94(4Бе)
С50

Раман Скірмунт

1868 – 1939

ЖЫЦЦЯПІС ГРАМАДЗЯНІНА КРАЮ

Аляксандр Смалянчук

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аляксандр Смалянчук

РАМАН СКІРМУНТ (1868–1939): ЖЫЦЦЯПІС ГРАМАДЗЯНІНА КРАЮ

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

94(476)
С 50

Аляксандр Смалянчук

РАМАН СКІРМУНТ (1868–1939): ЖЫЦЦЯПІС ГРАМАДЗЯНІНА КРАЮ

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Апошнім грамадзянам
Вялікага Княства Літоўскага
прысвячаецца

Президентская библиотека
Республики Беларусь
018000 088582
Ф.Н.

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2018

Президентская библиотека
Республики Беларусь
1628887

УДК 94(476)+929Скірмунт
ББК 63.3(4Беи)-8
С50

Рэцэнзенты

Доктар гістарычных навук *Сяргей Токць* (Варшаўскі ўніверсітэт),
Доктар гістарычных навук *Захар Шыбека* (Універсітэт Тэль-Авіва).

Кніга выдадзеная
пры падтрымцы
Польскага інстытута
ў Мінску

This book is published with a support of
Orsa-Romano Cultural and Educational Foundation Inc.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Смалянчук, А.

С50 Раман Скірмунт (1868–1939): жыццяпіс грамадзяніна Краю / Смалянчук Аляксандр Фёдаравіч. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2018.— 700 с. [12] л. іл. : іл.

ISBN 978-985-23-0016-2.

У цэнтры ўвагі біяграфія «краёўца» Рамана Скірмунта (1868–1939). Кніга знаёміць з асобай прадпрымальніка, ідэолага «краёвасці», беларускага і польскага палітыка і грамадскага дзеяча, для якога зыходным пунктам публічнай дзейнасці было замілаванне да роднага Краю. Гэты Край пачынаўся з Парэчча на Піншчыне і ахопліваў землі ўсёй гістарычнай Літвы. Краёвы патрыятызм паспрыяў далучэнню Р. Скірмунта да беларускага руху і ўдзелу ў змаганні за незалежнасць Беларусі ў 1918 г. Ягонае жыццё і дзейнасць можна лічыць апошнім актам польска-беларускага сімбіёза, які трагічна абарваўся ўвосень 1939 г.

Кніга адрасаваная ўсім, каго цікавіць мінулае гістарычнай Літвы, Беларусі, Польшчы.

ББК 63.3(4Беи)-8
УДК 94(476)+929Скірмунт

ISBN 978-985-23-0016-2

© Смалянчук А. Ф., 2018.
© Вокладка. Мануэль Прада, 2018.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2018.

ЗМЕСТ

Прадмова 7

«Смерць, дзе тваё джала?!» 9
Забойства ў Парэччы 10
«Скірмунт» як вобраз прыгнятальніка 18
Вяртанне з нябыту 24

Род і Радзіма 32
Легенда Скірмунтаў 32
Карані «Дуба» 40
Крона «Дуба» 48
«Ліверпуль на Ясельдзе» 59

Грамадзянін Краю 126
Краёвасць паводле Рамана Скірмунта 129
Думскі перыяд 149
Краёвая партыя Літвы і Белай Русі 173
Паміж Менскам, Парэччам і Пецярбургам 194
Вайна 220
Польская супольнасць Менска 245

«Беларускі дзеяч з вялікіх паноў...» 249
Беларускі выбар 249
На чале беларускага руху 257
У апазіцыі да сацыялістаў 290
У «другім эшалоне» 308
Рэвалюцыя і яе «нарады» 328
Перамога бальшавікоў 344
Усебеларускі з'езд 361

Пад знакам «Пагоні» 372
Вызваленне ад бальшавікоў 372
Першыя крокі да незалежнасці 382
Раман Скірмунт у Радзе БНР 403
«Дваяўраднасьць» 429
Раман Скірмунт і «нямецкі напрамак» дыпламатыі БНР 475
«Страшэнна не хватае Рамана Скірмунта» 494

Паміж Парэччам і Варшавай 517
«Польскі напрамак»: надзеі і расчараванні 517
Доўгая дарога дадому 522

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Супраць Рыжскага трактата 528
Ізноў «палескі фармат»? 534
Вяртанне палітыка і… даследчыка 542
У «партыі» Пілсудскага 568
Сенатар 585
«Мемуары» 605
Маёнтак і ягоныя жыхары 623
«Наш Скірмунт» 630
Гісторыя без Скірмунтаў… 647
Post scriptum 665
Летапіс жыцця і дзейнасці 669
Імянны паказальнік 678

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ПРАДМОВА

Гэтая кніга павінна была называцца «Апалогія Рамана Скірмунта»... Пры гэтым апалогія разумелася як абарона ў адпаведнасці з традыцыяй літаратуры старажытнай Грэцыі. Прыгадвалася славутая платонаўская «Апалогія Сакрата». Але падчас працы прыйшло разуменне, што гісторык не павінен ператварацца ў адваката або ў пракурора, што ягоны прафесійны абавязак звязаны з імкненнем зразумець. Гэта ў першую чаргу датычыць гістарычнай біяграфістыкі, якая займае важнае месца ў гістарыяграфіі. Усё ж гісторыя застаецца навукай пра чалавека ў часе, што калісьці трапна заўважыў вядомы французскі даследчык Марк Блок.

Хто такі Раман Скірмунт? Чаму ягоная постаць вартая ўвагі? Раман Скірмунт быў палітыкам трох краін і адным з ідэолагаў г. зв. «краёвасці», з якой многія даследчыкі звязваюць спробу будаўніцтва нацыі палітычнага тыпу на землях гістарычнай Літвы. Галоўным крытэрыем прыналежнасці да яе абвяшчалася адчуванне асобай уласнага краёвага «грамадзянства». Улетку 1918 г. былы дэпутат Дзяржаўнай Думы і сябра Дзяржаўнай Рады Расійскай імперыі ўжо фарміраваў урад Беларускай Народнай Рэспублікі, а ўвосень 1930 г. быў абраны ў Сенат Польшчы. На пачатку кастрычніка 1939 г. пасля прыходу г. зв. «першых саветаў» ён быў забіты паблізу роднага Парэчча на Піншчыне.

Ягоны жыццяпіс прыцягнуў увагу не толькі крутымі паваротамі палітычнай біяграфіі і надзвычай трагічным фіналам. Гісторыя жыцця Рамана Скірмунта, які называў сябе «беларусам польскай культуры» (1906), дазваляе зазірнуць у самасвядомасць супольнасці «літоўскіх» (*vel* «беларускіх») палякаў пачатку XX ст., закрануць праблему іх нацыянальнага выбару, які не заўсёды быў простым і відавочным. Даследаванні «краёвай ідэі», да выпрацоўкі якой ён меў непасрэднае дачыненне, значна паглыбляюць разуменне спецыфікі нацыянальных працэсаў на землях былога Вялікага Княства Літоўскага. Удзел палітыка ў беларускім Адраджэнні выклікае думкі пра магчымую альтэрнатыву беларускай гісторыі XX ст., менавіта пра Беларусь са Скірмунтамі і Радзівіламі.

Жыццяпіс Скірмунта – гэта таксама гісторыя Палесся, якое застаецца адным з найбольш прыгожых і таямнічых куткоў Беларусі. Дакрануцца да гэтай таямніцы і адчуць прывабнасць Палесся і ягоных жыхароў дапамаглі шматлікія экспедыцыі па вуснай гісторыі. Палешукі казалі «наш Скірмунт» і шчодра дзяліліся ўспамінамі пра «добрага пана», якія паведамлялі шмат цікавага не толькі пра ўладальніка маёнтка ў Парэччы, але таксама пра іх саміх, пра Палескі край.

Зразумець палітыка і грамадскага дзеяча немагчыма без сустрэчы з ім як з чалавекам з пэўнымі асаблівасцямі характару і менталітэту. Ігнараванне індывіду-

альнасці, якое часцяком сустракаецца ў гістарыяграфіі, недапушчальнае ў біяграфічных даследаваннях. Біяграфістыка (біяграфіка) апошнім часам ператварылася ў асобную галіну гуманітарных ведаў, якая грунтуецца на міждысцыплінарнасці. Метад біяграфістыкі, безумоўна, аказаў уплыў на аўтара гэтых радкоў, які, аднак, застаўся ў межах гістарычнай навукі. Пры гэтым атрымалася праца, якую можна трактаваць як пэўны выклік той беларускай гістарыяграфіі, якая ствараецца калегамі ў сценах дзяржаўных інстытутаў з аглядкай на «цэнзараў» ад афіцыйнай ідэалогіі, а яшчэ больш на «ўнутранага цэнзара».

Хачу выказаць удзячнасць тым людзям, якія цікавіліся ходам даследаванняў, дзяліліся гістарычнымі крыніцамі, выказвалі заўвагі і давалі парады, стваралі магчымасці публічных выступленняў і абмеркаванняў найбольш складаных пытанняў жыццяпісу Рамана Скірмунта. Імёны гэтых людзей таксама прысутныя ў гэтай кнізе. Асаблівая падзяка належыць старэйшым жыхарам Пінска, а таксама вёсак Парэчча, Табулкі, Моладава, Чамярын, Моталь, Мерчыцы, Рудка, Ахова, Бакінічы ды іншых на Піншчыне. Іх успаміны паглыблялі маё разуменне як асобы Рамана Скірмунта, так і асаблівасцяў гістарычнага даследавання.

Большасць ілюстрацый паходзяць з архіваў Беларусі, аддзела рукапісаў Бібліятэкі імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы (Вільня) і збораў спадарыні Зоф'і Дэрналовіч (Варшава).

Выданне гэтай кнігі стала магчымым дзякуючы падтрымцы Польскага Інстытута ў Менску, а таксама *Orsa-Romano Cultural and Educational Foundation Inc.*

P. S. Вяртаючыся да адкінутай першапачатковай назвы кнігі… Ужо пасля напісання прадмовы прыйшла думка, што апалогія (абарона) Рамана Скірмунта патрэбная не яму, а нам, жыхарам сучаснай Беларусі. Прынамсі тым, якія хочуць жыць у краіне свабодных людзей, дзе моц дзяржавы і закона не парушае, а абараняе іх вольнасць, годнасць і інтарэсы. Якраз пра гэта марыў Раман Скірмунт…

«СМЕРЦЬ, ДЗЕ ТВАЁ ДЖАЛА?!»

Імкненне захаваць жыццё – натуральная прага ўсяго жывога. Але смерць – гэта непазбежны лес кожнай жывой істоты. Як прымірыцца з ёй? Рэлігія прапануе адказ, які здымае праблему смерці як уяўную. Вядомы культуролаг Юры Лотман у сувязі з гэтым заўважыў, што культура занадта пагружаная ў чалавечую прастору, каб задаволіцца падобным рашэннем загадкі смерці[1]. Па-за межамі рэлігійнай свядомасці застаецца прыняцце смерці як непазбежнай і незалежнай ад волі чалавека. І таямніца смерці застаецца… Але часам менавіта смерць як найбольш драматычны элемент жыцця надае яму цэльнасць і стварае магчымасць ягонага асэнсавання. У гэтай сітуацыі асаблівы трагізм набываюць выпадкі гвалтоўнай смерці.

Рамана Скірмунта забівалі двойчы. 7 кастрычніка 1939 г. колішні дэпутат Дзяржаўнай Думы Расійскай імперыі (1906), кіраўнік Беларускага Нацыянальнага Камітэта (1917) і палітык Беларускай Народнай Рэспублікі (1918), сябра Канстытуцыйнай камісіі Сената міжваеннай Польшчы (1930–1935) быў забіты мясцовымі «актывістамі савецкай улады»[2] ва ўрочышчы «Корань» паблізу вёскі Парэчча на Піншчыне. Забойства было адным з наступстваў г. зв. «вызвалення Заходняй Беларусі ад польскіх паноў».

Пазней тыя гісторыкі, якія абслугоўвалі камуністычную ўладу, паспрабавалі забіць і памяць пра гэтага чалавека. Менавіта іх намаганнямі Раман Скірмунт у беларускай савецкай гістарыяграфіі ператварыўся ў сімвал «панскага прыгнёту» над беларускім народам[3].

Вяртанне з нябыту пачалося толькі ў 1990-я гг. У старым парку в. Парэчча з'явіўся памятны крыж, а беларускія гісторыкі, абапіраючыся на гістарычныя дакументы, паспрабавалі распавесці пра жыццё і дзейнасць палітыка і грамадскага дзеяча Рамана Скірмунта. Характэрнае для першых гадоў існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь імкненне пазбыцца згаданага савецкага «сімвалізму» і адрадзіць гісторыяпісанне як навуковую дысцыпліну стварыла шанс вяртання

---

[1] Ю. Лотман, *Смерть как проблема сюжета* (гл. зборнік *Studies in Slavic Literature and Poetics*, Vol. XX; Literary Tradition and Practice in Russian Culture, Amsterdam-Atlanta, 1993. Рэжым доступу: http://vivovoco.astronet.ru/VV/PAPERS/LOTMAN/LOTMAN06.HTM. Дата доступу: 02. 01. 2018

[2] Гл., напр., Электронная энцыклапедыя. Рэжым доступу: http://slounik.org/122364.html Дата доступу: 27. 04. 2018 г.

[3] Гл., напр., *Гісторыя Беларускай ССР.* Т. II. Пад рэд. І. С. Краўчанкі, Н. В. Каменскай. Мінск 1958, с. 93 ды інш.

ў прастору памяці не толькі постаці Рамана Скірмунта, але і тысячы іншых асоб, выкрасленых з айчыннай гісторыі савецкімі цэнзарамі.

Забойства ў Парэччы

Мая цікавасць да асобы Рамана Скірмунта першапачаткова была звязана з ягонай палітычнай дзейнасцю. Ва ўмовах дамінавання этнакультурнага нацыяналізму на землях былой Рэчы Паспалітай у пачатку XX ст. ён выступіў як адзін з ідэолагаў г. зв. краёвасці. Краёвасць (краёвую ідэю) можна трактаваць як спробу пашырэння канцэпцыі палітычнага або грамадзянскага разумення нацыі. Мэтаю краёўцаў было захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці гістарычнай Літвы, а таксама ўлагоджванне нацыянальных канфліктаў і сацыяльных супярэчнасцяў. Дарэчы, імкненне ісці супраць «плыні» было адной з дамінуючых рысаў характару Рамана Скірмунта.

Вобраз палітыка і «краёўца» набыў зусім іншыя фарбы, калі ў 1999 г. я ўпершыню наведаў вёску Парэчча Пінскага раёна, дзе яшчэ ў міжваенны час знаходзіўся маёнтак Скірмунтаў. Мяне цікавілі абставіны ягонай трагічнай смерці. Ужо першыя размовы ў вёсцы паказалі, што Раман Скірмунт з'яўляецца надзвычай важным «месцам памяці» парэчан. Аповед пра «нашага Скірмунта» і «добрага пана» быў (і застаецца!) абавязковым сюжэтам вусных успамінаў старэйшых жыхароў Парэчча. Вось, напрыклад, як прыгадвала яго Соф'я Хвясюк, 1933 г. нар.: *Такіх паныв як наш пан, то нігде такей душы, наверное, не було. Очэнь-очэнь буў добры. Сочувствовал каждому бідному, помогал бідным...*[4] Тады ж я пачуў, што «пана» забілі не нейкія там «актывісты», а «хуліганы і гулякі».

Ужо праз год у Парэччы, а таксама ў навакольных вёсках, у т. л. у Моладаве Іванаўскага раёна, дзе таксама быў маёнтак Скірмунтаў, пад маім кіраўніцтвам працавала першая экспедыцыя па вуснай гісторыі. Яе ўдзельнікамі былі навукоўцы, мясцовыя краязнаўцы і студэнты з Гародні. Мэтаю быў збор вусных сведчанняў пра Рамана Скірмунта, пра штодзённае жыццё ў маёнтку і блізкіх вёсках у міжваенны час. Асаблівая ўвага надавалася абставінам гібелі Скірмунтаў у Парэччы і Моладаве.

Пра спецыфіку *oral history* гаворка наперадзе. Зараз адзначу толькі, што ў беларускай гістарыяграфіі і *memory study* вусная гісторыя з'яўляецца адносна новым накірункам. Яна грунтуецца на выкліканых даследчыкам падчас інтэрв'ю вусных успамінах, якія становяцца гістарычным дакументам і аб'ектам навуковай інтэрпрэтацыі. У беларускай сітуацыі, калі значныя масівы пісьмовых дакументаў не захаваліся, а да іншых доступ часткова абмежаваны або наогул забаронены, вусная гісторыя мае асаблівую каштоўнасць. Пры гэтым трэба разумець, што

---

[4] Тут і далей у цытаванні вусных успамінаў захоўваюцца ўсе асаблівасці вымаўлення рэспандэнтаў.

«факты» памяці рэспандэнтаў належаць не толькі мінуўшчыне, але і сучаснасці. Зрэшты, суб'ектыўнасць уласцівая кожнай гістарычнай крыніцы, бо ўсе яны так ці інакш створаны чалавекам. Прычым іх аўтары звычайна не мелі магчымасці або не імкнуліся да аб'ектыўнага апісання падзеі ці асобы.

Даследаванні вуснай гісторыі 2000–2016 гг. у вёсках Парэчча, Моладава, Табулкі, Чамярын, Рудка, Ахова, Палтаранавічы, Кашавічы, Бакінічы, Юзэфіны, Церабень, Моталь, былое Альбрэхтова ды інш. Пінскага і Іванаўскага раёнаў Берасцейскай вобл. дазволілі аднавіць той вобраз трагічных падзей восені 1939 г. у палескіх маёнтках Скірмунтаў, які захавала памяць нашых рэспандэнтаў (суразмоўцаў). Імі былі пераважна вяскоўцы 1910–1930-х гг. нараджэння[5]. Аповеды «паріцкіх людзей» былі дапоўнены вуснымі ўспамінамі пляменніцы Рамана Скірмунта Вацлавы Нээф, дачкі Тэафілы са Скірмунтаў і Эдварда Корсак-Залескага, запісанымі польскай даследчыцай Зоф'яй Дэрналовіч у Кёнігсфельдзе (Германія) у 1985 г.[6], а таксама ўспамінамі Гераніма Тукальскага-Нелюбовіча з фондаў Асалінэум у Вроцлаве (Польшча).

Што адбылося ў Парэччы з прыходам Чырвонай арміі? Паводле ўспамінаў Вацлавы Нээф і Гераніма Тукальскага-Нелюбовіча, атрымаўшы звесткі пра агрэсію СССР супраць Польшчы, Раман Скірмунт з сястрой Аленай і яе мужам Баляславам Скірмунтам выехалі з Парэчча ў Пінск. Вечарам 20 верасня 1939 г. у горад увайшлі часткі Чырвонай арміі. У наступныя дні адбыліся масавыя арышты «класава чужога элементу». Былі арыштаваныя таксама Скірмунты. Але ў турме яны прабылі толькі суткі. Пасля допыту і запісу асабістых дадзеных іх, як і большасць іншых арыштантаў, выпусцілі на свабоду[7].

Напрыканцы верасня Раман і Баляслаў Скірмунты вырашылі вярнуцца ў Парэчча. У вёсцы Скірмунта вельмі шанавалі, і, магчыма, ён якраз і разлічваў на дапамогу вяскоўцаў. Тым больш, што ў Пінску ўжо распавядалі як пра факты «стыхійных» забойстваў і расправаў з землеўласнікамі (зямянамі), так і пра эпізоды, калі жыхары палескіх вёсак ратавалі іх ад рэпрэсій з боку новай улады. Праз даверанага чалавека (лакея Олеся) ён перадаў ліст Вацлаве Нээф. Яна жыла ў апусцелай плябаніі ў Парэччы і, дзякуючы мужу, які быў грамадзянінам Германіі, адчувала сябе больш-менш упэўнена. Савецкая ўлада нямецкіх саюзнікаў не крыўдзіла.

Каб вярнуцца ў Парэчча, патрэбны быў дазвол новай мясцовай улады. В. Нээф прыгадала, што «камісар» Марозаў, які знаходзіўся ў Парэччы, дазволіў вяртанне

---

[5] Аўдыёзапісы ўспамінаў жыхароў вёсак знаходзяцца ў асабістым архіве аўтара, а таксама ў Беларускім архіве вуснай гісторыі (http://www.nashapamiac.org/archive/home).

[6] Хачу выказаць шчырую ўдзячнасць спадарыні Зоф'і Дэрналовіч (Zofia Dernałowicz) за дазвол карыстацца запісамі гэтых успамінамі, а таксама фотадакументамі.

[7] Biblioteka Zakładu Narodowego imienia Ossolińskich we Wrocławiu (далей: ZNiO). Dział rękopisow, sygn. 15444 II/cz. 2. H. Tukalski-Nelubowicz. *Poł wieku wspomnien. Cz. 2. W siodle 1926–1939*, T. 1, k. 16.

з умовай, што Скірмунт не будзе ўмешвацца ў справы вясковага «рэвалюцыйнага камітэта».

Вацлава Нээф таксама распавяла, што не раіла Скірмунту вяртацца, бо згаданы Камітэт ужо пачаў расправы. Адной з першых ахвяр стаў ляснік Яворскі. Да таго ж у складзе Камітэта аказаўся чалавек, асуджаны за кражу мёду з вулляў маёнтка, які меў асабісты канфлікт з Скірмунтам.

Аднак Раман і Баляслаў Скірмунты ўсё ж прыехалі ў Парэчча і пасяліліся таксама ў плябаніі. Р. Скірмунт, як і Нээфы, амаль не пакідаў будынку. Магчыма, ужо ў Парэччы ён даведаўся пра трагічны лёс сваякоў з Моладава. Генрык і Марыя Скірмунты былі забітыя 20 верасня. У гэтыя трывожныя дні ён, верагодна, прыгадваў успаміны свайго сябра Эдварда Вайніловіча пра рабунак і знішчэнне ягонага палаца ў Савічах (Слуцкі пав.) дэзертырамі, сялянамі і слугамі ў лютым 1918 г. Жыццё Вайніловічу і ягонай жонцы выратавала толькі тое, што, папярэджаныя служкам, яны паспелі схавацца ў лесе...

Праз некалькі дзён пасля вяртання жыхароў плябаніі ўначы абудзіў адзін з парэцкіх сялян, які паведаміў, што «рэвалюцыйны камітэт» прыняў рашэнне расстраляць Скірмунтаў, і параіў ім уцякаць. Паводле ўспамінаў В. Нээф, Раман Скірмунт не паверыў і не хацеў пакідаць вёску, але ўрэшце паддаўся ўгаворам і заявіў, што раніцай яны паедуць вузкакалейкай да Янава, а адтуль чыгункай да Пінска.

Аднак іх апярэдзілі. Раніцай 6 кастрычніка Скірмунтаў арыштавалі ўзброеныя «камітэтчыкі» і памясцілі ў карцар былой управы гміны, якая стала сядзібай Камітэта. Раніцай наступнага дня арыштаваных пасадзілі на воз і заявілі, што павязуць у Пінск на допыт. Муж Вацлавы Нээф адразу ж пайшоў да «камісара» Марозава, і той пацвердзіў, што арыштаваных павязуць у Пінск. Насамрэч, яны былі расстраляныя ў лесе «Корань» паміж вёскамі Велясніца і Кажанёва (8–10 км ад Парэчча).

Вацлава Нээф прыгадала, што на наступны дзень адзін з забойцаў хадзіў у адзенні Рамана Скірмунта і меў на руцэ ягоны гадзіннік. Ён нават зайшоў у плябанію і папрасіў вады. Магчыма, чакаў нейкіх роспытаў, але не дачакаўся.

Вясковыя суразмоўцы пацвердзілі спадзяванні Скірмунта на дапамогу сялян. Марыя Кучынская (1919 г. нар.): *Быў пэўны на свой народ, бо він яго не обіжаў. Ён мог уцячы, але думаў, што прыйдуць Саветы і разбяруцца.* Яна ж прыгадала ягоныя словы пасля вяртання ў Парэчча: *Він хаціў так: Знаю, шчо ўжэ не памешчык, такі ж робочы, як і ўсі. Я буду робыты, але трэба, коб прыйшло начальство [...] Ну, ідітэ, забырайтэ ўсё мае багатство. Но рабітэ. А я посмотру, як вы будытэ робіты. Маладнякы шчэ ж вы, ныц ны знаетэ.*

Спадзяванне Рамана Скірмунта на сустрэчу і размову з «начальствам» пацвердзілі і іншыя суразмоўцы. Але гэтага спаткання не адбылося. «Начальства» (рэспандэнты прыгадвалі прозвішчы «камісараў» Холадава, Кавалёва і Маскалёва) не збіралася сустракацца з уладальнікам маёнтка. Магчыма, якраз гэтыя

«камісары» (часцей вясковыя суразмоўцы згадвалі Холадава) і стаялі за спіной забойцаў (Фёдар Хвясюк, 1912 г. нар.; Анастасія Вакульчык, 1911 г. нар. ды інш.).

Забойству папярэднічаў агульны сход, які павінен быў стаць «народным судом» над памешчыкам. Пра яго распавёў былы шафёр Рамана Скірмунта Мікалай Куцко (1911 г. нар.): *У 39 годзе Саветы сабралі суд: Што будзем рабіць са Скірмунтам? Некаторэ казалі, хай ён ідэ да сваіх лёкаеў на калёнію, і хай яны яго кормяць. Другія казалі, што трэба выдзяліць яму пакой у палацы. Хай там жыве. Ніхто не хацеў забіваты. Тады выступіў камісар Холадаў: «Вы ня знаеце, што такое памешчык, а мы знаем. Он і конюхам работаць можа, але возьме хлеў зачыніць, падпаліць, цялё на плечы, бяжыць і крычыць «Спасайте!» По-мойму такім як Скірмунт не далжно быць места на земле».*

Сярод парэчан знайшліся людзі, якія прыслухаліся да гэтага меркавання. Суразмоўцы асуджалі іх: *А між людьмы ўсякы ест. Е подхалімы такы* (Рыгор Цярэшка, 1932 г. нар.); *Люды, шчо забылы Скірмунта, булы гулякамы, любылы выпыты, пагуляты* (Фёдар Хвясюк).

Калі Рамана і Баляслава Скірмунтаў везлі на смерць, нехта з парэчан паспрабаваў заступіцца: *«Шчо вы робытэ? Куды вы ёго выдэтэ?» І почуў у адказ: «Моўчы, бо і тобі гэтэ будэ шчэ!»* (Анастасія Вакульчык).

Марыя Нікалайчык (1920 г. нар.) распавяла, што людзі плакалі, а Скірмунт сказаў: *«Я з вамы прошчаюся назаўсёды. Спадзяюся, што нікому не зрабіў кепскага».* У адказ на пытанне, чаму ж вы не абаранілі чалавека, суразмоўцы разводзілі рукі і адказвалі: *«А як жа абароніш? Нічога не зробіш!»* (Марыя Кучынская).

Прыгадвалі, што перад смерцю Раману Скірмунту загадалі адвярнуцца ад забойцаў. Ен адмовіўся: *«Я ад людзей ніколі не адварочваўся».* І дадаў: *«Я б вам не саветаваў гэта рабіць, бо вы маладыя. Я ўжо аджыў свае гады»* (Анастасія Вакульчык). У аднаго з забойцаў нават ружжо з рук выпала. Але сваю злачынную справу яны давялі да канца. Галоўным выканаўцам быў Сільвестр Лукашык (вясковае прозвішча «Соловэй»).

Найбольш поўны аповед пра забойства «пана» належаў Мікалаю Калбаску (1925 г. нар.) з в. Рудка. Прывяду фрагменты інтэрв'ю, запісанага ў 2004 г.:

Бачыў, як вызлы ёго страляты [...] Мы, хлопчыкі тагді короў паслы. Гадоў 14 було. Ёго вызлы, кучар сыдіў, пара коней з Парычча, і тры ішлі з ружжамі ззаду. А він і шурын ёго з Варшавы (прыехаў да яго ў госты)... І тут ужо большовыкы захватылы ёго, да ўсё. А він нікуды ны ўтыкаў. [...] Ёго вызлы Козак, Соловэй і Просіф. [...] Соловэй – гэтэ маей мамы сыстры буў шурын. Я Солоўя добрэ помню. [...] Трое ззаду з ружжамі ішлы, а кучар упэраді, а оны ў капэлюшах сыділы ззаду. Повозка наслана була – салома, адэяла засланэ було, усё хорошэ. Сумок ны було. [...] І тому пану і шурыну той Соловэй казаў: «Одвырныса задом. Коб у зад стрыляты. А він говорыты: «Я од людэй ны одворочваўса. Хто до мынэ прыходыў, я каждому помоч даваў». У ліцо выстрыліў. Так тому Солоўю він мо годоў з дэсять, мо і больш, як застрэліў, так у вочах усё врэмя стояў. Шчо ў ліцо стрыляў.

– Адкуль вядома, што гэта Скірмунт сказаў? Няўжо Соловэй пра гэта распавядаў?

Ну, пэўно! Там буў такі Сак Коля. Так він ему казаў, як пана стрыляў. А той буў хорошы і з панам, і з тым. Він у пана служыў, стары Сак. Скірмунт кажэ: «Чы я тыбэ колі тронуў, а ты хочэш мынэ застрэлыты». О, пан хорошы буў Скірмунт.

– А можа, якая крыўда была на Скірмунта?

Якая там крыўда!? Він на роботу до Скірмунта не хадыў ныяк! Стары Паўлюк Лукашык (Гарбарук) мні казаў, што він на роботу ны ходыў. А свое поле ны обробляў.

[...] На другі дэнь мы бігалы туды, на Корэнь, дэ маёнток буў. Кіламетрэў два ці тры. І там булы такы здоровы дубы. [...] Калі мы прыйшлі тые мисцэ глядзець, дэ застрэлылы, то адын з Рудкі хлопэц дажэ туфлі сорваў. Ны знаю, чы з пана, чы з того, бо ногы наверсы булы ў одного. Іх толькы прысыпалы. Булы там тры годы. А колы німцы прыйшлы, прыіхала сыстра. Она собрала костачкы і поховала ў Парыччы, дэ дарога на Чамырын. [...] Во, шчо я знаю про Скірмунта. Хорошы мужык буў!

– Людзі гавораць, што калі Скірмунт не захацеў адварочвацца, то двое з тых забойцаў кінулі стрэльбы і ўцяклі. Застаўся адзін Соловэй, які і забіў іх. Гэта праўда?

Гэтого я ны знаю. Можэ так і було. Только я знаю, шчо Скірмунту Соловэй казаў: «Одвырныса» А він говорыт: «Я од людэй ны одворочваўся». Гэто ў Парыччы мні расказвалі. Кажэ: «Хто до мынэ обрашчаўся, я каждому помоч даваў». Помогаў хаты робыты, грошыма помогаў, даваў усё. Колы-то ў Варшаве буў Сэнат, як зарэ Дума, так він жэ тожэ участвоваў там. То він сказаў, шчо ўсю зымлю трэба ў помешчыкаў забраты і оддаты людям. Помешчыкам надо покынуты по 40 гектар. Хватыты з іх. А ўсю зымлю зобраты і народу роздаты. Дык у его стрылялы, і він чэрэз окно выпрыгнуў. Тая Дума (ілі як) стрыляла. Матка моя расказвала. Він сам прыіхаў у Парыччэ і народу казаў, што так выступаў, а по мні стрылялы. Хорошы мужык буў.

– Але ж і ён бы зямлю страціў.

А він не жалеў. Холосцяк буў, дыты ны було ў его. Як застрылылы его, то ёму було 72 годы. Матка расказвала. Той другі Скірмунт буў малодшы. Він з Варшавы ў госты прыіхаў. Можэ од німцоў утыкаў. А сыстры ны було. Коб сыстра була, то і сыстру б застрэлылы. Ужэ пры німцах сыстра прыіхала, іх одкопала і похороныла.

– А чаму Скірмунт не з'ехаў, калі Саветы ішлі?

Він народу добрэ робыў, він ны бояўса. Хто мыны заб'е? Він врэды ны робыў. [...] У концы він мог быты прызідэнтом.

А вось фрагмент аповеду Соф'і Хвясюк (запіс 2015 г.):

Той чоловік, што пана ўбіваў жыў недалёко от маей сястры. Яна расказвала: Вязуць пана Козак Лысыков (не знаю як яго зваты), Гарбарук Соловэй (Лукашык)

і Пархомчук (тылько не знаю як яго зваты)... І вязуць пана і панавай сястры мужа. Сядзяць на возу. Ужас! Сястра говорыць, што не магла дывіцца, плакала. [...] І всым сілом везлі яго і завезлі яго на Корань. Там Холожын дзерэўня, а когда-то там часнікі булы, самі людзі кірпыч робылы. Там цыгельня була, і булы вялікія ямы. І завізлы туды того пана і яго швагра, і паставілы стрэляты... А той Соловэй кажэ: «Одвэрнісь». А він кажэ: «Я од людзей своіх не адворочваўся, а от цебя, подлеца тем более я не одвернусь». І прама яму ў глаза дывіўся. [...] І іх пострэлялы, і там в тых ямах прысыпалы зымлёй.

А вось як пераказаў успаміны парэчанкі Хрысціны Цярлецкай (1912 г. нар.) пра гэтую трагічную падзею пінскі журналіст Вячаслаў Ільянкоў:

Однажды я свидетельницей была, как Селивестр Лукашик подвыпил и рассказывал: Завели мы их и заставили яму копать. Роман отказался: Я не заслужил себе могилу рыть. Болеслав помоложе был, сразу струсил, потерялся. Заметил это Скирмунт, обоперся на сук – тяжело стоять, шли долго – и просит: «Быстрей делайте, что решили».

«Повернись», – говорю ему.

А он смотрит на меня: «Я ничего плохого людям не делал». Ударил его, а он говорит: «Не думайте, что прощусь, свое прожил, но вы не берите грех на душу».

Цудило винтовку кинул, Пархомчук тоже побежал. Пришлось мне кончать[8].

Паводле Вацлавы Нээф, забойства адбылося 7 кастрычніка 1939 г. Целы забітых былі скінуты ў вырытую магілу і прысыпаны зямлёй...

Пасля забойства Рамана Скірмунта палац быў разрабаваны. Рэспандэнты звычайна адмаўляліся распавядаць пра лёс сядзібы, маўляў, «не памятаем». Толькі Мікалай Куцко прызнаўся, што ў пэўны момант вёска пайшла рабаваць палац. А Яўдакія Пракопчык (1928 г. нар.) удакладніла: *Бяднейшыя ўсё расцягнулі. Тыя, што працавалі на пана, не пайшлі. [...] Усё пазабіралі... лыжкі, талеркі...* Яна ж прыгадала, што мэблю з палаца забрала згаданыя «камісары». І тут ізноў фігураваў Холадаў...

Большасць рэспандэнтаў у забойстве «добрага пана» вінаваціла выключна «сваіх» і сцвярджала, што савецкае «начальства» не мела дачынення да гэтай трагедыі. Толькі Харыта Чырко (1913 г. нар., в. Парэчча) заявіла, што смяротны прысуд вынеслі якраз «камісары»: *Савецкі булы люды, ну, то тые его приговорылы, што забіты. [...] Тэе начальство, што оно наіхало, а не поріцкія. Поріцкі [...] то его век не далы б забіты. Нікогда б не далы, бо він хорошы чоловік быв. Він такі, бідных людэй так він шкодовав.*

Амаль усе запісаныя аповеды пра забойства Рамана і Баляслава Скірмунтаў утрымлівалі згадкі пра «божую кару» для забойцаў. Паводле аповеду С. Хвясюк, Сільвестр Лукашык («Соловэй») часта жаліўся сваёй сястры: «*Хрысцечка, і ходзю, то ў вачах мне пан стоіць, і ложусь, і встаю, і в ноч, і в дзень у вачах стаіць.*

---

[8] В. Ильенков, *Трагедия Скирмунтов*, «Пинский вестник» 1992, 25 сакавіка.

Як дывіўся ў вочы, так у вачах стаіць» [...] А той Пархомчук, то яго нямцы забралі. Бацька казав... І там быв Рабы мост, і там яго немцы мучылі: «Што ж ты зрабыв? Нашчо Скірмунта ўбів?» Он погыб там. Трэці Цудзіла я не знаю дзе...

Іншыя суразмоцы прыгадвалі, што «Соловэй» хварэў на сухоты і выглядаў як *шкілет абцягнуты скурай.* Усцім Пархамчук («Козак»), паводле іншай версіі, падчас нямецкай акупацыі хаваўся ад немцаў і ад парэчан. А калі памёр, то быў закапаны жонкай у бульбяной яме. Тры ягоныя сыны трагічна загінулі[9]. Іван Цудзіла («Просіф») пасля вайны з'ехаў у Расію і згінуў без следу.

Вясковая калектыўная нарацыя перадае адчуванне вялікай несправядлівасці, якая здзяйснялася ў Парэччы. Яна відавочная ў прыгаданых апошніх словах Рамана Скірмунта, у абурэнні забойствам, у агульным перакананні ў «божай кары» для забойцаў. За ўсе гады даследаванняў па вуснай гісторыі ў гэтым рэгіёне не знайшлося аніводнага суразмоўцы, які б не асудзіў злачынцаў і не сказаў добрыя словы пра Рамана Скірмунта. Амаль усе падкрэслівалі вытрымку «пана», які і перад смерцю захоўваў яснасць думкі і годнасць. Загад адвярнуцца ён не выканаў. Глядзеў у твар смерці, якая прыйшла з той вёскі, якую ён любіў, і жыхарам якой так часта дапамагаў.

Варта звярнуць увагу на апошнія словы, якія, паводле вяскоўцаў, казаў Раман Скірмунт перад смерцю: *«Я ад людзей ніколі не адварочваўся...»* Магчыма, сапраўды, квінтэсэнцыяй ягонага жыцця была гатоўнасць дапамагаць людзям, падтрымліваць тых, хто апынуўся ў цяжкай сітуацыі.

Аналізуючы вусныя ўспаміны, між волі звяртаеш увагу і на тое, што постаць забітага Баляслава Скірмунта і ягоны трагічны лёс засталіся ў цені Рамана. Быццам людзі асуджалі не столькі самое забойства, колькі забойства менавіта «добрага пана».

На пачатку нямецкай акупацыі прах Рамана і Баляслава Скірмунтаў быў пахаваны ў парку, які некалі заснаваў сам гаспадар маёнтка. З аповеду Соф'і Хвясюк: *А после, як прышлі ўжэ німцы, прыіхала сястра Скірмунта з Польшчы... А мы жылі на хутары, і дарога тут була. І немцы поіхалы, а людзі з Холожына показалы, дзе іх пострэлялы. Німцы досталы, і в гробах повезлы. І покіль нас везлы. Кінь чорны. Збруя з такімі белымі гузічкамі. Гроб чорным абабіты і очэнь разукрашэны... Одын военны кіня погоняе, а німцы з адного боку і з другого ідуць вооружоны. Одна фурманка з гробом поіхала. Другая фурманка такасама. Трэця фурманка едзе, і сядзіць ужэ сястра Скірмунта, чорным накрыта. Ззаду дзесяць, мо і больше німцов ішло вооружоных. Пана повызлі прамо ў яго ліс, у урочышча Лісына, у Корчэва. І вот там яго сястра і похороніла.*

Як ужо адзначалася, 20 верасня 1939 г. у суседнім Моладаве былі забітыя

---

[9] В. Кучынскі, *Бог пакараў сям'ю забойцы,* «Народная воля». 2010, 18–19 красавіка.

ўладальнік маёнтка Генрык Скірмунт і яго сястра Марыя[10]. Наогул, на Піншчыне былі рэпрэсаваныя ўсе Скірмунты, якія не пакінулі родныя мясціны ў верасні 1939 г. Падобна, што ва ўласным ложку памёр толькі старэйшы брат Рамана Аляксандр Скірмунт (1858–1940). Скірмунты падзялілі лёс шматлікіх польскіх землеўласнікаў, якія разам з дзеячамі беларускага нацыянальнага руху былі першай ахвярай савецкіх рэпрэсій у Заходняй Беларусі. Пазней прыйдзе чарга мясцовай інтэлігенцыі, польскіх і беларускіх «кулакоў», габрэйскай «буржуазіі».

У 1990-я гг. у парэчскім парку быў пастаўлены помнік Скірмунтам – жалезны крыж з надпісам па-польску. Ужо ў XXI ст. паблізу першага крыжа на меркаванай магіле Скірмунтаў з'явіўся драўляны крыж з надпісам па-беларуску...

Сумныя думкі нараджаюцца каля гэтага крыжа. Лёс многіх таленавітых сыноў і дачок Беларусі быў надзвычай трагічным. Звычайна – гэта самотнасць, перадчасовая смерць ці выгнанне на чужыну. Дачка ўладальніка сядзібы ў Бакінічах Станіслава Скірмунта Тэрэза, дзяцінства якой прайшло ў адным з калгасаў Казахстана, у размове заўважыла, што трагедыя Беларусі не толькі ў тым, што вынішчылі найлепшых. Самым жахлівым было тое, што роль непасрэднага ката часта выконвалі самі беларусы. Быццам забівалі ўласную будучыню.

Аднак нельга забываць пра прысутнасць у Парэччы «камісараў». Упэўнены, што гэтае забойства не магло адбыцца без іх дазволу ці загаду. Забойцы папросту зрабілі тое, чаго дамагалася новая ўлада. Геранім Тукальскі-Нелюбовіч ва ўспамінах сцвярджаў, што г. зв. «народны гнеў» восені 1939 г. быў арганізаваны савецкай уладай і «камісарамі»[11]. Яны змянілі тактыку знішчэння «класава чужога элементу» і пачалі дзейнічаць рукамі мясцовых прыхільнікаў бальшавізму. Таксама нельга выключаць матываў, звязаных з прагай нажывы і хцівасцю прадстаўнікоў новай улады. Менавіта пасля забойства Скірмунтаў пачаўся рабунак сядзібы, а першымі рабаўнікамі былі якраз згаданыя «камісары».

На зварот у Архіў КДБ Беларусі ў студзені 2018 г. атрымаў адказ: «...Паведамляем, што матэрыялаў, якія тычацца асобы і дзейнасці Рамана Аляксандравіча Скірмунта ў фондах архіваў органаў дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь не маецца». Намеснік начальніка Цэнтральнага архіва КДБ сп. Варапаеў, які падпісаў гэты адказ, параіў звярнуцца да выданняў, якія распавядаюць пра дзейнасць органаў дзяржаўнай бяспекі...

---

[10] В. Ильенков, *Трагедия Скирмунтов*, «Пинский вестник». 1992, 25 сакавіка; ён жа, *Скирмунты*, «Пинский вестник». 1993, 27 студзеня; А. Сідлярэвіч, А. Смалянчук, *«Добры быў пан...»*, «Спадчына». 2000, № 5–6; У. Арлоў, *Раман Скірмунт* (у:) Імёны свабоды. Менск, 2007; А. Дзікавіцкі, *Помнік над катлаванам*, «Наша Ніва». 2001, 23 ліпеня; А. Смалянчук, *Успамін пра Рамана Скірмунта*, «Наша Ніва». 2000, 18 снежня; А. Смалянчук, *«Сфінкс» беларускай гісторыі?*, «Биржа информации». 1999, 10 июня.

[11] H. Tukalski-Nelubowicz, *Poł wieku wspomnień*..., k. 30–31.

Президентская библиотека Республики Беларусь
1628887

«Скірмунт» як вобраз прыгнятальніка

Пасля 1939–1940 гг. Скірмунты зніклі з далягляду беларускай гісторыі, а «добры пан» Раман Скірмунт у выніку намаганняў савецкіх гісторыкаў стаўся сімвалам «панскага прыгнёту».

Гістарыяграфічнае «забойства» Рамана Скірмунта пачалося яшчэ ў даваенны час. Яно было непасрэдна звязана з імкненнем камуністычных ідэолагаў асудзіць і перакрэсліць усе культурніцкія і палітычныя намаганні беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст., якія маглі прывесці да стварэння несавецкай беларускай дзяржавы. Стаўленне савецкіх гісторыкаў да асобы Скірмунта цалкам вызначалася іх надзвычай негатыўнымі ацэнкамі «беларускага буржуазнага нацыяналізму». Імкнучыся пераканаць чытача ў ягонай «антынароднай» сутнасці, многія аўтары ішлі на свядомую фальсіфікацыю мінулага Беларусі.

Адна з першых згадак палітыка і краёўца ў беларускай савецкай гістарыяграфіі належала актыўнаму змагару з «нацдэмаўшчынай» Андрэю Зюзькову[12]. У артыкуле «Беларускія нацдэмы – супроць Кастрычніка» (1934) ён сцвярджаў імкненне «нацыянальнай буржуазіі» да кансалідацыі пасля звяржэння самаўладдзя ў лютым 1917 г. Паводле Зюзькова, адным з «агульна нацыянальных інстытутаў» буржуазіі быў «Беларускі нацыянальны камітэт, у якім аб'ядналіся прадстаўнікі БСГ, лічыўшыя сябе «левымі», і памешчык Скірмунт, і ксёндз Гандлеўскі»[13]. Таксама аўтар прыгадаў «князя Радзівіла» як фундатара Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК). Варта заўважыць, што для гісторыка 1930-х гг., як і для большасці тагачаснага савецкага грамадства, ужо самі словы «памешчык», «ксёндз» і «князь» мелі выразна адмоўную канатацыю.

Аўтар асуджаў дзеячаў Беларускай сацыялістычнай Грамады (БСГ) за тое, што яны не жадалі працягваць рэвалюцыю паводле ленінскіх лозунгаў, імкнуліся захапіць уладу, каб стварыць «уласную» нацыянальную дзяржаву. Паводле Зюзькова, аб'яднанне БСГ і Скірмунта «адразу адштурхнула ад сябе масы беларускіх рабочых і сялян». Патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў межах Расіі, на ягоную думку, тлумачылася страхам буржуазіі, што «адна яна не здолее спыніць пралетарскі рух і рэвалюцыю». Вельмі крытычна і эмацыйна ацэньвалася праграма БНК, асабліва ў раздзелах, што датычылі аграрнага і канфесійнага пытанняў, стаўлення да вайны і надзей на Устаноўчы сход. «Дык чаго можна было і чакаць ад ксяндзоў, папоў, паноў, памешчыкаў і іх лёкаяў, хоць большасць з іх і звала сябе "соцыялістамі?"»[14] – рытарычна запытваў аўтар. Ён пераконваў чытачоў, што

---

[12] Андрэй Зюзькоў (1904–1938) падзяліў трагічны лёс тых «нацдэмаў», з якімі ён зацята змагаўся на старонках сваіх кніг. У лістападзе 1937 г. ён быў арыштаваны НКВД, а ўлетку 1938 г. расстраляны ў Менску.

[13] А. Зюзькоў, *Беларускія нацдэмы – супроць Кастрычніка* (у:) Кастрычнік на Беларусі. Мінск, 1934, с. 100 Ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага ён называў «Гандлеўскім».

[14] Тамсама.

толькі «партыя Леніна і Сталіна», а таксама «дапамога больш перадавога рускага пралетарыяту» дазволілі рабочым і працоўным сялянам Беларусі стварыць БССР. Беларуская Народная рэспубліка (БНР) наогул не згадвалася.

Ужо ў пасляваенны час пра БНР як «буржуазна-памешчыцкую дзяржаву» пісала Ніна Каменская (1913–1986) у *Гісторыі Беларускай ССР* (том 2, 1958). Яна характарызавала нацыянальных дзеячаў як «верных паслугачоў» нямецкіх акупантаў, якія «імкнуліся парваць шматвяковыя сувязі працоўных мас Беларусі і Расіі і ператварыць Беларусь у калонію капіталістычных дзяржаў». Каменская сцвярджала, што ў ліпені 1918 г. «крайні рэакцыянер і памешчык» Раман Скірмунт узначаліў «Часовы ўрад Беларусі», які дапамагаў акупантам «падаўляць рэвалюцыйны рух рабочых і сялян»[15]. Гэты тэзіс быў паўтораны ў рускамоўным выданні гэтай кнігі (1961). Праўда, у тэксце ўжо адсутнічала згадка пра несавецкую форму беларускай дзяржаўнасці[16].

Варта адзначыць першую публікацыю дакументаў пра стварэнне БНК і ягоныя мэты ў зборніку *Революционное движение в России после свержения самодержавия. Документы и материалы* (Москва, 1957). Там была змешчана інфармацыя газеты «Речь» (Петраград) пра сакавіцкі з'езд беларускіх арганізацый у Менску (1917), стварэнне БНК і ягоную дэкларацыю ў падтрымку Часовага ўрада. Таксама публікавалася *Докладная записка делегации Белорусского национального съезда* ад 14 красавіка 1917 г. з інфармацыяй пра рашэнні з'езда, падпісаная Раманам Скірмунтам і яшчэ шасцю сябрамі дэлегацыі[17]. У дакуменце гаворка ішла галоўным чынам пра неабходнасць беларусізацыі сістэмы адукацыі і паскораны ўвод установаў земскага і гарадскога самакіравання на дэмакратычных пачатках. Гэтыя дакументы не суправаджаліся каментарамі і стваралі цалкам пазітыўны вобраз дзеячаў беларускага руху, у т. л. Рамана Скірмунта. Аднак маскоўская публікацыя нічога не змяніла ў ацэнках гісторыкаў у БССР, якія ішлі ў першых шэрагах змагароў з «беларускім буржуазным нацыяналізмам».

Любімым сюжэтам некалькіх пакаленняў гэтых гісторыкаў былі згадкі пра сялянскія хваляванні ў маёнтку Скірмунтаў у в. Пінкавічы (Пінскі пав.) увосень 1905 г., у якіх удзельнічаў мясцовы настаўнік Канстанцін Міцкевіч (*Якуб Колас*). Звычайна, адзначалася, што памешчык Скірмунт не прыняў патрабаванняў, і сяляне пачалі самавольную лоўлю рыбы ў возеры[18].

---

[15] *Гісторыя Беларускай ССР.* Т. II. Пад рэд. І. С. Краўчанкі, Н. В. Каменскай. Мінск 1958, с. 93.

[16] *История Белорусской ССР в 2-х т.* Второе доп. изд. Под ред. Л. Абецедарского, Т. Горбунова и др. Т. 2. Минск 1961, с. 103.

[17] *Революционное движение в России после свержения самодержавия. Документы и материалы.* Под ред. Л. С. Гапоненко. Москва 1957, с. 739, 746.

[18] *Гісторыя Беларускай ССР.* Т. І. Пад рэд. В. Н. Перцава, К. І. Шабуні, Л. С. Абэцадарскага. Мінск 1955, с. 379; *История Белорусской ССР в 2-х т.* Второе доп. изд. Под ред. Л. Абецедарского, Т. Горбунова и др. Т. 1. Мінск 1961, с. 504; Л. Абэцадарскі, *У святле*

Канстанцін Шабуня ў манаграфіі, прысвечанай сялянскаму руху ў Беларусі падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг., прывёў кароткія звесткі пра хваляванні ў в. Моладава (Кобрынскі пав.), падчас якіх сяляне фактычна паралізавалі жыццё маёнтка Скірмунтаў. Адзначалася, што пры падаўленні гэтых хваляванняў быў забіты селянін і былі параненыя[19]. Ён жа паведаміў, што сяляне спынілі працу на ўсіх прадпрыемствах «памешчыка Скірмунта» ў Парэччы (Пінскі пав.) і выступілі з «эканамічнымі патрабаваннямі»[20].

Дарэчы, суконная фабрыка Аляксандра Скірмунта ў Парэччы часта прысутнічала ў беларускай гістарыяграфіі як ілюстрацыя да раздзелаў, прысвечаных эканамічнаму развіццю[21]. Таксама ў томе 1 *Гісторыі Беларускай ССР* (1972) фігуравала нібыта выява «сядзібы памешчыка Скірмунта першай паловы XIX ст. Пінскі павет»[22]. Насамрэч, на рэпрадукцыі можна было ўбачыць палац Сымона Скірмунта ў в. Моладаве Кобрынскага пав.

Трэба адзначыць, што звычайна гісторыкі карысталіся толькі прозвішчам Скірмунта, не згадваючы імя прадстаўніка роду. У выніку ў беларускай савецкай гістарыяграфіі з'явіўся нейкі «бессмяротны» Скірмунт, які з канца XVIII і да пачатку XX ст. прыгнятаў сялян і рабочых, душыў сялянскія хваляванні, узначальваў беларускіх «буржуазных нацыяналістаў» і вёў «контррэвалюцыйную дзейнасць». Так, напр., М. Матусевіч, характарызуючы канцэнтрацыю капіталаў у Беларусі, прывёў прыклад «памешчыка Скірмунта» з Пінскага пав., якому належала «пяць вінакурных, дрожджава-вінакурны, соладавы, піваварны, лесапільны і шкіпінарны заводы»[23].

Толькі Канстанцін Шабуня вярнуў «Скірмунту» імя, дакладней ініцыялы. Распавядаючы пра выбары ў I Дзяржаўную Думу (1906), ён паведаміў пра абранне «буйнога памешчыка Р. А. Скірмунта». Упершыню ў гістарыяграфіі Раман Аляксандравіч Скірмунт быў згаданы не ў сувязі з «контррэвалюцыйнай дзейнасцю». Паводле К. Шабуні, у Думе ён «абараняў прынцып недатыкальнасці прыватнай уласнасці на зямлю і, прыкідваючыся прыхільнікам інтарэсаў сялянства, абараняў іх зямельную ўласнасць»[24]. Пры гэтым гісторык коратка пераказаў асноўныя аргументы дэпутата, які сцвярджаў, што ліквідацыя прыватнай уласнасці на зямлю абернецца панаваннем бюракратыі, пазбавіць сялянства заробкаў,

---

неабвержных фактаў. Мінск 1969, с. 104; *Гісторыя Беларускай ССР*. У пяці тамах. Пад рэд. І. М. Ігнаценкі ды інш. Т. 2. Мінск 1972, с. 380.

19 К. Шабуня, *Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг.* Мінск 1962, с. 284. Даследчык выкарыстаў матэрыялы перыядычнага друку. Насамрэч, забітых у Моладаве не было (заўвага – *А. С.*).

20 Тамсама, с. 274.

21 Гл., напр. *История Белорусской ССР в 2-х т.* Т. 1, с. 382.

22 *Гісторыя Беларускай ССР*. У пяці тамах. Пад рэд. І. М. Ігнаценкі ды інш. Т. 1, с. 550.

23 Тамсама. Т. 2, с. 249.

24 К. Шабуня, *Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии...*, с. 352, 367.

прывядзе дзяржаву да эканамічнага крызісу і банкроцтва, і, нарэшце, створыць небяспечны прэцэдэнт для выступаў за адмену прыватнай уласнасці на іншыя сродкі вытворчасці. Таксама быў адзначаны намер Рамана Скірмунт «па меры магчымасці садзейнічаць паляпшэнню сялянскай гаспадаркі і павялічэнню плошчы землеўладанняў»[25]. Фактычна, гісторык даў магчымасць чытачу пазнаёміцца з крытычнай ацэнкай наступстваў сацыялістычных пераўтварэнняў у вёсцы.

Але падобны падыход быў рэдкім у беларускай савецкай гістарыяграфіі. Выразна дамінавала пазіцыя, сфармуляваная ў *Очерках истории Коммунистической партии Белоруссии* (1968). Старонкі гэтых нарысаў, прысвечаныя падзеям 1917–1918 гг., сёння немагчыма чытаць без абурэння. Ужо згаданая Ніна Каменская характарызавала БНК як «контрреволюционный комитет», а БСГ называла «кучкой политических авантюристов, перешедших затем на службу иностранных разведок», «социал-предателями»[26]. Першы Усебеларускі з'езд снежня 1917 г. ацэньваўся як «заговор черносотенных элементов против Советской власти». Сцвярджалася існаванне ў ліпені 1918 г. нейкага «Часовага ўрада Беларусі» (?!) на чале з «крайним реакционером помещиком Скирмунтом». Паводле Каменскай, Рада БНР «раболепствуя перед немцами, в тоже время обратилась к правительству США и предложила американским империалистам купить богатства Белоруссии [...] Ненавидя Советскую власть, буржуазные националисты готовы были превратить Белоруссию в колонию иностранных империалистов»[27]. Тут і каментары не патрэбныя...

Адзін з найбольш вядомых і ўплывовых у 1960–70-я гг. савецкіх гісторыкаў Лаўрэнці Абэцэдарскі (1916–1975) таксама далучыўся да кампаніі пасмяротнай расправы з Раманам Скірмунтам і дзеячамі беларускага руху. Па даручэнні ўлады ён выступіў з крытыкай «буржуазных фальсіфікатараў гісторыі» ў брашуры *У святле неабвержных фактаў* (Мінск, 1969), якая выйшла накладам у 30 тыс. асобнікаў (!).

Аўтар прыгадаў Рамана Скірмунта ў раздзеле, прысвечаным «развянчанню міфа гітлераўскіх паслугачоў» наконт адсутнасці беларускай буржуазіі. Падчас гэтага «развянчання» гісторык прыгадаў, што «буйныя землеўласнікі Скірмунты» былі «сапраўднымі прадпрыемцамі, капіталістамі». Раман Скірмунт быў згаданы як кіраўнік «контррэвалюцыйнага, самазванага Беларускага Нацыянальнага камітэту». Абэцэдарскі таксама распавёў пра канфлікт Р. Скірмунта з сялянамі в. Альшанка ў 1912 г., падчас якога нібыта «ў крывавых стычках з паліцэйскімі,

---

[25] Тамсама, с. 367.

[26] *Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии.* В 2-х частях. Часть 1. Минск 1968, с. 287–288.

[27] Тамсама, с. 414–415.

сцягнутымі з усяго павету на абарону маёмасці Скірмунта, многа сялян было цяжка паранена»[28].

Гэтыя ж ацэнкі палітычнай дзейнасці Рамана Скірмунта былі паўтораныя Верай Гняўко на старонках тома 3 *Гісторыі Беларускай ССР*[29]. У гэтым жа томе Н. Каменская ў раздзеле «Партызанскі рух на акупаванай тэрыторыі Беларусі» сцвярджала існаванне ў Менску ў лістападзе 1919 г. нейкага «Беларускага нацыянальнага камітэту на чале з памешчыкам Скірмунтам». Паводле аўтаркі, «у рабоце гэтага камітэту актыўна ўдзельнічалі ярыя ворагі беларускага народу Варонка, Аляксюк, Ластоўскі і інш. БНК дапамагаў акупантам занявольваць беларускі народ, рабаваць яго нацыянальныя багацці». Старонкі гэтай кнігі, дзе разглядаюцца пытанні дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1917–1920 гг. перапоўнены ненавісцю да дзеячаў беларускага руху як іншадумцаў.

Пытанне пра тое, каму было патрэбнае гэтае гістарыяграфічнае забойства Рамана Скірмунта, гучыць рытарычна. Расійскі гісторык Юры Афанасьеў вельмі трапна ахарактарызаваў савецкую гістарычную навуку як асобны навукова-палітычны феномен, гарманічна ўпісаны ў сістэму таталітарнай дзяржавы і прыстасаваны да абслугоўвання яе ідэйна-палітычных патрэб[30]. Камуністычная ўлада, якая нясе адказнасць за фізічнае забойства Рамана Скірмунта, паклапацілася і пра тое, каб ён застаўся ў памяці як сімвал прыгнёту і як абагульнены вобраз ворага беларускага народу.

Людзі, якія выконвалі гэтую замову, звычайна самі не лічылі сваю працу навуковай дзейнасцю. Можа не варта было пісаць пра гэтыя прапагандысцкія клішэ? Але ж адгалоскі той даўняй ідэалагічнай вайны з беларускай нацыянальнай ідэяй чуваць і сёння. Прычым яны адчувальныя нават у працах, што прэтэндуюць на самы высокі ўзровень прафесіяналізму. Так, падфарбаваныя савецкія тэзісы гісторыі беларускай дзяржаўнасці відавочныя ў апошніх працах вядомага беларускага гісторыка Вадзіма Круталевіча (1922–2006). У манаграфіі *История Беларуси: Становление национальной державности* (Менск, 1999) аўтар заявіў, што да паняцця беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. маюць дачыненне толькі БССР і сучасная Рэспубліка Беларусь. Вытокі гэтай дзяржаўнасці, паводле В. Круталевіча, у Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Гісторык шырока цытаваў бальшавіцкія выпады супраць БНР, сцвярджаў, што Рада БНР дыскрэдытавала сябе «угодничеством перед немецкими властями», падкрэсліваў «условность» тэрмінаў «Белорусская Народная республика», «Рада БНР» і паўтараў вядомую савецкую формулу: «БНР не состоялась».

Раман Скірмунт неаднаразова згадваўся ў кнізе. У прыватнасці, аўтар паведаміў, што на чале БНК у сакавіку 1917 г. стаў «крупный помещик Р. Скирмунт». У лютым

---

[28] Л. Абэцэдарскі, *У святле неабвержных фактаў*. Мінск 1969, с. 104.

[29] *Гісторыя Беларускай ССР*. У пяці тамах. Пад рэд. І. М. Ігнаценкі ды інш. Т. 3, с. 15.

[30] Ю. Афанасьев, *Феномен советской историографии* (у:) Советская историография. Москва 1996, с. 37.

1918 г. падчас «активизации буржуазно-помещичьих кругов» ён увайшоў у Камітэт Менскага народнага прадстаўніцтва (Беларускага народнага прадстаўніцтва), які імкнуўся наладзіць супрацу з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ды інш.[31] У кнізе выразна дамінавалі ацэнкі і тэрміналогія гістарыяграфіі СССР/БССР.

Другая палова 1990-х – пачатак 2000-х гг. у беларускай гістарыяграфіі, прадстаўленай дзяржаўнымі інстытутамі, сталі перыядам рэанімацыі савецкіх ідэалагічных канцэптаў. Асабліва выразна гэта праявілася ў ацэнках ролі БНР і БССР у гісторыі дзяржаўнасці, а таксама ў трактоўцы польска-беларускіх адносін першай паловы XX ст. Яскравым прыкладам рэсаветызацыі гістарычнай навукі стаў зборнік дакументаў і матэрыялаў *Польша-Беларусь. 1921–1953* (2-е изд. Ред. А. А. Каваленя и др., Минск 2013). Ужо ў ананімнай прадмове (*Предисловие*, с. 3–27) падзел Беларусі на перамовах у Рызе тлумачыўся выключна імперскімі амбіцыямі польскіх палітыкаў, а эліта Польскай дзяржавы абвінавачвалася ў імкненні «развалить и расчленить СССР». Палітычнае жыццё ў міжваеннай Польшчы параўноўвалася з нацысцкай Германіей (?!), а агрэсія СССР у верасні 1939 г. тлумачылася імкненнем савецкага кіраўніцтва «прийти на помощь белорусам и украинцам». Адпаведна гэтым тэзісам былі падабраныя гістарычныя дакументы і матэрыялы. Міжволі прыгадваюцца словы аднаго з класікаў сусветнай гістарыяграфіі французскага гісторыка Люсьена Февра: «Самы агідны тып хлусні – гэта хлусня, якая абапіраецца на гістарычныя факты».

Выключна як спробу рэсаветызацыі трэба расцэньваць шматлікія выказванні беларускіх «гісторыкаў на пасадах» адносна значэння кастрычніцкіх падзей 1917 г. для айчыннай гісторыі. 100-годдзе Расійскай рэвалюцыі зноў актуалізавала гэтае пытанне. Напрыклад, чытаючы адказы С. Трацціяка, М. Смальянінава, В. Гігіна, І. Марзалюка на пытанне карэспандэнта БелТА пра ролю і значэнне «Кастрычніцкай рэвалюцыі», нібыта вяртаешся ў 1987 г. Добра знаёмая савецкая ідэалагічная «жуйка»: «Октябрьская революция освободила народы от социально-экономического и национального гнета», «Октябрьская революция открыла для Беларуси практический путь к созданию своего государства», «Современная Беларусь – прямой наследник и правопреемник БССР, а БССР стала возможна только после Октябрьской революции»[32]. Быццам і не было амаль 30 гадоў развіцця гістарыяграфіі незалежнай Беларусі…

Пэўныя навацыі ў трактоўцы БНР з'явіліся толькі ў пачатку 2018 г, калі «прыдворныя гісторыкі» падкінулі грамадству ідэю «двух вытокаў» незалежнасці, звя-

---

[31] В. Круталевич, *История Беларуси: становление национальной державности*. Мінск, 1999, с. 22, 45, 204. Варта адзначаць, што на пачатку 1990-х гг. у працах В. Круталевіча фігуравалі больш аб'ектыўныя ацэнкі БНР і яе палітычных лідэраў (заўвага – *А. С.*).

[32] *Сто лет Октября: эксперты о достижениях и уроках революции 1917 года*. Рэжым доступу: http://www.belta.by/society/view/sto-let-oktjabrja-eksperty-o-dostizhenijah-i-urokah-revoljutsii-1917-goda-274565-2017/. Дата доступу: 03. 01 2018.

заных з БССР і БНР. Відавочна, што гэты праект нарадзіўся пры актыўным удзеле дзяржаўных чыноўнікаў з аддзелаў ідэалогіі. Агучаны ён быў І. Марзалюком падчас «круглага стала» ў рэдакцыі газеты «Звязда» ў студзені 2018 г. Між іншым, Марзалюк сцвярджаў, што «с начала 1918 г. в белорусском движении существовали и соперничали два течения – «белнацкомовцы» и «бэнээровцы». Каждое из этих течений отрицало другое, обвиняя в измене белорусскому делу и белорусскому народу. Объективно же – и те, и другие работали на благо Беларуси, стремились к созданию белорусской государственности»[33].

Насамрэч, у гэтай «навацыі» хаваецца чарговая ідэалагічная хлусня. Даследчыкі ведаюць, што галоўнай мэтай стварэння бальшавікамі Беларускага нацыянальнага камісарыяту і пазнейшага абвяшчэння БССР была якраз барацьба супраць ідэі незалежнасці Беларусі і тых людзей, якія спрабавалі яе ажыццявіць. БССР ствараліся толькі дзеля таго, каб ніколі не паўстала незалежная Беларусь.

Пра ўсё гэта, магчыма, не варта было б і казаць, але рэсаветызацыя гістарычнай навукі ў Беларусі непасрэдна датычыць асобы Рамана Скірмунта і вяртання яго імя ў прастору беларускай культурнай памяці.

Вяртанне з нябыту

Напачатку 1990-х гг. пачалі з'яўляцца даследаванні, аўтары якіх спрабавалі пераасэнсаваць ролю Рамана Скірмунта ў беларускай гісторыі, аспрэчвалі савецкі вобраз «Скірмунта-прыгнятальніка», а таксама імкнуліся зразумець стаўленне палітыка да беларускага руху.

Адным з першых быў вядомы беларускі гісторык і публіцыст Янка Запруднік. Выступаючы на канферэнцыі «Фарміраванне і развіццё нацыянальнай свядомасці беларусаў» (Маладэчна, 1992) з рэфератам «Дваранства і беларуская мова», ён высока ацаніў крытычную пазіцыю Рамана Скірмунта як дэпутата Дзяржаўнай Думы адносна праектаў нацыяналізацыі зямлі, а таксама сцвердзіў беларускасць палітыка, які быў толькі «ўзгадаваны ў польскай культуры». Паводле Янкі Запруднікa, прыклад Скірмунта ды некаторых іншых прадстаўнікоў беларускіх губерняў у Думе сведчыць пра тое, што «беларускасць у розных формах і з рознай ступеньню інтэнсыўнасьці праяўлялася сярод розных сацыяльных пластоў, у тым ліку сярод дваранства [...] Гэта значыць, што беларускі нацыянальна-гістарычны гмах другой паловы XIX ст. ня быў канчаткова зруйнаваны аж да свайго сацыяльнага падмурку – сялянства, а былі яшчэ ў ім сьцены і нават крыху даху»[34].

---

[33] *1918-й год для нашей государственности: приобретения и потери.* Рэжым доступу: http://house.gov.by/ru/interview-ru/view/1918-y-god-dlja-nashaj-dzjarzhaunastsi-nabytki-i-straty–3551/. Дата доступу: 27.04.2018.

[34] Тэкст рэферату быў апублікаваны ў зборніку *Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 2: Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.* Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Маладзечна, 19–20 жніўня 1992 г.). Мінск 1992,

Першая сустрэча аўтара гэтай кнігі з Раманам Скірмунтам адбылася падчас працы над дысертацыяй *Польскі грамадска-палітычны рух у Беларусі і Літве напярэдадні і падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг.* (навуковы кіраўнік праф. Міхась Біч). Адной з першых публікацый быў артыкул *Раман Скірмунт: шлях да Беларусі* (1994), у якім разглядалася паступовая эвалюцыя светапогляду палітыка, які пачынаў дзейнасць як прадстаўнік «краёвай» плыні польскага руху, а ў 1916 г. далучыўся да беларускага Адраджэння і стаўся адным з ягоных лідэраў[35]. У шэрагу іншых маіх публікацый, прысвечаных феномену краёвасці, аналізаваліся погляды Скірмунта як аднаго са стваральнікаў кансерватыўнага (кансерватыўна-ліберальнага) накірунку гэтай ідэалогіі[36].

Пазней аб'ектам увагі сталі іншыя аспекты жыцця палітыка, звязаныя з беларускім нацыянальным рухам, у т. л. з дзейнасцю на чале Беларускага нацыянальнага камітэта і ў якасці сябра Рады БНР, паўсядзённым жыццём у Парэччы ў 1920–1930-я гг. уключна са спробай рэканструкцыі сродкамі вуснай гісторыі абставін трагічнай смерці, а таксама радавод Скірмунтаў[37]. Адначасна з навуковымі даследаваннямі праводзілася публічная дзейнасць па азнаямленню грамадскасці з асобай Рамана Скірмунта. Так, на працягу 2013–2018 гг. чыталіся

с. 29–36. Цытата паводле публікацыі: Я. Запруднік, *Дваранства і беларуская мова* (у:) *З гісторыяй на «Вы»*. Выпуск 3. Мінск 1994, с. 339–340.

35 А. Смалянчук, *Раман Скірмунт: шлях да Беларусі*, «Спадчына». 1994, № 6, с. 6–10 (артыкул рыхтаваў да друку Вінцук Вячорка).

36 Напр., А. Смоленчук, *Историческое сознание и идеология поляков Белоруссии и Литвы в начале XX в.*, «Славяноведение». 1997, № 3, с. 100–105; ён жа, *Краёвасць у беларускай і літоўскай гісторыі*, «Беларускі гістарычны агляд». 1997. Т. 4, сш. 1–2(6–7), с. 56–67; ён жа, *Ewolucja ideologii krajowej w społeczno-politycznej działalnosci Romana Skirmunta (1905–1921)* (у:) *Krajowosc – tradycje zgody narodow w dobie nacjonalizmu*. Materiały z międzynarodowej konferencji naukowej w Instytucie Historii UAM w Poznaniu (11–12 maja 1998). Pod redakcją Jana Jurkiewicza. Poznan 1999, s. 267–280; ён жа, *Беларускі нацыянальны рух і краевая ідэя*, «Białoruskie Zeszyty Historyczne». 2000, Nr 14, с. 45–53; ён жа, *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г.* 2-е выд. Санкт-Петербург 2004, 402 с.; ён жа, *«Краевая ідэя» ў беларускай гісторыі*. Мінск 2017, 460 с. ды інш.

37 Напр., А. Смалянчук, *«Пакажэце ўсяму сьвету, што жыве Беларусь…» Раман Скірмунт (1868–1939) і дзейнасць Беларускага Нацыянальнага камітэту ў сакавіку – траўні 1917 г.* «Гадавік Цэнтра Беларускіх студыяў». 2016, № 2, с. 175–198; ён жа, *Жыццё і смерць Рамана Скірмунта (паводле вусных успамінаў жыхароў Піншчыны)*, «Białoruskie Zeszyty Historyczne». 2002. Т. 18, s. 214–222; ён жа, *Род Скірмунтаў у беларускай гісторыі*, «Białoruskie Zeszyty Historyczne». 2004. Т. 21, s. 169–177; ён жа, *«Добры быў пан...» Раман Скірмунт у вусных успамінах жыхароў в. Парэчча Пінскага раёну*, «Спадчына». 2002. № 5–6, с. 96–103 (разам з Алесяй Сідлярэвіч); ён жа, *Палеская вёска ў стасунку да пана* (у:) А. Смалянчук, *Беларуская гісторыя: знайсці чалавека*. Мінск 2013, с. 138–154 ды інш.

публічныя лекцыі, арганізацыі якіх паспрыяў Лятучы ўніверсітэт у Менску (каардынатар Таццяна Вадалажская) , Цэнтр гарадскога жыцця ў Гародні (кіраўнік Павел Мажэйка), праект «Мова нанова» (арганізатары Алеся Літвіноўская і Глеб Лабадзенка), Беларускі калегіум (каардынатары Ірына Дубянецкая і Аляксей Ластоўскі) ды інш.[38]

Гаспадарчыя аспекты дзейнасці сям'і Скірмунтаў на Палессі ўзняў у шэрагу артыкулаў даследчык гісторыі прадпрымальніцтва Андрэй Кіштымаў. Дзякуючы ягоным працам, у беларускай гістарыяграфіі прадстаўлены феномен прамысловага цэнтра Скірмунтаў у Парэччы і Моладаве, стварэнне якога распачаў яшчэ Аляксандр Скірмунт (1799–1870) на пачатку 1830-х гг.[39]

На рубяжы стагоддзяў артыкулы, прысвечаныя дзейнасці Рамана Скірмунта публікаваліся на старонках «Гістарычнага альманаха» (рэд. Аляксандр Краўцэвіч). У першую чаргу трэба адзначыць грунтоўнае даследаванне палітычнай біяграфіі нашага героя ў 1917–1918 гг., праведзенае Станіславам Рудовічам. Ён здолеў акрэсліць асноўныя вехі палітычнай кар'еры Рамана Скірмунта як беларускага дзеяча, выкарыстаўшы раней невядомыя гістарычныя крыніцы. Аўтар паказаў трагізм дзейнасці «беларускага дзеяча з вялікіх паноў» у складаных умовах Першай сусветнай вайны, абцяжараных супрацьстаяннем з прадстаўнікамі сацыялістычнай плыні беларускага руху[40]. Таксама варты ўвагі артыкул даследчыка з Пінска Аляксандра Ільіна, прысвечаны ўдзелу Рамана Скірмунта ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Піншчыны ў 1920–1930-х гг.[41]

С. Рудовіч быў таксама аўтарам біяграмы Рамана Скірмунта, змешчанай на старонках *Энцыклапедыі гісторыі Беларусі* (том 6, кніга 1)[42]. У гэтым самым томе быў апублікаваны артыкул пра род Скірмунтаў Уладзіслава Вяроўкіна-Шэлюты[43].

Як бачна, беларуская постсавецкая гістарыяграфіі паступова пераадольвае спадчыну савецкіх часоў у трактоўцы ролі Рамана Скірмунта ў айчыннай гісторыі.

---

[38] Гл., напр., Жыццяпіс Рамана Скірмунта як выклік для гісторыка. Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=uZZfYDRoeRo. Дата доступу: 27.04.2018.

[39] А. Киштымов, *Скирмунты–династия предпринимателей*, «Деловой вестник». 1994, № 9–10, с. 32; он же, *Западнополесская династия Скирмунтов XIX–XX вв.* (у:) *Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёну Беларусі*. Рэд. С. В. Арцёменка ды інш. Брэст 1998, с. 88–92; он же, *Аляксандр Скірмунт (1799–1870)* (у:) *Славутыя імёны Бацькаўшчыны*. Выпуск 2. Мінск, 2003, с. 374–380.

[40] Рудовіч С. *«...Беларускі дзеяч з вялікіх паноў». Эпізоды палітычнай біяграфіі Рамана Скірмунта*, «Гістарычны альманах». 1999. Том 2, с. 20–57.

[41] А. Ільін, *Раман Скірмунт у грамадска-палітычным і культурным жыцці Піншчыны ў 20–30-х гг. 20 ст.*, «Гістарычны альманах». 2003. Том 8, с. 98–106.

[42] С. Рудовіч, *Скірмунт Раман Мар'ян Аляксандравіч* (у:) *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*. Том 6. Кніга 1. Мінск 2001, с. 321.

[43] У. Вяроўкін-Шэлюта, *Скірмунты* (у:) *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*. Том 6. Кніга 1, с. 321–322.

З «ворага беларускага народа» ён ператварыўся ў аднаго з ягоных лідэраў у важны перыяд гісторыі. З дзейнасцю Скірмунта пачалі звязваць альтэрнатыўны шлях развіцця Беларусі. Відавочная свайго роду нацыянальная прыватызацыя чалавека, які, насамрэч, быў не толькі палітыкам і думаў не толькі пра Беларусь...

Значную ролю ў аднаўленні памяці пра Рамана Скірмунта адыгралі краязнаўцы Піншчыны. Гэта ўжо згаданы рэдактар часопіса «Гістарычная брама» Аляксандр Ільін, супрацоўнік аддзела культуры Пінскага гарвыканкаму Эдуард Злобін, журналісты Вячаслаў Ільянкоў і Зміцер Кісель, настаўніца з Парэчча Антаніна Сідарук, настаўнік Валеры Кучынскі ды інш. Так, Вячаслаў Ільянкоў на старонках газеты «Пінскі веснік» (1992) змясціў кароткі нарыс гісторыі палескай галіны роду Скірмунтаў і адным з першых паспрабаваў аднавіць карціну забойства ў Парэччы, запісаўшы вусныя ўспаміны старэйшых вяскоўцаў[44].

Намаганнямі краязнаўцаў пры ўдзеле Тэрэзы Скірмунт з Варшавы і падтрымцы мясцовых уладаў была ўшанавана памяць Скірмунтаў у Моладаве і Парэччы. 2 жніўня 1992 г. у парку былога Парэцкага маёнтка быў усталяваны крыж з надпісам на польскай мове[45]. Пазней намаганнямі беларускіх суполак на меркаванай магіле Рамана і Баляслава Скірмунтаў быў усталяваны яшчэ адзін крыж з надпісам па-беларуску.

Захавальніцай памяці пра парэцкіх Скірмунтаў стала жыхарка Парэчча Антаніна Паўлаўна Сідарук, якая таксама кіруе музеем, прысвечаным жыццю і творчасці славутай беларускай паэткі Яўгеніі Янішчыц (1948–1988). Музей месціцца ў Парэцкай школе, а яго кіраўніцу не пакідае надзея на стварэнне музея памяці Рамана Скірмунта. Пры непасрэдным удзеле А. Сідарук у 2012 г. на ўскрайку Парэцкага парку была ўсталяваная шыльда з надпісам: *У в. Парэчча нарадзіўся і жыў вядомы беларускі палітычны і грамадскі дзеяч Раман Аляксандравіч Скірмунт (7. 05. 1868–7. 10. 1939).*

У 2009 г. сябры Беларускага гістарычнага таварыства сабралі сродкі на шыльду памяці Рамана Скірмунта як «патрыёта Беларуска-Літоўскага краю і кіраўніка ўрада БНР (1918)». У наступным годзе гарадзенскі скульптар Уладзімір Панцялееў вырабіў шыльду з выявай палітыка і грамадскага дзеяча. Яе ўсталяванне планавалася ў касцёле св. Сымона і св. Алены ў Менску. Аднак напярэдадні ўрачыстасці яна была адменена па незалежным ад арганізатараў прычынам. Сёння шыльда ўпрыгожвае сцены грэка-каталіцкай царквы ў Івацэвічах (Берасцейская вобл.).

Таксама трэба адзначыць працы польскіх даследчыкаў. Так, біяграма Рамана Скірмунта змешчана ў Польскім слоўніку біяграфічным (ПСБ), дзе наогул род Скірмунтаў прадстаўлены даволі шырока. Аўтары біяграмы Чэслаў Бжоза і Каміль Стэпан стварылі панарамную карціну яго дзейнасці як польскага палітыка, фраг-

---

[44] В. Ильенков, *Скирмунты*, «Пінскі веснік». 1992, 27 студзеня; ён жа. *Трагедия Скирмунтов*, «Пінскі веснік». 1992, 25 сакавіка.

[45] Б. п., *На магіле прэм'ера БНР*, «Свабода». 1992, № 7–8.

ментарна засяродзіўшы ўвагу на «краёвых» поглядах і дзейнасці ў беларускім руху 1917–1918 гг.[46]

У ПСБ таксама змешчаны біяграмы дэпутата Пастаяннай Рады Рэчы Паспалітай Адама Скірмунта (другая палова XVIII ст. – каля 1820 г.)[47], стваральніка прамысловага цэнтра ў Моладаве і Парэччы Аляксандра Скірмунта (1799–1870)[48], мастачкі Алены Скірмунт (1827–1874)[49], ксяндза і кананічнага дарадцы пасольства Польшчы ў Ватыкане Казіміра Скірмунта (1861–1931)[50], літаратара і кампазітара Генрыка Скірмунта (1868–1939)[51], палітыка і дыпламата Канстанціна Скірмунта (1866–1949), грамадскай дзяячкі і «краёвай» публіцысткі Канстанцыі Скірмунт (1851–1934)[52].

Беларуская палітычная дзейнасць Рамана Скірмунта была прадстаўлена на старонках кнігі, прысвечанай гісторыі БНР, даследчыцы з Торуня Дароты Міхалюк[53]. Яна пазначыла асноўныя вехі гэтай дзейнасці, апофеозам якой лічыла стварэнне ўрада БНР на чале са Скірмунтам. Імя Рамана Скірмунта таксама згадваецца ў публікацыях, датычных дзейнасці іншых прадстаўнікоў роду Скірмунтаў першай трэці XX ст., у прыватнасці згаданых Канстанціна[54] і Канстанцыі Скірмунт[55].

Таксама варта адзначыць працы літоўскіх і польскіх даследчыкаў, у якіх разглядаецца феномен краёвай ідэі і аналізуюцца погляды асобных краёўцаў. Без гэтых даследаванняў немагчыма зразумець той ідэйны кантэкст, у якім адбывалася

---

[46] Cz. Brzoza, K. Stepan, *Skirmunt Roman (1868–1939)* (y:) *Polski słownik biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158. Warszawa-Krakow 1998, s. 184–187.

[47] E. Zielińska, *Skirmunt Adam (2. poł. XVIII w.)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*. T. XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 173–174.

[48] St. Konarski, *Skirmunt Aleksander (1798–1870)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*. T. XXXVIII/2, zeszyt 158, s. 174–175.

[49] J. Polanowska, *Skirmuntowa (Skirmunttowa, Skirmuntt) Helena (1827–1874)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 187–189.

[50] H. Fokcinski, *Skirmunt Kazimierz (1861–1931)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*. T. XXXVIII/2, zeszyt 158, s. 177–178.

[51] Z. Dernałowicz, *Skirmunt (Skirmuntt) Henryk (1868–1939)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 175–177.

[52] M. Nowik-Kiełbikowa, *Skirmunt (Skirmuntt) Konstanty (1866–1949)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 178–183; P. Łossowski, *Skirmuntowna (Skirmuntt) Konstancja (1851–1934)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 189–190.

[53] D. Michaluk, *Białoruska Republika Ludowa 1918–1920. U podstaw białoruskiej panstwowosci*. Toruń 2010.

[54] M. Nowik-Kiełbikowa, *Konstanty Skirmunt. Polityk i dyplomata*. Warszawa, 1998; K. Skirmuntt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*. Wstęp i opracowanie Ewa Orlof, Andrzej Pasternak. Rzeszów 1997.

[55] D. Szpoper, *Gente Lithuana, natione Lithuana. Mysl polityczna i działalnosc Konstancji Skirmunt (1851–1934)*. Gdansk 2009.

палітычная дзейнасць Рамана Скірмунта. У першую чаргу неабходна прыгадаць даследаванні вядомага польскага гісторыка права Юліуша Бардаха (1914–2010), якія актуалізавалі праблему вывучэння свядомасці «літоўскіх палякаў» XIX – пачатку XX ст. і сталі падмуркам даследавання краёвасці. Пра разуменне гісторыкам важнасці гэтай тэмы сведчыць і тое, што ягоны апошні артыкул таксама быў прысвечаны краёвай ідэі[56].

Адным з «піянераў» даследавання феномену краёвай ідэі з'яўляецца польскі гісторык Ян Юркевіч (Познань). Менавіта ягоная манаграфія, прысвечаная развіццю польскай палітычнай думкі на літоўскіх і беларускіх землях на пачатку XX ст., справакавала рост цікавасці да краёвай ідэі ў Літве і Беларусі[57]. У публікацыях Яна Юркевіча краёвасць атрымала найбольш грунтоўнае асвятленне. У 1998 г. гісторык ініцыяваў міжнародную навуковую канферэнцыю, прысвечаную краёвай ідэі і краёўцам, і быў рэдактарам зборніка яе матэрыялаў[58].

Іншы польскі даследчык Збігнеў Соляк стаў аўтарам грунтоўнага даследавання фарміравання светапогляду і дзейнасці аднаго з стваральнікаў ліберальна-дэмакратычнай плыні краёвасці Міхала Ромэра ў перыяд 1880–1920 гг.[59] Поспех ягоных даследаванняў быў немагчымы без супрацоўніцтва з віленскім асяродкам вывучэння краёвасці, які склаўся ў першай палове 1990-х гг. Трэба прыгадаць даследаванні краёвай ідэі і палітычнай дзейнасці М. Ромэра, праведзеныя літоўскім гісторыкам Рымантасам Мікнісам, і ягоную шматгадовую працу па выданні Дзённіка Міхала Ромэра (1911–1944), публікацыі Дарыюса Сталюнаса, а таксама Яна Савіцкага[60].

---

[56] J. Bardach, *O dawnej i niedawnej Litwie*. Poznan 1988; idem, *Od narodow politycznych do narodow etnicznych w Europie Srodkowowschodniej* (y:) *Mniejszosci narodowe i religijne w Europie Srodkowowschodniej*. Cz. 1. Lublin 1993; idem, *Polacy litewscy a inne narody Litwy historycznej. Proba analizy systemowej* (y:) *Belarus, Lithuania, Poland, Ukraine. The foundations of historical and cultural traditions in East Central Europe*. Internacional Conference Rome, 28 April–6 May. Lublin-Rome 1990; idem, *O krajowcach, krajowosci i patriotyzmie krajowym – dawniej i dzis* (y:) *Księga Wielkiego Księstwa Litewskiego. Ku europejskim tradycjom wspolnotowosci, Sejny 2008, s. 495–531.*

[57] J. Jurkiewicz, *Rozwój polskiej mysli politycznej na Litwie i Białorusi w latach 1905–1922*. Poznan 1983; idem, *Koncepcja krajowa a przemiany stosunkow narodowosciowych na Litwie i Białorusi w początkach XX w. (do 1918 r.)* (y:) *Krajowosc – tradycje zgody narodow w dobie nacjonalizmu*. Materiały z międzynarodowej konferencji naukowej w Instytucie Historii UAM w Poznaniu (11–12 maja 1998). Pod red. J. Jurkiewicza. Poznan 1999, s. 119–134.

[58] *Krajowosc – tradycje zgody narodow w dobie nacjonalizmu...*

[59] Z. Solak, *Między Polską a Litwą. Zycie i działalnosc Michała Romera. 1880–1920*. Krakow 2004.

[60] R. Miknys, *O «Dzienniku» Michała Romera*, «Lithuania». 1998, Nr 4 (29); idem. *Problem kształtowania się nowoczesnego narodu Polakow litewskich w pierwszej połowie XX w.*, «Biuletyn historii pogranicza». 2000. Nr 1, s. 21–32 ды інш.; D. Staliunas, *Tadeusz Wroblewski a idea kulturalnej autonomii personalnej na Litwie na początku XX w.* (y:) *Krajowosc – tradycje zgody*

Палітычную дзейнасць кансерватыўнай плыні краёўцаў закраналі ў сваіх даследаваннях польскія гісторыкі Раман Юркоўскі і Дарыуш Шпопэр[61]. Р. Юркоўскі ў шэрагу даследаванняў грунтоўна ахарактарызаваў светапогляд і палітычныя пазіцыі польскіх землеўласнікаў на беларускіх і літоўскіх землях. Менавіта яму належаць найбольш цікавыя даследаванні дзейнасці аднаго з прызнаных лідэраў «беларускіх палякаў» пачатку XX ст. Эдварда Вайніловіча[62]. Не абмінуў ён увагай і Рамана Скірмунта, які быў калегам і сябрам Вайніловіча. Д. Шпопэр прысвяціў асобнае даследаванне жыццю і дзейнасці Канстанцыі Скірмунт[63].

Варта адзначыць даследаванне краёвай ідэі беларускімі гісторыкамі[64]. Прычым апошнім часам тон задаюць гісторыкі і палітолагі з Інстытута палітычных даследаванняў «Палітычная сфера» (кіраўнік Андрэй Казакевіч). Менавіта па ініцыятыве гэтага асяродку была падрыхтавана электронная анталогія тэкстаў *Краевая ідэя: канец XIX – пачатак XX ст.*[65]

---

narodow w dobie nacjonalizmu..., s. 99–108 ды інш.; J. Sawicki, *Michał Romer a problemy narodowosciowe na ziemiach byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego*. Torun 1998; idem, *Michał Romer wobec problemow narodowosciowych ziem Litewsko-białoruskich na początku XX w.* (y:) *Krajowosc – tradycje zgody narodow w dobie nacjonalizmu...*, s. 71–86 ды інш.

61 D. Szpopper, *Stronnictwo Krajowe Litwy i Białej Rusi: przyczynek do dziejow «koncepcji krajowej» w polskiej mysli konserwatywnej*, «Mysl konserwatywna». Jesień 1997, Nr 1. Idem. *Sukcesorzy Wielkiego Księstwa. Mysl polityczna i działalnosc konserwatystow polskich na ziemiach litewsko-białoruskich w latach 1904–1938*. Gdansk 1999.

62 R. Jurkowski, *Ziemianstwo polskie Kresow Północno-Wschodnich 1864–1904. Działalnosc społeczno-gospodarcza*. Warszawa 2001; idem, *Stronnictwo Konstytucyjno-Katolickie na Litwie i Białorusi w 1906 r. Szkic do dziejow*, «Acta Baltico-Slavica». 1986, t. XVIII, s. 93–118; idem, W *epoce defensywy narodowej. Działalnosc i poglądy społeczno-polityczne Edwarda Woyniłłowicza w latach 1878–1909* (y:) *Polska i Polacy. Studia z dziejow polskiej mysli i kultury politycznej XIX i XX wieku*. Pod red. M. Mroczki. Gdansk 2000; idem, *Sukcesy i porazki. Ziemianstwo polskie Ziem Zabranych w wyborach do Dumy Państwowej i Rady Państwa. 1906–1913*. Olsztyn 2009.

63 D. Szpoper, *Gente Lithuana, Natione Lithuana. Mysl polityczna i działalnosc Konstancji Skirmuntt (1851–1934)*. Gdansk 2009.

64 А. Смалянчук, *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–люты 1917 г.* 2-е выд., дапрац. Санкт-Петербург 2004; ён жа, *«Краевая ідэя» ў беларускай гісторыі*. Мінск, 2017; А. Унучак, *Беларуская нацыянальна-дзяржаўная ідэя ў канцы XIX – 1917 г. (у:) На шляху станаўлення беларускай нацыі. Гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы*. Рэд. В. Яноўская ды інш. Мінск, 2011; ён жа, *«Заходнерусізм» і «краёвасць»: гістарыяграфія пытання* (у:) *Российские и славянские исследования*: Сб. науч. статей. Вып. 5. Редкол.: О. А. Яновский (отв. ред.) и др., Минск 2010, с. 243–252; І. Бабкоў, *Генеалёгія беларускай ідэі*, «Arche», 2005, № 3, с. 136–165; А. Казакевіч, *Яшчэ адна гісторыя пра беларускі нацыяналізм*, «Arche», 2007, № 7, с. 5–22.

65 Анталогія краёвай ідэі канца XIX – пачатку XX ст. Рэжым доступу: http://palityka.org/2015/04/antalohija-krajovaj-idei-xix-xx/. Дата доступу 27. 04. 2018.

Даследаванні беларускіх, літоўскіх і польскіх гісторыкаў стварылі магчымасць для аналізу дзейнасці Рамана Скірмунта на фоне тых палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных перамен, якія адбываліся ў рэгіёне ў перыяд паміж паўстаннем 1863 г. і пачаткам Другой сусветнай вайны.

На жаль, існуючая гістарыяграфія ў самай малой ступені дазваляе зразумець асобу Рамана Скірмунта. Між тым, без разумення жыццёвых і каштоўнасных арыенціраў і матываў ягонай дзейнасці немагчыма прэтэндаваць на глыбокі аналіз грамадскай і палітычнай пазіцыі.

Гэтая кніга з'яўляецца спробай вярнуць у прастору беларускай гістарычнай памяці Рамана Скірмунта не толькі як палітыка трох дзяржаў, ідэолага краёвасці і грамадскага дзеяча, але перадусім як ЧАЛАВЕКА і АСОБУ. Зразумела, наколькі гэта дазволіць зрабіць гістарычныя крыніцы і аўтарская здольнасць іх інтэрпрэтацыі.

P. S. ...Працэс вяртання Рамана Скірмунта ў публічную прастору і памяць сучаснай Беларусі прымушае згадаць словы з Новага Запавету (Першае пасланне да карынцян): *Смерць, дзе тваё джала?! Пекла, дзе твая перамога?* У гэтых словах – вера ў перамогу жыцця над смерцю, насмешка над бяссіллем апошняй. Па-за межамі рэлігійнай свядомасці такую веру можа даць толькі памяць. Як пісаў паэт Рыгор Барадулін: *І датуль чалавек жывы, покуль зь ім душа размаўляе...*

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

РОД І РАДЗІМА

Жыццяпіс прадстаўніка вядомага шляхецкага роду немагчымы без прэзентацыі ягонага радаводу. І справа нават не ў выкананні пэўных фармальных патрабаванняў. Гісторыя роду была важным элементам свядомасці кожнага шляхціча, род якога не згінуў у сацыяльных і палітычных катаклізмах і не страціў ні амбіцый, ні памяці. Даследчык шляхецкай культуры другой паловы XIX ст. Станіслаў Сякерскі адносіў яе да найважнейшых элементаў шляхецкага этасу[66].

Раман Скірмунт павінен быў так ці інакш суадносіць свае дзеянні з вядомым яму радаводам. Гэтыя веды былі адным з тых чыннікаў, якія вызначалі ягоны выбар у важных жыццёвых сітуацыях. Яны таксама ўплывалі на рашэнні бацькоў, калі сын яшчэ не быў у стане дзейнічаць самастойна. На жаль, аднавіць ягоныя веды ўласнага радаводу немагчыма, але можна з дапамогай архіўных дакументаў і гістарычных даследаванняў прадставіць у агульных рысах генеалогію Скірмунтаў.

Этымалогія імя і прозвішча *Скірмунт* звязана з літоўскай мовай. Літоўскі слоўнік прозвішчаў сцвярджае, што *Скірмантас* (пашыраная літоўская форма) складаецца з двух каранёў: *skir-* (skirti, г. зн. раздзяляць альбо падзяляць) і *man-* (manyti, г. зн. думаць, мець меркаванне)[67]. Найчасцей гэтае прозвішча сустракаецца ў раёне г. Рэтавас на Жмудзі.

Арыгінальную гіпотэзу выказаў беларускі даследчык Іван Ласкоў, які сцвярджаў наяўнасць фінскага (фіна-угорскага) субстрату ў этнагенезе беларусаў. Выкарыстаўшы сучасны комі-пярмяцкі дыялект у якасці ключа для прачытання імёнаў, ён «расшыфраваў» імя Скірмунт як «злы чалавек» або «сярдзіты чалавек»[68].

Легенда Скірмунтаў

Імя *Скірмунт* (або *Скірмонт*) ахутана легендамі і паданнямі, аналізам якіх варта распачаць аповед пра гісторыю роду. Гэтае імя сустракаецца ўжо ў славутай легендзе пра Палемона, якая звязвала пачаткі гісторыі Літвы з перасяленнем часткі рымскай знаці на берагі Нёмана ў перыяд праўлення імператара Нерона (I ст. н. э.). У легендзе прысутнічаў князь Скірмунт як адзін з нашчадкаў Палемона.

Дзякуючы гісторыку Яну Юркевічу, навуковыя даследаванні якога апошнім

---

[66] St. Siekierski, *Kultura szlachty polskiej w latach 1864–2001*. Pułtusk 2003, s. 11–14.

[67] *Lietuvių pavardžių žodynas*. T. 2. Vilnius 1989, p. 152–153, 742–743.

[68] І. Ласкоў, *Летапісная літва: сваяцтва і лёс. Ч. 1*. Койданава 2012. Рэжым доступу: http://acarajjjj-kut.blogspot.com/2014/05/2012.html. Дата доступу 04. 01. 2018.

часам звязаны пераважна з легендай пра Палемона[69], а таксама працам беларускіх даследчыкаў Міколы Улашчыка, Вячаслава Чамярыцкага і Валеры Пазднякова, ёсць магчымасць паглыбіцца ў гэтую легенду[70].

Упершыню згадкі пра рымскае паходжанне магнатаў і шляхты ВКЛ сустракаюцца ў працах Яна Длугаша (1415–1480). Ён аднёс гэтыя падзеі да часоў Юлія Цэзара. Аднак імя Палемона і яго спадарожнікаў не называлася. Арыгінал твору, у якім легенда была запісана ўпершыню, не захаваўся. Самы старажытны яе тэкст перадаюць летапісы Яўрэінаўскі і Красінскага. Пазней легенду (ужо з дапрацоўкамі і ўстаўкамі) пераказалі іншыя беларуска-літоўскія летапісы[71], а менавіта: Альшэўскі, Румянцаўскі, Археалагічнага таварыства, Рачынскага, а таксама Хроніка літоўская і жамойцкая, Хроніка Быхаўца. Канчатковае афармленне легенды адбылося недзе напрыканцы першай чвэрці XVI ст. Ян Юркевіч датуе апошнюю рэдакцыю Хронікі Быхаўца з найбольш поўнай версіяй легенды сярэдзінай XVI ст.[72] Сучасныя даследчыкі звязваюць нараджэнне легенды з агульнаеўрапейскімі працэсамі стварэння этнагенетычных міфаў.

Паводле найбольш вядомага варыянта легенды, уцёкі Палемона адбыліся ў I ст. н. э., а іх прычынай была жорсткасць імператара Нерона: «...Подданыи его для великаго окрутинства и неуставичности его не был певенъ а ни безпечонъ не толко именеи або скарбов але и здорова своего, а так многии опускаючы имъеня и скарбы свои утекали до размаитых земел наследуючы справедливаго покою»[73].

Пагроза жыццю прымусіла 500 сямей рымскай знаці выправіцца ў далёкае марское падарожжа ў заходнім накірунку. Паводле варыянта Мацея Стрыйкоўскага (пераказанага ў Хроніцы Быхаўца), гэтыя падзеі адбыліся ў 401 г. і былі звязаны з нападам гунаў Атылы на Італію: «А князь именем Палемон, які таксама ў тым месце быў, усё сабраўшы, уцёк з імі. І з ім было пяцьсот сем'яў рымскае шляхты, а між імі на востраве аказалася чатыры роды рымскае шляхты: з герба Кітаўраса –

---

[69] J. Jurkiewicz, *Od Palemona do Gedymina. Wczesnonowozytne wyobrazenia o początkach Litwy. Częsc I. W kręgu latopisow litewskich*. Poznan 2013.

[70] Н. Улащик, *Введение в изучение Белорусско-литовского летописания*. Москва 1985; В. Чамярыцкі, *Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў*. Мінск 1969; В. Пазднякоў, *Палемон* (у:) ЭГБ. Т. 5 Мінск 1999, с. 384.

[71] Тэрмін «беларуска-літоўскія летапісы» быў прапанаваны Міколам Улашчыкам у кнізе *Введение в изучение Белорусско-литовского летописания* (Москва, 1985). Ён адносіў да «беларуска-літоўскіх» тыя летапісы, у якіх выкладалася гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, і якія былі напісаны на яго тэрыторыі (с. 3).

[72] J. Jurkiewicz, *Od Palemona do Gedymina. Wczesnonowozytne wyobrazenia o początkach Litwy...*, s. 83.

[73] *Кроники Великаго Княжства Литовского и Жамойтскаго. Список Археологического общества*. Стлб. 240 (у:) *Полное собрание русских летописей* (далее: ПСРЛ). Т. 17. Западнорусские летописи. Санкт-Петербург 1907.

Даўспрунк, з герба Калюмнаў – Прэшпар Цэзарынус, з герба Урсінаў – Юліанус, а з герба Ружы – Гектар. І паплыў Палемон морам Міжземным [...] дабраліся да вусця ракі Нёман, дзе яна ўпадае ў мора-акіян [...] І ўверх па Нёмане дабраліся да ракі Дубісы, дзе, увайшоўшы ў тую раку Дубісу, знайшлі горы высокія, і сярод тых гор – раўніны вялікія і дубровы раскошныя, размаітым багаццем поўныя, звярамі рознага роду [...] І на некаторых рэках – на Дубісе, на Нёмне, на Юры – пасяліліся яны і пачалі размнажацца. Тое іх пасяленне на тых рэках вельмі ім спадабалася, і назвалі яны тую зямлю Жамойцкаю»[74].

Сыны Палемона (Борк, Кунос і Спера) заснавалі гарады Юрборк, Куносаў і Кернову. Кунос перабраўся праз Вяллю і пачаў асвойваць «землю Завілейскую». Пазней ён перадаў гэтую зямлю свайму сыну Кернусу. Паводле легенды, «празваў Кернус бераг той, дзе людзі множыліся, моваю сваёй валоскаю, на лаціне, – Літус, а трубы, на якіх яны гралі, – туба, і даў найменне тым людзям на лаціне, склаўшы назву берага са словам «туба», – «Лістубанія». Але простыя людзі не ўмелі называць на лаціне і пачалі называць проста Літвою»[75].

Вядомы беларускі даследчык Мікола Улашчык лічыў, што пачатковая частка легенды заканчваецца паведамленнем пра тое, як унук Палемона вялікі князь жмудскі Монтвіл накіраваў свайго сына Скірмунта (у летапісах таксама ён фігуруе пад іменем Эрдзівіл)[76] з войскам «на Русь»[77]. Перабраўшыся праз Вяллю і Нёман, Скірмунт заснаваў Наваградак і стаў вялікім князем Наваградскім: «Скирмонт почне княжити на Новъгородцы»[78]. Ён жа «заснаваў горад Горадзень, потым пайшоў да Берасця і знайшоў Берасце, Дарагічын і Мельнік, Батыем спустошаныя і панішчаныя, і тыя гарады адбудаваў нанова, і пачаў у іх княжыць»[79].

Сын і пераемнік Скірмунта-Эрдзівіла ў беларуска-літоўскіх летапісах выступае пад іменем Мінгайла. Пасля перамогі пад Полацкам ён набыў тытул «вялікага князя Полацкага». Адзін з ягоных сыноў меў імя Скірмунт (таксама ў летапісах ён фігуруе як Шварн або Ямонт). Менавіта ён пры падтрымцы вялікага князя літоўскага і жамойцкага Жывібунда разграміў на берагах Ясельды князя луцкага і пінскага Мсціслава і далучыў да Літвы Пінск і Тураў: «І загаласіла Русь вялікім плачам, што так усе пабіты бязбожнаю Літвою»[80]. Потым быў канфлікт з «царом заволжскім Балаклаем», які патрабаваў даніны. Скірмунт загадаў «насы ды губы

---

[74] *Хроніка Быхаўца* (у:) *Беларускія летапісы і хронікі*. Нав. рэд. В. Чамярыцкі. Мінск, 1997, с. 72–73. Аўтарам перакладу на беларускую мову з'яўляецца Зміцер Саўка.

[75] *Хроніка Быхаўца*, с. 74.

[76] Напр., Хроніка Быхаўца называе яго Эрдзівілам (гл.: *Хроніка Быхаўца*, с. 75–76).

[77] Н. Улащик, *Введение в изучение Белорусско-литовского летописания*. Москва 1985, с. 134.

[78] *Кроники Великаго Княжства Литовского и Жамойтскаго. Список Археологического общества*, стлб. 245.

[79] *Хроніка Быхаўца*, с. 75.

[80] Тамсама, с. 78.

паслам Балаклаевым паадрэзваць, і потым да Балаклая іх адпусціў». Балаклай адпомсціў паходам, падчас якога «многа зла ўчыніў у Рускай зямлі». Вайна скончылася разгромам татарскага войска ў Койданаве і далучэннем да Літвы Мазыра, Чарнігава, Старадуба і Карачова[81]. Пра далейшае кіраванне Скірмунта Хроніка Быхаўца маўчыць. А вось у Румянцаўскім летапісе адзначалася: «Князь велики Скирмонт в великой старости свое умре»[82].

Паводле летапіснай традыцыі, апошнім прадстаўніком роду Палемона быў вялікі князь Рынгольт[83]. Пасля роду Палемона ўлада перайшла да Швінтарога, які быў сынам вялікага князя літоўскага і жамойцкага Уценуса з гербу Кітаўраса (Кентаўра). Цэнтр княства перамясціўся на берагі Вяллі, туды, дзе ў яе ўпадала рака Вільня. Менавіта там летапісец змясціў жэглішча або святыя могілкі, на якіх сын Швінтарога Скірмунт згодна з традыцыямі і бацькавым запаветам спаліў яго цела разам са слугой, канём, сабакам і сокалам.

Аповяд пра асаблівасці кіравання трэцяга легендарнага Скірмунта ў Хроніцы Быхаўца таксама адсутнічае. Затое Румянцаўскі летапіс паведамляе пра вайну Скірмунта з «латыголамі»: «[...] собрался мужи латыгалове [...] и пришли в землю жамотскую, и шкоды многие починили, и крови пролития в людях жамотских от них много стало. И князь Скирмонт, собравшись с силами своими, и поиде на них в землю их и их самих вытинал, а иных в полон вывел, и землю их пусту учинил»[84].

Кроники Великаго Княжства Литовского и Жамойтскаго (спіс Археалагічнага таварыства) дадаюць, што пасля выгнішчэння «латыголаў» Скірмунт засяліў іх зямлю «немцамі»[85]. У Яўрэінаўскім летапісу адзначаецца, што пасля смерці Швінтарога Скірмунт стаў «вялікім князем Літоўскім, Рускім і Жамойцкім»[86], а летапіс Археалагічнага таварыства надзяліў яго тытулам «вялікага князя Літоўскага і Жамойцкага»[87].

Трэці легендарны Скірмунт пакінуў пасля сябе двух сыноў – Трабуса і Гілігіна. Праўнукамі гэтага Скірмунта былі пяцёра братоў, з якіх варта назваць старэйшага

---

[81] Тамсама, с. 77–78.

[82] *Румянцевская летопись* (у:) *ПСРЛ*. Т. 35. *Летописи Белорусско-Литовские*. Москва 1980, с. 196.

[83] У Хроніцы Быхаўца як апошні з роду Палемона згадваецца Войшалк, унук Рынгольта (с. 84). Іншыя беларуска-літоўскія летапісы дзяцей і ўнукаў Рынгольта не згадваюць.

[84] *Румянцевская летопись*, с. 197.

[85] *Кроники Великаго Княжства Литовского и Жамойтскаго. Список Археологического общества*, стлб. 252.

[86] *Книга Великаго Княжества Литовскаго и Жамойцкаго. Евреиновский список* (у:) *ПСРЛ*. Т. 17. *Западнорусские летописи*. Санкт-Петербург 1907, стлб. 366.

[87] *Кроники Великаго Княжства Литовского и Жамойтскаго. Список Археологического общества*, стлб. 251.

Нарымунта і малодшага Тройдзена[88]. У гэтым месцы легенда пачынае ператварацца ў гісторыю.

Менавіта Тройдзена вядомыя польскія гісторыкі 1920–30-х гг. Генрык Пашкевіч і Юзаф Пузына лічылі заснавальнікам дынастыі Гедымінавічаў. Пазней гэты тэзіс аспрэчваў Ежы Ахманьскі, які спасылаўся на *Задоншчыну* Сафонія Разанца. У гэтым творы Андрэй Полацкі, звяртаючыся да князя Дзмітрыя, згадвае, што ён разам з братам Дзмітрыем Бранскім з'яўляецца праўнукам Скаламенда[89]. Паводле Тадэуша Васілеўскага, «Скаламендам» мог быць перайначаны ў старарускім вымаўленні вялікі князь Скірмунт[90]. Даследчык нават увёў у генеалогію князёў ВКЛ тэрмін «род Скірмунтовічаў-Гедымінавічаў»[91]. Беларускія медыевісты таксама лічаць верагодным пачынальнікам роду Гедымінавічаў Скалманта (Скаламенда, XIII ст.)[92]. Падобна, што гэта ўсё той жа пераназваны Скірмунт.

Першыя даследчыкі генеалогіі Скірмунтаў актыўна карысталіся легендай пра Палемона. Напрыклад, яе пераказам пачынаў гісторыю роду Войцах Віюк Каяловіч у *Herbarze rycerstwa W. X. Litewskiego*[93] у XVII ст. Пэўны водгук гэтая легенда атрымала ў выданні *Materiałów do biografii i genealogii i heraldyki* (пад рэд. Шымона Канарскага). У тэксце пра Скірмунтаў сцвярджалася, што яны паходзяць з роду ўдзельных князёў Літвы, Жамойці і Русі, якія некалі былі падзелены паміж трыма братамі. Тамсама згадвалася іх легендарная сястра манахіня Пракседа, якая нібыта была фундатарам базыліянскага кляштара ў Полацку[94]. Юзаф Вольф таксама распачынаў радавод Скірмунтаў са згадкі сына князя Мінгайлы Скірмунта[95]. А вось Тэадор Жыхліньскі ў *Złotej księgie szlachty polskiej* крытычна паставіўся да тэзіса пра князя наваградскага Скірмунта як пачынальніка роду[96].

Сёння згадкі пра княскае паходжанне Скірмунтаў часцей сустракаюцца на старонках папулярных і сенсацыйных выданняў або адпаведных сайтаў інтэрнэту.

---

[88] *Хроніка Быхаўца*, с. 86.

[89] *Задонщина*, (у:) *Памятники литературы древней Руси: XIV–середина XV века*. Москва 1981, с. 96–111.

[90] T. Wasilewski, *Początkowe dzieje dynastii Gedymina*, (у:) *Człowiek w społeczeństwie sredniowiecznym*. Warszawa 1997, s. 348.

[91] Ibidem, s. 362.

[92] *Вялікае Княства Літоўскае*. Энцыклапедыя ў двух тамах. Том 1. А–К. Мінск 2005, с. 520.

[93] Ks. Wojciecha Wijuka Kojałowicza S. J., *Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego tak zwany Compendium czyli o klejnotach albo Herbach ktorych familie stanu tycerskiego w prowincyach Wielkiego Xięstwa Litewskiego zazywają*. Krakow 1897.

[94] *Materiały do biografii i genealogii i heraldyki polskiej*. T. II. Red. Sz. Kanarski. Buenos Aires-Paryz 1964, s. 44.

[95] J. Wolff, *Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku*. Warszawa 1895.

[96] *Złota księga szlachty polskiej przez Teodora Zychlińskiego*. Rocznik pierwszy. Poznań 1879, s. 284–285.

Існуе таксама легенда, якая звязвае паходжанне Скірмунтаў з яцвягамі. Пра гэта пісаў польскі публіцыст, грамадскі і рэлігійны дзеяч XX ст. Валер'ян Мэйштовіч у зборніку эсэ, прысвечаных вядомым родам літоўскіх і беларускіх палякаў[97]. Паводле В. Мэйштовіча, роды Давятаў, Кунатаў і Скірмунтаў выводзяцца з яцвяжскіх плямён, вынішчаных дружынамі мазавецкага князя Лешка Белага. Сам аўтар прызнаў, што гістарычныя дадзеныя, якія б пацвердзілі ягоную версію, адсутнічаюць. Адзіным ягоным аргументам было паведамленне, што пра яцвяжскае паходжанне Скірмунтаў «хадзілі ў нас чуткі»[98]. Магчыма, гэтая версія паходжання абмяркоўвалася ў асяродку літоўскіх палякаў XIX–пачатку XX ст.

Яе карані таксама можна знайсці ў летапісах. У Галіцка-Валынскім летапісе, уключаным у Іпацьеўскі, згадваюцца імёны некалькіх яцвяжскіх князёў. Сярод іх Комат[99] і Скоманд. Апошні атрымаў ад летапісца вельмі яркую характарыстыку: «Скомонд бо бе волхв і кобник нарочит, борз же бе яко звер, пеш бо ходя повоева землю Пинскую, иные страны; и убьен бысть нечестивый, и глава его взотечена бысть на кол»[100].

Паданні пра яцвяжскага правадыра Скомэна (ён жа Кумат або Комат) змешчаныя ў выданні «*Legendy, podanni i basni Suwalszczyzny*» (укладальнік Януш Копцял, 1997). Паводле легенды, Скомэн загінуў у бітве з польскімі князямі недзе ў міжрэччы Нурца і Бранка. Ягоны сын Скірмунт быў прывезены як здабыча на двор мазавецкага князя Лешка Белага. Калі ён вырас, то вярнуўся на радзіму і быў абраны кіраўніком паходу супраць крыжакоў. Паход аказаўся паспяховым, і Скірмунт застаўся правадыром яцвягаў. Аднак вайна закончылася паражэннем, і ён збег у Польшчу. Гэтую гісторыю выкарыстаў у рамане *Skirmunt syn Kumata* (Warszawa, 1973) пісьменнік Рышард Краська. Галоўная сюжэтная лінія прысвечана лёсу ганарлівага яцвяжскага князя Скірмунта, які ўрэшце прызнаў сябе васалам Пястаў і стаў бараніць іх усходнія межы.

А як трактавалі сваё паходжанне самі Скірмунты? Трэба прызнаць, што згадкі пра вялікакняскае паходжанне зрэдку сустракаюцца ў дакументах і тэкстах сямейнага паходжання. Напрыклад, ва ўспамінах Баляслава Скірмунта (1931), прысвечаных дарадцу пасольства Польшчы ў 1920-я гг. у Ватыкане і ягонаму брату Казіміру, сцвярджаецца паходжанне роду ад «удзельных князёў літоўскіх»[101]. Таксама князі прыгадваліся ў дакументах на зацвярджэнне Скірмунтаў у шляхецтве, пададзеных на разгляд у Магілёўскі шляхецкі сход (1834). У перакладзе на рускую мову прыводзіўся выпіс з земскіх кніг Дынабургскага пав. (1773), у якім

---

[97] W. Meysztowicz, *Poszło z dymem. Gawędy o czasach i ludziach.* Londyn 1973, s. 114–115.

[98] Ibidem, s. 114.

[99] *Ипативская летопись* (у:) *ПСРЛ.* Санкт-Петербург 1843, с. 191.

[100] Там же, с. 182.

[101] Archiwum PAN w Warszawie. Sygn. III–83, j. 96, k. 1; Гл. таксама: B. Skirmunt, W *służbie Kościoła i Polski. Ks. Dr Kazimierz Skirmunt.* Wilno 1931.

сцвярджалася, што род Скірмунтаў «некогда происходящий от литовских самогитских и русских владетельных князей по свидетельствам различным летописцев пользовался впоследствии времени дворянским достоинством с разными противу старинного своего герба переменами...»[102]

Вялікакняскае паходжанне з іроніяй прыгадвалася ў лісце Ганны Скірмунт да віленскага выдаўцы Юзафа Завадскага ад 20 красавіка 1842 г. Гэты ліст быў адпраўлены з Волагды і ўтрымліваў просьбу аўтаркі прыслаць на яе пінскі адрас некалькі выданняў. Яна падпісала ліст: «Pana Dobrodzieja Najnizsza sługa Anna Skirmuntt», а ніжэй дадала: «Wielka Księzna Litewska, nieswiezska y Nowogrodzka»[103].

Затое ў дакументах, што пацвярджалі шляхецкае паходжанне Скірмунтаў і падаваліся ў Дэпартамент герольдыі і губернскія шляхецкія дэпутацкія сходы ў Менску, Коўне і Вільні, легендарныя князі ВКЛ не фігуравалі.

Канстанцыя Скірмунт у сваіх даследаваннях пачаткаў гістарычнай Літвы легенду пра Палемона распавядала паводле Хронікі Быхаўца[104]. У адным з выданняў яна паспрабавала параўнаць гэтую легенду з народнымі паданнямі жмудзінаў, у якіх таксама прысутнічае Палемон. Як жмудскі князь, ён «розумам, а не крывёю» далучыў да Жмудзі (у паданнях яна месцілася на заходнім беразе Нёмана) усходняе Панямонне[105]. Даследчыца згадвала толькі аднаго Скірмунта, а менавіта князя Наваградскага, сына Мінгайлы. Пры гэтым заўсёды падкрэсліваўся легендарны характар падання, адзначалася адсутнасць дакладных звестак пра князя. Канстанцыя Скірмунт нават не спрабавала звязаць яго з уласным родам.

Згадкі пра легендарныя карані роду адсутнічалі таксама ў гістарычных экскурсах публіцыстыкі Рамана Скірмунта. А ў лісце да беларускага дзеяча Яўсея Канчара ён сціпла адзначыў, што з'яўляецца «потомком литовской семьи с древних времен, с испокон веков оседлой в этом крае...»[106]

Важным элементам генеалогіі кожнага шляхецкага роду з'яўляецца герб. Першым вядомым нам гербам Скірмунтаў быў «Дуб» (у чорным полі – залаты дуб з пяццю каранямі, двумя лістамі на сярэдзіне ствола і трыма жалудамі замест верхавіны, наверсе княская мітра. Канарскі сцвярджаў, што герб Скірмунтаў меў блакітнае поле[107]).

---

[102] Российский государственный исторический архив (далей: РГИА). Ф. 1343, оп. 29, д. 3567, л. 14.

[103] Lietuvos valstybes istorijos archyvas (далей: ЛДГА). Ф. 1135, воп. 7, спр. 454, арк. 8. Хачу выказаць удзячнасць др Лілії Коўкель за магчымасць пазнаёміцца з гэтымі дакументамі.

[104] K. Skirmuntt, *Dzieje Litwy. Opowiedziane w zarysie*. Krakow 1886; idem, *Nad Niemnem i Bałtykiem. T. II. Podanie. Czasy przed-mendogowe. Dzieje starozytnych Prus*. Krakow 1903.

[105] Idem, *Nad Niemnem i Bałtykiem. T. I. W zaraniu dziejow*. Warszawa [1897], s. 93. Пры гэтым аўтарка спасылалася на *Zbior podan zmujdskich* М. Давойны-Сільвестровіча.

[106] З перапіскі Рамана Скірмунта з Яўсеям Канчарам, «Чырвоны шлях». 1918, № 1–2, с. 12.

[107] *Materiały do biografii i genealogii...*, s. 44.

Паводле нямецкага даследчыка Эмільяна Жарніцкага-Шалігі гэты герб вядомы з 1340 г.[108] У пастанове Менскага губернскага шляхецкага схода, які ў 1802 г. пацвердзіў шляхецтва Скірмунтаў, фігураваў якраз герб «Дуб» («Dąb»)[109]. Каспер Нясецкі ў 1841 г. паведамляў, што гэты герб яшчэ ўжываюць многія прадстаўнікі роду, асабліва ягонай «пінскай» галіны. Гэта пацвердзілі і самі Скірмунты. Ва ўспамінах Баляслава Скірмунта (1931) адзначалася карыстанне гербом «Дуб пад мітрай»[110].

Герб «Дуб» роду Скірмунтаў на малюнку Сяргея Харэўскага.

Аднак Скірмунты мелі таксама іншыя гербы. Сярод даследчыкаў першым звярнуў увагу на геральдыку роду Скірмунтаў В. Каяловіч. Ён заўважыў, што Скірмунты, якія прынялі прозвішча Стравінскіх, карысталіся гербам «Прыяцель» («Przyjaciel»): у блакітным полі – два чырвоныя сэрцы, паміж імі – дзве срэбраныя стралы ўгару, наверсе – рыцарскі шлем з трыма страусінымі пёрамі[111].

Каспер Нясецкі ў *Herbarze Polskim* сцвярджаў, што герб «Прыяцель» Скірмунты пачалі ўжываць пасля Люблінскай уніі (1569) як сімвал сяброўства з паранённымі польскімі шляхецкімі родамі. Сучасныя даследчыкі Ян Цехановіч і Эдмундас Рымша выказалі меркаванне, што Скірмунты ўжывалі герб «Гадземба» («Godzięba»). Ян Цехановіч пры гэтым спаслаўся на радавод Скірмунтаў, зацверджаны Віленскім шляхецкім сходам у 1819 г.[112] У выпісцы з земскіх кніг Дынабургскага пав. (1773), перададзенай разам з іншымі дакументамі ў Магілёўскі шляхецкі сход у 1835 г., сцвярджалася, што пачынальнік гэтай лініі роду Мацей Скірмунт (маёнтак Буткішкі ў Самагіцкім княстве, XVII ст.) меў на гербе выявы трох лілій[113].

Ужыванне розных гербаў было адлюстраваннем даволі шырокай геаграфіі роду Скірмунтаў, якія ў часы Рэчы Паспалітай рассяліліся па ўсім Беларуска-Літоўскім краі, а ў XIX ст. выйшлі па-за яго межы.

Паспрабую на падставе матэрыялаў расійскага Дэпартамента герольдыі і шляхецкіх сходаў, а таксама генеалагічных даследаванняў аднавіць у агульных рысах радавод Скірмунтаў.

---

[108] *Die polnischen Stammwappen ihre Geschichte und ihre Sagen Von Emilian von Zernicki-Szeliga*. Hamburg 1904, s. 21

[109] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей: НГАБ). Ф. 319, воп. 2, спр. 2969, арк. 159.

[110] Archiwum PAN w Warszawie. Sygn. III–83, j. 96, k. 1.

[111] Віленскі даследчык Эдмундас Рымша назваў гэты варыянт «Прыяцеля» «літоўскім».

[112] J. Ciechanowicz, *Rody rycerskie Wielkiego Księstwa Litewskiego*. T. V. S-Z. Rzeszów 2001, s. 96.

[113] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3567, л. 14.

Карані «Дуба»

Трэба адзначыць існаванне «жмудскай» і «палескай» галін роду. Звычайна, большую ўвагу гісторыкаў прыцягвала жмудская. Адным з першых даследчыкаў радаводу Скірмунтаў быў ужо згаданы Войцах Віюк Каяловіч, які паведаміў пра ковенскага стольніка Мікалая Скірмунта і Базыля Скірмунта з Берасцейскага ваяв. Апошні меў сыноў – Іяхіма, Яна (дэпутата Вялікага трыбунала 1685 г.) і Стэфана (гусарская каралеўская рота Крыштафа Белазора). Даследчык таксама згадаў «каплана вучонага» жмудскага каноніка ксяндза Валенты Скірмунта[114].

Каспер Нясецкі сярод першых вядомых Скірмунтаў назваў ковенскага стольніка Мікалая з Жмудзі (1621) і Базыля з Берасцейшчыны (1632). Паводле яго звестак, апошні ўдзельнічаў у падпісанні *pacta conventa* караля Яна Казіміра (1648). Апрача іх Нясецкі назваў Іяхіма Скірмунта і ягонага сына Валенты (пінскі возны, інтурскі староста), жмудскага біскупа суфрагана, а пазней уцянскага біскупа Іяхіма Скірмунта (памёр у 1718 г.) і гродскага ашмянскага суддзю (1778) Крыштафа Скірмунта. Ён жа згадаў земскага пінскага суддзю Адама, мастаўнічага пінскага Сымона, інфлянцкага стражніка Зыгмунта і ашмянскага суддзю Юзафа Скірмунтаў (1788)[115]. Ковенскі падстолі Мікалай Скірмунт, які падпісаў *pacta coventa* Яна Казіміра, таксама згадваецца ў *Herbarze Polski i imionopisu zasluzonych w Polsce ludzi*[116].

Найбольш поўна «жмудская лінія» Скірмунтаў апісана ў працы польскага гісторыка Гжэгажа Блашчыка *Herbarz szlachty zmudzkiej* (Tom 5, 2016). Паводле даследчыка, першая згадка Скірмунтаў на Жмудзі звязана з прывілеем вялікага князя Вітаўта для медніцкіх баяр (1422). Адзін з іх, Скобут, названы «пляменнікам» Скірмунта, атрымаў «падданага». Пазней Скірмунты згадваліся ў вайсковых попісах ВКЛ (напр., 1567 г.), а таксама ў жмудскіх земскіх актах. Пры гэтым усе згаданыя Скірмунты мелі ўладанні ў Ёсвайнскай, Велёнскай і Тэнджаголскай валасцях. Аднак родавае «гняздо» Г. Блашчык схільны шукаць у Айрагольскім пав., з якім звязаны найдаўнейшыя згадкі Скірмунтаў. У дакументах XVII ст. ён адшукаў інфармацыю пра мясцовасць Кірмонты ў Айрагольскім пав., а таксама Пашвентупе Скірмонты і Швентупе Скірмунты ў Велёнскім пав., якіх не атрымалася лакалізаваць. Мясцовасці з назвамі Скірмантышкі (Ковенскі пав.) або Скірмунцішкі (Ашмянскі пав.) даследчык лічыць пазнейшымі[117].

Паводле Г. Блашчыка, Скірмунты на Жмудзі прадстаўлялі ўсе слаі шляхецкага саслоўя – ад зямян на высокіх пасадах да беззямельнай шляхты. Пры гэтым

---

[114] *Ks. Wojciecha Wijuka Kojałowicza S. J. Herbarz rycerstwa...*, s. 246.

[115] *Herbarz Polski Kaspra Niesieckiego S. J. powiększony dodatkami z pozniejszych autorów, rękopismów, dowodow urzędowych.* T. VIII. Lipsk 1841, s. 380–381.

[116] *Herbarz Polski i imionopisy zasluzonych w Polsce ludzi wszystkich stanow i rodow.* T. III. Lwow 1862, s. 60.

[117] G. Błaszczyk, *Herbarz szlachty zmudzkiej*. Tom 5. Warszawa 2016, s. 257.

яны карысталіся гербамі «Гадземба» і «Прыяцель». У шэрагу найбольш вядомых жмудскіх Скірмунтаў (Скірмонтаў) гісторык назваў каноніка жмудскага Валенты Скірмунта, таварыша гусарскай харугвы караля польскага Стэфана Скірмунта, а таксама Іяхіма Скірмунта (1644–1718), які займаў пасаду жмудскага біскупа суфрагана (1701–1707)[118].

Матэрыялы Віленскага шляхецкага схода называюць пачынальнікам роду Мацея Скірмунта (герб «Дуб»), які валодаў маёнткам Буткішкі (Будкішкі) у Жмудзі[119]. Яго сын Ян атрымаў у спадчыну бацькоўскія землі і павялічыў зямельныя ўладанні сям'і набыццём маёнткаў Кольне (Гольне) і Пашкевічы на Піншчыне (1676). Пасля смерці Яна Скірмунта маёнткі адышлі да сына Пятра.

Другі сын Яна Міхал перасяліўся ў Інфлянты. У шлюбе з Альбрэхтоўнай нарадзіліся сыны Зыгмунт, Караль і Багуслаў, якія займалі ў Інфлянтах адпаведна пасады падчашага, войскага і канюшага. Вялікай кар'еры і багацця яны не здабылі. Выключэннем быў сын Караля Адам Скірмунт, які займаў пасады каморніка інфлянцкага, ротмістра наваградскага і сакратара земскай пячаткі Дзвінскай правінцыі. Яны, як і Скірмунты з Піншчыны, захавалі герб «Дуб»[120].

Менавіта з гэтымі прадстаўнікамі роду звязана з'яўленне Скірмунтаў у Віленскай, Віцебскай і Магілёўскай губ. на рубяжы XVIII–XIX ст. Так, Юзаф Багуслававіч Скірмунт перабраўся ў Вільню, дзе ажаніўся з Багуславай Садоўскай. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся сыны Ян, Юзаф, Міхал і дачка Феліцыяна[121]. Апошняя ў 1799 г. падала дакументы аб зацвярджэнні шляхецтва ў Віленскі шляхецкі сход. Дакументы сведчаць, што гэтая галіна Скірмунтаў карысталася гербам «Гадземба»[122].

У *Polskiej encyklopedii szlacheckiej* таксама згадваюцца маёнткі Скірмунтова ў Ашмянскім і Пінскім пав., якія належалі Скірмунтам герба «Прыяцель», і маёнтак з такой самай назвай у Менскім пав., што належаў Скірмунтам герба «Дуб»[123].

У матэрыялах Дэпартамента герольдыі фігураваў Іван Казіміравіч Стравінскі-Скірмунт (герб «Прыяцель»), які валодаў вотчынным маёнткам Гронскішкі з сялом Вінажэндзь у Ашмянскім пав. У 1658 г. ён набыў маёнтак Ласосна пад Гародняй[124]. Скірмунты гэтага герба атрымалі пацвярджэнне шляхецтва ў 1798 г. (Віленская губ.). Яны прадставілі дакументы, якія сведчылі, што Мікалай Скірмунт (сын

---

[118] Ibidem, s. 259.

[119] ЛДГА. Ф. 391, воп. 1, спр. 1553, арк. 51; J. Ciechanowicz, *Rody rycerskie Wielkiego Księstwa Litewskiego*. Tom V, s. 96–97.

[120] *Materiały do biografii i genealogii...*, s. 44.

[121] ЛДГА. Ф. 391, воп. 1, спр. 1553, арк. 52.

[122] Тамсама, воп. 4, спр. 2705, арк. 5.

[123] *Polska encyklopedia szlachecka*. T. XI. Warszawa 1988, s. 71.

[124] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3564.

Войцаха) у 1638 г. перадаў вотчынны маёнтак Скірмонты (як варыянты: Скірмонт і Скірмунцішкі) у Ашмянскім пав. сынам Аляксандру і Станіславу[125].

Скірмунты таксама мелі вотчынныя ўладанні ў Падляскім ваяв. Гэта маёнтак Грэгароўцава ў Бельскай зямлі, набыты за 10 тыс. польскіх злотых Станіславам Адамам Скірмунтам у 1698 г., а таксама маёнткі Войтава і Алексін, якія ў 1736 г. перайшлі ў валоданне Мікалая Скірмунта[126].

Геаграфія і храналогія росту зямельных уладанняў Скірмунтаў пацвярджае іх жмудскае паходжанне. Першая дакументаваная згадка пра прадстаўніка роду Скірмунтаў, якая датычыць Палесся, паходзіць з сярэдзіны XVI ст. Так, падкаморны пінскі Адам Скірмунт, які ў 1802 г. прадставіў дакументы, пацвярджаючыя прыналежнасць Скірмунтаў да шляхты, вытокі роду звязаў з Богушам Скірмунтам[127]. Апошні атрымаў ад каралевы Боны 22 чэрвеня 1552 г. маёнтак Плотніцу Пінскага пав.[128] Менавіта яго можна лічыць пачынальнікам «палескай» галіны роду Скірмунтаў[129].

У 1833 г. сярод дакументаў, перасланых Мінскім шляхецкім сходам у Сенат, аказалася копія прывілея каралевы Боны, перакладзеная на рускую мову: «Желая го на потомственные времена к службе нашей поощрить, оное Тарасовское дворище в Плотница… собственность нашу государственную ему же пожаловать и сею нашею грамотою… жалуем. …на вечныя времена… а нам из того военную земскую службу производить сродно тому, как и прочие наши пинские земяне из своих имений служат… ему Богушу Скирмунтовичу и его потомкам повелели выдать сию нашу грамоту. Писано в Варшаве 22 июня 1552 г.»[130]

Польскі даследчык Адам Банецкі паведаміў, што ў 1543 г. Богуш Скірмунт (як варыянты: Скірмонт, Скірмант) займаў пасаду падстарасты пінскага, а ў 1551 г. пачаў судовы працэс супраць Капусцічаў за валоданне маёнткам Тарасава[131]. Яшчэ раней, у чэрвені 1544 г. ён набыў у Олюхны Крывецкуўны паўтары дварышчы ў в. Дубоі Пінскага пав. за 60 коп грошаў літоўскіх.

У шлюбе Богуша Скірмунта з Анастасіяй Сыруцінай нарадзіліся два сыны – Мікалай і Крыштаф. Лінія роду ад Мікалая згасла ў чацвёртым калене. Лінія Крыштафа працягваецца па сённяшні дзень. Менавіта ён быў уладальнікам

---

[125] Там же, д. 3565, л. 15–16.

[126] Там же, д. 3570, л. 2 адв.–3.

[127] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2969.

[128] На карце беларускага гісторыка Міхаіла Спірыдонава *Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.)* (Минск, 1992) в. Плотніца знаходзіцца паміж Пінскам і Давыд-Гарадком. Сёння гэта веска ў Столінскім раёне Берасцейскай вобл.

[129] Д. Шпопэр у кнізе *Gente Lithuana, natione Lithuana* (Gdansk, 2009, s. 16) памылкова лічыць такім пачынальнікам Крыштафа Скірмунта (сяр. XVII ст.).

[130] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3574, л. 46.

[131] *Poczet rodow w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI w. ułozył i wydał Adam Boniecki.* Warszawa 1883, s. 314.

Плотніцы, а таксама займаў пасады старасты плотніцкага і суддзі пінскага. Ён меў чатырох сыноў – Яна, Матэуша, Дзмітрыя і Аляксандра. Плотніца знаходзілася ў іх сумесным валоданні.

Паводле звестак беларускага даследчыка Анатоля Федарука, найбольш вядомы з іх – Ян, які быў дэпутатам Смаленскага ваяв. на Люблінскі сейм і пакінуў подпіс на акце Люблінскай уніі 1569 г.[132]

Што датычыць культурніцкай арыентацыі гэтых найбольш далёкіх ад нас Скірмунтаў, то вартым увагі з'яўляецца прызнанне Рамана Скірмунта, зробленае ім увесну 1917 г. у лісце да Яўсея Канчара: «...Мои предки до 17 столетия пользовались белорусским языком как домашним»[133].

Паводле прадстаўленай Скірмунтамі напрыканцы XIX ст. схемы радаводу, Ян Скірмунт меў шасцёра сыноў – Казіміра, Яраша, Льва, Бенедыкта, Адама і Юрыя. Два апошнія атрымалі ў спадчыну (паводле тэстамента ад 15 ліпеня 1649 г.) родавы маёнтак Плотніцу. Гэтая лінія роду згасла ў сёмым калене.

Сярод сыноў Дзмітрыя найбольш вызначыўся «паводле здольнасцяў і заслугаў перад Айчынай» Ян, які займаў пасаду войскага жытомірскага і меў шасцёра сыноў ад чатырох жонак[134]. Сярод іх варта назваць Аляксандра (памёр да сакавіка 1746 г.), які займаў пасады вознага пінскага (1704), гараднічага пінскага (1726) і старасты вечыкоўскага (1710–1740). Ён ажаніўся на Карнеліі Ордзе, якая нарадзіла сямёра сыноў – Францa, Станіслава, Ігнацыя, Баніфацыя, Міхала, Яна і Карла. Апошні вядомы як староста інтурскі[135].

Зямельныя ўладанні Аляксандра Скірмунта знаходзіліся ў Пінскім, Вількомірскім, Ашмянскім, Менскім і Кіеўскім пав., а таксама на Віленшчыне і Ковеншчыне. У. Вяроўкін-Шэлюта сцвярджаў, што Аляксандр Скірмунт валодаў маёнткамі Сушыцк[136], Выласкія Увалокі, Кашэвічы, Цмень, Ругаз, Лугаж, Плотніца ў Пінскім пав.[137] Таксама ён меў землі ў Вількомірскім, Ашмянскім, Менскім і Кіеўскім паветах, Віленскім ваяв. і Самагіцкім княстве[138].

Паводле маёмаснага падзелу 1728 г. Плотніца перайшла да ягонага сына Францa, а ў 1746 г. – да двух сыноў ягонага брата старасты васількаўскага Міхала Скірмунта – харунжага пінскага Тамаша і Адама. Тамаш у 1792 г. быў старастам пінскім, а праз год засядаў ужо ў расійскай Ліквідацыйнай камісіі Менскай губ. па праверцы дакументаў на права валодання нерухомай маёмасцю[139].

---

[132] А. Федорук, *Старинные усадьбы Берестейщины*. Минск 2004, с. 32–41.

[133] З перапіскі Рамана Скірмунта з Яўсеям Канчарам, «Чырвоны шлях». 1918, № 1–2, с. 12.

[134] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2969, арк. 160.

[135] Biblioteka naukowa PAN i PAU w Krakowie. Zbiory specjalne, j. 4480, k. 33.

[136] На карце М. Спірыдонава – у 10 км на паўночны ўсход ад Пінска.

[137] Вяроўкін-Шэлюта У. *Скірмунты* (у:) *ЭГБ*. Т. 6, с. 321.

[138] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2969, арк. 160.

[139] Biblioteka naukowa PAN I PAU w Krakowie. Zbiory specjalne, j. 6125, k. 1; j. 5924, k. 150–152.

А вось ягоны брат Адам стаўся адной з найбольш прыкметных постацей сярод Скірмунтаў XVIII ст. Прынамсі, ён аказаўся адзіным прадстаўніком роду гэтага стагоддзя, біяграфія якога трапіла на старонкі *Польскага слоўніка біяграфічнага*[140].

Аўтар артыкула Эва Зеліньска галоўную ўвагу звярнула на палітычную дзейнасць Адама Скірмунта. У 1773 г. ён быў абраны паслом на сейм ад Пінскага пав. Удзельнічаў у працы сейма да канца яго тэрміну, г. зн. да красавіка 1775 г. У гэтым годзе Адам Скірмунт быў ужо пінскім земскім суддзёй. На апошнім пасяджэнні ў якасці прадстаўніка шляхты Берасцейскага ваяв. ён быў абраны суддзёй сеймавага суда. Удзельнічаў у працы сеймікаў Пінскага пав., які выбіраў паслоў на Чатырохгадовы сейм. У лістападзе 1790 г. быў узнагароджаны ордэнам св. Станіслава. Прадстаўляў пінскую шляхту на апошнім сейме Рэчы Паспалітай у Гародні ў 1793 г.

Паводле Зеліньскай, Адам Скірмунт пагаджаўся задаволіць прэтэнзіі Расіі, але быў праціўнікам Прусіі, настойваў на эвакуацыі яе войск з тэрыторыі Рэчы Паспалітай і кампенсацыі нанесенай імі шкоды. У 1794 г. як кандыдатура расійскага пасла Восіпа Ігельстрома і біскупа Юзафа Касакоўскага ён быў уключаны ў склад Пастаяннай Рады. Адбылося гэта насуперак меркаванню караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Аднак «усходнія апекуны» таксама крытыкавалі Адама Скірмунта, які часта аспрэчваў прапановы расійскага пасла.

Апрача палітычнай дзейнасці Адам Скірмунт актыўна ўдзельнічаў у будаўніцтве канала Агінскага. За ягоныя сродкі будавалася частка канала ад Гаравахі да Вяляцічаў. Ён таксама быў канюшым пінскім, падкаморым пінскім, старастам пінскім (1775) і войтам пінскім (1792)[141].

Дакументы таксама сведчаць, што пры выкананні службовых абавязкаў Адам Скірмунт злоўжываў сваім становішчам. Так, 7 мая 1792 г. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі зацвердзіў рашэнне Асэсарскага суда Вялікага Княства Літоўскага па выніках разгляду скаргі пінскіх мяшчан на супрацьзаконную дзейнасць гетмана Міхала Казіміра Агінскага, старасты пінскага Тамаша Скірмунта, войта пінскага Адама Скірмунта і камісара Себасцьяна Бароўскага.

ДАКУМЕНТ

Скарга мяшчан горада Пінска. 1792 г.[142]

[...] места Пінск, некалі гандлёвае і шматлюднае праз розныя краёвыя рэвалюцыі або праз шматлікія пажары зруйнаванае да такой ступені, што толькі след мяс-

---

[140] E. Zielińska, *Skirmunt Adam (2. poł. XVIII w.)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny.* T. XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 173–174.

[141] J. Gordziejew, *Materiały zrodłowe do dziejow Wielkiego Księstwa Litewskiego. Cz. 1. Inwentarze miasta Pinska z lat 1764 i 1778*, «Rocznik Biblioteki naukowej PAU i PAN w Krakowie». Rok. XLVIII (2003), s. 185; А. Федорук, *Старинные усадьбы Берестейщины*, с. 32–41.

[142] Biblioteka naukowa PAN i PAU w Krakowie. Zbiory specjalne, j. 5924, k. 150–152.

цовай юрысдыкцыі, раней называнай Магдэбургіяй, з невялікай лічбай мяшчан у ім застаўся, у той жа час кіраўніцтва старасты [Тамаша Скірмунта – А. С.] так далёка пашырыла межы сваей улады, што ўсе фундушы, прыбыткі і выгоды на ўпрыгожванне, парадак ды іншыя патрэбы места ад Найсвятлейшых Каралёў Польскіх і Вялікіх Князёў Літоўскіх прывілеямі перад і пасля ўнійнымі, Канстытуцыямі сеймавымі зацверджаныя і нададзеныя, былі незаконна адабраны на карысць старасты.

Менавіта ўвесь прыбытак прапінацыі ад вырабу і продажы ў месце напояў, а таксама чыншы з мясцовых пляцаў, купецкіх крамаў, з камораў солі ды інш., з крамаў хлебных і мясных, таксама прыбытак з Дома гасціннага, прыбытак за вагу і вымярэнні з васкабойні, цырульні і лазні. Таксама ад [...] гандлюючых на Рынку і Рыбным базары ды іншых базарах, адным словам, усё, што павінна ісці на ўтрыманне, упрыгожванне і парадак з самых старажытных часоў наданых і выкарыстаных, усё гэта названым ваяводам [гетманам Міхалам Казімірам Агінскім – А. С.] з папярэднікамі сваімі, старастамі пінскімі адабрана, места апрача жахлівых карцін знішчанай Ратушы пакінуў без найменшых фундушаў. Таксама на самым пачатку сваёй улады староста, заключыўшы на шкоду места Пінска змову з названымі Скірмунтам войтам места Пінска [Адам Скірмунт – А. С.] і Бароўскім, у той час намеснікам замкавым Пінска, грунт мясцовы Бронага да шасці валок, які з незапамятных часоў быў уласнасцю пінскіх мяшчан (пра тое сведчыць Маніфест, унесены у гродскія акты Берасцейскага ваяводства) з фальваркам Вайтоўскім і млынам ветраным забраў і да гэтага часу прыбытак сабе забірае. Акрамя таго, розныя манаполіі, якія сціскаюць гандаль і перашкаджаюць прамысловасці, надзвычайныя падаткі як ад солі, што прывезена на продаж, ад продажы алею, дзёгцю, а таксама яблык, цыбулі ды іншага харчу на мяшчан пінскіх, якія жывуць з працы сваіх рук і з прамысловасці, накінуў.

Названы Гетман пасля атрымання Эканоміі Пінскай усялякі ўваход у пушчу Эканоміі Пінскай, нягледзячы на даўнія правы і звычаі, мяшчанам пінскім забараніў. Таксама, будучы старастам пінскім, аўстэрыю на самым Рынку места збудаваў, і па гэты час на шкоду прапінацыі мясцовай прыбытак незаконна забірае.

У выніку гетман Міхал Казімір Агінскі, Тамаш і Адам Скірмунты, Себасцьян Бароўскі былі прызнаныя каралём і вялікім князем вінаватымі ў тым, што пазбавілі пінскіх мяшчан законных прывілеяў, прысвоілі гарадскую маёмасць, наклалі вялізарныя падаткі на гандаль і прамысловасць і г. д. Суд прызнаў справядлівасць скаргі і прымусіў адмяніць усе незаконныя акты, якія парушалі правы пінчукоў.

Цікава, што адначасна ў земскім судзе Пінскага пав. разглядаўся пазоў Адама Скірмунта да гетмана Міхала Казіміра Агінскага, які быў вінаваты яму значную суму грошай і не спяшаўся яе вяртаць. Суд падтрымаў пазоў і абавязаў гетмана выплаціць Адаму Скірмунту 1 тыс. чырвоных злотых па набытых у гетмана аблігацы-

ях і амаль 2,5 тыс. злотых як працэнтаў за ранейшы доўг[143]. Гэтыя судовыя працэсы не пашкодзілі палітычнай кар'еры Адама Скірмунта, які памёр каля 1820 г.[144]

Вяроўкін-Шэлюта згадаў таксама пінскага каморніка гранічнага, мастаўнічага і харунжага пінскага Аляксандра (сын Баніфацыя, памёр да чэрвеня 1801 г.) і яго-ных сыноў – пінскага падсудка і падкаморага Каспера Вінцэнта (нар. у 1775 г.) і лаўніка пінскага павятовага земскага суда, пазней прэзідэнта межавага пінскага суда Амброжыя Вінцэнта (1776–да 1840 г.)[145].

Значны след у гісторыі XVIII ст. пакінуў таксама сын Ігнацыя Аляксандравіча Сымон (1747–1835). Ён займаў пасады мастаўнічага пінскага (1776-1788), мечніка пінскага (1788–1792), падчашага Пінскага пав. (1793), дэпутата Галоўнага Літоўска-га трыбунала (з 1776 г.) і дэпутата Чатырохгадовага сейма (з 1790 г.), маршалка шляхты Берасцейскага ваяводства і маршалка шляхты Пінскага пав. (1812). Дзяку-ючы хуткаму кар'ернаму росту і шлюбу з Эльжбетай Ажэшка ён сабраў значны ка-пітал. Сярод дакументаў Бібліятэкі Польскай Акадэміі навук у Кракаве захавалася шмат квіткоў, якія сведчаць пра пэўную фінансавую залежнасць гетмана Міхала Казіміра Агінскага ад мечніка пінскага[146]. Ён спачатку арандаваў у гетмана землі на Піншчыне і на Ашмяншчыне, а ў 1792 г. выкупіў у Агінскіх маёнтак Моладава з фальваркам Парэчча. Пачалася гісторыя моладава-парэчскай галіны роду[147].

Плотніца засталася сынам Тамаша Міхайлавіча – выпускніку Віленскага ўні-версітэта, «кандыдату філасофіі» (1811) Адаму і маршалку шляхты Пінскага пав. Аляксандру. У 1820 г. яны падзялілі маёнтак паміж сабой[148].

У лістападзе 1802 г. Скірмунты былі прызнаны «древними и родовыми пол-ными дворянами» і запісаны ў шостую частку Радаводнай кнігі Менскай губ. Шляхецтва Скірмунтаў пацвярджалася ў 1811, 1820 і 1829 гг.

Яшчэ адна лінія роду Скірмунтаў мела татарскае паходжанне. Станіслаў Дзя-дулевіч у *Herbarze rodzin tatarskich w Polsce* распавёў пра татарскі княжы род Кады-шэвічаў (Аксак-Мірза). Прадстаўнікі гэтага роду сыны Найманскага харунжага Асана, а менавіта Абрахім і Багдан, іх пляменнік Алей Ахміцевіч у 1631 г. прынялі прозвішча *Скірмунт*[149]. Паводле Дзядулевіча, Кадышэвічы захавалі ўласны герб, які з гэтага часу пачаў называцца герб Скірмунт. Аднак дакументы Дэпартамента

---

[143] Biblioteka naukowa PAN i PAU w Krakowie. Zbiory specjalne, j. 4391, k. 146–147.

[144] У. Вяроўкін-Шэлюта, *Скірмунты*..., с. 321. Вынікі экспедыцыі па Піншчыне ў 2004 г. дазваляюць лічыць верагодным месцам пахавання Адама Скірмунта могілкі в. Ахова Пінскага раёна.

[145] У. Вяроўкін-Шэлюта, *Скірмунты*..., с. 321–322.

[146] Biblioteka naukowa PAN i PAU w Krakowie. Zbiory specjalne, j. 4458; j. 4462, т. 1; j. 4463, т. 2.

[147] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2969, арк. 160–162; А. Федорук, *Старинные усадьбы Берестейщины*, с. 32–41.

[148] А. Федорук, *Старинные усадьбы Берестейщины*, с. 32–41.

[149] *Herbarz rodzin tatarskich w Polsce*. Opr. Stanislaw Dziadulewicz. Wilno 1929, s. 295.

герольдыі сведчаць, што прынамсі ў XVIII ст. татарскі род Скірмунтаў карыстаўся гербам «Прыяцель».

Пра перайманне адным з татарскіх родаў на Гарадзеншчыне прозвішча *Скірмунт* пісаў таксама расійскі даследчык Станіслаў Думін[150]. Вядомы публіцыст пачатку XX ст. Чэслаў Янкоўскі ў даследаванні гісторыі Ашмянскага пав. (1896) у пераліку найбольш уплывовых татарскіх родаў («татары дагестанскія») назваў род Аксак – эмірза – Скірмунты[151]. Прычыны гэтага пераймання вядомыя. Такім чынам прадстаўнікі татарскіх родаў Рэчы Паспалітай у XVII ст. імкнуліся падкрэсліць лаяльнасць да дзяржавы. Зразумела, без дазволу Скірмунтаў перадача прозвішча была немагчымай.

Паводле С. Дзядулевіча, Скірмунты татарскага паходжання жылі пераважна на Гарадзеншчыне. Гэта пацвярджаюць і матэрыялы Дэпартамента герольдыі. У 1847 г. разглядалася справа пра шляхецтва Мустафы і Асмана Скірмунтаў з Сакольскага пав. Дакументы пацвярджалі іх паходжанне ад Найманскага харунжага Багдана Асанавіча Скірмонта герба «Прыяцель». Таксама ў справе фігураваў палкоўнік Ахмет Скірмунт, які валодаў вёскамі Драгна, Горныя, Панятовічы і Каменка[152].

У перыяд Рэчы Паспалітай прадстаўнікі роду займаліся пераважна гаспадарчай дзейнасцю або знаходзіліся на адміністрацыйных ці вайсковых пасадах ніжэйшага і сярэдняга ўзроўню. Духоўную кар'еру сярод Скірмунтаў выбіралі адзінкі. Так, у Энцыклапедыі Брактауза і Эфрона згаданы суфраган жамойцкі і біскуп уцянскі Іяхім Скірмунт, які памёр у 1781 г.[153] Вядомы даследчык гісторыі ордэна езуітаў Людвік Гжэбень паведаміў пра ксяндза Яна Скірмонта (Скірмунта) (1667–1718), прафесара граматыкі, паэтыкі і рыторыкі, а таксама аўтара драматычных твораў[154]. Ён уступіў у ордэн у верасні 1688 г. у Вільні. На пачатку XVIII ст., у перыяд Паўночнай вайны быў прэфектам школ і бібліятэкі ў Наваградку, Драгічыне і Пінску, рэгенсам канвікту[155] Клакоцкага ў Слуцку, потым – місіянерам у Чарнігаве, а памёр у Бабруйску на пасадзе суперыёра[156] *Society of Jesus*. Таксама

---

[150] С. Думін, *Татарская шляхта на ўсходніх землях былой РП у 1795–1999 гг.* (у:) *Europa nie prowincjonalna. Przemiany na ziemiach wschodnich dawnej Rzeczypospolitej (Białorus, Litwa, Łotwa, Ukraina, wschodnie pogranicze III Rzeczypospolitej Polskiej) w latach 1772–1999*. Pod redakcją K. Jasiewicza. Warszawa 1999, s. 537.

[151] Cz. Jankowski, *Powiat Oszmiański. Częsc pierwsza*. Petersburg 1896, s. 240.

[152] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3569, л. 1.

[153] *Энциклопедический словарь*. Издатели Ф. А. Брокгауз и И. А. Ефрон. Т. 30 (59): Сим-Слюзка. Санкт-Петербург 1900, с. 200.

[154] *Encyklopedia wiedzy o jezuitach na ziemiach Polski i Litwy, 1564–1995*. Opracował Ludwik Grzebien S J przy współpracy zespołu jezuitow. Krakow 1996.

[155] Регенс канвікту – кіраўнік інтэрнату для вучняў калегіума.

[156] Суперыёр узначальваў «dom zakonny». Гэта была найменшая адміністрацыйная адзінка ордэна. У 1630–1633 гг. гэтую пасаду ў Бабруйску займаў св. Андрэй Баболя.

варта згадаць манаха ордэна базыліян Пятра Дамініка, прадстаўніка пятага «калена» роду, які фігураваў у дакументах, прад'яўленых Менскаму шляхецкаму сходу ў 1802 г.[157]

Такім чынам, Скірмунты па-за легендарнай часткай радаводу не належалі да эліты Вялікага Княства Літоўскага. Сярод іх нячаста сустракаліся выбітныя асобы, якія мелі ўплыў на прыняцце важных палітычных рашэнняў. Скірмунты XV–XVIII стст. – гэта адзін са шматлікіх шляхецкіх родаў Беларуска-Літоўскага краю, які служыў яму на розных грамадскіх і адміністрацыйных пасадах і панаваў на сваіх «загродах».

Вельмі важную рысу гэтага роду адзначыў Браніслаў Залескі ў кнізе, прысвечанай Алене Скірмунт (1874). Ён пісаў, што род Скірмунтаў быў адным з тых, каго называлі «гнездавымі», бо яго пачатак быў звязаны з пачаткамі самой шляхты, і Скірмунтаў ніхто не мог назваць чужынцамі. Наколькі сягала чалавечая памяць, яны належалі да спрадвечаных жыхароў Беларуска-Літоўскага краю[158].

У апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай Скірмунты здолелі ўмацаваць свае пазіцыі і парадніліся з Друцкімі-Любецкімі, Бутрымовічамі, Твардоўскімі, Сулістроўскімі, Ажэшкамі ды інш.

Крона «Дуба»

XIX стагоддзе ў гісторыі Беларуска-Літоўскага краю стала перыядам вялікіх перамен, якія непасрэдна датычылі шляхецкага саслоўя. Іх галоўным зместам быў працэс палітычнай і эканамічнай дэградацыі шляхты, яе паступовы сыход з гістарычнай арэны. Важным элементам гэтага працэсу была працэдура г. зв. «разбору шляхты», ініцыяваная расійскімі ўладамі. Шляхта была вымушана прад'яўляць дакументы, якія пацвярджалі шляхецкасць, і чакаць рашэння чыноўнікаў з Дэпартамента герольдыі. Зрабіць гэта па розных прычынах было складана. Паводле падлікаў беларускай даследчыцы Сузанны Самбук, у 1868–1869 гг. у Менскай губ. пацвердзілі шляхецтва толькі 53,4 % усіх, хто падаваў дакументы (10 850 чал.)[159]. Іншых запісвалі ў катэгорыю «сялян-аднадворцаў».

Пераважная большасць незаможнай шляхты, каб выжыць павінна была сама адмовіцца ад прэтэнзій на пэўныя прывілеі і ўтрымлівацца коштам уласных намаганняў. Са шляхтай былой Рэчы Паспалітай іх яднала толькі ўсведамленне ўласнай шляхецкасці, якое насуперак расійскай палітыцы г. зв. «дэпаланізацыі», звычайна спалучалася з пачуццём польскасці. Пры гэтым захоўвалася этнакультурная адметнасць мясцовай шляхты ад насельніцтва этнічных польскіх земляў,

---

[157] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2969, арк. 159.

[158] B. Zaleski, *Z zycia Litwinki. 1823–1874. Z listow i notatek*. Poznań 1876, s. 7–8.

[159] С. Самбук, *Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в.* Минск 1980, с. 38.

пра якую ў 1908 г. пісаў адзін з ідэолагаў краёвасці Міхал Ромэр[160]. Складанасць феномена свядомасці шырокіх колаў шляхты адлюстравалася таксама ў моўнай сітуацыі. Польская даследчыца Зофія Кужова (Zofia Kurzowa) звярнула ўвагу на феномен білінгвізму, калі польская мова станавілася мовай кантактаў звонку, а беларуская ці літоўская мовы захоўвалі пазіцыі першай і хатняй[161].

Больш істотным фактарам дэградацыі шляхты сталі сацыяльна-эканамічныя працэсы, звязаныя з эпохай мадэрнізацыі, якая паступова ахоплівала еўрапейскую частку Расійскай імперыі. Традыцыйнае грамадства паступова трансфармавалася ў грамадства сучаснае. Гэта выяўлялася ў яго ўрбанізацыі, рацыяналізацыі свядомасці і дзейнасці, змяншэнні ролі рэлігіі ў грамадскім жыцці, дэмакратызацыі і нівеліяванні сацыяльных адрозненняў ды інш.

Аналіз матэрыялаў Дэпартамента герольдыі сведчыць, што шматлікія прадстаўнікі роду Скірмунтаў не мелі праблемы з пацвярджэннем шляхецтва. Але і яны павінны былі прыкладаць намаганні, каб даказаць уласную прыналежнасць да прывілеяванага саслоўя.

Гэтыя намаганні дазваляюць сучасным даследчыкам убачыць не толькі тых Скірмунтаў, якія сталі свайго роду «візіткай» роду і звычайна фігуруюць ва ўсіх публічных радаводах, але таксама іншых, што не пакінулі прыкметнага следу ў аналах гісторыі. Магчыма, гэта пра іх жартавалі палешукі яшчэ на пачатку XX ст.: *Шчо ні морда, то Орда, шчо ні шпунцік то Скірмунцік*. Аднак дакументы Дэпартамента герольдыі спрыяюць усведамленню, што без гэтых «іншых» немагчыма зразумець гісторыю роду Скірмунтаў, і, што яны маюць не меншае права прысутнічаць у радаводах, чым вядомыя палітыкі і прадпрымальнікі.

Матэрыялы, прадстаўленыя Скірмунтамі ў Магілёўскі шляхецкі сход у 1834 г., утрымліваюць звесткі пра харунжага прускай арміі Тадэуша Скірмунта, які тэстаментам 1784 г. перадаваў маёнтак Вяляцічы Ашмянскага пав. сынам Юстыну, Міхалу і Станіславу. Юстын 12 гадоў праслужыў на расійскай Белянскай мытнай заставе *Самогитской провинции*, якая знаходзілася на старой мяжы паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай і была створана расійскімі ўладамі ўжо пасля першага падзелу краіны (1773). Ён быў звольнены ў 1794 г. з характарыстыкай, што «вёл себя как найлучше»[162]. Варта адзначыць, што сваіх сыноў Яна (1802 г. нар.) і Іосіфа (1804 г. нар.) ён хрысціў у грэка-каталіцкай царкве.

Ягоны брат Міхал з 1799 па 1828 г. быў упраўляючым маёнткамі ў Віцебскай, Менскай і Магілёўскай губ. і рабіў «честно, примерно и трезво»[163], што пацвярджалі 10 (!) атрыманых ім атэстатаў. Сына Аляксандра (1821 г. нар.) таксама хрысціў ва ўніяцкай царкве ў Бабруйскім пав. У 1828 г. ён набыў маёнтак у Быхаўскім пав.

---

[160] M. Römer, *Litwa. Studyum o odrodzeniu narodu litewskiego*. Lwow 1908, s. 24.

[161] Z. Kurzowa, O *mowie Polakow na kresach wschodnich*. Krakow 1993.

[162] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3567, л. 26.

[163] Тамсама, л. 14.

Уніяцкі сюжэт у радаводзе Скірмунтаў можна дапоўніць звесткамі пра сыноў харунжага Пятра Скірмунта Яна (1800 г. нар.) і Стэфана (1803 г. нар.), якія былі хрышчаны ва ўніяцкай Рухоцкай царкве Пінскага пав.

Хрышчэнне ва ўніяцкіх цэрквах дзяцей старажытнага каталіцкага роду ў перыяд Расійскай імперыі – варты ўвагі феномен. Асабліва з улікам таго, што пераследу каталіцкага касцёлу на рубяжы XVIII–XIX ст. не было. Зрэшты, як і ўніяцкай царквы. Як вядома, імператар Павел I адмовіўся ад антыўніяцкай палітыкі Кацярыны II.

Трэба адзначыць, што хрышчэнне дзяцей ва ўніяцкіх храмах практыкавалася Скірмунтамі і раней. Так, у 1793 г. у маёнтку Сяляцічы на Піншчыне быў хрышчаны святаром Фамой Рабановічам Адам Людвік Скірмунт[164], які ў 1811 г. атрымаў дыплом «кандыдата філасофіі» Віленскага ўніверсітэта. Аднак у 1799 г. манах францысканец Пётр Твароўскі ў касцёле Пінска правёў над ім адмысловы абрад увядзення ў каталіцкі касцёл.

Дакументы геральдычных камісій таксама паведамляюць пра Іосіфа Мустафавіча Скірмунта, сына адстаўнога карнета расійскай арміі, які Беластоцкім шляхецкім сходам быў прызнаны шляхцічам у 1818 г. Ён наогул не меў нерухомай маёмасці і арандаваў фальварак у Навагрудскім пав.[165] Не меў уласнасці таксама Станіслаў Скірмунт, які трапіў у Спіс шляхты Дзісенскага пав. (1864). Ён «працаваў на зямлі» і, як дадалі складальнікі спісу, быў «палітычна дабранадзейным, у бунце не ўдзельнічаў»[166].

Незаможнасць згаданых прадстаўнікоў роду абумовіла даволі гарачыя спрэчкі паміж імі пасля смерці Міхаіла Міхайлавіча Скірмунта, які памёр у 1884 г. у Крыме, не пакінуўшы спадкаемцаў. У гэтых судовых спрэчках удзельнічалі магілёўскія, беластоцкія і віленскія Скірмунты. На жаль, матэрыялы Дэпартамента герольдыі не дазваляюць ацаніць спадчыны памерлага. Вядома толькі, што ягоны бацька адстаўны штабс-капітан Міхаіл Стэфанавіч Скірмунт наогул не меў нерухомай маёмасці, а маці памерлага валодала фруктовым садам каля Сімферопаля і 9 «душамі обоего пола»[167].

Вайсковая кар'ера вабіла Скірмунтаў. Ужо згаданы Міхаіл Стэфанавіч Скірмунт як афіцэр расійскага войска ўдзельнічаў у вайне з Турцыяй 1829–1831 гг., быў паранены і ўзнагароджаны срэбным медалём. Не задаўся вайсковы лёс Феліцыяна Скірмунта, які ў складзе Эстляндскага пяхотнага палка ўдзельнічаў у франка-расійскай вайне 1812 г. Падчас ваенных дзеянняў на тэрыторыі Саксоніі ў 1813 г. ён трапіў у палон. Пасля вызвалення (1814) выйшаў у адстаўку ў чыне

---

[164] Тамсама, д. 3574, л. 140.

[165] ЛДГА. Ф. 391, воп. 6, спр. 665, арк. 80.

[166] Ibidem, спр. 2057, арк. 19.

[167] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3575, л. 13.

падпаручніка[168]. На іншым баку былі сімпатыі маршалка шляхты Пінскага пав. Сымона Скірмунта, які пры адступленні расійскага войска не дапусціў знішчэння запасаў збожжа ў Пінску, а пасля прыходу войск Напалеона арганізаваў шыкоўны баль і банкет, на які былі прывезены запасы віна з Моладава[169].

Стрыечны брат Феліцыяна Стэфан Пятровіч Скірмунт, хрышчаны таксама ва ўніяцкай царкве, быў звольнены ў адстаўку (1833) у чыне паручніка з мундзірам і «пенсионам полного жалованья». У архіве захаваліся копіі імператарскіх указаў.

ДАКУМЕНТ

Указы Мікалая I датычна вайсковай службы Стэфана Скірмунта (Скірмонда, Скірмунда). 1831–1832 гг. Фрагменты[170]

Подпоручику Литовского гренадерского полка Скирмунду. В воздаяние ревностной вашей службы и отличия, оказанного вами в сражении против польских мятежников 8 февраля 1831 г., вы мужеством и храбростью подавая собою пример, поощряли людей к поражению неприятеля, нанося ему большой вред сильным огнем стрелков, причем вы тяжело контужены ядром в грудь, Всемилостивейше пожаловали мы вас Указом в 2-й день августа 1831 г. капитулу данным Кавалером ордена св. Анны 4-й степени с натписью за храбрость […]

Подпоручику Луцкого гренадерского полка Скирмонду. В воздаяние ревностной вашей службы и отличного мужества и храбрости, оказанных при штурме Варшавских укреплений […], пожаловали мы вам Указом в 19-й день мая 1832 г. капитулу данным орден св. Анны 3-й степени с бантом […]

Відавочна, што пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Скірмунты апынуліся ў розных палітычных лагерах. Стрыечны брат Стэфана Ігнацы Скірмунт быў абвінавачаны ва ўдзеле ў паўстанні 1830–1831 гг. Інфармацыю пра гэта ўлады атрымалі толькі ў 1850 г. ад салдата-дэзерціра, які паведаміў, што ў 1831 г. у лясах Ігнацыя Скірмунта (маёнтак Туляцін на Піншчыне) у адмысловым лагеры збіраўся паўстанцкі атрад (да 50 чал.). Гэты атрад аб'яднаўся з атрадам Цітуса Пуслоўскага. Пасля разгрому паўстанцаў іх камандзір нейкі час хаваўся ў сядзібе Скірмунтаў[171].

Пінскі земскі суд распачаў следства, якое ўстанавіла датычнасць І. Скірмунта да «мятежных действий». Мінскае губернскае праўленне прыняло рашэнне ўнесці яго імя ў спіс асобаў «принимавших участие в злоумышленных противу

---

[168] Тамсама, л. 163.

[169] H. Skirmunt, Z *dziejow Pinszczyzny. Trzy najazdy: 1709–1812–1915*, «Gazeta Warszawska». 1925, Nr 154, 6 czerwca,.

[170] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3575, л. 115.

[171] Государственный архив Российской Федерации (далей: ГАРФ). Ф. 109, оп. 25, д. 280, л. 1–1 адв.

правительства предприятиях». Але гэта не было зроблена, бо за «мяцежніка» заступіўся... віленскі генерал-губернатар Ілля Бібікаў. Ён звярнуўся з лістом да начальніка Корпуса жандараў генерала Л. Дубельта, у якім нагадаў пра ўказ Мікалая I (1832) наконт забароны весці следства адносна новых удзельнікаў паўстання, калі гэта не яго ініцыятары і кіраўнікі. Бібікаў прапанаваў пакараць парушальнікаў імператарскага ўказу. Дубельт пагадзіўся з ім, і Ігнацы Скірмунт пазбег пакарання[172].

Прычыны гэтага заступніцтва застаюцца таямніцай. Але варта адзначыць, што Скірмунты на Палессі адыгрывалі значную ролю ў гаспадарчым жыцці і займалі высокія пасады ў органах шляхецкага самакіравання. Менавіта Скірмунты з 1811 па 1838 г. былі маршалкамі шляхты Пінскага пав. – Сымон (1811–1814), Адам Тамашавіч (1814–1817 і 1835–1838) і Аляксандр Сымонавіч (1823–1835)[173]. Магчыма, гэта адыграла пэўную ролю ў лёсе Ігнацыя Скірмунта.

Пра моцныя пазіцыі Скірмунтаў на Піншчыне сведчыць таксама рэестр шляхты Пінскага пав. за 1815 г. У рэестры фігуравалі былы падкаморны Пінскага пав. Адам Станіслававіч Скірмунт (82 г.) як уладальнік маёнткаў Рухна і Калоднае (2 044 прыгонныя «душы обоего полу»), маршалак павятовай шляхты Адам Тамашавіч (25 г., Вяляцічы, 500 прыгонных), харунжы павету Аляксандр Тамашавіч (24 г., Чарвенічы, 489), былы маршалак шляхты Сымон Ігнацьевіч (64 г., Парэчча і Альбрэхтова, 1 897), былы падсудак земскі Каспер Аляксандравіч (42 г., Кашавічы, 240), былы суддзя земскі Амброжы Аляксандравіч (40 г., Бакінічы, 200), суддзя гранічны павета Антон Аляксандравіч (36 г., Плоскінь, 440), былы шамбелян Ігнацы (30 г., Туляцін, 110), паручнік польскага войска Каэтан Васільевіч (52 г., Зарэчча, 350), харунжы Пётр Андрэеевіч (54 г., Плотніца, 34), харунжы Якуб (54 г.) і стараста павета Антон Норбертавіч (30 г.)[174]. Сын Сымона Скірмунта Аляксандр у 1826 г. стаў старшынём Пінскага межавага суда, а праз тры гады быў абраны маршалкам шляхты Пінскага пав. На гэтай пасадзе ён заставаўся і ў 1835 г.[175]

Пасямейныя спісы шляхты II разраду Пінскага пав. за 1834 г. пацвердзілі моцныя пазіцыі Скірмунтаў у эканоміцы і грамадскім жыцці рэгіёна. У спісе згаданыя Антон Пятровіч (38 г.), які жыў з сям'ёй ва ўласным доме ў Пінску, былы падкаморны Пінскага пав. Каспер Аляксандравіч (60 г.) як уладальнік маёнтка Кашавічы (373 прыгонныя «душы»), былы суддзя Пінскага павятовага суда Амброжы Аляксандравіч (56 г., Бакінічы, 361), былыя суддзі павятовага межавага суда Антон Аляксандравіч (55 г., Плоскінь, 398), Ігнат Ануфрыевіч (44 г., Туляцін, 476) і Іосіф Іванавіч (48 г., Відзібор, 192), Франц Якубавіч (39 г., Плотніца, 137),

---

[172] Тамсама, л. 3.

[173] *Алфавитный список дворянским родам Минской губ., внесенным в дворянскую родословную книгу па 1 июля 1903 г.* Минск 1903, с. 145.

[174] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 69а, арк. 32–34.

[175] Тамсама, спр. 952, арк. 4–6, 37.

маршалак шляхты павета і камер-юнкер Аляксандр Сымонавіч (34 г., Парэчча, 2 195), былыя маршалкі павятовай шляхты Адам Тамашавіч (42 г., Вяляцічы ды інш., 1 875) і Аляксандр Тамашавіч (40 г., Рум ды інш., 1 255) ды інш.[176]

Большасць згаданых Скірмунтаў вяла звычайнае шляхецкае жыццё, якое грунтавалася на больш ці менш эфектыўным прыгнёце «душ абоего полу». Толькі некаторыя прадстаўнікі роду ступілі на шлях рэфармавання ўласных маёнткаў і паступова ператварыліся ў паспяховую дынастыю прадпрымальнікаў. Гаворка ідзе ў першую чаргу пра ўладальнікаў маёнткаў Парэчча Пінскага пав. Менскай губ. і Моладава Кобрынскага пав. Гарадзенскай губ.

Як ужо адзначалася, гэтыя землі напрыканцы XVIII ст. Сымон Скірмунт выкупіў у Агінскіх. Агінскія аказаліся не вельмі добрымі гаспадарамі. Іх палескі маёнтак не даваў прыбытку і быў абцяжараны вялізнымі даўгамі. Сымон Скірмунт пачаў гаспадарыць з пабудовы ўласнага палаца, які павінен быў замяніць старую сядзібную забудову Агінскіх. Такі традыцыйны пачатак для амбіцыёзнай і багатай шляхты…

Палітык і дыпламат першай трэці XX ст. Канстанцін Скірмунт успамінаў, што мастаўнічы пінскі, маршалак шляхты Пінскага пав. і дэпутат сейма Сымон Скірмунт, які ажаніўся на Эльжбеце з Ажэшкаў (герб «Кораб»), быў адным з найбагацейшых жыхароў Палесся. У Моладаве спачатку была збудавана мураваная сядзіба (1795), а пазней (1798) пад кіраўніцтвам архітэктара фон Гроса – прыгожы палац, прызнаны за адзін з найпрыгажэйшых у тагачаснай гістарычнай Літве[177].

Француженка Роза Белі, генеральны сакратар *Les Amis de la Pologne*, якая наведала Моладава ў 1936 г., прызнавалася, што ёй гэты палац нагадваў «мару пры святле месяца пад цудоўную музыку Моцарта»[178]. Ягоныя пакоі ўпрыгожвалі партрэты Скірмунтаў і Ажэшкаў. Атачалі палац дрэвы парка ў англійскім стылі.

Выключную ролю ва ўзвышэнні роду і пераўтварэнні палескай лініі Скірмунтаў у дынастыю славутых прадпрымальнікаў адыграў сын Сымона Аляксандр Ізідар (1799–1870). Дзякуючы яго прадпрымальніцкім здольнасцям і гаспадарчай актыўнасці, уладанні Скірмунтаў на Піншчыне ператварыліся ў свайго роду плацдарм фабрычнай прамысловасці ў Беларусі.

Аляксандр Скірмунт закончыў фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта (1818) і працягнуў адукацыю па-за межамі Расіі. Ва ўніверсітэтах Германіі і Францыі ён вывучаў хімію і прайшоў практыку на адной з фабрык як звычайны рабочы. Дадому вярнуўся ў 1823 г. У тым жа годзе ажаніўся з дачкой менскага гу-

---

[176] ЛДГА. Ф. 391, воп. 6, спр. 612, арк. 199, 264, 265, 308–309.

[177] K. Skirmunt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*; wstęp i oprac. E. Orlof, A. Pasternak. Rzeszow 1997, s. 19.

[178] Цытата па: А. Киштымов, *Скирмунты: династия предпринимателей*, «Деловой вестник». 1994. № 9–10.

бернатара Канстанцыяй Суліcтроўскай[179] і ўзяў у свае рукі кіраванне сямейнай гаспадаркай[180]. На той час яна ўключала маёнткі Моладава (з фальваркам Парэчча), Альбрэхтова, Кажанёва і Клетна ў Кобрынскім пав. Гарадзенскай губ. і Пінскім пав. Менскай губ. Акрамя таго, у пасаг за жонку атрымаў маёнтак Шаметаўшчына ў Свенцянскім пав. Віленскай губ. (сучасная в. Шэметава Мядзельскага раёна). Агульная плошча зямельных уладанняў перавышала 33 тыс. га[181].

Аляксандр Скірмунт заняўся гаспадаркай, імкнучыся выкарыстаць набытыя веды. У 1830 г. у Моладаве пачала дзейнічаць цукроўня, адна з першых у Беларусі. У 1836 г. у Парэччы, якое ў гэты час вылучылася ў асобны маёнтак, распачаўся выпуск прадукцыі суконнай фабрыкі, якая праславіла Скірмунтаў амаль на ўсёй тэрыторыі імперыі.

Гаворка пра прамысловасць Парэчча яшчэ наперадзе, а пакуль варта адзначыць, што эканамічныя пераўтварэнні Аляксандр Сымонавіч Скірмунт спалучаў з незвычайнай для таго часу сацыяльнай палітыкай. У прыватнасці, будаваліся дамы для сямейных рабочых, дзейнічаў шпіталь, было арганізавана прафесійнае навучанне для дзяцей.

Апрача таго, у Моладаве дзейнічаў вінакурны завод. Аляксандр Скірмунт таксама меў дачыненне да адкрыцця фабрыкі свечак і туалетнага мыла ў Альбрэхтове, паравога млына ў Пінску ды інш.

У шлюбе з Канстанцыяй Суліcтроўскай (1806–1845) нарадзілася 11 дзяцей: шасцёра сыноў – Казімір (1824–1877), Канстанцін (1828–1880), Аляксандр (1830–1909), Сымон (1835–1902), Генрык (1836–1916), Зыгмунт (1839–1863) і пяцёра дачок – Караліна (1826?–1916), Антаніна (1825–?), Эмілія (1833–1905), Канстанцыя і Гартэнзія (памерла ў маладосці).

Казімір Скірмунт як уладальнік маёнтка Калоднае прадстаўляў Пінскі пав. у Менскім губернскім Камітэце паляпшэння сялянскага жыцця (1858), а пасля адмены прыгону ў 1861 г. актыўна працаваў як міравы пасярэднік. Падчас паўстання 1863 г. ён пакінуў гэтую пасаду і адмовіўся падпісаць «адрас» на імя імператара, у якім менская шляхта выказвала сваю адданасць расійскаму прастолу. Быў арыштаваны і змешчаны разам з іншымі былымі міравымі пасярэднікамі, якія таксама адмовіліся ад пасады, у гмаху Менскага шляхецкага схода, а потым высланы ў Кастраму. Як удзельніца паўстання была выслана ў Тамбоў і ягоная жонка, таленавіты скульптар Алена Скірмунт (1827–1874).

Маёнткі падвергліся прымусоваму продажу. Дачку Канстанцыю (1851–1934), якая стане вядомай грамадскай дзяячкай і публіцысткай, выхоўвала бабуля

---

[179] Cz. Jankowski, *Powiat Oszmianski. Częsc druga*. Petersburg 1897, s. 35 (Чэслаў Янкоўскі ў сваёй кнізе згадаў пра «шумнае вяселле» 1823 г. у Варнянах на Ашмяншчыне).

[180] N. Orda, *Aleksander Skirmunt*, «Tygodnik ilustrowany». 1871. Nr 175.

[181] St. Konarski, *Skirmunt Aleksander (1798–1870)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. T. XXXVIII/2, zeszyt 158, s. 174

Гартэнзія Скірмунт (з Ордаў). Пасля вяртання з ссылкі ў 1867 г. Казімір, якому не дазволілі застацца на Меншчыне, атрымаў ад бацькі падарунак у выглядзе балаклаўскіх вінаграднікаў і паехаў у Крым. Алена Скірмунт разам з дачкой Канстанцыяй далучыліся да яго праз два гады.

У гісторыю мастацтва земляў гістарычнай Літвы Алена Скірмунт увайшла як першая жанчына, якая прафесійна займалася скульптурай. Вучылася ў мастакоў і скульптараў з Берліна, Вены і Рыма і ўласным талентам ламала гендарныя стэрэатыпы. Яе творы дэманстраваліся на выставах у Львове, Варшаве і Кракаве ў 1870–80-я гг.

Найбольш вядомым творам Алены Скірмунт былі «гістарычныя шахматы», фігуры якіх увасаблялі паход караля Яна III Сабескага на Вену падчас вайны з Асманскай імперыяй (1683). Стварэнне шахмат пачалося ў 1864 г. Фігуры прызначаліся для ўдзельнікаў паўстання, якіх высылалі ў Сібір. Пасля вяртання з ссылкі яна працягнула працу над імі. Усяго было створана 12 фігур войска Рэчы Паспалітай і 10 – Асманскага войска. У 1873 г. у Вене гэтыя фігуры былі адлітыя з бронзы і пакрытыя срэбрам або золатам. Пазней яны распаўсюджваліся ў выглядзе літаграфій і фотаздымкаў[182]. Браніслаў Залескі назваў іх «гістарычнай паэмай»[183].

Канстанцін атрымаў маёнтак Шаметаўшчыну і заняўся добраўпарадкаваннем як сваёй гаспадаркі, так і сялянскіх. Ён быў ініцыятарам стварэння Таварыства ўзаемнага крэдыта з удзелам сялян, што спрыяла іх вызваленню ад ліхвярства, выдаткоўваў значныя сродкі на культурныя і гаспадарчыя патрэбы. Падчас паўстання 1863 г. быў арыштаваны і зняволены ў Менску па справе Зыгмунта Серакоўскага[184]. Аднак па выніках следства быў вызвалены і вярнуўся ў Шаметаўшчыну.

Сын Канстанціна Скірмунта і Габрыэлы Умястоўскай Казімір (1861–1931) стаў вядомым юрыстам і рэлігійным дзеячам, які на пачатку XX ст. быў пасярэднікам паміж польскім епіскапатам і Апостальскай сталіцай, а ў 1919 г. заняў пасаду кананічнага дарадцы пасольства Польшчы ў Ватыкане[185]. Ягоны брат Баляслаў стаў пісьменнікам, аўтарам біяграфіі Казіміра[186]. Сястра Марыя (1858–1907) вучылася ў Вышэйшай школе Баранецкага ў Кракаве і цікавілася батанікай. Пазней,

---

[182] J. Polanowska, *Skirmuntowa (Skirmunttowa, Skirmuntt) Helena (1827–1874)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 187–189; Б. Залескі, З *жыцця літвінкі. З лістоў і нататак. 1823–1874*. Мінск 2009.

[183] Б. Залескі, З *жыцця літвінкі*..., с. 312.

[184] Бібліятэка Віленскага ўніверсітэта (далей: БВУ). Адзел рукапісаў F 33, j. 702 a. З ліста Рамана Скірмунта да Мар'яна Здзяхоўскага ад 11 верасня 1931 г.

[185] H. Fokcinski, *Skirmunt Kazimierz (1861–1931)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2, zeszyt 158, s. 177–178.

[186] B. Skirmunt, W *służbie Kościoła i Polski. Ks. Dr Kazimierz Skirmunt*. Wilno 1931.

ужо як Марыя Твардоўская працавала ў рэдакцыі часопіса «Zielnik Flory Polskiej», збірала гербарый, які перадала Таварыству сяброў навукі ў Познані[187].

Брат Канстанціна Зыгмунт стаў доктарам філасофіі Гейдэльбергскага ўніверсітэта, але яго жыццё абарвалася ў 24-гадовым узросце. Сымон уладарыў у маёнтку Клетна, аднак больш цікавіўся жывапісам, чым гаспадаркай. Таксама валодаў вінаграднікамі ў в. Перыно паблізу Брындызі ў Італіі. Генрыку дасталася моладаўская гаспадарка, якую ён зрабіў узорнай. Тут быў уведзены чатырохпольны і васьміпольны севазвароты, разводзілі пародзістую скаціну. Сметанковае масла з Моладава ішло на экспарт у Данію і Англію.

Парэчча атрымаў Аляксандр Аляксандравіч, які паспяхова кіраваў прамысловым цэнтрам у Парэччы, актыўна дзейнічаў падчас падрыхтоўкі і ажыццяўлення аграрнай рэформы 1861 г. і заслужыў павагу сялян і памешчыкаў на пасадзе міравога пасярэдніка. Быў адным з заснавальнікаў Таварыства дабрачыннасці ў Пінску, павятовага Сельскагаспадарчага таварыства, а таксама Пінскага банка ўзаемнага крэдыту, які сам і ўзначаліў. Ён таксама ўдзельнічаў у паўстанні 1863 г. Паводле ўспамінаў Якуба Гейштара, Аляксандр Скірмунт быў праціўнікам узброенай барацьбы, але аказаў паўстанцам важныя паслугі. Між іншым, перавозіў у карэце кіраўніка паўстання Рамуальда Траўгута[188]. Магчыма, толькі самаахвярнасць сяброў і аднадумцаў дазволіла пазбегнуць рэпрэсій і захаваць уладанні.

У ягоным шлюбе з Тэафілай Любаньскай (1836–1928) нарадзілася 10 дзяцей. Адным з іх быў Раман Скірмунт. Разам з ім у Парэцкім маёнтку выхоўваліся браты Аляксандр (1858–1940), Вацлаў (1867–1872), Зянон (1874–1910) і сёстры Тэафіла (1857–1935), Браніслава (1864–1916), Ванда (1866–1954), Феліцыя (1873–1950) і Алена (1869–1943?)[189]. У дакументах Дэпартамента герольдыі згадваўся таксама Юзаф, які нарадзіўся ў 1862 г., але падобна, што ягонае жыццё было вельмі кароткім.

У суседнім Моладаве ў шлюбе Генрыка Скірмунта з Марыяй Твардоўскай (1840–?) нарадзілася 4 дзяцей – Канстанцін (1866–1949), Генрык (1868–1939), Марыя (1870–1939) і Ядвіга (1874–1968).

Найбольш вядомым з іх быў Канстанцін Скірмунт. Ён вучыўся ў Мікалаеўскай гімназіі ў Лібаве, працягваў навучанне ў Пецярбурзе, дзе ў 1887 г. атрымаў дыплом «кандыдата права». Наступныя два гады служыў у Сенаце, а потым па просьбе бацькі выйшаў у адстаўку і вярнуўся ў Моладава, каб займацца гаспадаркай. На пачатку XX ст. стаў адным з заснавальнікаў Гарадзенскага сельскагаспадарчага таварыства і з'яўляўся ягоным фактычным кіраўніком з 1902 па 1905 г. У верасні 1904 г. удзельнічаў у адкрыцці помніка Кацярыне II у Вільні і атрымаў прыдвор-

---

[187] Fr. Chłapowski, *Maria Twardowska z Skirmuntow. Notka biograficzna.* [Poznan] 1908.

[188] J. Gieysztor, *Pamiętniki z lat 1850–1865.* Tom I. Wilno 1913, s. 402.

[189] НГАБ. Ф. 295, воп. 2, спр. 2969, арк. 43; *Złota księga szlachty...*, s. 284–285; А. Федорук, *Стариные усадьбы Берестейщины*, с. 32–41.

ны тытул камер-юнкера. Моцная крытыка г. зв. «катараняжаў» як адступнікаў і здраднікаў прымусіла яго на нейкі час адысці ад грамадскай дзейнасці. Але ўжо ў 1906 г. Канстанцін Скірмунт удзельнічаў у выбарах у I Дзяржаўную Думу ад Гарадзенскай губ. Гэтая спроба распачаць палітычную дзейнасць аказалася няўдалай. Поспех прыйшоў у 1909 г., калі «галасамі» зямян Гарадзеншчыны ён быў абраны ў Дзяржаўную Раду і да 1917 г. заставаўся яе сябрам.

Палітычныя перамены 1917 г. паспрыялі рэзкай змене накірунку палітычнай дзейнасці. К. Скірмунт стаў адным з заснавальнікаў Польскага нацыянальнага камітэта, а пазней – яго прадстаўніком у Рыме. З 1919 па 1921 г. быў паслом Польскай дзяржавы ў Італіі, а ў 1921–1922 гг. займаў пасаду міністра замежных спраў Польшчы. Потым (да 1934 г.) быў паслом у Вялікабрытаніі. Як дыпламат адыграў значную ролю ва ўмацаванні міжнародных пазіцый адроджанай Польскай дзяржавы[190].

Ягоны брат Генрык (1868–1939) увайшоў у польскія энцыклапедыі як паэт і кампазітар. Пасля заканчэння гімназіі ў Лібаве паступіў у кансерваторыю ў Пецярбурзе, пазней вучыўся ў Парыжы, Варшаве і Берліне. У 1902 г. у Львове адбылася прэм'ера яго оперы «Пан Валадыеўскі» паводле твораў Генрыка Сянкевіча. Рэцэнзіі былі вельмі стрыманыя. Пачаў пісаць вершы, якія, між іншым, публікаваліся на старонках пецярбургскага «Краю». Сябраваў з Элізай Ажэшка, якая падтрымлівала яго творчасць. У Варшаве (1903) і Кракаве (1912) выйшлі з друку два тамы «Паэзіі», якія, аднак, не былі заўважаны крытыкамі. У 1925 г. быў прыняты ў Секцыю кампазітараў пры Варшаўскім музычным таварыстве[191]. У 1913 г. у сувязі з занятасцю старэйшага брата палітычнымі і грамадскімі справамі Генрык быў вымушаны ўзначаліць гаспадарку Моладава. У міжваеннай Польшчы ён уваходзіў у Саюз землеўласнікаў і актыўна падтрымліваў дзейнасць каталіцкага касцёла.

Асобнай згадкі заслугоўвае публіцыстка Канстанцыя Скірмунт (1851–1934), дачка Алены і Казіміра. Яе першыя публікацыі, якія звярнулі на сябе ўвагу чытачоў, з'яўляліся папулярызацыяй гісторыі старажытнай Літвы. Так, у 1886 г. у Кракаве выйшла з друку кніга *Dzieje Litwy opowiedziane w zarysie*. У гэтай ды іншых працах яна ў папулярнай форме распавядала пра пачаткі гісторыі Літвы, дзейнасць першых князёў, прычым крытычна ацэньвала ролю Польшчы ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

---

[190] M. Nowik-Kiełbikowa, *Skirmunt (Skirmuntt) Konstanty (1866–1949)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 178–183; M. Nowik-Kiełbikowa, *Konstanty Skirmunt. Polityk i dyplomata*. Warszawa 1998; P. Bojarski, *Zapomniany dygnitarz: Konstanty Skirmunt – minister spraw zagranicznych w latach 1921–1922*, «Meritum». 2016, Tom 6, s. 57–70.

[191] Z. Dernałowicz, *Skirmunt (Skirmuntt) Henryk (1868–1939)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 175–177.

Актывізацыі яе публіцыстычнай дзейнасці на пачатку XX ст. паспрыяла палеміка паміж «старалітвінамі» і «младалітвінамі», якая фактычна была дыскусіяй пра месца літоўскіх палякаў у будучыні гістарычнай Літвы. Канстанцыя Скірмунт падзяляла галоўныя пастулаты ідэалогіі краёўцаў і прапагандавала ідэю палітычнай нацыі. Галоўным крытэрыем нацыянальнай прыналежнасці лічыла пачуццё патрыятызму і грамадзянскага абавязку ў дачыненні да Айчыны-Літвы і яе карэнных народаў. Праўда, у адрозненне ад іншых краёўцаў Канстанцыя Скірмунт карэннымі народамі лічыла толькі літоўцаў, палякаў і беларусаў.

У артыкуле на старонках «Кур'ера Польскага» (1906, № 193) яна вызначыла ўласную свядомасць як *Gente Lithuana, natione Lithuana*, што, прынамсі, па форме адрознівалася ад традыцыйнай формулы свядомасці літоўскіх палякаў: *Gente Lithuani, natione Poloni*.

Выступаючы пад псеўданімамі (*Futurus, Pojata, Helena-Pojata*), Канстанцыя Скірмунт актыўна змагалася з усімі праявамі радыкальнага нацыяналізму. Але пры гэтым падтрымлівала літоўскі нацыянальны рух, абараняла яго на старонках польскага друку, кантактавала з дзеячамі літоўскага руху, у прыватнасці, перапісвалася з Ёнасам Басанавічусам. Публіцыстка была прыхільніцай «ягелонскай ідэі», разумеючы яе як яднанне народаў былой Рэчы Паспалітай на прынцыпах роўнасці. У 1907 г. на старонках «Кур'ера Літэўскага» заявіла, што Польшча не дасягне нічога, калі не ўбачыць на Усходзе замест «крэсаў» краіны і народы[192].

Яе дом («Мур») у Пінску ўжо ў 1880–1890-я гг. стаў пэўным цэнтрам асветніцкай і грамадскай дзейнасці, у якой краёвасць спалучалася з абаронай інтарэсаў мясцовых палякаў і каталіцкага касцёла. З непасрэдным удзелам Канстанцыі і яе сяброўкі Юзэфы Кужанецкай ў часы прэм'ерства Пятра Сталыпіна быў выратаваны ад руйнавання касцёл у Гарадзішчы, што на Піншчыне. Таксама яна была актывісткай дабрачыннага руху[193]. Адначасна Канстанцыя Скірмунт цалкам падтрымлівала беларускую палітычную дзейнасць стрыечнага брата Рамана ў перыяд нацыянальна-культурнага Адраджэння і спробы пабудовы беларускай дзяржаўнасці.

Пачатак Другой сусветнай вайны і савецкая агрэсія супраць Польшчы абярнуліся рэпрэсіямі супраць Скірмунтаў, якія засталіся на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У перыяд панавання «першых саветаў» (1939–1941) загінулі амаль усе мужчыны з роду Скірмунтаў, якія трапілі ў рукі «вызваліцеляў», а іх маці, жонкі, сёстры і дзеці былі вывезены ў калгасы Казахстана або ў лясгасы Поўначы СССР. Рэпрэсіі, якія працягваліся савецкімі партызанамі падчас нямецкай акупацыі, сталі канцом гісторыі палескіх Скірмунтаў.

---

[192] Futurus [Konstancja Skirmuntt], *Idea Jagiellońska, a polityka kresowa*, «Kurjer Litewski». 1907, Nr 24, 31 stycznia.

[193] P. Łossowski, *Skirmuntowna (Skirmuntt) Konstancja (1851–1934)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 189–190; D. Szpoper, *Gente Lithuana, natione Lithuana…*

«Ліверпуль на Ясельдзе»

Радзімай Рамана Скірмунта было Парэчча на беразе р. Ясельды. Менавіта тут, у сямейным коле і ў атачэнні жыхароў палескай вёскі ён сфарміраваўся як асоба. Ягоная сувязь з гэтай малой Радзімай выходзіла далёка па-за межы звычайных матэрыяльных патрэб. Парэчча было для Скірмунта тым родным домам, які дапамагаў перажыць выпрабаванні, мацаваў дух і даваў надзею. Рызыкну выказаць меркаванне, што якраз маленькае Парэчча, а не вялікая палітыка было галоўнай справай ягонага жыцця.

Гісторыя «скірмунтаўскага Парэчча» пачалася задоўга да нараджэння будучага палітыка і грамадскага дзеяча. Нагадаю, што калі прадзед Рамана Сымон Скірмунт выкупляў маёнтак Моладава на Піншчыне ў Агінскіх, то Парэчча з'яўлялася толькі фальваркам. Доўгі час менавіта Моладава было цэнтрам гаспадарчых ініцыятыў палескіх Скірмунтаў. Толькі ў сярэдзіне XIX ст. гэты цэнтр перамясціўся ў Парэчча Пінскага пав. Яго ўладальнікі ўвайшлі ў беларускую гісторыю як прадстаўнікі адной з найбольш паспяховых дынастый мясцовых прадпрымальнікаў у XIX – пачатку XX ст.

Варта засяродзіцца на пераўтварэнні Парэчча ў буйны па мерках Менскай губ. прамысловы цэнтр і на той ролі, якую ў гэтым працэсе адыгралі Аляксандр Сымонавіч і Аляксандр Аляксандравіч Скірмунты. Жыццё і дзейнасць дзеда і бацькі былі пэўным жыццёвым арыенцірам для Рамана Скірмунта.

Аналіз асобаснага чынніка станаўлення беларускага «Ліверпуля на Ясельдзе» дазваляе выказаць меркаванне, што сярод матываў дзейнасці дзеда і асабліва бацькі дамінавала не асабістае ўзбагачэнне, а імкненне да развіцця роднага краю, пераўтварэння Піншчыны як часткі гістарычнай Літвы ў квітнеючы прамысловы рэгіён.

Магчыма, падчас свайго навучання ў Еўропе Аляксандр Скірмунт (старэйшы) пазнаёміўся з працамі славутага эканаміста Адама Сміта (1723–1790), галоўная кніга якога *An Inquiry into the Nature and Causes of the Wealth of Nations* (Даследаванне пра прыроду і прычыны багацця народаў, 1776) была перакладзена на французскую і нямецкую мовы яшчэ пры жыцці аўтара. Аднак пацвердзіць гэтае меркаванне гістарычнымі дакументамі немагчыма. Адзіным пацвярджэннем можа быць толькі сама дзейнасць заснавальніка прамысловага цэнтра і ягоных пераемнікаў. Ізноў жа гіпатэтычна можна сцвярджаць уплыў на жыццё і дзейнасць трох пакаленняў палескіх Скірмунтаў кніг Джона Сцюарта Міля (1806–1873), дзе былі выкладзены асновы класічнай палітэканоміі і дактрыны лібералізму. Дарэчы, яны маглі чытаць гэтыя працы ў арыгінале, бо валодалі англійскай мовай.

Нагадаю, што асновай рынкавай эканомікі Сміт лічыў імкненне прадпрымальніка атрымаць прыбытак, што, незалежна ад яго волі і свядомасці, працавала на эканамічны прыбытак усяго грамадства. Пры гэтым галоўнай умовай поспеху і ўзбагачэння грамадства былі эканамічныя свабоды ўсіх суб'ектаў гаспадарання.

Гаворка ішла пра свабоду выбару сферы дзейнасці і прыняцця рашэнняў, свабоду канкурэнцыі і гандлю.

У гаспадарчай дзейнасці палескіх Скірмунтаў заўсёды былі адчувальнымі пэўныя грамадскія матывы. Іх жыццё ніколі не абмяжоўвалася інтарэсамі ўласнай сям'і і нават таго саслоўя, да якога належалі. Аляксандр Скірмунт (малодшы), паводле сцвярджэння сына Рамана, быў прыхільнікам «варшаўскага пазітывізму» і «лічыў галоўным абавязкам працу на сваім загоне дзеля ўздыму матэрыяльнага дабрабыту ўласнага грамадства»[194]. Менавіта шырыня мыслення, клопат пра «малую» і «вялікую» Радзімы ды іх жыхароў, імкненне пашырыць межы еўрапейскай цывілізацыі ператваралі паспяховых прадпрымальнікаў у людзей, якія намагаліся змяніць рэчаіснасць, прыспешыць ход гісторыі, і тым самым станавіліся небяспечнымі для Расійскай імперыі.

Як фармаваўся і што сабой уяўляў «Ліверпуль на Ясельдзе»? Што абумовіла нетыповае для шляхты жыццё прадстаўнікоў парэцкай галіны роду Скірмунтаў? Якім чынам прадпрымальніцкая дзейнасць дзеда і бацькі паўплывала на «краёвую» канцэпцыю Рамана Скірмунта?

Аляксандр Сымонавіч Скірмунт (1799–1870)

Магчыма, штуршком для пераўтварэння шляхціча ў прадпрымальнікаў сталі даўгі Агінскіх, якія Сымон Скірмунт выкупіў разам з маёнткам Моладава. Апрача таго, пачатак XIX ст. не быў спрыяльным для гаспадарчага развіцця. Вайна 1812 г. адмоўна паўплывала на эканамічны стан Піншчыны, у т. л. на стан скірмунтаўскіх уладанняў. Так, у красавіку 1814 г. маршалак шляхты Пінскага пав. Сымон Скірмунт падчас агульнага схода шляхецкіх дэпутатаў Менскай губ. адзначыў цяжкія наступствы знішчэнняў і рэквізіцый апошняй вайны і заявіў, што пасля пагашэння працэнтаў па тых даўтах, што ўсё яшчэ абцяжарвалі маёнтак, і ўсіх выплат у дзяржаўны скарб за 1813 г. ён не атрымаў аніякага прыбытку[195].

Вялікую ролю ў станаўленні дынастыі Скірмунтаў-прадпрымальнікаў адыграў сын Сымона Аляксандр Ізідар (1 ліпеня 1799 – 22 ліпеня 1870)[196]. Жыццё і дзейнасць гэтага чалавека заслугоўвае асобнай манаграфіі, якая магла б стаць важнай старонкай у эканамічнай гісторыі Беларусі і ўсёй гістарычнай Літвы. У гэтай працы абмяжуюся толькі сціплым пералікам зробленага ім дзеля стварэння ў Моладаве і Парэччы буйнога прамысловага цэнтра.

Пасля вяртання з Еўропы, дзе ён удасканальваў сваю ўніверсітэцкую адукацыю і атрымліў пэўныя практычныя навыкі фабрычнай працы, Аляксандр Сымонавіч у 1823 г. ажаніўся з дачкой былога менскага губернатара Канстанцыяй

---

[194] [R. Skirmunt], *Zywot, zgon i pogrzeb s. p. Aleksandra Skirmunta*, «Słowo». 1909, Nr 165.

[195] НГАБ. Ф. 319, воп. 1, спр. 848, арк. 18.

[196] РГИА. Ф. 1343, оп. 29, д. 3574, л. 2.

Суліcтроўскай і заняўся рэфармаваннем уласнай гаспадаркі. Бацька перадаў яму права кіравання ўсімі маёнткамі і капіталамі. У той час гаспадарка гэтай лініі Скірмунтаў уключала маёнткі Моладава ў Кобрынскім пав. Гарадзенскай губ., Парэчча, Альбрэхтова, Кажанёва і Клетна ў Пінскім пав. Менскай губ., а таксама маёнтак Шэметаўшчыну ў Свенцянскім пав. Віленскай губ. Нагадаю, што апошні Скірмунты атрымалі ў пасаг за Канстанцыю Суліcтроўскую. Гаспадарчае жыццё на гэтых землях традыцыйна абмяжоўвалася земляробствам.

Аляксандр Сымонавіч Скірмунт на партрэце В. Ваньковіча

У 1829 г. супрацоўнік Польскага банка Казімір Контрым, вядомы таксама як сакратар скарба ўрада Вялікага Княства Літоўскага ў 1812 г. і бібліятэкар Віленскага ўніверсітэта, што ў свой час апекаваўся філаматамі, па загаду кіраўніцтва банка выбраўся на Палессе, каб пазнаёміцца з узроўнем гандлю і гаспадаркі рэгіёна. Узровень быў даволі нізкі. На фоне гаспадарчай актыўнасці прадстаўнікоў габрэйскай супольнасці мясцовая заможная шляхта дэманстравала няздольнасць да эфектыўнага вядзення гаспадаркі, нежаданне і адсутнасць умення ўлічваць прыродныя асаблівасці Палесся. Іх прамысловыя і гандлёвыя зацікаўленні дыктаваліся модай і традыцыяй, а не рацыянальным разлікам і інтарэсамі капіталу. Марнатраўства капіталаў і працы было нормай гаспадарання ў маёнтках. Галоўнай крыніцай шляхецкай заможнасці з'яўляліся не гаспадарчыя поспехі, а звычайны рабунак галоўнага багацця Краю, а менавіта – лесу і селяніна.

Значна пазней вядомы даследчык Палесся этнолаг Юзаф Абрэмбскі, разважаючы пра вытокі гаспадарчага заняпаду Палесся ўжо ў 1920–30-я гг., справядліва адзначаў: «Малыя палескія «Версалі» з іх палацамі, стайнямі, сабакарнямі, бібліятэкамі, аранжарэямі, паркамі і звярынцамі, з іх айчынным марнатраўствам і імпартаванай раскошай, усёй спажывецкай пышнасцю – грунтаваліся не на прадпрымальніцтве землеўласніка, не на паляпшэнні прадукцыйнасці ці тэхнічных удасканаленнях, не на росце вытворчасці ці развіцці прамысловасці і гандлю, а на вынішчэнні лесу і прыгнёце селяніна»[197].

Контрым асцярожна ацэньваў мясцовыя перспектывы развіцця фабрычнай прамысловасці. Ён канстатаваў, што нізкі тэхнічны ўзровень звычайна спалучаецца з адсутнасцю падрыхтаваных работнікаў і ігнараваннем патрэбаў рынку. Пры гэтым падарожнік з вялікай цікавасцю прыглядаўся да шляхецкіх спроб

[197] J. Obrębmbski, *Polesie. Studia etnosocjologiczne. 1.* Red. naukowa i wstęp A. Engelking. Warszawa 2007, s. 66.

ажыўлення гаспадарчага жыцця. Паспяховы шляхціч-прадпрымальнік на Палессі ў часы Контрыма быў з'явай унікальнай. Так, ён згадаў з'яўленне на берагах Ясельды і Шчары невялікіх суконных фабрык, у т. л. фабрыкі Войцаха Пуслоўскага ў наваколлях мяст. Хомска і г. Слоніма, а таксама паведаміў пра плантацыі цукровых буракоў у Моладаве Аляксандра Скірмунта і будаўніцтва там цукроўні, першая прадукцыя якой павінна была з'явіцца ўжо ў 1829 г.[198]

Магчыма, што абранне А. Скірмунтам менавіта гэтай галіны прамысловасці было абумоўлена таксама ягонай цікавасцю да хіміі. Уладальнік маёнтка, дарэчы, атрымаў патэнт на ўласнае вынаходніцтва – апарат для паскоранага выпарэння цукровага сіропу[199]. Сутнасць вынаходніцтва заключалася ў выкарыстанні г. зв. «праката». Гэта была металічная паверхня, што награвалася парам, па якой сцякаў цукровы сіроп. «Пракат» дазваляў значна паскорыць тэхналагічны працэс выпарвання цукру. Замест 4–5 гадзінаў ён доўжыўся 3–4 хвіліны. Наогул, гэта патэнт лічыцца першым у гісторыі Беларусі.

Вытворчасць цукра на Палессі была наватарскай справай. Паводле дадзеных Энцыклапедычнага слоўніка Ф. Брактгаўза і І. Ефрона, ва ўсёй Расійскай імперыі ў 1830 г. мелася толькі 20 (!) цукровых заводаў[200]. Адпаведна, збыт прадукцыі быў гарантаваны.

Аднак маладога прадпрымальніка напаткала няўдача. Фабрыка не давала прыбытку. На думку Напалеона Орды, які быў сваяком Скірмунта і ведаў сітуацыю з «першых рук», няўдача была абумоўлена як адсутнасцю падрыхтаваных да фабрычнай працы кадраў, так і занятасцю ўладальніка, які ў 1829 г. быў упершыню абраны маршалкам шляхты Пінскага пав[201]. Выправіць сітуацыю не атрымалася, бо ў 1835 г. фабрыка з усімі гаспадарчымі пабудовамі згарэла.

Гэтая няўдача не спыніла Аляксандра Сымонавіча. Шматлікія суседзі, для якіх непрымальнымі былі ўсе навацыі, а працавітасць і няўрымслівасць маладога ўладальніка Моладава выклікала раздражненне, казалі пра хуткі крах маёнтка. Між тым Скірмунт аднавіў цукроўню. Але і ў гэтым выпадку складана казаць пра паспяховасць праекта.

Паводле інфармацыі гарадзенскай губернскай канцылярыі, у 1841 г. у Моладаве знаходзілася цукроўня, на якой выраблялі розныя віды цукру (у т. л. цукар-рафінад) і цукровы сіроп. На фабрыцы дамінавала ручная праца. Толькі пры першаснай апрацоўцы буракоў выкарыстоўвалася машына, якую прыводзілі ў дзе-

---

[198] *Podroz Kontryma, urzędnika Banka Polskiego odbytaja w roku 1829 po Polessiu.* Wydana przez Edwarda Raczyńskiego w Poznaniu, 1839, s. 50.

[199] *Свод выданных в России привиллегий с 1814 по 1835 г.* СПб. 1865, с. 289–292; А. Киштымов, *Западнополесская династия Скирмунтов XIX –XX вв.*, с. 88.

[200] *Энциклопедический словарь.* Издатели Ф. А. Брокгауз и И. А. Ефрон. Т. 29 (58): Сахар-Семь мудрецов. Спб. 1900, с. 16.

[201] N. Orda, *Aleksander Skirmunt*, «Tygodnik ilustrowany». 1871, Nr 175, s. 213.

янне коні. Кіраваў вытворчасцю майстар з сялян Моладаўскага маёнтку Адам Васілеўскі, якому дапамагаў таксама селянін Давід Вырвіч. Штодня працавалі ад 10 да 20 сялян у залік паншчыны. Сыравінай служыла новая для Палесся тэхнічная культура, менавіта цукровыя буракі, якія вырошчваліся ў маёнтку. Плошча плантацыі буракоў складала каля 2 300 *четвертей* або прыблізна 1 150 дзесяцін. Кошт усёй прадукцыі за 1841 г. склаў больш 2 200 руб.[202]

У Канцылярыі гарадзенскага губернатара захаваліся статыстыка дзейнасці гэтай цукроўні да 1846 г. Трэба адзначыць, што з кожным годам вытворчасць цукру змяншалася. Так, у 1846 г. кошт усёй прадукцыі склаў толькі 841 руб. Прытым што рознічныя цэны засталіся нязменнымі. Плошча «бурачнай плантацыі» скарацілася да 1 тыс. *четвертей*[203]. Праз два гады моладаўская цукроўня была наогул зачынена.

Поспех да А. Скірмунта прыйшоў у іншай галіне прамысловасці. У 1836 г. першую прадукцыю пачала даваць суконная фабрыка, збудаваная ў Парэччы. Спачатку яна была зусім маленькай, але паступова колькасць станкоў была павялічана да 100. Абсталяванне набывалася па-за межамі Расіі. З Германіі і Францыі ў Парэчча прыехалі вопытныя ткачы. Дырэктарам фабрыкі стаў нямецкі спецыяліст. Тым не менш, у першыя гады яе існавання прыбытку не было. Адной з праблем былі занадта вялікія выдаткі на замежных спецыялістаў, што значна падвышала кошт прадукцыі. Урэшце Аляксандр Скірмунт звольніў дырэктара і сам узначаліў прадпрыемства. Праз некалькі гадоў дзякуючы ягоным высілкам Парэцкая суконная фабрыка па колькасці і якасці прадукцыі стала адным з лідэраў тэтай галіны прамысловасці на беларускіх землях.

Напачатку 1840-х гг. асноўнай сыравінай для вытворчасці сукна была воўна «іспанскіх авечак», якіх паспрабавалі разводзіць у Парэччы. Фарба набывалася за межамі Расіі. Сукно прадавалася ў Віленскай, Кіеўскай, Гарадзенскай і Менскай губ.

Зразумела, што цалкам абысціся без ткачоў з Еўропы было немагчыма. У 1843 г. на фабрыцы працавалі 2 замежныя спецыялісты і 215 мясцовых рабочых[204]. Адным з такіх «суконных фабрыкантаў» быў грамадзянін Францыі Ксаверы Маўрос. Разам з жонкай ён прыехаў у Парэчча ў ліпені 1844 г., а напрыканцы года звярнуўся да ўладаў з просьбай дазволіць застацца ў Парэччы на пастаяннае жыхарства пры суконнай фабрыцы[205]. Звычайна, замежнікі, апрача асноўных абавязкаў, павінны былі рыхтаваць рабочых і майстроў з мясцовых ураджэнцаў.

Найбольш здольных мясцовых работнікаў Скірмунт пасылаў вучыцца

---

[202] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні (далей: НГАБ у Гародні). Ф. 1, воп. 20, спр. 466, арк. 126 адв.–127.

[203] Тамсама, воп. 21, спр. 30, арк. 241 адв.–242; воп. 21, спр. 25, арк. 12.

[204] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 871, арк. 109 адв. – 110.

[205] Тамсама, спр. 879, арк. 354–354 адв.

і набірацца вопыта на іншыя фабрыкі. Пасля вяртання яны займалі кіруючыя пасады на фабрыцы. Прынамсі, такім быў лёс дырэктара фабрыкі ў 1850–70-я гг. Аляксандра Скупееўскага, які пачынаў фарбавальшчыкам сукна[206].

На пачатку 1850-х гг. на фабрыцы дзейнічала адна паравая машына, а праз дзесяць гадоў – ужо тры машыны агульнай магутнасцю ў 62 конскія сілы. Са «Спісу фабрык і заводаў Менскай губ за 1859 г.» можна даведацца, што ў гэтым годзе на фабрыцы было выраблена 120 тыс. аршын[207] сукна на суму 300 тыс. руб. На фабрыцы працавалі 16 майстроў і 382 рабочыя[208]. Першапачатковыя драўляныя будынкі фабрыкі зніклі. На беразе Ясельды выраслі каменныя фабрычныя гмахі, якія ўражвалі сваімі памерамі і пры гэтым адпавядалі пэўным эстэтычным густам таго часу.

Яшчэ раз трэба адзначыць «сацыяльную палітыку» Аляксандра Сымонавіча. У Парэччы былі збудаваны чатыры дамы (90 кватэр) для сямейных рабочых і чатыры інтэрнаты для тых, хто сям'і не меў. Уладальнік утрымліваў лекара і шпіталь на 12 ложкаў. Ён жа аплачваў харчаванне. Існавала вучылішча, дзе дзяцей вучылі асновам ткацкага рамяства.

Прамысловасць дапаўняў вінакурны завод у Моладаве. Звесткі пра яго ўтрымліваюцца ў інвентары Моладаўскага маёнтка, складзеным у сакавіку 1839 г. дзеля атрымання банкаўскага крэдыта[209]. У той час маёнтак меў 8 380 дзес. зямлі (каля 8 400 га), у т. л. 529 дзес. дваровай пашні і 1 446 дзес. пашні сялянскай. У маёнтку пражывала 1 037 «душ обоего пола». Прычым «дваровых» толькі 37 чал. Кожны сялянскі двор («дым») штотыдзень меў два мужчынскія і два жаночыя дні паншчыны (усяго 14 325 дзён). Апрача таго, кожная «душа» была абавязаная адпрацаваць 12 дзён у год г. зв. «гвалту»[210]. Маёнтак быў земляробчым, а ягоная прадукцыя складалася з «хлеба» і... «горячего вина». Першае і другое адпраўлялася па рэках у Палтаўскую губ., Каралеўства Польскае, у Прусію (Данцыг і Кёнігсберг), а таксама пастаўлялася ў корчмы і прадавалася на рэгіянальных кірмашах. Аляксандр Скірмунт сцвярджаў, што прыбытак з маёнтку складаў ад 10 да 12 тыс. руб. на год.

Сярод гаспадарчых пабудоў інвентар зафіксаваў вінакурню з сасновага дрэва на каменным падмурку плошчай 120 кв. сажняў (прыблізна 240 м²). У далейшым вытворчасць гарэлкі і спірта набывала ўсё большы размах. Прынамсі, у інвентары Моладаўскага маёнтка за 1858 г. згадвалася ўжо «вінакурня каменная двухпавярховая»[211]. Дарэчы, гэты ж інвентар сцвярджаў, што гадавы прыбытак

---

[206] N. Orda, *Aleksander Skirmunt*, s. 214; НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 3401, арк. 4.

[207] Старажытная мера даўжыні. 1 аршын роўны прыблізна 0,7 м.

[208] НГАБ. Ф. 21, воп. 1, спр. 5, арк. 448 адв.

[209] НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 11, спр. 643, арк. 33–34.

[210] «Гвалт» – павіннасць, згодна з якой усе працаздольныя сяляне або мяшчане абавязаны былі з'яўляцца на працу туды, куды ім загадаюць.

[211] НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 27, спр. 1520, арк. 27–28.

маёнтка складаў каля 8 тыс. руб. Відавочна, што ўвагу ўладальніка больш прыцягвала прамысловаць Парэчча.

Аляксандр Сымонавіч таксама меў непасрэднае дачыненне да адкрыцця фабрыкі туалетнага мыла, стэарынавых і васковых свечак у Альбрэхтове, паблізу Пінска. Ён прапанаваў варшаўскаму купцу Робэрту Ботэ заснаваць фабрыку і перадаў яму ў арэнду пляц і забудовы на тэрыторыі ўласнага маёнтка[212]. Даволі хутка фабрыка стала адной з самых буйных у імперыі. Асаблівай папулярнасцю карысталася туалетнае мыла, якое было новым таварам для Беларусі. Напрыканцы 1850-х гг. гэтая фабрыка стала ўласнасцю Скірмунта. Ён таксама спрычыніўся да з'яўлення паравога млына ў Пінску і фабрыкі металічных інструментаў у Дастоеве Пінскага пав.

Як ужо адзначалася, прадпрымальніцкая дзейнасць Скірмунта, якая не належала да традыцыйных шляхецкіх заняткаў, выклікала раздражненне суседзяў. Архіўныя дакументы даносяць да нас водгукі канфліктаў гэтага надзвычай энергічнага чалавека з жыхарамі навакольных маёнткаў і вёсак. Так, у 1847 г. гарадзенскі губернатар задаволіў прашэнне памешчыкаў Пружанскага пав., абураных пабудовай шлюзаў на тэрыторыі Моладаўскага маёнтка. Яны сцвярджалі, што ў выніку з'яўлення шлюзаў «для личных выгод» вада пачала заліваць іх лугі[213]. Праз год Гарадзенская палата дзяржаўнай маёмасці ў чарговы раз разглядала скаргу ўжо Скірмунта на сялян мяст. Моталь, якія перасталі выплочваць памешчыку чынш. Палата накіравала даручэнне Кобрынскаму земскаму суду вырашыць гэтую праблему на месцы пры ўдзеле Скірмунта. Гэта было ўжо 11-е (!) даручэнне Палаты па дадзенай справе[214]. Падобна, што ў гісторыі трансфармацыі шляхецкага саслоўя на беларускіх землях Скірмунты выглядалі хутчэй выключэннем, чым тыповым прыкладам перамен.

Жыццё Аляксандра Скірмунта было напоўнена не толькі гаспадарчымі клопатамі. Паводле меркавання Аляксандра Ільіна, менавіта ён пачаў ствараць у Моладаве бібліятэку. Ёсць згадкі пра тое, што яго сын Генрык выпісваў напрыканцы 1850-х гг. папулярную «Тэку віленьску»[215], рэдактарам якой быў Адам Ганоры Кіркор (1818–1886). Ролю апошняга ў кантынуацыі традыцый ліцвінскага патрыятызму і фарміраванні ўласна ліцвінскай культурнай традыцыі цяжка пераацаніць.

Цікавасць Аляксандра Сымонавіча да мінулага гістарычнай Літвы прывяла яго ў шэрагі фундатараў і дабрачынцаў Віленскага музея старажытнасцяў і Віленскай археалагічнай камісіі (1855–1865), створаных па ініцыятыве графа Яўстаха

---

[212] НГАБ. Ф. 147, воп. 3, спр. 26892, арк. 5.

[213] НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 5, спр. 681.

[214] Тамсама, спр. 746.

[215] А. Ильин, Е. Игнатюк, *Очерки истории культуры Пинщины (IX – начало XX в.)*. Пинск 2013, с. 211.

Тышкевіча (1814–1873)[216]. Відавочна, што ў гэтага пакалення Скірмунтаў прыналежнасць да польскай культуры спалучалася з патрыятызмам у дачыненні да гістарычнай Літвы. У далейшым гэтая рыса паспрыяла афармленню краёвай ідэалогіі, стваральнікамі якой стануць унук і ўнучка Аляксандра Сымонавіча Раман і Канстанцыя Скірмунты.

Сямейнае жыццё складвалася шчасліва. Як ужо адзначалася, у шлюбе з Канстанцыяй Суліcтроўскай нарадзілася 11 дзяцей, з іх шасцёра сыноў – Казімір, Канстанцін, Аляксандр, Сымон, Генрык і Зыгмунт. Са спадкаемцамі Аляксандр Сымонавіч не меў праблем. Але ў 1845 г. жонка памерла, і яе смерць стала моцным ударам па ўсёй сям'і. Аляксандр Скірмунт заставаўся ўдаўцом да канца жыцця.

Не ўсе спадкаемцы мелі жаданне працягваць гаспадарчую дзейнасць бацькі і займацца прадпрымальніцтвам. Усё ж большасць сваякоў вяла традыцыйны лад жыцця, які не выходзіў па-за межы прыгонніцкай сістэмы і пэўных узораў шляхецкай штодзённасці часоў Рэчы Паспалітай. Жыццё і дзейнасць паспяховага прадпрымальніка Аляксандра Скірмунта часам ацэньвалася даволі крытычна. Так, ягоны сваяк Эдвард Ромэр у сваім дзённіку 26 сакавіка 1866 г., прыгадваючы Скірмунта, з раздражненнем адзначыў, што той усё сваё жыццё прысвяціў «спекуляцыі», і нават дзяцей прывучыў да гандлю[217].

Вяртаючыся да сыноў Аляксандра Сымонавіча, трэба адзначыць, што ўсе яны закончылі гімназію ў Міта́ве. Старэйшы Казімір потым паспяхова закончыў факультэт прыродазнаўства Пецярбургскага ўніверсітэта. У 1848 г. ён узяў шлюб з Аленай, дачкой Аляксандра Тамашавіча і Гартэнзіі з Ордаў Скірмунтаў. Яны пасяліліся ў маёнтку Калоднае на Піншчыне. Канстанцін паспрабаваў сябе на дзяржаўнай службе, але ў 1859 г. перабраўся ў маёнтак Шаметаўшчыну Свенцянскага пав. Ён ажаніўся з Габрыэлай Умястоўскай і распачаў уласныя гаспадарчыя пераўтварэнні, якія таксама спалучаліся з грамадскай дзейнасцю. Генрыка прывабіла вайсковая кар'ера ў лейб-гвардыі Валынскім палку.

Пераемнікам усёй гаспадарчай дзейнасці стаў сын Аляксандр, якому нават не далі скончыць універсітэт. Ён пачаў дапамагаць бацьку ўжо на пачатку 1850-х гг. У 1860 г. Аляксандр Сымонавіч перадаў сыну кіраванне маёнткамі Моладава, Альбрэхтова і Парэчча, а сам пераехаў у Крым.

У даліне Балаклавы (Таўрычаская губ.) ён набыў 200 га зямлі і заснаваў вінаграднікі, дзе вырошчваліся выключна венгерскія і нямецкія гатункі вінаграда. Пасля вяртання з ссылкі сына Казіміра, якому ўлады не дазволілі застацца на тэрыторыі «Паўночна-Заходняга краю», ён запрасіў сына да сябе і перадаў яму гаспадарку. Пасля гэтага Аляксандр Сымонавіч пераехаў у Італію (раён Брындызі), дзе таксама заняўся вінаградарствам. Аднак праблемы са здароўем перапынілі

---

[216] Г. Каханоўскі, А. Каханоўскі, *Руплівец нашай старасветчыны*. Мінск 1991, с. 31.

[217] Biblioteka Narodowa (далей: BN). Dział rękopisow. Sygn. IV. 8724. Dzienniki Edwarda Romera z lat 1855–1872. Tom 11, 1866, k. 32–32 v.

ягоную працу. Аляксандр Скірмунт паехаў на лячэнне ў Германію, дзе і памёр 22 ліпеня 1870 г.

Адным з першых даў ацэнку ягонай дзейнасці Напалеон Орда на старонках часопіса «Tygodnik ilustrowany» (1871, № 175). Між іншым, ён адзначыў, што напрыканцы першай трэці XIX ст., калі ў Моладаве распачыналіся пераўтварэнні, уся прамысловасць Піншчыны складалася з фабрыкі па вырабу шкла ў Плотніцы, ганчарнага промысла ў Гарадной, вытворчасці паркету ў Пакосце, а таксама з гарбарняў у Століне і Рэчыцы. На гэтым фоне больш відавочным становіцца значэнне дзейнасці Аляксандра Сымонавіча Скірмунта. Менавіта дзякуючы ягоным намаганням Пінскі пав. у сярэдзіне XIX ст. выйшаў у лідэры прамысловага развіцця ўсёй Менскай губ.

Аляксандр Аляксандравіч Скірмунт (1830–1909)

Аляксандр Аляксандравіч Скірмунт (1830–1909) з годнасцю працягваў справу бацькі, паспяхова спалучаючы прадпрымальніцтва і грамадскую дзейнасць.

Універсітэт ён не скончыў. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захавалася справа пад назвай *О высылке сыновей дворян на военную службу*. У спісе памешчыкаў і іх сыноў, якія мелі не менш 100 прыгонных «душ» у Пінскім пав. (1852), насупраць імя Аляксандра ёсць кароткі запіс: «По выбытии из Императорского Санкт-Петербургского университета занимается по настоящее время при суконном заводе своего отца в имении Поречье»[218].

Прычыны гэтага «выбытия», хутчэй за ўсё, звязаны з патрэбамі гаспадаркі. Магчыма, ужо ў той час Аляксандр Скірмунт (старэйшы) пачаў глядзець на сына Аляксандра як на свайго пераемніка. Выраз «занимается по настоящее время при суконном заводе своего отца» мог азначаць якраз падрыхтоўку сына да самастойнай дзейнасці ў якасці будучага кіраўніка маёнтка. Іншую версію выказаў Якуб Гейштар, які сцвярджаў, што Аляксандр Сымонавіч забраў сына з Пецярбурга незадоўга да заканчэння ўніверсітэта, бо баяўся наступстваў устаноўленага над студэнтамі жорсткага нагляду пасля рэвалюцыйных падзей 1848 г.[219] Магчыма і тое, што якраз гэтыя падзеі падштурхнулі бацьку да прыняцця рашэння наконт спадкаемцы. Дарэчы, спадкаемца не толькі атрымліваў магчымасць распараджацца маёмасцю «моладава-пінскіх» Скірмунтаў. Ён адначасна браў на сябе абавязак утрымання ўсёй вялікай сям'і і нёс пэўную адказнасць за лёс сваякоў.

У 1855 г. Аляксандр Аляксандравіч Скірмунт узяў шлюб з Тэафілай Любаньскай. Запіс метрычнай кнігі Кужанецкага касцёла сведчыць, што 19 лістапада 1855 г. ксёндз Антоні Пузарэвіч павянчаў «дворянина Александра Скирмунта, юношу 25 лет из имения Молодово прихода Яновского Гродненской губернии

---

[218] НГАБ. Ф. 320, воп. 1, спр. 313, арк. 50.

[219] J. Gieysztor, *Pamiętniki z lat 1850–1865*. Tom I. Wilno 1913, s. 402.

Кобринского уезда с дворянкою Теофилою Любанскою, девицею лет 18 из имения Токлипаны (правільна Тэклінаполь – *А.С.*) Куренецкого прихода»[220].

Жонка прынесла ў пасагу фальварак Тэклінаполь, што паблізу Вілейкі. Інфармацыя пра фальварак, якая ўтрымліваецца ў выданні *Słownik geograficzny Krolewstwa Polskiego i innych panstw słowianskich* (Том XII, 1892), не сведчыць пра заможнасць гэтай лініі роду Любаньскіх. Прынамсі, у 1865 г. у Тэклінаполі пражывала толькі 28 чалавек і знаходзіўся адзін мураваны дом[221].

Маладыя пасяліліся ў Альбрэхтове пад Пінскам. Аляксандр Скірмунт (малодшы) паспяхова займаўся справамі фабрыкі свечак і мыла, якую Скірмунты выкупілі ў Р. Ботэ. Згаданы «Спіс фабрык і заводаў» (1859) паведамляў, што на фабрыцы было выраблена 2 230 пудоў стэарынавых свечак на суму 18 590 руб. срэбрам, а звычайнага мыла – 3 230 пудоў на суму 8 190 руб.[222] Адначасова А. Скірмунт займаў пасаду куратара вучылішч Пінскага пав. У Альбрэхтове нарадзіліся дачка Тэафіла (1857) і сын Аляксандр (1858). Імёны першых дзяцей паўтаралі імёны бацькоў, што, магчыма, сведчыць на карысць думкі пра рамантычныя падставы гэтага шлюбу.

У 1860 г. Аляксандр Скірмунт (малодшы) стаў кіраўніком вялізнай гаспадаркі Моладава, Парэчча і Альбрэхтова, фармальным уладальнікам якой заставаўся ягоны бацька. З новымі абавязкамі быў звязаны пераезд у Парэчча, якое адыгрывала вядучую ролю ў гаспадарцы маёнтка. Тут паспяхова дзейнічала суконная фабрыка, і была заснавана цукроўня.

Пачатак цалкам самастойнай дзейнасці А. Скірмунта супаў з вялікімі пераменамі ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці ўсёй імперыі і Беларуска-Літоўскага краю. Прыход да ўлады Аляксандра II спарадзіў надзеі на змену палітычнага клімату ў імперыі. Браніслаў Залескі ў кнізе, прысвечанай Алене Скірмунт, пісаў пра агульнае адчуванне гэтых перамен мясцовай шляхтай: «Вяртанне шматлікіх ссыльных з найбольш далёкіх краёў расчульвала сэрцы і напаўняла бадзёрасцю, мясцовыя ўлады пачыналі інакш размаўляць і паводзіць сябе, чым дагэтуль [...] Паўсюль казалі, то аб прыязных да нас пачуццях новага імператара, то аб тайных нібыта на нашу карысць абавязацельствах, якія наклаў на яго Парыжскі кангрэс. Генерал-губернатар у Вільні абвяшчаў пра шматлікія памілаванні, дазваляў сабе казаць нават аб аднаўленні ўніверсітэта, і нават розумы, што найменш паддаюцца ілюзіям, спадзяваліся на лепшую будучыню краю»[223].

На глебе гэтых спадзяванняў нарадзілася ідэя стварэння Сельскагаспадарчага таварыства, якое павінна было ахапіць большасць губерняў Беларуска-Літоўскага

---

[220] НГАБ у Гародні. Ф. 915, воп. 1, спр. 27, арк. 36.

[221] *Słownik geograficzny Krolewstwa Polskiego i innych panstw słowiańskich*. Tom XII. Warszawa 1892, s. 279.

[222] НГАБ. Ф. 21, воп. 1, спр. 5, арк. 448 адв.

[223] Б. Залескі, З *жыцця літвінкі*..., с. 109.

краю. Як сцвердзіў Д. Шпопер, ініцыятыву стварэння такога Таварыства ў Менскай губ. агучыў землеўласнік з Навагрудскага пав. Юльян Карповіч падчас шляхецкіх выбараў у Менску (1859). Яе падтрымалі і пашырылі. Таварыства павінна было ахопліваць не толькі Менскую, але таксама Віленскую, Гарадзенскую і Ковенскую губ.[224]

Дзеля распрацоўкі Статута ў 1860 г. у Вільні пачаў працаваць Камітэт прадстаўнікоў названых губерняў. Ад Менскай губ. у яго склад увайшоў брат Аляксандра Казімір Скірмунт. Пра цікавасць іншых прадстаўнікоў роду да гэтай ініцыятывы сведчыць тое, што распрацаваны праект Статута разам з іншымі матэрыяламі захаваўся сярод карэспандэнцыі Скірмунтаў у Асалінэум (Вроцлаў).

Знаёмства са зместам праекта дазваляе сцвярджаць, што гэтае Таварыства павінна было аб'яднаць эліту літоўскіх і беларускіх палякаў, а ў выпадку неабходнасці ягоная дзейнасць магла набыць нават больш шырокі характар. Між іншым, пра гэта сведчаць прапанаваныя ўмовы ўступлення ў арганізацыю: «Усе грамадзяне краю без розніцы саслоўя і веравызнання могуць быць сябрамі Таварыства»[225]. Гэтае палажэнне цалкам адпавядала адной з задач Таварыства: «У сувязі з тым, што праблема развіцця сельскай гаспадаркі і павялічэння краёвай прадукцыі датычыць не толькі землеўласнікаў, але ўсіх без выключэння жыхароў краю, якія могуць быць карыснымі для сельскай гаспадаркі, заклікаем да ўдзелу ў працах Таварыства...»[226]

Праект Статута праз віленскага генерал-губернатара Назімава быў перададзены імператару, але той яго не падпісаў. Магчыма, расійскія ўлады адчулі пэўную небяспеку ў яднанні эліты палякаў чатырох губерняў, хоць бы і дзеля развіцця сельскай гаспадаркі.

Зрэшты ў парадку дня ўжо стаяла адмена прыгону, што павінна было прывесці да вялікіх перамен ва ўсёй сістэме сацыяльна-эканамічных адносін. Аляксандр Скірмунт (малодшы) вітаў гэтыя перамены і актыўна ўдзельнічаў у сацыяльных і гаспадарчых пераўтварэннях. Як прадстаўнік шляхты Пінскага пав., ён прысутнічаў у нарадах у Менску, дзе абмяркоўваліся прынцыпы сялянскай рэформы, а потым, як прадстаўнік Меншчыны, працаваў у складзе Рэдакцыйнай камісіі па падрыхтоўцы асноўных рэфарматарскіх указаў[227].

А вось які запіс у сваім календары на пачатку 1861 г. зрабіла Алена Скірмунт: «Бягучая праблема займае нас цалкам [...] Казімір укараняе даўно прыгатаваныя новыя распараджэнні, і мы вельмі радуемся, што як сябе, так і людзей настроілі прыхільна да гэтай акцыі гуманізму»[228].

---

[224] D. Szpoper, *Gente Lithuana, natione Lithuana...*, s. 34–35.

[225] ZNiO. Dział rękopisow. Sygn. 13817/II. Korespondencja Skirmuntow z lat 1817–1933, k. 5.

[226] Ibidem, k. 11.

[227] БВУ. Аддзел рукапісаў. F 33–702a. З ліста Р. Скірмунта да М. Здзяхоўскага, арк 15.

[228] B. Zaleski, *Z zycia Litwinki...*, s. 95.

Зразумела, што гэта не былі настроі большасці зямян Беларуска-Літоўскага краю. Прынамсі, чаканне перамен спалучалася з хваляваннем пра ўласны заўтрашні дзень. Так, Эдвард Вайніловіч прыгадваў, што ў дзень рэформы ягоны бацька звярнуўся да дзяцей: «Вось, дзеткі, заўтра сам пайду карміць коней і кароў, а вы будзеце мне дапамагаць»[229].

У лютым 1861 г. быў абвешчаны Маніфест, якім заканчвалася эпоха ўзаконенага рабства ў Расійскай імперыі. Праўда, зямлю і свабоду для былых прыгонных гэты дакумент толькі дэкларавaў. Уводзілася «часоваабавязанае становішча», якое прадугледжвала 9-гадовае выкананне сялянамі ўсіх ранейшых павіннасцяў. Аднак вызначаны парадак быў змецены паўстаннем 1863 г. Расійскія ўлады, каб перацягнуць на свой бок сялянства, былі вымушаны істотна палепшыць умовы адмены прыгону ў Беларусі і Літве. Ужо ў 1863 г. тут адмянялася «часоваабавязанае становішча», на 20 % змяншаліся выкупныя плацяжы, а з 1 мая 1863 г. сялянам дазваляўся выкуп зямлі. Як вядома, з памешчыкамі за зямлю расплацілася дзяржава, а сяляне павінны былі разлічыцца за гэты крэдыт на працягу 49 гадоў.

Пасля 19 лютага 1861 г. Аляксандр Скірмунт (малодшы) заняў пасаду міравога пасярэдніка. Забягаючы наперад, адзначу, што па выніках сваёй дзейнасці ён атрымаў срэбны медаль на Аляксандраўскай ленце. У абавязкі пасярэдніка ўваходзіў разгляд сялянскіх і памешчыцкіх скаргаў, вырашэнне канфліктных сітуацый, а таксама нагляд за дзейнасцю сялянскіх органаў самакіравання. Пасярэднікі прызначаліся губернатарамі паводле спісу, прад'яўленага павятовымі шляхецкімі сходамі. Але іх звальненне знаходзілася ўжо ў кампетэнцыі Сената, што стварала ўмовы пэўнай незалежнасці ад мясцовага чыноўніцтва. Падобна, што Аляксандр Скірмунт актыўна карыстаўся гэтай магчымасцю. Прынамсі, вядома, што ён заслужыў любоў і павагу навакольнага сялянства[230].

Магчыма, апошняе было звязанае таксама з тым, што, як сцвердзіў Якуб Гейштар, Аляксандр Скірмунт у 1861 г. цалкам урэгуляваў праблему сервітутаў, якая была адной з галоўных прычын канфліктаў паміж памешчыкам і сялянамі, а таксама паспрыяў ліквідацыі цераспалосіцы[231]. Ён жа пайшоў насустрач пажаданням сялян пры падпісанні Устаўнай граматы (1864), што размяжоўвала ўладанні памешчыка і вёскі і вызначала суму выкупнога плацяжу. Акт міравога пасярэдніка 4 участка Кобрынскага пав. Паўла Капторава засведчыў, што, паводле планаў каморніка, сяляне атрымлівалі значныя лішкі зямлі. Так, сялянам вёсак Моладава і Бусы адыходзіла на 60 дзес. болей, чым яны валодалі. Аднак Аляксандр

---

[229] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza.* Wilno 1931, s. 12.

[230] S. K. [Konstancja Skirmuntt?], *Aleksander Skirmunt (wspomnienia posmierne),* «Kurier Litewski». 1909, Nr 161, 19 lipca (1 sierpnia).

[231] J. Gieysztor, *Pamiętniki z lat 1850–1865.* Tom I, s. 402.

Скірмунт не выказаў прэтэнзій і падпісаў гэты акт. Пазней ён без спрэчак саступіў сялянам яшчэ 16 дзес. зямлі пад выганы і дарогу для скаціны[232].

Аднак цалкам бесканфліктнымі стасункі Скірмунта з сялянамі навакольных вёсак не былі. Амаль 8 гадоў (1862–1870) працягвалася межавая спрэчка з сялянамі дзяржаўнага маёнтка Багрылаўка[233]. У 1873 г. сяляне в. Табулкі звярнуліся ў суд, патрабуючы вярнуць ім права выпасу скаціны на поле, якое памешчык зрабіў ворным. Спрэчка скончылася толькі ў 1882 г.[234]

Але ўсё гэта яшчэ наперадзе, а ў тым жа лютым 1861 г. да Палесся дайшла інфармацыя пра трагедыю ў Варшаве. Падчас разгону патрыятычнай маніфестацыі расійскія войскі прымянілі зброю, у выніку чаго загінулі пяць чалавек. Хваля пратэстаў ахапіла Каралеўства Польскае і перакінулася на ўсходнія землі былой Рэчы Паспалітай. У касцёлах адбываліся патрыятычныя набажэнствы, вернікі спявалі гімн «Boze, cos Polskę...», які стаўся песняй пратэсту.

У касцёлах Пінска і Асовай таксама праходзілі набажэнствы са спевамі гімна. У кастрычніку 1861 г. дзеля памяці пра варшаўскія ахвяры каля Францысканскага касцёла ў Пінску быў усталяваны вялізны крыж з выявай Маці Божай, а таксама караля Ягайлы і каралевы Ядвігі. Каля крыжа спяваліся патрыятычныя і рэлігійныя песні. Уздым патрыятычных пачуццяў закрануў таксама Скірмунтаў. Пра гэта сведчаць нататкі Алены Скірмунт, якія ў сваёй кнізе цытаваў Браніслаў Залескі. Фотаздымкі загінулых дэманстрантаў захаваліся сярод іншых дакументаў сям'і Скірмунтаў у Асалінэум[235].

У 1862 г. улады здолелі аслабіць «маніфестацыйны рух», але сутыкнуліся з новай праблемай. Распачалася кампанія зваротаў шляхецкіх сходаў да імператара з просьбай далучыць землі былога Вялікага Княства Літоўскага да Каралеўства Польскага. Улады адрэагавалі на гэта традыцыйна: шляхецкім сходам забаранялася звяртацца да імператара з падобнай просьбай.

У фондзе «афіцыйнага» гісторыка паўстання 1863 г. генерала Васіля Ратча ў адзеле рукапісаў Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі захаваўся пратакол пасяджэння шляхты Менскай губ. Сярод тых, хто падпісаўся, нягледзячы на забарону, былі Генрык, Станіслаў і Казімір Скірмунты[236]. Аднак іншыя Скірмунты ўстрымаліся ад падобнай дэманстрацыі польскага патрыятызму. Справа была не толькі ў боязі рэпрэсій. Усё яшчэ моцнымі былі надзеі на паступовую лібералізацыю палітыкі ў дачыненні да польскай супольнасці. Апрача таго, польскасць Скірмунтаў заўсёды

---

[232] НГАБ у Гародні. Ф. 10, воп. 2, спр. 137 арк. 91–92, 113–116, 217.

[233] НГАБ. Ф. 147, воп. 3, том 7, спр. 11391.

[234] Тамсама, том 9, спр. 25657, 25657а.

[235] ZNiO. Dział rękopisow. Sygn. 13816/II. Papiery rozne z rodu Skirmuntow.

[236] Российская национальная библиотека (далей: РНБ). Отдел рукописей. Фонд 629, д. 248. *Дворянские выборы в Минской губ. и обсуждение присоединения Минской губ. к Польше*, л. 27–27 об.

спалучалася з адчуваннем адметнасці Беларуска-Літоўскага краю («Літвы») ад карэннай Польшчы («Кароны»).

У студзені 1863 г. у Варшаве выбухнула паўстанне. Пра стаўленне Скірмунтаў да яго сведчаць радкі з кнігі Б. Залескага: «У апошнія дні студзеня Казімір, які позна вярнуўся з Пінска, прывёз глухія навіны пра выбух у Варшаве. У Рухчы яны сталі прычынай глыбокага смутку. Алена ўсю ноч не самкнула вачэй»[237]. Пазней у адным з лістоў у яе вырвалася: «Зараз жа толькі страх: ці не заўчасная паводка, якая пасевы залье і знішчыць?»[238]

Боязь была цалкам абгрунтаваная, бо належных рэсурсаў для перамогі паўстанцы не мелі. Скірмунты гэта разумелі і асцерагаліся павароту імперыі да агрэсіўнай антыпольскай палітыкі. Пра апошняе сведчыць ліст Аляксандра Скірмунта (старэйшага), адрасаваны да Міхаіла Пушчына. Ён быў напісаны ў мясцовасці Перына каля Брындызі 22 лютага 1863 г. і высланы ў маёнтак Парычы Бабруйскага пав., дзе ў той час жыў колішні дзекабрыст. А. Скірмунт лічыў паўстанне трагедыяй і прадракаў ягоны хуткі разгром. Але пры гэтым сцвярджаў, што ідэя паўстання «ўжо ніколі не згіне».

Пафас ліста быў скіраваны супраць пэўнага публічнага зварота да імператара, складзенага і распаўсюджанага праваслаўным духавенствам. А. Скірмунт пісаў, што змест гэтага звароту разбурае этычныя межы, уведзеныя хрысціянствам і правамі народаў, што царква выйшла па-за межы дазволенага чалавечай культурай. Ён выказваў упэўненасць, што «хотя это писание направлено только против поляков, Вы будете не менее возмущены, так как этот документ полон лжи, злобы и ненависти. Такими средствами невозможно вызвать ни уважения, ни любви»[239].

Крытыкуючы паўстанне, Скірмунты, тым не менш, былі на баку змагароў. Так, Аляксандр і Казімір Скірмунты разам з некаторымі іншымі міравымі пасярэднікамі пакінулі пасады. Як ужо адзначалася, Казімір быў выкліканы ў Менск і арыштаваны. Таксама была арыштавана і выслана Алена Скірмунт, якая самаручна даставіла карэспандэнцыю ў адзін з паўстанцкіх атрадаў.

Аляксандр Скірмунт (малодшы), як і ягоны бацька, належаў да праціўнікаў узброеннай барацьбы. Пры гэтым ён падтрымліваў кантакты з паўстанцамі. Так, польскі гісторык Стэфан Кяневіч у кнізе *Dereszewicze. 1863* (1986), распавядаючы пра атрад Рамана Рагіньскага, паведаміў, што 9 (21) лютага 1863 г. той наведаў Парэчча і перадаў уладальніку ягоныя векселі, захопленыя падчас нападу на пошту[240]. Паводле кіраўніка Літоўскага аддзела Якуба Гейштара, Аляксандр

---

[237] B. Zaleski, Z *zycia Litwinki*..., s. 112.

[238] Ibidem.

[239] Інстытут рускай літаратуры РАН. Рукапісны аддзел. Ф. 248, д. 6697/XXXIV6. 36, арк. 1–2. Хачу выказаць шчырую падзяку Алесю Петухову за магчымасць пазнаёміцца з гэтым дакументам.

[240] St. Kieniewicz, *Dereszewicze. 1863*. Wrocław 1986, s. 122–123.

Скірмунт двойчы перавозіў праз пінскія лясы Рамуальда Траўгута. Пазней ён быў прызначаны камісарам Пінскага пав.[241]

Магчыма, якраз гэта меў на ўвазе аўтар (Канстанцыя Скірмунт?) згаданых пасмяротных успамінаў пра Аляксандра Скірмунта, апублікаваных у газеце «Kurier Litewski» (1909, Nr 161). Аўтар адзначыў патрыятызм Скірмунта, які праявіўся ў тым, што «калі большасць складала ахвяры, ён не вагаўся, рызыкаваў сваім жыццём і маёмасцю».

Рэпрэсіі яго абмінулі. Якуб Гейштар тлумачыў гэта паводзінамі на следстве намесніка начальніка Менскай губ. Баляслава Сьвіды, які адказваў у т. л. і за Пінскі пав. Ён узяў віну на сябе, што дапамагло пазбегнуць пакарання Аляксандру Скірмунту, Вітальду Ордзе, Генрыку Аскерцы, а таксама Гераніму Кяневічу[242].

Скірмунты сапраўды захавалі свае маёнткі, за выключэннем Калоднага. Ягоныя ўладальнікі Казімір і Алена Скірмунты былі высланы, а маёнтак прададзены.

Пасля разгрому паўстання магчымасці для грамадскай дзейнасці амаль зніклі. Польская супольнасць Літвы і Беларусі трапіла пад ціск палітыкі «дэпаланізацыі», якая, насамрэч, больш нагадвала татальную русіфікацыю. Для літоўскіх і беларускіх палякаў быў зачынены шлях кар'еры ў мясцовай адміністрацыі, і шматлікая шляхта, як успамінаў Эдвард Вайніловіч, павінна была «шукаць хлеб у незалежных сферах»[243].

Імператарскі ўказ ад 10 снежня 1865 г., які забараняў палякам набываць зямлю ў «Паўночна-заходнім краі», яшчэ больш абмежаваў сферу жыцця і дзейнасці мясцовай польскай грамадскасці. Але ён жа меў таксама нечаканы для расійскай улады вынік. Боязь страціць зямлю ператварылася ў патрыятычны абавязак па яе захаванні. Вайніловіч сцвярджаў, што адмова ад зямлі або выгнанне зямяніна з яе ацэньваліся як здрада. Здараліся выпадкі, калі нават не вельмі багатыя людзі лічылі за лепшае страціць пазычаныя камусьці з польскіх зямян грошы, але не прымушаць таго прадаваць зямлю[244]. У новых умовах найбольш аптымальным шляхам захавання ранейшых уплываў стала гаспадарчая і прадпрымальніцкая дзейнасць. Гэты шлях быў добра вядомы Аляксандру Аляксандравічу. Для палескіх Скірмунтаў ён быў актуальным яшчэ да паўстання.

Шмат інфармацыі для разумення свядомасці і характару Аляксандра Скірмунта (малодшага) дае гісторыя з парэцкім «палацам». Яна, дарэчы, таксама сведчыць пра тую культурную і ментальную дыстанцыю, якая падзяляла маёнткі Моладава і Парэчча.

Справа ў тым, што Аляксандр Скірмунт вырашыў не будаваць палац. Месцам

---

[241] J. Gieysztor, *Pamiętniki z lat 1850–1865*. Tom I, s. 282, 402.

[242] Ibidem. Tom II, s. 148.

[243] E. Woynitłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza*, s. 38.

[244] Ibidem, s. 39.

жыцця ягонай сям'і стаўся перабудаваны цэх суконнай фабрыкі (?!). Славутая «шляхецкая пыха» цалкам адсутнічала ў парэцкага ўладальніка.

Пасля рамонту сядзіба парэцкіх Скірмунтаў была абсаджана дрэвамі і кветкамі, потым з'явіліся альтанкі, абвітыя плюшчом і дзікім вінаградам. У 1876 г. карэспандэнт варшаўскага часопіса «Kłosy» Ігнацы Аніхімоўскі нават быў уражаны прыгажосцю гэтага «палацыка»[245], дзе нарадзіліся Браніслава, Юзаф, Ванда, Вацлаў, Раман, Алена, Феліцыя і Зянон.

Аляксандр Скірмунт цалкам паглыбіўся ў гаспадарчыя справы. Найбольш цікавай старонкай яго дзейнасці было развіццё прамысловасці ў Парэччы і Моладаве.

Аўтар апісання Менскай губ. падпалкоўнік Генеральнага штаба Іван Зяленскі на пачатку 1860-х гг. меў усе падставы сцвярджаць, што мануфактурная прамысловасць у губерні мае «ничтожное значение»[246]. Паводле ягоных падлікаў і аналізу, прамысловасць Менскай губ. у гэты час была прадстаўлена шасцю цукроўнямі, дзвюма суконнымі фабрыкамі, свечным і мылаварным заводам[247]. Застаецца толькі дадаць, што трэцяя частка гэтай прамысловасці належала Аляксандру Сымонавічу Скірмунту, а кіраваў ёй ягоны сын Аляксандр.

З усіх цукровых заводаў Зяленскі вылучыў завод у Парэччы як «самый замечательный». Ён адзначыў, што завод месціцца ў 4-павярховым каменным будынку, мае два лакамабілі і чатыры паравыя катлы. Вытворчасць цукру была заснавана на выкарыстанні цэнтрыфугі, што значна павялічвала яе эфектыўнасць у параўнанні з традыцыйным прэсам. Штогод Парэцкі завод прадукаваў каля 9 тыс. пудоў цукру, у той час як астатнія пяць цукровых заводаў губерні – толькі каля 2,2 тыс.[248]

Іван Зяленскі таксама адзначыў, што вырошчванне цукровых буракоў значна палепшыла дабрабыт сялян навакольных вёсак. 1 дзес. «бураковай плантацыі» магла прынесці гаспадару да 137 руб. у год. Паводле падлікаў афіцэра Генштаба, за 5 месяцаў дзейнасці ў 1861–1862 г. цукроўня ў Парэччы прынесла 12,5 тыс. руб. (!) «чыстага прыбытку». Пры гэтым ён адзначыў, што на заробкі 120 рабочых пайшло толькі 3,6 тыс. (з разліку 6 руб. у месяц), іншыя выдаткі на іх утрыманне склалі яшчэ 1,8 тыс., а зарплата двух майстроў дасягнула 3 тыс. руб.[249]

Параўнанні заробкаў дазволілі аўтару апісання Менскай губ. сцвярджаць, што прадпрымальніцкі поспех Скірмунтаў у вялікай ступені грунтаваўся на выкарыстанні дармовай працы сялян і рабочых. Варта адзначыць, што Зяленскі цалкам праігнараваў вышэйзгаданую сацыяльную палітыку ўладальніка Парэчча (кватэры пры фабрыцы, дровы, харчаванне, лекар ды інш.).

---

[245] Z. Szczerzy, *Wycieczka po Pinski i Pinszczyznie*, «Kłosy» 1877, Nr 606.

[246] *Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губ.* Часть 2. Составил И. Зеленский. Санкт-Петербург 1864, с. 234.

[247] Тамсама, с. 241–242.

[248] Тамсама, с. 246–248.

[249] Тамсама, с. 249–250.



«Ліверпуль на Ясельдзе»
на малюнку Напалеона Орды.

Найбольш увагі Зяленскі надаў Парэцкай суконнай фабрыцы. Яе асноўнай прадукцыяй у той час былі тонкае сукно, трыко, сацін ды інш., а таксама падвойнае сукно. Па ўзроўні абсталявання фабрыка належала да самых сучасных. Аўтар апісання адзначыў, што ўладальнік не шкадаваў сродкаў дзеля набыцця апошніх навінак тэхнікі. Кошт усяго абсталявання разам з будынкамі ён ацаніў у 80 тыс. руб. Воўна набывалася ў Падольскай, Кіеўскай, Валынскай, Гарадзенскай і Менскай губ., а таксама на кірмашах Варшавы, Харкава і Палтавы.

Сукно выраблялася на 60-ці механічных станках саксонскай вытворчасці. Большая частка рабочых і надмайстраў складалася з былых прыгонных, а 1/3 – з габрэяў, былых салдат і дзяржаўных сялян. Усе яны мелі жыллё і харчаваліся пры фабрыцы за кошт уладальніка. Пры гэтым рабочыя атрымлівалі заробку ад 15 да 40 руб. у год, а надмайстры – ад 100 да 200 руб. у залежнасці ад працоўных абавязкаў. Колькасць усіх работнікаў вагалася ад 200 да 300 чал. у залежнасці ад маштабу вытворчасці. Майстроў было толькі пяцёра. Усе яны прыехалі з Германіі. Іх заробак складаў ад 500 да 1 000 руб.[250] Дарэчы, у спіс замежных падданых у Пінскім пав. (1905), магчыма, трапіў адзін з гэтых майстроў – Аляксандр Мель. Ён жыў пры фабрыцы з 1862 г. (!)

Паводле дадзеных Івана Зяленскага, якія грунтаваліся на дакументах А. А. Скірмунта, гадавая вытворчасць сукна вагалася ў межах ад 60 да 90 тыс. аршынаў. За перыяд з 1856 па 1860 г. яе кошт вырас з 205 да 300 тыс. руб. Прадукцыя збывалася на месцы, а таксама прадавалася ў Менску, Вільні, Кіеве, Адэсе, Бердычаве, Варшаве, Маскве і Пецярбурзе[251].

Пра памеры маёмасці Скірмунтаў сведчаць матэрыялы г. зв. «запісу падзелу» (7 снежня 1873 г.), згодна з якім, агульны маёнтак быў падзелены паміж сынамі нябожчыка Аляксандра Сымонавіча Скірмунта. У дакуменце згадваліся ў Пінскім пав. Альбрэхтова (3 671 дзес. зямлі, пляцы пад Пінскам і фабрыка свечак і мыла), Клетнае (5 473 дзес.), Парэчча (5 169 дзес., суконная фабрыка, ацэненая ў 100 тыс. руб., і цукроўня – у 50 тыс.), у Кобрынскім пав. – Моладава (5 471 дзес.), у Ялцінскім пав. – каменны дом (Балаклаўская даліна) з зямельнымі участкамі пад вінаграднікамі (больш 162 дзес.), у Свенцянскім пав. – Шаметаўшчына

[250] Тамсама, с. 256–257.
[251] Тамсама, с. 258.

(4 392 дзес.). Агульны кошт маёнтка Скірмунтаў быў ацэнены ў 510 тыс. руб.[252] Вінаграднікі каля Брындызі ў гэты дакумент не трапілі.

Падзел адбываўся паміж братамі Аляксандрам, Казімірам, Сымонам, Генрыкам і Канстанцінам, а таксама маленькім Зыгмунтам, сынам ужо памерлага Зыгмунта Аляксандравіча. У выніку кожны з братоў атрымаў у той ці іншай форме па 85 тыс. руб. Маёнтак Парэчча застаўся ва ўласнасці Аляксандра Аляксандравіча, а суконная фабрыка і цукроўня былі падзелены паміж ім, Канстанцінам і Сымонам. Казімір атрымаў вінаграднікі ў Балаклаўскай даліне, Канстанцін – Шаметаўшчыну на Віленшчыне, Генрык – Моладава ў Кобрынскім пав., Сымон – Клетнае, а Альбрэхтова перайшло да іх пляменніка Зыгмунта Зыгмунтавіча.

На працягу 1870-х гг. Аляксандр выкупіў долі сваіх братоў[253] і стаў адзіным уладальнікам прамысловасці Парэчча. У гэты час колькасць рабочых на суконнай фабрыцы, цукроўні і ў механічных майстэрнях Парэчча даходзіла да 600 чал.

Развіццё прамысловасці ўносіла свае карэктывы ў сельскагаспадарчую вытворчасць маёнтка і вёскі. Настаўнік Парэцкага народнага вучылішча Пётр Гякоўскі, адказваючы на апытальнік Паўночна-Заходняга аддзелу Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства (1872) у межах праграмы вывучэння стану сельскай гаспадаркі і прамысловасці, паведаміў пра плантацыі цукровых буракоў (*свекловицы*) і варсільных шышак. Ён сцвярджаў, што плантацыі буракоў займалі плошчу ў 39 дзес. на землях А. Скірмунта і яшчэ 32 дзес. ў суседніх маёнтках Велясніцы і Кажанёва. Сяляне таксама вырошчвалі цукровыя буракі, тым больш, што ўладальнік Парэчча ў гэтым выпадку кампенсаваў сялянскія выдаткі і перадаваў у бясплатнае карыстанне землі для пасеву зернавых, бульбы ды інш.[254] На цукроўні за пуд буракоў плацілі ад 10 да 12 кап.

Гякоўскі ўпершыню згадаў пра плантацыі варсільных шышак, прысутнасць якіх на Палессі ў 1870-я гг. мела адценне сенсацыі. Справа ў тым, што шышкі, без якіх не працавалі варсільныя машыны і была недасягальнай высокая якасць сукна, раслі толькі ў Францыі. Гэты імпартны прадукт быў надзвычай дарагім. Між тым, у Парэччы іх вырошчвалі не толькі на ўласныя патрэбы, але і на продаж. Карэспандэнт Паўночна-Заходняга аддзела нават заўважыў, што «если бы крестьяне и другие землевладельцы занялись посевом их, то Россия бы обрела несколько сот тысяч рублей, поглощаемых другими державами»[255].

Гякоўскі таксама пісаў пра паравы млын і тартак у маёнтку. Апрацаваныя брусы з дуба і сасны водным шляхам адпраўляліся ў Прусію, дзе каштавалі ад 2-х да

---

[252] НГАБ. Ф. 147, воп. 3, спр. 26892, арк. 5.

[253] Тамсама, арк. 1.

[254] БВУ. Аддзел рукапісаў. F 34–248. П. Гяковский, *Сведения о состоянии сельского хозяйства и промышленности в районе Поречского народного училища*, вопросы 14, 51.

[255] Тамсама, вопрос 51.

4-х руб. за штуку. Дрэва іншых гатункаў прадавалася для сялянскіх пабудоў і каштавала ад 60-ці да 80-ці кап. з вырубкай і вывазам[256].

Найбуйнейшым прадпрыемствам заставалася суконная фабрыка. Паводле інфармацыі Гякоўскага, якую ён атрымаў у фабрычным праўленні, у 1872 г. кошт яе прадукцыі склаў больш за 313 тыс. руб. Прадукцыю цукроўні ацанілі прыблізна ў 61 тыс. Сукно прадавалася ў Маскве, Пецярбурзе, Вільні, Кіеве і Пінску. У тым самым кірунку (за выключэннем Кіева) вывозіўся і цукар[257].

Карэспандэнт варшаўскага часопіса «Kłosy» Ігнацы Аніхімоўскі (*Земіслаў Шчыры*) наведаў Парэчча ўвосень 1876 г. і быў уражаны маштабам вытворчасці Парэцкай фабрыкі. Паводле ягоных звестак, фабрыка штогод вырабляла прадукцыі (драп і тонкае сукно) на 250 тыс. руб. На ёй працавалі 420 рабочых, дзейнічала адна паравая машына, 100 ткацкіх станкоў і фарбавальня. Аніхімоўскага таксама ўразіла тое, што кіраўніцтва фабрыкі цалкам складалася з мясцовых ураджэнцаў, пераважна моладзі. Сярод іх ён заўважыў сына паэта Людвіка Кандратовіча (*Уладзіслава Сыракомлі*). Аўтар заметкі таксама звярнуў увагу на дамы для рабочых і іх сямей.

ДАКУМЕНТ

Парэчча ў апісанні Ігнацыя Аніхімоўскага. 1876 г.[258]

Парэчча нагадвае невялікае замежнае мястэчка. Прыгожы двухпавярховы палацык, устроены з камфортам, аточаны напоўненымі кветкамі скверамі і стылёвымі альтанкамі, аплеценымі плюшчом і дзікім вінаградам. Франтон упрыгожаны фантанам. З вокнаў адкрываецца прыемны від на Ясельду, якая цячэ каля скверaў і дубовага парка, шырока разліваецца і губляецца за далягляда м.

Паўсюль пануе суровы парадак. Усё адбываецца ва ўласцівы час. Нават штодзённае жыццё пана Скірмунта прыстасавана да фабрычнага званка. Калі глядзіш на гэтых рацыянальна актыўных людзей, пачынаеш разумець, якой каштоўнасцю з'яўляецца працоўны час [...] З асаблівым задавальненнем я прыглядаўся да ўпарадкаванай сельскай гаспадаркі, клапатлівага вырошчвання лясоў, шырокіх і добра дагледжаных дарог. Быў сведкам завяршэння дрэнажа 50 моргаў зямлі, прызначанай пад буракі. Такім спосабам гаспадар асушыў поле. За гэты дрэнаж Аляксандр Скірмунт на выставе ў Шаўлях атрымаў медаль [...] Адным словам, паўсюдна панує парадак, скіраваны на тое, каб зробленыя паляпшэнні далі як найлепшы вынік. Немагчыма лепей выкарыстаць галоўны прынцып палітычнай эканоміі.

Напрыканцы 1870-х гг. суконная фабрыка ў Парэччы па-ранейшаму застава-

[256] Тамсама, вопрос 19.

[257] Тамсама, вопрос 43–47.

[258] Z. Szczerzy, *Wycieczka po Pinski i Pinszczyznie*, «Kłosy». 1877, Nr 606.

лася адным з буйнейшых прадпрыемстваў Менскай губ. Пра гэта сведчыць статыстыка развіцця прамысловасці і гандлю за 1879 г., якую аналізаваў эканаміст Мячыслаў Дабашыньскі на старонках пецярбургскай газеты «Край». Дык вось, сукно ў губерні выраблялася на 6 фабрыках, дзе працавалі 542 працаўніка, а кошт усёй вытворчасці складаў 343,5 тыс. руб. Зразумела, якое значнае месца ў гэтай вытворчасці займала фабрыка Скірмунта! Таксама варта адзначыць, што статыстыка зафіксавала большую колькасць працоўных толькі ў вытворчасці віна і спірту, але там існавала 212 прадпрыемстваў[259].

Цікавай крыніцай па гісторыі прамысловасці ў Парэччы з'яўляюцца кнігі рэгістрацыі споведзі і прычасця Парэцкай праваслаўнай царквы другой паловы XIX ст., якія захаваліся часткова[260]. Яны ўтрымліваюць спісы фабрычных рабочых праваслаўнага веравызнання разам з іх сем'ямі («Двора Поречье крестьяне, состоящие при суконной фабрике», «Дворовые и их домашние»). Прагляд матэрыялаў за 1854, 1862, 1865, 1868, 1870, 1880 і 1886 гг. дазваляе сцвярджаць, што на фабрыцы працавалі як мясцовыя ўраджэнцы, так і прышлыя. У асобных выпадках (Мельнікі, Лукашыкі ці Лукашэвічы, Шпакоўскія ды інш.) можна нават казаць пра працоўныя дынастыі.

Праца на фабрыцы дазваляла ўтрымліваць даволі вялікія сем'і. Адзін з запісаў у кнізе за 1854 г. сведчыць, што рабочы Юстын Іванавіч Мельнік (32 г.), які меў дачку Караліну (5 г.), утрымліваў таксама служанку (!).

У кнізе за 1880 г. зафіксавана найбольшая колькасць праваслаўных працоўных фабрыкі разам з сем'ямі – каля 180 чал. У 1886 г. – толькі каля 60 чал. Праўда, у гэтым годзе ў кнізе таксама пачалі фігураваць «Мещане и их домашние» (35 чал.). Растлумачыць змяншэнне колькасці праваслаўных работнікаў складана, бо аб'ём фабрычнай вытворчасці за 1885 г. ніяк не сведчыў пра крызіс фабрыкі ў Парэччы.

Матэрыялы Менскага губернскага статыстычнага камітэта даюць больш поўную інфармацыю пра дзейнасць фабрыкі ў другой палове 1880-х гг. Так, у 1885 г. на фабрыцы было выраблена больш 65,6 тыс. аршын драпа і 2,2 тыс. аршын тонкага сукна на агульную суму амаль 200 тыс. руб. Колькасць рабочых перавысіла 370 чал. На фабрыцы былі дзве паравыя машыны, тры паравыя катлы, 100 ткацкіх станкоў і 2 тыс. верацён.

Прадукцыя Парэцкай фабрыкі (асабліва драп) карысталіся вялікім попытам і прадавалася ў Пецярбурзе, Маскве, Вільні, Коўне, Беластоку, Варшаве, Кіеве ды інш. Дырэктарам фабрыкі быў згаданы А. Скупееўскі, які меў «общее образование (техническое)». Таксама адзначалася, што пры фабрыцы існаваў шпіталь на 12 месцаў і ашчадная каса (з 1878 г.) з гадавым абаротам у 30 тыс. руб.[261] Праз ча-

[259] «Kraj». 1883, Nr 46.

[260] Кнігі былі выратаваныя ад спалення Антанінай Сідарук (в. Парэчча, 2015) і перададзеныя ў НГАБ.

[261] НГАБ. Ф. 21, воп. 1, спр. 34, арк. 187.

тыры гады (1889) агульны кошт прадукцыі склаў ужо каля 192 тыс. руб. Рабочыя жылі ў чатырох дамах. Працягласць працоўнага дня складала 13 гадзін, а месячны заробак вагаўся ў межах ад 4-х да 10-ці руб.[262]

У 1890 г. Парэчча наведаў падчас Палескай экспедыцыі па заданні Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі малады навуковец Мітрафан Доўнар-Запольскі. Пазней на старонках газеты «Виленский вестник» (1890–1891) ён паведаміў, што Парэцкая фабрыка стала першай у Расіі, дзе працоўныя атрымлівалі пэўную долю ад прыбыткаў. Назіраючы за трэцім пакаленнем парэцкіх рабочых, большасць якіх былі пісьменнымі, даследчык адзначыў іх знешнюю адметнасць ад сялян. Таксама звярнуў увагу на габрэяў, што працавалі ў фарбавальні.

М. Доўнар-Запольскі быў уражаны плантацыяй варсільных шышак у Парэччы. Праекты іх вырошчвання на Каўказе і на поўдні Расіі толькі абмяркоўваліся, але нічога не было зроблена. А вось Скірмунты ў Парэччы здаўна карысталіся выключна ўласнымі шышкамі. Гаспадар маёнтка паведаміў даследчыку, што гадавы прыбытак з дзесяціны варсільных шышак складаў каля 400 руб.[263]

У наступным годзе госцем маёнтка быў Юльян Талько-Грынцэвіч. Пад псеўданімам *Ян Ілгоўскі* ён распавёў на старонках газеты «Край» пра сваё падарожжа па Палессі (1891) і таксама не абмінуў увагай прамысловасць Парэчча. Ён адзначыў вялікі маштаб вытворчасці на суконнай фабрыцы і дадаў, што яе ўладальнік нават ва ўмовах крызісу апошніх гадоў не стаў на шлях скарачэння вытворчасці. Паводле меркавання аўтара, Скірмунт кіраваўся выключна пачуццём «грамадзянскага абавязку» і не хацеў пазбавіць сваіх рабочых заробкаў[264].

Пра поспехі суконнай вытворчасці ў Парэччы таксама сведчаць узнагароды, якія атрымлівала фабрычная прадукцыя. У 1865 г. на Мануфактурнай выставе ў Маскве парэцкае сукно атрымала вялікую срэбную медаль, а праз два гады ў Парыжы на Сусветнай выставе – ганаровы ліст[265]. Андрэй Кіштымаў знайшоў звесткі пра поспехі парэцкага сукна на Сусветных выставах у Вене (1873) і Парыжы (1878), дзе быў атрыманы вялікі срэбны медаль, на ўсерасійскіх выставах у Маскве ў 1882 г. (залаты медаль) і Ніжнім Ноўгарадзе ў 1896 г. (срэбны медаль)[266]. Сукно Парэцкай фабрыкі дэманстравалася на выставе ў Менску з нагоды 25-годдзя дзейнасці Менскага таварыства сельскай гаспадаркі ў аддзеле рамесных вырабаў і прамысловасці (1901). У тым самым годзе ў Менску прадукцыя фабрыкі атрымала залаты медаль на Юбілейнай выставе вырабаў сель-

---

[262] Тамсама, спр. 54.

[263] М. Запольский, *Заметки из путешествия по Белоруссии*, «Виленский вестник». 1890, № 265.

[264] J. Iłgowski [J. Talko-Hryncewicz], Z *wycieczki na Białorus*, «Kraj». 1891, Nr 36.

[265] Z. Szczerzy, *Lipowa, w pazdzierniku 1876 r.*, «Kłosy». 1877, Nr 606.

[266] А. Киштымов, *Западнополесская династия Скирмунтов XIX–XX вв.*, с. 89.

скай гаспадаркі і прамысловасці[267]. Апошнія поспехі былі звязаны з Раманам Скірмунтам, які ў 1880–90-я гг. актыўна ўдзельнічаў у кіраванні Парэцкім маёнткам.

На пачатку XX ст. фабрыка захоўвала свае высокія пазіцыі, хоць колькасць рабочых скарацілася да 250 чал. (1901, 1906)[268]. Сустракаюцца звесткі, што Парэчча было адным з галоўных пастаўшчыкоў драпа для пашыву шынеляў афіцэраў расійскай арміі. Таксама вядома, што ў 1900 г. сукно з Парэчча прадавалася ў адмысловых крамах у Маскве і Вільні[269].

Аляксандр Скірмунт (малодшы) адрадзіў цукровую вытворчасць у маёнтку. Новая цукроўня (1860) істотна адрознівалася ад папярэдніх. Яна была адным з буйнейшых прадпрыемстваў гэтай галіны прамысловасці ў Беларусі. Штодня тут перапрацоўвалася да 1 000 ц цукровых буракоў па новай для таго часу тэхналогіі з выкарыстаннем цэнтрыфугі. У 1862 г. у цукроўні былі ўсталяваны чатыры паравыя катлы агульнай магутнасцю ў 100 к. с. і працавала 300 рабочых[270].

Сялянам навакольных вёсак прамысловыя прадпрыемствы Скірмунтаў дапамаглі палепшыць дабрабыт, бо стваралі дадатковыя магчымасці для заробкаў, звязаных, напрыклад, з падвозам дроў і з вырошчваннем цукровых буракоў. Ужо ў 1860 г. замест чыншу і паншчыны прыгонныя павінны былі пастаўляць на цукроўню 20 «бочак» буракоў з «дыму»[271]. Сяляне іншых маёнткаў маглі толькі зайздросціць парэчанам.

Прадукцыя цукроўні была прадстаўлена на сусветнай выставе ў Парыжы, дзе атрымала бронзавы медаль і дыплом[272]. Аднак, калі ўзнагарода дайшла да ўладальніка фабрыкі, тая ўжо не існавала. Пажар 1879 г. цалкам знішчыў цукроўню. Скірмунт вырашыў яе не аднаўляць. На яе месцы збудавалі вінакурны завод, які стаў годным канкурэнтам вінакурні ў Моладаве. Верагодна, менавіта гэта стала прычынай атрымання А. Скірмунтам у 1879 г. закладнага пасведчання на маёнтак Парэчча. Падобна, што з'явілася вострая патрэба ў значных фінансавых сродках, і ўладальнік не знайшоў іншага шляху, як «закласці» маёнтак у Віленскі зямельны банк пад пазыку[273].

Вінакурны завод у Парэччы месціўся ў адбудаваным каменным гмаху былой цукроўні. Ён пачаў даваць прадукцыю ў 1880 г. Матэрыялы Менскага статыстычнага камітэта паведамляюць, што кошт прадукцыі ў 1887 г. склаў каля 19 тыс.

---

[267] *Wystawa w Minsku*, «Kraj». 1901, Nr 36.

[268] НГАБ. Ф. 458, воп. 1, спр. 352, арк. 43–44 адв.

[269] *Вся Россия. Русская книга промышленности, торговли, сельского хозяйства и администрации. Адрес-календарь Российской империи.* Том 1. СПб. 1900, стлб. 94, 1065.

[270] N. Orda, *Aleksander Skirmunt*, «Tygodnik ilustrowany». 1871, Nr 175, s. 214.

[271] Ibidem. («Бочка» – расійская мера аб'ёму і вагі. 1 бочка роўная 10 пудам або 163,8 кг).

[272] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 3401, арк. 1–3.

[273] Тамсама. Ф. 147, воп. 3, том 9, спр. 26551, арк. 1–2.

руб.[274] Дзеля параўнання адзначу, што ў 1896 г. кошт прадукцыі моладаўскай вінакурні склаў трохі болей за 13 тыс. руб.[275]

З-пад увагі ўладальніка Парэчча не выходзілі і іншыя сферы гаспадарчай і прадпрымальніцкай дзейнасці, у т. л. гандаль віном і гарэлкай. Напрыканцы 1880-х гг. Аляксандр Скірмунт меў склады і крамы ён у Вільні, Коўне і Менску. Там прадавалася прадукцыя крымскіх ды італьянскіх вінаграднікаў, якія належалі братам Казіміру і Сымону, а пазней сталі ўласнасцю Аляксандра Аляксандравіча. Газета «Край» на працягу ўсяго 1905 г. друкавала рэкламу скірмунтаўскай «Старой гарэлкі» з Парэчча (яе таксама называлі «скірмунтоўкай»). Бутэлька каштавала 2,5 руб. і прадавалася ў крамах Вільні і Коўне.

Шмат намаганняў прыкладалася дзеля развіцця лясной гаспадаркі, правядзення меліярацыі, увядзення рацыянальнай сістэмы земляробства і жывёлагадоўлі. Менавіта на гэта ў першую чаргу звярнуў увагу малады даследчык Мітрафан Доўнар-Запольскі падчас наведвання маёнтка (1890).

ДАКУМЕНТ

Мітрафан Доўнар-Запольскі пра наведванне Парэчча. 1890 г.[276]

Я в кратких словах расскажу о тех коренных улучшениях, которые введены Скирмунтами в их имении. Правильная система лесоводства ведется с 30-х годов. Огромные леса разделены на участки, по возрасту и качеству леса. Рубится, конечно, только вполне зрелый лес. Кроме того, леса и болота канализированы, пересечены целою сетью каналов, изливающих свои воды в Яцольду [Ясельду – А. С.], на берегах которой расположено имение. Каналы приносят огромную пользу имению. Кроме того, что они осушают лес, гарантируя его от чрезвычайной сырости, которая здесь во многих местах уменьшает качественность леса. Каналы служат, главным образом, ещё для сплава леса. Они устроены так, что главные жилы их соединяются недалеко от двора имения, и притом каналы проникают в самые отдаленные участки лесов и болот и соединяют их с двором.

Весной можно по этим каналам сплавлять в имение дровяной и строевой лес с вырубленных участков. Нужно заметить, что такая операция значительно сохраняет расходы по имению: заводы поглощают огромное количество топлива, и, кроме того, лес, идущий в продажу выигрывает в цене, так как он подвозится к сплавной реке Яцолде. Мы уже не будем упоминать о той огромной пользе, которую принесли каналы осушению полей и лугов.

Луга в имении также обращают на себя внимание: они лежат в долине реки Яцольды, занимая огромное пространство в несколько тысяч десятин.

---

[274] Тамсама. Ф. 21, воп. 1, спр. 44, арк. 423–423 адв.

[275] НГАБ у Гародні. Ф. 313, воп. 1, спр. 13, арк. 1.

[276] М. Запольский. *Заметки из путешествия по Белоруссии*, «Виленский вестник». 1890, № 265.

Пространство, занятое лугом, совершенно чистое и ровное: ни лозы, ни зарослей где-либо вы не встретите. Культура сенокоса доведена до того, что он обязательно косится два раза в год.

Нельзя не обратить внимания на дороги, проведенные по всему имению в лесах и по лугам. В виду низменной местности, дороги насыпаны выше ее уровня и с обоих сторон акопаны канавами. Такое устройства дорог частным владельцем – мера исключительная.

Но что самое замечательное в местном хозяйстве владельцев имения Поречье – это искусственное заселение леса. Всякий кусок поля, неудобный для хлебопашества, в имении не пропадает: он засеивается лесом. Кроме того, лесосеяние приносит пользу земледелию: все поля, подвергающиеся наносным пескам с соседних песчаных холмов, также обсажены лесом. Лесосеяние ведется здесь уже более 60 лет.

Конечно, при таком лесном хозяйстве необходим ученый лесничий и соответствующий штат служащих, что существует уже много десятков лет в имении.

Я не буду говорить о мелких улучшениях в культировании различных растений, о рациональном земледелии и скотоводстве – общие приемы того и другого известны, замечу только, что все стороны хозяйства заведены по улучшенным системам ещё в то время, когда у нас в России ещё никто и не помышлял о каких-либо нововведениях в сельском хозяйстве; системы хозяйства в Поречье постепенно улучшаются сообразно с успехами науки.

На жаль, іншыя бакі штодзённасці «Ліверпуля на Ясельдзе» або сямейнага жыцця Скірмунта ахарактарызаваць складана па прычыне адсутнасці дакументаў. Так, застаюцца невядомымі матывы надпісання Аляксандрам Скірмунтам 22 лістапада 1882 г. даверанасці на імя старэйшага сына Аляксандра (1858 г. нар.), які ў той час быў студэнтам Варшаўскага ўніверсітэта.

У адпаведнасці з даверанасцю апошні атрымаў права распараджацца маёнткам і суконнай фабрыкай: «Имея надобность часто отлучаться из дому и не имея возможности постоянно заниматься делами, касающимися управления недвижимым имением моим Поржече, в Пинском уезде положенном, и суконною фабрикою, там же находящеюся, прошу Вас принять труд управления сказанным имуществом моим на себя, а посему предоставляю Вам иметь хождение и ходатайство по всем моим делам, сказанных имений касающихся… А всё, что вы на основании моей доверенности законно учините за благо приму, спорить и прекословить не буду. 22. 11. 1882 г.»[277]

Аднак Аляксандр Скірмунт (III) як новы гаспадар Парэчча ніколі не фігураваў у захаваных дакументах. Падобна, што гэтая даверанасць была ануляваная. Імя старэйшага сына фігуравала толькі ў матэрыялах нарад Менскага губернскага

[277] НГАБ. Ф. 147, воп. 3, том 9, спр. 25657а, арк. 46–46 адв.

і Пінскага павятовага камітэтаў пра патрэбы сельскагаспадарчай прамысловасці (1902–1903), а таксама ў дакументах Пінскага рымска-каталіцкага дабрачыннага таварыства (1902–1917). Яшчэ ён згадваецца як уладальнік маёнтка Кажанёва (2,3 тыс. дзес.). Вядома, што пазней такой даверанасцю карыстаўся ўжо Раман Скірмунт. Менавіта ён замяніў старэйшага брата і стаў галоўным пераемнікам бацькоўскай справы.

Пры ўсёй сваёй вялізарнай занятасці і пагружанасці ў гаспадарчыя клопаты Аляксандр Скірмунт (малодшы) знаходзіў час для адпачынку і для іншых спраў. Так, узімку 1883 г. «Край» паведаміў, што ў лясах маёнтка Парэчча ў Пінскім пав. 19 і 22 лютага адбылося паляванне на ласёў з удзелам гасцей з Каралеўства Польскага, Галіцыі і Прусіі. Было забіта 12 ласёў, дзік і шмат дробнай жывёлы. Пасля палявання госці наведалі суконную фабрыку, вінакурны завод сучаснай тэхналогіі, тартакі ды інш. Убачанае пераканала гасцей, што Парэчча з'яўляецца цэнтрам прамысловасці ўсяго Краю, які некалі называлі «глухім Палессем»[278]. Дарэчы, такія паляванні былі магчымыя таму, што ў адрозненні ад многіх зямян Беларускага краю А. Скірмунт не дапускаў масавай вырубкі лесу і захоўваў вялікія пушчы, дзе мог жыць буйны лясны звер.

Пра культурнае жыццё ў маёнтку вядома няшмат, хоць узровень адукацыі ўсіх прадстаўнікоў парэцкай сям'і Скірмунтаў быў гарантыяй, што яно павінна было быць на адпаведна высокім узроўні. Знойдзеныя А. Ільіным дакументы сведчаць, што ў канцы 1870-х гг. гаспадар маёнтка вёў перапіску з вядомым польскім лінгвістам і этнографам, рэдактарам часопіса «Вісла» Янам Карловічам (1836–1903). Карэспандэнцыя сведчыць пра сталыя кантакты паміж імі[279]. Дарэчы, перапіску з Янам Карловічам у гэты ж час вяла і Канстанцыя Скірмунт[280].

Жыццё Парэчча, у якім, паводле Аніхімоўскага, панаваў «суровы парадак», а рытм задавалі прамысловыя прадпрыемствы, знаходзілася ў выразнай супярэчнасці з жыццём навакольных палескіх вёсак і маёнткаў нават блізкіх сваякоў Скірмунтаў.

У Моладаве, якое знаходзілася на адлегласці 8 км ад Парэчча, захоўваліся традыцыі шляхецка-арыстакратычнага ладу жыцця. Часам здаецца, што жыхары маёнтка быццам спрабавалі спыніць час. Тут не даводзіцца казаць пра нейкае збліжэнне Скірмунтаў і вёскі. Наадварот, паступова нарастаў канфлікт, які ўпершыню адкрыта праявіўся ў снежні 1905 г., калі ў Моладаве адбыліся моцныя сялянскія хваляванні.

Адзіным прамысловым прадпрыемствам тут была вінакурня, якая, аднак, ніколі

---

[278] «Kraj». 1883, Nr 8.

[279] А. Ильин, Е. Игнатюк. Очерки истории культуры Пинщины (IX – начало XX в.), с. 193–194. (Лісты знаходзяцца ў Аддзеле рукапісаў Навуковай бібліятэкі імя В. Стэфаніка ў Львове).

[280] Тамсама, с. 198–203.

не была аб'ектам асаблівай увагі ўладальніка Моладава Генрыка Скірмунта. Затое гэты маёнтак паступова ператвараўся ў пэўны аазіс культуры, які часта наведвалі многія творцы. Адным з іх быў сваяк Скірмунтаў вядомы кампазітар, музыкант, мастак і пісьменнік Напалеон Орда (1807–1883). Улетку 1867 г. ён прыехаў сюды ўжо не па сваёй волі. Год таму Напалеон Орда быў арыштаваны па падазрэнні ў «содействии мятежу» 1863 г. Пасля шматлікіх прашэнняў жонкі і ўмяшальніцтва пасла Францыі ў Расіі ён выйшаў з Кобрынскай турмы па амністыі. На пэўны час месцам пражывання без права выезду сталася якраз Моладава.

Частым госцем Моладаўскага палаца была пісьменніца Марыя Радзевічуўна (1863–1944), якая сябравала з дачкой Генрыка Ядвігай Скірмунтуўнай (1874–1968). Радзевічуўна амаль адразу пасля нараджэння засталася сіратой, бо бацькі былі высланы ў Сібір за падтрымку паўстання. Дзяўчынкай апекавалася Марыя Скірмунт з Кажанёва, а Скірмунты з Моладава і Парэчча сталі для яе бліжэйшымі сваякамі і сябрамі, а некаторыя яшчэ і пэўным жыццёвым узорам. Сярод літаратуразнаўцаў існуе меркаванне, што нехта са Скірмунтаў (часцей называюць Канстанціна з Моладава або Рамана з Парэчча) быў прататыпам Марка Чэртвана з рамана «Дэвайціс».

У Моладаве гасцяваў і знаходзіў віды для сваіх пейзажаў вядомы польскі мастак Юзаф Хэлмоньскі (1849–1914). Менавіта тут быў напісаны ягоны вядомы твор «Голас з Літвы», у якім мастак прадставіў пастуха, што граў на палескай сурме (1907).

Таксама тут гасцявала вядомая пісьменніца і сваячка Скірмунтаў Элізa Ажэшка (1841–1910), якая падтрымлівала з моладаўскімі Скірмунтамі сяброўскія адносіны і на працягу многіх гадоў ліставалася з імі. Яна ж актыўна спрыяла паэтычнай творчасці Генрыка. Так, у лісце да яго ад 9 сакавіка 1902 г. пісьменніца сцвярджала: «Ваш паэтычны талент будзе на нашым польскім небе зоркай першай велічыні»[281].

Красамоўны вобраз Моладава намаляваны ў лістах Элізы Ажэшкі да літаратурнага крытыка Аўрэлія Драгашэўскага. Так, у лісце ад 7 лютага 1904 г. яна прасіла падтрымаць «добрым словам» першы том *Poezji* (Варшава, 1903) Г. Скірмунта і наступным чынам ахарактарызавала гаспадароў Моладаўскага маёнтка: «Гэтыя два браты Скірмунты – дзеці з сям'і выключна інтэлігентнай і грамадска актыўнай. Старэйшы (Канстанцін Скірмунт) весь пагружаны ў грамадскія справы, шмат працуе, ахвяруючы час і сродкі, забываючы пра асабістыя інтарэсы і ўласнае шчасце. Блізка яго ведаю і часта бачу, бо бывае тут [у Гародні – *А. С.*] па грамадскіх справах. Розум, сэрца і рука – шчырыя і гарачыя. Малодшы (Генрык Скірмунт) – кампазітар і паэт. Гэтага ведаю менш, але бачу, што жыве цалкам у му-

[281] E. Orzeszkowa, *Listy zebrane*. T. 8. Do druku przygot. i komentarzem opatrzył Edmund Jankowski. Wrocław 1976, s. 305.

зыцы і паэзіі. Ёсць яшчэ дзве сястры – прыгожыя тыпы жанчын з высокімі ідэямі, якія нягледзячы на багацце, шмат і цяжка працуюць на розных палетках»[282].

Наведаўшы Моладава ўлетку 1905 г., Ажэшка падзялілася ўражаннямі з вядомым літаратуразнаўцам і гісторыкам літаратуры Мар'янам Здзяхоўскім у лісце ад 4 ліпеня 1905 г.: «Вельмі прыемная атрымалася паездка як з пункту гледзішча прыроды, сярод якой я апынулася, так і – у большай ступені – людзей, якіх наведала. Я жыла ў сельскім доме, прыгожым і старым, напоўненым прыгожымі і старымі рэчамі, атачоным дрэвамі, жыццё якіх вылічваецца стагоддзямі, доме адукаваным, у якім граюць, чытаюць, высока і шырока мысляць, а для мяне, беднай, доме здаўна сяброўскім»[283].

Пра жыццёвы рытм Моладава шмат гавораць радкі з ліста Канстанціна Скірмунта да Элізы Ажэшкі ад 30 верасня 1903 г.: «Восень тут ужо халодная і шэрая. Увечары распальваем у каміне бібліятэкі полымя і сядзім за вялікім сталом над кнігамі. Хто-небудзь зайграе на піяніна, часам падзелімся нейкімі меркаваннямі, а потым ізноў цішыня, сярод якой нараджаюцца і пранікаюць у душу думкі...»[284]

Вялізарная розніца паміж ладам жыцця і зацікаўленасцямі гаспадароў Парэчча і Моладава дазваляе яшчэ раз узняць праблему стаўлення заможнай шляхты да працэсаў сацыяльнай трансфармацыі, якія ў другой палове XIX ст. закранулі Беларуска-Літоўскі край. Відавочна, што большасць шляхты не прыняла перамен. Парэцкія гаспадары ўспрымаліся як нейкія дзівакі. З вялікай сям'і Аляксандра Сымонавіча Скірмунта і Канстанцыі з Сулістроўскіх духоўным «паплечнікам» уладальніка Парэчча стаў толькі брат Канстанцін, які гаспадарыў у маёнтку Шаметаўшчына Свенцянскага пав.

У некралогу, падпісаным крыптонімам *S. K.* (Канстанцыя Скірмунт?), адзначалася ягоная актыўная грамадская і гаспадарчая праца. Менавіта ён быў ініцыятарам і галоўным арганізатарам мясцовай крэдытна-ашчаднай суполкі ў Шаметаўшчыне (1877), якая «паспрыяла вызваленню селяніна з-пад улады ліхвяра». Ужо праз тры гады суполка налічвала 384 сябра, мела больш 60 тыс. руб. капіталу, $^{2}/_{3}$ якога пайшлі на крэдытаванне[285]. Канстанцін Скірмунт быў вядомым фундатарам культурніцкіх праектаў. На ягоныя сродкі выдаваліся паэтычныя зборнікі, былі адлітыя ў бронзе чатыры асобнікі ўжо згаданых шахмат Алены Скірмунт. Ён жа абвясціў грашовую прэмію за знаходку рукапісу «Гісторыі Літвы» Ігната Анацэвіча (1780–1845)[286].

---

[282] Ibidem, s. 167.

[283] Ibidem. T. 2, 1955, s. 264.

[284] Ibidem. T. 9, 1981, s. 564.

[285] *Słownik geograficzny Krolewstwa Polskiego i innych państw słowiańskich.* Tom XI. Warszawa 1890, s. 894.

[286] Гэты загадковы рукапіс, над якім працаваў вядомы гісторык, так і не быў знойдзены. Магчыма, І. Анацэвіч не паспеў закончыць працу над ім. Аднак існуе версія, што

Дзейнасць Аляксандра і Канстанціна Скірмунтаў не стала жыццёвым узорам нават для большасці сваякоў. Магчыма, іх таксама датычыла тая знішчальная ацэнка, якую пазней даў заможнай шляхце Палесся XIX ст. Юзаф Абрэмбскі. Ён адзначаў яе рэнцьерскі і спажывецкі характар, сцвярджаючы, што апошняе нават не залежала ад таго, ці шляхціч кіраваў уласным маёнткам архаічным спосабам і імкнуўся захаваць старашляхецкі лад жыцця, ці ён займаўся пэўнай мадэрнізацыяй гаспадаркі і ствараў імідж чалавека сучаснай эпохі. Паводле Абрэмбскага, месца шляхціча ў сацыяльнай іерархіі свайго саслоўя паранейшаму вызначалася памерамі зямельных уладанняў і колькасцю прыгонных ці працоўных. Спажывецкі эксгібіцыянізм заставаўся галоўным рэгулятарам чалавечых узаемадачыненняў, вызначаў сацыяльную пазіцыю шляхціча і адпаведна належную яму павагу атачэння[287].

Адначасна шляхціч з пагардай глядзеў на тых, хто ўзбагачаўся, дзякуючы ўласным ініцыятывам і гаспадарчым намаганням. Большасць заможнай шляхты ўсё яшчэ жыла мінулым і марыла пра вяртанне часоў Рэчы Паспалітай. Ідэалогія «варшаўскага пазітывізму» з яе высокай ацэнкай чалавека-стваральніка матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў была чужой для менталітэту большасці мясцовай шляхты.

А вось жыццё сялян у вёсках Моладава і Парэчча, як і сотні гадоў таму, вызначалася цыклам земляробчай працы. Ужо згаданы настаўнік Пётр Гякоўскі даволі падрабязна ахарактарызаваў асноўныя заняткі і гаспадарчыя схільнасці парэчан. Паводле ягоных дадзеных, у 1872–1873 гг. у вёсцы і маёнтку пражывала каля 1 200 чал. Мясцовы інфарматар Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства на падставе «наречия» вылучыў чатыры катэгорыі насельніцтва Парэцкай воласці – сялян-уласнікаў («белорусское наречие»), шляхту («дворян») і мяшчан з Пінска, што карысталіся польскай мовай, а таксама немцаў і чэхаў, што часова жылі ў воласці. У апошнім выпадку гаворка, відаць, ішла пра нешматлікіх «фабрыкантаў» і перасяленцаў-земляробаў.

Галоўным заняткам вёскі, які забяспечваў яе існаванне, было земляробства. Кожны сялянскі двор меў: зямлі пад сядзібу – 1 600 саж., пашні – 9 дзес. 424 саж., сенакосаў – 5 дзес. 1 224 саж. Выганы для скаціны знаходзіліся ў агульным карыстанні. У якасці асноўных палявых культур фігуравалі жыта, ячмень, авёс, пшаніца, грачыха, проса, а таксама бульба, рэпа і буракі. Ураджаі зернавых у гэты час гарантавалі пражыванне сям'і з 10 чалавек. Большая сям'я ўжо павінна была набываць хлеб.

Памешчыцкія землі і частка сялянскіх апрацоўваліся парабкамі. Іх гадавы заробак у Скірмунта складаў 35–40 руб., а ў сялян – 17–20 руб. пры харчаванні за

рукапіс быў перададзены аўтарам пісьменніку і гісторыку Юзафу Ігнату Крашэўскаму (1812–1887).

[287] J. Obrębski, *Polesie. Studia etnosocjologiczne*..., s. 73.

кошт гаспадара. Садаводствам і гародніцтвам займаліся пераважна памешчыкі. За збор грыбоў і ягад у памешчыцкіх лясах сяляне павінны былі адпрацаваць два дні з «душы». Сабранае яны збывалі габрэям-пасярэднікам.

Пад сенакосамі ў Скірмунта знаходзілася 900 дзес., а пад выганам для быдла – каля 1 тыс. дзес. Сялянскія сенакосы не заўсёды гарантавалі магчымасць нармальнай зімоўкі для скаціны. Недахоп сена прымушаў набываць яго ў памешчыка. Так, увосень лугавое сена каштавала ад 12 да 15 кап. за пуд, а ўвесну кошты ўзрасталі да 35 кап.

Жывёлагадоўля ў сялянскіх дварах была арыентавана толькі на ўласныя патрэбы. Пры гэтым згадваюцца каровы «тирольской породы», якія каштавалі ад 40 да 60 руб., што амаль удвая перавышала кошт кароў «простой породы». Зямля апрацоўвалася валамі і коньмі. Хатнюю птушку таксама разводзілі толькі для ўласнай патрэбы. Рыбалоўствам сяляне займаліся пераважна ўзімку.

Варта дадаць, што выкупная пазыка за зямлю аплочвалася з двара (21 руб. 74 кап.), а дзяржаўныя падаткі – з «душы» (5 руб. 23 кап.). Таксама даводзілася аплочваць куплю і рамонт прыладаў працы і транспартных сродкаў, пэўнага харчу і тавараў. Паводле падлікаў Гякоўскага, кожная парэцкая сям'я выдаткоўвала штогод на соль, гарэлку, боты, шапку і рукавіцы ад 38 да 50 руб., на сала ішло ад 40 да 80 руб. Затое ўся вопратка выраблялася ў хаце з уласных матэрыялаў.

Асобную ўвагу Гякоўскі надаў дадатковым заробкам вёскі, магчымасць для якіх стварала прамысловасць маёнтка. На фабрыку сяляне звычайна ішлі позняй восенню і зімой. Заробкі былі даволі значнымі, хоць істотна саступалі заробкам сталых «фабрыкантаў», якія да таго ж мелі бясплатнае харчаванне, пражыванне і атрымлівалі дровы. Так, у залежнасці ад кваліфікацыі і характару працы гадавы заробак мужчыны складаў ад 40 да 300 руб., жанчыны – ад 20 да 40 руб., а дзіцяці (з 14 год) – ад 12 да 18 руб. Таксама працяглы час сяляне зараблялі грошы перавозкай цукра і сукна, якія даводзілася вазіць у Менск, Вільню, Берасце, Пінск і Коўна. Аднак развіццё чыгуначнага транспарта паступова перакрэсліла магчымасць такога заробку[288].

Трэба адзначыць, што актыўная гаспадарчая дзейнасць парэцкіх Скірмунтаў моцна закранала вёску, абуджала ініцыятыву і паступова ўцягвала ў эканамічны і гандлёвы вір сялян Парэчча. Усё гэта спрыяла пэўнаму збліжэнню маёнтка і вёскі, якіх у канцы XIX ст. ужо не дзяліла сацыяльная бездань, вядомая з часоў Рэчы Паспалітай. Дарэчы, менавіта Скірмунты заснавалі першую школу ў Парэччы, якая, праўда, арыентавалася амаль выключна на падрыхтоўку працоўных суконнай фабрыкі. Тым не менш, гэты факт варты ўвагі.

Патрэба ў адукацыі стала больш адчувальнай ужо пасля адмены прыгону.

---

[288] БВУ. Аддзел рукапісаў. F 34–248. П. Гяковский. *Сведения о состоянии сельского хозяйства…*

Вядома, што ў 1864 г. існавала школа пры Парэцкай царкве, заняткі ў якой вёў святар. Пра гэта паведаміў у лісце міравому пасярэдніку парэцкі валасны старшыня Сідарук. Ён таксама даслаў спіс вучняў. Гэта былі Якаў Сідарук, Адам Горбач, Раман і Кірыла Чугаі, Грыгоры Лукашык, Максім Есіпчук, Сільвестр Цярлецкі, Патап Ковель, Павел Застружскі, Грыгоры, Якаў і Цімафей Хвясюкі, Лявон Юрчук, Адам Гур'янчык, Лукаш і Янка Глушкі[289]. Большасць гэтых прозвішчаў і сёння сустракаюцца ў Парэччы.

У згаданым лісце адчувальны клопат валаснога старшыні пра школу. Ён прыгадаў, што ў красавіку 1864 г. губернатар забараніў самавольнае будаўніцва школ і загадаў чакаць распрацоўкі адзінага стандартнага праекта вясковай школы. Аднак і напрыканцы лета праект у Парэчча не даслалі, і Сідарука цікавіла магчымасць самастойнага будаўніцтва школы.

Сітуацыя з навучальнымі ўстановамі ў Пінскім пав. у гэты час сведчыць пра тое, што эпоха Асветніцтва сюды яшчэ не дабралася. У 1863 г. на ўвесь Пінскі пав. прыходзілася 10 народных вучылішчаў Міністэрства народнай асветы (МНА) (290 вуч.), 79 вучылішчаў пры цэрквах (733 вуч.) і 5 вучылішчаў Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў (329 вуч.). Такім чынам, у Пінскім пав. у 1863 г. у афіцыйных школах атрымлівалі пачатковую адукацыю ўсяго толькі 1 352 вуч. (у т. л. 128 дзяўчынак), з якімі працавалі 94 настаўнікі[290]. Для Расійскай імперыі гэта была звычайная сітуацыя.

Народнае вучылішча Міністэрства народнай асветы было адчынена ў Парэччы ў 1868 г.[291] Магчыма, Пётр Гякоўскі быў яго першым настаўнікам. *Памятные книжки Минской губернии* ўтрымліваюць імёны парэцкіх настаўнікаў, якія адыгралі вялікую ролю ў наступовай сацыялізацыі жыхароў палескай вёскі. Так, у 1886–1889 гг. у Парэччы выкладаў Павел Крычэўскі[292], а на пачатку XX ст. – Пётр Гоцка[293]. Паводле запісу спаведнай кнігі, у 1881 г. у Парэччы настаўнічала Соф'я Амоліч, якая мела ўсяго 21 год.

Гаспадарчая дзейнасць гаспадароў маёнтка спалучалася з грамадскай актыўнасцю. Дарыуш Шпопер лічыць, што ўжо ў 1880 г. фактычна аднавілася дзейнасць Таварыства дабрачыннасці, якая, аднак, не была публічнай і не афішавалася[294]. Ёсць усе падставы меркаваць, што Аляксандр Скірмунт меў непасрэднае дачыненне да яго дзейнасці. У некралозе на старонках «Кур'ера Літоўскага» (1909, № 161) сцвярджалася, што менавіта ён разам з Марыяй Скірмунтовай з Твардоўскіх заснаваў

---

289 НГАБ. Ф. 242, воп. 1, спр. 119, арк. 95–96.

290 Тамсама. Ф. 21, воп. 1, спр. 12, арк. 8.

291 Тамсама. Ф. 458, воп. 1, спр. 78, арк. 11 адв.

292 *Памятная книжка Минской губ. на 1886 г.* Минск 1885, с. 189; *Памятная книжка Минской губ. на 1889 г.* Минск 1888, с. 156.

293 *Памятная кніжка Мінской губ. і календарь на 1910 г.* Мінск 1909, с. 171.

294 D. Szpoper, *Gente Lithuana, natione Lithuana...*, s. 72.

у Пінску Таварыства дабрачыннасці ў перыяд урадавага «ціску і грамадскай апатыі». Варта адзначыць, што ў 1902 г., калі Пінскае рымска-каталіцкае дабрачыннае таварыства афіцыйна абвясціла пра пачатак сваёй дзейнасці, А. Скірмунт стаў адным з шасці яго ганаровых сяброў.

З 1873 г. А. Скірмунт быў «действительным членом» Менскага губернскага статыстычнага камітэта. Вядома, што гэтая дзейнасць працягвалася да самай смерці ў 1909 г.[295] У прыватнасці, ягонае імя як сябра Камітэту згадвалася ў Памятных кніжках Менскай губ. на 1885, 1886, 1889 і 1910 гг.

У 1878 г. Аляксандр Скірмунт пагадзіўся ўвайсці ў склад Менскага таварыства сельскай гаспадаркі. Яно было створана два гады таму і першапачаткова прызначалася выключна для чыноўнікаў і памешчыкаў «рускага паходжання». Аднак вынікам гэтага абмежавання стала амаль поўная бяздзейнасць Таварыства. Дзеля яго ажыўлення пасля шматлікіх узгадненняў, у якіх актыўную ролю адыграў уладальнік маёнтка Савічы Слуцкага пав. Эдвард Вайніловіч, арганізацыя папоўнілася некалькімі мясцовымі польскімі землеўласнікамі. Сярод іх быў Аляксандр Скірмунт[296].

Актыўнасць новых сяброў цалкам змяніла сітуацыю ў Таварыстве. Ужо праз некалькі гадоў пад фактычным кіраўніцтвам Э. Вайніловіча яно стала важным чыннікам эканамічнага жыцця ўсяго Беларуска-Літоўскага краю, а ў грамадскім плане значна ўмацавала пазіцыі мясцовых польскіх землеўласнікаў.

У тым самым 1878 г. у Парэччы па ініцыятыве Аляксандра Скірмунта ўзнікла першая ў Менскай губ. крэдытна-ашчадная суполка, якая па вызначэнні аўтараў тэксту *Слоўніка геаграфічнага земляў Каралеўства Польскага...* (адным з іх быў Аляксандр Ельскі), «перакрыла дарогу ліхвярству і паяднала сялян з інтэлігенцыяй»[297]. 1 студзеня 1879 г. суполка налічвала ўжо 460 сяброў, а яе фінансавы абарот за мінулы год склаў болей 43 тыс. руб. Праз два гады колькасць сяброў суполкі вырасла да 591, а гадавы абарот – да 63,5 тыс. руб. Суполка развівалася, і напрыканцы 1880-х гг. дзейнічала ў трох валасцях Пінскага пав. і памежных з імі валасцях Кобрынскага пав. Скірмунты з Моладава таксама далучыліся да гэтай ініцыятывы. Пазней паводле яе ўзору была створана суполка ў Клецку.

У 1881 г. Аляксандр Аляксандравіч Скірмунт быў запрошаны менскім губернатарам Аляксандрам Пятровым для ўдзелу ў нарадах адмысловай камісіі па зменах заканадаўства, якое датычыла габрэяў. У выніку ён стаў адным з трох прадстаўнікоў польскіх землеўласнікаў Менскай губ., якія ўвайшлі ў склад

---

[295] *Памятная книжка Минской губ. на 1874 г.* Ч. 1. Минск 1873, с. 11; *Памятная книжка Минской губ. на 1886 г.*, с. 29; *Памятная книжка Минской губ. на 1885 г.* Минск 1884, с. 31; *Памятная книжка Минской губ. на 1889 г.*, с. 68.

[296] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza*, s. 40.

[297] *Słownik geograficzny Krolewstwa Polskiego i innych panstw słowianskich.* Tom VIII. Warszawa 1887, s. 835.

Рэдакцыйнай камісіі. Іншы сябра гэтай Камісіі Эдвард Вайніловіч ва ўспамінах назваў А. Скірмунта «светачам нашай правінцыі, чалавекам вопытным у рашэнні грамадскіх пытанняў, смелым і дзёрзкім» і прызнаў, што той быў для яго ўзорам грамадзяніна[298]. Можна меркаваць, што ацэнку Вайніловіча ў той час падзяляла значная частка зямян Меншчыны.

Дзякуючы А. Скірмунту, у 1901 г. Менскае таварыства сельскай гаспадаркі стварыла ў Пінску ўласны філіял – Аддзяленне па распрацоўцы сельскагаспадарчых і эканамічных пытанняў Менскага Палесся. Актыўным сябрам Аддзялення быў сын А. Скірмунта Раман.

У 1870–80-я гг. губернскі сакратар Аляксандр Скірмунт штогод прызначаўся на пасаду ганаровага міравога суддзі ў Пінскім пав. і адначасна быў сябрам *По крестьянским делам присутствия*[299]. Паводле Якуба Гейштара, у 1887 г. ён упершыню не быў зацверджаны на гэтую пасаду па прычыне «неблагонадежности»[300]. Памятная кніжка Менскай губ. на 1889 г. сапраўды не згадвала Скірмунта на гэтай пасадзе. Затое ён фігураваў як сябра *Податного присутствия* Пінскага пав.[301]

У сакавіку 1889 г., калі маршалак шляхты Пінскага пав. прасіў яго даслаць адпаведныя дакументы дзеля ўнясення ў спіс кандыдатаў на пасаду ганаровага міравога суддзі, ён пісьмова заявіў, што не жадае быць уключаным у гэты спіс[302]. Праўда, пазней ён пагадзіўся вярнуцца на пасаду, і незадоўга да смерці зноў яе заняў[303].

Паводле Якуба Гейштара, ён быў адным з заснавальнікаў і першым кіраўніком Палескага таварыства ўзаемнага крэдыту (1902). Трэба дадаць, што А. Скірмунт уваходзіў у кіраўніцтва гэтага Таварыства амаль да канца жыцця. Былы паўстанец бачыў у ім тыповага прадстаўніка «арганічнай працы» і пазітывіста ў шляхетным разуменні. Ён сцвярджаў, што А. Скірмунт да самай смерці асабіста кіраваў гаспадаркай, не меў палітычных амбіцый і лічыў абавязкам землеўласніка працу на зямлі сваіх продкаў[304].

1902–1903 гг. ён актыўна ўдзельнічаў у нарадах Менскага губернскага і Пінскага павятовага камітэтаў аб патрэбах сельска-гаспадарчай прамысловасці. Менскі камітэт зацвердзіў ягоны рэферат, прысвечаны праблеме сялянскага землеўладання, ліквідацыі цераспалосіцы і сервітутаў. Дарэчы, напрыканцы рэферату

---

[298] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza*, s. 47.

[299] *Памятная книжка Минской губ. на 1886 г.*, с. 179, 186; НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 6515, арк. 135 адв.

[300] J. Gieysztor, *Pamiętniki z lat 1850–1865*. Tom I, s. 402.

[301] *Памятная книжка Минской губ. на 1889 г.*, с. 156.

[302] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 4563, арк. 29.

[303] *Памятная книжка Минской губ. и календарь на 1910 г.* Минск 1909, с. 162.

[304] J. Gieysztor, *Pamiętniki z lat 1850–1865*. Tom I, s. 402.

А. Скірмунт заявіў пра неабходнасць поўнага ўраўнання сялян у правах з іншымі саслоўямі[305].

У 1904 г. як прадстаўнік «дворянства» Пінскага пав. (разам з Геранімам Кяневічам) стаў сябрам Менскай губернскай нарады па пераглядзе заканадаўства пра сялян. Гэтыя губернскія нарады ствараліся па загадзе міністра ўнутраных спраў Плеве з нагоды ўвядзення Палажэння пра земскіх начальнікаў[306].

Аляксандр Аляксандравіч Скірмунт памёр 26 чэрвеня 1909 г. у Парэччы. Напярэдадні пахавання парэцкія сяляне па ўласнай ініцыятыве ўпрыгожылі вёску кветкамі і зелянінай. Труну сяляне неслі на руках больш 8 км на родавыя могілкі Скірмунтаў у Моладава. З развітальнымі прамовамі выступілі старшыня Менскага таварыства сельскай гаспадаркі Эдвард Вайніловіч, прадстаўнік павятовай шляхты Ян Орда і прадстаўнік рабочых і служачых прадпрыемстваў Парэчча Ф. Енджэеўскі.

На рэштках помніка, зруйнаванага ўвосень 1939 г., застаўся надпіс: *Mąz wielkich zasług, wspołpracownik reformy włosciańskiej (Чалавек вялікіх заслуг, супрацоўнік сялянскай рэформы)*. Цікава, што аўтары гэтага надпісу адзначылі менавіта ягоную грамадскую дзейнасць, звязаную з адменай прыгоннага рабства... Падобна, што і для ягоных нашчадкаў менавіта гэта, а не прадпрымальніцкая і гаспадарчая дзейнасць было пэўным прыярытэтам.

Моладава і Парэчча быццам сімвалізуюць два шляхі, па якіх пайшла шляхта былога Вялікага Княства Літоўскага ў XIX ст. Уладальнікі Парэчча сталі на шлях прамысловага рэфармавання маёнтка, што цалкам змяніла іх жыццёвы ўклад і ментальнасць. Сацыяльная палітыка парэцкіх Скірмунтаў ламала саслоўныя перагародкі і адкрывала шлях у новае грамадства, у якім краёвая ідэя мела шансы на рэалізацыю. Атмасфера Парэчча моцна паспрыяла фармаванню асобы Рамана Скірмунта як краёўца і палітыка. Ужо ў сваіх першых публікацыях (1904) ён сцвярджаў, што XIX ст. стала стагоддзем дэмакратызацыі грамадства, што гістарычная роля шляхты засталася ў мінулым, што ўжо люд «надае фарбы краёваму сцягу»[307]. А вось у Моладаве ў большай ступені спрабавалі захаваць старасвецкі лад жыцця і традыцыйныя адносіны паміж вёскай і маёнткам.

Аднак дзейнасць Скірмунтаў-рэфарматараў, як у гаспадарчай, так і ў сацыяльнай сферы, не стала ўзорам не толькі для большасці шляхты Беларуска-Літоўскага краю, але нават для сваякоў. Прыклад «Ліверпуля на Ясельдзе» нават у кантэксце гісторыі аднаго шляхецкага роду сведчыць хутчэй пра няўдачу працэсу трансфармацыі шляхецкага саслоўя. Гісторыя роду Скірмунтаў пацвярджае моц шляхецкіх традыцый і стэрэатыпаў, арыентацыю значнай часткі шляхты на

---

[305] *Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности.* XXI. Минская губерния. Санкт-Петербург 1903, с. 328.

[306] НГАБ. Ф. 68, воп. 1, спр. 1, арк. 52.

[307] Ro...munt [R. Skirmunt], *Głos przeszłosci i potrzeba chwili.* Lwow 1904, s. 29.

каштоўнасці, звязаныя з эпохай Рэчы Паспалітай. Відавочна, што не адбылося грунтоўных змен у той карціне свету, якая вызначала падыходы большасці шляхты да сацыяльна-эканамічных і палітычных перамен XIX ст. Адпаведна краёвая ідэя не магла мець шырокай сацыяльнай базы нават сярод «тутэйшай» эліты, якая ніколі не забывала пра мясцовыя карані ўласных радаводаў.

Раман Аляксандравіч Скірмунт: палескі фармат

Раман Скірмунт нарадзіўся 25 красавіка 1868 г. у Парэччы. Ён быў сёмым нашчадкам у сям'і Аляксандра Скірмунта і Тэафілы з Любаньскіх. Нагадаю, што яшчэ ў Альбрэхтове нарадзіліся Тэафіла (1857) і Аляксандр (1858), а ў Парэччы – Браніслава (1864), Юзаф (1862), Ванда (1866) і Вацлаў (1867). Сям'я была вялікая. Пры жыцці Рамана нарадзіліся Алена (1869), Феліцыя (1873) і Зянон (1874), але трагічна загінуў Вацлаў (1872). 30 красавіка Раман Скірмунт быў ахрышчаны ў Пінскім парафіяльным касцёле ксяндзом Вікенціем Свідэрскім.

ДАКУМЕНТ

Выпіска з метрычнай кнігі Пінскага парафіяльнага касцёла. 1876 г.[308]

Выпись метрики о рождении и крещении дворянина двуименного Романа-Марьяна Александрова Скирмунта, из подлинной Пинского римско-католического приходского костела книги страницы 30, ст. 62 требующей стороне выдана. Тысяча восемьсот шестьдесят восьмого года апреля тридцатого дня, в Пинском римско-католическом приходском костеле окрещен младенец по имени Роман-Марьян, преподобным отцем белого духовенства Викентием Свидерским с совершением всех обрядов таинства. Дворян помещиков Александра и Теофилы из Любанских Скирмунтов, законных супругов сын, родившийся сего ж года и месяца 25 числа в имении Поржече Пинского прихода. Восприемниками были помещик Казимир Твардовский с Мариею Скирмунтовою.

Что сия метрическая выпись о рождении и крещении дворянина двуименного Романа-Марьяна Скирмунта с подлинною Пинского римско-католического приходского костела книгою верна, имеет законную достоверность и не подлежит никакому сомнению, в чем я, ручаясь надлежащим подписом с приложением костельной печати, удостоверяю.

Октябрь 4 дня 1876 года. Гор. Пинск. № 469

/подлинную подписали:

Настоятель Пинского римско-католического приходского костёла /М.П./

По Указу Его Императорского Величества Виленская римско-католическая духовная консистория, сходно резолюции своей 9 октября 1876 г. состоявшейся,

---

[308] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2969, арк. 77 адв.

утверждая метрическую выпись о рождении и крещении Романа-Марьяна, сына дворянина Александра Скирмунта, свидетельствует надлежащею подписью и приложением казенной печати.

Октября 21 дня 1876 года. № 9068
/подлинную подписали:
Ассесор Пр. Каноник А. Вашкевич
Секретарь Поразинский
За столоначальника Горский.

Хроснымі бацькамі сталі ўладальнік маёнтка Велясніца Казімір Твардоўскі і ягоная сястра Марыя, жонка Генрыка Скірмунта з Моладава.

Палессе на той час было радзімай трох пакаленняў роду Твардоўскіх, найбольш вядомым з якіх быў рэктар Віленскага ўніверсітэта Юзаф Твардоўскі (1786–1840). Пасля адстаўкі (1824), звязанай са справай філаматаў і філарэтаў, ён перабраўся ў маёнтак і паспяхова заняўся гаспадарчай дзейнасцю. Брат Марыі Эдвард за ўдзел у паўстанні быў высланы ў Табольск, дзе і памёр. Твардоўскія ўспрымаліся як цалкам мясцовы («гнездавы») род, што было важным для іх прэстыжу. Напрыклад, Вайніловіч нават у тэстаменце з гонарам адзначаў, што Вайніловічы не прыходзілі ні з Усходу, ні з Захаду, што яны карэнныя, «кроў ад крыві і косць з косці мясцовага люду», што жывуць і працуюць на «роднай беларускай зямлі»[309].

Дзяцінства Рамана Скірмунта праходзіла ў тым самым «палацыку», які ў 1876 г. прыемна ўразіў Ігнацыя Аніхімоўскага. Ён рос у шляхецкім асяродку, дзе дамінавала якраз «гнездавая шляхта». Побач кіпела фабрычная мітусня, а трохі далей сваё больш размеранае жыццё вяла палеская вёска.

Матэрыялы пра першыя гады ягонага жыцця адсутнічаюць. У апублікаваных тэкстах Рамана Скірмунта няма згадак пра дзяцінства. Толькі ў артыкуле «Пані з Муру» (1934), які быў развітаннем з памерлай сястрой Канстанцыяй, ён задаўся пытаннем пра вытокі фармавання нацыянальнай свядомасці. Паводле Скірмунта, усё пачынаецца з выхавання, апрача таго, «паходжанне і традыцыя ствараюць моцны падмурак, а асяродак, у якім жывем, мацуе яго або нішчыць»[310].

Гэтыя думкі падказваюць далейшы накірунак разважанняў. З дапамогай гістарычнай літаратуры і ўспамінаў можна паспрабаваць уявіць штодзённасць жыцця заможнага шляхецкага маёнтка, у якім падрасталі дзеці.

Польскі даследчык Міраслаў Устжыцкі, даследуючы штодзённасць шляхты і зямян заходніх губерняў Расійскай імперыі ў апошняе паўстагоддзе яе існавання, звярнуў увагу на вялікую ролю сям'і і блізкіх сваякоў у жыцці шляхціча. Менавіта яны ўтваралі натуральны асяродак і вызначалі ягоны ўнутраны свет на ўзроўнях

---

[309] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza*, s. VIII.

[310] R. Skirmuntt, *Panie z Muru*, «Słowo». 1934, Nr 130.

ад штодзённасці да ідэалогіі[311]. Прычым на першым месцы была сям'я, якая звычайна складалася з некалькіх пакаленняў, а таксама ў выпадку неабходнасці станавілася прытулкам для блізкіх сваякоў і асоб, што калісьці аказалі ёй важныя паслугі.

У выпадку Скірмунтаў месцам такога прытулку было хутчэй Моладава з ягонай доўгай гісторыяй і пэўнай традыцыяй. Парэчча стала месцам жыхарства сям'і Аляксандра Скірмунта (малодшага) толькі ў 1860 г. Але яго сям'я хутка расла, што, між іншым, патрабавала прысутнасці ў маёнтку шматлікіх гувернантак і хатніх настаўнікаў. Звычайна ў ролі гувернантак выступалі француженкі, але з улікам таго, што хлопчыкі гэтай лініі роду Скірмунтаў часта атрымлівалі сярэднюю адукацыі ў гімназіях Мітавы або Рыгі, гувернанткамі ў Парэччы і Моладаве маглі быць таксама немкі.

У пераважнай большасці шляхецкіх сем'яў дамінавалі мужчыны. У 1930 г. Раман Скірмунт у каментарах да выдання ўспамінаў Э. Вайніловіча адзначыў: «У Савічах, як і ў большасці крэсовых дамоў, якія клапаціліся пра традыцыю, добрыя звычаі і выхаванне дзяцей, найвялікшым аўтарытэтам быў бацька. Яго слухаліся слепа і ахвотна, а для мамы заставалася шчырая дзіцячая прыхільнасць»[312]. Магчыма, пішучы гэтыя словы, ён прыгадваў і ўласнае дзяцінства.

Паводле М. Устжыцкага, асобасная мадэль «добрага гаспадара» абавязкова ўключала ягоны клопат пра блізкіх, працу ў маёнтку дзеля падвышэння эфектыўнасці гаспадаркі і росту сямейнага дабрабыта, гасціннасць і таварыскасць[313]. Да гэтага трэба дадаць яшчэ і ўласцівую для многіх зямян актыўную грамадскую дзейнасць. Напрыклад, Эдвард Вайніловіч ва ўспамінах наступным чынам характарызаваў уласнага бацьку: «Пасля заканчэння вучобы ў Вільні адразу быў уцягнуты ў грамадскую дзейнасць. Цяжкая праца на зямлі ва ўласнай гаспадарцы [...] жыццё не па сродках і выдаткі, звязаныя з кіраваннем маёнткам бацькоў, патрабавалі вялікіх намаганняў. Добрасумленным выкананнем абавязкаў і пачуццём гонару, якія спалучаліся з эрудыцыяй і выхаваннем, што дала Віленская альма-матэр, Адам спаткаў агульнае прызнанне і павагу грамадскасці»[314].

Узорам такога гаспадара з'яўляўся Марк Чэртван з рамана Марыі Радзевічуўны «Дэвайціс» (1889). Кніга Радзевічуўны – гэта свайго роду гімн патрыярхальным парадкам і супрацы маёнтка і вёскі. Яна распавядае пра цяжкую працу, гонар, патрыятызм і цярплівасць, якія дапамагаюць выстаяць і захаваць традыцыі. У якасці іх сімвала фігураваў стары дуб-волат («Дэвайціс»), якога галоўны герой

---

311 M. Ustrzycki, *Ziemianie polscy na Kresach. 1864–1914. Swiat wartosci i postaw.* Krakow 2006, s. 111.

312 R. Skirmuntt, *Edward Woyniłłowicz. Wspomnienia 1847–1928 r. Wyd. 1931 r.*, «Słowo». 1932, Nr 1.

313 M. Ustrzycki, *Ziemianie polscy na Kresach. 1864–1914...*, s. 114.

314 E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza*, s. 9.

твора спрабаваў абараніць ад сякеры. Як ужо адзначалася, Марыя Радзевічуўна была сваячкай Скірмунтаў, і цалкам магчыма, што сапраўды нехта з мужчын гэтага роду стаў прататыпам Марка Чэртвана. Прынамсі пра гэта сведчыць цэнтральны для аповесці вобраз дуба, выява якога была важным элементам герба роду Скірмунтаў, а таксама тое, што асноўныя падзеі разгортваюцца на Жмудзі, адкуль і паходзіў гэты род.

Безумоўна, Аляксандр Скірмунт адыграў значную ролю ў станаўленні асобы сына Рамана. Бацька сапраўды быў узорам працавітасці, цярплівасці, самастойнасці мыслення, краёвага патрыятызму і смеласці ў пракладванні новых шляхоў як у гаспадарчай дзейнасці, так і ў грамадскай.

Пра ролю бацькі ў станаўленні асобы нашага героя таксама можна меркаваць на падставе тэксту Рамана Скірмунта «Жыццё, смерць і пахаванне с. п. Аляксандра Скірмунта», апублікаванага на старонках варшаўскай газеты «Слова». Тэкст не быў падпісаны, але аўтарства Р. Скірмунта было ўстаноўлена дзякуючы ягонаму лісту да Ч. Янкоўскага, які ў 1909 г. фактычна кіраваў рэдакцыяй газеты. Пачатак тэксту ўяўляў сабой некралог, а ягоны працяг утрымліваў апісанне пахавання з развітальнай прамовай Вайніловіча. Найбольшую цікавасць уяўляе першая частка.

Варта прывесці фрагмент гэтага некралога, які пачынаўся адразу пасля кароткіх біяграфічных звестак пра нараджэнне, вучобу ў Пецярбургскім універсітэце і вяртанне ў Парэчча па просьбе бацькі Аляксандра Сымонавіча Скірмунта.

ДАКУМЕНТ

Жыццё, смерць і пахаванне с. п. Аляксандра Скірмунта (1909). Фрагмент[315]

[...] У 1858 г. Аляксандр Скірмунт выступае на шырокую **грамадскую** *арэну як прадстаўнік Пінскага пав. на нарадах па вызваленні сялян. Потым як прадстаўніка Менскай губ. мы яго бачым ужо ў сталіцы над Нявою. Актыўны ўдзел у працы па падрыхтоўцы сялянскай рэформы цалкам займае ягоны час з 1858 па 1861 г. Урэшце ён удзельнічае ў працы агульнай Рэдакцыйнай камісіі. С. п. Аляксандр Скірмунт быў гарачым прыхільнікам вызвалення сялян. У гэтай справе ён упарта бараніў прынцыпы сапраўднага прагрэсу.*

Пасля 1861 г. бацька цалкам перадаў яму кіраванне абшырнымі зямельнымі уладаннямі ў краі, а таксама цукроўняй і суконнай фабрыкай. Характэрнае для яго ад нараджэння імкненне да парадку прымусіла адразу ж заняцца ўрэгуляваннем праблемы сервітутаў і ліквідацыяй церазпалосіцы на сваіх землях. Маёнтак Парэчча ён зрабіў узорным.

С. п. Аляксандр Скірмунт быў прынцыповым праціўнікам руху 1863 г. Балюча перажываў гэтыя падзеі, але выканаў свой абавязак адносна ўласнага народу, калі

[315] B. p. [Skirmunt R.]. *Zywot, zgon i pogrzeb s. p. Aleksandra Skirmunta*, «Słowo». 1909, Nr 165.

ўзнікла патрэба. Двойчы асабіста перавозіў Траўгута праз пушчы. Шчаслівы лёс і прыродная асцярожнасць дапамаглі пазбегнуць згубы ў тым жахлівым пажары, хоць ён і быў прызначаны «Нацыянальным урадам» начальнікам павета.

Руплівая праца над умацаваннем матэрыяльнага быту пасля ўсіх хваляванняў напоўняла ягонае жыццё да 1875 г. У тым жа годзе ён быў прызначаны ганаровым суддзёй Пінскага пав., але ў 1887 г. быў адпраўлены ў адстаўку як «неблагонадёжный». Праз 6 гадоў зноў быў прызначаны на гэтую пасаду. Ён карыстаўся вялікай пашанай як суддзя, бо ягоныя рашэнні адрозніваліся развазнасцю і празрыстасцю, і займаў гэтую пасаду амаль да самай смерці.

Да апошніх хвілін жыцця с. п. Аляксандр заставаўся руплівым грамадскім дзеячам. Ён быў адным са стваральнікаў і першым кіраўніком Палескага аддзелу Менскага таварыства сельскай гаспадаркі, Пінскага таварыства дабрачыннасці і Палескага таварыства ўзаемнага крэдыту. У красавіку 1908 г. падчас агульнага схода Палескага таварыства ўзаемнага крэдыту ён перажыў прыступ глаўкомы (кровазліццё ў вока). Гэта быў злавесны знак блізкага канца. З пасады кіраўніка ён сышоў толькі за два месяцы да смерці, адчуваючы, што выкананне гэтых абавязкаў стала для яго занадта цяжкім, і не жадаючы заставацца фармальным кіраўніком.

Ён займаўся і кіраваў уласнай гаспадаркай да дня смерці. Яшчэ напярэдадні гэтага фатальнага дня ён па шматгадовай звычцы аб'язджаў свае палеткі на аднаконным вазку. Беззаганная справядлівасць, памяркоўнасць, лагоднасць у ацэнках падзей і людзей, яснасць розума былі выдатнымі рысамі ягонай чыстай душы. Да апошніх дзён жыцця да яго звярталіся па парады і чакалі прысуду. Здаралася, што нават габрэі прасілі яго дапамогі ў сваіх унутраных спрэчках.

З замілаваннем займаўся ўласнай гаспадаркай. Ніякія ўдары лёсу і няўдачы не маглі расчараваць ці аслабіць ягонай прагі да працы. Калі ў 1879 г. згарэла цукроўня, якая не была застрахаваная, пасля скрупулёзнай калькуляцыі ён прыйшоў да высновы, што ў мясцовых умовах больш адпаведным будзе заснаванне вінакурнага завода. У тым жа годзе завод быў збудаваны і пачаў даваць прадукцыю. У 1876–1877 гг. ён правёў дрэнаж сваіх земляў на вельмі значных плошчах. Пры гэтым яго праца не была паспешлівай і імпульсіўнай. Настойлівасць і паслядоўнасць, сіла духу нават пасля самых цяжкіх няўдач – былі выдатнай рысай ягонага характару.

Ён быў грунтоўна падрыхтаваны да грамадскай дзейнасці, але палітычных амбіцый амаль не меў. Да 1905 г. лічыў галоўным абавязкам працу на сваім загоне дзеля ўздыму матэрыяльнага дабрабыту ўласнага грамадства. Не верыў у магчымасць шырокай палітычнай акцыі. Меў моцнае польскае нацыянальнае пачуццё, але без варожасці да расійцаў.

У адносінах з прадстаўнікамі ўладаў вызначаўся прастатой і праўдзівасцю, часта з дадаткам горычы. Калі ў 1888 г. пасля адстаўкі з пасады суддзі, якую ён любіў, у коле высокіх чыноўнікаў хтосьці выказаўся, што не ўсе палякі заслугоўваюць

звальнення з дзяржаўных устаноў, і што сярод іх ёсць тыя, хто заслугоўвае даверу, с. п. Аляксандр Скірмунт заўважыў: «Толькі ў сучасных умовах невядома, чым трэба ганарыцца, ці заслугоўваць гэты давер, ці яго страціць...» У той жа групе чыноўнікаў, калі пачалі выказваць кампліменты адной высокапастаўленай асобе, с. п. Аляксандр Скірмунт не пабаяўся прыгадаць продаж дзяржаўных лясоў, якая ставіла пад сумнеў беззаганнасць гэтай асобы.

Аднаму з прадстаўнікоў улады, які ў яго прысутнасці паўтарыў хлусню, што нібыта рух 1863 г. узнік з прычыны вызвалення сялян, жорстка адказаў: «Спадар гэта можа казаць каму заўгодна, але не мне, бо асабіста выслухаў ад Яго Вялікасці (Аляксандра II) словы падзякі за ўдзел нашых землеўласнікаў у вызваленні сялян». Прадстаўнікам улады ахвотна нагадваў памятныя і важныя словы імператара Аляксандра II, якія той сказаў на сходзе дваранства пасля правядзення сялянскай рэформы, і якія ўтрымлівалі падзяку прадстаўнікам нашых губерняў «за прыклад, які далі ўсёй Расіі». Нягледзячы на гэтую жорсткую праўдзівасць, у колах расійскай адміністрацыі памерламу выказвалі належную павагу і нават прыхільнасць [...]

У ацэнцы жыцця і дзейнасці бацькі сын выразна вылучыў ягоную грамадскую дзейнасць. У першую чаргу, гэта ўдзел у правядзенні сялянскай рэформы і выкананне свайго «абавязку» падчас паўстання 1863 г. Нават праца над «паляпшэннем матэрыяльнага дабрабыту» ў трактоўцы сына мела значэнне, якое выходзіла далёка за межы вузкіх сямейных інтарэсаў. «Праца на сваім загоне», якую Аляксандр Скірмунт лічыў галоўным абавязкам шляхціча, мела сваёй мэтаю ў першую чаргу ўмацаванне пазіцый «уласнага» грамадства. Над апошнім разумелася мясцовая польская супольнасць. На пачатку тэксту Аляксандр Скірмунт быў ахарактарызаваны як «адзін з найбольш выбітных прадстаўнікоў польскіх землеўласнікаў у Беларусі», а напрыканцы сын падкрэсліў ягонае моцнае «польскае нацыянальнае пачуццё». Магчыма, гэты выраз павінен быў узмацніць тэзіс наконт адсутнасці ў А. Скірмунта выразнай варожасці да рускіх. Варта адзначыць, што ў далейшым сын Раман пашырыць тэрыторыю «свайго загона» да межаў усяго Краю і надасць гэтай працы іншы ідэалагічны падмурак...

На жаль, немагчыма нешта канкрэтнае сказаць пра ролю маці ў выхаванні дзяцей, якая, безумоўна, была значнай. Прынамсі, так было ў большасці шляхецкіх сем'яў. Напрыклад, Міхал Ромэр у сваёй аўтабіяграфіі адзначаў, што выхаваннем дзяцей займалася выключна маці і служба. Бацька не звяртаў на іх вялікай увагі[316].

Постаць Тэафілы Скірмунт (з Любаньскіх) адсутнічае ва ўспамінах Канстанціна Скірмунта або яго сястры Ядвігі з Моладава. Амаль нічога не распаўяла пра яе і Вацлава Нээф. Маці таксама незаўважальная ў тых архіўных дакументах, якія з большага датычаць гаспадарчых спраў або грамадскай дзейнасці ўладальнікаў

[316] Z. Solak, *Między Polska a Litwą. Zycie i działalnosc Michała Romera. 1880–1920*, s. 23.

Парэчча. Падобна, што жыццё маці не выходзіла па-за кола звычайных жаночых клопатаў, у цэнтры якога знаходзілася выхаванне дзяцей і здароўе сям'і.

Таксама можна меркаваць, што ў адрозненне ад большасці гаспадынь шляхецкіх маёнткаў маці не выхоўвала сваіх дзяцей ў духу кансерватызму і каталіцкасці. Дзеці выраставалі адкрытымі на выклікі эпохі і не абмяжоўвалі духоўнае жыццё сценамі касцёла. Вядома, што той жа Раман Скірмунт ужо ў міжваенны час катэгарычна асуджаў рэлігійную канверсію, абумоўленую пошукамі пэўных матэрыяльных выгод.

Сумеснае жыццё Аляксандра і Тэафілы не было ідылічным. Рамантычная гісторыя кахання, якая магла мець месца ў пачатку гісторыі сям'і, верагодна, скончылася пасля нараджэння дзяцей. В. Нээф у сваіх успамінах прыгадала, што бацькі Рамана Скірмунта жылі кожны сам па сабе. Тэафіла толькі зімавала ў Парэччы, а з надыходам вясны выбіралася ў Тэклінаполь, дзе жыла да позняй восені. Калі здарыўся гэты разлад, устанавіць складана. Магчыма, з ім было звязана з'яўленне даверанасці на кіраванне маёнткам на імя Аляксандра Скірмунта (III) у лістападзе 1882 г. Ці не ён спрычыніўся да таго, што большасць дзяцей Аляксандра і Тэафілы не ўзялі шлюбу і не мелі ўласных сем'яў?

У Скірмунтаў, як і ў кожнай іншай шляхецкай сям'і, дзеці павінны былі добра ведаць гісторыю ўласнага роду. Звычайна гэтаму спрыялі аповеды бацькоў і дзядоў, радаводы, партрэты продкаў і сама шляхецкая сядзіба. У большай ступені гэтую сувязь сучаснага і мінулага перадавала атмасфера Моладава, з ягоным прыгожым палацам, старой мэбляй, карціннай галерэяй, бібліятэкай, што захоўвалі памяць пра ягоных ранейшых жыхароў. Гісторыя роду тут была элементам штодзённасці.

У Парэцкай сядзібе, гаспадары якой жылі ў перабудаваным фабрычным гмаху, падобная атмасфера даўніны і традыцыі ў дзіцячыя гады Рамана Скірмунта напэўна адсутнічала. Традыцыя тут толькі ствараласа. Так, Аляксандр Ельскі на старонках *Слоўніка геаграфічнага земляў Каралеўства Польскага...* паведамляў (1887) пра бібліятэку[317], архіў, навуковыя зборы, а таксама памятныя рэчы роду Скірмунтаў у Парэччы[318].

Найбольш поўнае апісанне архітэктурнага аблічча дома і яго інтэр'ераў зрабіў аўтар гісторыі рэзідэнцый на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай Раман

---

[317] Экпедыцыі па вуснай гісторыі, а таксама кантакты з палескімі краязнаўцамі і гісторыкамі дазволілі адшукаць дзве кнігі з гэтай бібліятэкі, якія знаходзяцца ў прыватных асоб: М. Грушевский, *Киевская Русь. Том 1. Введение. Территория и население в эпоху образования государства* (Спб., 1911); F. Hosick, *Juliusz Słowacki. 1809–1849. Biografia psychologiczna*. Tom pierwszy (Krakow, 1907). На тытульным аркушы апошняга выдання захаваўся экслібрыс бібліятэкі Скірмунтаў у форме авала з стылізаванай выявай дуба з двума лістамі і трыма жалудамі і надпісам па краях авалу: PORZECZE NR... SKIRMUNT.

[318] *Słownik geograficzny Krolewstwa Polskiego i innych panstw słowiańskich*. Tom VIII. Warszawa 1887, s. 835.

Афтаназы[319]. Пры гэтым ён абапіраўся на ўласныя ўражанні ад наведвання маёнтка ў міжваенны час.

Сядзібны дом ўзвышаўся паблізу Ясельды. Нават пасля грунтоўнай рэканструкцыі і прыстасавання пад жыллё ён меў выгляд суровай глыбы, пазбаўленай пэўнага архітэктурнага стылю. Гэта быў мураваны трохпавярховы простакутны гмах з гладкім двухскатным дахам, які атрымаў бакавыя прыбудовы з зубчатым завяршэннем на даху. Фасад быў упрыгожаны ганкам з ляпным дэкорам у форме перавязанага стужкай вянка з каласоў і гербавага шчыта. Вокны паабапал уваходу мелі трохкутнае завяршэнне, а праёмы паміж вокнамі былі аздоблены гірляндамі ў выглядзе раслін. Манатоннасць фасада з боку Ясельды парушаў толькі балкон з чыгуннай балюстрадай, а адна з прыбудоў атрымала вялізную веранду, дах якой трымаўся на высокіх і тонкіх калонах.

Інтэр'ер сядзібнага дома з пункту гледзішча архітэктуры быў даволі сціплым. Сцены асобных салонаў і пакояў былі пафарбаваны. Толькі ў некаторых памяшканнях была паркетная падлога. Аднак усе рэпрэзентатыўныя пакоі (вялікі і малы салоны, сталовая, кабінет ды інш.) мелі стылёвы інтэр'ер канца XVIII ст. Часткова ён быў перавезены з Моладава.

У доме знаходзіліся сямейныя партрэты, мініяцюры, калекцыя абразоў, сярод якіх вылучаўся старажытны абраз з касцёла ў Любешове з выявай Маці Божай з Дзіцём у срэбнай шаце і каронах. Тут можна было ўбачыць медалі, якія атрымлівала прадукцыя парэцкіх фабрык і заводаў на міжнародных выставах, фарфоравыя вырабы галоўных еўрапейскіх мануфактур. Дарэчы, калі ўлетку 1919 г. падчас наступу Чырвонай арміі Скірмунты сталі бежанцамі, то Раман Скірмунт вывез у Варшаву і перадаў на дэпазітнае захоўванне мясцоваму прадстаўніцтву Таварыства аховы помнікаў сем пакункаў «старога фарфору і крышталя»[320]. Падобна, што гэтая калекцыя была вельмі каштоўнай.

Раман Афтаназы таксама паведаміў пра бібліятэку, дзе пераважала гістарычная літаратура, і частку сямейнага архіва. Галоўны герой гэтай кнігі моцна прычыніўся да папаўнення і бібліятэкі, і архіва.

З паўднёвага боку сядзібы адкрываўся вельмі «меланхалічны» (Р. Афтаназы) палескі пейзаж з Ясельдай і квітнеючымі лугамі. На першым плане гэтай маляўнічай перспектывы знаходзіўся востраў, на якім быў высаджаны сад. Прастору паміж домам і Ясельдай запаўнялі кветнікі. Вясной Ясельда шырока разлівалася, і з вокнаў сядзібы можна было назіраць «палескае мора» да самога далягляду.

Гэта былі першыя палескія пейзажы, якія мог назіраць маленькі Раман улетку 1868 г. Прырода Палесся на свой лад таксама фармавала характар і пэўныя

---

[319] R. Aftanazy, *Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej*. Wydanie 2. Tom 2. Wrocław 1992, s. 121; гл. таксама А. Федорук, *Старинные усадьбы Берестейщины*. 2-е изд. Минск 2006, с. 498.

[320] Archiwum Akt Nowych (далей: AAN). Sygn. 55/II. Towarzystwo Strazy Kresowej. J. 648, k. 2.

каштоўнасныя арыенціры будучага палітыка і грамадскага дзеяча. Цікава, што з усіх новаўвядзенняў у Парэччы пачатку XX ст. з Раманам Скірмунтам найчасцей звязваюць стварэнне вялізнага парку на беразе Ясельды.

Паводле вядомага даследчыка сядзібаў і паркаў Беларусі прафесара Анатоля Федарука, да рэзідэнцыі падыходзілі тры алеі. Ліпавая алея ішла з поўначы. Уздоўж яе стаялі каменныя будынкі інтэрнатаў для рабочых. З супрацьлеглага боку знаходзіўся пладовы сад. Алея з конскіх каштанаў ішла ад дому ва ўсходнім накірунку, перпендыкулярна ліпавай, уздоўж суконнай фабрыкі і даходзіла да дарогі, што вяла з Парэчча ў Моладава. Паралельна ёй і бліжэй да Ясельды знаходзілася трэцяя ясеневая алея, якая выводзіла на дарогу да фабрыкі[321].

Дом быў моцна пашкоджаны ў 1943 г., калі партызаны забілі Алену Скірмунт, апошнюю з сям'і Аляксандра і Тэафілы. Канчаткова ён быў разбураны ўжо пасля вайны, а пляц быў перададзены пад прыватныя забудовы. Сёння тут знаходзіцца частка вёскі Парэчча.

Вяртаючыся ў XIX ст., варта адзначыць, што стварэнне ў Парэччы ўласнай традыцыі магло мець таксама пазітыўны эфект, звязаны з адсутнасцю снабізму і імкненнем уладальнікаў зліквідаваць характэрную для эпохі сацыяльную і культурную ізаляцыю маёнтка і ягоных жыхароў ад навакольнага сялянскага асяродку. Аляксандр Аляксандравіч Скірмунт працягваў сацыяльную палітыку, якую распачаў ягоны бацька, будуючы дамы для работнікаў фабрыкі. Варта яшчэ раз прыгадаць актыўнасць гаспадара Парэчча як міравога пасярэдніка падчас ліквідацыі прыгоннага ладу, заснаванне ім Крэдытна-ашчаднай суполкі з удзелам сялян, адкрыццё фабрычнай школы ў Парэччы ды інш.

Аднак другая палова XIX ст. у гісторыі Беларусі таксама была часам паступовага абвастрэння стасункаў паміж вёскай і маёнткам. Вёска пасля рэформы 1861 г. перастала быць «панскай». Яна ператварылася ў суседа, які забяспечваў гаспадарку маёнтка працоўнай сілай, з зайздрасцю глядзеў на зямельныя і лясныя багацці зямяніна і быў перакананы, што лясы і лугі ёсць «дарам Божым». Апошняе абарочвалася незаконнымі вырубкамі і выпасамі, нараджала бясконцыя канфлікты паміж вёскай і маёнткам. Вацлаў Лядніцкі ва ўспамінах канстатаваў, што лёсам кожнага зямяніна былі непазбежныя канфлікты з суседнімі вёскамі. Шкоду сенажацям наносілі сялянскія коні і скаціна, частымі былі крадзяжы ў лесе і нават на палях, дзе знікалі снапы. Дарэчы, апошняе нават з гледзішча сялянскай этыкі было злачынствам[322].

Важным фактарам абвастрэння стасункаў быў нарастаючы «зямельны голад». Тут варта прыгадаць указ ад 12 снежня 1865 г., які забараняў «лицам польского происхождения» набываць зямлю ў «паўночна-заходніх губернях». Непасрэдным наступствам гэтага ўказу было тое, што мясцовыя землеўласнікі каталіцкага вера-

---

[321] А. Федарук, *Старинные усадьбы Берестейщины*, с. 498.

[322] W. Lednicki, *Pamiętniki*. Tom 1. Londyn 1963, s. 561.

вызнання амаль не прадавалі свае землі. Між тым, вёска, якая перажывала ў другой палове XIX ст. дэмаграфічны выбух, патрабавала ўсё больш зямлі. Перасяленні не маглі вырашыць праблемы, якая стаяла надзвычай востра ў пачатку XX ст.

Скірмунты ў Парэччы здолелі захаваць пэўны патрыманіяльны характар адносін з вёскай. Падобна, што гэтаму спрыяла як згаданая грамадская дзейнасць Аляксандра Скірмунта, так і прамысловасць маёнтка, якая стварала для сялян магчымасць дадатковых заробкаў. Відавочна, што ў адрозненне ад многіх суседзяў-землеўласнікаў і сваякоў (у т. л. з Моладава) парэцкія Скірмунты разумелі важнасць добрасуседскіх адносін з вёскай і дзеля гэтага гатовы былі пайсці на пэўныя матэрыяльныя ахвяры. Канфлікты здараліся, але ўладальнікі маёнтка звычайна імкнуліся мінімалізаваць іх наступствы. Падобна, што раней за іншых сям'я Аляксандра Скірмунта зразумела непазбежнасць пэўных дэмакратычных перамен. Так, Раман Скірмунт у адной са сваіх першых публікацый (1904) заявіў пра гістарычную паразу шляхты і прызнаў, што менавіта народ (люд) у выніку перамен XIX ст. ператварыўся ў вызначальны чыннік гістарычнага развіцця[323].

На каштоўнасныя арыенціры маленькіх жыхароў Парэчча таксама ўплывала пачуццё сувязі з «малой Айчынай». Так, у 1852 г. Алена Скірмунт, ад'язджаючы на лячэнне ў Вену, пісала сваёй сяброўцы Ядвізе Кяневіч: «Ніколі не знаходзіла ў нашым бедным неадукаваным народзе столькі скарбаў сумленнасці, столькі запасаў для вышэйшых і высокародных пачуццяў, столькі роднай залатой удзячнасці, колькі цяпер. Калі будзеш мне пісаць, абавязкова расказвай што-небудзь пра сялян, пра нашых любых палешукоў, аб Літве дарагой нашай, аб Вільні пальмавай ад пакутніцтва»[324]. Раман Скірмунт у адной са сваіх першых публікацый (1904) параўнаў шляхціча, які страціў уласную зямлю з чалавекам без ценю з вядомай казкі Ганса Крыстыяна Андэрсана[325].

Мечыслаў Ялавецкі ва ўспамінах прызнаваўся, што вызначальнай у яго-ным жыцці, таксама як і ў жыцці ягонага бацькі Баляслава, была сувязь з роднай зямлёй, з родавым «гняздом»: «Асабіста не ведаў свету па-за Сылгудышкамі і глядзеў на яго праз прызму двух парафій, а таксама пушчаў, азёраў, лугоў і гаёў Лаборнашчызны»[326].

Менавіта гэтую моцную сувязь з родным краем мела на ўвазе Канстанцыя Скірмунт, калі на пачатку XX ст. абараняла паняцце «тутэйшасці» ад насмешак польскіх нацыянальных дэмакратаў: «Тутэйшасць – гэта сувязь з роднай зямлёю, гэта патрыятызм»[327]. Паводле вядомай публіцысткі, «тутэйшасць» адлюстроўвала духоўную прывязанасць да зямлі, з яе тысячагадовай гісторыяй, магіламі продкаў,

---

323 Ro...munt [R. Skirmunt], *Nowe hasła w sprawie odrodzenia narodowosci litewskiej*, s. 9.

324 Б. Залескі, *З жыцця літвінкі. З лістоў і нататак. 1823–1874*, с. 51.

325 Ro...munt [R. Skirmunt], *Nowe hasła w sprawie odrodzenia narodowosci litewskiej*, s. 13.

326 M. Jałowiecki, *Na skraju imperium*. Warszawa 2000, s. 99.

327 «Kurier Litewski». 1906, Nr 214

і была доказам таго, што мясцовая шляхта з'яўляецца карэнным насельніцтвам Краю. «Тутэйшасць» таксама сведчыла пра сувязь з мясцовым насельніцтвам, якое было неад'емнай часткай «роднай зямлі».

Відавочная цікавасць парэцкіх Скірмунтаў да гісторыі Палесся як адметнага прыроднага і гісторыка-культурнага рэгіёну, да мовы і побыту палешукоў. Аляксандр Ільін, напрыклад, лічыць Аляксандра Аляксандравіча Скірмунта прадстаўніком «палеска-польскага пазітывізму»[328]. Згодна з ягоным меркаваннем, якое трымаецца на сведчаннях Ежы Асмалоўскага і высновах вядомага дыялектолага Фёдара Клімчука, Раман і Канстанцыя Скірмунты мелі непасрэднае дачыненне да выдання *Русінскага лементара* (1907), які быў першай спробай стварэння буквара на палескай гаворцы[329]. Тут варта дадаць, што сам Раман Скірмунт галоўным аўтарам *Лементара* назваў сяброўку Канстанцыі Скірмунт Юзэфу Кужанецкую[330].

Р. Скірмунт у публікацыях міжваеннага перыяду падкрэсліваў этнакультурную самабытнасць Палесся і ягоных жыхароў. На старонках выдання *Polesie ilustrowane* (1923) ён характарызаваў побыт, заняткі, ментальнасць і мову палешука. Аўтар аспрэчваў тэзіс вядомага ўкраінскага гісторыка Міхайлы Грушэўскага наконт прыналежнасці Палесся да Украіны і не згаджаўся з лінгвістам Яўхімам Карскім, які, сцвярджаючы дамінаванне на Палессі гаворак украінскай мовы, фактычна падтрымаў Грушэўскага. Раман Скірмунт звяртаў увагу на этнакультурную адметнасць палешука і сцвярджаў існаванне адметнай «палескай мовы». Пры гэтым ён трактаваў Палессе як частку Беларусі, прызнаючы, што «за выключэннем мовы паляшук больш падобны на беларуса, чым на ўкраінца»[331]. Відавочна, што «палескі фармат» заўсёды быў вельмі важным для яго, і гэтая важнасць сфарміравалася ўжо ў дзяцінстве.

Раман Аляксандравіч Скірмунт: пачаткі грамадскай працы

Міраслаў Устжыцкі ў даследаванні каштоўнасных арыенціраў свету шляхецкіх маёнткаў Беларуска-Літоўскага краю шмат увагі надаваў агульнапольскім кампанентам ментальнасці. Ён шчыра прызнаўся, што папросту ігнараваў тых «нешматлікіх» прадстаўнікоў заможнай шляхты, якія напярэдадні Першай су-

---

328 А. Ильин, Е. Игнатюк, *Очерки истории культуры Пинщины (IX – нач. XX вв.)*, с. 192.

329 *Rusinsky Łementar=Русински Лементар*. Napysau Staryj Hospodar. Б. м. 1907; А. Ильин, Е. Игнатюк, *Очерки истории культуры Пинщины (IX–нач. XX вв.)*, с. 196, 211; А. Ільін, *Раман Скірмунт у грамадска-палітычным жыцці Піншчыны ў 20–30-я гг. XX ст.*, «Гістарычны альманах». 2008, Том 8, с. 103.

330 R. Skirmunt, *Jozefa Kurzeniecka (wspomnienia posmiertne)*, «Kurier Litewski».1915, Nr 107, 25 kwietnia.

331 R. Skirmunt, *Rysy odrębności Polesia*, (y:) *Polesie ilustrowane*. Monografia. Praca zbiorowa pod redakcją inz. Nelarda. Brzesc n/B 1923; R. Skirmunt, *Rysy odrębnosci Polesia*, «Gazeta Warszawska». 1925, Nr 145.

светнай вайны адмовіліся ад польскасці і абвясцілі ўласную прыналежнасць да новых «крэсовых нацый»[332]. Аднак якраз гэтыя, сапраўды, нешматлікія прадстаўнікі шляхты і землеўласнікаў гістарычнай Літвы дапамагаюць больш грунтоўна зразумець асаблівасці свядомасці ўсяго мясцовага шляхецкага асяродку.

Відавочна, што для гэтай свядомасці было характэрна пачуццё ўласнай «ліцвінскай» адметнасці ад шляхты з тэрыторыі Каралеўства Польскага. Гэтая адметнасць у вялікай ступені грунтавалася на гістарычнай памяці пра мінулае Вялікага Княства Літоўскага. Так, вядомы літаратуразнаўца Мар'ян Здзяхоўскі (1861–1938) прызнаваўся: «У дзяцінстве мяне вучылі не толькі гісторыі Польшчы, але і гісторыі Літвы. Дзякуючы гэтаму я лічыў нацыянальнымі героямі не толькі тых, хто будаваў Польшчу, але і таго, хто імкнуўся адарваць Літву ад Польшчы – вялікага князя Вітаўта. Але хто тады задумваўся над гэтай непаслядоўнасцю? І калі б мяне сёння запыталі, кім я сябе адчуваю ў глыбіні душы, адказаў бы, што адчуваю сябе грамадзянінам Вялікага Княства Літоўскага, непарыўнай уніяй звязанага з Польшчай»[333].

Гэтая асаблівасць была характэрнай і для Скірмунтаў. Дастаткова прыгадаць выяву «Пагоні» сярод славутых шахмат Алены Скірмунт, папулярныя гістарычныя працы яе дачкі Канстанцыі, перапіску Аляксандра Скірмунта з Янам Карловічам або абвешчаную Канстанцінам Скірмунтам прэмію за знаходку рукапісу «Гісторыі Літвы» Ігната Анацэвіча ды інш. Вялікае значэнне таксама мела ўсведамленне ўласнага паходжання, што, дарэчы, адзначаў і наш герой – Раман Скірмунт – у згаданым біяграфічным нарысе памяці Канстанцыі Скірмунт (1934).

Адзін са стваральнікаў ліберальна-дэмакратычнага накірунку краёвай ідэі пачатку XX ст. Міхал Ромэр у недапісанай аўтабіяграфіі згадваў уласную бабулю Сузанну Тукала з роду Багдановічаў. У размовах з унукам, маючы на ўвазе свой род ды іншыя шляхецкія роды з Беларусі, яна казала: «Мы не з'яўляемся ўласна палякамі. Мы – русіны. І хаця мы размаўляем па-польску і ўтвараем палітычнае адзінства з Польшчай, але па крыві і нацыянальнасці мы належым да асобнай русінскай грамадскасці»[334].

Маці Міхала Ромэра (Віталія Ромэр з Кабылінскіх) ужо не мела «русінскай» свядомасці. Затое яна жыла з выразным пачуццём адметнасці Беларусі і Літвы ад Польшчы. «Зрэшты, у XIX ст., – заўважыў М. Ромэр, – падобнае пачуццё было даволі распаўсюджаным у свядомасці краёвых землеўласнікаў. Яны лічылі сябе не адметнай і чужой «меншасцю», не часткай іншага замежнага народу, а кіраўнікамі

[332] M. Ustrzycki, *Ziemianie polscy na Kresach. 1864–1914. Swiat wartosci i postaw*, s. 10.

[333] M. Zdziechowski, *Idea Polska na kresach* (у:) *Widmo przeszłosci*. Lozanne 1983, s. 3.

[334] Бібліятэка імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы (далей: БУАНЛ). Аддзел рукапісаў. F. 138–2262. М. Ромэр, *Аўтабіяграфія*, k. 24.

мясцовай, краёвай грамадскасці, ад імя якой іх продкі і нават яны самі, асабліва падчас паўстанняў, стваралі гісторыю гэтага краю як яго сапраўдныя грамадзяне»[335].

Узгадваючы ўласнае дзяцінства ў маёнтку Багданішкі на Жмудзі (Аляксандраўскі пав.), Ромэр адзначаў на старонках Дзённіка, што ў ягоным тагачасным уяўленні паміж польскасцю і літоўскасцю не было аніякай розніцы. Яны зліваліся ў адзінае цэлае як два бакі аднаго медаля. Усе элементы краёвага грамадства – літоўцы, беларусы і палякі – успрымаліся як непарыўнае цэлае, нягледзячы нават на тое, што розніліся мовамі[336].

Колішні сябра Рамана Скірмунта і будучы Генеральны камісар Усходніх земляў Ежы Асмалоўскі (1872–1954) ва ўспамінах прызнаваўся ў беларускім паходжанні сваёй сям'і, сцвярджаў, што толькі ягоны прадзед авалодаў польскай мовай. Для яго Радзімай была і Польшча, і Беларусь. Шукаючы формулу ўласнай ідэнтычнасці, ён пісаў: «Я паляк паводле мовы і культуры, каталік, але не жыву ў Польшчы і маю абавязкі ў стасунку да Краю, дзе нарадзіўся, і людзі, што мяне атачаюць, блізкія мне»[337]. Як ужо адзначалася, сам Раман Скірмунт называў сябе «потомком литовской семьи с древних времен, с испокон веков оседлой в этом крае [...]»[338].

Гістарычная памяць і звязаныя з ёю пэўныя псіхалагічныя ўстаноўкі былі часткай унікальнага феномена падвоенай свядомасці тыпу *gente Lithuanus (vel Ruthenus) natione Polonus*. Даследчык Юліуш Бардах лічыў пачаткам яго фармавання другую палову XVII ст.[339]. Паводле яго пераканання, «палітычная нацыя» («narod polityczny») Вялікага Княства Літоўскага ў гэты час ужо пераняла польскую мову і культуру, што ў спалучэнні з палітычным «польска-літоўскім» збліжэннем спрыяла ўтварэнню адзінай шляхецкай нацыі Рэчы Паспалітай. Аднак шляхта Княства заўсёды захоўвала пачуццё ўласнай адметнасці ад жыхароў этнічнай Польшчы.

Варта згадаць пра шматлікія праявы мясцовага патрыятызму, які палітыкі «Кароны» часта характарызавалі як «ліцвінскі сепаратызм», а таксама пра даволі крытычнае стаўленне «ліцвінаў» да жыхароў Кароны. Марыя Радзевічууна нават акрэсліла гэта як «спрадвечны антаганізм»[340]. Ён адчуваўся і на пачатку XX ст. Напрыклад, Генрык Скірмунт 30 верасня 1905 г. у лісце да Элізы Ажэшкі, ацэньва-

---

[335] Тамсама, k. 25–26.

[336] J. Sawicki, *Od dwuszczeblowosci do dwoistosci litewsko-polskiej. Swiadomosc narodowa Michała Romera* (y:) *Wilno i Kresy północno-wschodnie*: Materiały II Międzynarodowej konferencji w Białymstoku 14–17. IX. 1994, tom 1. Białystok 1996, s. 132.

[337] BN. Dział mikroform. Akc. 7042. J. Osmołowski, *Wspomnienia z przeszłosci. Lata dziecinne i młodziencze*, k. 142.

[338] З перапіскі Рамана Скірмунта з Яўсеям Канчарам, «Чырвоны шлях». 1918, № 1–2, с. 12.

[339] J. Bardach, O *dawnej i niedawnej Litwie.* Poznan 1988, s. 201.

[340] Ч. Милош, *Поиск Отчизны.* Петербург 2011, с. 24.

ючы палітычную сітуацыю, заўважыў: «Карона выкарыстоўвае Літву. Братэрскае пачуццё адсутнічае. Літва зноў павінна цягаць для Кароны каштаны з полымя»[341].

Звычайна гістарычная Літва ўспрымалася як «малая Айчына», а Рэч Паспалітая як свайго роду «ідэалагічная Айчына». Пры гэтым «караняжы» і «ліцвіны» называлі сябе «палякамі». Гэты тэрмін быў пазначэннем рэчпаспалітаўскага грамадзянства, незалежна ад месца пражывання, мовы або веравызнання.

Вядомы публіцыст і нашчадак «стараліцвіна» Валяр'ян Мэйштовіч параўноўваў гэтую сітуацыю з брытанскім патрыятызмам валійцаў і шатландцаў, якія фактычна страцілі свае родныя мовы на карысць англійскай. Яны падкрэслівалі ўласную адметнасць ад англічан, але праяўлялі салідарнасць з імі, калі справа даходзіла да дэманстрацыі брытанскага патрыятызму[342].

Прыкладам «ліцвінскага патрыятызму» можна лічыць «Катэхізіс ліцвіна», які распаўсюджваўся ў часы паўстання 1830–1831 гг. і, магчыма, быў вядомы жыхарам скірмунтаўскага Моладава.

ДАКУМЕНТ

Катехизис литвина (1830–1831?). Фрагмент[343]

– Литвин ли ты?

– Литвин по милости Бога.

– Кто есть литвин?

– Тот, кто верит в вольность и исполняет права Статута.

– Почем узнается истинный литвин?

– По знаку усердного патриотизма. Во имя сабли, пороху и свинцовой пули. Аминь. [...]

– Что есть вольность?

– Быть человеком, а не зверем, жить свободно на родной земле, говорить и писать на родном языке, устанавливать общие народные права, не подвергаться наказаниям и их указаниям, переноситься с места на место по своей воле и надобности, пользоваться привилегиями местных дворян, вести открытую торговлю, черпать образование из разных наук, не знать губернатора, прокурора, советников, исправников, асессоров, новосельцев, даже Пеликана, Мяновского и всех подобных плутов, шпионов и мошенников.

– Что есть единство с поляками?

– Составлять с ними единый и нераздельный народ, так чтобы литвин был поляком, а поляк – литвином одной и той же Конституции. [...]

---

[341] Archiwum Instytutu Badan Literackich PAN. Ліст Г. Скірмунта да Э. Ажэшкі ад 30 верасня 1905 г.

[342] W. Meysztowicz, *Poszło z dymem*. Londyn 1973, c. 33.

[343] РНБ. Аддзел рукапісаў. Sygn. 106. Фонд В. Ф. Ратча, арк. 4–7 (дакумент быў перакладзена на рускую мову).

– Что такое Отечество?

– Это есть земля, на которой я родился, вырос, воздухом которой дышу, которая меня живит и кормит, где имею родных и друзей, где покоится пепел моих предков, где свободно могу действовать, думать и говорить природным языком, словом оно есть моя мать, и я ее сын. […]

Верю в святые дела Отечества нашего, родительницы моей и моих братий и в Статут Литовский – единственного ее сына, судьи нашего, который получил начало от разума, родился от вольности, чистой девицы, замучен царем Николаем, умер и похоронен, вступил ныне в Варшаву, опирается на право Конституции. Оттуда придет суд повешанным и неповешанным.

Верю в дух вольности поляков с литовцами, в искоренение заблуждений и в воскресение Польши, в жизнь вечную.

Аминь.

Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены канца XVIII–XIX ст. не знішчылі цалкам феномен падвоенай свядомасці. Мар'ян Здзяхоўскі нават у 1918 г. адзначаў, што гэты феномен «праяўляецца як жывая памяць уласнага літоўскага або рускага паходжання, як усведамленне непарыўнай сувязі з роднай зямлёю і мясцовым людам і адначасна характарызуецца глыбокай прыхільнасцю да польскай культуры і мовы, што стала роднай, пачуццём непадзельнасці як гістарычнага лёсу Літвы і Польшчы, так і іх будучыні»[344]. Пры гэтым трэба адзначыць, што палітыка культурнай русіфікацыі і палітычнай дэпаланізацыі спрыяла ўмацаванню ў свядомасці менавіта «польскага» кампанента. Гэты працэс таксама ўмацоўвала антыпольскасць літоўскага нацыянальнага руху, якая сталася выразнай ужо ў другой палове XIX ст.

Відавочна, што нацыянальная свядомасць значнай часткі шляхты Беларуска-Літоўскага краю напрыканцы XIX – пачатку XX ст. трымалася не столькі на культурнай і моўнай прыналежнасці, колькі на ўсведамленні свайго паходжання і сваёй сувязі з мінулым і сучасным гістарычнай Літвы. Юліуш Бардах наступным чынам характарызаваў гэтую свядомасць: «Паводле сваёй культурнай арыентацыі гэта былі палякі, аднак пры вызначэнні нацыянальнай прыналежнасці пераважала пачуццё краёвай адметнасці, што вяло да падпарадкавання інтарэсаў польскай грамадскасці інтарэсам усяго Краю […] Яны былі ліцвінамі ў гістарычным сэнсе, і гэта вызначала іх пазіцыю ў палітычным жыцці»[345].

Ён жа адзначыў немагчымасць правядзення дакладнай мяжы, дзе «заканчвалася пачуццё рэгіянальнай адметнасці літвінаў-палякаў (або беларусаў-палякаў) […] і нараджалася літоўская або беларуская нацыянальная свядомасць. Іншым разам на тэрыторыях, дзе канкуравалі паміж сабою розныя нацыянальныя

[344] «Dziennik Miński». 1918, 6 (19) stycznia.

[345] J. Bardach, O *dawnej i niedawnej Litwie*, s. 217–218.

супольнасці, адна і тая ж асоба ў розныя перыяды свайго жыцця дэкларавала сябе то палякам, то літоўцам, то беларусам. Асабліва цікавыя матывы гэтых зменаў у выпадку асобаў, якія належылі да інтэлектуальнай эліты Краю, г. зн. там, дзе працэс асіміляцыі саступаў свядома зробленаму выбару»[346]. Жыццяпіс Рамана Скірмунта – гэта спроба зразумець менавіта матывы такога выбару...

У апошняй трэці XIX ст. на тэрыторыі гістарычнай Літвы пачаў пашырацца этнонім «літоўскія палякі»[347]. Даследчык Рымантас Мікніс упэўнены, што на пачатку XX ст. распачаўся працэс фарміравання нацыі літоўскіх палякаў[348]. Відавочна, што польскасць многіх шляхецкіх маёнткаў Беларуска-Літоўскага краю была моцна звязана з традыцыямі гістарычнай Літвы і жыццём мясцовых беларускіх і літоўскіх сялян. Маёнтак Скірмунтаў у Парэччы не быў выключэннем.

М. Устжыцкі, аналізуючы шляхецкія ўяўленні пра Айчыну, сцвердзіў існаванне розных узроўняў патрыятызму, змяшанне нацыянальных крытэрыяў з сацыяльнымі, а таксама спецыфіку польскасці, якая ўключала ў сябе літоўскасць, беларускасць і валынскасць. Усё гэта існавала ў неідэалагізаванай і толькі часткова ўсвядомленай форме[349]. Аднак уласныя даследаванні, а таксама працы Ю. Бардаха, Р. Мікніса ды іншых даследчыкаў «ліцвінскага патрыятызму» прымушаюць паставіць пытанне: Ці сапраўды польскасць у гэтым сімбіёзе была дамінуючай формай?

Скірмунты, як іншыя літоўскія палякі, павінны былі адаптавацца да новых умоў жыцця і гаспадарання, падмуркі якіх былі закладзены яшчэ генерал-губернатарам М. Мураўёвым пасля паразы паўстання 1863 г. У другой палове XIX ст. Беларуска-Літоўскі край стаўся адной з галоўных арэн чарговай спробы расійскіх уладаў канчаткова вырашыць г. зв. «польскае пытанне». Пад апошнім яны разумелі ліквідацыю ўсялякіх уплываў мясцовай польскай грамадскасці на палітычнае, эканамічнае, культурнае і рэлігійнае жыццё рэгіёну. Пры гэтым антыпольскія па форме і антыкаталіцкія па змесце мерапрыемствы ўрада і мясцовай адміністрацыі датычылі таксама беларусаў-каталікоў і літоўцаў. Можна пагадзіцца з высновай М. Ромэра, які ў 1906 г. сцвярджаў, што расійскі ўрад на беларускіх і літоўскіх землях праводзіць палітыку русіфікацыі і асіміляцыі нерускіх народаў. Гэтая палітыка праяўлялася ў абмежаванні правоў гэтых народаў, стрымліванні іх культурнага развіцця і ўмацаванні ўплываў «вялікарускага племені»[350].

Варта прыгадаць яшчэ раз закон ад 10 снежня 1865 г., які забараняў набываць зямлю «асобам польскага паходжання» (апошняе датычыла каталіцкага

---

[346] Ibidem, s. 212.

[347] M. Budny, *Bronisław Piłsudski. Życie i tworczosc*, «Niepodległosc». T. XXI. Nowy York-Londyn 1988, s. 184.

[348] R. Miknys, *Problem kształtowania się nowoczesnego narodu Polakow litewskich w pierwszej połowie XX w.*, «Biuletyn Historii Pogranicza». 2000, Nr 1, s. 23–29.

[349] M. Ustrzycki, *Ziemianie polscy na Kresach. 1864–1914. Swiat wartosci i postaw*, s. 203.

[350] M. Romer, *Stosunki etnograficzno-kulturalne na Litwie*. Krakow 1906, s. 35.

насельніцтва), антыкаталіцкія мерапрыемствы (скарачэнне колькасці касцёлаў і кляштараў, спроба ўвядзення рускай мовы ў дадатковае каталіцкае набажэнства), «кантрыбуцыйныя зборы» са шляхецкіх маёнткаў (10 % усіх прыбыткаў), выгнанне літоўскіх палякаў з мясцовых органаў улады, забарону ўжываць у афіцыйнай перапісцы і карыстацца ў публічных месцах польскай мовай, далейшую русіфікацыю сістэмы адукацыі ды інш.

Гэты палітычны рэжым шмат каго прымусіў пашкадаваць аб нядаўняй захопленасці рамантычнымі марамі пра «свабоду нашу і вашу». Духоўнае жыццё шляхецкіх маёнткаў пасля разгрому паўстання было прасякнута настроямі горычы і расчаравання. Многія літоўскія палякі лічылі паўстанне (па выніках) шкодным, а дзейнасць Варшаўскага ўрада і ягоных «камісараў» у Літве – не адпавядаючай інтарэсам Краю[351]. Некаторыя нават ацэньвалі паўстанне як правакацыю і сцвярджалі, што яно выратавала расійскія ўлады, якія, дзякуючы дзейнасці «партыі» Аляксандра Веляпольскага, паступова страчвалі свае пазіцыі ў гістарычнай Літве. Разгром паўстання стаўся нагодай для расправы з польскасцю. Так, Юзаф Пілсудскі згадваў, што ў часы ягонага дзяцінства дарослыя рэдка выказваліся пра паўстанне, а тое, што казалі, шакіравала: «Паўстанне было не толькі памылкай, але і злачынствам»[352].

Браніслаў Залескі ў кнізе пра Алену Скірмунт (1876) абвінаваціў кіраўнікоў паўстання ў авантурызме і легкадумнасці: «Кіруючае рухам Літоўскае Аддзяленне, распаленае загадамі з Варшавы і падбадзёрваннямі з-за мяжы, намагалася працягваць барацьбу амаль без аніякіх матэрыяльных сродкаў, без зброі і грошай, нават энергіяй не раўнуючыся з ворагам. Але ўсе намаганні ў параўнанні з жаданнем былі слабыя і мізэрныя і каштавалі шмат жыццяў»[353].

Дзядзька Рамана Скірмунта, уладальнік маёнтка Моладава Генрык Скірмунт, паводле ўспамінаў сына Канстанціна, «усё жыццё знаходзіўся пад уражаннем несувымернасці нашых сіл і расійскай моцы»[354]. Сам Раман Скірмунт у пасмяротнай біяграфіі Канстанцыі Скірмунт пісаў пра «фатальны 1863 год», што меў «катастрафічныя наступствы для многіх зямянскіх родаў». Ён нават параўнаў яго з Рыжскім трактатам 1921 г. (!)[355]

Дакументы расійскай адміністрацыі сведчаць, што значная частка польскай грамадскасці Беларуска-Літоўскага краю думала толькі пра выжыванне. Так, у жніўні 1866 г. начальнік жандарскай управы Аршанскага пав. дакладваў свайму кіраўніцтву: «Шляхта без пярэчання выконвае ўсе распараджэнні ўрада і пры ўсялякай нагодзе выказвае яму адданасць, усведамляючы бяздумнасць удзелу

---

[351] Гл., напр., E. Wojniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1929*. Czesc pierwsza, s. 36–37.

[352] J. Piłsudski, *Jak stałem się socjalistą*. Warszawa 1986, s. 6.

[353] Б. Залескі. З *жыцця літвінкі. З лістоў і нататак. 1823–1874*, с. 152.

[354] K. Skirmunt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*, s. 19.

[355] R. Skirmuntt, *Panie z Muru*, «Słowo». 1934, Nr 130.

ў былых палітычных хваляваннях і разам з тым сваё бяссілле»[356]. Таксама ў архівах захаваліся шматлікія звароты да ўладаў з запытам, ці дастаткова будзе для вызвалення ад «кантрыбуцыйных збораў» публічнага адрачэння ад Каралеўства Польскага, ад польскай мовы і звычаяў, выхавання дзяцей у расійскіх навучальных установах у духу адданасці Расіі і г. д.[357]

Віленскі генерал-губернатар П. Альбядзінскі ў лісце да Аляксандра II у снежні 1879 г. адзначаў, што «местному польскому населению чуждо стремление проявлять, какую бы ни было враждебность к правительству»[358]. Праўда, ніжэйшыя паліцэйскія чыны такой пэўнасці не мелі. Было відавочным моцнае незадавальненне мясцовага каталіцкага насельніцтва палітыкай прыціску каталіцкага касцёлу. Падчас вайны Расіі з Турцыяй у 1876–1877 гг. праявіліся выразныя пратурэцкія сімпатыі літоўскіх палякаў.

А вось для моладзі паўстанцы 1863 г. заставаліся героямі. Як і прадказваў калісьці А. Скірмунт (старэйшы), ідэя змагання не знікла. Той жа Ю. Пілсудскі згадваў: «Усе мары канцэнтраваліся ў той час вакол паўстання і ўзброенай барацьбы супраць маскалёў, якіх я ўсёй душой ненавідзеў [...]»[359]. Іншы вядомы дзеяч польскага руху Вацлаў Студніцкі (Гізбэрт-Студніцкі), згадваючы пра свае дзіцячыя прагулкі з мамай каля Дынабургскай крэпасці, у якой быў пакараны смерцю Леан Плятэр, пісаў: «Неаднойчы калі праходзіў каля крэпасці, абдумваючы планы яе захопу, а заходзячае сонца зіхацела ў вільготным тумане, які ўздымаўся з палёў, здавалася мне, што бачу душу Плятэра, і я маліўся яму як мучаніку нацыянальнай справы і прасіў, каб паслаў на мяне моц вызваліцеля Польшчы»[360].

Ва ўмовах жорсткай русіфікацыйнай палітыкі галоўнай мэтай намаганняў літоўскіх палякаў стала захаванне ўласных эканамічных і культурных пазіцый. Большасць імкнулася да пэўнай згоды з уладамі, шукала кампраміс паміж інтарэсамі расійскага ўрада і ўласнымі патрэбамі, якія часам трактаваліся як інтарэсы ўсяго Беларуска-Літоўскага краю.

Парэчча не было выключэннем. У маёнтку падрасталі дзеці, якіх трэба было выхоўваць і вучыць. Звычайна адукацыя пачыналася ў родным доме. Гэта была агульная практыка заможнай шляхты. Так, першымі настаўніцамі Міхала Ромэра былі французанкі-гувернанткі, што паспрыяла выдатнаму валоданню ім французскай мовай. Каб падрыхтаваць сына да навучання ў гімназіі бацькі запрасілі таксама настаўніцу рускай мовы. Але гэта аказалася недастаткова, і Міхал Ромэр у 1890 г. быў прыняты ў прыватную школу Цэброўскіх у Вільні. Праз год ён па-

---

[356] Государственный архив Российской Федерации (далей: ГАРФ). Ф. 109 (с. а.), оп. 2, д. 763, л. 2.

[357] Напрыклад, ЛДГА. Ф. 378 (п. а.), 1866, спр. 125, арк. 9 адв.

[358] РНБ. Аддзел рукапісаў. Фонд Альбядзінскага П. П. Ф. 16, д. 53, л. 2 адв.

[359] J. Piłsudski, *Jak stałem się socjalistą*. Warszawa 1986, s. 3.

[360] Wł. Studnicki, *Z przezyc i walk*. Warszawa 1928, s. 8–9.

спяхова здаў іспыты і паступіў у Першую віленскую мужчынскую гімназію[361]. А вось Эдварда Вайніловіча ў маёнтку Савічы Слуцкага пав. вучылі замежным мовам немка і француженка. Пазней бацькі запрасілі ў якасці хатняй настаўніцы сваячку Юлію Рэвеньскую з Наваградка. Навучанне адбывалася па-польску і па-французску. Вайніловіч ва ўспамінах адзначаў таксама вялікую выхаваўчую ролю хатняй настаўніцы[362]. Толькі ў 12-цігадовым узросце ён пачаў вывучаць рускую мову, і праз год паступіў у 4 клас Слуцкай гімназіі.

Відавочна, што і Рамана Скірмунта рыхтавалі да працягу навучання запрошаныя ў Парэчча настаўнікі. Далей ягоны шлях ляжаў у Курляндыю, якая была традыцыйным для Скірмунтаў месцам атрымання сярэдняй адукацыі.

Стрыечны брат Рамана Канстанцін Скірмунт, які разам з братам Генрыкам вучыўся ў нямецкай гімназіі ў Лібаве, ва ўспамінах тлумачыў такі адукацыйны выбар імкненнем бацькоў выдаліць сыноў з-пад ціску «ашалелай у нашым краі ў тыя гады русіфікацыі»[363]. У тагачаснай Курляндыі дамінавала нямецкая шляхта, якая карысталася шляхецкімі прывілеямі, і, паводле К. Скірмунта, захоўвала прыязнае стаўленне да палякаў[364].

Ен з прыемнасцю згадваў гімназічныя гады: «Там мы раслі і выхоўваліся [...] Там мелі шматлікае кола польскіх калег, найбольш з блізкай Жмудзі. Прыгадваю братоў Камароўскіх, з якімі захаваў блізкія стасункі на доўгія гады, пазнейшага прэзідэнта Рэчы Паспалітай Польскай Габрыэля Нарутовіча, Тышкевічаў і Свіртунаў. Рускіх у школе амаль не было, а нашы стасункі з нямецкім калегамі, ці то са шляхты, ці то з мяшчанскіх колаў былі простыя і зразумелыя. Настаўнікі ставіліся да нас добразычліва і з вялікім клопатам»[365].

Гісторыя з адукацыяй Рамана Скірмунта заблытаная. Упершыню праблема паўстала ў 1909 г., калі яму як дэпутату шляхты Пінскага пав. (з 1905 г.) павінны былі надаць чын калежскага рэгістратара. Але не надалі, бо ён не здолеў прад'явіць атэстат аб заканчэнні гімназіі. У наступным годзе гэта праблема выйшла ўжо на ўзровень Дзяржаўнай Рады Расійскай імперыі. Раман Скірмунт быў абраны ў Раду ад Менскай губ. у 1909 г. Падчас звычайнай працэдуры праверкі правільнасці выбараў дэпутата высветлілася, што адсутнічае дакумент аб ягонай адукацыі.

Менскі губернатар Якаў Эрдэлі на афіцыйны запыт адказаў, што «точных данных об образовательном цензе названного Скирмунта, не получившего по частным сведениям будто бы среднего образования, у меня не имеется»[366]. Ён накіраваў запыт да папячыцеля Рыжскай навучальнай акругі. Той паведаміў, што

---

[361] Z. Solak, *Między Polska a Litwa. Zycie i działalnosc Michała Romera. 1880–1920*, s. 25

[362] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Częsc pierwsza*, s. 10.

[363] K. Skirmunt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*, s. 19.

[364] Ibidem.

[365] Ibidem, s. 20.

[366] РГИА. Ф. 1162, оп. 8, д. 4, л. 143.

Раман Скірмунт у Рызе не вучыўся. Затое Рыжскую Аляксандраўскую гімназію ў 1886 г. закончыў Баляслаў Скірмунт (1866 г. нар.). Эрдэлі паведаміў пра гэта Камісіі Дзяржаўнай Рады і дадаў, што падчас прызначэння на пасаду дэпутата шляхты Пінскага пав. у Менскім шляхецкім сходзе (1905) Раман Скірмунт заявіў, што атэстат аб заканчэнні Рыжскай гімназіі застаўся ў лейб-гвардыі Валынскім палку, дзе напрыканцы 1880-х гг. ён праходзіў вайсковую службу. Быў зроблены чарговы запыт. Камандзір палка прыслаў копію выпіскі пра службу прапаршчыка запаса Рамана Скірмунта і заявіў, што дакумент аб адукацыі ў ягонай асабістай справе адсутнічае[367].

Усё скончылася тым, што ў студзені 1911 г. Раман Скірмунт накіраваў ліст да старшыні Рады, у якім адмовіўся ад звання дэпутата. У якасці галоўнай прычыны фігуравала смерць бацькі і неабходнасць займацца справамі маёнтка[368].

Даследаванні ў Дзяржаўным гістарычным архіве Латвіі ў Рызе, праяснілі сітуацыю. Сярод матэрыялаў пасяджэнняў педагагічнай рады Рыжскай гарадской гімназіі 1881–1883 гг. знайшлася інфармацыя пра Рамана Скірмунта. Так, з пратакола пасяджэння ад 11 жніўня 1881 г. можна даведацца, што Раман Скірмунт (Skirmundt, Skirmuntt) быў прыняты ў 5 клас прагімназіі па праграме «рэальнага» навучання. Ужо праз некалькі месяцаў (пратакол ад 12 снежня 1881 г.) ён быў пераведзены ў 4 клас з пераэкзаменоўкай па нямецкай мове[369].

Варта адзначыць, што навучанне ў гэтай гімназіі ў той час вялося па-нямецку. Існавалі два адукацыйныя накірункі – «рэальны» і «класічны». Поўны курс навучання працягваўся 8 гадоў. Звычайна хлопчыкі паступалі ў 7 клас прагімназіі, дзе вучыліся два гады. Пасля заканчэння 4 класа прагімназіі яны паступалі ў вышэйшае трохкласнае аддзяленне. Выпускнікі 1 класа атрымлівалі атэстат аб гімназічнай адукацыі.

Пратакольны запіс пасяджэння Педагагічнай рады ад 13–14 снежня 1882 г. сведчыць пра тое, што Раман Скірмунт (Skirmunt) быў пераведзены ў 3 клас з пераэкзаменоўкай па алгебры і геаграфіі[370]. У наступных пратаколах яго імя больш не згадвалася. Прагляд запісаў кнігі аплаты за навучанне сведчыць, што ў верасні 1881 г. Р. Скірмунт заплаціў за навучанне ў 5 класе «рэальнай праграмы» 15 руб. 75 кап., у снежні таго ж году – 11 руб. 25 кап.[371] У сакавіку 1882 г. ён унёс у касу яшчэ 11 руб. 25 кап.[372] І гэта апошняя згадка Рамана Скірмунта. Падобна на тое, што яго гімназічная адукацыя скончылася ў 3 класе Рыжскай гарадской гімназіі.

---

[367] Тамсама, арк. 152.

[368] Тамсама, спр. 5, арк. 95–95 адв.

[369] Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі. Ф. 3155, воп. 1, спр. 67, арк. 76 адв., 79.

[370] Тамсама, арк. 89.

[371] Тамсама. Ф. 6715, воп. 2, спр. 439, арк. 31, 43.

[372] Тамсама, спр. 440, арк. 11.

Як бачым, гімназічныя гады Рамана Скірмунта не былі працяглымі. Ягонае вяртанне ў Парэчча магчыма было звязана з няўдалай спробай бацькі перакласці кіраванне маёнткам на старэйшага сына Аляксандра. Праўда, у красавіку 1883 г. Раману споўнілася толькі 15 гадоў, і ён не меў права самастойна кіраваць маёнткам, ды і не быў да гэтага падрыхтаваны. Рыжскую гімназію замяніла хатняя адукацыя, найважнейшым прадметам якой было знаёмства з вопытам бацькі па кіраванню вялізнай гаспадаркай.

Такім чынам, Раман Скірмунт не здолеў закончыць гімназію і атрымаць адпаведны атэстат. Аўтары артыкула пра яго ў Польскім біяграфічным слоўніку Чэслаў Бжоза і Каміль Стэпан сцвярджалі, што ён вывучаў права па-за межамі Расіі[373]. Аднак адшукаць дакументальнае пацвярджэнне або нейкую верагодную інфармацыю пра гэта не атрымалася. Магчыма, больш дакладнай з'яўляецца інфармацыя пляменніцы Скірмунта Вацлавы Нээф, якая ў размове з Зоф'яй Дэрналовіч паведаміла, што яе дзядзька вучыўся ў Палітэхнічным інстытуце ў Рызе. Цалкам магчыма, што ён наведваў заняткі як вольны слухач. Праўда, інфармацыя пра вучобу ва ўніверсітэце адсутнічала ў біяграме кандыдата ў сенатары Рамана Скірмунта, апублікаванай у кастрычніку 1930 г. на старонках віленскай газеты «Слова»[374].

Пры гэтым аналіз палітычнай і грамадскай дзейнасці Рамана Скірмунта, ягоныя лісты, тэксты шматлікіх публікацый і выступаў у Дзяржаўнай Думе і Дзяржаўнай Радзе Расійскай імперыі, у Сенаце Польшчы сведчаць пра высокі ўзровень ягонай адукацыі.

У снежні 1888 г. Раман Скірмунт як *вольнопределяющийся* пачаў вайсковую службу ў лейб-гвардыі Валынскім палку. Статут пра вайсковую павіннасць 1874 г. уводзіў катэгорыю *вольноопределяющихся*, якімі маглі стаць выпускнікі рознага тыпу гімназій і рэальных вучылішчаў, а таксама тыя, хто мог прадставіць дакументы нават пра некалькі гадоў гімназічнай вучобы. Яны пачыналі службу шараговымі салдатамі і выконвалі ўсе службовыя абавязкі, апрача ўдзелу ў гаспадарчых працах. Мелі права жыць на кватэрах або ў асобных казарменных памяшканнях. Служылі 1 год, а потым здавалі іспыт на званне прапаршчыка.

У Расійскім ваенна-гістарычным архіве захавалася службовая справа Рамана Скірмунта. Яна сведчыць, што ў ліпені 1889 г. Скірмунт атрымаў званне унтэр-афіцэра, а ў жніўні ў Макатоўскім лагеры пад Варшавай ужо здаваў іспыт на званне прапаршчыка. Трэба было прадэманстраваць веданне вайсковых статутаў, асаблівасцяў палявой службы, агнястрэльнай зброі і сродкаў умацавання пазіцый на мясцовасці. Па ўсіх прадметах ён атрымаў вышэйшыя адзнакі, стаў прапар-

[373] Cz. Brzoza, K. Stepan, *Skirmunt Roman (1868–1939)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 184.

[374] *Kandydaci B. B. W. R.*, «Słowo». 1930, Nr 254, 5 listopada.

шчыкам армейскай пяхоты, а 7 верасня звольніўся ў запас[375]. Праўда, на гэтым ягоная ваенная адукацыя не скончылася. У 1891 і 1896 гг. ён прымаў удзел у вайсковых вучэбных зборах у складзе Каломенскага пяхотнага палка. У снежні 1901 г. Р. Скірмунт па дасягненні 33-гадовага ўзросту быў вызвалены ад вайсковага абавязку[376].

Трэба адзначыць, што атэстат аб прысваенні звання ўтрымліваў непраўдзівую інфармацыю, што ў 1887 г. Раман Скірмунт закончыў поўны курс Рыжскай губернскай гімназіі. Падобна, што Скірмунты ў дадзенай сітуацыі знайшлі спосаб схаваць праўду пра адукацыю Рамана Аляксандравіча.

1890-я гг. для адстаўнога прапаршчыка Рамана Скірмунта былі напоўнены працай поруч з бацькам у маёнтку. Магчыма, пагружанасць у гаспадарчыя клопаты і інтарэсы сям'і стала істотнай перашкодай наладжвання ўласнага сямейнага жыцця.

Якраз ягоная самахвярнасць дзеля патрэбаў сям'і ды сваякоў паслужыла падставай сцвярджэння Ежы Асмалоўскага, што менавіта Раман Скірмунт стаў галоўным прататыпам ужо згаданага Марка Чэртвана, галоўнага героя «Дэвайціса». У 1888 г. Марыя Радзевічуўна атрымала за гэты твор прэмію газеты «Кур'ер Варшаўскі». Але ёсць пэўныя сумненні, ці сапраўды юнак, якому не споўнілася яшчэ і 20 гадоў, мог стаць прататыпам Марка Чэртвана?

Блізкасць бацькі ў гэты перыяд жыцця была вельмі важнай для Рамана Скірмунта. Бацька не толькі вучыў гаспадарыць. Ён быў пэўным узорам стаўлення да мясцовай адміністрацыі, да суседзяў-землеўласнікаў, да сваякоў, нарэшце, да палескай вёскі. Апошняя хоць і стала свабоднай, але па-ранейшаму патрабавала дапамогі, а часам і апекі. Прынамсі, парэцкія Скірмунты не збіраліся мяняць ранейшую лінію паводзін.

Гэта праяўлялася таксама ў экстрэмальных сітуацыях. Прыкладам можа служыць пажар у Парэччы напрыканцы 1891 г. Вось што пра гэтае здарэнне пісаў карэспандэнт «Краю», які схаваўся пад крыптанімам *В. М.*: «Напрыканцы мінулага месяца жахлівы пажар здарыўся ў вёсцы Парэчча, якая знаходзіцца на землях Аляксандра Скірмунта ў адлегласці адной вярсты ад сядзібы і вядомай суконнай фабрыкі. Згарэла каля 50 розных пабудоў і шмат людзей засталося без даху над галавой. Нягледзячы на моцны вецер, згарэла толькі сярэдзіна вёскі. Іншыя часткі ацалелі дзякуючы энергічнай дапамозе Рамана Скірмунта, які не толькі кіраваў пажарнай камандай, створанай Скірмунтамі, але і сам прымаў актыўны ўдзел у лакалізацыі пажара, рызыкуючы ўласным жыццём. Алена Скірмунт таксама дапамагала пагарэльцам, не ашчаджаючы сіл. Наогул, сяля-

---

[375] Российский государственный военно-исторический архив (далей: РГВИА). Ф. 400, оп. 9, д. 25772, часть 2, л. 23. Хачу шчыра падзякаваць Яніне Карпенкінай за магчымасць аналізу архіўных дакументаў.

[376] Там же, оп. 17, д 13551, л. 117.

не ваколіцы павінны быць вельмі ўдзячныя Скірмунтам. Суконная фабрыка і эканомія даюць ім пастаянны спакойны заробак, а ў выпадку няшчасця аказваюць матэрыяльную дапамогу»[377].

Забягаючы наперад, хачу адзначыць, што гэта быў далёка не апошні выпадак рэальнай дапамогі жыхарам вёскі з боку сям'і Скірмунтаў, і ў т. л. Рамана.

Што датычыць сумеснага з бацькам кіравання гаспадаркай, то пэўныя ўскосныя дадзеныя дазваляюць сцвярджаць, што Аляксандр Скірмунт канцэнтраваў свае намаганні на прамысловасці Парэчча, а галоўным клопатам сына стала сельская гаспадарка. Так, у ягонай біяграме на старонках Альбома дэпутатаў Дзяржаўнай Думы (1906) было сціпла пазначана: «Занимается сельским хозяйством»[378]. Пры гэтым сын таксама меў дачыненне да дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў Парэчча, магчыма, у першую чаргу па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі (сыраварня, паравы млын ды інш.). Менавіта Рамана бацька загадзя зрабіў «распорядителем всего имущества» пасля сваёй смерці. Пра гэта можна даведацца з інфармацыі прыстава 4 стана Пінскага пав. пра маёмасны стан Рамана Скірмунта ад 7 верасня 1905 г.[379]

Пра пэўны падзел абавязкаў паміж бацькам і сынам сведчыць таксама ліст Рамана Скірмунта да рэдактара варшаўскай газеты «Слова» і свайго сябра Чэслава Янкоўскага ад 6 чэрвеня 1909 г. Аўтар ліста скардзіўся, што пасля смерці бацькі ён застаўся адзіным кіраўніком вялікай гаспадаркі і не спраўляецца з навалам спраў. У сувязі з гэтым Раман Скірмунт паведамляў пра рашэнне зняць уласную кандыдатуру на выбарах дэпутата Дзяржаўнай Рады ад Менскай губ.[380]

Аднак не толькі гаспадарчыя клопаты займалі час Рамана Скірмунта. Менавіта ён стаў ініцыятарам і галоўным «архітэктарам» стварэння на пачатку XX ст. вялізнага ландшафтнага парку на беразе Ясельды, які сёння ў найбольшай ступені сведчыць пра неардынарны гістарычны лёс Парэчча.

Раман Афтаназы, які ў міжваенны час наведаў Парэчча, сцвярджаў, што ягоная кампазіцыя ўключала як фрагменты старога лесу, у т. л. дубы, так і розныя экзатычныя дрэвы, прывезеныя з розных краін свету[381]. Перад палацам цягнуліся газоны з клумбамі кветак і дэкаратыўнымі кустамі. Парк займаў увесь правы бераг Ясельды і яе прытока Ясеня, быў насычаны каналамі і сажалкамі, якія ўпрыгожвалі выгнутыя драўляныя масткі. Шматлікія сцяжынкі і сцежкі збягаліся і разбягаліся ў розныя бакі, шматразова перакрыжоўваліся, але пераважна вялі да Ясельды. Тут дубы перамяжоўваліся з вязамі, ясенямі, клёнамі і экзатычнымі дрэвамі, у т. л. цюліпанавымі. Надзвычай багатым быў жывёльны і птушыны свет

---

377 «Kraj». 1891; Nr 46.

378 *Альбом портретов депутатов Государственной Думы.* Москва 1906, с. 41.

379 НГАБ. Ф. 299, воп. 7, спр. 2849, арк. 15 адв.

380 БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 102–122. Карэспандэнцыя Чэслава Янкоўскага, k.1.

381 R. Aftanazy, *Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej.* Wydanie 2. Tom 2, s. 122.

Парэцкага парку. Для птушак былі збудаваны адмысловыя «хаткі». На востраве, які знаходзіўся ў месцы ўпадзення ў Ясельду яе прытока Ясеня, знаходзіўся вялікі сад.

Найбольш грунтоўнае апісанне парка ў Парэччы належыць беларускаму даследчыку Анатолю Федаруку[382]. Ён лічыў яго кампазіцыйным цэнтрам паляну з двума валунамі ў атачэнні старых дубоў, якія налічвалі некалькі соцень гадоў. Адсюль у розныя бакі разыходзіліся пяць вузкіх прыўзнятых сцежак, пасыпаных рачным пяском і з адмысловымі паглыбленнямі дзеля стоку вады. У глыбіні парку знаходзілася высокая альтанка ў тры яруса з пляцоўкай для агляду, на якую ўздымаліся па вінтавой лесвіцы.

Большасць сцяжынак вяла да лясной часткі парку, дзе працякала Ясельда. Тут адкрываўся прыгожы пейзаж з маляўнічай поймай ракі, астравамі, каналам з двума рукавамі, водны рэжым у якіх забяспечвала адмысловая сістэма рэгулявання ўзроўню вады. Важнае дэкаратыўнае значэнне мелі экзоты ў выглядзе адзінкавых дрэў або груп дрэў, асноўныя з якіх пералічыў яшчэ Афтаназы.

Дарогу да вінакурнага завода ўпрыгожвалі цюліпанавыя дрэвы, прадстаўнікі рэліктавай флоры даледавіковага перыяду сямейства магноліевых. Перад заводам раслі арэхі шэры і бразільскі. У заходняй частцы парку былі высаджаны экзоты з субтрапічных лясоў Каўказа, Усходняй Турцыі і Ірана. Унікальны балотны кіпарыс, радзімай якога лічацца субтрапічныя балоты Фларыды, дажыў да нашых дзён. Ягоная вышыня сёння складае каля 10 м.

Прафесар Федарук у розных частках парка заўважыў піхту бальзамічную, белую і сібірскую, сасну еўрапейскую і сібірскую, яліну канадскую, яліну Энгельмана, яліну веймутаву, лістоўніцу еўрапейскую, лістоўніцу Кемпфера, бук лясны, клён востралісты ды інш. Беларускі даследчык налічыў каля 30 назваў інтрадуцэнтаў. Парк разам з садам даглядаў Рыгор Клімовіч, а ягоным памочнікам быў Фёдар Лукашык. Парк быў важнай часткай маёнтка таксама ў міжваенны час, пра што гаворка наперадзе…

На пачатку XX ст. распачалося супрацоўніцтва Рамана Скірмунта з польскім тыднёвікам «Край», які выдаваўся ў Пецярбурзе. У адрозненне ад Беларусі і Літвы ў сталіцы імперыі польская мова не была забаронена. Напрыканцы 1904 г. на старонках газеты неаднаразова з'яўлялася інфармацыя за подпісам *Romunt*. Гэты псеўданім Раман Скірмунт выкарыстоўваў таксама ў форме *Ro…munt*.

Romunt інфармаваў чытачоў газеты пра ход мабілізацыі рэзервістаў у расійскае войска падчас вайны з Японіяй, а таксама засяроджваў увагу на ролі земстваў у развіцці асветы, аказанні лекарскай дапамогі, рамонце і будаўніцтве дарог і сродкаў сувязі. Як вядома, у красавіку 1903 г. у Менскай, Віцебскай і Магілёўскай губ. былі ўведзены губернскія земскія ўстановы, сябры якіх прызначаліся адміністрацыяй.

---

[382] А. Федарук, *Старинные усадьбы Берестейщины*, с. 499–500.

Паводле Рамана Скірмунта, нават абмежаваны ў паўнамоцтвах і цалкам пазбаўлены выбараў гэты «земскі дадатак» да адміністрацыі ў Менскай губ. паспрыяў паляпшэнню ўмоў жыцця насельніцтва. Скірмунт падкрэсліваў важнасць прызначэння на пасады земскіх начальнікаў аўтарытэтных мясцовых «кадраў» (меліся на ўвазе мясцовыя польскія зямяне), якія выдатна арыентаваліся ў праблемах Краю. Але якраз з гэтым была праблема, бо доступ палякаў на кіруючыя пасады быў забаронены пасля паўстання 1863 г. *Romunt* выказваў асцярожнае спадзяванне, што ў Менскай губ., а ў будучыні ў Ковенскай, Віленскай і Гарадзенскай губ., зямяне складуць значны адсотак усіх земскіх начальнікаў[383].

У гэты ж час распачалася актыўная грамадская дзейнасць Рамана Скірмунта. У 1902 г. ён належаў да ганаровых сяброў нядаўна заснаванага Пінскага рымска-каталіцкага дабрачыннага таварыства. Цалкам магчыма, што гэтае Таварыства ў 1902 г. толькі легалізавала сваю дзейнасць, бо ягоны першы Статут быў распрацаваны яшчэ ў 1897 г. Старшынём праўлення Таварыства быў А. Твардоўскі, а ягоным намеснікам старэйшы брат Рамана Аляксандр Скірмунт. Дарэчы, з 57 сяброў Таварыства 12 належалі да роду Скірмунтаў. У 1903 г. ужо Раман Скірмунт узначаліў Таварыства і кіраваў дабрачыннай дзейнасцю ва ўсім павеце. Пасаду скарбніка займала Канстанцыя Скірмунт.

Вялікай увагі заслугоўвае ўдзел Рамана Скірмунта ў працы Менскага таварыства сельскай гаспадаркі (МТСГ), бо ягоная грамадская актыўнасць на доўгія гады была звязана менавіта з ім. Ён з вялікай павагай ставіўся да неадменнага кіраўніка МТСГ Эдварда Вайніловіча, які нароўні з бацькам стаў для Рамана Скірмунта ўзорам адносін да Беларуска-Літоўскага краю і ўсведамлення абавязкаў «літоўскага шляхціча». З часам іх пачалі звязваць сяброўскія стасункі.

Менскае таварыства сельскай гаспадаркі было заснавана ў 1876 г. па ініцыятыве тагачаснага міністра ўнутраных спраў Льва Макава, які набыў маёнткі Блонь і Навасёлкі ў Ігуменскім пав. Галоўнай задачай МТСГ была падтрымка рускага землеўладання на Меншчыне. Яго ўзначаліў губернскі маршалак В. Паўлаў, а сябрамі сталі пераважна чыноўнікі губернскай канцылярыі. Адно з палажэнняў Статута сцвярджала, што сябрамі Таварыства могуць быць толькі «асобы рускага паходжання». Аднак дыскрымінацыя мясцовых землеўладальнікаў не спрыяла эфектыўнасці Таварыства. Праяўленне гаспадарчай або прадпрымальніцкай ініцыятывы было рэдкасцю на яго сходах, а цікавасць да сельскай гаспадаркі пераважна абмяжоўвалася ўрачыстым унясеннем у залу на пачатку кожнага пасяджэння драўлянай сахі.

У 1878 г. Паўлаў быў вымушаны прыцягнуць да працы МТСГ літоўскіх палякаў. Запрашэнні да сяброўства ў арганізацыі атрымалі былы губернскі маршалак Леан Ваньковіч, а таксама Аляксандр Скірмунт, Эдвард Вайніловіч, Віктар Сьвіда і Зыгмунт Свянціцкі. Але гэта быў толькі пачатак. Як пісаў ва ўспамінах

[383] «Kraj». 1904. Nr 51.

Вайніловіч, «мундзіры» на пасяджэннях Таварыства саступілі месца «сапраўдным гаспадарам»[384]. У канцы 1878 г. колькасць сяброў МТСГ дасягнула 64 чалавек. Большасць з іх належалі да мясцовай польскай грамадскасці.

Уваходжанне зямян Меншчыны ў Таварыства паспрыяла актывізацыі ягонай працы. Прычым гэта датычыла не толькі гаспадарчых спраў. Хутка праявіліся тэндэнцыі да аднаўлення публічнай грамадскай дзейнасці літоўскіх палякаў. Так, на пачатку 1880-х гг. МТСГ прыняло актыўны ўдзел у спробе палітычнага рэфармавання Расіі. Ягоныя прадстаўнікі ўдзельнічалі ў г. зв. «акруговых з'ездах», ідэя якіх належала міністру ўнутраных спраў Міхаілу Лорыс-Мелікаву. Міністр паспрабаваў прыцягнуць да абмеркавання дзяржаўных праблем земскіх дзеячаў, а ад беларускіх і літоўскіх земляў – землеўласнікаў. Акруговыя з'езды павінны былі абраць дэпутатаў на Усерасійскі з'езд, які многія лічылі пачаткам расійскага парламента.

МТСГ накіравала на з'езд у Смаленск Э. Вайніловіча і В. Сьвіду. Першы нават трапіў у лік «запасных» кандыдатаў на ўдзел ва Усерасійскім з'ездзе[385]. Аднак бомба нарадавольца Ігната Грынявіцкага, якая 1 сакавіка 1881 г. абарвала жыццё імператара Аляксандра II, перакрэсліла праекты ліберальных пераўтварэнняў.

Таварыства спрабавала гаспадарчай актыўнасцю кампенсаваць адсутнасць палітычных правоў. Са з'езда ў Смаленску Вайніловіч прывёз узор статута Крэдытна-ашчаднага таварыства і дазвол на яго адкрыццё ў Клецку. Таварыства займалася крэдытаваннем землеўласнікаў і сялян. У асобныя гады ягоны капітал дасягаў 800 тыс. руб.[386].

У 1883 г. МТСГ арганізавала ў Менску сельскагаспадарчую выставу. Яе поспех спрычыніўся да значнага росту колькасці сяброў Таварыства. У 1884 г. па рэкамендацыі Аляксандра Скірмунта ў шэрагі Таварыства быў прыняты ягоны старэйшы сын Аляксандр[387]. Менавіта ў гэты час «асобы рускага паходжання» канчаткова адышлі на другі план[388].

Беларускі гісторык і палітык Аляксандр Цвікевіч на пачатку 1920-х гг. адзначаў, маючы на ўвазе губернскія сельскагаспадарчыя таварыствы: «Дарэмна расійская адміністрацыя пільна сачыла за тым, каб у «Пазямельных Таварыствах» ня зьвівала сабе гнязда ненавісная ёй «пальшчызна», яны ўсё-такі былі падобнымі «гнёздамі»»[389]. Ацэнка беларускага дзеяча падаецца перабольшанай. Польскасць

---

[384] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza*, s. 40.

[385] А. Смалянчук, *Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905–1907 гг.* Гародня 2000, с. 54.

[386] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia 1847–1928. Część pierwsza*, s. 48.

[387] *Отчет о деятельности Минского общества сельского хозяйства за 1914 г.* Минск 1915, с. XXVI.

[388] J. Lutosławski, *Edward Woyniłłowicz (Kartki z dziejow Kresow Wschodnich)*. Warszawa 1928, s 8.

[389] А. Цьвікевіч, *«Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.* Менск 1993, с. 266.

Таварыства доўгі час праяўлялася толькі ў тым, што яго паспяховая дзейнасць паляпшала эканамічнае становішча беларускіх і літоўскіх палякаў.

Менавіта ў гэтым, паводле Рамана Скірмунта, праяўлялася «польская праграма» Вайніловіча[390], які, насамрэч, адыграў важную ролю ў актывізацыі польскага руху на беларускіх землях. У 1888 г. Вайніловіч быў абраны віцэ-старшынём МТСГ і стаў ягоным фактычным кіраўніком, бо пасада старшыні, якая прызначалася губернатару, мела выключна ганаровы характар.

Сфера гаспадарчай дзейнасці МТСГ у 1880–1890-я гг. пастаянна пашыралася. У 1885 г. была заснавана Секцыя вінакурэння, якая ў 1894 г. ператварылася ў Менскае таварыства вінакурэння з капіталам у 100 тыс. руб.[391] У 1894 г. узнікла Лясная секцыя, галоўнай задачай якой было супрацьдзеянне масавай вырубцы лясоў з мэтаю продажу драўніны. У наступным годзе была створана Агранамічная секцыя, якая ў 1901 г. складалася з 70 сяброў (!) Таксама дзейнічалі секцыі жывёлагадоўлі і конегадоўлі. У 1896 г. быў нават арганізаваны Гандлёвы аддзел МТСГ, які прыносіў вялізарныя прыбыткі. Расла колькасць сяброў Таварыства. Калі ў 1888 г. іх было 209, то ў 1894 г. – 448, а ў 1901 г. – 701[392]. Паводле статута 1897 г., для ўступлення ў МТСГ было дастаткова заплаціць 10 руб. гадавых складак і мець вусныя рэкамендацыі трох сяброў Таварыства. Раман Скірмунт стаў сябрам Таварыства ў 1900 г. Разам з ім быў прыняты стрыечны брат Канстанцін з Моладава[393].

Адметнай падзеяй у гісторыі МТСГ стала арганізацыя напрыканцы лета 1901 г. вялікай сельскагаспадарчай выставы, прысвечанай 25-годдзю Таварыства. Менск упершыню прымаў выставу падобнага маштабу. Былі высланы больш за 3,5 тыс. запрашэнняў, прыехалі карэспандэнты ўсіх значных польскіх выданняў не толькі з Расіі, але таксама з Германіі і Аўстра-Венгрыі. Вялікую цікавасць выклікалі прэзентацыі экспанатаў у 12 павільёнах. Дарэчы, у павільёне прамысловых вырабаў дэманстравалася сукно Парэцкай фабрыкі Скірмунтаў, якое, як ужо адзначалася, па выніках выставы было ўзнагароджана залатым медалём. Адначасна ў Менску адбываліся шматлікія балы, рауты і тэатральныя пастаноўкі. На ўрачыстых пасяджэннях прысутнічалі прадстаўнікі ўлады як з Менску, так і з Пецярбургу.

Але першым узяў слова Эдвард Вайніловіч. Пасля традыцыйных і непазбежных рэверансаў у бок улады, ён прыгадаў, што дзейнасць Таварыства актывізавалася толькі пасля таго, як да яго далучыліся мясцовыя землеўласнікі. Паводле кіраўніка МТСГ, гэтыя людзі «адклалі ў бок усялякае палітыканства і пачалі араць родную зямлю, знаходзячы там скарбы, схаваныя мінулымі пакаленнямі. Бог блаславіў нашую шляхетную працу. Зерні дабра і працы, кінутыя ў зямлю

---

[390] J. Lutosławski, *Edward Woyniłłowicz (Kartki z dziejow Kresow Wschodnich)*,s. 28.

[391] R. Jurkowski, *Ziemiaństwo polskie Kresow Połnocno-Wschodnich. 1864–1904. Działalnosc społeczno-gospodarcza*. Warszawa 2001, s. 191.

[392] R. Jurkowski, *Ziemianstwo polskie Kresow Połnocno-Wschodnich. 1864–1904…*, s. 183.

[393] *Отчет о деятельности Минского общества сельского хозяйства за 1914 г.*, с. XXVI.

нашымі продкамі, узышлі і далі цудоўны плён – дабрабыт і шчасце».

Эдвард Вайніловіч.

Падсумоўваючы вынікі 25-гадовай дзейнасці Таварыства, Э. Вайніловіч адзначыў: «Сёння ўсё здаецца простым і ясным. Але, насамрэч, няпроста было дасягнуць такога выніку. Поспех стаў магчымым, бо, па-першае, Таварыства аніводнага разу не выйшла па-за межы свайго статута і не ставіла ніякіх іншых задач; па-другое, займалася праблемамі, якія не пераўзыходзілі яго магчымасці; па-трэцяе, канцэнтравала ўласныя намаганні і стала на шлях пэўнай дэцэнтралізацыі толькі пасля таго, як умацавалася; па-чацвёртае, заўсёды і ва ўсіх абставінах лічыла сябе прадстаўніком землеўласнікаў Заходняга краю і імкнулася не страціць гонар і годнасць гэтага саслоўя. [...] Мы моцныя нашай праватой, ганарымся нашай мінуўшчынай. Таварыства сельскай гаспадаркі стала для нас школай падрыхтоўкі да грамадскага жыцця»[394].

Выстава яскрава дэманстравала моц гаспадарчых пазіцый эліты літоўскіх і беларускіх палякаў, але таксама яна стала нагодай, каб пазнаёміць расійскія ўлады з актуальнымі праблемамі сельскай гаспадаркі Меншчыны і ўсёй Беларусі, прынамсі, з той іх часткай, якая здавалася найбольш важнай арганізатарам выставы.

Мечыслаў Ялавецкі згадваў, якое моцнае ўражанне зрабіла выстава на ягоных бацькоў. Яны ўспрынялі яе як адзін з «доказаў жыццяздольнасці і ўплываў польскіх зямян на нашых крэсах»[395]. Падобнае пачуццё меў таксама Канстанцін Скірмунт. Пазней ён згадваў уражанне ад прамовы Э. Вайніловіча на пашыраным сходзе МТСГ 28 жніўня 1901 г.: «...тое, што казаў Вайніловіч было сапраўдным гімнам працы польскіх зямян. У яго словах не было хвальбы, а было канкрэтнае і праўдзівае падсумаванне вынікаў шматгадовай працы нашых землеўласнікаў»[396]. І гэта пры тым, што Эдвард Вайніловіч ва ўсіх прамовах старанна падкрэсліваў апалітычнасць Таварыства, ягоную засяроджанасць на праблемах сельскай гаспадаркі.

Раман Скірмунт у каментарах да ўспамінаў Вайніловіча (1931) таксама прыгад-

---

[394] «Kraj». 1901, Nr 35

[395] BN. Dział mikroform. Sygn. III.10592/cz, j. 1–5. M. Jałowiecki, *Wspomnienia*, k. 15.

[396] K. Skirmunt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*, s. 25–26.

ваў уласнае ўражанне ад менскай выставы, якая выдатна дэманстравала магчымыя накірункі дзейнасці ва ўмовах палітычнага бяспраўя[397].

Не менш чым выстава, многіх уразіла постаць Эдварда Вайніловіча, ягоная ўпэўненасць і шчырасць. Было відавочна, што ён казаў тое, што думаў. Раман Скірмунт лічыў гэта важнай рысай ягонага характару і сцвярджаў, што Вайніловіч не мог быць Конрадам Валенродам. У каментарах Скірмунт таксама прыгадаў выступ Вайніловіча на адкрыцці выставы Віцебскага таварыства сельскай гаспадаркі ў Дзвінску ў 1902 г., у якім прамоўца даволі крытычна выказаўся пра расійскую палітыку ў «польскім пытанні», пра палітычны пераслед польскай супольнасці, а закончыў сцвярджэннем, што самае цяжкае палякі ўжо перажылі, і цяпер перад імі адкрываюцца значна лепшыя перспектывы: «Казаў як гетман, які ведае шляхі і мэты... »[398]

Відавочна, што ў пэўны момант Эдвард Вайніловіч стаў для Рамана Скірмунта надзвычай важнай постаццю. У згаданых каментарах да выдання ўспамінаў Вайніловіча (1931) ён наступным чынам характарызаваў чалавека, які з настаўніка паступова ператварыўся ў сябра: «Любоў да роднага гнязда ў пэўнай ступені пераносіў на павет, які яго атачаў, з павета гэтае пачуццё пашыралася на ўсю Менскую зямлю, а адтуль – на ўсю супольную Айчыну. Лёс вызначыў для яго пост як найдалей высунуты на ўсход. Абараняючы яго, лічыў сваім першым абавязкам, паводле традыцыі, умацаванне сувязі з захадам Літвы – Белай Руссю. У тых справах не любіў слухаць указанняў з-над Віслы. [...] Ягоны лакальны патрыятызм быў моцны, без пазначэння гэтай рысы яго вобраз няпоўны. Гэта нагадвала замілаванне шатландцаў да сваёй малой радзімы. Шатландзец таксама з'яўляецца добрым брытанцам, як радавіты англічанін, і таксама робіць вялікі ўнёсак у нацыянальную скарбніцу. Мудры англічанін не злуецца на лакальны патрыятызм шатландца і не патрабуе, каб той адмовіўся ад уласнай крыві і паходжання. Гэтыя тэрытарыяльныя адрозненні не перашкаджаюць нацыянальнай еднасці.

Вайніловіч, у сваіх пачуццях паляк да мозгу касцей, адчуваў еднасць з мясцовым беларускім людам, жадаў, каб той прайшоў тую ж эвалюцыю, якую прайшлі яго ўласныя продкі. Ён не збіраўся адмаўляцца ад уласнай адметнасці інтэлекту і характару. Не госць, а свой чалавек сярод сваіх – менавіта такім ён хацеў быць на ўласнай зямлі. Моцнае пачуццё прывязанасці да краю, як ніякое іншае, умацоўвала ўплывы нацыянальнай культуры на далёкіх рубяжах і забяспечвала яе пазіцыі ў шырокіх межах. Якраз яно было злучальным звяном паміж Крэсамі і цэнтрам, якога ні час, ні полымя, ні іржа не здолелі знішчыць. Якраз яно было тым ідэалам актыўнай працы, якую ён павінен быў выканаць у жыцці»[399].

---

[397] R. Skirmuntt, *Edward Woyniłłowicz. Wspomnienia 1847–1928 r. Wyd. 1931 r.*, «Słowo». 1932, Nr 3.

[398] Ibidem.

[399] R. Skirmuntt, *Edward Woyniłłowicz. Wspomnienia 1847–1928 r. Wyd. 1931 r.*, «Słowo». 1932, Nr 2.

Чытаючы ўсё гэта, міжволі думаеш, што Раман Скірмунт, згадваючы Эдварда Вайніловіча, насамрэч, пісаў свой уласны партрэт. Пры гэтым пераканаць, што ў тэксце 1932 г. Скірмунт усё ж перабольшваў польскасць Эдварда Вайніловіча, магчыма, каб падкрэсліць польскі характар уласнай грамадска-палітычнай працы.

На пачатку XX ст. для маладога грамадскага дзеяча кіраўнік МТСГ быў узорам паводзін, які дэманстраваў шляхі выхаду па-за межы «палескага фармату». Пэўнае збліжэнне Эдварда Вайніловіча і Рамана Скірмунта адбылося ўжо пасля абрання апошняга ў шэрагі Рады МТСГ (1903). У адрозненне ад агульных сходаў Таварыства, што звычайна праводзіліся двойчы на год, сябры Рады сустракаліся значна часцей. Фактычна Рада была пастаянна працуючым органам Таварыства.

Як ужо адзначалася, сябрам МТСГ Раман Скірмунт стаў у 1900 г., і гэтае сяброўства было звязана з дзейнасцю адмысловай камісіі Таварыства па праблемах Палесся, якая была створана ў тым самым годзе. Менавіта яна стала падмуркам арганізацыі Аддзялення па распрацоўцы сельскагаспадарчых і эканамічных патрэб Палесся пры Менскім таварыстве сельскай гаспадаркі (1901). Паводле статута Пінскі аддзел павінен быў арганізаваць землеўпарадкаванне Пінскага, Мазырскага і Рэчыцкага пав. дзеля правядзення меліярацыі і ўпарадкавання «эксплуатацыі лясоў». Першым ягоным старшынём быў князь Геранім Друцкі-Любецкі (1901–1905), якога замяніў Раман Скірмунт (1906–1910)[400].

Пры непасрэдным удзеле апошняга распрацоўвалася адмысловая праграма дзейнасці Пінскага аддзела – *Программа занятий Отделения по разработке сельскохозяйственных и экономических вопросов Минского Полесья при Минском обществе сельского хозяйства* (Минск, 1901)[401]. Пры гэтым Раман Скірмунт займаўся і канкрэтнай арганізацыйнай працай. Так, ён меў непасрэднае дачыненне да арганізацыі ў 1902 г. выставы «жывога інвентара» ў Давыд-Гарадку[402].

Раман Скірмунт таксама ўдзельнічаў у працы Палескай камісіі МТСГ па падрыхтоўцы статута Палескага таварыства ўзаемнага крэдыту. У снежні 1900 г. на агульным сходзе Менскага таварыства старшыня Камісіі князь Г. Друцкі-Любецкі паведаміў пра заканчэнне працы па падрыхтоўцы статута[403]. А праз некалькі дзён Палеская камісія з дазволу «головы» Пінска Л. Брыянэ дэ Ласі правяла ўласны сход у будынку гарадской ратушы. У адсутнасць князя Друцкага-Любецкага працай сходу кіраваў Раман Скірмунт.

---

400 R. Jurkowski, *Ziemianstwo polskie Kresow Połnocno-Wschodnich. 1864–1904*..., s. 209.

401 А. Киштымов, *Экономический потенциал Полесья в начале XX в.* (у:) *Загароддзе-3*. Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе ў XX стагоддзі». 1–4 чэрвеня 2000 г., Беласток-Мінск 2001.

402 A. Kieniewicz, *Nad Prypiecią, dawno temu... Wspomnienia zamierzchłej przeszłosci*. Przygotował do druku St. Kieniewicz. Wrocław 1989, s. 66–67.

403 «Kraj». 1901, Nr 1.

У цэнтры ўвагі апынулася праблема асушэння забалочаных земляў. Справа ў тым, што з 1873 г. у Заходнім Палессі ажыццяўлялася шырокамаштабная меліярацыя. Афіцыйна яна называлася «Заходняй экспедыцыяй па асушэнню балот», якой кіраваў генерал Іосіф Жылінскі, аўтар плана меліярацыі. Як сцвярджаў сам генерал, у 1897 г. было асушана 450 тыс. дзес. балот. Адначасна праводзіліся эксперыменты па вырошчванні на асушаных землях яравых і азімых культур, па пасадцы лесу. Аднак на рубяжы стагоддзяў асігнаванні на меліярацыю Палесся значна скараціліся. «Экспедыцыя» фактычна прыпыніла сваю дзейнасць у 1898 г., а ў 1902 г. яе дзейнасць наогул была спынена[404].

Палеская камісія МТСГ шукала магчымасці працягнуць меліярацыю, выкарыстоўваючы крэдыты. З рэфератамі выступілі сябра Камісіі Казімір Шчыт і інжынер «Заходняй экспедыцыі» Піятроўскі. У выніку вырашылі стварыць адмысловую аналітычную камісію. У яе склад быў абраны Раман Скірмунт, які якраз у гэты час распачынаў працы па асушэнні берага Ясельды на тэрыторыі Парэчча[405].

Статут Палескага таварыства ўзаемнага крэдыту быў зацверджаны на агульным сходзе МТСГ у пачатку сакавіка 1901 г. На гэтым сходзе Друцкі-Любецкі падрабязна распавёў пра дзейнасць Палескай камісіі, якая складалася з 60 сяброў. Аднак галоўную ролю ў распрацоўцы статута Таварыства ўзаемнага крэдыту адыграў ужо згаданы К. Шчыт, якому дапамагаў Канстанцін Скірмунт, адзін з найбольш актыўных сяброў створанага ў лютым 1901 г. Гарадзенскага таварыства сельскай гаспадаркі[406].

Асаблівай увагі заслугоўвае «сялянская палітыка» Пінскага аддзелу МТСГ. Справа ў тым, што якраз гэты Аддзел стаў першай арганізацыяй землеўласнікаў Менскай губ., якая пачала прымаць у свае шэрагі сялян. Вырашальную ролю адыграла пазіцыя Аляксандра і Рамана Скірмунтаў, а таксама кіраўніка Аддзела князя Гераніма Друцкага-Любецкага. Вядома, што іх актыўна падтрымаў Э. Вайніловіч. Каб стаць сябрамі арганізацыі сяляне павінны былі мець дзве вусныя рэкамендацыі, а таксама зрабіць гадавы ўнёсак у памеры 2,5 руб. Аднак не ўсе былі гатовыя плаціць такія грошы.

Аддзел правёў цыкл папулярных лекцый для сялян па праблемах арганізацыі гаспадаркі, а ў верасні 1904 г. арганізаваў сялянскую сельскагаспадарчую выставу ў Пінску. Паводле інфармацыі газеты «Край», гэта была першая сялянская выстава ў «Заходнім краі». Карэспандэнт таксама паведаміў, што напрыканцы выставы на мясцовай гаворцы прамаўляў Раман Скірмунт[407].

Гэтыя выставы сталі традыцыйнымі для Піншчыны і карысталіся вялікай па-

---

[404] В. Аношка, *Заходняя экспедыцыя па асушэнню балот Палесся 1873–98* (у:) ЭГБ. 1996. Т. 3, с. 426.

[405] «Kraj». 1901, Nr 4.

[406] Ibidem, Nr 12.

[407] Ibidem. 1904, Nr 39

пулярнасцю сярод сялян, асабліва пасля таго, як арганізатары пачалі праводзіць іх у форме кірмаша, дзе можна было нешта прадаць і набыць, праслухаць карысную лекцыю і ўбачыць новую тэхніку.

Таксама менавіта Пінскі аддзел стаў ініцыятарам стварэння сялянскіх сельскагаспадарчых гурткоў. У 1906 г. іх было ўсяго тры. Вялікай актыўнасці сяляне не праяўлялі, хоць з гатоўнасцю прымалі ўсе формы дапамогі з боку землеўласнікаў. Таксама не назіралася сялянскага наплыву ў шэрагі Пінскага аддзелу, хоць на пачатку 1906 г. сума гадавога ўнёску для сялян была зменшана да 1 руб.

Аўтар даследавання дзейнасці губернскіх таварыстваў сельскай гаспадаркі польскі гісторык Раман Юркоўскі прыйшоў да высновы, што гэтыя гурткі не мелі шансаў: «Бездань, што дзяліла памешчыкаў і сялян, сялянскі недавер да землеўласнікаў, які падтрымлівала ўлада, неадукаванасць сялянскага насельніцтва Беларусі, перакрэслівала тыя нешматлікія, але вартыя ўвагі, спробы памешчыкаў палепшыць стасункі. Напэўна, памешчыкі не шмат сіл і сродкаў прысвяцілі стварэнню сялянскіх сельскагаспадарчых гурткоў, але ж пры гэтым яны, як і сяляне, не маглі пераадолець стэрэатыпы патрыярхальных адносін, паводле якіх «добры пан дае, а прыстойны селянін з пакорай і ўдзячнасцю прымае». Адсутнасць разумення важнасці пабудовы гэтых адносін на глебе матэрыяльнай карысці і не аднаразовай, а пастаяннай [...] прыводзіла да таго, што селянін чакаў рашэння памешчыкаў, быў абыякавым да іх намаганняў, а тыя апускалі рукі пасля першых няўдач»[408].

Што б публічна ні казаў Эдвард Вайніловіч пра дзейнасць МТСГ, але, папраўдзе, значэнне Таварыства і асобы яго кіраўніка выходзіла далёка па-за межы гаспадарчых праблем. Гэта выразна праявілася ўлетку 1904 г., калі міністр унутраных спраў князь Пётр Святаполк-Мірскі запрасіў вядомых землеўласнікаў Віленскай, Ковенскай, Гарадзенскай і Менскай губ. прыняць удзел ва ўрачыстым адкрыцці помніка Кацярыне II у Вільні.

Эліта літоўскіх і беларускіх палякаў апынулася перад даволі складаным выбарам. Удзел ва ўрачыстасцях з нагоды адкрыцця помніка расійскай імператрыцы, што непасрэдна спрычынілася да падзелаў Рэчы Паспалітай, азначаў дэманстратыўны разрыў з ідэаламі польскай дзяржаўнасці і незалежнасці. Усё гэта пагражала кампаніяй шырокага грамадскага асуджэння. Аднак у якасці падзякі фігуравала абяцанне князя хадайнічаць пра адмену ўказа ад 10 снежня 1865 г., які, між іншым, забараняў «асобам польскага паходжання» набываць зямлю ў «Заходнім краі». Адмова ад запрашэння пагражала абвінавачваннем у нелаяльнасці і пэўнымі адміністрацыйнымі наступствамі. Напр., Канстанцін Скірмунт прыгадваў уласную боязь, што ягоная адсутнасць на адкрыцці помніка магла паўплываць на лёс Гарадзенскага таварыства сельскай гаспадаркі[409].

---

[408] R. Jurkowski, *Ziemianstwo polskie Kresow Północno-Wschodnich. 1864–1904*..., s. 214.

[409] K. Skirmunt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*, s. 29.

Аляксандр Хаміньскі ўспамінаў бурлівы характар схода землеўласнікаў Віленшчыны, на якім вырашалася пытанне ўдзелу ў адкрыцці помніка. Большасць выказвалася за неабходнасць удзелу ў цырымоніі. Пры гэтым амаль кожны казаў, што пэўныя абставіны не дазваляюць яму прысутнічаць асабіста. Аднак, як зазначыў А. Хаміньскі, «пачуццё грамадзянскага абавязку» ўсё ж перамагло[410].

Канстанцін Скірмунт у гэты час знаходзіўся ў Італіі, дзе атрымаў ліст ад бацькі, які паведамляў, што іх абодвух запрасілі ў Вільню. Потым прыйшла тэлеграма з Моладава, у якой бацька настойваў на вяртанні сына. Разам з ёй даставілі ліст ад віцэ-старшыні Віленскага таварыства сельскай гаспадаркі, які таксама прасіў вярнуцца і быць у Вільні. Канстанцін Скірмунт тэрмінова прыехаў у Вільню, дзе на вакзале сустрэў свайго бацьку. У дзень адкрыцця помніка ў газетах з'явілася інфармацыя пра наданне шасці прадстаўнікам польскіх землеўласнікаў прыдворных тытулаў. Канстанцін Скірмунт атрымаў тытул камер-юнкера[411]. 10 верасня 1904 г. у Вільні на цырымоніі адкрыцця помніка Кацярыне II прысутнічалі многія вядомыя ў Краі землеўласнікі Віленскай, Ковенскай і Гарадзенскай губ.

А вось з Менскай губ. не было нікога. Справа ў тым, што Эдвард Вайніловіч склікаў таемны сход найбольш уплывовых сяброў Менскага таварыства ў кватэры сваёй сястры Ядвігі Кастравіцкай у Менску. Першым моцны і аргументаваны пратэст супраць удзелу ў адкрыцці помніка выказаў Аляксандр Скірмунт з Парэчча. Эдвард Вайніловіч яго падтрымаў, і справа была вырашана без галасавання[412]. У Менску не сталі гандляваць ідэаламі і гонарам. Для Скірмунта і Вайніловіча гэта было недапушчальна, а польская супольнасць Меншчыны не магла супрацьстаяць іх аўтарытэту.

Гэтыя падзеі яшчэ раз выявілі тую вялікую дыстанцыю, што дзяліла ўладальнікаў Моладава і Парэчча. Згадваючы пра пашыранае сярод шляхты асуджэнне парэцкіх Скірмунтаў за «спекуляцыю», трэба прызнаць, што сапраўднымі «спекулянтамі» аказаліся іх сваякі з Моладава.

Кампанія асуджэння не прымусіла сябе доўга чакаць. Асабліва рэзка асудзіла гэты ўчынак грамадскасць Каралеўства Польскага. Нават нарадзіўся тэрмін «катараняжы» як сінонім слова здраднікі.

Дамінуючым матывам гэтага вельмі непапулярнага кроку было імкненне дабіцца адмены «мураўёўскага» заканадаўства. Аднак надзеі на ўступкі расійскага ўрада спраўдзіліся толькі часткова. Паводле польскага даследчыка Лешака Яськевіча, менавіта акты «згодніцтва», у т. л. прысутнасць на віленскай цырымоніі, а таксама неаднаразовыя звароты да ўладаў спрычыніліся да з'яўлення Указа ад 12 снежня 1904 г., які наносіў моцны ўдар па «мураўёўскім» заканадаўстве. На думку даслед-

---

[410] BN. Dział mikroform. Akc. 9736/3. L. Chominski, *Pamiętniki*. T. 1, k. 153.

[411] K. Skirmunt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*, s. 30.

[412] R. Skirmuntt, *Edward Woyniłłowicz. Wspomnienia 1847–1928 r. Wyd. 1931 r.*, «Słowo». 1932, Nr 3.

чыка, мемарандумы польскіх «згоднікаў» цалкам адпавядалі ўяўленням расійскай апазіцыі пра мадэрнізацыю дзяржаўнага ладу[413].

Адным з «катараняжаў» быў Канстанцін Скірмунт з Моладава, які да таго ж не адмовіўся ад тытула камер-юнкера. Надзвычай вострая крытыка на старонках польскага друку, дзе асабліва рэзка выказваліся прадстаўнікі Партыі нацыянальных дэмакратаў, прымусіла яго да пэўнага акту публічнага пакаяння.

Канстанцін Скірмунт прыехаў у Гародню да сваячкі Элізы Ажэшкі і ў яе салоне «пакаяўся» перад мясцовай польскай грамадскасцю. Ён распавёў пра матывы свайго прыезду ў Вільню і прызнаў уласную «памылку»[414]. Пісьменніца ў адказ запатрабавала ад яго на некалькі гадоў цалкам адмовіцца ад грамадскай дзейнасці і ўсялякай публічнасці. Канстанцін Скірмунт пагадзіўся. Ён адмовіўся ад кіравання Гарадзенскім таварыствам сельскай гаспадаркі. Аднак ужо ў 1906 г. прыняў удзел у выбарах у I і II Дзяржаўныя Думы. Праўда, ягоная кандыдатура не была падтрымана на павятовым выбарчым сходзе ў Кобрыне. Але гэтая няўдача была часовай…

Раман Скірмунт, як і яго стрыечны брат з Моладава, даволі позна далучыўся да публічнай грамадскай дзейнасці. Доўгі час ён займаўся амаль выключна гаспадаркай маёнтка, але паступова рамкі Парэчча і Піншчыны перасталі яго задавальняць. Ён нібыта прадчуваў блізкасць перамен, якія праз некалькі гадоў ператвораць імперыю ў амаль што канстытуцыйную дзяржаву. Для Рамана Аляксандравіча прыклад бацькі з ягонай адданасцю «працы на ўласным загоне» заўсёды будзе галоўным арыенцірам. Вось толькі для сына гэтым «загонам» хутка стане ўвесь Беларуска-Літоўскі край.

---

[413] L. Jaskiewicz, *Carat i kwestja Polska na początku XX w.*, «Przegląd Historyczny». 1995. Tom LXXXVI, zeszyt 1, s. 38.

[414] M. Nowak-Kiełbikowa, *Konstanty Skirmunt. Polityk i dyplomata*, s. 24–26.

ГРАМАДЗЯНІН КРАЮ

Тэрмін «грамадзянін Краю» непарыўна звязаны з ужо згаданым феноменам ідэалогіі краёвасці, паводле якой галоўным крытэрыем нацыянальнай прыналежнасці з'яўлялася пачуццё агульнакраёвага патрыятызму[415]. Адпаведна, краёвасць звычайна тлумачыцца як варыянт ідэалогіі нацыі палітычнага тыпу. Гэтая ідэйная плынь нарадзілася ў асяродку шляхты гістарычнай Літвы. Яе ідэолагі належалі да супольнасці літоўскіх і беларускіх палякаў, якія выступалі як захавальнікі памяці пра палітычныя, канфесійныя і этнакультурныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. Прыгадваючы адзінства гістарычнага лёсу народаў былога княства, краёўцы імкнуліся захаваць тэрытарыяльную цэласнасць усяго Беларуска-Літоўскага краю.

Галоўнай мэтай краёвасці з'яўлялася прымірэнне інтарэсаў асобных мясцовых нацый з іх агульным інтарэсам, пад якім разумелася дабро супольнай Айчыны – гістарычнай Літвы. Апошняе патрабавала супрацы розных нацый на падмурку палітычнай ці грамадзянскай роўнасці. Прычым, як справядліва заўважыў Ян Юркевіч, гэтая супраца была не толькі шляхам да супольнай мэты, але таксама мэтаю самою па сабе[416]. Прыхільнікі краёвасці спадзяваліся, што краёвую ідэю атрымаецца сумясціць з мадэрновай нацыянальнай свядомасцю.

Магчыма, пашырэнню краёвасці паспрыяла г. зв. «тутэйшасць» мясцовага люду. Даследчыкі часта трактуюць яе як ніжэйшую ступень этнічнай самаідэнтыфікацыі, аднак такі погляд з'яўляецца павярхоўным. Невыпадкова, як ужо адзначалася, Канстанцыя Скірмунт па пачатку XX ст. абараняла паняцце «тутэйшасці» ад насмешак польскіх нацыянальных дэмакратаў[417]. Пра «тутэйшасць» пісаў і Юліуш Бардах: «У вёсцы, перш за ўсё беларускай, там, дзе сустракаліся розныя мовы, веравызнанні, уплывы розных культур, «тутэйшасць» азначала форму адмовы ад пэўнага выбару, нежаданне прызнаць сваю прыналежнасць да таго або іншага этнасу. Была боязь, што такі выбар можа парушыць традыцыйныя формы сумеснага жыцця і прывесці

---

[415] Больш падрабязна пра феномен краёвасці гл.: А. Смалянчук, *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-люты 1917.* Санкт-Петербург 2004; ён жа, «*Краевая ідэя*» *ў беларускай гісторыі*. Мінск 2017 ды інш.

[416] J. Jurkiewicz, *Koncepcja krajowa a przemiany stosunków narodowosciowych na Litwie i Białorusi w początkach XX w. (do 1918 r.)* (у:) *Krajowosc – tradycje zgody narodow w dobie nacjonalizmu...*, s. 119.

[417] Futurus [Skirmuntt Konstancja], *Nasza «tutejszosc»*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 214, 22 wrzesnia (1 pazdziernika).

Карта губерній Беларуска-Літоўскага краю (Бенэдыкт Хэртц).

да канфліктаў»[418]. І сапраўды, «тутэйшасць» у пэўным сэнсе была краёвасцю «маўклівай большасці» (Арон Гурэвіч) жыхароў Беларуска-Літоўскага краю. Даследчык Алег Латышонак трапна назваў краёвасць «ідэалагізаванай тутэйшасцю». На яго думку, «тутэйшасць» можна лічыць свядомасцю, а краёвасць – светапоглядам[419].

Да ідэалагізацыі «тутэйшасці» спрычынілася актывізацыя нацыянальных працэсаў. Менавіта выбух нацыяналізму ў Беларуска-Літоўскім краі нарадзіў краёвую ідэю. На рубяжы XIX–XX ст. найбольш моцным быў літоўскі рух. Ён прапанаваў мадэрновае разуменне нацыі, ключавымі элементамі якога станавіліся мова, традыцыйная народная культура і гістарычная памяць. У мінулым засталося разуменне нацыі як палітычнай катэгорыі, што яднала прадстаўнікоў вышэйшых станаў. Найважнейшую ролю для свядомасці адыгрывала тоеснасць не гістарычна-палітычнай, а этнакультурнай (этналінгвістычнай) супольнасці. Менавіта літоўскі нацыянальны рух на пачатку XX ст. першым сфармуляваў задачу этнапалітычнага падзелу гістарычнай Літвы і Польшчы.

Польскі даследчык Збігнеў Соляк, аналізуючы біяграфію галоўнага ідэолага ліберальна-дэмакратычнага варыянта краёвай ідэі Міхала Ромэра, звярнуў увагу на ягоныя кантакты з літоўскімі нацыянальнымі арганізацыямі. Яшчэ ў гады вучобы ў Парыжы на пачатку XX ст. Ромэр наведваў пасяджэнні літоўскага тавары-

[418] J. Bardach, *Polacy litewscy a inne narody Litwy historycznej. Proba analizy systemowej* (y:) *Belarus, Lithuania, Poland, Ukraine. The foundations of historical and cultural traditions in East Central Europe*. Internacional Conference Rome, 28 April–6 May. Lublin-Rome 1990, s. 366.

[419] O. Łatyszonek, *Krajowość i «zapadno-russizm». Tutejszosć zideologizowana* (y:) *Krajowość – tradycje zgody narodów w dobie nacjonalizmu...*, s. 35.

ства «Želmuo», а пазней – аб'яднання літоўскіх студэнтаў «Lithuania», заснаванага Ёзасам Пятрулісам (1877–1958)[420].

Літоўскі рух, безумоўна, паўплываў таксама на пазіцыю прадстаўнікоў кансерватыўнай плыні краёвасці. Гаворка пра Рамана Скірмунта, першая кніга якога была інспіраваная якраз літоўскім нацыяналізмам, і пра Канстанцыю Скірмунт. Апошняя ў 1906 г. на старонках газеты «Кур'ер Польскі» (Nr 296) вызначыла ўласную ідэнтычнасць формулай: *Gente Lithuana, natione Lithuana.*

Вялікую ролю таксама адыграла афармленне польскага нацыянальнага руху. На пачатку XX ст. у грамадскім жыцці Беларуска-Літоўскага краю ён прысутнічаў прынамсі ў двух формах. Польскія нацыянальныя дэмакраты абвяшчалі прыярытэт польскай ідэі ў яе этнакультурным разуменні, а сацыялісты спрабавалі яе спалучыць з прывабнай сацыяльнай праграмай. У выніку прапаганды польскага нацыяналізму большасць палякаў гістарычнай Літвы паступова пачала атаясамліваць сябе з сучаснай Польшчай як у культурным, так і этнапалітычным сэнсе. Аднак даволі моцныя пазіцыі па-ранейшаму захоўвала ідэнтыфікацыя з гістарычнай Літвой, якая ўспрымалася як Айчына. Цікава, што яшчэ ў 1930 г. Міхал Ромэр у лісце да прафесара Уладзіслава Сэмковіча прызнаваўся ў прыналежнасці да «псіхічнага тыпу, які сёння ўжо вымірае, а ідэальным узорам якога быў Адам Міцкевіч, тыпу, што яднаў у сабе дзве нацыянальныя душы, і быў у такой ступені палякам, як і літоўцам, але не быў толькі палякам ці толькі літоўцам»[421]. Усё гэта якраз і дазволіла Рымантасу Мікнісу, аналізуючы актыўнасць ідэолагаў краёвасці і ступень яе пашырэння, выказаць ідэю пра працэс фарміравання «нацыі літоўскіх палякаў»[422].

На пачатку XX ст. стала відавочным як абвастрэнне польска-літоўскіх адносін, так і адсутнасць адзінства сярод польскай грамадскасці гістарычнай Літвы.

Большасць даследчыкаў сцвярджаюць існаванне двух варыянтаў краёвай ідэі – дэмакратычнага (ліберальна-дэмакратычнага) і кансерватыўнага (кансерватыўна-ліберальнага). Першы быў звязаны з выданнем «Газеты Віленьскай» (1906), фактычным кіраўніком якой быў Міхал Ромэр. Ідэолагамі кансерватыўнай плыні краёвасці з'яўляліся Раман і Канстанцыя Скірмунты, Баляслаў Ялавецкі (1843–1917).

Чым адрозніваліся гэтыя варыянты? Часам можна сустрэць меркаванне, што кансерватары ў адрозненні ад ліберальна-дэмакратычнай плыні краёўцаў былі праціўнікамі нацыянальнай эмансіпацыі літоўцаў і беларусаў. Але з гэтым тэзісам нельга пагадзіцца. Прыклад Р. Скірмунта, які ў 1907 г. спрабаваў стварыць «Краёвую партыю Літвы і Белай Русі» ў форме саюза польскай, беларускай і лі-

---

[420] Z. Solak, *Między Polską a Litwą. Zycie i działalnosc Michała Romera 1880–1920*, s. 44–53.

[421] Цыт. па: Z. Solak, *Między Polską a Litwą. Zycie i działalnosc Michała Romera 1880–1920*, s. 444.

[422] R. Miknys, *Problem kształtowania się nowoczesnego narodu Polakow litewskich w pierwszej połowie XX w.*, «Biuletyn Historii Pogranicza». 2000, Nr 1, s. 23–29.

тоўскай партыйных арганізацый, сведчыць, што прынамсі частка прадстаўнікоў гэтага кірунку прымала нацыянальныя рухі суседніх народаў. Падобна, што сам Скірмунт быў упэўнены ў магчымасці сумяшчэння краёвай свядомасці з мадэрновым нацыяналізмам. Пра апошняе сведчыць таксама ягоны прыхільны стасунак да беларускага руху, які ўрэшце ператварыў яго ў аднаго з лідэраў гэтага руху ў 1916–1918 гг.

Краёўцы абодвух кірункаў дэманстравалі прыхільнасць і падтрымку патрабаванняў літоўскага і беларускага нацыянальных рухаў. Гэтая прыхільнасць мела розныя прычыны, але нават у дэкларатыўнай форме яна спрыяла пашырэнню талерантнасці. Праблемай было прымірэнне нацыянальнага адраджэння беларусаў і літоўцаў з захаваннем традыцыйных добрасуседскіх адносін паміж народамі гістарычнай Літвы, палітычная нейтралізацыя моўнага і канфесійнага падзелаў.

Таксама ўсе краёўцы імкнуліся да абмежавання палітычных амбіцый польскай супольнасці, пераконвалі яе ў неабходнасці ўлічваць інтарэсы беларусаў і літоўцаў. Якраз гэтым было абумоўлена іх рашучае змаганне супраць польскіх нацыянальных дэмакратаў. Менавіта Партыя польскіх нацыянальных дэмакратаў і яе галоўны ідэолаг Раман Дмоўскі (1864–1939), а не дзеячы літоўскага ці беларускага рухаў, трактаваліся краёўцамі як галоўныя праціўнікі.

Краёўцы, прымаючы сацыяльную і нацыянальную эмансіпацыю літоўцаў і беларусаў, падкрэслівалі ўласную польскасць і права на развіццё польскай культуры. Яны трактавалі паняцці нацыянальнасці і грамадзянства як камплементарныя. У адным з рэдакцыйных артыкулаў «Газеты Віленьскай» сцвярджалася: «Мы сыны польскага народу ў культурным і нацыянальным сэнсе, але ў сацыяльных, палітычных і эканамічных дзеяннях кіруемся інтарэсамі гістарычнай Літвы». Краёвая грамадскасць, якой прыпісваліся пэўныя атрыбуты палітычнай нацыі, павінна была падпарадкоўваць інтарэсы асобных нацыянальных супольнасцяў агульнакраёвым. Пры гэтым сацыяльная група літоўскіх палякаў трактавалася як адна з краёвых нацый[423].

Краёвасць паводле Рамана Скірмунта

Раман Скірмунт ужо напярэдадні рэвалюцыі 1905–1907 гг. стаўся адным з галоўных ідэолагаў краёвай канцэпцыі. Біяграфія Рамана Скірмунта як «грамадзяніна Краю» распачалася выданнем у Львове (пад псеўданімам *Ro...munt*) двух брашур, прысвечаных грамадска-палітычнай і нацыянальнай сітуацыі ў Беларуска-Літоўскім краі – *Новыя лозунгі ў справе адраджэння літоўскай нацыянальнасці (Nowe hasła w sprawie odrodzenia narodowosci litewskiej)*[424] *(1904)*, а таксама

[423] J. Jurkiewicz, *Koncepcja krajowa a przemiany stosunkow narodowosciowych...*, s. 122–123.

[424] Ro...munt [R. Skirmunt]. *Nowe hasła w sprawie odrodzenia narodowosci litewskiej*. Lwow 1904.

Раман Скірмунт (1906).

Голас мінулага і патрэбы сучаснасці (Głos przeszłości i potrzeba chwili) (1905)[425]. Яны ўтрымлівалі прапановы па пераадоленню крызіса «краёвага грамадства» і сталі падмуркам далейшай распрацоўкі краёвай ідэі.

Што прымусіла спадкаемцу Парэцкага маёнтка, яшчэ нядаўна цалкам пагружанага ў гаспадарчыя клопаты, выступіць публічна з уласнай пазіцыяй па актуальных праблемах жыцця Краю? І якія ідэі выказваліся ў гэтых першых «краёвых» тэкстах?

Сам аўтар на старонках брашуры «Новыя лозунгі ў справе адраджэння літоўскай нацыянальнасці» (1904) прызнаваўся, што ягоны публічны выступ быў абумоўлены крызісам «літоўскай» (ліцвінскай) грамадскасці, якая аказалася негатовай адказаць на нацыянальныя і сацыяльныя выклікі новай эпохі. Між тым, вырашэнне праблемы «адзінства нацыі» сталася жыццёва важнай справай: «Сфінкс гісторыі загадаў нам сваю загадку зусім нядаўна, а Эдыпа, які здольны разгадваць загадкі сфінкса, звычайна трэба доўга чакаць. Зрэшты, шляхціч-земляроб, заняты працай на зямлі, не мае асаблівага жадання ламаць галаву над падобнымі загадкамі, ён іх папросту ігнаруе. Але сфінкс забівае і тых, каго не цікавяць яго загадкі»[426].

Праявы крызіса Раман Скірмунт убачыў у канфлікце паміж «младаліцвінамі» і польскамоўнай літоўскай шляхтай («стараліцвінамі»). Гэты канфлікт увасобіўся ў публічную палеміку паміж ксяндзом Аляксандрасам Дамбраўскасам[427], аўтарам звароту *Głos Litwinów do młodej generacji magnatów, obywateli i szlachty na Litwie* (1902) і ананімным аўтарам брашуры *Przenigdy! Odpowiedź na «Głos Litwinów do młodej generacji magnatów, obywateli i szlachty na Litwie»*[428] *(1903).*

З тэксту відаць, як моцна *Ro…munt* усхваляваны канфліктам, наступствам якога магло стаць «разбурэнне адзінства літоўскай грамадскасці», што пашкодзіла б дасягненню галоўнай мэты, якая, на думку аўтара, стаяла перад УСІМІ гістарычнымі літоўцамі (ліцвінамі), а менавіта барацьбе з русіфікацыяй. У адзінстве гэтай літоўскай (ліцвінскай) грамадскасці Раман Скірмунт бачыў шлях да абароны

---

[425] Ro…munt [R. Skirmunt]. *Głos przeszłości i potrzeba chwili.* Lwów 1905.

[426] Ro…munt [R. Skirmunt], *Nowe hasła w sprawie odrodzenia…*, s. 15.

[427] [A. Dambrauskas], *Głos Litwinów do młodej generacji magnatów, obywateli i szlachty na Litwie.* [Tylża?] 1902.

[428] В. а. *Przenigdy! Odpowiedź na «Głos Litwinów do młodej generacji magnatów, obywateli i szlachty na Litwie»*, Kraków 1903. (Польскія гісторыкі Ян Юркевіч і Пётр Ласоўскі шукалі аўтара гэтага тэксту сярод прадстаўнікоў маладзейшага пакалення роду Мэйштовічаў).

«заходняй культуры». Пры гэтым аўтар зыходзіў з пастулата адзінства літоўцаў (ліцвінаў) незалежна ад паходжання (шляхецкага або сялянскага) і культурнай ці моўнай прыналежнасці. У брашуры выразна прысутнічала палітычная трактоўка паняцця «літоўская грамадскасць».

Першасным адрасатам публікацыі з'яўлялася шляхта. Раман Скірмунт пазітыўна ацэньваў літоўскі нацыянальна-культурны рух, сцвярджаючы, што толькі пашырэнне літоўскай культуры дазволіць дайсці да «сэрца люду» і зрабіць з яго саюзніка палякаў у цывілізацыйным змаганні з Усходам. Ён нават параўнаў ролю мадэрновай літоўскасці з колішняй польскасцю: «Як некалі польскасць [...] была паратункам ад асіміляцыі на карысць Белай Русі, так зараз толькі асвета ў роднай мове можа даць народу неабходную мужнасць і здольнасць абараніцца ад расійскай хвалі»[429].

Але паступова на старонках брашуры з'яўляецца і другі матыў аўтара, які даводзіць чытачу-шляхцічу, што літоўскі рух усё роўна «не стрымаць»[430], што толькі прызнанне права на свабоднае развіццё літоўскай нацыі, у т. л. на асвету па-літоўску, адкрывае шлях да паразумення ў дзвюх найважнейшых праблемах, а менавіта ў праблеме сучаснага стаўлення Літвы да Польшчы, а таксама ў праблеме развіцця адносін паміж польскамоўнымі і літоўскамоўнымі літоўцамі (ліцвінамі). У гэтым месцы Раман Скірмунт звяртаўся ўжо да «младаліцвінаў», сцвярджаючы, што адсутнасць такога паразумення будзе моцнай перашкодай на шляху літоўскага нацыянальнага Адраджэння. Аўтар крытыкаваў пазіцыю, выказаную ксяндзом А. Дамбраўскасам, і заяўляў, што «літоўцы маюць толькі аднаго натуральнага саюзніка – Польшчу». Лозунг «Палякі – гэта чужынцы» ён назваў «тупіковым»[431].

У другой частцы брашуры аўтар перастаў быць бесстароннім назіральнікам і прамаўляў ужо ад імя «літоўскай шляхты». Ён пачаў атаясамліваць сябе са шляхтай і землеўласнікамі і заявіў пра неабходнасць выпрацоўкі «палітычнай праграмы», якая павінна ўлічваць не толькі гістарычную традыцыю польска-літоўскага «згоднага гарманічнага сужыцця» («Польшча ніколі не пагражала этнаграфічнай Літве...»[432]), але і патрабаванні сучаснасці. Пад апошнімі аўтар разумеў важнасць паразумення з народам, які ў XIX ст. стаўся галоўным чыннікам гістарычнага развіцця.

Апошняя частка брашуры – гэта спроба выкласці пэўныя ідэйныя падставы новай палітычнай праграмы. У брашуры яшчэ не ўжываліся тэрміны «краёвасць» ці «краёвая ідэя», але ўжо прысутнічалі некаторыя з характэрных для краёвасці пастулатаў.

---

[429] Ro...munt [R. Skirmunt], *Nowe hasła w sprawie odrodzenia*..., s. 7.

[430] Ibidem.

[431] Ibidem, s. 13.

[432] Ibidem, s. 12.

Так, Р. Скірмунт сцвярджаў, што польскамоўная шляхта не з'яўляецца для Літвы «прышлым элементам», што яна належыць да карэннага насельніцтва і мае агульнае паходжанне з «навакольным людам»: «Адзіная кроў і адзінае паходжанне – адна маці-зямля спрадвеку»[433]. Менавіта гэты чыннік (агульнасць паходжання і крыві ці «братэрства») Скірмунт лічыў зыходным пунктам у выпрацоўцы культурнай праграмы мясцовай шляхты, якая павінна ўзгадаць пра свае абавязкі адносна «братэрскага» народу. Абавязкам шляхціча-літоўца (ліцвіна) аўтар лічыў удзел у літоўскім нацыянальным Адраджэнні і клопат пра захаванне польскай культуры. Пра перспектыўнасць падобнай пазіцыі, на яго думку, сведчылі прыклады Швейцарыі і Шатландыі. Ён сцвярджаў, што моладзь павінна ведаць польскую і літоўскую мовы і мець права на самастойнае вызначэнне ролі літоўскай мовы ў прыватным жыцці.

Аўтар надаваў вялікае значэнне пашырэнню «лакальнага патрыятызму», які моцна аслабеў падчас апошняга паўстання. *Ро...мунт* быў пэўны, што яднанне ўсіх элементаў літоўскага (ліцвінскага) грамадства павінна адбывацца «на падмурку любові да роднай зямлі, якая з'яўляецца галоўным сродкам жыцця як для селяніна, так і для шляхціча»[434]. Гэта і было галоўным новым лозунгам у справе Адраджэння літоўскай нацыі, які Раман Скірмунт імкнуўся данесці да свайго чытача.

У тэксце відавочная спроба Рамана Скірмунта знівеляваць сацыяльныя і культурныя адрозненні паміж польскамоўнай шляхтай і літоўскамоўным сялянствам і пераканаць абодва бакі канфлікту ў адзінстве «літоўскай грамадскасці» (пазней ён будзе пісаць пра адзінства «краёвай грамадскасці»), што грунтуецца на падмурку агульнага паходжання, агульнай крыві і любові да роднай зямлі.

Што найбольш хвалюе аўтара? Лёс Айчыны, якая атаясамліваецца з тэрыторыяй былога Вялікага Княства Літоўскага (не з «Каронай»!), ці лёс польскамоўнай літоўскай шляхты, да якой належыць сам аўтар?

І тут трэба звярнуць увагу на той вобраз ворага, які намаляваў Раман Скірмунт у сваёй публіцыстыцы. Гэта, у першую чаргу, расійскі ўрад і палітыка русіфікацыі, а таксама мадэрновыя нацыянальныя рухі як пагроза пэўнай традыцыі. Апрача таго, аўтар невыпадкова прыгадаў г. зв. крызіс «лакальнага патрыятызму» падчас Студзеньскага паўстання (мелася на ўвазе пазіцыя сялянства) і выказаў думку, што ў XIX ст. менавіта народ становіцца чыннікам гістарычнага развіцця. З гэтым трэба лічыцца. Прынамсі, не выпадае ігнараваць.

На першым плане для аўтара стаяла пагроза адзінству «літоўскай грамадскасці». Яго найбольш хваляваў лёс таго сацыяльнага слою, да якога сам належаў, а менавіта польскамоўнай шляхты. Але не варта трактаваць гэты выступ як толькі клопат пра

---

[433] Ibidem, s. 14. (Больш грунтоўна гэты тэзіс быў раскрыты Б. Ялавецкім у *Нацыянальным катэхізісе Літвы* (Вільня, 1905)).

[434] Ibidem, s. 18.

лес уласнага маёнтка, у чым пазней будуць вінаваціць краёўцаў кансерватыўнага кірунку ліберады і сацыялісты. Усё ж літоўскія і беларускія палякі трактаваліся аўтарам як галоўны аплот «заходняй культуры» і гарант захавання традыцый гістарычнай Літвы.

І яшчэ адзін момант падаецца важным. Характарызуючы асаблівасці польска-літоўска-беларускіх стасункаў, Р. Скірмунт сцвярджаў, што менавіта польскасць выратавала «сапраўдную Літву» ад асіміляцыі з боку «Белай Русі» (аўтар пісаў пра «беларускае мора»), якая паглынала яе з усходу, поўначы і поўдня[435]. Упершыню ў польскамоўнай публіцыстыцы «Белая Русь» і беларусы разглядаліся як істотны фактар гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Якой была рэакцыя мясцовай польскай эліты на з'яўленне гэтай брашуры? Карэспандэнт газеты «Край», які падпісаўся крыптанімам *А. С.*, увесну 1905 г. прааналізаваў дыскусію, справакаваную выступам ксяндза Дамбраўскаса. Брашуру Скірмунта аўтар гэтага агляду змясціў у адзін шэраг з зваротам «маладога літоўскага шляхціча» *Przenigdy* і публікацыяй Канстанцыі Скірмунт *O prawde i zgode z powodu Głosu Litwinów...* (1904).

Аўтар агляду адзначыў перакананне *Ромунта*, што праграма дзейнасці польскамоўных ліцвінаў павінна ўлічваць тую выключную ролю, якую яны адыгрывалі ў гісторыі Літвы. Літоўскія палякі не павінны разрываць духоўнай сувязі з «польскай цывілізацыяй» і адмаўляцца ад польскай мовы, якой карысталіся іх продкі, але адначасна яны абавязаны любіць літоўскі народ і яго мову, клапаціцца пра яго развіццё. Сумяшчэнне аднаго і другога будзе падставай для польска-літоўскага паразумення, а праблему мовы хатняга ўжытку будуць вырашаць ужо будучыя пакаленні. Гэтую пазіцыю аглядальнік «Краю» лічыў яснай і выразнай[436].

Брашура «Голас мінулага і патрэбы сучаснасці» (1905) пісалася ўжо пад уплывам тых палітычных перамен, што адбыліся на пачатку Першай расійскай рэвалюцыі. Ідэі, выказаныя ў 1904 г., даводзілася адстойваць у палеміцы не столькі з расійскім урадам, колькі з польскімі нацыянальнымі дэмакратамі і з «імпартаванай грамадска-палітычнай думкай [...], што вырастала на іншай глебе, у чужых для нас умовах»[437].

Аўтар быў праціўнікам гэтага «імпарту», сцвярджаючы, што Край паміж Дняпром і Віслай мае ўласную гісторыю і ўласныя традыцыі. Толькі абапіраючыся на іх можна знайсці адказы на галоўныя пытанні сучаснасці: якую пазіцыю павінна займаць «шляхта Літвы і Русі» ва ўласным Краі? Якія адносіны трэба выбудоўваць з уласным народам, а таксама з Расіяй і з Польшчай?

Скірмунт, характарызуючы настроі шляхты, заўважыў, што «апрача людзей, якія ўсёй сілай уласных пачуццяў імкнуцца да «сваёй Радзімы» – Польскага

---

[435] Ibidem, s. 7.

[436] A. C., *Spor o szlachtą litewską*, «Kraj». 1905, Nr 18.

[437] Ro...munt [R. Skirmunt], *Głos przeszłosci i potrzeba chwili*, s. 7.

каралеўства, і асоб, што прагнуць расійскай пяшчоты, сярод шляхты ёсць паважная група людзей, сэрцам і душою адданых справам сваёй «малой Айчыны» – Літвы ці Русі»[438].

Раман Скірмунт у гэтай працы шмат увагі надаў мінуламу. Менавіта там ён знаходзіў асноўныя аргументы. «Голас мінулага...» – гэта пераважна гістарычны нарыс. Ніколі пазней у публіцыстыцы Рамана Скірмунта гісторыя не будзе займаць такое значнае месца.

Шукаючы ў мінулым адказ на пастаўленыя пытанні, *Ромунт* сцвярджаў, што «з Польшчы пралілося на Літву спрадвечнае святло веры, [...] святло заходняй культуры, якая магла толькі ўмацаваць нашу адвечную любоў да вольнасці»[439]. А вось стасункі з Масквой абмежаваліся войнамі: «Узаемная разня была іх зместам. Бедствы і спусташэнні – іх наступствам»[440].

Галоўнае пасланне аўтара свайму чытачу заключалася ў сцвярджэнні, што «Літва і Русь» не з'яўляецца часткай ні Расіі, ні Польшчы, што гэта адметны Край, характар якога ўжо вызначае не шляхта, а народ (люд). Польскасць мае права на гістарычнае існаванне ў ім, але шляхта павінна працаваць не дзеля Польшчы, а дзеля «Літвы і Русі»: «Сёння ўжо ніхто не можа атаясамляць наш край з Каралеўствам Польскім. Не шляхта і нешматлікая інтэлігенцыя, а люд надае колеры краёваму сцягу. [...] Наша культурная лучнасць з Польшчай мае паважную духоўную гісторыю, нас злучаюць сардэчныя стасункі, але нашая родная зямля, спрадвечная Айчына, для якой мы працуем і для якой з Божай дапамогай і наступныя пакаленні будуць працаваць – гэта Літва або Русь з ушанаваннем даўняй братняй уніі з Польшчай»[441].

Аўтар крытыкаваў пазіцыю польскай нацыянальнай дэмакратыі, якая, на яго думку, павінна дзейнічаць на карэнных польскіх землях, а «на сенажацях Літвы і Русі яна ператвараецца ў антынацыянальную арыстакратыю, бо чым жа іншым можа быць гэтая жменька шляхты, пазіцыя якой прывядзе да сацыяльнага і нацыянальнага антаганізму з мясцовым людам?»[442]

Паводле аўтара, шляхта «Літвы і Русі» павінна катэгарычна адкінуць лозунгі, якія прыходзяць з-над Віслы і падтрымаць літоўцаў і «русінаў» у іх нацыянальным адраджэнні. «Гэта складана зрабіць, гэты шлях стромкі, невядомы, цярністы, – адзначаў аўтар. – Тут актыўнасць на грамадскім поле – змаганне. Хто ідзе абараняць добрую справу, той не шукае асабістай карысці. Не здабудзе яе і той, хто абярэ гэтую стромкую і цярністую дарогу. Сепаратысты з-над Віслы выракуцца нас, младаліцвінаў ці русінаў. Неаднакроць мы застанемся незразумелымі, але

[438] Ibidem, s. 9.
[439] Ibidem.
[440] Ibidem, s. 14.
[441] Ibidem, s. 29–30.
[442] Ibidem, s. 32.

пракладзем шлях будучым пакаленням!»[443]. Кожны з нас, – працягваў думку Скірмунт, – паляк, літовец або русін – стане мацнейшым, змагаючыся пад сцягам справядлівасці для ўсіх, а не працуючы на эгаістычныя лозунгі. Гэта цалкам адпавядае традыцыям Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, якія пакінулі нам лозунг павагі да нацый[444].

Аўтар выступаў як прадстаўнік шляхты «Літвы і Русі». Але важна адзначыць, што якраз «Русі» Раман Скірмунт удзяляў асноўную ўвагу ў сваім гістарычным экскурсе. Ён лакалізаваў «Русь» у міжрэччы Прыпяці, Дзвіны і Дняпра, г. зн., што размова ішла пра Беларусь.

Вялікае значэнне *Ромунт* надаваў тлумачэнню адрозненняў гістарычнай Русі ад тагачаснай Расіі. Ён звярнуўся да пачатковага перыяду гісторыі рэгіёну. Ужо ўзнікненне «Уладзіміра-Маскоўскай дзяржавы», паводле публіцыста, прынцыпова адрознівалася ад гісторыі іншых славянскіх дзяржаў. Яе падмуркі заклаў яшчэ князь Андрэй Багалюбскі, «аўтакрат і дэспат, чужы і варожы сэрцам і розумам Заходняй Русі». Менавіта ён жорстка знішчыў Кіеў у 1169 г., апярэдзіўшы хана Батыя[445]. Татарскае нашэсце было моцным ударам па гэтай дзяржаве, але яна яго вытрымала і паступова пачала адраджацца. Вялікае Княства Маскоўскае пераймала традыцыі дзяржаўнага кіравання ад Залатой Арды («Корміцца і набіраецца моцы ад татарскай грудзі...»[446]). Пасля вызвалення з-пад татарскай няволі Масква адразу пачала ўласныя заваёвы ў заходнім напрамку (Іван III). У выніку на працягу стагоддзяў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Масквой адбываліся крывавыя войны.

Зусім па-іншаму ўяўляў Раман Скірмунт гісторыю «сапраўднай Русі». Яе пачатак – палітыка галіцка-валынскіх князёў, якую працягвалі літоўскія князі. Так, Міндоўг пачаў, а Гедымін і Альгерд закончылі аб'яднанне Русі ў межах Вялікага Княства, якое ў 1386 г. злучылася ўніяй з Польшчай.

Ромунт быў пэўны, што «сужыццё параднёных гісторыяй літоўцаў і русінаў было бесканфліктным»[447]. Літоўскія ваяры і палітыкі не аказвалі нацыянальнага ўціску. Наадварот, яны самі траплялі пад асіміляцыйныя ўплывы з боку русінаў. Апошнія дамінавалі пры двары князя Альгерда. На ўвядзенне пэўных прывілеяў для каталіцкай шляхты русіны адказалі паўстаннем, якое прымусіла Ягайлу ўраўнаць іх у правах.

Мова русінаў, паводле Скірмунта, на працягу трох стагоддзяў (да канца XVII ст.) была мовай Вялікага Княства Літоўскага. Яна была пашырана сярод насельніцтва ВКЛ паўсюдна, дзе русіны кантактавалі з літоўцамі. Не польская, а «русінская

---

[443] Ibidem, s. 34–35.
[444] Ibidem, s. 32.
[445] Ibidem, s. 11.
[446] Ibidem, s. 12.
[447] Ibidem, s. 16.

мова» выцясніла літоўскую нават з хатняга ўжытку вядомых літоўскіх родаў. Ёю карысталіся нават дзеці Казіміра Ягелончыка, – сцвярджаў аўтар[448].

Русіны разам з палякамі і літоўцамі пралівалі кроў, баронячы агульную Айчыну. Толькі канфесійныя праблемы пры Жыгімонце III і казацкія бунты пры Яне Казіміры карэнным чынам змянілі становішча русінаў. Расія ж адразу паспрабавала гэта выкарыстаць у барацьбе супраць Рэчы Паспалітай.

Памяць пра мінуўшчыну Вялікага Княства Літоўскага для Рамана Скірмунта – гэта памяць адзінства трох народаў у абароне Радзімы. Аснова адзінства – роўнасць гэтых народаў незалежна ад узроўню іх матэрыяльнага і культурнага жыцця. У выніку «інтэлектуальныя і сардэчныя сувязі і сёння збліжаюць Літву і Русь з Польшчай. Захавалася гістарычнае братэрства...»[449]

Скірмунт лічыў памылковым меркаванне, што русіны – нібыта чужы для шляхты народ, з якім яе нічога не звязвае: «Нас яднае з імі агульная гісторыя самых далёкіх стагоддзяў, а таксама адзінства крыві і паходжання». Моўныя адрозненні, на яго думку, не адыгрывалі істотнай ролі[450].

Відавочна, што асаблівасцю ягонай трактоўкі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага з'яўлялася прысутнасць Русі і яе дамінаванне ў пэўны перыяд. Русь, якую аўтар атаясамліваў з беларускімі землямі, дамінавала ў культурным жыцці і актыўна ўплывала на ўнутраную і знешнюю палітыку гістарычнай Літвы. У брашуры Скірмунта «русінскі чыннік» станавіўся важным элементам ліцвінскай традыцыі.

Калі аналізаваць вобразы Літвы і Русі ў ранніх тэкстах Рамана Скірмунта з пазіцыі канцэпцыі «месцаў памяці» французскага даследчыка П'ера Нара, то, як ні дзіўна гэта будзе для краёўца, на першым месцы аказвалася мова русінаў. Скірмунт пісаў пра яе як пра «мову ўлады» (Статуты Княства ды інш.), адзначаў яе дамінаванне пры двары вялікага князя Альгерда, а таксама ў сем'ях магнацкіх родаў Літвы і г. д.

Аўтар імкнуўся ў пэўным сэнсе вярнуць Русь у Вялікае Княства Літоўскае. Ён абвяргаў расійскіх гісторыкаў і палітыкаў, якія даказвалі тоеснасць старажытнай Русі і Расіі і разыгрывалі «русінскую/рускую карту», каб на свой бок перацягнуць мясцовае праваслаўнае насельніцтва.

Варта адзначыць, што ў палітычнай частцы канцэпцыі Р. Скірмунта «Русь» паступова ператваралася ў Белую Русь або Беларусь (1906). Яе капчатковае пераўтварэнне адбылося ўжо не ў ягоных тэарэтычных працах, а ў практычнай палітычнай дзейнасці. Але гэта будзе трохі пазней...

З'яўленне аналізаваных тэкстаў было выклікана абвастрэннем польска-літоўскіх стасункаў на ўзроўні эліты літоўскай нацыі і мясцовай польскамоўнай

---

[448] Ibidem, s. 16.

[449] Ibidem, s. 19.

[450] Ibidem, s. 35.

шляхты, а таксама складанай нацыянальна-культурнай і палітычнай сітуацыяй. Асаблівую ролю ў абвастрэнні міжнацыянальных стасункаў адыгрываў расійскі ўрад, які ўжо падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. пачаў праводзіць палітыку «падзяляй і пануй».

Іншым заўважальным матывам публічнага выступу Рамана Скірмунта стала ўсведамленне новай гістарычнай ролі ніжэйшых колаў грамадства. Ён быў перакананы, што народ (люд) ператвараецца ў рашаючы фактар развіцця гістарычнай Літвы. А гэта патрабавала выпрацоўкі пэўнай палітычнай праграмы дзейнасці польскамоўнай шляхты.

У гэтых першых тэкстах былі выказаныя наступныя ідэі канцэпцыі краёвасці:

- Ідэя супольнага («краёвага») грамадзянства як згоднага сужыцця розных нацый у Літве.
- Ідэя агульнага паходжання шляхты і сялянства (асабліва папулярная ў кансерватыўным варыянце краёвасці), кроўнае сваяцтва, «братэрства» шляхты і народу (люду).
- Ідэя «лакальнага патрыятызму», любові да Краю, да роднай зямлі як падмурку краёвага грамадзянства.
- Дапаўненне феномена «ліцвінства» чыннікам «Русі» (пазней «Белай Русі»).

Варта таксама адзначыць пэўныя аўтарскія разважанні наконт сутнасці і метадаў палітычнай дзейнасці, якія прысутнічалі ў брашуры «Голас мінулага...» і, магчыма, былі выкліканы ўдзелам прадстаўнікоў эліты літоўскіх і беларускіх палякаў у адкрыцці помніка Кацярыне II у Вільні. Так, Скірмунт катэгарычна аспрэчваў тэзіс, што «ў палітыцы няма годнасці»: «Дазволіць біць сябе ў твар, нават за добрае ўзнагароджанне, лічу вялізнай памылкай, таксама як адмову ад ўласных прынцыпаў дзеля таго, каб спадабацца праціўніку»[451]. У іншым месцы ён працягваў думку: «У палітыцы трэба імкнуцца да дасягнення найвялікшай рэальнай карысці, не забываючыся пра нацыянальную годнасць. Яе абарона павінна заставацца краевугольным каменем у падмурку палітыкі. Імкненне атрымаць рэальную выгоду, спалучанае з адмовай ад уласнай годнасці можа быць добрым падчас... выпасу свіней, але не ў палітыцы»[452].

Выказаныя ў «Голасе мінулага...» думкі вартыя ўвагі, бо Скірмунт імкнуўся ім следаваць на працягу ўсёй сваёй грамадскай і палітычнай дзейнасці, што далёка не заўсёды гарантавала дасягненне «рэальнай карысці».

Што было прычынай пераўтварэння прадпрымальніка ў грамадскага дзеяча і палітыка, аднаго з аўтараў арыгінальнай палітычнай канцэпцыі? Верагодна, важную ролю адыграла адчуванне блізкасці перамен ды іх пачатак у 1905 г. У гэты час «палескі фармат» ужо здаваўся недастатковым. Ягоны інтарэс канцэнтраваўся

[451] Ibidem, s. 25.

[452] Ibidem, s. 26.

вакол ўсяго *Краю*, пад якім разумеўся абшар былога Вялікага Княства Літоўскага (пасля Люблінскай уніі).

Знойдзеныя біяграфічныя матэрыялы гавораць пра Рамана Скірмунта як пра асобу з вельмі высокай ступенню адказнасці за тое, што адбываецца вакол. Гэта датычыла як роду Скірмунтаў, так і Палесся, усёй гістарычнай Літвы, і, нарэшце, нават будучыні «заходняй культуры» ў гэтай частцы Еўропы. Магчыма, менавіта гэтае адчуванне асабістай адказнасці і падштурхнула Рамана Скірмунта да «краёвай дзейнасці». Тым больш, што апрача Канстанцыі Скірмунт, якая ў вялікай ступені падзяляла ягоны клопат і сама пашырала краёвую ідэю, былі таксама іншыя прадстаўнікі роду, якія не прымалі краёвасць.

Так, Скірмунты з Моладава належалі да той часткі літоўскіх і беларускіх палякаў, якія вельмі насцярожана сустрэлі нацыянальныя рухі і працэсы лібералізацыі грамадскага і палітычнага жыцця. Яны рабілі стаўку на Польшчу, якую атаясамлівалі з Рэччу Паспалітай. Канстанцыя Скірмунт звязвала лёс Краю з Літвой не толькі гістарычнай, але і «этнаграфічнай», а ўладальнік Парэчча сцвярджаў значную ролю «Русі-Беларусі» як у гісторыі, так і ў будучыні Краю. Відавочна, што сярод прадстаўнікоў палескай галіны Скірмунтаў мела месца сямейная дыскусія, і, магчыма, першы публічны выступ Рамана Скірмунта ў пэўным сэнсе быў адным з «галасоў» гэтай палемікі.

Можна выказаць меркаванне, што для Рамана Скірмунта, як, дарэчы, і для Міхала Ромэра, які трохі пазней (1906) выступіць з канцэпцыяй ліберальна-дэмакратычнага варыянта краёвасці, надзвычай важнымі аказаліся асабістыя матывы першых публічных выступаў. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што краёвасць Міхала Ромэра была непасрэдна звязана з праблемай ягонай самаідэнтычнасці. З іншага боку, прысутнасць гэтых асабістых матываў у дзейнасці піянераў краёвай ідэі рабіла ўсю канцэпцыю больш зразумелай і прывабнай для значнай часткі мясцовых палякаў.

Таксама можна выказаць меркаванне, што асобай, якая інспіравала грамадскую і палітычную дзейнасць Рамана Скірмунта як краёўца, магла быць стрыечная сястра Канстанцыя. У некралогу на яе смерць Раман Скірмунт адзначыў тое вялікае замілаванне да Літвы, якое яна пранесла праз усё жыццё[453]. Ён сцвярджаў, што вывучэнне гісторыі Літвы было справай яе жыцця і прыгадаў напісаны яшчэ ў 1880-я гг. падручнік па яе гісторыі[454]. Таксама варта прыгадаць тры кнігі Канстанцыі пад агульнай назвай *Nad Niemnem i Bałtykiem* (1879–1909). Яна ж у адным з лістоў да Ёнаса Басанавічуса (25 верасня 1891 г.) пісала пра два тыпы літоўскасці – «этнічны» і «гістарычны» і сцвярджала, што галоўнай задачай іх пакалення з'яўляецца збліжэнне гэтых тыпаў і нейтралізацыя антаганізму паміж імі[455].

---

[453] R. Skirmuntt, *Panie z Muru*, «Słowo». 1934, Nr 134.

[454] K. Skirmuntt, *Dzieje Litwy opowiedziane w zarysie*. Krakow 1886.

[455] D. Szpoper, *Gente Lithuana, natione Lithuana…*, s. 139.

Магчыма, што многія ідэі першага тэксту Скірмунта нарадзіліся ў разважаннях над кнігамі Канстанцыі Скірмунт або ў размовах ці спрэчках з ёю ці з больш шырокім колам сяброў і сваякоў.

Пры гэтым аналіз публіцыстыкі 1904–1906 гг. сведчыць пра самастойнасць «краёвай канцэпцыі» Рамана Скірмунта. Дастаткова параўнаць змест аналізаванага тэксту Скірмунта з брашурай Канстанцыі Скірмунт *O prawdę i zgodę z powodu «Głosu Litwinow do magnatow, obywateli i szlachty na Litwie» i odpowiedzi młodego szlachcica litewskiego* (*Пра праўду і згоду з нагоды Голаса літоўцаў да магнатаў, грамадзянаў і шляхты Літвы і адказу маладога літоўскага шляхціча*) (1904)[456].

У адрозненні ад сястры Раман Скірмунт падкрэсліваў важнасць «русінскага чынніка» ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта Русь ён лічыў галоўным цывілізацыйным элементам у гісторыі Княства да Люблінскай уніі.[457] У значна большай ступені публіцыст з Парэчча ўлічваў дэмакратычныя перамены часу і быў гатовы іх прыняць.

Пашырэнню краёвай ідэі моцна паспрыялі рэвалюцыйныя падзеі і тыя ўступкі, на якія быў вымушаны пайсці царызм. Вялікае значэнне меў Маніфест ад 17 Кастрычніка 1905 г., які абвяшчаў увядзенне асноўных дэмакратычных свабод, а таксама выбары і дзейнасць Дзяржаўнай Думы. Гэтыя перамены спрыялі пераўтварэнню краёвасці ў палітычную праграму літоўскіх і беларускіх палякаў.

У лістападзе 1905 г. Раман Скірмунт як прадстаўнік «Часовага камітэта прыхільнікаў Краёвага кола» выступіў з ідэяй стварэння «Краёвай партыі Літвы і Русі» і прапанаваў праграму сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных рэформ. На ягоную думку, Край, якія мае ўласныя інтарэсы, павінен навучыцца іх самастойна бараніць, а дзеля гэтага неабходна агульнакраёвая партыя.

Паводле Скірмунта, «край з такой слаўнай гісторыяй і нацыянальнай адметнасцю, край, што ў мінулым быў радзімай шматлікіх славутых постацей, якія служылі яму з поўным самаахвяраваннем, і сёння знойдзе сярод сваіх сыноў людзей, гатовых выкарыстаць атрыманую палітычную свабоду дзеля агульнага дабра на шляху сумленнай і настойлівай працы».

У агульных палажэннях прапанаваная праграма паўтарала асноўныя задачы дзейнасці Менскага таварыства сельскай гаспадаркі, якое падчас рэвалюцыі дапоўніла ўласную праграму гаспадарчай дзейнасці палітычнымі пастулатамі. Яна ўключала патрабаванне рэальных грамадзянскіх і палітычных свабод, недатыкальнасць жытла і асобы, роўнасць усіх перад законам, а таксама ўвядзення школы на роднай мове і агульнадаступнай бясплатнай пачатковай адукацыі. Таксама прадугледжвалася адмена пашпартоў і ліквідацыя рысы аселасці для габрэйскага насельніцтва. Вялікае значэнне надавалася ўвядзенню самакіравання, пашырэн-

---

[456] Futurus [K. Skirmuntt], *O prawdę i zgodę z powodu «Głosu Litwinow do magnatow, obywateli i szlachty na Litwie» i odpowiedzi młodego szlachcica litewskiego*. Lwow 1904.

[457] Ro…munt [R. Skirmuntt], *Głos przeszłosci i potrzeba chwili*, Lwow 1905.

ню жаночых правоў, уздыму матэрыяльнага дабрабыту. Краевая партыя абяцала змагацца за роўнасць сялянства з іншымі саслоўямі. Важнай задачай з'яўлялася дапамога беззямельным і малазямельным сялянам у набыцці зямлі шляхам дзяржаўнага крэдытавання, паляпшэння культуры землекарыстання, правядзення меліярацыі, удасканалення працы земскіх установ. Таксама Краевая партыя заяўляла, што будзе стаяць «на падмурку расійскай дзяржаўнасці», і выказвала спадзеў на яе паступовае рэфармаванне ў кірунку пашырэння палітычных свабод. Прадугледжвалася пераўтварэнне Дзяржаўнай Рады ў выбарны орган кіравання.

На гэтым пералік агульных прынцыпаў дзейнасці завяршаўся. У другой частцы звароту ўтрымліваліся канкрэтныя прапановы па партыйнай дзейнасці на бліжэйшы час. Гаворка ішла пра шляхі рэалізацыі краёвай ідэі, прапанаваныя Раманам Скірмунтам.

ДАКУМЕНТ

Зварот Краёвай партыі Літвы і Русі. 1905 г.[458] Фрагмент.

Дзеля акрэслення нашага стаўлення з аднаго боку да Расійскай дзяржавы, а з другога да нашай малой радзімы прапануем наступныя тэзісы:

I. Стаім на падмурку расійскай дзяржаўнасці, спадзеючыся на далейшае паспяховае развіццё палітычных і канстытуцыйных свабод, пашырэнне агульначалавечых правоў;

II. Будзем падтрымліваць расійскіх дзеячаў у іх намаганнях па рэфармаванні дзяржаўнага ладу ў духу талерантнасці, свабоды, парадку і прагрэсу.

III. У сувязі з негатыўнымі наступствамі празмернай цэнтралізацыі кіравання і звычайным у гэтых умовах забыццём адметных інтарэсаў крэсаў, лічым адным з найважнейшых палажэнняў нашай праграмы ўвядзенне органаў самакіравання.

IV. Як спрадвечныя дзеці свайго краю імкнёмся ўсе свае сілы аддаць дзеля яго. Найлепшай формай абароны нацыянальных правоў у краі са змяшаным насельніцтвам з'яўляецца лозунг «Справядлівасць для ўсіх», які мы і выбіраем.

V. Уступленне ў Краёвую партыю магчымае для ўсіх прадстаўнікоў карэннага насельніцтва (літоўцаў, палякаў, русінаў), наогул для грамадзян, якіх з гэтаю зямлёю, як з Айчынай, звязваюць сардэчныя стасункі і якія імкнуцца шчыра і сумленна працаваць дзеля яе дабра.

VI. Нашы абранцы ў Дзяржаўнай Думе павінны імкнуцца да арганізацыі асобнага Краёвага Кола Літвы і Русі. Мы выступаем супраць навязвання ім мандатаў, якія б абмяжоўвалі свабоду дзеянняў. Апошняя будзе залежаць ад абставін і камбінацый, якія немагчыма прадбачыць на перадвыбарчых сходах.

VII. Уздымаючы лозунг агульнага росквіту краю, не будем перашкаджаць кожнай сумленнай культурна-нацыянальнай працы.

---

[458] R. Skirmunt, *Odezwa Stronnictwa Krajowego Litwy i Rusi*, «Kurier Litewski». 1905, Nr 65.

VIII. Як дэмакратычная партыя прызнаем, што характар і назву краю надае большасць насельніцтва, а г. зн. надае люд (літоўцы і русіны). Прызнаем, што культурныя патрэбы люду ў мінулым былі цалкам занядбаныя і сёння патрабуюць ад нас асаблівай увагі і клопату. З іншага боку, правы польскай меншасці, якая займае ў Літве і Русі лёсавызначальнае становішча, павінны быць забяспечаны.

Грунтуючыся на прынцыпах хрысціянскай этыкі і на гісторыі Літвы і Белай Русі, не абцяжаранай вострымі нацыяльнымі сутыкненнямі, верым, што падобнае мірнае супрацоўніцтва нацыянальнасцяў цалкам магчымае і для нашага краю найбольш адпаведнае.

Мы перакананыя, што паміж шляхтай карэннай або ад вякоў аселай на нашых землях і мясцовым людам павінна і можа панаваць поўная згода ў грамадскай і палітычнай працы дзеля дабра супольнай Айчыны.

Часовы камітэт прыхільнікаў Краёвага Кола

Гэты выступ Рамана Скірмунта сведчыць пра пашырэнне сярод краёўцаў разумення неабходнасці ўласнай палітычнай арганізацыі. Гэтаму моцна спрыяў вопыт назапашаны за час існавання таварыстваў сельскай гаспадаркі. Найбуйнейшым з іх заставалася Менскае таварыства сельскай гаспадаркі. Менавіта яго сябры і склалі тую самую «групу грамадзян», ад імя якіх, як паведаміла рэдакцыя, Скірмунт даслаў гэты зварот у газету.

Гісторык Дарыуш Тарасюк на падставе матэрыялаў «Журнала Минского общества сельского хозяйства» за 1905 г. даволі падрабязна распавёў пра абмеркаванне і выпрацоўку канчатковага тэксту гэтага звароту на пасяджэннях МТСГ[459]. Яго галоўным ініцыятарам быў Раман Скірмунт. Напачатку 1906 г. ён паўтарыў свой зварот, што тлумачылася «анархіяй», у якую ператваралася рэвалюцыя.

Сапраўды, восень і зіма 1905 г. былі надзвычай бурлівымі не толькі ў цэнтральнай частцы імперыі, але таксама на яе акраінах, у т. л. у Беларуска-Літоўскім краі. У лістападзе і снежні прыкметна павялічылася колькасць разгромаў і падпалаў памешчыцкіх двароў, сутыкненняў з паліцыяй і войскам, палітычных сходаў, мітынгаў і дэманстрацый. Салдацкія хваляванні адбыліся ў Гародні, Берасці і Бабруйску. Гісторыкі таксама налічылі 460 сялянскіх выступаў на беларускіх землях[460].

Апошнія не абмінулі і Скірмунтаў. Так, у пачатку лістапада сяляне в. Пінкавічы Пінскага пав. запатрабавалі ад гаспадара маёнтка Альбрэхтова Зыгмунта Скірмунта перадаць ім у поўнае карыстанне азёры і балоты з правам рыбнай лоўлі, збору камыша ды інш., а таксама саступіць выган для ската (77 га), якім карысталіся на

---

[459] D. Tarasiuk, *Między nadzieją a niepokojem. Działalnosc społeczno-kulturalna i polityczna Polakow na wschodniej Białorusi w latach 1905–1918.* Lublin 2007, s. 96–98.

[460] *Гісторыя Беларусі. Том 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).* Рэдкал.: М. Касцюк ды інш. Мінск 2005, с. 323.

правах сервітута. Сяляне быў ўпэўнены, што памешчык незаконна валодае двума азёрамі і выганам, бо ўсё гэта калісьці было сялянскім[461].

Вядома, што ў гэтых хваляваннях удзельнічаў настаўнік Канстанцін Міцкевіч (*Якуб Колас*) (1882–1956). Менавіта ён угаварыў сялян не ісці ўсёй вёскай да памешчыка, а паслаць прадстаўнікоў. Тыя вярнуліся ні з чым, бо Скірмунт нават не стаў іх слухаць. Пасля гэтага Канстанцін Міцкевіч склаў петыцыю, якую падпісалі 69 чалавек. Яе аднеслі ў Альбрэхтова. Не дачакаўшыся адказу, сяляне пачалі самавольна лавіць рыбу. У выніку паліцыя арыштавала двух сялянскіх «агітатараў», а настаўніка кіраўніцтва школ народнай асветы перавяло на працу ў Ігуменскі пав.

Значна больш сур'ёзны характар набылі хваляванні ў Моладаве. 9 снежня 1905 г. сялянскі натоўп (каля 150 чал.) запоўніў маёнтак і запатрабаваў ад Генрыка Скірмунта перадачы сялянам 50 дзес. пашы фальварка «Залугі», якія нібыта да адмены прыгону былі сялянскімі; 160 дзес., за карыстанне якімі сяляне адпрацоўвалі ў фальварку; 20–30 дзес. лесу там, дзе ён межаваў з сялянскімі землямі, і павышэння заробкаў да 50 кап. за адзін зімовы дзень і да 1 руб. – за летні. Апрача таго, патрабавалі браць на працу ў маёнтак выключна сялян з навакольных вёсак.

Генрык Скірмунт адмовіўся, заявіўшы, што сяляне не маюць ніякага права гэта патрабаваць. У адказ пачуў пагрозы: «Даб'ёмся сілаю!» Сяляне накіраваліся да гаспадарчых пабудоў і вінакурнага завода з заклікам да забастоўкі. Паколькі рабочыя і батракі не збіраліся баставаць, іх пачалі біць. Усе працы былі спынены.

10 снежня ў маёнтак прыйшло ўжо каля 200-т сялян. Яны зноў спынілі ўсе працы і пачалі збіваць рабочых. 12 снежня сяляне яшчэ раз выказалі свае патрабаванні Генрыку Скірмунту. Некаторыя нават уварваліся ў кухню палаца і забаранілі кухару гатаваць абед. Шукалі ўпраўляючага маёнткам і выламалі дзверы ў яго кватэру. Толькі ўвечары прыбыў атрад драгун з Пінска, які паспрабаваў арыштаваць найбольш актыўных сялян. Тыя аказалі супраціў. Ротмістр атрымаў удар па галаве, пасля чаго драгуны агалілі шашкі. Адзін з сялянскіх актывістаў быў цяжка паранены і адвезены ў шпіталь.

Урэшце былі арыштаваны 10 чалавек, якіх змясцілі ў Кобрынскую турму. Праўда, ненадоўга, бо пад *поручительство* вёскі і заклад у 200 руб. яны вярнуліся дадому чакаць суда. Віны сваёй не прызналі. У красавіку 1906 г. былі асуджаны 5 чалавек. Максімальны тэрмін пакарання склаў 8 месяцаў. Падчас следства высветлілася, што адной з прычын выступлення былі чуткі, што калі да пачатку новага 1906 г. сяляне не «забяруць сваё», то потым нічога не атрымаюць[462].

Жыхары маёнтка перажылі жахлівыя дні, адчуваючы сябе цалкам бездапаможнымі перад агрэсіўным натоўпам. Вось што пісала Ядвіга Скірмунт у лісце да Элізы Ажэшкі 27 снежня 1905 г.: «Аграрныя хваляванні пачаліся ў нас нечака-

---

[461] НГАБ. Ф. 458, воп. 1, спр. 300, арк. 30. Гэтыя падзеі Якуб Колас апісаў у сваёй трылогіі «На ростанях».

[462] НГАБ у Гародні. Ф. 34, воп. 1, спр. 7, арк. 2–6, 64, 160–162, 164.

на і набылі вельмі востpую форму. Гэта быў сапраўдны бунт. Аднойчы раніцай прыйшоў натоўп, які запатрабаваў зямлю, лясы, лугі і трохразовага павялічэння аплаты. Яны рабілі гэта так нахабна, што становішча адразу стала вельмі цяжкім. Усе мірныя сродкі замірэння хутка вычарпаліся. Костусь (Канстанцін Скірмунт – *А. С.*) адправіў губернатару тэлеграму, у якой прасіў вайсковай дапамогі. Засталося толькі вытрымаць да падыходу войска [...] Праз чацвёра сутак прыйшоў атрад драгун, а таксама прадстаўнік губернатара сп. Сталяраў з трыма афіцэрамі. На наступны дзень, калі прыйшлося сілай разганяць натоўп, трое сялян былі паранены. [...] Войска і зараз стаіць у нас, і мы перакананы, што толькі ягоная прысутнасць стрымлівае нашых сялян і навакольныя вёскі».

Чатыры дні чакання былі напоўнены драматычнымі падзеямі. Сяляне збілі кіямі і разагналі парабкаў, спынілі ўсе працы ў маёнтку, не дазвалялі нават карміць скаціну, забаранілі кухарам гатаваць ежу ды інш. Ядвіга Скірмунт прызнавалася, што сям'я была амаль упэўненая, што надышоў канец Моладава. Скірмунты падрыхтаваліся да ўцёкаў і маліліся, каб застацца жывымі. Пасля перажытага яны былі перакананы, што лёс эліты літоўскіх і беларускіх палякаў цалкам залежыць ад сітуацыі ў дзяржаве: «Калі пераможа ўрад, то можа і ў нас усё супакоіцца. Калі не, то хутчэй за ўсё нашыя пазіцыі будуць знішчаныя»[463].

У лістападзе таго ж года Казімір Здзяхоўскі з Ракава пісаў Элізе Ажэшка пра «цёмнае ўзбаламучанае народнае мора», якое можа ўзняцца супраць польскіх зямян і, карыстаючыся «канстытуцыяй», рабаваць, паліць і знішчаць: «Тут у Літве прыходзіць канец Польшчы, польскай культуры, працы, думкі [...] Найбольш паважныя і мудрыя сярод нас ўпэўнена сцвярджаюць, што мы не пазбегнем разні ў вёсцы»[464].

Гэты трагізм адчувала і сама пісьменніца. У адным з лістоў (7 студзеня 1906 г.) яна сумна канстатавала: «Па вёсках шалее жахлівая навальніца. Шмат маіх найлепшых добрых знаёмых апынуліся ў сітуацыі тройчы трагічнай паміж бандамі раз'юшаных сялян і прыбываючым нібыта на дапамогу войскам. У такім самым стане знаходзіцца Моладаў Скірмунтаў, дзе нядаўна адбываліся сцэны, ад якіх уздымаюцца валасы на галаве. Але мы жывыя. Усе яшчэ жывем». І дадала, што не хвалюецца за ўласнае жыццё, якое і без таго набліжаецца да канца, але «сэрца баліць за іншых, за сваіх, за братоў...»[465]

Дарэчы, затрымка са з'яўленнем вайсковага атрада хутчэй за ўсё была абумоўлена тым, што ва ўсёй Менскай губ. склалася вельмі напружаная сітуцыя. 9 снежня ў Менску і па ўсёй губерні было абвешчана становішча «надзвычайнай аховы». У Пінску баставалі работнікі прамысловасці і гандлю, была паралізавана чыгунка. Па напружанасці сітуацыя была блізкай да паўстання.

---

[463] E. Orzeszkowa, *Listy zebrane*. T. 1–9. Zebrał E. Jankowski. T. 2. Wrocław 1955, s. 417.

[464] Ibidem, s. 417–418.

[465] Ibidem, s. 270–271.

Рэвалюцыйная эйфарыя закранула таксама сялян Парэчча. У снежні 1905 г. яны ўвайшлі на тэрыторыю маёнтка, прымусілі рабочых суконнай фабрыкі і вінакурнага завода спыніць працу і, як адзначаў губернатар, выставілі «всевозможные экономические требования»[466]. У вуснай гісторыі вёскі захавалася памяць пра галодную скаціну, якую «бунтары» забаранялі карміць і пра ініцыятыву слуг з маёнтка, якія пераканалі сялян, што «скот не вінаваты» і выратавалі змучаную жывёлу. Таксама распавядалі, што ініцыятары гэтай акцыі і іх дзеці атрымалі шчодрыя ўзнагароды ад гаспадара маёнтка. А тая частка вёскі, дзе жылі бунтарныя парабкі, атрымала назву *Бунт*.

Дарэчы, сацыяльныя супярэчнасці праяўляліся і ў паслярэвалюцыйныя гады. Так, бальшавіцкая газета «Правда» ў 1912 г. паведамляла пра шматгадовы канфлікт уладальніка Парэчча з сялянамі в. Альшанка, які скончыўся судовым рашэннем пра выплату памешчыку 1 302 руб. За гэты доўг была апісана сялянская скаціна. Аднак сяляне адмаўляліся яе прадаваць. Спробы паліцыі выканаць судовае рашэнне абярнуліся сутычкамі і арыштамі. Сутнасць канфлікту на старонках газеты не раскрывалася. Варта адзначыць, што гэтую гісторыю ў кастрычніку 1937 г. пераказала менская газета «Звязда»[467]. Пра Рамана Скірмунта менскія бальшавікі не забываліся…

Рэвалюцыйныя падзеі не маглі не паўплываць на пэўнае пераасэнсаванне ролі рэвалюцыі нават тымі, хто яшчэ ўлетку вітаў перамены. Рамантычныя надзеі на хуткія і пазітыўныя перамены адыходзілі ў мінулае. Рэчаіснасць аказвалася больш жорсткай. Эліта літоўскіх і беларускіх палякаў пачынала ўсведамляць усю небяспеку аграрнай праблемы. У гэтыя дні Эліза Ажэшка ў лісце да Канстанцыі Скірмунт сцвярджала, што менавіта гэтая праблема з'яўляецца найбольш небяспечнай для «нашай нацыянальнасці і цывілізацыі»: «Альбо сялянскія масы атрымаюць прадмет сваіх пажаданняў, альбо пачнецца завіруха крыві і полымя. У першым выпадку наша нацыя будзе абезгалоўлена […], у другім – апынецца пасярод паводкі крыві і полымя»[468].

Сітуацыя патрабавала рашучых дзеянняў. І Раман Скірмунт яшчэ раз выступіў з прапановай стварэння Краёвай партыі. На гэты раз галоўным аргументам яе стварэння станавілася неабходнасць «спыніць знішчэнне грамадскага ладу» і супольнымі намаганнямі ўсіх народаў Краю будаваць лад у духу «свабоды, права і парадку» на падмурку Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г.

---

[466] К. Шабуня, *Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг.* Минск 1962, с. 274.

[467] *Барацьба сялян з памешчыкам Скірмунтам*, «Звязда».1937, № 243, 21 кастрычніка.

[468] Цыт. па: E. Jankowski, *Eliza Orzeszkowa*. Warszawa 1964, s. 569–570.

ДАКУМЕНТ

Зварот Краёвай партыі Белай Русі і Літвы. 1906 г.[469] Фрагмент.

Ад Рамана Скірмунта з Парэчча (менскага) мы атрымалі просьбу апублікаваць наступны зварот:

Галоўныя сілы, што дзейнічалі на першых этапах рэвалюцыйнай эпохі, складаліся з трох груп:

I. Урад і прыхільнікі старога дзяржаўнага ладу.

II. Партыі парадку, якія бачылі паратунак дзяржавы ў пераходзе да канстытуцыйнага жыцця.

III. Партыі, што намагаюцца перавароту любым коштам і імкнуцца да мэтаў, схаваных ад грамадства.

Каб аслабіць моц старога рэжыму, абедзве апазіцыйныя групы пачалі дзейнічаць супольна на карысць агульнай справы. З-за памылак сваіх правадыроў партыі парадку пацярпелі паразу, а радыкальныя сілы атрымалі рашучую перавагу ў кіраўніцтве вызвольным рухам. Важнай, хоць і не канчатковай перамогай над прыхільнікамі старога рэжыму стаўся Маніфест 17 кастрычніка. Для прыхільнікаў парадку ён стварыў шырокае поле для карыснай працы, магчымасць атрымання самых шырокіх свабод, і часткова ўжо даў гэтыя свабоды. У стасунку да гэтага факта ва ўсім аб'ёме выявілася добра схаваная прынцыповая розніца ў памкненнях двух крылаў апазіцыйнай арміі.

Трэба было распачаць творчую і стваральную працу. Аднак вялікае значэнне 17 кастрычніка аспрэчвалася і пагарджалася апанентамі, варожымі не толькі ўраду, але і грамадству. Іх голас падмануў вялікія масы прыхільнікаў парадку, якія ў віхуры падзей страцілі арыентацыю. На ўсе ўступкі ўрада яны адказвалі новымі патрабаваннямі і варожай дзейнасцю.

Адчуваючы ўласную сілу і падмануўшы былога саюзніка ў барацьбе за свабоду, радыкальныя партыі пачалі рэалізоўваць злачынныя мэты, настройваць адныя колы грамадства супраць другіх. Пачалася падрыўная праца на два франты. Дзеля падтрымкі з боку натоўпу маламаёмаснага насельніцтва яны пачалі заахвочваць да знішчэння і рабавання чужой маёмасці ў вёсках.

[...] Шмат хто з нас падтрымліваў рэвалюцыю, ці то з перакананняў, ці то з апартунізму надзеі, што пажар рэвалюцыі абміне маёмасць яе ваяроў. Да апошняга часу мы падтрымлівалі рэвалюцыю словамі і ахвяраваннямі.

Гэта было памылкай або злачынствам. На срэбранік, ахвяраваны на барацьбу з прыгнётам, была выкутая зброя супраць нас.

Лозунгі вызвалення былі велічнымі, але іх прыўлашчылі і дэкларавалі людзі, якія ў душы сваёй песцілі памкненні і думкі, варожыя агульнаму дабру. Натоўп прызвычаіўся верыць гэтым галасам і пайшоў за імі, хоць самазванныя правады-

[469] R. Skirmunt, *Odezwa Stronnictwa Krajowego Białej Rusi i Litwy*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 7–8.

ры ў блуканнях па бездарожжы даўно змянілі накірунак і выракліся мэтаў, да якіх імкнецца амаль усё грамадства.

Мы марылі пра свабоду і развіццё інтэлектуальнага, грамадскага, палітычнага і эканамічнага жыцця. Але атрыманыя правы ператварыліся ў зброю супраць тых, хто не хоча падпарадкоўвацца загадам тыранаў анархічнага руху.

Тыя, хто найбольш голасна заклікаў да свабоды слова, сходаў і саюзаў на самой справе гвалцілі гэтую свабоду, каб не даць слова людзям, што маюць адрозныя ад іх погляды, імкнуліся пазбавіць грамадства правоў, якія лічацца святым здабыткам чалавецтва. Замест бачнага прыгнёту зверху мы атрымалі ананімны тэрор і тыранію людзей, якія хаваюцца ад дзённага святла.

Настаў час зразумець, што падтрымліваючы рэвалюцыю, мы крочым не да выпраўлення, а да знішчэння грамадскага ладу. Прыйшоў час вызваліцца ад гіпнозу, якому паддаліся, як тая птушка, што сама ляціць у пашчу крыважэрнага драпежніка.

[...] Дзеля гэтага неабходна з'яднаць усе нашы сілы. Раздрабленне партый у такі адказны момант вядзе да слабасці і згубы. Мы павінны адкласці спрэчкі пра неістотнае на заўтра і сабраць разам усе сілы, гатовыя абараняць прынцыпы свабоды і законнасці з улікам інтарэсаў шырокіх народных мас, дзяржаўнага і грамадскага ладу, які трэба разумець у хрысціянскім духу.

У якасці базавай мы прынялі праграму Менскага таварыства сельскай гаспадаркі, дапоўненую праграмай Краёвай партыі Літвы і Русі. Мы імкнемся да паразумення з людзьмі, блізкімі да нас па спосабу мыслення, з грамадзянамі ўсіх слаёў і саслоўяў Белай Русі і Літвы. Павінны наладзіць стасункі з блізкімі да нас партыямі іншых рэгіёнаў дзяржавы. Мы хочам падтрымліваць стасункі з тымі партыямі імперыі, якія прызнаюць важныя для нас прынцыпы дзеля абароны агульных мэтаў і лепшага разумення імі нашай сітуацыі, у якой яны, на жаль, не арыентуюцца.

[...] Калі ж не атрымаецца дасягнуць зліцця ўсіх груп нашага краю, якія прытрымліваюцца падобных прынцыпаў, то мы павінны стварыць саюз гэтых партый дзеля аб'яднання намаганняў у справах першачарговай вагі і дзеля паразумення з блізкімі па поглядах партыямі іншых рэгіёнаў дзяржавы.

У заключэнне Раман Скірмунт абяцаў у бліжэйшы час разаслаць запрашэнні на сход у Менску ўсім тым асобам, якія імкнуцца да ўмацавання прававога ладу на падмурку прынцыпаў Маніфеста 17 кастрычніка.

Звяртае на сябе ўвагу змена ў назве партыі. У гэтым звароце яна фігуруе як «Краевая партыя Белай Русі і Літвы». Магчыма, гэта сведчанне перамен у свядомасці некаторых краёўцаў (прынамсі, Рамана Скірмунта), якія павярнуліся да беларушчыны. Тэрмін «Русь» канчаткова саступіў месца тэрміну «Белая Русь». Зрэшты, апошні фігураваў ужо напрыканцы звароту ад 17 лістапада 1905 г. Таксама варта звярнуць увагу на заклік да яднання розных палітычных сіл, якія маюць агуль-

ную мэту. Падобнае імкненне было характэрнай рысай усёй палітычнай дзейнасці Рамана Скірмунта, якая праяўлялася ў розныя часы і ў розных сітуацыях.

Звароты Рамана Скірмунта па стварэнні Краёвай партыі засведчылі гатоўнасць эліты мясцовай польскай супольнасці да актыўнага ўдзелу ў палітычным і грамадскім жыцці Беларуска-Літоўскага краю і ўсёй Расіі, якая стала на шлях пераўтварэння ў канстытуцыйную манархію.

Відавочна, што Раман Скірмунт адным з першых прамовіў тое, што сапраўды хвалявала эліту літоўскіх і беларускіх палякаў. Гэтае «краёвае» рознагалоссе было надзвычай карысным. Ягоныя ўдзельнікі пагаджаліся ў галоўным, а менавіта ў імкненні нейтралізаваць нацыянальныя і сацыяльныя лініі расколу краёвага грамадства, актуалізаваць традыцыі талерантнасці часоў Вялікага Княства Літоўскага і, нарэшце, ператварыць Край у суб'ект палітычнага жыцця Расіі, у якім літоўскія і беларускія палякі захаваюць свае эканамічныя і культурныя пазіцыі. Голас Рамана Скірмунта ў гэтым рознагалоссі ў 1905–1906 гг. быў адным з найбольш выразных.

Але трэба аддаць належнае таксама іншым ідэолагам краёвасці. Значную ролю ў далейшай распрацоўцы канцэпцыі краёвасці ў гэты час адыгралі публікацыі Баляслава Ялавецкага, Канстанцыі Скірмунт, Міхала Ромэра, «кансерватыўна-краёвая» пазіцыя штодзённага «Кур'ера Літэўскага» (падчас яго рэдагавання Чэславам Янкоўскім у 1905–1907 гг.), «ліберальна-краёвая» праграма «Газеты Віленьскай» (рэдактар Міхал Ромэр, 1906), а таксама стварэнне Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (1906) на чале з віленскім біскупам Эдвардам фон Ропам.

Варта спыніцца на *Нацыянальным катэхізісе Літвы* Баляслава Ялавецкага (1905), які таксама прапанаваў палітычную праграму[470]. На момант выдання *Катэхізіса* Ялавецкі быў адным з вядучых інжынераў чыгуначнага транспарту ў Расіі, арганізатарам першага ў краіне Таварыства вузкакалеек, сябрам Віленскага таварыства сельскай гаспадаркі. Ключавымі для Б. Ялавецкага былі пытанні, выкарыстаныя ў якасці эпіграфа: «Хто мы? Што нам патрэбна? Што трэба рабіць, каб усім нам было добра, як дзецям нашай агульнай маці-Айчыны?..»

Аўтар таксама пісаў пра «адзіную нацыю» з агульнай культурай, якую ўтварылі палякі, літоўцы і беларусы ў выніку супольнага гістарычнага лёсу. Існаванне трох розных моваў і для яго не было істотным. Усе яны абвяшчаліся «роднымі для нас, бо ў нашых жылах цячэ адна кроў»[471].

На старонках *Катэхізіса* шырока ўжываўся тэрмін «грамадзяне краю». Ялавецкі найважнейшым лічыў дасягненне рэальнага адзінства ў намаганнях па пераадоленні таго цяжкага становішча, у якім апынуўся Край: «Перш за ўсё мы, як грамадзяне краю, незалежна ад саслоўнай прыналежнасці, нацыянальнасці,

---

[470] B. J...i [B. Jałowiecki], *Litwa – jej potrzeby... Katechizm narodowy Litwy*. Wilno [1905].

[471] Ibidem, s. 6.

веравызнання, павінны паціснуць адзін аднаму рукі і з узаемным даверам узяцца за працу [...] Асобны чалавек ці асобная сацыяльная група не шмат здолеюць зрабіць, але калі за працу бярэцца ўся супольнасць, то пры мінімальных намаганнях у самым кароткім часе робіцца тое, чаго першыя не дамагліся б і за некалькі гадоў самай цяжкай працы, бо толькі ў адзінстве – моц»[472].

Ён заклікаў да распрацоўкі праграмы «грамадскай працы» на падмурку Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. і далейшага развіцця канстытуцыяналізму. Падкрэслівалася вялікае значэнне дзейнасці Дзяржаўнай Думы. У якасці галоўных тэзісаў гэтай праграмы прапаноўвалася ўтварэнне на тэрыторыі шасці беларускалітоўскіх губерняў «Літоўскай правінцыі» з шырокім самакіраваннем як для самой «правінцыі», так і для яе складовых частак – акругаў і гмінаў. Нормай жыцця Краю павінны былі стаць свабода веравызнання, роўнасць у правах незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання і пола, роўнасць саслоўяў, свабода слова, друку, сходаў, саюзаў і арганізацый, недатыкальнасць асобы і жытла, незалежнасць судоў ад адміністрацыі і г. д. Таксама сцвярджалася неабходнасць першынства карэннага насельніцтва (аўтар ужыў тэрмін «краёўцы») ва ўсіх органах самакіравання, у судзе, а таксама свабода карыстання «краёвымі мовамі», а менавіта польскай, літоўскай і беларускай. Мову выкладання ў школах павінна было вызначаць якраз мясцовае самакіраванне.

Выключна ў кампетэнцыі самакіравання знаходзілася правядзенне аграрнай рэформы. Аўтар *Катэхізіса* лічыў, што аграрная праблема ў Літве павінна вырашацца шляхам камасацыі надзелаў і падтрымкі невялікіх, але моцных гаспадарак праз паступовае набыццё іх уладальнікамі новых угоддзяў, прадастаўленне таннага крэдыту, развіццё кааперацыі, ліквідацыю цераспалосіцы і сервітутаў з правам (у пэўных выпадках) прымусовага адчужэння земляў у адпаведных памерах за аплату па яе рэальным кошце, не парушаючы сістэмы гаспадаркі фальварка або вёскі ды інш.[473]

Краёвая праграма Баляслава Ялавецкага ўключала таксама «братэрскае» стаўленне да рускіх і габрэяў, якія пастаянна жывуць у Краі, але толькі ў выпадку, калі яны «самі захочуць стаць актыўнымі грамадзянамі нашага Краю і будуць прымаць шчыры ўдзел у грамадскай працы»[474]. Пры гэтым выказвалася патрабаванне адмены рысы габрэйскай аселасці.

Трэба адзначыць, што ў якасці галоўнага суб'екта грамадска-палітычнага жыцця аўтары «краёвых» тэкстаў успрымалі менавіта эліту літоўскіх і беларускіх палякаў. Сцвярджэнне, што воблік краю вызначае люд, а не шляхта (Р. Скірмунт) было разлічана на ўсведамленне мясцовымі польскімі элітамі неабходнасці ўлічваць інтарэсы сацыяльных нізоў Беларусі і Літвы. У агульнапалітычных пы-

[472] Ibidem, s. 10–11.

[473] Ibidem, s. 19–20.

[474] Ibidem, s. 21.

таннях Баляслаў Ялавецкі, Раман і Кастанцыя Скірмунты знаходзіліся ў рэчышчы лібералізму. Яны адстойвалі права насельніцтва на ўсю паўнату грамадзянскіх і палітычных свабод і выступалі як прыхільнікі эвалюцыйнага шляху развіцця грамадства. На гэтым шляху было магчыма паразуменне грамадства з уладай, якая разумелася досыць шырока (прынамсі, яна ўключала ў сябе ліберальную бюракратыю). Краёўцы таксама адрозніваліся беражлівым стаўленнем да гістарычных і культурных традыцый, што лічыліся падмуркам развіцця Краю. Усё гэта дае падставы для акрэслення гэтага кірунку краёвасці як кансерватыўна-ліберальнага. Дарэчы, вядомы амерыканскі гісторык Рычард Пайпс характарызаваў такіх расійскіх палітыкаў пачатку XX ст. як Дзмітры Шыпаў і Аляксандр Гучкоў як кансерватыўных ліберальў[475].

Сваю ролю ў пашырэнні краёвасці адыгрываў таксама пэўны прагматызм. Многія ідэолагі кансерватыўна-ліберальнага кірунку разумелі, што краёвая ідэя можа паспрыяць захаванню элітай літоўскіх палякаў уласных эканамічных і культурных пазіцый. Працэс мадэрнізацыі грамадства Беларусі і Літвы, прыспешаны пераменамі 1905–1907 гг., актуалізаваў праблему месца польскай эліты ў новым грамадстве. Яшчэ больш яе абвастрала палітыка русіфікацыі.

Цэнтрам краёўцаў кансерватыўна-ліберальнага накірунку стаў штодзённы «Кур'ер Літэўскі», першы нумар якога выйшаў 1 верасня 1905 г. У снежні ягоным рэдактарам стаў публіцыст, гісторык і паэт Чэслаў Янкоўскі, які займаў гэтую пасаду да красавіка 1907 г. Новы рэдактар падзяляў асноўныя палажэнні праграмы краёўцаў кансерватыўна-ліберальнага кірунку і здолеў зрабіць з «Кур'ера» ўплывовы і папулярны орган друку.

Думскі перыяд

Выбары ў Дзяржаўную Думу сталі першым сур'ёзным выпрабаваннем для краёвай ідэі і яе носьбітаў. Асабіста для Рамана Скірмунта гэтыя выбары і праца ў Думе былі добрай школай палітычнай дзейнасці. Дзякуючы актыўнаму ўдзелу ў думскіх пасяджэннях яго імя прагучала далёка па-за межамі Беларусі і Літвы, але менавіта ў гэты час былі пакладзены першыя цаглінкі ў вобраз «рэакцыянера» Скірмунта.

Палітычная дзейнасць краёўцаў падчас выбараў у Думу і яе дзейнасці заслугоўвае асаблівай ўвагі. На фоне актывізацыі нацыянальных рухаў і абвастрэння сацыяльных адносін яны дэкларавалі імкненне ўзняцца над нацыянальнымі і сацыяльнымі супярэчнасцямі. Абвяшчэнне ў якасці першачарговай задачы абароны інтарэсаў усяго Беларуска-Літоўскага краю і ягоных народаў можна расцэньваць як першую у беларускай і літоўскай гісторыі спробу ідэалагічнага абгрунтавання існавання палітычнай нацыі. Але, насамрэч, у перыяд рэвалюцыі

[475] Р. Пайпс, *Русская революция*: В 2-х ч. Частка 1. Москва 1994, с. 182.

1905–1907 гг. ажыццявіць гэтую дэкларацыю не атрымалася. Яна засталася хутчэй заявай пра намеры.

У гэты перыяд краёўцы ўяўлялі сабой сапраўдны кангламерат дзеячаў з розным разуменнем сутнасці краёвай ідэі, але большасць з іх заставалася ў рэчышчы польскага грамадска-палітычнага руху. У тагачасных умовах многім мясцовым палякам «краёвая пазіцыя» здавалася найбольш аптымальнай для абароны ўласных эканамічных і нацыянальна-культурных пазіцый. У большай ступені гэта было характэрна для беларускіх земляў, дзе адсутнічаў нацыянальны польска-беларускі канфлікт, а падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг. мелі выразную сацыяльную афарбоўку.

На літоўскіх землях сітуацыя была больш складаная. Польска-літоўскі канфлікт яшчэ да рэвалюцыі праявіўся ў вострых спрэчках і сутычках па праблеме мовы касцельнага набажэнства або ў ацэнках «младаліцвінамі» ролі палякаў у гісторыі. Нацыянальная ідэя паступова пашыралася нават сярод літоўскага сялянства. У 1905 г. у многіх мясцовасцях Ковенскай губ. рэвалюцыйныя падзеі набылі выразную нацыянальную афарбоўку. Літоўскія гісторыкі гавораць пра нацыянальную рэвалюцыю ў Літве ў 1905 г.

Нацыянальныя і сацыяльныя перамены пачатку XX ст. для супольнасці літоўскіх і беларускіх палякаў сталі сапраўдным гістарычным выклікам. Краёвасць была адным з варыянтаў адказу на яго.

Нацыянальна-дэмакратычная плынь польскага руху ў Беларусі і Літве актывізавалася толькі напрыканцы 1905 г. У лютым 1906 г. было абвешчана стварэнне Польскай дэмакратычна-нацыянальнай партыі Літвы і апублікавана яе праграма[476]. Аднак існаванне партыі фактычна толькі дэкларавалася. Спробы адшукаць сярод архіўных дакументаў, успамінаў і матэрыялаў друку сляды дзейнасці гэтай партыйнай арганізацыі аказаліся марнымі. Таксама не шмат здолеў распавесці пра яе дзейнасць у азначаны перыяд гісторык Пшэмыслаў Дамброўскі ў манаграфіі, прысвечанай дзейнасці нацыянальных дэмакратаў на беларуска-літоўскіх землях у 1897–1918 гг.[477] Магчыма, публікацыя праграмы партыі была прадыктавана выключна агітацыйнымі намерамі ў сувязі з набліжэннем выбараў у Думу. Тым не менш, ідэі Рамана Дмоўскага (1864–1939) таксама станавіліся варыянтам адказу літоўскіх палякаў на выклікі новай эпохі.

Адной з галоўных мэтаў нацыянальных дэмакратаў было дасягненне аўтаноміі Каралеўства Польскага. А вось для краёўцаў найважнейшай задачай было ўвядзенне самакіравання ў Беларусі і Літве. Патрабаванне аўтаноміі для Каралеўства Польскага яны падтрымлівалі, але ўключаць яго ў сваю праграму не збіраліся. Краёўцы таксама выказваліся за роўныя магчымасці для развіцця нацыянальных

---

[476] *Polskie Stronnictwo demokratyczno-narodowe na Litwie*, Wilno 1906.

[477] P. Dąbrowski, *Narodowa Demokracja byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Studium z zakresu mysli politycznej i działalnosci obozu narodowego na ziemiach litewsko-białoruskich w latach 1897–1918*. Krakow 2010, s. 27–47.

культур усіх народаў Краю. Мэтаю нацыянальных дэмакратаў было дамінаванне польскай культуры.

Трэба адзначыць, што канцэпцыя краёвасці падчас рэвалюцыі атрымала далейшае развіццё. Так, у лютым 1906 г. аформілася дэмакратычна-ліберальная плынь краёвасці, цэнтрам якой стала «Газета Віленьска». Выданнем кіраваў Міхал Ромэр. У 1905 г. ён вярнуўся з Парыжа ў Вільню і акунуўся ў атмасферу рэвалюцыйных перамен. Гэты палітык і публіцыст быў звязаны з дзеячамі літоўскага руху, падтрымліваў кантакты з беларускімі адраджэнцамі. У адрозненні ад Р. Скірмунта ён разумеў краёвасць не як сужыцце розных этнасаў-нацый, а як утварэнне новай палітычнай нацыі. Пры гэтым усе этнасы, што зліваліся ў «нацыю ліцвінаў», павінны былі мець свабоду для развіцця ўласнай культуры.

У рэдакцыйным артыкуле першага нумара «Газеты Віленьскай» тлумачылася пазіцыя выдання: «Мы павінны кіравацца інтарэсамі Краю. У гэтым зыходны пункт усялякай палітычнай, грамадскай і культурнай дзейнасці. Мы – грамадзяне Літвы і Беларусі. І наш грамадзянскі абавязак – служыць роднаму Краю. Мы не можам быць польскімі каланістамі. З палітычнага пункту гледжання нашай Радзімай з'яўляецца Беларусь і Літва. Толькі з культурна-нацыянальнага – мы дзеці польскага народу»[478].

Паводле краёўцаў, польскасць заўсёды несла з сабой узоры талерантнасці і дэмакратыі. З гэтымі якасцямі яны звязвалі будучыню палякаў у Краі: «Польскасць у Літве можа забяспечыць сваю будучыню толькі пры ўмове радыкальнай дэмакратызацыі»[479].

Менавіта ў рэчышчы краёвай ідэалогіі дзейнічала першая легальная палітычная партыя краю – Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі (ККП) (1906). Яе заснавальнік і кіраўнік віленскі біскуп Эдвард фон Роп быў прыкметнай постаццю сярод краёўцаў кансерватыўна-ліберальнай арыентацыі.

Для праграмы Канстытуцыйна-каталіцкай партыі было характэрным пэўнае спалучэнне краёвасці з хрысціянска-дэмакратычнай ідэалогіяй[480]. Сярод галоўных пастулатаў праграмы трэба адзначыць пераўтварэнне Расіі ў дзяржаву шырокага самакіравання (фактычна гаворка ішла пра аўтаномію Беларуска-Літоўскага краю, хоць адкрыта гэтая мэта не прапісвалася), вырашэнне аграрнага пытання на падмурку прынцыпа недатыкальнасці прыватнай уласнасці, стварэнне бясплатнай народнай школы з адукацыяй на роднай мове і абавязковым вывучэннем рэлігіі, вяртанне каталіцкаму касцёлу маёмасці, канфіскаванай пасля паўстання 1863 г. або кампенсацыя гэтых страт ды інш.

Трэба адзначыць, што частка эліты літоўскіх палякаў даволі крытычна паставілася да палітычнай дзейнасці кліра. Распачалася дыскусія. На шматлікія

---

[478] «Gazeta Wileńska». 1906, Nr 1.

[479] Ibidem, Nr 37.

[480] *Program Stronnictwa Konstytucyjno-Katolickiego na Litwe i Białorus.* Wilno 1906.

заўвагі на старонках газеты «Навіны віленьске» адказваў біскуп. Менавіта ён быў галоўным аўтарам праграмы.

Партыя праіснавала нядоўга, бо ўжо ў сакавіку 1906 г. улады забаранілі правядзенне яе сходаў. Аднак актыўнасць яе сяброў напярэдадні і падчас выбараў у Думу мела плен. Так, з сямі дэпутатаў Думы ад Віленскай губ. шасцёра падтрымлівалі праграму ККП. Адным з дэпутатаў стаў віленскі біскуп.

У сакавіку 1906 г. Канстанцыя Скірмунт на старонках «Кур'ера Літэўскага» ў артыкуле «Краёвае кола» падтрымала ідэю стварэння агульнакраёвай партыі. Гэта быў адзін з першых водгукаў на зварот Рамана Скірмунта. Паводле меркавання публіцысткі, патрэба ў палітычнай арганізацыі, якая б з'яднала народы Краю, была відавочнай. Канстытуцыйна-каталіцкая партыя распачала гэты працэс, каб стаць ядром Краёвага кола. Да яго планавалася далучыць таксама праваслаўнае беларускае насельніцтва. Працяг працэсу партыйнага будаўніцтва публіцыстка звязвала з дзейнасцю МТСГ і ягонага нязменнага кіраўніка Э. Вайніловіча[481]. Галоўныя мэты дзейнасці Краёвага кола звязваліся з выбарамі ў Дзяржаўную Думу. Гэтым выбарам палякі Беларусі і Літвы надавалі вялікае значэнне. Менавіта на Думу ўскладаліся галоўныя надзеі на рэфармаванне палітычнай сістэмы і паляпшэнне становішча Краю.

Пачатак 1906 г. праходзіў пад знакам набліжэння выбараў, якія былі прызначаны на сакавік-красавік. Ужо ў студзені 1906 г. пачалі ўзнікаць польскія выбарчыя камітэты. Ініцыятыву захапілі краёўцы кансерватыўна-ліберальнай арыентацыі. Менавіта яны ўтварылі Выбарчы камітэт землеўласнікаў Менскай губ., аснову якога склалі сябры МТСГ. Яго праграма прадугледжвала прыняцце канстытуцыі, дзяржаўныя гарантыі дэмакратычных свабод, усеагульнае і роўнае выбарчае права, ільготы малазямельным і беззямельным сялянам пры набыцці зямлі, ліквідацыю цераспалосіцы, недатыкальнасць прыватнай уласнасці і земскае самакіраванне[482].

Па меры набліжэння губернскіх выбарчых з'ездаў станавілася відавочным, што аніводная з трох выбарчых «курый» (землеўласнікі, гарадская і сялянская курыі) паасобку поспеху не дасягне. Напярэдадні з'езда ў Менску сябры МТСГ абмяркоўвалі два варыянты ўласнай тактыкі: змагацца за тое, каб кожная нацыянальнасць і кожны сацыяльны слой атрымалі дэпутацкія месцы або весці барацьбу выключна за поспех «сваіх» дэпутатаў? Абмеркаванне было вострым. У дадзеным выпадку краёвая пазіцыя задавальняла не ўсіх. Урэшце перамог першы падыход, але большасцю ўсяго ў адзін голас. Варта адзначыць, што гэта быў голас Аляксандра Аляксандравіча Скірмунта з Парэчча, які выказаўся апошнім[483].

Іншае важнае пытанне датычыла будучыні абранцаў літоўскіх палякаў

---

[481] Futurus [K. Skirmuntt], *Koło Krajowe*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 49.

[482] «Kurier Litewski». 1906, Nr 19.

[483] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 112.

у Дзяржаўнай Думе, а дакладней іх магчымага далучэння да дэпутатаў з Каралеўства Польскага. Гэтая дыскусія яшчэ больш актуалізавала краевую ідэю.

Эдвард Вайніловіч на старонках «Кур'ера Літэўскага» заклікаў будучых дэпутатаў быць салідарнымі і кіравацца толькі патрэбамі «Літвы і Русі», не пераймать лозунгі Варшавы ці Масквы, а абапірацца выключна на ўласную гісторыю і традыцыі. Ён катэгарычна выказаўся ў падтрымку ідэі Рамана Скірмунта наконт стварэння фракцыі дэпутатаў, асобнай ад Каралеўства Польскага, якую назваў «Краёвай партыяй Літвы і Русі». Паводле Вайніловіча, яна будзе моцнай, калі з'яднае намаганні ўсіх краевых арганізацый, у т. л. Канстытуцыйна-каталіцкай партыі, Менскага ды іншых таварыстваў сельскай гаспадаркі, а таксама будзе абараняць інтарэсы ўсіх народаў Краю[484].

Гэтую пазіцыю найбольш паслядоўна адстойваў Раман Скірмунт. 11 сакавіка 1906 г. падчас выбарчага сходу курыі землеўласнікаў у в. Хойна Пінскага пав. ён быў абраны дэпутатам на павятовы сход выбаршчыкаў у Пінск[485]. Ужо пінскі сход накіраваў яго ў Менск для ўдзелу ў заключным этапе выбараў ад губерні.

Выбары ў Менску аказаліся найбольш паспяховымі для літоўскіх і беларускіх палякаў. Напярэдадні яны заключылі пагадненне з прадстаўнікамі «гарадской курыі», што выклікала пратэсты сялянскіх удзельнікаў выбарчага сходу. У знак пратэсту сяляне пакінулі губернскі з'езд. У выніку дэпутатамі Думы былі абраны сямёра прадстаўнікоў мясцовай польскай супольнасці, у т. л. Раман Скірмунт. Па колькасці набраных галасоў (86) ён саступіў толькі адвакату Аляксандру Лядніцкаму (88)[486]. Дарэчы, апошні пазней сцвярджаў, што Раман Скірмунт імкнуўся не дапусціць сыходу прадстаўнікоў сялянства з выбарчага з'езда і нават хацеў зняць уласную кандыдатуру дзеля сялянскага дэпутата[487]. Ён выразна імкнуўся да паразумення з сялянамі. Але апошнія гэтай ахвяры не прынялі.

Пасля завяршэння выбараў «Кур'ер Літэўскі» пачаў знаёміць чытачоў з біяграфіямі і праграмамі польскіх дэпутатаў. У біяграме Рамана Скірмунта асаблівая ўвага надавалася якраз ягонай краёвай пазіцыі і стаўленню да народаў Краю. Сцвярджалася, што ён лічыць беларусаў моцным і скансалідаваным народам, верыць у адметнасць і перспектывы развіцця беларускай культуры. Цікава, што ў гэтым месцы прадстаўнік рэдакцыі не ўстрымаўся ад уласнага каментара. На яго думку, пазіцыя дэпутата тлумачылася яго пражываннем не столькі сярод беларускага, колькі сярод «маларускага» народу. Р. Скірмунт нібыта бачыў іх блізкасць і меў на ўвазе агульную «рускую» праблему. Таксама каментатар падкрэсліў (!), што дэпутат лічыў сябе палякам.

Яшчэ адзначалася, што Скірмунт выступае за стварэнне асобнай дэпутацкай

---

[484] E. Woyniłłowicz, *Koło Polskie*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 80.

[485] НГАБ. Ф. 519, воп. 1, спр. 1, арк. 119.

[486] «Kurier Litewski». 1906, Nr 85.

[487] A. Lednicki, *Po wyborach*, «Kurier litewski». 1907, Nr 41.

фракцыі («Кола Літвы і Русі»), але не хоча, каб яна было выключна польскім. Ягонай мэтаю з'яўляецца ўтварэнне фракцыі з удзелам беларусаў, літоўцаў і, магчыма, габрэяў. Пры гэтым ён усведамляе, што гэта задача заўтрашняга дня[488].

Цікава, што гэтая інфармацыя істотна адрознівалася ад той, якую змясцілі ўкладальнікі альбомаў з біяграфіямі і фотапартрэтамі дэпутатаў Дзяржаўнай Думы (1906). У пецярбургскім выданні адзначалася актыўная дзейнасць Рамана Скірмунта ў МТСГ, асабліва ў справе наладжвання стасункаў з сялянствам: «Много сделал в целях сближения помещиков с крестьянами, и по его инициативе в Минское сельскохозяйственное общество стали принимать крестьян на льготных условиях». Таксама адзначалася, што ў публіцыстыцы дэпутата дамінуе прынцып «мирного сожительства национальностей». Палітычныя погляды характарызаваліся адным словам: *прогрессист*. Укладальнікі сцвярджалі ягоную прыналежнасць да «Группы представителей западных окраин», а таксама да думскай фракцыі Саюза аўтанамістаў»[489].

У аналагічным маскоўскім выданні Скірмунт характарызаваўся як «польский националист, защитник автономии Польши». Пры гэтым ён застаўся *прогрессистом* і быў «человеком твёрдых убеждений, серьёзным и деятельным»[490]. Як бачна, укладальнікаў зусім не зацікавіла краёвая пазіцыя дэпутата. Яны фактычна ўпісвалі Р. Скірмунта ў кола больш зразумелых ім паняццяў. Менавіта пра гэта думаеш, калі разважаеш над гіпатэтычнай прыналежнасцю Р. Скірмунта да *прогрессистов*. У перыяд I Дзяржаўнай Думы гэты тэрмін быў сінонімам лібералізму і азначаў прыхільнасць ідэі прагрэсу і развіцця. Ён сапраўды адпавядаў поглядам дэпутата Менскай губ., але пры гэтым ператвараў яго ў звычайнага расійскага палітыка.

Апрача Скірмунта краёвую ідэю ў Думе гатовы былі падтрымаць уладальнік маёнтка Лунін у Пінскім пав. князь Геранім Друцкі-Любецкі (1861–1919), адвакат і сябра Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі Аляксандр Лядніцкі (1866–1934), а таксама абранцы Віленскай губ. біскуп Эдвард фон Роп, рэдактар «Кур'ера Літэўскага» Чэслаў Янкоўскі і Баляслаў Ялавецкі.

Усяго прадстаўнікі польскага грамадства атрымалі 14 дэпутацкіх мандатаў. Поспех быў абумоўлены колькасцю і згуртаванасцю літоўскіх і беларускіх палякаў і іх падрыхтаванасцю да палітычнай барацьбы. Гэта праявілася ў дзейнасці шматлікіх выбарчых камітэтаў і арганізацый, актыўнасці Канстытуцыйна-каталіцкай партыі, якая выкарыстоўвала аўтарытэт каталіцкага духавенства.

---

[488] «Kurier Litewski». 1906, Nr 86.

[489] *Биографии членов Государственной Думы*. Укладальник Г. В. Малаховский. Санкт-Петербург 1906, с. 38.

[490] *Первая Государственная Дума. Алфавитный список и подробные характеристики и биографии членов Государственной Думы*. Москва 1906, с. 109.

Моцную падтрымку ў час выбараў яны атрымалі ад губернскіх таварыстваў сельскай гаспадаркі і польскага віленскага друку.

Яшчэ больш паспяховымі для літоўскіх палякаў былі выбары ў Дзяржаўную Раду. Ва ўсіх шасці беларуска-літоўскіх губернях перамаглі іх прадстаўнікі, большасць якіх былі кіраўнікамі губернскіх таварыстваў сельскай гаспадаркі. Менскую губ. у Дзяржаўнай Радзе павінен быў прадстаўляць кіраўнік МТСГ, аднадумец і сябра Скірмунта Эдвард Вайніловіч.

27 красавіка 1906 г. у Таўрычаскім палацы адбылося ўрачыстае адкрыццё працы Дзяржаўнай Думы. Вось як пазней успамінаў пра гэта Вайніловіч: «Зала была перапоўнена, а напружанне было такім, што, здавалася, дастаткова было невялікага інцыдэнта, каб справакаваць выбух. У сувязі з хваробаю састарэлага старшыні Дзяржаўнай Рады графа Дзмітрыя Сольскага ў прэзідыуме засядаў віцэ-старшыня Эдуард Фрыш. Ён зачытаў зварот імператара і даручыў сходу распачаць абранне старшыні Дзяржаўнай Думы. У сувязі з неабходнасцю выканання ўсіх маніпуляцый пры падачы і падліку галасоў працэдура зацягнулася, хоць кожны ведаў, што кадэты, якія «правілі баль» у Думе, ужо даўно прызначылі на гэтае месца маскоўскага адваката Сяргея Мурамцава. Урэшце Мурамцаў пад бурныя апладысменты заняў крэсла старшыні, падзякаваў за аказаны давер і прапанаваў пракрычаць *Ура!* у гонар «канстытуцыйнага манарха». Гэты тэрмін, які не быў прадугледжаны і зацверджаны ні ў якіх афіцыйных дакументах, выклікаў сапраўдны шквал апладысментаў»[491].

Ужо першыя прамовы, у т. л. старшыні Думы, яскрава паказалі, што дэпутаты не збіраюцца дзейнічаць выключна ў рамках вызначанай кампетэнцыі. Сяргей Мурамцаў заявіў, што ў дзейнасці Думы будзе рэалізоўвацца «воля народа» і заклікаў да працы дзеля народу і Радзімы.

Дэпутаты літоўскіх і беларускіх палякаў прыехалі ў Пецярбург, так і не скончыўшы дыскусію аб лёсе іх дэпутацкай групы. Толькі 4 мая было прынята канчатковае рашэнне стварыць самастойную тэрытарыяльна-нацыянальную фракцыю з уласнай праграмай і назвай «Група дэпутатаў ад заходніх губерняў». У друку яе звычайна называлі «Тэрытарыяльным колам». Прынцыповае значэнне мела заява, што ўвайсці ў «Групу» могуць усе дэпутаты Беларуска-Літоўскага краю незалежна ад нацыянальнасці.

Распрацоўка праграмы была закончана ў сярэдзіне чэрвеня 1906 г. Галоўнай мэтай абвяшчалася мірнае суіснаванне ўсіх народаў Краю і задавальненне іх патрэб. Будучае дзяржавы звязвалася з канстытуцыйна-парламенцкім ладам, заснаваным на дэмакратычных прынцыпах. Таксама праграма ўключала патрабаванні ўвядзення асноўных дэмакратычных свабод, поўнай роўнасці ўсіх грамадзян незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання, ліквідацыі саслоўнага падзелу, канстытуцыйнага забеспячэння нацыянальных і культурных патрэб і правоў

[491] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 119.

нацыянальных меншасцяў, стварэнне органаў самакіравання як пераход да федэратыўнай структуры Расійскай дзяржавы, дазволу на карыстанне мясцовымі мовамі ў адміністрацыйных установах, судах, школах і грамадскіх арганізацыях, увядзення ўсеагульнага бясплатнага пачатковага навучання ды інш.

У аграрным пытанні адзінства дэпутаты не дасягнулі. Яны згаджаліся, што яго вырашэннем павінны займацца органы мясцовага самакіравання на аснове прынцыпа прыватнай уласнасці на зямлю і шляхам паляпшэння і павялічэння зямельнай уласнасці сялян. Дзеля гэтага прапанавалася выкарыстанне казённых, манастырскіх, дзяржаўных і кабінецкіх зямель. Розніца поглядаў датычыла толькі лёсу памешчыцкага землеўладання. «Палажэнне А» вызначала яго так: «Магчыма частковае прымусовае адчужэнне памешчыцкіх зямель за выкуп». «Палажэнне Б»: «Магчыма прымусовае адчужэнне прыватных зямель дзеля камасацыі, урэгулявання праблемы сервітутаў, ліквідацыі цераспалосіцы». Апошні варыянт прадугледжваў большыя гарантыі для захавання памешчыцкага землеўладання.

Якой была пазіцыя Рамана Скірмунта? На пачатку мая 1906 г. уласнае апытанне сярод сяброў «Групы дэпутатаў ад заходніх губерняў» правёў «Кур'ер Літэўскі». Першым выказаўся якраз Раман Скірмунт, абраны ў склад Аграрнай камісіі Думы: «У Думе ёсць шмат прыхільнікаў рабавання землеўласнікаў і нацыяналізацыі зямлі. Але большасць не дапусціць перамогі ініцыятараў гэтых рызыкоўных эксперыментаў. Перадача сялянам дадатковага надзелу магчыма толькі ў Цэнтральнай Расіі. У нас можа быць толькі частковае адчужэнне памешчыцкіх зямель за выкуп»[492]. Неабходнасць частковага адчужэння за выкуп таксама прызнавалі Геранім Друцкі-Любецкі і Эдвард фон Роп. «Палажэнне Б» падтрымалі Баляслаў Ялавецкі і Чэслаў Янкоўскі.

8 мая 1906 г. Дума пачала абмеркаванне аграрнага пытання. Да найбольш папулярных праектаў яго вырашэння належаў праект Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі, які прадугледжваў прымусовы выкуп прыватнаўласніцкіх земляў і перадачу іх сялянам. Апрача таго, дэпутаты г. зв. *Трудовой группы* («праект 104-х») прапанавалі стварэнне «грамадскага зямельнага фонда» дзеля забеспячэння зямлёй малазямельных і беззямельных сялян на ўмовах арэнды ўчасткаў у межах вызначанай «працоўнай нормы». Існаваў таксама эсэраўскі праект, які зыходзіў з пастулата ліквідацыі прыватнай уласнасці на зямлю і абвяшчэння яе ўласнасцю ўсяго насельніцтва Расіі.

Першым з дэпутатаў «Групы» ў Думе выступіў якраз Раман Скірмунт. Ён прызнаў неабходным павелічэнне сялянскага землеўладання, але выказаўся супраць папулярных у Думе і грамадстве праектаў радыкальнай аграрнай рэформы. Дэпутат рэзка крытыкаваў аграрны праект *трудовиков*, які прадугледжваў адчужэнне часткі памешчыцкіх зямель ды іх нацыяналізацыю разам з былымі царкоўнымі і казённымі ўладаннямі. Землі гэтага дзяржаўнага фонду потым пла-

[492] «Kurier Litewski». 1906, Nr 103.

навалася перадаць сялянам у доўгатэрміновую арэнду. Раман Скірмунт адзначыў, што ў гэтым выпадку месца былых землеўласнікаў зойме дзяржава і наступіць «рай» для бюракратыі.

Гэта быў адзін з найбольш аргументаваных і эмацыйных выступаў супраць праектаў радыкальнага вырашэння аграрнай праблемы. Выступленне не спадабалася большасці дэпутатаў і перапынялася выкрыкамі абурэння. Вось як апісаў заканчэнне выступу Скірмунта карэспандэнт «Кур'ера Літэўскага»: «Уся правіца і частка Цэнтра пляскаюць у далоні, левіца – шыпіць і крычыць. З месцаў, што займае Польскае кола, аніводнага гуку. Са сваіх месц уздымаюцца, каб павіншаваць прамоўцу, такія прадстаўнікі памяркоўных кадэтаў, як прафесар Сяргей Катлярэўскі і Міхаіл Львоў»[493].

ДАКУМЕНТ

З прамовы Рамана Скірмунта на пасяджэнні Дзяржаўнай Думы 16 мая 1906 г.[494]

Фрагмент

[...] Вчера Дума поступила очень правильно, очень справедливо не решив прекратить все прения по этому поводу посредством упрощенной гильотины. Вопрос очень важный, сложный и было бы действительно странным, если бы мы, избирая комиссию (Аграрную камісію – А. С.) по столь важному вопросу, решились бы сделать это без каких-либо рассуждений. Тем более, ввиду материала, который нам доставлен заявлением (г. зв. «заява 42-х» рэзюміравала найбольш радыкальныя праекты аграрнага заканадаўства – А. С.), это представляется почти необходимым. На одном пункте, несомненно, мы всё таки будем единодушны, все согласны – это в желании по возможности содействовать улучшению положения крестьянского хозяйства и увеличению площади их землевладения или землепользования.

Согласно заявлению, отчуждение частной земельной собственности должно произойти в самых обширных, можно сказать, даже небывалых размерах. Несомненно, если все те предложения, которые заключены в этом заявлении, будут приняты, то крупное и среднее землевладение будет упразднено. Однако принудительное отчуждение не остановится только на этих формах землевладения. Во многих случаях и мелкое землевладение будет поглощено, ведь в пятом пункте «в» сказано, что различные угодья и земли, не превышающие по площади установленные по законам размеры на одного владельца, должны подлежать обязательному отчуждению, если местное население не может получить достаточного обеспечения из других земель в той же местности. Также в некоторых других случаях разрешается отчуждение даже мелких участков земли; словом, если бы

---

[493] «Kurier Litewski». 1906. Nr 152.

[494] *Стенографические отчеты. Гос. дума, 1906 год, сессия первая.* Санкт-Петербург 1906–1907. Том 1. Заседания 1–18, с. 409–411.

законопроект был разработан на основании заявления, то из прежней частной собственности не осталось бы ровно ничего, или остались бы самые жалкие незначительные остатки. Ломка прежнего строя в прежней форме землевладения произошла бы основательная, и от него не осталось бы камня на камне.

Однако вопрос – в чью пользу произошло бы это? Кто явился бы, так сказать, наследником этого бывшего землевладения? Местные землевладельцы были бы замещены миллионами новых счастливых собственников? Вовсе нет. Единственным наследником, единственным юридическим лицом, которое бы приняло в свою собственность все отчуждаемые земли, было бы государство – все земли поступили бы в государственный земельный фонд. Опять благодать для бюрократии[,] Эльдорадо.

Конечно, никто из крестьян и мелких землевладельцев не получит из всего этого ни одной десятины, ни малейшего куска земли. Ведь в 4-м пункте[, что] сказано? Все земли отчуждаются в государственный земельный фонд. Из государственного земельного запаса все земли передаются в долгосрочное пользование на срок, установленный подлежащими учреждениями, однако, без права переуступки. Следовательно, все отчуждение частновладельческих земель, а их будет громадное количество, произойдет в пользу земельного фонда, и земли будут отдаваться казной в аренду на известный срок, на 10–20 лет, а, может быть, и пожизненно, однако, не в собственность; все наследственные права будут безусловно исключены: сын не будет пользоваться плодами трудов своего отца; сын не будет работать на том поле, где трудился его отец. По постановлению будущих бюрократических органов все земли могут быть передаваемы новым владельцам, а наследники могут быть переведены в другие места, на другие участки, и плодами трудов прежних владельцев будут пользоваться новые, чужие люди.

Это предложение не ставит себе задачу – увеличение площади крестьянского землевладения. Здесь сказано только о пользовании землёй. Не знаю, как решение этого вопроса будет принято в тех местностях, где существует общинное землевладение, но в районах подворного, личного землевладения такой проект будет принят с недоумением, с ужасом.

Я обращаю внимание еще на один пункт этой программы, который вызовет недоумение. В п. 7 сказано: «Из государственного земельного запаса отводятся земли сначала местному населению, а за удовлетворением потребности местного населения, земли предназначаются для переселенцев». Мне кажется, что этот вопрос поставлен тоже неправильно. Не следует устраивать переселенческого дела во внутренних губерниях России с сравнительно значительным населением. Например, в некоторых уездах Волынской и Минской губерний в настоящее время оказалось бы еще много свободных участков, однако, прирост населения там значительно выше среднего нормального процента. Через несколько лет эти земли будут необходимы местному населению, между тем, они могут быть заняты переселенцами. Мне кажется, это было бы очень обидным и несправедливым для

местного населения. Думаю, оно будет всеми силами протестовать против этого и сумеет защищаться.

Однако, я еще скажу несколько слов об обязательном отчуждении. Я не буду упоминать о праве частной собственности – это понятие, по мнению многих, устарело, может быть, даже предрассудок? Однако передача и отчуждение таких громаднейших пространств, как полагается по этому проекту – ведь будут отчуждены сплошь и рядом все земли, находящиеся под пашней, под лугами, все леса, даже участки мелких землевладельцев, даже земли, находящиеся под усадьбами, промышленными заведениями, питомниками – все это требует громаднейших финансовых средств и расходов; откуда взять?

Вот об этом в заявлении не упоминается ни слова. Вопроса этого для авторов заявления не существует. Однако, это может отразиться неблагоприятно на положении всего государства. Как это повлияет на благосостояние населения, которое лишится миллионов заработка, который им доставляют в настоящее время среднее и крупное землевладение? Как это отразится на культуре и промышленности, не поведет ли это к государственному банкротству? Все это сомнения серъезные, немаловажные. Дать положительный ответ на эти вопросы необходимо прежде, чем мы приступим к решению земельного вопроса.

Если крестовый поход физиократов, аграриев и доктринеров против частной земельной собственности будет иметь успех, то этим всё-таки дело не кончится, еще останется множество безземельного населения, останутся рабочие, останется и бедное городское население. Они тогда выступят с иском к имущим классам с требованием передать в их пользование дома, промышленные заведения, капиталы. И это требование будет вполне справедливо, и мы не найдем никаких справедливых против него возражений. Такие требования несомненно поступят к нам.

После японской авантюры, после несчастной внутренней междоусобицы, вызванной нерадением и грехами правительства, не толкнем ли мы страну в новую экономическую и социальную авантюру, еще более опасную в своих последствиях, чем все те, которые мы уже пережили?

Вот те опасения и те сомнения, которые делают для многих из нас положительно невозможным согласиться с заявлением в его настоящем виде. Однако, мы, конечно, будем стоять, думаю, единогласно, за выборы комиссии. Частная собственность может быть сохранена и должна быть сохранена для общей пользы государства, однако одновременно площадь крестьянского землевладения может быть и должна быть увеличена. Мы знаем, что это невозможно сделать без многих жертв со стороны имущих классов, но на это все приготовлены. И вот мы будем стоять за выборы комиссии, переполненные желанием по мере возможности содействовать улучшению крестьянского хозяйства и увеличению площади землевладения. (Сдержанные знаки неодобрения).

Председатель: Прошу прощения, что в качестве председателя я позволяю

себе сказать следующее: авторитет законодательного учреждения, какова Государственная Дума, стоит высоко и может стоять высоко только при условии, что все члены Государственной Думы имеют возможность высказывать свободно свое мнение, именно потому, что Дума выслушивает все мнения и, выслушав их, постановит свое решение большинством голосов [...], это решение приобретет особый авторитет и про него нельзя будет сказать, что решение постановлено под односторонним влиянием и т. д.

Поэтому я вас прошу, усерднейше прошу, воздерживаться от знаков неодобрения. Эти знаки неодобрения всегда ораторов смущают. Можно не одобрять дурной поступок, если только допустить, что кто-нибудь из нас способен на такой поступок, но не одобрять взгляды, которые высказываются членами Государственной Думы по долгу совести, мне кажется, не следует.

Прошу извинения, что я позволил себе это сказать, но достоинство... (Аплодисменты).

А вось як ахарактарызаваў выступ Скірмунта Чэслаў Янкоўскі, які асвятляў працу Думы ў якасці карэспандэнта «Кур'ера Літэўскага» пад псеўданімам *Ligenza*:

ДАКУМЕНТ

Ligenza [Чэслаў Янкоўскі]. Аграрная справа ў Дзяржаўнай Думе[495]. Фрагмент.

[...] У баявую сурму ўдарыў менскі дэпутат Раман Скірмунт. Не паглыбляючыся ў дэталі [праекта] аграрнай рэформы, які грунтаваўся на радыкальных дактрынах, менскі дэпутат паставіў Думу перад фактам, што экспрапрыяцыя будзе азначаць канец буйной і дробнай зямельнай уласнасці, што правядзенне такой рэформы запатрабуе вялізных сродкаў, і, нарэшце, што невядома, ці спадчыннікі (на праве арэнды) распарцэляванай зямлі атрымаюць хоць нейкую матэрыяльную карысць ад валодання гэтай доўгачаканай зямлёй, а вось гаспадарка і культура краю напэўна на доўгі час будзе зруйнаваная.

Скірмунт прамаўляў востра і пераканаўча. Нягледзячы на шум пратэстаў, якія несліся з лаваў сялянскай «Групы працы», ён ужыў слова «жах» для характарыстыкі таго ўражання, якое выклікаў праект аграрнай рэформы сярод землеўласнікаў.

Адважна і моцна прамаўляў менскі дэпутат, называючы рэчы сваімі імёнамі. Расійска-японскую вайну ён назваў «авантурай», а правядзенне аграрнай рэформы акрэсліў як яшчэ «большую авантуру». Адным словам, Скірмунт зрабіў сапраўднае expose той апазіцыйнай акцыі, якая збіраецца на далягляд зе, супраць аграрнай рэформы, што грунтуецца на экспрапрыяцыі і наступнай нацыяналізацыі зямлі.

---

[495] «Kurier Litewski».1906, Nr 111.

Менскі дэпутат пайшоў вельмі далёка... Магчыма занадта далёка ў прынцыповай справе, а з пункту гледзішча тактыкі – безумоўна занадта далёка.

Вострая і безапеляцыйная прамова адразу ж выклікала рэпліку з боку «Групы працы», з якой супраць «абшарнікаў» выступіў ковенскі дэпутат Лопас. Такім чынам, замест планаванага першага падыходу да аграрнай праблемы, замест асцярожных дэбатаў (у выпадку, калі б не атрымалася іх пазбегнуць) адразу ж распачалося in medias res[496]*... Што было непажадана» [...]*

Затое Эдвард Вайніловіч вельмі высока ацэньваў пазіцыю і паводзіны Рамана Скірмунта падчас абмеркавання аграрнага пытання. Нават у яго пазнейшых успамінах адчувальны гонар за калегу, які «выступіў у абарону права ўласнасці, без якога немагчыма існаванне ні дзяржавы, ні грамадства, ні культуры [...] Ад Віслы да Ціхага акіяна прагрымеў лозунг: Яшчэ не згінула ўласнасць!»[497].

Вядомы польскі палітык Уладзіслаў Студніцкі, які не падзяляў краёвай ідэі, гэтую прамову Р. Скірмунта лічыў узорам «грамадзянскай мужнасці»[498].

У абарону прыватнага землеўладання і супраць нацыяналізацыі зямлі выступілі таксама князь Друцкі-Любецкі і біскуп Роп. Пазіцыю дэпутатаў Кола падтрымала эліта літоўскіх палякаў, а вось у Пецярбурзе яны апынуліся ў атмасферы варожасці. І гэта пры тым, што па большасці пытанняў сябры «Групы» цалкам падтрымлівалі курс на дэмакратызацыю краіны. Так, Раман Скірмунт падтрымаў заяву 151-го дэпутата Думы «Асноўныя палажэнні законаў пра дзяржаўную роўнасць»[499]. Падмуркам прапаноў быў тэзіс: «Усе грамадзяне абодвух полаў роўныя перад законам». Заява прапанавала адмену ўсіх саслоўных прывілеяў і абмежаванняў, а таксама абмежаванняў, звязаных з нацыянальнай і канфесійнай прыналежнасцю, роўнасць жанчын у доступе да адукацыі, у выбарчым заканадаўстве ды інш.

Ягоны ж подпіс стаяў на шматлікіх дэпутацкіх запытах да міністра ўнутраных спраў Пятра Сталыпіна адносна зняволеных у турмах, асуджаных на адміністрацыйную высылку і на смерць. Ва ўсіх запытах адзначалася сваволле мясцовай адміністрацыі, паводле загадаў якой адбываліся арышты і турэмнае зняволенне без прад'яўлення абвінавачванняў, а таксама актыўна выкарыстоўваліся ваенныя суды[500].

Атмасфера ізаляцыі, якая ўзнікла вакол «Групы», не спрыяла яе кансалідацыі. Апрача лёсу памешчыцкага землеўладання ў Беларусі і Літве дэпутатаў падзяліла

---

[496] Гэта можна перакласці з латыні як «у цэнтры падзей».

[497] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Częsc pierwsza*, s. 151.

[498] Wł. Studnicki, *Pierwsza Duma Panstwowa i działalnosc naszych posłow*. Warszawa 1907, s. 37.

[499] *Стенографические отчеты. Гос. дума, 1906 год, сессия первая.* Том 1. Заседания 1–18, с. 378–380.

[500] Там же, с. 629, 743; *Стенографические отчеты. Гос. дума, 1906 год, сессия первая.* Санкт-Петербург 1906–1907. Том 2. Заседания 19–38, с. 1075, 1572, 1681, 1758, 1801, 1845.

рознае стаўленне да нацыянальнай праблемы. Сябра Кола граф Юзаф Патоцкі на старонках «Дзенніка Кіеўскага» прызнаў існаванне супярэчнасцяў і з раздражненнем заўважыў: «Я заўсёды выказваюся як паляк, а некаторыя іншым разам выступаюць як беларусы»[501]. Не цяжка здагадацца, каго ён меў на ўвазе...

У адным з наступных нумароў гэтай газеты быў апублікаваны ліст *грамадзяніна Забранага краю П. В.* Аўтар быў абураны паводзінамі польскіх дэпутатаў ад Менскай губ., якія нібыта публічна прызналі, што з'яўляюцца «тутэйшымі», а таксама «беларусамі польскай культуры». Як здраднікі фігуравалі Р. Скірмунт, Г. Друцкі-Любецкі, В. Янчэўскі і М. Масоніус. Спрабуючы зразумець іх пазіцыю, аўтар адразу ж адкінуў варыянт беларускага паходжання і выказаў меркаванне, што такім чынам яны нібыта хочуць і надалей захаваць дэпутацкія мандаты. У лісце сцвярджалася існаванне ў «Групе» дзвюх плыняў, якія змагаюцца паміж сабой. Пры гэтым «беларусы» абзываюць апанентаў «ляхамі» і г. д.[502] Падобна, што «ляхамі» аказаліся якраз абранцы польскіх землеўласнікаў з украінскіх земляў (у т. л. згаданы граф Патоцкі), якія таксама далучыліся да «Групы дэпутатаў заходніх губерняў». «Дзеннік Кіеўскі» выступаў у іх абарону.

Адной з найбольш значных думскіх фракцый была «Парламенцкая група Саюза аўтанамістаў», якая яднала прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў Расіі, што з'яўляліся сябрамі розных палітычных партый. Падмуркам пааднання была ідэя дэцэнтралізацыі сістэмы ўлады і аўтаномія ўскраін. Група аўтанамістаў налічвала ад 120 да 150 дэпутатаў[503]. А найбольшай актыўнасцю вылучаліся якраз дэпутаты «заходніх губерняў». Магчыма, гэтаму паспрыяла тое, што адным з ініцыятараў стварэння гэтай парламенцкай групы, а потым яе кіраўніком быў адвакат Аляксандр Лядніцкі.

У лісце да прафесара Мар'яна Здзяхоўскага ён назваў Рамана Скірмунта сваім «найвялікшым саюзнікам у Думе» і заўважыў, што той «выдатна арыентуецца ў сітуацыі і з'яўляецца надзіва сімпатычным чалавекам». Адначасна дэпутатаў ад «Русі» (меліся на ўвазе ўкраінскія землі) Лядніцкі ахарактарызаваў як «сапраўдных феадалаў і цалкам апалітычных людзей»[504].

Для Аляксандра Лядніцкага адной з галоўных мэтаў думскай дзейнасці была аўтаномія Каралеўства Польскага. Менавіта таму ён быў вельмі асцярожны ў ацэнках праектаў аграрнай рэформы, заяўляючы, што рэформай павінна займацца мясцовае самакіраванне, і заклікаў да стрыманасці іншых дэпутатаў ад Менскай губ. Ён асцерагаўся, што выступы польскіх дэпутатаў па аграрнай пра-

---

[501] «Dziennik Kijowski». 1906, Nr 101.

[502] Ibidem. 1906, Nr 103.

[503] Н. Бородин, *Государственная Дума в цифрах*. СПб. 1906, с. 42.

[504] БВУ. Аддзел рукапісаў. F 33–534. Ліст А. Лядніцкага да М. Здзяхоўскага, арк. 7 адв.–8. Ліст не датаваны, але змест дазваляе сцвярджаць, што ён быў напісаны падчас дзейнасці I Дзяржаўнай Думы.

блеме могуць выклікаць недавер да самой ідэі аўтаноміі, якую будуць успрымаць як прыкрыццё інтарэсаў «абшарнікаў». Цікава, што паводзіны Р. Скірмунта пры абмеркаванні аграрнай праблемы не перашкаджалі Лядніцкаму бачыць у ім саюзніка.

Адносіны «Групы дэпутатаў ад заходніх губерняў» з Польскім колам складваліся няпроста. Па многіх пытаннях яны ўзгаднялі свае пазіцыі і дзейнічалі сумесна. Аднак дэкларацыю Польскага кола аб аўтаноміі Каралеўства Польскага сябры «Групы» не падтрымалі, заявіўшы пра адметнасць краёвых інтарэсаў. Чэслаў Янкоўскі пазней згадваў, што напярэдадні выступу прадстаўніка Польскага кола ў Думе з Дэкларацыяй пра аўтаномію Польшчы да дэпутатаў ад літоўскіх і беларускіх палякаў, якія збіраліся на кватэры Б. Ялавецкага, прыехаў Ф. Навадворскі, каб пазнаёміць з яе зместам. Яго сустрэлі даволі крытычна. Дэпутаты-краёўцы лічылі Дэкларацыю шкоднай для «польскага пытання» ва ўмовах I Думы і звярнулі ўвагу на адметнасць інтарэсаў Беларуска-Літоўскага краю. Пасля працяглай дыскусіі дамовіліся на наступны дзень правесці сход Польскага кола, на які дэлегаваць Рамана Скірмунта, Чэслава Янкоўскага і Уладзіміра Грахольскага з Валыні. Аднак Скірмунту перашкодзілі прыняць у ім удзел пільныя справы, а крытычныя заўвагі, прапановы і стылёвыя праўкі двух іншых дэлегатаў былі адкінуты сходам[505].

30 красавіка 1906 г. у Думе была прачытана Дэкларацыя Польскага кола пра аўтаномію Каралеўства Польскага. Папулярнасці польскім дэпутатам яна сапраўды не дадала. У сваю чаргу Польскае кола не падтрымала пазіцыі «Групы» па аграрным пытанні. Дэпутаты ад Каралеўства Польскага прагаласавалі за праект аграрнай рэформы Партыі канстытуцыйных дэмакратаў (кадэтаў), які быў непрымальны для эліты літоўскіх палякаў.

Між тым, сярод урадавых колаў яшчэ ў сярэдзіне мая ўзнікла ідэя роспуску Думы. 20 чэрвеня ўрад нанёс моцны ўдар. У гэты дзень была надрукавана ўрадавая заява аб прынцыпах аграрнай рэформы, у якой падкрэслівалася недатыкальнасць прыватнай уласнасці і недапушчальнасць вырашэння аграрнага пытання на прынцыпах, прапанаваных Думай.

Гэта быў адкрыты выклік, і Дума вырашыла прыняць яго. Сярод часткі кадэцкіх дэпутатаў узнікла ідэя думскага звароту да народу. Закон забараняў гэта рабіць, але дэпутаты свядома пайшлі на яго парушэнне. У дыскусіі па гэтым пытанні актыўна ўдзельнічала ўся «Група». Геранім Друцкі-Любецкі і Раман Скірмунт выступілі супраць звароту. Яны лічылі непажаданым адкрытае выступленне Думы супраць урада. Скірмунт, які расцаніў урадавую заяву як «памылковую», сцвярджаў, што зварот можа канчаткова знішчыць уладу. Ён заклікаў не ператвараць Думу ў зброю партыйнага змагання.

---

[505] Cz. Jankowski, *W ciągu dwoch lat*... Warszawa 1908, s. 87–91.

ДАКУМЕНТ

З прамовы Рамана Скірмунта на пасяджэнні Дзяржаўнай Думы 4 ліпеня 1906 г.[506] Фрагмент.

[…] Не всякий удар допустим, нельзя убивать назойливой мухи на чужой щеке; ведь от подобного удара необходимо воздержаться. При подобной партийной борьбе необходимо избирать почву тщательно и осторожно. Аграрный вопрос – вопрос очень щекотливый и очень опасный. Вспомните, когда в 1902 или в 1904 годах разрешался аграрный вопрос в Ирландии при министерстве Бальфура, то это происходило при заключении перемирия, при полном соглашении партий. Нам необходимо было бы следовать этому примеру. Желательно нанести удар министерству, но нам необходимо обращать внимание и на то, чтобы мы не нанесли одновременно удара и тому, что должно быть для нас всего дороже, благу родины. […]

Однако в настоящий момент я считаю более важным самый вопрос, вызвана ли действительно правительственным сообщением необходимость возражения? Мнения многих склоняются к утвердительному ответу; оно необходимо будто бы для того, чтобы успокоить взволнованное население. […]

Конечно, заслуга была бы громадная, если бы Государственная Дума пожелала и сумела бы повлиять на успокоение населения, на излечение от ран, от которых страдает страна. Однако, время наше очень занято, и у нас остаётся очень мало свободного времени. Мы всецело поглощены необходимой борьбой с министерством. Конечно, разносить министерство – занятие очень приятное (смех), иногда даже полезное, однако оно не должно всецело поглощать наше время. Многие придерживаются того мнения, что министерство давным давно само бы с нами рассталось, если бы слишком пылкие и громкие речи, произносимые здесь, с этой кафедры, не удерживали бы его искусственно при жизни. Что между министерством и нами существует полнейший раскол, разлад, это народу прекрасно известно; это известно из всех газет, из печатных наших речей.

Однако сообщение со стороны Государственной Думы в том виде, в каком оно предложено нашей комиссией, могло бы вызвать другое, может быть нежелательное впечатление, а именно то, что наш спор не кончается здесь у министерской скамьи, а идет значительно дальше. Подобное впечатление было бы нежелательно; оно было бы в состоянии разрушить окончательно тот жалкий призрак власти, который еще существует в стране; и как эта власть не опорочена, она все же лучше, чем полное господство анархии. […]

Думу, мне кажется, лучше оставить в покое, да не будет она служить оружием для партийной борьбы! Мы упрекаем, и вполне правильно, правительство в том, что оно потчует народ как бы несваренной пищей, оно разъясняет за-

---

[506] *Стенографические отчеты. Гос. дума, 1906 год, сессия первая.* Том 2. Заседания 19–38, с. 1962–1966.

коноположения, которые не получили еще в установленном порядке утверждения. Но мы в этом идём гораздо дальше, чем правительство. Мы желаем представить наши объяснения по поводу предположений, для которых у нас даже не разработан окончательный план, не разъяснены окончательно основы. Если мы будем передавать населению такие не вполне ясные сообщения, то ведь это может только увеличить существующее в стране и без того безобразное вавилонское столпотворение. Ведь многие из нас, членов Государственной Думы, еще не уяснили себе в полном размере объема предполагаемой аграрной реформы. [...] Если вопрос, даже не вполне разрешенный ввел такую смуту в наше понимание, то что он должен произвести там, где нераздельно царствует власть тьмы, где наши неполные, не ясные предположения будут объясняться в деревенской глуши не всегда доброжелательными и не всегда добросовестными комментаторами?

В записке 42-х упоминаются, между прочим, при перечислении земель, которые не подлежат отчуждению, сады и огороды. И что же мы видим? Как бы в ответ на это, по сведениям, которые получаются в газетах, в некоторых местностях, при усовершенствованном способе погромов начинают именно с садов и огородов, как бы не желая, чтобы они мешали проведению полного принципа отчуждения, который, будто бы, установлен. Рассуждение тут очень просто и логично. Если добрые люди порешили раздать всю землю таким способом, т. е. подвергнув все частновладельческие земли полному отчуждению, и если эти добрые люди или Дума не могут этого сделать сейчас по каким-то соображениям, для исполнения каких-то формальностей, так, может быть, для населения не обязательно ожидать исполнения всех этих формальностей? Пусть себе Дума работает; можно уже справиться с тем, что присуждено в пользу населения и до окончания работ Думы. Мне кажется, что подобные недоразумения могут повторяться часто, что подобное сообщение, как оно предложено со стороны аграрной комиссии, введет только еще большую смуту (шум, среди депутатов волнение), будет так понято, что вся земля уже передана (восклицания). Я скоро кончаю; мне тоже надо предоставить свободу слова.

Необходимо было бы разъяснить, что вопрос еще не решен окончательно и потому вряд ли можно обращаться теперь с неполным разъяснением к народу. Желательно внести успокоение в страну. Я не стану обращаться к тем, кто готов удовлетвориться и успокоением на развалинах, успокоением, напоминающим знаменитую картину Верещагина «На Шипке всё спокойно»; я обращаюсь к тем, которые желают мирного обновления своей родины. Господа, мы переживаем время серьезное, время опасное. Мы находимся в борьбе с министерством, в борьбе, которая, несомненно, будет доведена до конца. Однако необходимо обращать внимание, чтобы от этого не пострадала вся страна. Мы желаем нанести удар министерству, однако надо обратить внимание, чтобы не нанести одновременно удар родине. Для мирного обновления страны необходимы новые прочные основы, необходимы новые законы. Конечно, первым должен быть спра-

ведливый закон об удовлетворении земельной нужды крестьян, однако в пустых воззваниях, декларациях страна не нуждается, она наслушалась их уже довольно.

Председатель: Оратор, я останавливаю вас за слова «пустые воззвания».

Голос: Возьмите назад эти слова.

Скирмунт: Я вовсе не желал применить это слово «пустое заявление» к докладу комиссии. Желательно было бы одно в обращении Государственной Думы к народу: желательно сказать, воздерживаясь от всяких полемических и неясных принципиальных заявлений, желательно подтвердить, что мы помним его нужды, что мы заботимся о них, что они будут справедливо удовлетворены, однако, для того, чтобы работа наша была плодотворна, необходимо соблюдать в стране законность и спокойствие (аплодисменты справа, шиканье слева, шум).

Председатель: Господа, мы прошлый раз уже условились, чтобы этот зал был залом свободы мнений. Высказывание разных мнений только гарантирует серьезный характер предстоящих решений и вследствие этого всякие порицания, произносимые по адресу ораторов в этом зале неуместны. Господа, будем же сохранять наш хороший договор как следует.

Пазіцыю Рамана Скірмунта падтрымала большасць дэпутатаў Беларусі і Літвы. Аднак Дума ўсё ж прыняла рашэнне аб звароце да народа, а ўрад выкарыстаў гэта, каб распусціць парламент. 8 ліпеня Мікалай II падпісаў Маніфест аб роспуску Думы і прызначыў тэрмін склікання II Думы – 20 лютага 1907 г. Адначасова быў адпраўлены ў адстаўку старшыня Савета міністраў Іван Гарамыкін. Новым прэм'ерам стаў Пётр Сталыпін, які захаваў за сабой таксама пасаду міністра ўнутраных спраў.

Значная частка дэпутатаў (у асноўным фракцыя партыі канстытуцыйных дэмакратаў) пераехалі ў Выбарг, каб выпрацаваць тэкст думскага пратэсту. Урад загадаў уладам аўтаномнай Фінляндыі распусціць сход. Аднак дэпутаты ўсё ж паспелі падпісаць дакумент. Яго надрукавалі і тайна прывезлі ў Пецярбург. Аснову пратэсту склаў заклік да насельніцтва не плаціць падаткі і адмаўляцца ад службы ў войску.

«Група дэпутатаў заходніх губерняў» у гэтай акцыі не ўдзельнічала. Праз «Кур'ер Літэўскі» яны звярнуліся з уласным зваротам да насельніцтва Беларусі і Літвы. Дэпутаты заяўлялі, што імкнуліся абараняць інтарэсы Краю. Яны крытыкавалі ўрад, які не толькі не здолеў навесці парадак у краіне, але нават не зняў нацыянальных абмежаванняў. У звароце выказвалася шкадаванне, што не спраўдзіліся надзеі, звязаныя з Думай, крытыкаваліся «выбаржцы» і выказвалася спадзяванне на больш паспяховую дзейнасць новай Думы[507].

Сябры «Групы» палічылі патрэбным таксама выступіць з самастойнай заявай, апублікаванай на старонках варшаўскай газеты «Слова». У ёй сцвярджалася, што

[507] «Kurier Litewski». 1906, Nr 158.

галоўнай мэтаю дзейнасці «Групы» было служэнне інтарэсам Беларуска-Літоўскага краю, які іх абраў. Крытыкуючы думскія праекты аграрнай рэформы, як не адпавядаючыя патрэбам Краю, яны прызнавалі неабходнасць паляпшэння дабрабыту малазямельных сялян пры дапамозе мясцовага самакіравання, і заклікалі да сумеснай працы дзеля росквіту гістарычнай Літвы. Сярод падпісаўшых фігураваў таксама Скірмунт...[508]

«Неафіцыйнае» стаўленне Рамана Скірмунта да роспуску Дзяржаўнай Думы адлюстравалася ў лісце Ядвігі Скірмунт да Элізы Ажэшкі ад 28 ліпеня 1906 г.: «Мой стрыечны брат вярнуўся з Пецярбургу з перакананнем, што роспуск Думы быў неабходнасцю. Калі б яна надалей існавала, то дайшло б да страшэннага выбуху»[509].

Падобна, што Раман Скірмунт звязваў з асобай Сталыпіна надзеі, як на «супакаенне» краіны, так і на перамены ў становішчы Краю і літоўскіх палякаў. Ён, напэўна, ведаў, што пасля роспуску Думу адбылася сустрэча толькі што прызначанага Старшынём Рады міністраў П. Сталыпіна з Э. Вайніловічам. Кіраўнік урада падзяліўся планамі ўключэння ў склад новага кабінета міністраў вядомых грамадскіх дзеячаў і палітыкаў-лібералаў князя Георгія Львова, Аляксандра Гучкова, Міхаіла Стаховіча і прапанаваў Вайніловічу пасаду віцэ-міністра сельскай гаспадаркі[510]. Такая пазіцыя Сталыпіна давала падставы для пэўнага аптымізму. Пазней у каментарах да ўспамінаў Эдварда Вайніловіча, апублікаваных на старонках віленскай газеты «Слова» (1932) Скірмунт прызнаваўся, што Пётр Сталыпін стварaў уражанне чалавека, якому можна было давяраць. Але, насамрэч, гэта было падманлівае ўражанне[511].

А вось Элізa Ажэшка раней пазбылася ілюзій наконт расійскіх палітыкаў. У лісце да Казіміра Здзяхоўскага ад 2 кастрычніка 1906 г. яна пісала: «Божа! Якія мы няшчасныя, і што зрабіла з намі стогадовае панаванне дзікуноў, якімі з'яўляюцца нашы ўладары! Ведаеце, з болем прыходзіць разуменне, што ўсе яны са сваімі кадэтамі, трудавікамі і г. д., паўдзікуны, што яны з'яўляюцца толькі матэрыялам да грамадства, а не грамадствам, і што з імі ніколі не атрымаецца знайсці паразумення»[512].

Між тым, набліжаліся выбары ў II Дзяржаўную Думу. У жніўні 1906 г. адбыўся з'езд землеўласнікаў Менскай губ., на якім была выказана прапанова распрацаваць праграму, якая б яшчэ на этапе выбараў аб'яднала ўсіх польскіх кандыдатаў. Неабходнасць такой праграмы была відавочная як для краёўцаў, так і для нацы-

---

[508] «Słowo». 1906, Nr 202.

[509] Instytut Badan Literackich PAN. Archiwum Elizy Orzeszkowej. List Jadwigi Skirmuntowny. 28. 07. 1906 r.

[510] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Częsc pierwsza*, s. 131.

[511] R. Skirmuntt, *Edward Woyniłłowicz. Wspomnienia 1847–1928 r. Wyd. 1931 r.*, «Słowo». 1932, Nr 4.

[512] Цытата па: Z. Opacki, *W kręgu Polski, Rosji i słowianszczyzny. Mysl i działalnosc społeczno-polityczna Mariana Zdziechowskiego do 1914 roku*. Gdansk 1996, s. 169.

янальных дэмакратаў. Разыходжанні пачыналіся пры абмеркаванні яе зместу. Нацыянальныя дэмакраты па-ранейшаму імкнуліся падмяніць агульнакраёвыя патрэбы польскімі нацыянальнымі інтарэсамі[513]. Краёўцы з гэтым катэгарычна не пагаджаліся. Яны былі перакананы, што польскія дэпутаты Краю зноў павінны выступіць пад агульнакраёвымі лозунгамі.

У пачатку кастрычніка 1906 г. падчас візітацыі касцёлаў Менскай губ. Моладава і Парэчча наведаў віленскі біскуп Эдвард Роп. У Моладаве ён затрымаўся амаль на два дні. У палацы Скірмунтаў адбылося набажэнства, а на падворку – таінства святога прычасця, у якім удзельнічала каля 200 чалавек[514]. Падобна, што ў гэтыя дні ў Моладаве і Парэччы біскуп і зямяне таксама абмяркоўвалі стратэгію і тактыку выбарчай кампаніі.

Магчыма, лістападаўскія публікацыі Канстанцыі і Рамана Скірмунтаў былі водгукам гэтых абмеркаванняў. Так, Канстанцыя Скірмунт у артыкуле «Думкі і намеры»[515] заклікала шляхту і інтэлігенцыю працаваць над ідэяй адзінства Краю, імкнуцца, каб «Краёвае кола» было прадстаўніцтвам усіх народаў Літвы і Беларусі, якія спрадвеку былі і застаюцца ўзаемапрыязнымі. Яна сцвярджала неабходнасць збліжэння шляхты з народамі, якія становяцца на шлях самастойнага развіцця, пераконвала, што інтарэсы шляхты і народу не з'яўляюцца супрацьлеглымі, што паміж імі магчымае палітычнае паразуменне.

Амаль адразу на гэты артыкул адгукнуўся Раман Скірмунт. У лістападзе 1906 г. у трох нумарах «Кур'ера Літэўскага» быў апублікаваны ягоны артыкул «Праграмныя пытанні». Аўтар пераконваў чытачоў у тым, што ўдзел у палітычным жыцці з'яўляецца іх «святым абавязкам», што без гэтага немагчыма бараніць ні інтарэсы Краю, ні свае ўласныя. Скірмунт прыгадаў думскую дыскусію вакол праекта аграрнай рэформы, прапанаванага Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыяй, якую ён ахарактарызаваў як спробу «аплаціць вексель рэвалюцыі нашым коштам». Былы дэпутат яшчэ раз прыгадаў асноўныя хібы гэтага праекта і тыя прапановы, з якім выступаў ён ды іншыя яго праціўнікі[516]. Скірмунт імкнуўся давесці будучым дэпутатам неабходнасць мець уласную краёвую праграму, а не ісці за «фальшывымі багамі», роль якіх у I Думе, на яго погляд, выконвалі кадэты.

Таксама Раман Скірмунт спыніўся на адносінах да расійскага ўрада і «памяркоўных» палітычных партый ліберальнага кірунку. Ён заклікаў да «рэальнай палітыкі» ва ўмовах рэвалюцыйнага крызісу. Былы дэпутат не бачыў для эліты літоўскіх і беларускіх палякаў іншага шляху, як падтрымаць урадавыя намаганні па супакаенні краіны. На яго думку, калі ў выніку рэвалюцыйнага ціску будзе зруйнавана Расійская дзяржава, то пад яе руінамі будзе пахавана і краёвая

---

[513] «Dziennik Wileński». 1906, Nr 4, 5, 19.

[514] НГАБ. Ф. 1, воп. 18, спр. 1109, арк. 31 адв.–32.

[515] S. K. [K. Skirmuntt]. *Mysl i dązenia*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 265.

[516] R. Skirmunt, *Kwestje programowe*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 268.

шляхта. Аднак у выпадку вяртання ўрада да палітыкі рэакцыі і цемрашальства трэба будзе распачынаць змаганне ўжо з ім[517].

Скірмунт бачыў магчымасць супрацы думскага «Краёвага кола» з прадстаўнікамі такіх ліберальных партый як «Партия мирного обновления» і «Партия 17 октября» (*октябристы*). Упершыню на старонках «Кур'ера Літэўскага» Аляксандр Гучкоў атрымаў асцярожную пазітыўную характарыстыку. Аўтар яшчэ раз пацвердзіў сваё перакананне аб магчымасці пабудовы новай дзяржавы на падмурку Маніфеста ад 17 кастрычніка 1905 г.

Прынцыпова важным для Скірмунта было сцвярджэнне, што праграма Краёвага кола павінна ўлічваць інтарэсы шырокіх мас насельніцтва Краю і абавязкова ўключаць такія патрабаванні, як абарона свабод, неабходных для развіцця грамадства і кожнага індывідуума, уздым і пашырэнне асветы і ўдасканаленне тых папраўак у заканадаўстве, што датычылі рабочых прамысловасці і сельскай гаспадаркі, якія былі прапанаваны ліберальнымі партыямі.

Дэвізам Краёвага кола ў II Думе Раман Скірмунт лічыў супрацоўніцтва ўсіх народаў, што насялялі Беларуска-Літоўскі край. Гэта зусім не пярэчыла патрыятычнаму стаўленню да ўласнай нацыі і, тым больш, абароне інтарэсаў усяго Краю. «Мы хочам жыць і працаваць там, куды закінуў нас лёс, на той зямлі, дзе выраслі, сынамі якой ад вякоў з'яўляемся як карэннае насельніцтва. Мы хочам, каб гэты край развіваўся і таму імкнемся не да барацьбы на яго нівах, а да мірнага і культурнага супрацоўніцтва [...] Мірная супраца і роўныя правы для ўсіх – гэта наш лозунг»[518].

Ён быў перакананы як у недапушчальнасці ўваходу польскіх дэпутатаў Беларусі і Літвы ў Польскае кола, так і ў непазбежнасці супрацоўніцтва з ім. «Нашы дарогі не розныя, але адметныя», – сцвярджаў Раман Скірмунт. Ён яшчэ раз агучыў прапанову, выказаную падчас працы I Думы: уваход у Краёвае кола адкрыты для ўсіх без розніцы веравызнання і нацыянальнасці[519].

У заключэнні Скірмунт заклікаў да дыскусіі і прыгадаў насмешкі польскіх нацыянальных дэмакратаў, якія назвалі краёвы патрыятызм «парафіянствам». «Але ж гэта не абы якая «парафія», – адказаў краёвец. – Былы бюракратычны ўрад называў яе «Северо-Западным краем». Яе межы ад Дзвіны і Немана – да Дняпра і Прыпяці. Яна мае агульную гісторыю, і на яе тэрыторыі за выключэннем Ковенскай і часткі Віленскай губ. пануюць тыя ж этнаграфічныя стасункі. Кожны б пажадаў быць пробашчам такой парафіі! Вялікага памеру павінны быць людзі, якім цесна ў гэтай парафіі!»[520]

Але не ўсе краёўцы пагадзіліся з выказанымі ідэямі. У прыватнасці Баляслаў

---

[517] R. Skirmunt, *Kwestje programowe*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 269.

[518] R. Skirmunt, *Kwestje programowe*, «Kurier Litewski». 1906, Nr 270.

[519] Ibidem.

[520] Ibidem.

Ялавецкі ў звароце «Да маіх высокародных землякоў з Літвы і Русі» (1906) выказаўся катэгарычна супраць надзей і, тым больш, пошукаў згоды з камандай Сталыпіна і расійскімі лібераламі. Кіраўніка ўрада ён характарызаваў як «рускага нацыяналіста».

Публіцыст не бачыў розніцы паміж расійскімі «правымі» і лібераламі ў падыходах да вырашэння нацыянальнага пытання. Ён быў упэўнены, што ўсе расійскія партыі падтрымліваюць ідэю жорсткага цэнтралізму, карані якой трэба шукаць у светапоглядзе самой нацыі. Гэта прымушае краёвыя сілы шукаць шляхі да самастойнага існавання: «Мы з рускімі не можам заставацца пад адной страхой і есці з адной міскі. Гэта было б для нас вялікім няшчасцем»[521].

Толькі пры ўмове самастойнасці гістарычнай Літвы аўтар звароту лічыў магчымым яе нармальнае сужыцце з усходнім суседам. Адпаведна найважнейшай задачай на дадзены момант з'яўлялася ўвядзенне самакіравання. Першым крокам да яго Ялавецкі лічыў стварэнне *Краёвага камітэта*, які б у сваёй дзейнасці абапіраўся на краёвыя губернскія і павятовыя камітэты, што рабіла яго падобным на агульнакраёвую партыю.

Баляслаў Ялавецкі заявіў пра поўную падтрымку пазіцыі Рамана Скірмунта ў пытанні, чые інтарэсы павінны адстойваць абранцы літоўскіх і беларускіх палякаў. Звяртаючыся да «высокародных землякоў», ён заклікаў помніць, што «землеўласнікі – палякі, літоўцы, русіны і беларусы – з'яўляюцца не «аграрыямі» ў вузкім разуменні гэтага слова, а грамадзянамі краю і дэмакратамі ў адпаведнасці з гістарычнай традыцыяй [...] У сітуацыі, калі ўсё насельніцтва краю ператварылася ў нацыю, то і мы, шляхта, не можам заставацца асобнай кастай. Нашым абавязкам з'яўляецца абарона інтарэсаў усёй нацыі»[522].

З апошнім тэзісам катэгарычна не згаджаліся польскія нацыянальныя дэмакраты. Другая палова 1906 г. прайшла пад знакам абвастрэння палемікі паміж прыхільнікамі двух кірункаў польскага руху. Гэтаму спрыяла з'яўленне ў Вільні штодзённага выдання сяброў Нацыянальна-дэмакратычнай партыі «Дзенніка Віленьскага».

Першы нумар «Дзенніка» выйшаў на пачатку жніўня 1906 г. Галоўную ролю ў рэдакцыі адыгрываў Ян Замараеў, больш вядомы пад псеўданімам *Ежы Урсын*. Менавіта ён выступіў з праграмным артыкулам у першым нумары газеты[523]. Нацыянальныя дэмакраты абвінавачвалі краёўцаў у забыцці польскіх нацыянальных інтарэсаў. Яны ахрысцілі апошніх «тутэйшымі», г. зн. людзьмі без нацыянальнасці[524]. Краёўцы, у сваю чаргу, звярталі ўвагу на адасобленасць сваіх

---

[521] B. Jałowiecki, *Do zacnych współziemian moich z Litwy i Rusi*. Petesburg 1906, s. 3.

[522] Ibidem.

[523] «Dziennik Wileński». 1906, Nr 1.

[524] Ibidem, Nr 3.

ідэйных канкурэнтаў у Краі: «Калі мы выпусцім з рук сцяг з Пагоняй, наша місія на гэтай зямлі будзе скончана»[525].

«Кур'ер Літэўскі» адыгрываў прыкметную ролю ў гэтай палеміцы. У адным з лістоў да рэдактара Чэслава Янкоўскага Раман Скірмунт падзякаваў за адказ «звышпалякам» (*wszechpolakom*) і дадаў: «Злосцю яны нас значна перавышаюць. Зусім бы нас з'елі, калі б мы не мелі органа друку, які час ад часу дае адпор, і калі б зерне, што яны кідаюць, не было цалкам неадпаведным нашай глебе»[526].

Што датычыць арганізацыйных форм дзейнасці польскіх дэпутатаў Беларусі і Літвы ў Думе, то краёўцы і нацыянальныя дэмакраты працягвалі сваю ранейшую спрэчку наконт далучэння да фракцыі Польскага кола. Менскі з'езд землеўласнікаў абмінуў гэтае пытанне. А вось Віленскі сход, які адбыўся 6–7 снежня 1906 г., выказаўся за захаванне асобнай дэпутацкай групы.

Апрача гэтага, прынятая выбарчая праграма прапанавала ажыццяўленне канстытуцыйных палажэнняў і іх развіццё, роўнасць усіх нацый і рэлігій, недатыкальнасць права ўласнасці, рэгуляванне форм уласнасці і права валодання маёмасцю, ліквідацыю цераспалосіцы і сервітутаў, дэцэнтралізацыю ўлады і ўвядзенне самакіравання, а таксама супрацоўніцтва з Польскім колам[527].

З'езд адыграў значную ролю ў кансалідацыі літоўскіх і беларускіх палякаў у час выбараў. Выбарчыя праграмы і тактыка барацьбы губернскіх камітэтаў у значнай меры абапіралася на зацверджаныя з'ездам прынцыпы. Аднак у параўнанні з мінулымі выбарамі мясцовая адміністрацыя актыўна ўмешвалася ў ход выбарчай кампаніі, імкнучыся правесці ўласных кандыдатаў. Так, з відавочнымі парушэннямі (адсутнасць тайнага галасавання, агітацыя ў дзень выбараў ды інш.) прайшоў выбарчы сход у Пінску, па выніках якога на губернскія выбары не трапіў аніводны прадстаўнік літоўскіх палякаў. Праверка скаргаў Аляксандра і Рамана Скірмунтаў, князя Станіслава Радзівіла пацвердзіла факт парушэння закону[528]. Але вынікі сходу не былі адменены.

Сярод прайграўшых быў і Раман Скірмунт. Але ў ягоным выпадку рашаючую ролю адыграла не парушэнне працэдуры. Раман Скірмунт атрымаў толькі 39 галасоў, а г. зн., што амаль палова выбаршчыкаў галасавала супраць яго. Магчыма, што дробным землеўласнікам не спадабалася ягоная пазіцыя па аграрнай праблеме, агучаная ў I Думе. Да таго ж, мясцовыя палякі маглі быць незадаволены ўласна нацыянальнай пазіцыяй Р. Скірмунта, які, як ужо згадвалася, падчас адной з дыскусій унутры «Групы дэпутатаў заходніх губерняў» назваў сябе беларусам. Дарэчы, «беларусам польскай культуры», – называў яго ў сваіх успамінах

---

[525] «Kurier Litewski». 1906, Nr 213.

[526] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 102–122. Лісты Р. Скірмунта да Ч. Янкоўскага. 1906–1909, арк. 9 адв.

[527] «Dziennik Wileński». 1906, Nr 84.

[528] НГАБ. Ф. 317, воп. 1, спр. 54.

сябра Дзяржаўнай Рады Іпаліт Корвін-Мілеўскі[529]. Таксама не ўсім выбаршчыкам маглі падабацца даволі рэзкія выпады Скірмунта супраць польскіх нацыянальных дэмакратаў, якіх ён аднойчы параўнаў з вялікарускімі шавіністамі[530].

Вынікі выбараў у II Думу былі несуцяшальнымі для літоўскіх і беларускіх палякаў. Замест чатырнаццаці дэпутацкіх мандатаў, як было год таму, яны атрымалі толькі дзесяць. Сярод абраных ізноў пераважалі краёўцы кансерватыўна-ліберальнай арыентацыі. Аднак ў параўнанні з мінулагоднімі выбарамі значна ўзмацнілі свае пазіцыі нацыянальныя дэмакраты.

Па гарачых слядах распачаўся аналіз няўдачы. І адразу ўзнавілася ранейшая палеміка паміж краёўцамі і сябрамі партыі Р. Дмоўскага. Публіцысты абедзвюх плыняў галоўную прычыну паражэння бачылі ў адасабленні землеўласнікаў-палякаў ад сялянства. Але з гэтага бясспрэчнага факту рабіліся розныя высновы. Нацыянальныя дэмакраты лічылі, што трэба больш актыўна пашыраць польскасць сярод сялян. Магчымасці ўзмацнення пазіцый польскіх дэпутатаў ад краю ў Думе яны бачылі ў адзінстве з Польскім колам[531].

А Раман Скірмунт галоўнай прычынай няўдачы лічыў менавіта нацыяналістычную прапаганду, якая, на яго погляд, адштурхнула ад палякаў іншыя нацыі. Аляксандр Лядніцкі звярнуў увагу на сацыяльны аспект. Ён пісаў пра бездань, што падзяліла народ і памешчыкаў і была вынікам недэмакратызму апошніх. Ён вярнуўся да выказанай год таму Раманам Скірмунтам ідэі стварэння агульнакраёвай партыі і прапанаваў стварыць Краёвую партыю ліберальна-дэмакратычнай арыентацыі[532].

20 лютага 1907 г. пачала працу II Дзяржаўная Дума. Склад яе дэпутатаў быў нечаканым для ўрада. Адміністрацыйныя намаганні ў час выбараў далі толькі частковы эфект. Канстытуцыйныя дэмакраты страцілі каля 80-ці дэпутацкіх месцаў, але ў цэлым корпус дэпутатаў стаў яшчэ больш радыкальным. *Трудовики* атрымалі 104 месцы, сацыял-дэмакраты – 55. Фракцыя «правых» складалася з 54 дэпутатаў[533]. Урадавыя партыі атрымалі толькі пятую частку дэпутацкіх месцаў. Аднак казаць пра поўную няўдачу ўрадавай палітыкі нельга. Другая Дума ўжо не была такой кансалідаванай, як першая.

Польскія дэпутаты Краю прыехалі ў Пецярбург напярэдадні адкрыцця Думы і адразу заняліся выпрацоўкай арганізацыйных форм сваёй дзейнасці. Гэтая задача аблягчалася рашэннямі Віленскага снежаньскага з'езда. У адпаведнасці з імі дэпутаты вырашылі стварыць Кола польскіх дэпутатаў-канстытуцыяналістаў Літвы

---

529 H. Korwin-Milewski, *Siedemdziesiąt lat wspomnień. 1875–1925*. Warszawa 1993, s. 172.

530 «Kurier Litewski». 1907, Nr 10.

531 «Dziennik Wileński». 1907, Nr 32.

532 A. Lednicki, *Po wyborach*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 41.

533 Н. Ерошкин, *История государственных учреждений дореволюционной России*. Москва 1983, с. 265.

і Русі, якое ўзначаліў дэпутат ад Віленскай губ. Міхал Венслаўскі. Таксама было прынята рашэнне пра салідарнасць з Польскім колам. Віленскі польскі друк вітаў вынікі арганізацыйнай працы дэпутатаў.

Асноўнай мэтай дзейнасці польскіх дэпутатаў Краю было перакананне II Думы ў неабходнасці рэформы самакіравання ў Беларусі, Літве і Украіне. Яе сутнасцю павінна было стаць увядзенне выбарных земстваў, заснаваных на роўнасці грамадзян без розніцы нацыянальнасці і веравызнання. Пра якую б рэформу не заходзіла размова, польскія дэпутаты заўсёды падкрэслівалі, што без увядзення земстваў і перадачы ім паўнамоцтваў па рэфармаванні ніякіх карысных перамен у Беларусі і Літве не адбудзецца.

Адным з цэнтральных пытанняў працы II Думы з'яўлялася абмеркаванне дзяржаўнага бюджэту. Аднак актыўная праца Думы была гвалтоўна спынена. Урад пачаў рыхтаваць яе роспуск, як толькі зразумеў, што Дума не адмовіцца ад патрабавання адчужэння памешчыцкіх зямель і не зацвердзіць Указ ад 9 лістапада 1906 г., якім распачыналася г. зв. «сталыпінская аграрная рэформа».

Падставай для роспуску стала абвінавачванне думскай сацыял-дэмакратычнай фракцыі ў антыдзяржаўнай змове. На закрытым пасяджэнні Думы 1 чэрвеня 1907 г. Пётр Сталыпін імкнуўся пазбавіць дэпутацкіх паўнамоцтваў усю сацыял-дэмакратычную фракцыю, а ў адносінах да 16-ці дэпутатаў патрабаваў дазволу на арышт. Гэта быў сапраўдны ўльтыматум. Прычым улады нават не сталі чакаць адказу на яго.

Ужо 3 чэрвеня 1907 г. быў абнародаваны Маніфест пра роспуск II Думы і заканчэнне другой сесіі Дзяржаўнай Рады. Адначасова было зменена Палажэнне аб выбарах. Апошняе было прамым парушэннем закона, бо змяняць выбарчую сістэму без санкцыі Думы не дазвалялася. Новы выбарчы закон, які павінен быў гарантаваць цалкам паслухмяны ўраду склад Думы, нават у Радзе міністраў назвалі «бессаромным». Гэтая падзею гісторыкі часта ацэньваюць як дзяржаўны пераварот. Аднак са шляху паламентарызму Расія яшчэ не сышла.

Краёвая партыя Літвы і Белай Русі

Як ужо адзначалася, ідэю стварэння краёвай партыі («Краёвая партыі Літвы і Русі») Раман Скірмунт выказаў яшчэ ў лістападзе 1905 г. У студзені 1906 г. ён апублікаваў новы зварот, у якім упершыню прысутнічаў пэўны беларускі кампанент («Краёвая партыя Літвы і Белай Русі»).

Падчас працы II Дзяржаўнай Думы ідэя стварэння партыі зноў стала актуальнай. Аляксандру Лядніцкаму гэтая арганізацыя бачылася як «Прагрэсіўная краёвая партыя». «Прагрэсізм» як ідэалагічны кірунак і палітычны рух нарадзіўся якраз у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. Ягоным палітычным ідэалам з'яўлялася канстытуцыйная манархія, заснаваная на падзеле трох галін улады – заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Важным элементам таксама была рэформа сістэмы мяс-

цовага самакіравання і роўнасць нацыянальнасцяў і веравызнанняў[534]. На думку краёўца і канстытуцыйнага дэмакрата, «Прагрэсіўная партыя» магла паспрыяць збліжэнню інтарэсаў зямян і сялян, калі б выступала як абаронца «агульначалавечых прынцыпаў» і вярнулася да традыцый дзядоў, якія «ў беларускім народзе бачылі народ, блізкі ім, самастойны, які мае права на ўласнае развіццё»[535].

На пачатку сакавіка 1907 г. Канстанцыя Скірмунт адгукнулася на публікацыю А. Лядніцкага і на старонках «Кур'ера Літэўскага» прапанавала стварэнне «Краёвай партыі Літвы і Белай Русі», якая павінна была спрыяць дасягненню рэлігійнага і палітычнага адзінства гістарычнай Літвы. Падмуркам гэтай партыі, паводле публіцысткі, павінны былі стаць імкненне да прававой роўнасці нацыянальнасцяў, веравызнанняў і полаў; дасягненне самакіравання Літвы і Беларусі з сеймам у Вільні і культурнымі цэнтрамі ў Менску і Коўне; адмова ад нацыяналізму з адначасовай падтрымкай усіх нацыянальных культур. Яна нават лічыла неабходным пераўтварэнне польскіх культурніцкіх арганізацый у агульнакраёвыя, якія б спрыялі развіццю беларускай і ўкраінскай культур[536]. Спадзевы на стварэнне краёвай партыі публіцыстка звязвала з МТСГ і ягонымі кіраўнікамі Эдвардам Вайніловічам і Раманам Скірмунтам.

У красавіку 1907 г. Канстанцыя Скірмунт апублікавала артыкул «Навошта патрэбная Краёвая партыя Літвы і Белай Русі?» Адказваючы на пастаўленае ў загалоўку пытанне, яна заявіла, што гэтая партыя павінна спрыяць паразуменню трох нацыянальных патрыятызмаў – літоўскага, польскага і беларускага; а таксама рэалізаваць этычныя і грамадскія памкненні тых літоўскіх і беларускіх палякаў, якіх не задавальняла праграма польскіх нацыянальных дэмакратаў, і забяспечыць будучыню польскай супольнасці ў Краі[537].

А вось польская нацыянальная дэмакратыя выказалася супраць стварэння краёвай партыі артыкулам Юзафа Хласкі на старонках «Дзенніка Віленскага»[538].

Арганізацыйную працу па стварэнні Краёвай партыі ўзяў на сябе Раман Скірмунт. Моцную падтрымку ён атрымаў ад рэдактара «Кур'ера Літэўскага» Чэслава Янкоўскага. У маі 1907 г. у Менску адбылася адмысловая канферэнцыя, у якой удзельнічалі сябры МТСГ, якія сабраліся на чарговы сход Таварыства, а таксама Ч. Янкоўскі.

Удзельнікі прынялі рашэнне аб правядзенні ў Вільні 17 чэрвеня 1907 г. схода прадстаўнікоў польскіх землеўласнікаў шасці беларуска-літоўскіх губерняў. Удзел

---

[534] *Политическая история России в партиях и лицах.* Сост. В. Шелохаев, Н. Ерофеев, И. Задорожнюк и др. Москва 1994, с. 41.

[535] A. Lednicki, *Po wyborach*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 41.

[536] Futurus [K. Skirmuntt], *Stronnictwo Krajowe Litwy i Białej Rusi*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 50.

[537] Futurus [K. Skirmuntt], *Kartki polityczne ze spraw krajowych poruszonych w prasie wilenskiej. 1905–07.* Warszawa 1907, s. 79–80.

[538] «Dziennik Wileński». 1907, Nr 52.

прыхільнікаў нацыянальных дэмакратаў не прадугледжваўся. Арганізатары не збіраліся марнаваць час на ідэалагічныя спрэчкі. На сходзе планавалася абмеркаваць праграму, падрыхтаваную Скірмунтам, і абвясціць стварэнне партыі.

Раман Скірмунт рыхтаваўся да сходу ў Парэччы. Менавіта адсюль 6 чэрвеня 1907 г. ён выслаў Чэславу Янкоўскаму асноўныя тэзісы партыйнай праграмы («Агульныя прынцыпы») і прасіў іх надрукаваць у адпаведнасці з рашэннем Менскай канферэнцыі[539]. На жаль, гэтыя «Прынцыпы» не знойдзены, і аб змесце прапанаванай праграмы можам меркаваць толькі на падставе іншых тэкстаў і выступаў Р. Скірмунта. Вядома таксама, што ў лісце ад 8 чэрвеня ён прасіў рэдактара «Кур'ера» ўнесці праўкі ва ўступную частку праграмы, адзначыўшы, што краёвая партыя «падтрымлівае імкненне габрэяў да роўнасці ў выпадку, калі іх інтарэсы не супярэчаць інтарэсам усяго грамадства»[540].

Пра пазіцыю Рамана Скірмунта шмат гаворыць і тое, што ён запрасіў на сход аднаго са стваральнікаў Літоўскага навуковага таварыства Тадэуша Доўгірда, які публічна прызнаваўся ў сваёй літоўскасці[541].

Чэслаў Янкоўскі пазней сцвярджаў, што галоўная ідэя Рамана Скірмунта заключалася ў стварэнні саюза трох партыйных арганізацый (або трох фракцый) – польскай, літоўскай і беларускай[542]. Можна выказаць меркаванне, што на ролю лідэраў беларускай арганізацыі планаваліся Э. Вайніловіч і Р. Скірмунт, а ў літоўскую фракцыю павінны былі ўвайсці Доўгірд і прадстаўнікі Ковенскай губ. Пра гэта сведчыць і выбар удзельнікаў віленскага схода.

Вялікія надзеі з гэтым сходам звязвала Канстанцыя Скірмунт, якая ў дзень яго правядзення накіравала ліст ксяндзу Дамбраўскасу, у якім ацэньвала сход як апошні шанс на паразуменне паміж палякамі, літоўцамі і беларусамі[543].

Аднак спадзяванняў Рамана і Канстанцыі Скірмунт сход не апраўдаў, хоць партыя і была створана. 17 чэрвеня 1907 г. у Вільню прыехала каля 30 чалавек. Двухдзённыя дэбаты скончыліся абвяшчэннем стварэння «Краёвай партыі Літвы і Белай Русі», зацвярджэннем базавага варыянта яе праграмы і абвяшчэннем газеты «Глос польскі» партыйным органам[544]. Яе рэдактарам стаў Чэслаў Янкоўскі, які ў той час ужо пакінуў рэдакцыю «Кур'ера Літэўскага».

Аднак распрацаваная Раманам Скірмунтам канцэпцыя партыі не была прынята. Сход адверг ідэю саюза трох партыйных арганізацый і стварыў партыю літоўскіх і беларускіх палякаў. Нават Вайніловіч і Янкоўскі ў вырашальны момант

---

[539] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 102–122. Лісты Р. Скірмунта да Ч. Янкоўскага. 1906–1909, арк. 10–10 адв.

[540] Ibidem, арк. 7.

[541] D. Szpoper, *Gente Lithuana, natione Lithuana…*, s. 256.

[542] Cz. Jankowski, *W ciągu dwoch lat…*, s. 138.

[543] D. Szpoper, *Gente Lithuana, natione Lithuana…*, s. 256.

[544] «Kurier Litewski». 1907, Nr 135.

не падтрымалі Скірмунта. Двухдзённыя дыскусіі, верагодна, сведчаць пра тое, што Р. Скірмунт да канца адстойваў уласную канцэпцыю Краёвай партыі.

Праграму падпісалі 23 удзельнікі сходу, сярод якіх не аказалася ні прадстаўнікоў Ковенскай губ., ні Рамана Скірмунта. Як успамінаў Ч. Янкоўскі, яны не пажадалі ўступіць у «чыста польскую партыю»[545].

Прынятая праграма цалкам месцілася ў рэчышчы кансерватыўна-ліберальнага варыянта краёвай ідэі. Яна заклікала да сумеснай працы на карысць усяго Краю, роўнасці ягоных народаў ва ўсіх галінах жыцця і магчымасці свабоднага развіцця іх культур, свабоды веравызнання, выказвала прыхільнасць да канстытуцыйнай манархіі з гарантыяй грамадзянскіх правоў, падтрымлівала ідэю самакіравання, патрабавала пачатковай адукацыі на роднай мове. Пры рашэнні аграрнай праблемы праграма зыходзіла з неабходнасці павялічэння памераў сялянскага землеўладання «шляхам натуральнай эвалюцыі і пры моцнай падтрымцы з боку дзяржавы, без парушэння права ўласнасці». Скарачэнне буйнога памешчыцкага землеўладання дапускалася толькі ў выпадку ліквідацыі цераспалосіцы. Таксама праграма абяцала спрыяць паляпшэнню становішча «бедных і працоўных класаў» і г. д.[546] Многія яе палажэнні фактычна паўтаралі рашэнні перадвыбарчага з'езду ў Вільні (снежань 1907 г.).

Ідэя Рамана Скірмунта наконт міжнацыянальнага саюза ў межах Краёвай партыі ператварылася ў спадзяванне, што на глебе праграмных прынцыпаў паўстануць «нацыянальныя фракцыі», з якімі партыя магла б знайсці паразуменне і стварыць саюз. Апошняе палажэнне цяжка зразумець. Магчыма, гаворка ішла пра асобныя нацыянальныя партыі, якія б узнікалі на падмурку праграмы «віленскіх краёўцаў».

Праграму падпісалі Іпаліт Корвін-Мілеўскі, Эдвард Вайніловіч, Дзмітры Карыбут-Дашкевіч, Канстанцін Скірмунт, Аляксандр Хаміньскі, Станіслаў Ваньковіч, Чэслаў Янкоўскі, Тадэуш Дэмбоўскі ды інш. Старшынём быў абраны Эдвард Вайніловіч, а яго намеснікам памешчык з Гарадзеншчыны Юльян Талочка[547].

З'яўленне Краёвай партыі выклікала шматлікія крытычныя заўвагі ў адрас яе арганізатараў. «Кур'ер Літэўскі», які па асобных пытаннях ужо падтрымліваў нацыянальных дэмакратаў, і «Дзеннік Віленьскі» змясцілі шэраг крытычных артыкулаў. Незадавальненне прыхільнікаў партыі Дмоўскага выклікала адсутнасць у праграме спецыфічна польскіх патрабаванняў, што дало падставы аднаму з аўтараў «Дзенніка» заявіць, што краёўцы імкнуцца адарваць гістарычную Літву

[545] Cz. Jankowski, *W ciągu dwoch lat*..., s. 138.

[546] *Stronnictwo Krajowe Litwy i Białej Rusi*, «Słowo». 1907, Nr 177.

[547] «Kurier Litewski». 1907, Nr 148.

ад Каралеўства Польскага[548]. Варожа сустрэла з'яўленне партыі і адміністрацыя Віленскага генерал-губернатарства[549].

Частка краёўцаў убачыла ў дадзеным варыянце краёвай арганізацыі выразнае імкненне да абароны інтарэсаў не Краю, а ўласных маёнткаў. Менавіта на гэта звярнуў увагу Баляслаў Ялавецкі. Ён ахарактарызаваў створаную ў Вільні арганізацыю як «партыю без твару, без сілы і без смеласці». На яго думку, ні літоўцы, ні беларусы ніколі не далучацца да партыі, бо яе праграма супярэчыць назве. Фактычна, на думку аднаго з ідэолагаў краёвасці, «узнікла эндэцыя № 2» з выразнай «кансерватыўна-каставай» афарбоўкай. Ялавецкі таксама ахарактарызаваў яе як войска правадыроў, якія не маюць салдат і могуць існаваць толькі на паперы[550]. «Аб'яднаннем кансерватараў» лічыў Краёвую партыю Людвік Абрамовіч[551].

«Кур'ер Літэўскі» даў магчымасць сябрам Краёвай партыі адказаць сваім апанентам. Станіслаў Ваньковіч заявіў, што партыя імкнецца да кампрамісу з рускай нацыяй, вынікам якога можа стаць доўгачаканая палітычная роўнасць палякаў. Краёўцы не высоўваюць лозунга аўтаноміі Літвы і Беларусі толькі таму, што гэта справа далёкай будучыні. Што датычыць радыкальнай аграрнай рэформы, то, на думку Ваньковіча, такое патрабаванне, па сутнасці, не з'яўляецца дэмакратычным, бо можа прывесці да знішчэння найбольш прыбытковых гаспадарак[552].

У абарону Краёвай партыі выступіў таксама пецярбургскі «Край» Эразма Пільтца. У артыкуле «Польская Краёвая партыя Літвы і Беларусі» сцвярджалася, што праграма краёвай партыі напоўнена «духам хрысціянскай любові і міру, ідэаламі нацыянальнай справядлівасці, роўнасці і згоды». Аўтар нават параўнаў яе з... Люблінскай уніяй і бачыў у яе стварэнні імкненне краёўцаў працаваць разам з іншымі народамі Краю дзеля ягонага росквіту. Публіцыст катэгарычна не згаджаўся з тэзісам польскіх нацыянальных дэмакратаў нібыта Краёвая партыя з'яўляецца адмаўленнем ад польскай ідэі. Але падобна, што памылка ў назве партыі, дзе, насамрэч, адсутнічала слова «польская» была невыпадковай. Асяродак пецярбургскага «Краю» разумеў краёвасць як аптымальную форму абароны польскасці[553]. Відаць, менавіта так яе разумелі і сябры новай партыі, што было непрымальным для Рамана Скірмунта.

Крытычныя галасы былі значна мацнейшымі за спробы абароны Краёвай партыі. Прычым прыхільнікі партыі Рамана Дмоўскага крытыкавалі не толькі партыю, але і саму краёвую ідэю. Відаць, якраз апошняе і прымусіла выказацца Рамана Скірмунта, які дагэтуль у дыскусіі не ўдзельнічаў. Расчараванне, якое ён перажыў

---

[548] «Dziennik Wileński. 1907, Nr 141.

[549] E. Wojniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 174.

[550] B. Jałowiecki, *Odrobina obiektywizmu*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 162.

[551] «Kurier Litewski». 1907, Nr 191.

[552] St. Wańkowicz, *Audiator*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 170.

[553] Zygm. L...ski, *Stronnictwo Krajowe Polskie Litwy i Białej Rusi*, «Kraj». 1907, Nr 22.

у Вільні, не датычыла яго стаўлення да краёвай ідэі. Напрыканцы ліпеня 1907 г. на старонках варшаўскай газеты «Слова» Раман Скірмунт выступіў з вялікім артыкулам «У абарону ідэі», які з'яўляецца адным з найбольш важных для разумення асабістых матываў краёвай дзейнасці яго аўтара.

Ужо на самым пачатку ён зазначыў, што не належыць да Краёвай партыі Літвы і Белай Русі і не збіраецца абараняць яе праграму, а засяродзіць увагу на краёвай ідэі і паспрабуе адказаць на тры ключавыя пытанні:

- Наколькі абгрунтавана ідэя адметнай краёвай палітыкі для Літвы і Беларусі?
- Ці з'яўляецца шкодным для польскіх нацыянальных інтарэсаў існаванне Краёвай партыі?
- Ці магчымае мірнае супрацоўніцтва або сімбіёз нацыянальнасцяў, якія суіснуюць на адной тэрыторыі?

Раман Скірмунт пачаў артыкул з двух вельмі важных прызнанняў. Па-першае, палякі ў Літве і Беларусі за выключэннем некалькіх мясцовасцяў з'яўляюцца абсалютнай меншасцю «пасярод беларускага або літоўскага мора», а, па-другое, яны належаць да «спрадвечных сыноў гэтай зямлі, бо Літва і Беларусь сталі іх Айчынай».

На яго думку, гістарычную і культурную адметнасць Краю прызнала нават расійская бюракратыя, якая стварыла асобную адміністрацыйную адзінку (*Северо-Западный край*), жыццё якой вызначае выключнае заканадаўства і інструкцыі, скіраваныя супраць польскасці і развіцця гістарычнай Літвы. Ён выказаў здзіўленне, што гэтую краёвую адметнасць і права ягоных жыхароў любіць свой Край і быць ягонымі патрыётамі не прызнаюць тыя, хто здаўна адчуваў увесь цяжар цэнтралізму і разумеў каштоўнасць самастойнасці пры вырашэнні мясцовых праблем. Паводле Скірмунта, якраз польскія нацыянальныя дэмакраты настойваюць на тым, каб лёс Беларусі і Літвы вызначаўся ў Варшаве людзьмі, якія не арыентуюцца ва ўмовах мясцовага жыцця і абыякава ставяцца да ягоных патрэб. Раман Скірмунт прыгадаў, што дзеля аўтаноміі Каралеўства Польскага гэтыя людзі пайшлі на пагадненне з расійскай Партыяй канстытуцыйных дэмакратаў і гатовы былі пакласці Край як «ахвяру на алтар кадэцкай праграмы».

«У галовах гэтых спадароў, – з абурэннем пісаў Скірмунт, – не змяшчаецца, як гэта магчыма, каб жыхары цёмнай Літвы і адсталай Русі імкнуліся самастойна вырашаць уласныя праблемы. Не! За імі нельга прызнаваць права сталасці! «Бацвіны» не павінны забываць, што думаць за іх заўжды будзе Карона, а ім дастаткова слухацца. Так было даўней, так было ў II Думе, і ці ж не было вельмі добра? Прэч з краёвай палітыкай! З гледжання Варшавы для «бацвінаў» няма самакіравання і не павінна быць незалежнага меркавання»[554].

---

[554] R. Skirmunt, *W obronie idei*, «Słowo». 1907, Nr 202. «Бацвіны» ці «бацьвіннікі» – пагардлівая мянушка жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, якая сустракалася ў Каралеўстве Польскім. Пэўны сучасны адпаведнік «бацвінаў» – «бульбашы».

Артыкул Скірмунта быў вельмі эмацыйным. Яго абурала стаўленне апанентаў да Беларуска-Літоўскага краю як да «засценку», іх нежаданне зразумець, што крыніцай краёвасці з'яўляецца любоў да Айчыны, а не нейкія адарваныя ад жыцця тэорыі: «Горкім бывае хлеб, які мы вырошчваем на гэтай зямлі, але нельга пакідаць пост, на які мы пастаўлены лесам. Тут мы павінны жыць, працаваць і паміраць, і пакуль усведамленне гэтага абавязку будзе з намі, будзе жыць і краёвая палітыка»[555].

На гэтыя словы варта звярнуць увагу. Магчыма, менавіта ў іх – сутнасць усёй грамадскай і палітычнай дзейнасці Рамана Скірмунта. Клопат пра родны Край стаў абавязкам з усведамленнем той высокай місіі, якую выконвалі продкі і павінен выконваць іх нашчадак. Уласная праца набывала значэнне абароны культуры, гісторыі і традыцый Беларуска-Літоўскага краю ад ціску ці то ўсходняга, ці то заходняга «цэнтралізму».

Краёвец Скірмунт таксама пераконваў, што асобная пазіцыя літоўскіх і беларускіх палякаў не толькі не шкодзіць польскай нацыянальнай справе, а, наадварот, спрыяе ёй. Ён прыводзіў прыклады нацый, падзеленых дзяржаўнымі межамі і нават акіянамі, сцвярджаючы, што пачуццё нацыянальнай еднасці ў большай ступені прысутнае там, дзе ўлічваецца адметнасць розных рэгіёнаў. Так, аўстрыйскі немец не павінен дзеля велічы нямецкай нацыі рабіць тое ж самае, што робіць грамадзянін Германскай імперыі. Брытанскае адзінства трымаецца на разуменні метраполіяй адметных задач, якія стаяць перад падданымі Яе Вялікасці Каралевы ў асобных калоніях, а таксама на аўтаноміі і самастойнасці гэтых земляў.

Аўтар прыгадаў гісторыю, адзначыўшы, што і пасля Люблінскай уніі Вялікае Княства Літоўскае мела шырокія магчымасці для самастойнага развіцця. «Нядоля і ўціск XIX ст. наймацней яднае і цэнтралізуе польскае жыццё, пралітая кроў цэментуе яго», – заўважыў публіцыст. Але нельга ігнараваць і тое, што палякі Беларуска-Літоўскага краю і Каралеўства Польскага жывуць у розных умовах і адпаведна маюць розныя задачы: «Грамадскія дзеячы Каралеўства дзейнічаюць на падмурку згуртаванай польскай нацыі. У нас няма такога трывалага падмурку. Мы павінны працаваць сумесна і ўзгоднена з карэнным і няпольскім насельніцтвам Краю, з якім нас яднае кроў і паходжанне, чаго нельга забываць»[556]. Адпаведна, калі першай задачай палітыка Каралеўства Польскага з'яўляецца дасягненне яго аўтаноміі, то для літоўскага ці беларускага паляка галоўным абавязкам застаецца клопат пра патрэбы «нашага Краю». Выкананне гэтага абавязку, на думку Скірмунта, цалкам адпавядала агульнапольскім нацыянальным інтарэсам.

У гэтай публікацыі адчувальны водгук віленскай няўдачы Рамана Скірмунта. Ён зазначыў, што шмат людзей палохаецца самой думкі пра пэўнае нацыянальнае паяднанне, пра супольную працу ў адной арганізацыі з прадстаўнікамі іншых на-

[555] Ibidem.
[556] Ibidem.

цый. Яны перакананыя, што падобная супраца немагчыма. Раман Скірмунт меў іншае меркаванне.

ДАКУМЕНТ

Раман Скірмунт. У абарону ідэі. 1907 г.[557] Фрагмент.

Усім вядомы прыклад мірнай супрацы нацыянальнасцяў дае Швейцарыя. У Бельгіі мы бачым прадстаўнікоў абедзвюх нацыянальнасцяў гэтай краіны – валонаў і фламандцаў, якія працуюць разам у адной партыі. Галасы нацыяналістаў, якія імкнуцца пасеяць раздор у палітычным жыцці, застаюцца без водгука. Тое ж назіраем у Канадзе. Супольная праца ў краевым духу паяднала французаў і англічан. Француз сэр Уілфрэд Лор'е э з'яднаў прадстаўнікоў абедзвюх нацыянальнасцяў у ліберальнай партыі, таксама як раней англічанін сэр Джон Макдональд іх аб'яднаў у кансерватыўнай партыі. І абедзьве нацыі супрацоўнічаюць у руплівай абароне, з аднаго боку, сваёй краёвай незалежнасці, а з другога – адзінства і магутнасці дзяржавы.

Імкненне да паляпшэння сужыцця нацый, што жывуць на адной зямлі, вітае ў паветры [...]

Магчыма, падчас рэвалюцыі нідзе разбуральныя памкненні людзей, што страцілі раўнавагу, не набывалі такіх жудасных форм як у балтыйскіх правінцыях. Нідзе падзел паміж людам і маёмасным класам не быў такім вострым. Тым не менш, і там з'явілася думка пра магчымасць і неабходнасць міжнацыянальнага паразумення і супольнай працы на грамадскай ніве. Прыбалтыйскія немцы прапанавалі заснаваць Балтыйскую канстытуцыйную партыю з мэтаю паяднання добрых сыноў балтыйскай айчыны ў сумеснай працы дзеля агульнага дабра.

Балтыйская канстытуцыйная партыя не з'яўляецца нямецкай нацыянальнай. Хоць яна была заснавана немцамі і знайшла сярод іх найбольшую падтрымку, але ніхто, апрача самых упартых гакатыстаў, не нападае на яе, ніхто, апрача людзей злой волі і вузкага мыслення, не абвінавачвае яе ў здрадзе нямецкай справе.

Калі мы пачнем адмяжоўвацца ад люду ў нацыянальных арганізацыях, свядома страцім тыя рэшткі нашага ўплыву, што яшчэ засталіся. Відаць, кожны разумее, што падчас супольнай працы ўзнікае ўзаемадавер і нараджаецца адчуванне агульных патрэб.

Бюракратыя старога рэжыму працавала дзесяткі гадоў, каб нас аддзяліць ад люду, ізаляваць нас як заразлівых у халерным бараку. Ідучы за лозунгамі эндэцыі, мы б завяршылі гэтую нескончаную і гібельную для нас працу.

Супраца розных нацый, якія насяляюць адзін край – не ўтопія. Мы гэта назіраем у іншых краінах. І ў нас яна магчымая. Але неабходна зрабіць яе галоўнай ідэяй нашай праграмы і свядома працаваць у гэтым кірунку.

---

[557] R. Skirmunt, *W obronie idei*, «Słowo». 1907, Nr 203.

Краёвая партыя нічым не пашкодзіць добрым стасункам палякаў з Літвы і Беларусі з Каралеўствам. Але добрымі і трывалымі гэтыя адносіны стануць толькі тады, калі будзем ставіцца да іншых як роўныя да роўных, калі «звышпалякі» адмовяцца ад імкнення кіраваць нашымі краёвымі справамі і вызначаць нашыя крокі. Гэтае жаданне навязаць апеку ўжо мела кепскія наступствы, але стойкасці супрацьстаяць такім намерам нам заўсёды хопіць.

Людзі, што маюць такую каштоўную рысу як асцярожнасць, не павінны даказваць сваю невінаватасць, уступаючы ў шэрагі Краёвай партыі. Нападкі на яе прыхільнікаў зыходзяць з групы «сапраўдных палякаў». Не ўвесь польскі друк, а толькі эндэцкі ўдзельнічае ў гэтым. Прэса рэалістаў і прагрэсістаў прыхільна паставілася да партыі. Адмова называць кагосьці «добрым сынам» свайго народу – гэта добра вядомы тэрарыстычны прыём. Ён дзейнічае на недаспелы або баязлівы розум. «Истинно-русские» адмаўляюць у гэтым многім прыстойным расійцам. Ворагамі Айчыны называлі Віндхорста, Біхтэра ды іншых прадстаўнікоў больш гуманістычнага накірунку нямецкай палітыкі. Калі і нас не лічаць «добрымі сынамі», то мы трапляем у слаўную кампанію.

Чалавечая прырода недасканалая. Схільнасць да крыўды бліжніх часта ў ёй прысутная, таму ўключэнне ў праграму ваяўнічых і агрэсіўных палажэнняў з'яўляецца данінай кепскім інстынктам. Такіх палажэнняў і пазіцый няма ў адозве краёўцаў. Пры гэтым ім хопіць смеласці, каб выступіць у абарону ўласных прынцыпаў, бо вера ў іх справядлівасць і правату глыбокая.

Іншыя абвінавачванні, выказаныя рознымі буркатунамі пад гукі эндэцкага кацінага канцэрта, можна абмінуць маўчаннем, яны не маюць значэння. На абвінавачванне, што ў нашай праграме мы не ставім сябе паўсюль на першае месца, не гарантуем сабе кіраўніцтва і перавагі, адкажу так – такое кіраўніцтва можна забяспечыць, толькі не ў якасці прывілея, атрыманага з кармазынавай традыцыі[558] *Рэчы Паспалітай ад мора да мора, а на падставе заслуг і ўласнай працы, тут і зараз.*

Прыведзены фрагмент артыкула выразна сведчыць пра тое, што інтарэсы літоўскіх і беларускіх палякаў для Рамана Скірмунта непарыўна перапляталіся з інтарэсамі ўсёй гістарычнай Літвы. Пры гэтым яны заставаліся неад'емнай часткай польскіх нацыянальных інтарэсаў. Скірмунт трактаваў гэтыя інтарэсы ў рэчышчы палітычнага разумення нацыянальнай ідэі. Клопат аўтара пра лёс мясцовай польскай эліты адначасова быў клопатам пра будучыню Беларусі і Літвы і ўласна польскага руху. Развіццё апошняга Скірмунт звязваў з пераадоленнем міжнацыянальных антаганізмаў, дасягненнем пэўнага паразумення на глебе абароны агульнакраёвых інтарэсаў.

---

[558] Кармазынавы – цёмна-вішнёвы колер, які часта мелі жупаны магнатаў Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

Таксама звяртае на сябе ўвагу і тое, што першапачатковы намер абараніць краевую ідэю напрыканцы артыкула ператварыўся ў абарону Краёвай партыі Літвы і Беларусі і яе праграмы. Магчыма, ужо падчас падрыхтоўкі гэтага тэксту яго аўтар пераадолеў зразумелае расчараванне віленскім сходам. З гэтага моманту пачалося ягонае паступовае збліжэнне з Краёвай партыяй.

Між тым, у ліпені была створана Рада Краёвай партыі, у якую ўвайшлі старшыня Эдвард Вайніловіч, віцэ-старшыні Юльян Талочка (Гарадзенская губ.) і Тадэуш Дэмбоўскі (Віленская губ.), казначэй Эдмунд Барткевіч (Вільня), а таксама Аляксандр Хаміньскі (Віленская губ.), Караль Незабытоўскі (Бабруйскі пав.), Канстанцін Скірмунт (Кобрынскі пав.), Станіслаў Ваньковіч (Менская губ.) і Міхал Мэйштовіч (Ковенская губ.). Важную ролю ў функцыянаванні партыі павінен быў адыгрываць яе Сакратарыят, які складаўся з Тадэуша Дэмбоўскага і Чэслава Янкоўскага.

Аднак партыя аказалася няздольнай на актыўную дзейнасць. Перспектыва застацца партыяй «на паперы», якую прадказваў Баляслаў Ялавецкі, была вельмі рэальнай. Чэслаў Янкоўскі прызнаваўся, што «Глос Польскі» знайшоў толькі трохі болей за 200 падпісчыкаў. Сродкаў, якія партыя вылучыла на гэтае выданне, хапіла толькі на пяць нумароў[559]. Абранне ў верасні 1907 г. Станіслава Ваньковіча дэпутатам III Дзяржаўнай Думы ад Віленскай губ. не было звязана з дзейнасцю партыі. Паводле прызнання Вайніловіча, Краёвая партыя «праспала» думскія выбары[560].

У верасні 1907 г. Чэслаў Янкоўскі ў пошуках працы перабраўся ў Варшаву. Аднак думкамі ён быў усё яшчэ ў Вільні і адгукнуўся на прапанову Рамана Скірмунта стварыць суполку, якая б паспрабавала выкупіць «Кур'ер Літэўскі» ў ягонага ўладальніка біскупа фон Ропа. Пераемнік Янкоўскага рэдактар Войцах Бараноўскі і адміністратар Эдмунд Навіцкі не здолелі захаваць ранейшую папулярнасць газеты, і біскуп выказаў жаданне яе прадаць.

Раман Скірмунт зацікавіўся магчымасцю выкупіць газету і вярнуць ёй характар агульнакраёвага выдання. Аднак перамовы ішлі цяжка. Спачатку фігуравала сума ў 50 тыс. руб., потым паступіла прапанова выкупіць палову акцый «Кур'ера» за 30 тыс. Пры гэтым адміністратарам заставаўся Навіцкі, а новыя ўладальнікі атрымлівалі свабоду рэдагавання.

8 кастрычніка 1907 г. Раман Скірмунт напісаў ліст да Чэслава Янкоўскага, які прэзентаваў яго аўтара ўжо як прадпрымальніка. Паводле меркавання Скірмунта, якое грунтавалася на кансультацыях са спецыялістамі па гандлёвых аперацыях, кошт «Кур'ера» быў завышаны прыблізна ў два разы. Раман Скірмунт прапанаваў набыць палову газеты за 15 тыс. руб. і падзяліць штогадовы даход з тым, каб суполка пакупнікоў атрымлівала 900 руб. (6 % ад выкупной сумы), а былы ўладальнік – 2 700 руб. (6 %) ад поўнага кошту газеты, які складаў 45 тыс. руб.

---

[559] Cz. Jankowski, *W ciągu dwoch lat...*, s. 136.

[560] E. Wojniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Częsc pierwsza*, s. 175.

Пры гэтым уладальнік Парэчча вельмі насцярожана ставіўся да існавання незалежнай ад новых уладальнікаў адміністрацыі. Наогул, зацягнутасць перамоў, якія адбываліся з лета 1907 г., прымушала сумнявацца ў перспектывах набыцця газеты. Напрыканцы ліста ён прасіў Янкоўскага не адкідаць думкі пра выданне ўласнай «Газеты Краёвай» і заяўляў, што паспрабуе сабраць на гэта адпаведныя сродкі[561].

Ужо пасля палітычна матываванай высылкі біскупа фон Ропа з Вільні (кастрычнік 1907 г.) Скірмунт і Янкоўскі выказалі намер набыць газету за 25 тыс. і гарантавалі былому ўладальніку пажыццёвыя 4 % ад усіх яе даходаў. Была дасягнутая згода і нават вызначаны дзень падпісання дамовы. Аднак напярэдадні Янкоўскі атрымаў ліст ад Навіцкага, які паведаміў, што «Кур'ер» не прадаецца (?!)[562].

Няўдачы не адштурхнулі Рамана Скірмунта ад краёвай ідэі і спробаў яе практычнай рэалізацыі. Тым больш, што канцэпцыя краёвасці станавілася ўсё больш папулярнай сярод літоўскіх і беларускіх палякаў. Пра гэта сведчыць спроба стварэння некалькіх партыйных арганізацый, якія дэкларавалі краёвасць.

Так, адначасна з віленскім сходам 17 чэрвеня 1907 г. у Менску адбыўся ўстаноўчы сход па стварэнні Польскага дэмакратычнага саюза Беларусі. Галоўнай мэтай яго дзейнасці абвяшчаўся ўздым дабрабыту і культурнага ўзроўню ўсіх жыхароў Беларусі незалежна ад этнічнай і рэлігійнай прыналежнасці, сацыяльнага становішча. Асноўным сродкам дасягнення гэтай мэты лічылася ўвядзенне самакіравання. Мэтай аграрнай рэформы абвяшчалася стварэнне моцнай сялянскай гаспадаркі. Пры гэтым дапускалася магчымасць адчужэння часткі памешчыцкіх земляў за выкуп. Саюз не абмінаў увагай польскія нацыянальныя інтарэсы. Яго праграма патрабавала аўтаноміі Каралеўства Польскага, роўнасці палякаў у правах, захавання і развіцця польскай культуры[563]. У Галоўны камітэт Саюза ўвайшлі К. Гардзялкоўскі, К. Дзямідэцкі-Дзямідовіч, В. Нітаслаўскі, М. Абязерскі, Е. Асмалоўскі і А. Ражноўскі. Падобна на тое, што мела месца спроба арганізацыйнага паяднання ліберальна-дэмакратычнай плыні краёўцаў з Менскай, Магілёўскай і Віцебскай губ. з мясцовымі прыхільнікамі Партыі канстытуцыйных дэмакратаў.

Трэба адзначыць, што Польскі дэмакратычны саюз быў сустрэты даволі прыхільна. На старонках «Кур'ера Літэўскага» з тлумачэннем асноўных праграмных прынцыпаў выступіў адзін з яго арганізатараў Вітальд Жукоўскі[564]. Ён сцвярджаў, што краёвая пазіцыя – адзіная магчымая для польскай грамадскасці Краю, а падзеі 17 чэрвеня 1907 г. выявілі прысутнасць двух кірункаў сярод

---

[561] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 102–122. Лісты Р. Скірмунта да Ч. Янкоўскага. 1906–1909, арк. 3–5.

[562] Cz. Jankowski, *W ciągu dwoch lat...*, s. 143.

[563] W. Żukowski, *Związek Polski Demokratyczny na Białejrusi*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 141.

[564] W. Zukowski, *W obronie Związku Demokratycznego*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 164.

краёўцаў. Калі Краёвая партыя, на яго думку, з'яднала кансерватыўныя элементы, то Саюз аб'яднаў дэмакратычна настроеных прадстаўнікоў розных колаў польскай грамадскасці. Іх паразуменне можа гарантаваць поспех на чарговых думскіх выбарах. Відавочна, што менавіта чыннік выбараў з'яўляўся тым стымулам, які прыспешваў арганізацыйныя намаганні мясцовых польскіх дзеячаў. Аднак разгарнуць практычную дзейнасць гэтая партыя не здолела. Е. Асмалоўскі ва ўспамінах адзначаў, што ўсё закончылася фактычна на стадыі прыняцця галоўных партыйных дакументаў[565].

Варта таксама адзначыць, што 27 жніўня 1907 г. узнікла Польская краёвая партыя на Русі. Яна была створана буйнымі польскімі землеўласнікамі (старшыня партыі князь Раман Сангушка), займала выразныя кансерватыўныя пазіцыі і толькі сваёй назвай нагадвала краёўцаў Беларуска-Літоўскага краю. Вячаслаў Ліпіньскі, характарызуючы плыні польскага руху ва Украіне, аднёс гэтую партыю да «правых» і ахарактарызаваў накірунак яе дзейнасці як «польска-кансерватыўны»[566].

Яна сапраўды не адрознівалася актыўнасцю і практычна не ўдзельнічала ў думскіх выбарах. Раман Юркоўскі залічыў яе ў шэраг «канапавых партый», уся актыўнасць якіх зводзілася выключна да ўдзелу ў дыскусіях у прэсе і выданні адозваў[567]. Ён жа сцвярджаў, што мэтай партыі было дасягненне паразумення з рускай супольнасцю ва Украіне, прадстаўленай пераважна дзяржаўнай адміністрацыяй і памешчыкамі. Але пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. шансы на такое паразуменне зніклі. У азначаным рускім асяроддзі дамінавалі вялікадзяржаўныя і нацыяналістычныя настроі[568].

У Беларусі і Літве ведалі пра гэтую партыю. Раман Скірмунт у лісце да Чэслава Янкоўскага ад 8 кастрычніка 1907 г. згадаў яе і паведаміў пра выданне газеты «Крэсы»[569]. Аднак тут ён памыляўся. Польская краёвая партыя на Русі не здолела стварыць уласны перыядычны орган. Апошняя згадка пра яе на старонках друку (газета «Край») датычыла чэрвеня 1909 г.

Пэўнай рэакцыяй на ўтварэнне Краёвай партыі можна лічыць таксама ідэю стварэння Польскага саюза краёвай працы, якая, паводле В. Бараноўскага, увосень 1907 г. актыўна абмяркоўвалася сярод літоўскіх палякаў. Рэдактар «Кур'ера Літэўскага» заявіў, што ў гэтым выпадку краёвасць не азначае адмаўлення паляка ад польскасці, а літоўца – ад літоўскасці. Кожны народ будзе мець магчымасці для

---

[565] BN. Dział mikroform. Akc. 7042. J. Osmołowski, *Wspomnienia z przeszłosci*, k. 130.

[566] W. Lipiński, *Szlachta na Ukrainie. Udział jej w zyciu narodu ukrainskiego na tle jego dziejow*. Krakow 1909, s. 74.

[567] R. Jurkowski, *Polskie Stronnictwo Krajowe na Rusi 1907–1909*, «Echa Przeszłosci». 2009, X, s. 195.

[568] Ibidem, s. 216.

[569] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 102–122. Лісты Р. Скірмунта да Ч. Янкоўскага. 1906–1909, арк. 4.

абароны ўласнай культуры і пры гэтым не перашкаджаць іншаму, бо «ўсім хопіць месца на гэтай зямлі». У супрацьвагу Краёвай партыі сцвярджалася, што будучы Саюз будзе абараняць польскія нацыянальныя інтарэсы, не перашкаджаючы абараняць уласныя інтарэсы іншым народам[570].

Арганізацыйныя намаганні, да якіх меў непасрэднае дачыненне В. Бараноўскі, скончыліся стварэннем у Вільні на пачатку 1908 г. Польскага саюза грамадскай працы ў Літве і Беларусі. «Кур'ер Літэўскі» падтрымаў новую польскую арганізацыю. А. Тупальскі на ягоных старонках коратка сфармуляваў галоўныя пастулаты Польскага саюза: быць палякам, прыхільнікам эвалюцыйнага шляху развіцця, шчырым дэмакратам і ўдзельнічаць у грамадскай працы на карысць усяго Краю[571]. Магчыма, менавіта гэты Саюз меў на ўвазе Раман Скірмунт, калі выказаўся наконт групы людзей, якіх аб'яднаў «палітычны рэцэпт», спісаны з праграмы Краёвай партыі: «Плагіят меў пазітыўны вынік...»[572]

У сярэдзіне лютага 1908 г. «Кур'ер» паведаміў, што да Саюза далучыліся такія вядомыя дзеячы, як Войцах Бараноўскі, Аляксандр Хаміньскі, Станіслаў Ваньковіч, Тадэуш Дэмбоўскі, Юзаф Монтвіл, Конрад Недзялкоўскі, Казімір Шафнагель, Анджэй Тупальскі, Міхал Венслаўскі ды інш.[573] Як бачна, значная частка сяброў Краёвай партыі перайшла ў створаны Саюз грамадскай працы.

Крызіс Краёвай партыі Літвы і Беларусі падштурхнуў Рамана Скірмунта да больш актыўных дзеянняў. Напачатку 1908 г. ён уступіў у яе шэрагі. У лютым таго ж года Скірмунт на старонках «Кур'ера Літэўскага» ад імя партыі ўжо адказваў на крытычныя заўвагі А. Тупальскага. Апошні прыпісаў партыі эгаізм «буйных аграрыяў», заклапочаных выключна захаваннем уласных маёнткаў, а таксама згодніцтва з «чарнасоценцамі», праявай якога лічыў паразуменне польскіх выбаршчыкаў з рускімі «правымі» падчас губернскага сходу ў Гародні, дзе абіралі дэпутатаў III Дзяржаўнай Думы (верасень 1907 г.)

Раман Скірмунт накіраваў у рэдакцыю «Кур'ера» кароткі ліст, у якім заявіў, што Краёвая партыя Літвы і Беларусі не з'яўляецца партыяй аграрыяў, якія абараняюць толькі ўласныя інтарэсы, а рашэнне пра саюз з «правымі» прымалася гарадзенскімі выбаршчыкамі. Рэдакцыя «Кур'ера» змясціла ліст, але не ўтрымалася ад каментара пра «эгаістычны дух», якім нібыта прасякнута праграма Краёвай партыі[574].

Менавіта Раман Скірмунт стаў ініцыятарам правядзення агульнага партыйнага сходу, які павінен быў прывесці да кардынальных змен. Сам рэфарматар

---

[570] W. B. [W. Baranowski], *Związek pracy krajowej*, «Kurier Litewski». 1907, Nr 221.

[571] A. Tupalski, *Polski Związek pracy społecznej na Litwie i Białej Rusi*, «Kurier Litewski». 1908, Nr 32.

[572] «Słowo». 1908, Nr 75.

[573] «Kurier Litewski». 1908, Nr 35.

[574] «Kurier Litewski». 1908, Nr 35.

падрыхтаваў даклад «Развіццё прынцыпаў і мэтаў Краёвай партыі», інфармацыя пра які з'явілася на старонках варшаўскага «Слова»[575]. На парадку дня былі пытанні пра выбары новага кіраўніцтва ў сувязі з тым, што Вайніловіч часова займаў гэтую пасаду, пра выхад з партыі Ваньковіча і Дэмбоўскага і даклад Скірмунта. Таксама адзначалася, што ўдзельнікам сходу для абмеркавання будзе прапанаваны новы праект арганізацыі партыі і новы рэгламент яе дзейнасці. Таксама планавалася «развіццё праграмы» Краёвай партыі.

Што атрымалася ў выніку? 13 лютага 1908 г. адбыўся партыйны з'езд, які зацвердзіў прапанаваныя рэфарматарам прынцыпы рэарганізацыі. Было прынята рашэнне пра стварэнне польскага і беларускага аддзяленняў, якія павінны былі скаардынавана вырашаць уласныя нацыянальныя задачы. Было абрана новае кіраўніцтва. На чале партыі стаў Раман Скірмунт[576].

У сакавіку 1908 г. ён выступіў на старонках «Слова» з вялікім артыкулам, у якім тлумачыў сітуацыю ў партыі[577]. Новы партыйны лідэр заявіў, што насуперак чуткам Краёвая партыя Літвы і Беларусі жыве і развіваецца. Ён не прымаў папрокаў у несваечасовасці яе стварэння і прыгадаў, што яшчэ раней заявіла пра сваё існаванне ў Краі Партыя нацыянальных дэмакратаў, актыўна разгортвала сваю дзейнасць Партыя канстытуцыйных дэмакратаў. Стварэнне Краёвай партыі, якая пад сваім штандарам яднала «людзей памяркоўных поглядаў, што шчыра жадалі дабра Краю», у гэтай сітуацыі Скірмунт лічыў неабходнасцю. Праблемай была адсутнасць перыядычнага органа, што не дазволіла своечасова растлумачыць грамадству мэты і задачы партыі. Ён параўнаў Краёвую партыю з нямым чалавекам.

Паводле Рамана Скірмунта, галоўным прынцыпам Краёвай партыі было перакананне, што любоў да ўласнай нацыі не азначае нянавісці да іншых, што можна развіваць уласную культуру без шкоды для культурнага развіцця суседніх народаў. «Гіпертрафіраванае нацыяналістычнае пачуццё кінула вялікі цень на ўсю заходнюю цывілізацыю, – пісаў ён. – Падчас бескампраміснай барацьбы здзічэлі і маральна заняпалі пераможцы і пераможаныя. Барацьбе за выжыванне мы супрацьпаставілі ідэю сімбіёзу або мірнага суіснавання нацый і верым, што здолеем ажыццявіць яе на нашай глебе, як гэта атрымалася ў іншых краінах».

Гаспадар Парэчча прызнаваў важнасць абароны інтарэсаў уласнай нацыі і выказваўся за стварэнне ў партыі «польскай фракцыі», але адразу ж адзначаў неабходнасць паразумення з іншымі нацыямі і сумесную з імі грамадскую дзейнасць. Раман Скірмунт бачыў магчымасць пэўнага нацыянальнага сімбіёзу ў межах адной партыі. Гэта значыць, што прынятая сходам праграма рэарганізацыі трымалася на першапачатковай канцэпцыі партыі як міжнацыянальнага саюза.

Асобна Раман Скірмунт спыніўся на аграрным раздзеле праграмы. Ён заявіў,

---

[575] «Słowo». 1908, Nr 45.

[576] «Słowo». 1908, Nr 75.

[577] R. Skirmunt, *Stronictwo Krajowe*, «Słowo». 1908, Nr 78.

што не можа быць і гаворкі пра «эгаізм буйных аграрыяў», што лозунг «Ні пядзі зямлі!» прыдумала рэдакцыя «Кур'ера Літэўскага» і прыгадаў, што краёўцы ў перыяд I Дзяржаўнай Думы былі ў авангардзе барацьбы супраць радыкальных аграрных праектаў. Скірмунт быў пэўны, што аграрную праблему ў Беларусі і Літве можна вырашыць эвалюцыйным шляхам, выкарыстоўваючы існуючыя інстытуты і Сялянскі банк. Галоўнай задачай ён лічыў ажыўленне зямельнага рынку шляхам стварэння інстытутаў, якія будуць спрыяць парцэляцыі і набыццю сялянамі зямлі.

Кіраўнік Краёвай партыі адкінуў абвінавачванні ў згодніцтве з уладамі, прызнаўшы, аднак, што на дадзены момант урад уяўляе рэальную палітычную сілу, з якой трэба лічыцца. Пры гэтым свае надзеі Краёвая партыя звязвала з «канстытуцыйным урадам». Паводле Скірмунта, толькі ён можа «супакоіць краіну і задаволіць нашыя справядлівыя патрабаванні». Магчыма, пад такім урадам разумеўся Кабінет міністраў, зацверджаны Дзяржаўнай Думай. Артыкул завяршаўся аптымістычным пасланнем аўтара да чытача: «Мы вытрымаем!»

Аднак спадзяванні Скірмунта былі марныя. Ажывіць Краёвую партыю не атрымалася. Яна непрыкметна сышла з палітычнай арэны.

Няздольнасць краёўцаў стварыць уплывовую палітычную арганізацыю ў перыяд рэвалюцыі ў вялікай ступені тлумачыцца пэўным рознагалоссем, характэрным для гэтага кірунку грамадска-палітычнага руху. Сутнасць краёвай ідэалогіі заставалася нязменнай – прыярытэт агульнакраёвых інтарэсаў, роўнасць «грамадзян краю» незалежна ад іх этнакультурнай, рэлігійнай і сацыяльнай прыналежнасці ды інш. Але ўжо ў разуменні нацыі, у стаўленні да асобных народаў Краю (напр., габрэяў), у пошуках шляхоў вырашэння агульнакраёвых праблем і г. д. краёўцы не мелі згоды. Як адзначыла даследчыца Марыя Задэнцка, «краёвая канцэпцыя распадалася на шмат галасоў, аргументацыя і рыторыка якіх больш альбо менш відавочна разыходзіліся ў розныя бакі, змяняліся ў залежнасці ад сітуацыі і ад перыяду гісторыі»[578]. Міхал Ромэр у 1921 г. на старонках свайго дзённіка зрабіў наступны запіс: «Ужываючы тэрмін «краёўцы», трэба заўсёды памятаць, што гэтае паняцце не азначае ні партыі, ні адзінай праграмы. Можна нават сказаць, колькі «краёўцаў», столькі розных праграм [...]»[579]

Але краёвая ідэя жыла і развівалася. Яна засталася ідэалагічнай асновай выбарчай кампаніі літоўскіх і беларускіх палякаў у III Дзяржаўную Думу і Дзяржаўную Раду. На пачатку верасня 1907 г. у Кіеве адбыўся з'езд дэлегатаў губернскіх выбарчых камітэтаў дзевяці «заходніх губ.» Адным з двух прадстаўнікоў Менскай

---

[578] M. Zadencka, *Krajowosc a strategie elit wobec emancypacji narodowej ludu w koncu XIX i początku XX wieku: Litwa i Białorus, prowincje Bałtyckie, Finlandia* (у:) *Krajowosc – tradycje zgody narodow w dobie nacjonalizmu...*, s. 49.

[579] Цытата паводле: J. Sawicki, *Michał Romer a problemy narodowosciowe na ziemiach byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego*, s. 84.

губ. на гэтым з'ездзе быў Раман Скірмунт. У якасці асноўных пастулатаў выбарчай праграмы літоўскіх палякаў былі зацверджаны прынцыпы Віленскага з'езду 1906 г., якія ўключалі ажыццяўленне канстытуцыйных прынцыпаў, патрабаванне роўнасці нацый і рэлігій, адстойвалі недатыкальнасць права ўласнасці, выказваліся за ліквідацыю цераспалосіцы і сервітутаў, уздым сельскагаспадарчай культуры. Важным элементам праграмы заставалася дэцэнтралізацыя ўлады і ўвядзенне самакіравання[580].

Ізноў было прынята рашэнне пра стварэнне асобнага і самастойнага думскага Кола. Падкрэслівалася, што ў сваіх рашэннях яно павінна абапірацца на разуменне асаблівасцяў Краю, клапаціцца пра інтарэсы ўсіх народаў «Літвы і Русі», спрыяць супрацоўніцтву паміж імі. У агульнанацыянальных справах Кола абавязвалася дзейнічаць салідарна з прадстаўнікамі Каралеўства Польскага.

Пасля выбараў абранцы польскай грамадскасці ў адпаведнасці з рашэннямі Кіеўскага з'езда ўтварылі ўласную думскую фракцыю, якая атрымала назву «Польска-літоўска-беларускае кола». Яно дзейнічала ў рэчышчы краёвасці.

Краевая ідэя выразна прысутнічала ў публіцыстыцы. Гэта датычыла нават «Кур'ера Літэўскага», якога так і не здолелі цалкам «прыручыць» польскія нацыянальныя дэмакраты. Тут па-ранейшаму з'яўляліся артыкулы, якія абгрунтоўвалі адпаведнасць краёвай ідэалогіі самаідэнтыфікацыі літоўскіх палякаў. Пра гэта пісалі, напрыклад, Ю. Букоўскі («Калі жыву ў Літве, кахаю яе суровую прыроду і жыхароў, маю агульныя з Краем інтарэсы, то з'яўляюся грамадзянінам Літвы ў поўным значэнні гэтага слова і літоўцам у грамадскім сэнсе. Аднак таму, што размаўляю і думаю па-польску, што пэўныя імёны польскай гісторыі напаўняюць мяне гонарам або сумам, што выхаваў сваю душу на польскай гісторыі і літаратуры [...], належу да польскай нацыі»)[581] і Канстанцыя Скірмунт[582].

Вядомая публіцыстка была аўтарам найбольш палымяных краёвых зваротаў. У лютым 1910 г. яна яшчэ раз заявіла пра сваю прыналежнасць да «літоўскай нацыі», культура якой разумелася як «літоўска-польскае дрэва, што выросла на глебе лацінства і каталіцтва»[583].

Публіцыстка пратэставала супраць ужывання тэрміна «крэсы» і заяўляла, што Беларуска-Літоўскі край уяўляе закончаную цэласнасць. Гэты край, які «калісьці складаў больш чым палову Рэчы Паспалітай, быў цэнтрам працы і ідэі па адраджэнні яе духа, а сёння з'яўляецца Айчынай мільённых народаў, і ні ў якім сэнсе не можа быць названы крэсамі»[584].

«Альфай і амегай» краёвасці публіцыстка лічыла саюз літоўскіх палякаў

---

[580] «Dziennik Wileński». 1907, Nr 84.

[581] «Kurier Litewski». 1908, Nr 223.

[582] Ibidem. 1908, Nr 273, 293.

[583] K. Skirmuntt, *Kartki krajowe*. Wilno 1913, s. 52.

[584] Ibidem, s. 79.

з мясцовымі народамі. Менавіта тут «пані з Муру» разлічвала на з'яўленне новых форм краёвасці, без якіх гэтая ідэя не магла існаваць: «Новая форма – гэта не што іншае, як збліжэнне землеўласнікаў з дэмакратычнымі элементамі, г. зн. з беларускай і літоўскай народнай інтэлігенцыяй – як свецкай, так і духоўнай, з польскім мяшчанствам, з сялянствам, што размаўляе па-польску, з дробнай шляхтай, якая рассеяна па ўсім свеце і цалкам забыта»[585].

Дзеля гэтага збліжэння Канстанцыя Скірмунт лічыла неабходным «адрачэнне ад эгаістычных магнацкіх і зямянскіх інтарэсаў», шчырую падтрымку народных патрабаванняў і культурнае супрацоўніцтва з беларускай і літоўскай інтэлігенцыяй. Яна бачыла «грамадзян краю» сярод літоўскіх палякаў, а таксама маладой літоўскай і беларускай інтэлігенцыі[586].

У сапраўдны орган краёўцаў ператварыў варшаўскае «Слова» Чэслаў Янкоўскі, які ў адным з артыкулаў (1909) ужыў тэрмін «польская краёвая ідэя». На яго думку, толькі яна магла спыніць канфлікты і супярэчнасці, што пагражалі адзінству Краю, які стаў супольнай Айчынай розных народаў: «Толькі пад лозунгам гэтай ідэі ў Літве і Русі можа наступіць яднанне мясцовых нацыянальных сіл для сумеснай працы дзеля будучыні краю. Толькі і выключна краёвая ідэя як ідэя шматэтнічнага краёвага грамадзянства, здольная вырашыць праблемы тутэйшых нацыяналізмаў, і ў першую чаргу польска-літоўскую праблему, якая, нарэшце, перастане быць праблемай»[587].

Апрача ўжо згаданых публіцыстаў і палітыкаў да кола прыхільнікаў краёвасці, паводле канцэпцыі Рамана Скірмунта, можна аднесці таксама Давыд-Гарадокскага ардынанта князя Станіслава Радзівіла (1880–1920) і княгіню Марыю Магдалену Радзівіл (1861–1945). Сімпатыі апошняй да беларускага руху заслугоўваюць асаблівай увагі.

У снежні 1913 г. менскі губернатар паведамляў свайму кіраўніцтву, што княгіня Радзівіл «относится с большой симпатией к местному белорусскому населению, стараясь разговаривать с крестьянами на белорусском языке, снабжая местных католиков белорусскими молитвенниками, оказывая всяческую помощь белорусам и принимая исключительно их к себе на службу»[588].

Добра вядомая вялікая матэрыяльная падтрымка, якую княгіня аказвала выдавецкім і культурніцкім праектам «Нашай Нівы». Таксама сустракаюцца звесткі, што яе дом у Менску і палац у Кухцічах Ігуменскага пав. Менскай губ.

---

[585] «Kurier Litewski». 1912, Nr 99.

[586] Ibidem.

[587] Cz. Jankowski, *Idea krajowa*, «Słowo». 1909, Nr 88.

[588] РГИА. Ф. 821, оп. 128, д. 698, л. 5.

сталі месцамі сустрэч Рамана Скірмунта з лідэрамі беларускага руху братамі Іванам і Антонам Луцкевічамі, Вацлавам Іваноўскім і Аляксандрам Уласавым[589].

Краёвасць, сапраўды, мела вялікі патэнцыял для паразумення прадстаўнікоў розных палітычных груповак і нацыянальных рухаў. Многія краёўцы ўсведамлялі ўласнае беларускае або літоўскае паходжанне, якое спалучалася з польскасцю як прыналежнасцю да польскай культуры. Родавая памяць часам спрыяла іх далучэнню да літоўскага і беларускага адраджэнцкіх рухаў.

Зразумець шлях гэтых людзей паспрабаваў ксёндз Уладзіслаў Талочка ў артыкуле «Пратэст, скіраваны па памылковым адрасе», прысвечаным мітрапаліту Андрэю Шаптыцкаму. На старонках «Двутыгодніка дыяцэзіяльнага» ён бараніў уніяцкага мітрапаліта ад нападкаў польскага друку. Апошні ў дзейнасці прадстаўніка польскага арыстакратычнага роду з Галіцыі, які паспяхова спалучаў пастырскую працу з удзелам у культурным адраджэнні «русінаў», убачыў нацыянальную здраду.

У. Талочка сцвярджаў, што Шаптыцкія паланізаваліся не раней XVIII ст., і ў іх выпадку мела месца вяртанне арыстакратычнага роду да «першапачатковай нацыянальнасці». Гэты выпадак ён разглядаў у шэрагу аналагічных працэсаў у гісторыі Чэхіі, Венгрыі і Літвы і заклікаў прызнаць іх права на гэтае вяртанне: «Калі мы прымаем сітуацыю з нашчадкамі анямечаных, зрусіфікаваных ды іншых родаў, якія, выпраўляючы памылкі сваіх бацькоў (калі яны былі), вяртаюцца ў лона сваёй нацыі, то нам трэба прыняць і зразумець аналагічную псіхалогію і эвалюцыю спаланізаваных русінаў і літвінаў, не адмаўляючы ім таго ж самага права»[590].

Дадам, што аўтар гэтых слоў, разважаючы пра Шаптыцкага, магчыма, тлумачыў і ўласную эвалюцыю свядомасці і культурніцкай дзейнасці...

Варта таксама звярнуць увагу на артыкул «Неадпаведная тэрміналогія», надрукаваны ў студзені 1912 г. на старонках «Дзенніка Пецярбургскага» за подпісам «Незнаёмы». Аўтар пратэставаў супраць акрэслення літоўскіх палякаў «каланістамі» і «палякамі». Ён падкрэсліваў мясцовае паходжанне пераважнай іх большасці і прапанаваў называць сябе літоўцамі і беларусамі: «Каб разглядаць праблему на адпаведнай глебе, мы, жыхары Літвы і Белай Русі, павінны называць сябе літоўцамі і беларусамі. Гэта адразу зруйнуе ўсе абвінавачванні ў чужым паходжанні. Мы, безумоўна, з'яўляемся абарыгенамі і жывем на ўласнай зямлі [...] Але трагізм палажэння ў тым, што мы, літоўцы і беларусы, павінны афіцыйна называць сябе палякамі, бо ў школьных, касцельных і выбарчых справах кожнага непаляка запісваюць адразу ў рускую курыю. Каб не страціць права маліцца папольску, вывучаць польскую мову і выбіраць дэпутатаў нашай культуры, мы вымушаны сцвярджаць, што з'яўляемся палякамі»[591].

---

[589] O. Łatyszonek, A. Zięba, *Radziwiłłowa z Zawiszow Maria Magdalena (1861–1945)* (y:) *Polski Słownik Biograficzny*, t. XXX/3, z. 126. Wrocław 1987, s. 398–399.

[590] «Dwutygodnik Djecezalny». 1913, Nr 3, 10 lutego.

[591] «Dziennik Petersburgski». 1912, Nr 545.

Верагодным аўтарамі артыкула маглі быць Міхал Ромэр або Раман ці Канстанцыя Скірмунт. Таксама можна назваць імёны Антона або Івана Луцкевічаў, якія перанялі многія палажэнні краёвасці і як польскія «краёўцы-прагрэсісты» ў 1912 г. пачалі выдаваць польскамоўны «Кур'ер Краёвы» (1912–1914).

Праблема ўзаемадачыненняў беларускага Адраджэння і краёвай ідэі патрабуе спецыяльнай увагі, асабліва з улікам пазнейшага далучэння Рамана Скірмунта да беларускага нацыянальнага руху.

Гэты рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. паступова ператварыўся ў істотны чыннік грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларуска-Літоўскага краю. Аднак этыка «нацыянальнага эгаізму» не стала характэрнай рысай беларускага Адраджэння. Так, у студзені 1906 г. Беларуская сацыялістычная Грамада абвясціла сябе «партыяй працавітай беднаты Беларускага краю без адрознення нацыянальнасцяў»[592]. Лозунгам «Нашай Нівы» былі словы: «Свайго не цурайся, чужому навучайся», а публікацыі на яе старонках асуджалі ўсе праявы шавінізму, у т. л. беларускага. Зрэшты, пра яго ў той час наогул не даводзіцца казаць.

Дзеячы беларускага Адраджэння знаходзіліся ў пошуках найбольш адпаведнай формулы нацыянальнай ідэі. Яе этнакультурны варыянт («Наша Ніва», 1906–1915) спалучаўся са спробамі паяднання беларускай ідэі з дактрынай сацыялізму (БСГ), з хрысціянска-дэмакратычнай ідэалогіяй («Bielarus», 1913–1915), нарэшце, з краёвасцю. Апошняму спрыялі шчыльныя кантакты з краёўцамі ліберальна-дэмакратычнай плыні, а таксама з дзеячамі дэмакратычных арганізацый літоўскага руху.

Міхал Ромэр увесну 1905 г. ініцыяваў правядзенне ў Вільні польска-беларуска-літоўска-габрэйскіх з'ездаў прыхільнікаў аўтаноміі Літвы. Беларусы, якіх прадстаўлялі Іван Луцкевіч і Аляксандр Уласаў[593], літоўскія палякі і прадстаўнікі габрэйскай супольнасці Вільні выступалі за аўтаномію гістарычнай Літвы з гарантыяй нацыянальна-культурных правоў кожнай нацыі. А вось літоўскія дзеячы адстойвалі ідэю аўтаноміі «этнаграфічнай Літвы з прылеглымі тэрыторыямі і сталіцай у Вільні»[594]. Згода не была дасягнута, але кантакты працягваліся.

Міхал Ромэр у даследаванні гісторыі літоўскага Адраджэння на падставе інфармацыі літоўскай газеты «Darbininku Balsas» (1906, № 1) паведаміў пра зварот кіраўнікоў БСГ напрыканцы 1905 г. да сацыялістычных партый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Літвы і ў першую чаргу да Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі з прапановай стварэння адзінай сацыял-дэмакратычнай партыі Літвы і Беларусі.

---

[592] *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.* У 2-х кн. Кн. 1. Рэд. А. Каваленя і інш. Мінск 2011, с. 252.

[593] R. Miknys, *Lietuvos demokratų partija 1902–1915 metais* (у:) *Lietuvių atgimimo istorijos studijos*. 10. Vilnius 1995, p. 85.

[594] M. Romer, *Litwa. Studyum odrodzenia narodu litewskiego*, s. 350–353.

Яе галоўнай мэтай абвяшчалася аўтаномія Беларусі і Літвы з агульным сеймам[595]. Дарэчы, гэтая ідэя ўвайшла ў праграму БСГ (1906).

Міжнацыянальныя кантакты прыкметна ўзмацніліся ў 1911 г., калі ў Вільні ўзнікла масонская ложа «Еднасць», сярод заснавальнікаў якой былі браты Іван і Антон Луцкевічы. Ложа аб'ядноўвала прадстаўнікоў дэмакратычных плыняў польскага, беларускага, літоўскага нацыянальных рухаў, а таксама габрэйскіх арганізацый. У 1911 г. у ложу быў прыняты Міхал Ромэр, які хутка стаў прызнаным масонскім лідэрам[596].

Дзякуючы ягонай здольнасці пераканаць і павесці за сабой, віленскія масонскія ложы сталі моцнымі цэнтрамі прапаганды краёвай ідэі[597]. Перад Першай сусветнай вайной у Вільні існавалі ўжо чатыры ложы –«Еднасць» («Jednosc»), «Літва», «Беларусь» і «Руплівы ліцвін» («Gorliwy Litwin»). Тры першыя фактычна ядналі прыхільнікаў краёвасці, сярод якіх апынуліся браты Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі, літоўскія дзеячы Міколас Сляжэвічюс, браты Міколас і Вацловас Біржышкі, Феліксас Бугайлішкіс, Юргіс Шаўлюс, Ёнас Вілейшыс, Андрус Булёта ды інш.

М. Ромэр у сваім Дзённіку адзначаў: «Як уласна масонская арганізацыя мы не дзейнічаем, але ў многіх справах менавіта сярод нас выпрацоўваюцца дырэктывы і нараджаюцца ініцыятывы. Нашыя ложы маюць вялікі ўплыў на ўмацаванне ў свядомасці братоў краёвай пазіцыі»[598]. Ложы непасрэдна спрычыніліся да выдання беларускага польскамоўнага «Кур'ера Краёвага» (1912–1914) і польскага «Пшэглёнда Віленьскага» (1911–1915).

Відавочна, што прызнаныя лідэры беларускага руху браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі не толькі прынялі ідэю тэрытарыяльнай непадзельнасці зямель гістарычнай Літвы, але і актыўна яе прапагандавалі. Сродкам гэтай прапаганды стаў віленскі перыядычны друк краёўцаў як прастора міжнацыянальнага паразумення і супрацоўніцтва. Так, у рэдакцыі «Газеты Віленьскай» існаваў г. зв. «літоўскі аддзел» у складзе Міколаса Біржышкі, Юргіса Шаўлюса і Павіласа Вішынскаса.

Супрацоўніцтва таксама датычыла дзейнасці газеты «Кур'ер Краёвы». Гэты беларускі праект выходзіў па-за межы дактрыны этнакультурнага нацыяналізму, што дамінавала ў рэгіёне. Гэта быў арыгінальны праект выдання беларускай газеты на польскай мове[599]. Кіраўнікамі і аўтарамі гэтай газеты былі браты Луцкевічы, якіх падтрымліваў Міхал Ромэр. У лістападзе 1913 г., калі газета пераживала

---

[595] Ibidem, s. 352.

[596] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. Dziennik Michała Romera. T. 4, s. 403.

[597] А. Смалянчук, *З гісторыі віленскага масонства пачатку XX ст.*, «Спадчына». 1998, № 5, с. 50–58.

[598] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. Dziennik Michała Romera. T. 4, s. 404.

[599] ГАРФ. Ф. 102, особый отдел, 1913, оп. 243, д. 157, л. 1.

моцны фінансавы крызіс, у склад яе рэдакцыі ўвайшлі літоўцы Ёнас Вілейшыс, Юргіс Шаўлюс і Сцяпонас Кайрыс, а таксама краёўцы-дэмакраты Ю. Сумарок, Ю. Букоўскі і М. Ромэр[600].

Варта адзначыць, што ў гэты самы час браты Луцкевічы, захоўваючы таямніцу, пачалі выдаваць ліберальна-дэмакратычную газету на рускай мове. «Вечерняя газета» (1911–1915) выступала як орган «рускіх прагрэсістаў», хоць, папраўдзе, гэта была яшчэ адна беларуская выдавецкая ініцыятыва, праз якую рэалізоўваўся беларускі «краёвы праект». Пра яго ўжо даводзілася пісаць[601], таму абмяжуюся толькі сцвярджэннем, што ў паслярэвалюцыйны перыяд краёвая ідэалогія сталася часткай ідэйнага падмурку беларускага руху. Ягоныя кіраўнікі бачылі ў краёвасці сродак умацавання пазіцый беларусаў у нацыянальна-культурным і грамадска-палітычным жыцці Беларусі.

Гэтаму павінны былі спрыяць міжнацыянальныя кантакты, а таксама спроба «думаць Беларусь» у межах канцэпцыі нацыі як палітычнай катэгорыі. Усё ж этнакультурны варыянт нацыяналізму, які паспяхова выкарыстоўвалі літоўцы і палякі, не знаходзіў масавай падтрымкі сярод беларусаў. Для беларускай вёскі, якая была галоўным аб'ектам прапаганды адраджэнцаў, ні родная мова, ні культура не былі дастаткова прывабнымі, бо не мелі сацыяльнага прэстыжу. Можна дапусціць, што прапаганда краёвасці была асцярожнай спробай парушэння пэўнага «нашаніўскага канону» тымі, хто стаяў ля яго вытокаў.

Збліжэнню пазіцый краёўцаў і кіраўнікоў беларускага руху спрыялі таксама тыя крокі, якія прадпрымалі асобныя краёўцы. Так, у беларускім руху актыўна працавалі Язэп Манькоўскі і Аляксандр Заштаўт, якія прадстаўлялі краёўцаў ліберальна-дэмакратычнага накірунку. Крокі насустрач рабілі таксама Раман Скірмунт і Марыя Магдалена Радзівіл. Нагадаю спробу Скірмунта стварыць Краёвую партыю Літвы і Белай Русі з трыма партыйнымі філіямі – польскай, літоўскай і беларускай.

Беларускі гісторык літаратуры Мікола Хаўстовіч адшукаў у Галоўным архіве даўніх актаў (AGAD) у Варшаве лісты Канстанцыі Скірмунт да Аляксандра Ельскага, датаваныя жніўнем і вераснем 1906 г. У лістах ішла гаворка пра напісанне папулярнай «народнай» кнігі для чытання пра Беларусь. Падобна, што гэта была замова пецярбургскага беларускага выдавецтва «Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ». У лісце ад 22 верасня 1906 г. Канстанцыя Скірмунт заахвочвала А. Ельскага ўзяць гэтую справу ў свае рукі, а сама разважала пра магчымае напісанне нарыса гісторыі Беларусі. У лісце згадваўся таксама Раман Скірмунт, з якім аўтарка ліста раілася ў гэтай справе, і які падзяляў яе меркаванне наконт аўтарства А. Ельскага. Паводле Канстанцыі Скірмунт, адмова апошняга пісаць кнігу пра Беларусь можа

---

[600] А. Смалянчук, *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй...*, с. 283.

[601] А. Смалянчук. *«Краёвая ідэя» ў беларускай гісторыі*. Мінск 2017.

абярнуцца тым, што яе напіша нехта іншы і, «хто ведае, ці ў братэрскім духу? »[602] Відавочна. што беларускія справы ўсё больш цікавілі Р. Скірмунта, і нядаўні дэпутат Дзяржаўнай Думы, між іншым, абмяркоўваў іх са сваёй стрыечнай сястрой і вядомай «краёвай» публіцысткай.

Паводле інфармацыі Севярына Выслауха, Скірмунт аказваў фінансавую падтрымку «Нашай Ніве» і сустракаўся з актывістамі беларускага Адраджэння[603]. У 1910-х гг. ён кантактаваў з групай беларускіх студэнтаў у Пецярбурзе. Пазней пра гэта ўзгадваў адзін з тых студэнтаў дзеяч беларускага руху Павел Аляксюк (1892–каля 1950)[604].

Праўда, сярод значнай часткі беларускай эліты ў адносінах да «сацыяльна чужых» пераважала насцярожанае і крытычнае стаўленне. Іх падазравалі ў імкненні захаваць свае дамінуючыя гаспадарчыя і палітычныя пазіцыі. Забягаючы наперад, трэба прызнаць, што гэтая «філасофія падазрэння» суправаджала амаль усю дзейнасць Скірмунта ў беларускім руху.

Паміж Менскам, Парэччам і Пецярбургам

У жыцці Рамана Скірмунта таксама быў эпізод, звязаны з афіцыйнай «службай». У лютым 1905 г. ён пагадзіўся замяніць у Менскім шляхецкім дэпутацкім сходзе памерлага Атона Корсака, які прадстаўляў шляхту Пінскага пав. Яго кандыдатуру зацвердзіў імператар, і ў Менскім сходзе быў заведзены *формулярный список*[605]. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захаваліся тры варыянты яго асабістай справы як дэпутата Губернскага дваранскага схода ад Пінскага пав. Найбольш поўным варыянтам з'яўляецца справа, заведзеная ў Менскім губернскім праўленні 10 сакавіка 1905 г.[606] Апошні запіс быў зроблены 30 чэрвеня 1911 г.

Варта адзначыць, што прадстаўніцтва павятовай шляхты ў губернскім дваранскім сходзе мела пераважна ганарова-фармальны характар. Дэпутат быў абавязаны прысутнічаць на губернскім сходзе дваранства, а таксама на сходах шляхты і яе маршалкаў. Звычайна павет прадстаўляў толькі адзін дэпутат. Аднак гэтая «фармальнасць» магла стаць пачаткам адміністрацыйнай кар'еры.

У сярэдзіне сакавіка 1905 г. губернскае праўленне запатрабавала ад пінскага павятовага спраўніка атрымаць ад кандыдата ў дэпутаты шэраг дакументаў, у т. л.

---

[602] М. Хаўстовіч, *Даследаванні і матэрыялы. Літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзяў*. Том трэці. Warszawa 2017, s. 205.

[603] S. Wysłouch, *Białorusini na ziemi Wileńskiej*. Wilno 1930, s. 3.

[604] А. Чарнякевіч, *Чужы сярод чужых. Павел Аляксюк і беларускія «паланафілы»*. Мінск 2017, с. 28.

[605] НГАБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2979. Формулярный список о службе депутата от дворян по Пинскому уезду Минской губернии дворянина Романа Александровича Скирмунта.

[606] НГАБ. Ф. 299, воп. 7, спр. 2849. Формулярный список о службе депутата от дворян по Пинскому уезду Минской губернии дворянина Романа Александровича Скирмунта.

пасведчанні аб дваранстве, выкананні вайсковага абавязку, атрыманні сярэдняй адукацыі ды інш.

У адказ на зварот служачага паліцыі Скірмунт выслаў пашпарт, выдадзены ў верасні 1902 г. і пасведчанне аб прыналежнасці да патомнага дваранства. У лісце ён сцвярджаў, што дата нараджэння і інфармацыя пра звальненне ў запас (26 чэрвеня 1902 г.) пазначаныя ў пашпарце, а пасведчанне аб заканчэнні Рыжскай губернскай гімназіі засталося ў лейб-гвардыі Валынскім палку, дзе ён праходзіў вайсковую службу ў якасці *вольноопределяющегося* I разраду[607].

У ліпені пра Рамана Скірмунта як кандыдата ў дэпутаты ад дваранства Пінскага пав. паведамілі імператару. Гэты выпадак меў асаблівы характар, бо звычайна дэпутатамі прызначаліся дваране, якія ўжо мелі пэўны чын. Скірмунт яго не меў. Тым не менш, імператар згадзіўся на ягоную кандыдатуру. 23 ліпеня 1905 г. указам Мікалая II Скірмунт быў прызначаны на пасаду дэпутата[608].

У сувязі з прызначэннем Менскае дваранскае праўленне запатрабавала дадатковую інфармацыю. Прыстаў Трусевіч паведаміў, што Раман Скірмунт «холост, живёт при отце, имеющем в Поречской волости имение «Поречье» с принадлежащими к нему фольварками Шчыліпоўка і Дуброва, в коих имеется 7 000 дес. земли, суконная фабрика и винокуренный завод, и имение Теклинополь, расположенное в Вилейском уезде Виленской губ. в 5 700 дес. земли. Письменных документов на принадлежность ему этого имущества не имеет, так как он является распорядителем по смерти отца к имуществу»[609].

10 кастрычніка 1905 г. Раман Скірмунт «выполнил присягу на верность службе». Да прысягі яго прыводзіў пінскі дэкан ксёндз Станіслаў Войцік у прысутнасці павятовага «предводителя дворянства».

Пра тое, як Раман Скірмунт працаваў дэпутатам ягоная асабістая справа маўчыць. Падобна, што фармальны характар працы Губернскага сходу не заахвочваў да нейкай адмысловай актыўнасці. Але ён, безумоўна, паспрыяў пашырэнню кантактаў Рамана Скірмунта ў межах Менскай губ. Таксама трэба адзначыць, што з 1906 г. Раман Скірмунт з'яўляўся радным Пінскага павятовага земства. Двойчы (1906 і 1909) на гэтую пасаду яго прызначаў менскі губернатар[610].

У студзені 1909 г. Губернскі сход звярнуўся з лістом да Губернскага праўлення з просьбай прысвоіць Скірмунту чын калежскага рэгістратара. Адзінай перашкодай была адсутнасць дакумента аб атрыманні дэпутатам сярэдняй адукацыі. Сам Раман Скірмунт у сакавіку 1909 г. яго адсутнасць тлумачыў тым, што дакумент нібыта застаўся ў Лейб-гвардыі Валынскім палку. Таксама ён паведамляў, што

---

[607] Ibidem, арк. 5–5 адв.

[608] Ibidem, арк. 11.

[609] Ibidem, арк. 15–15 адв.

[610] «Kurier Litewski». 1909, Nr 170; «Kurier Wileński». 1911, Nr 68.

звярнуўся непасрэдна ў Рыжскую гімназію з просьбай выдаць пасведчанне аб яе заканчэнні[611].

Архіўная справа ўтрымлівае працяглую перапіску Менскага губернскага праўлення з камандаваннем Валынскага палка і апекуном Рыжскай навучальнай акругі. З палка паведамілі, што ўсе дакументы былі вернуты адстаўному прапаршчыку Скірмунту, а з Рыгі прыйшоў ліст з інфармацыяй, што Раман Скірмунт у Рыжскай губернскай гімназіі не навучаўся. Насамрэч, як ужо адзначалася, у 1881–1883 гг. ён вучыўся ў Рыжскай гарадской гімназіі, якую так і не скончыў. Адсутнасць дакумента аб сярэдняй адукацыі перакрэсліла адміністрацыйную кар'еру Рамана Скірмунта. Але гэтая няўдача, магчыма, толькі актывізавала ягоную грамадскую і палітычную актыўнасць.

У паслярэвалюцыйны перыяд яна была шчыльна звязана з Менскім таварыствам сельскай гаспадаркі, у якім адбыліся пэўныя змены. Так, у сакавіку 1907 г. агульны сход МТСГ упершыню абіраў свайго «рэальнага» старшыню. Менскі губернатар больш не з'яўляўся ягоным фармальным кіраўніком. З выбарам не было праблемы, бо Эдвард Вайніловіч не меў альтэрнатывы. Таксама былі пераабраны сябры Рады Раман Скірмунт, Ежы Чапскі, Міхал Лэнскі і Аколаў. А вось за пасаду віцэ-старшыні разгарэлася барацьба. Вайніловіч прапанаваў Рамана Скірмунта, як «маладога і здольнага». Але знайшоўся годны канкурэнт.

Трэба адзначыць, што з часоў Юбілейнай менскай выставы (1901) сітуацыя ў Таварыстве істотна змянілася. Даследаванні Рамана Юркоўскага дазваляюць сцвярджаць, што ў МТСГ афармілася апазіцыйная кіраўніцтву групоўка, сябры якой імкнуліся надаць Таварыству больш выразнае нацыянальнае аблічча. Апазіцыю, якая сімпатызавала польскім нацыянальным дэмакратам, падтрымала маладзейшага частка сяброў МТСГ[612]. Менавіта яны прапанавалі кандыдатуру Урбана Крупскага, які падчас выбараў набраў больш галасоў[613]. Аднак кіраўніцтва Таварыства паведаміла пра парушэнне працэдуры галасавання і не прызнала іх вынікі. Вайніловіч не збіраўся саступаць.

Таксама на гэтым сходзе ўздымалася праблема сялянскіх сельскагаспадарчых гурткоў, якія ствараліся пад эгідай МТСГ, але не згадваліся ў статуце арганізацыі. Раман Скірмунт коратка распавёў гісторыю стварэння гурткоў Пінскім аддзелам Таварыства і выказаўся за ўнясенне зменаў у статут[614].

Наступны агульны сход адбыўся ў кастрычніку 1907 г. Галоўнай падзеяй былі выбары віцэ-старшыні. На гэты раз Вайніловіч загадзя пралабіраваў кандыдатуру Рамана Скірмунта. Сам кандыдат падчас выступу прызнаўся, што згадзіўся

---

611 НГАБ. Ф. 299, воп. 7, спр. 2849, арк. 34.

612 R. Jurkowski, *Ziemianstwo polskie Kresow Północno-Wschodnich. 1864–1904. Działalnosc społeczno-gospodarcza.* Warszawa 2001, s. 262.

613 «Głos Polski». 1907, Nr 1.

614 «Kurier Litewski». 1907, Nr 60.

ўдзельнічаць у выбарах толькі па просьбе некаторых сяброў Таварыства. «Ведаю, – заявіў ён, – што не маю папулярнасці сярод вас з прычыны сваёй палітычнай пазіцыі, але палітыка не будзе мець дачынення да сельскагаспадарчых спраў»[615]. Урэшце рэшт ён набраў 60 галасоў супраць 50 у таго ж канкурэнта і заняў пасаду віцэ-старшыні. Раман Скірмунт заставаўся на ёй і працаваў поруч з Эдвардам Вайніловічам амаль да самага канца існавання Таварыства. На наступных выбарах 1910, 1913 і 1916 гг. ён ужо не меў канкурэнтаў.

На вынікі кастрычніцкіх выбараў, магчыма, паўплывалі палітычныя перамены. Роспуск II Дзяржаўнай Думы, змена выбарчага заканадаўства, а таксама вынікі выбараў дэпутатаў ад Менскай губ. у III Дзяржаўную Думу, на якіх перамаглі вялікарускія шавіністы прымушалі вярнуцца да ранейшых, дарэвалюцыйных форм дзейнасці. Эдвард Вайніловіч параўнаў дзейнасць Таварыства з слімаком, які, напаткаўшы перашкоду, вяртаецца да свайго дому і штодзённай працы. Менавіта да гэтага заклікаў старшыня, зрабіўшы агаворку наконт захавання «ўласных культурных ідэалаў» у новай рэчаіснасці[616].

У снежні 1907 г. Раман Скірмунт упершыню кіраваў агульным сходам Менскага таварыства. Вайніловіч быў вымушаны тэрмінова выехать у Пецярбург. Ён толькі распачаў сход, павіншаваў прысутных з надыходзячым святам і прасіў не губляць надзеі на лепшае нават у такі складаны час. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў сходу апынулася пытанне дапамогі сялянам, якія пакутавалі ад голаду ў выніку няўраджаеў 1905–1907 гг. Хлеб быў, але гандляры, карыстаючыся сітуацыяй, павышалі цэны. Выступоўцы канстатавалі, што ў гэтай сітуацыі сяляне могуць спадзявацца толькі на г. зв. «абшарнікаў», якіх звыкліся лічыць галоўнымі ворагамі. У выніку абмеркавання прапановы Рады МТСГ было прынята рашэнне закупіць разам з земствам 500 вагонаў збожжа, каб прадаць яго галадаючым сялянам па цане набыцця. Кіраўніцтва Таварыства разлічвала такім спосабам спыніць гандлёвыя спекуляцыі мясцовых купцоў[617].

Потым сход заслухаў рэферат «апазіцыянера» Яўгена Кавалеўскага пра «крызіс Таварыства». Выступоўца крытыкаваў «бяздзейснасць» кіраўніцтва і прапанаваў дэцэнтралізацыю і дэмакратызацыю МТСГ, а таксама выказваўся за пашырэнне агранамічнай культуры, адкрыццё сельскагаспадарчых школ, ашчадных кас, стварэнне павятовых сельскагаспадарчых арганізацый ды інш.[618] Паводле інфармацыі на старонках газеты «Край», гэты рэферат не выклікаў дыскусіі з прычыны сваёй

[615] Ibidem, Nr 233.

[616] R. Jurkowski, *Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich*..., s. 260.

[617] «Kraj». 1907, Nr 46.

[618] R. Jurkowski, *Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich*..., s. 260–261.

«журналісцкай легкавеснасці»[619]. Дыскусія адбылася пазней на старонках «Кур'ера Літэўскага»[620].

Пазіцыі Рамана Скірмунта ў МТСГ паступова ўмацаваліся. На гэта паўплывала ягоная энергічная дзейнасць і кампетэнтнасць у самых розных сферах гаспадарання. Так, у сакавіку 1914 г. на вясновым агульным сходзе Таварыства Раман Скірмунт быў абраны ў склад дэлегацыі для ўдзелу ў з'ездзе Расійскай Экспартнай палаты ў Вільні. Ён жа стаў пастаянным прадстаўніком МТСГ пры Віленскім аддзяленні гэтай палаты[621]. Скірмунт таксама меў дачыненне да распрацоўкі статута Таварыства ўзаемнага страхавання, які павінны былі зацвердзіць улетку 1914 г.[622] Дарэчы, у гэты час сябрамі МТСГ былі яшчэ два прадстаўнікі парэцкай лініі Скірмунтаў – старэйшы брат Аляксандр і малодшая сястра Алена[623].

Важнай прасторай асабістага жыцця Рамана Скірмунта заставалася Парэчча. Уласнай сям'і ён не меў і жыў разам з бацькамі і сястрой Аленай. Трэба адзначыць, што ніхто з пяцёх сыноў Аляксандра і Тэафілы Скірмунтаў не ўзяў шлюбу і не меў уласнай сям'і. Чаму так атрымалася? Адказаць на гэтае пытанне складана, бо асабістыя архівы Скірмунтаў не захаваліся, а аб'ектам публічнага абмеркавання ў тыя часы гэтая праблема не стала. Магчыма, пэўную ролю адыгралі адносіны паміж бацькамі, якія напрыканцы XIX ст. пагоршыліся. Як ужо адзначалася, кожны з іх фактычна вёў уласнае жыццё.

Толькі дзве дачкі з вялікай сям'і Аляксандра і Тэафілы Скірмунтаў мелі дзяцей. А адзінай прадаўжальніцай парэцкай лініі роду стала старэйшая дачка Тэафіла (1857–1935). Дарэчы, аналагічная сітуацыя склалася ў суседнім Моладаве, дзе ніхто з дзяцей Генрыка і Марыі Скірмунтаў не меў уласнай сям'і і нашчадкаў. Канстанцін Скірмунт быў цалкам пагружаны ў грамадскія і палітычныя справы, а ягоны брат Генрык у маладосці перажыў трагедыю, калі каханая жанчына незадоўга да шлюбу парвала з ім стасункі. Іх сястра Ядвіга большую частку жыцця пражыла разам з Марыяй Радзевічуўнай.

Спробы знайсці інфармацыю пра іншыя старонкі асабістага жыцця Рамана Скірмунта паспрыялі знаходцы ў Бібліятэцы імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы двух фотаальбомаў Рамана Скірмунта, датаваных 1905–1914 гг.[624] Яны запоўнены фотаздымкамі з Егіпта, Судана і Італіі, пра што сведчаць некаторыя подпісы і шматлікія афрыканскія пейзажы. «Італьянскіх» здымкаў няшмат, але

---

[619] «Kraj». 1907, Nr 46.

[620] «Kurier Litewski». 1907, Nr 285; 1908, Nr 9.

[621] *Отчет о деятельности Минского общества сельского хозяйства за 1914 г.* Минск 1915, с. 14.

[622] *Журналы общих собраний Минского общества сельского хозяйства. 1915. Мартовские собрания.* Минск 1915.

[623] *Отчет о деятельности Минского общества сельского хозяйства за 1914 г.*, с. XXVI.

[624] БУАНЛ. Аддзел рэдкай кнігі. Fg. 1–919/1, Fg. 1–919/2. Хачу выказаць удзячнасць др Вользе Масцяніцы-Станкевіч за дапамогу ў выяўленні і карыстанні гэтымі матэрыяламі.

на двух з іх можна пазнаць Рамана Скірмунта. Большасць фотаздымкаў – гэта афрыканскія пейзажы, выявы мясцовых жыхароў, вайскоўцаў у брытанскай форме, а таксама цывільных еўрапейскага выгляду.

На многіх фотаздымках прысутны стрыечны брат Рамана Станіслаў Скірмунт, які быў службоўцам брытанскай каланіяльнай місіі спачатку ў Егіпце, а пазней у Судане. Усяго захавалася 70 фотаздымкаў. Подпіс пад адным з афрыканскіх здымкаў сведчыць, што і Раман Скірмунт наведаў Судан. Праўда, асоба на ім зусім не падобная на іншыя ягоныя выявы таго часу. Цікава, што нешматлікія здымкі Скірмунта, зробленыя ў Італіі, выразна адрозніваюцца лепшай якасцю ад большасці афрыканскіх.

Гэтыя фотаальбомы ўтрымліваюць пэўную загадку. Справа ў тым, што ў публіцыстыцы і вядомай эпісталярнай спадчыне Рамана Скірмунта, а таксама ва ўспамінах прадстаўнікоў гэтага роду ніколі не згадваліся ягоныя падарожжы ў Афрыку. Італія таксама не фігуравала ў пісьмовых крыніцах, але падарожжы ў гэтую краіну былі звычайнай справай для Скірмунтаў. Асабліва, калі прыгадаць іх маёмасць у раёне Брындызі. Магчыма, разгадку трэба шукаць у постаці Станіслава Скірмунта. У бібліятэцы імя Урублеўскіх таксама захаваліся ягоныя фотаальбомы. Подпісы сведчаць, што фотаздымкі рабіліся ў Судане з 1909 па 1917 гг. На двух альбомах, датаваных 1913 і 1917 гг., пазначаная сталіца брытанскага Судана г. Хартум. На большасці здымкаў тыя ж афрыканскія пейзажы і выявы мясцовых жыхароў.

Цалкам магчыма, што ўсе гэтыя фотаальбомы належалі Станіславу Скірмунту, а пасля ягонай смерці ў Хартуме ў ліпені 1921 г. разам з іншымі рэчамі былі перасланы ў Пінск да сястры Канстанцыі. Можна меркаваць, што некаторыя з іх маглі трапіць у Парэчча пасля яе смерці ў 1934 г. Магчыма, асобныя здымкі былі пазней устаўлены ў альбомы і тады ж падпісаны. Між іншым, пра гэта сведчыць напісанне прозвішча Рамана Скірмунта праз двайное *tt*. Вядома, што на пачатку XX ст. ён меў у прозвішчы толькі адну літару *t*. На жаль, невядома, хто займаўся атрыбутацыяй і якім чынам здымкі апынуліся ў Бібліятэцы Урублеўскіх…

Пра некаторыя іншыя паездкі Рамана Скірмунта сведчыць ягоны пашпарт, які захаваўся ў «фармулярным спісе», куды трапіў увесну 1905 г. Пашпарт быў выдадзены 16 верасня 1902 г., а праз тры дні ягоны ўладальнік ужо быў у Пецярбурзе, дзе прайшоў рэгістрацыю. Таксама ў пашпарце можна ўбачыць штамп «Еўрапейскай гасцініцы» Варшавы, які сведчыць пра прыезд туды Скірмунта 13 кастрычніка 1902 г.[625]

Што датычыць гаспадаркі Парэчча, то, верагодна, з пачаткам актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці Рамана Скірмунта галоўную ролю ў ёй ізноў пачаў адыгрываць ягоны бацька.

«Ліверпуль на Ясельдзе» ў пачатку XX ст. зрэдку фігураваў на старонках га-

[625] НГАБ. Ф. 288, воп. 7, спр. 2849, арк. 5а–6к.

зет і часопісаў. Перамены ў Расійскай імперыі актуалізавалі навіны грамадска-палітычнага жыцця. Між тым, архіўныя крыніцы дазваляюць сцвярджаць, што ў Парэччы па-ранейшаму паспяхова функцыянавалі суконная фабрыка і вінакурны завод. У маёнтку ў 1905 г. жылі замежныя спецыялісты вінакур Густаў Тупенталь, рабочыя Бартэк Шнурова і Александр Мель (усе з Германіі), грамадзянін Аўстра-Венгрыі Карл Загурскі[626]. Газета «Край» у тым жа годзе рэкламавала «Старую гарэлку Александра Скірмунта ў Парэччы», якая прадавалася ва ўласных крамах у Вільні (вул. Вялікая) і Коўне (вул. Віленская)[627]. Гэтую ж рэкламу маглі ўбачыць чытачы газеты «Двутыгоднік Дыяцэзіяльны Віленьскі»[628]. Таксама вядома, што права ўдзелу ў выбарах у I Дзяржаўную Думу атрымалі 105 работнікаў суконнай фабрыкі[629].

Матэрыялы беларускіх архіваў дазваляюць сцвярджаць, што ў маёнтку з 1907 г. існавала незарэгістраваная школа для дзяцей фабрычных рабочых. Улады даведаліся пра яе толькі ў 1912 г., калі рашэннем Менскага Акруговага суда «тайная польская школа» была зачынена, а Раман Скірмунт і настаўніца Марыя Нарэйка былі аштрафаваны[630].

Такім чынам, Раман Скірмунт удзельнічаў у арганізацыі тайнага польскамоўнага навучання ў Менскай губ і ў Пінскім пав. Сустракаюцца звесткі пра ягонае сяброўства ў Радзе польскага таварыства *Oswiata* у Менску[631]. Пра гэта пісаў таксама Канстанцін Скірмунт у лісце да Элізы Ажэшкі ад 1 ліпеня 1907 г. Ён пераслаў пісьменніцы справаздачу Пінскага таварыства дабрачыннасці, датаваную 24 сакавіка 1907 г. Паводле гэтага дакумента, адным з найважнейшых кірункаў дзейнасці было навучанне дзяцей каталікоў польскай мове, катэхізісу, гісторыі і арыфметыцы, іх выхаванне ў духу хрысціянства. З восені 1906 г. Таварыства ўтрымлівала 7 школ (397 вучняў і 12 настаўнікаў), а таксама фінансава падтрымлівала выкладанне польскай мовы ў Пінскай гімназіі. Выдаткі на гэтую дзейнасць склалі болей 2 тыс. руб. У лісце К. Скірмунт адзначыў, што ініцыятарамі гэтай падтрымкі былі «нашы зямяне», а галоўнай пружынай усёй справы былі Канстанцыя Скірмунт і Юзэфа Кужанецкая пры ўдзеле Рамана Скірмунта ды іншых сваякоў»[632].

Тут варта прыгадаць, што названыя асобы мелі таксама непасрэднае дачыненне да выдання «Русінскага лементара» (1907), які можна лічыць першай спробай стварэння буквара на палескай гаворцы. Дарэчы, у артыкуле «Юзэфа Кужанецкая

---

626 НГАБ. Ф. 519, воп. 1, спр. 119, арк. 272.

627 Напр., «Kraj». 1905, Nr 1 і Nr 2.

628 Гл., напр., «Dwutygodnik Djecezalny Wileński». 1913, Nr 3.

629 НГАБ. Ф. 519, воп. 1, спр. 119, арк. 272.

630 НГАБ. Ф. 295, воп. 2, спр. 137, арк. 48.

631 А. Ильин, Е. Игнатюк, *Очерки истории культуры Пинщины (IX – начало XX в.)*, с. 195.

632 Instytut Badań Literackich PAN. Archiwum Elizy Orzeszkowej. List Konstantego Skirmuntta. 01. 07. 1907 г.

(успаміны пасля смерці)» Раман Скірмунт прыпісваў аўтарства Лементара менавіта ёй[633]. Аднак веданне тых моцных сяброўскіх стасункаў, якія ядналі гэтых людзей, дазваляе сцвярджаць, што да стварэння палескага буквара дачыненне мелі таксама Раман і Канстанцыя Скірмунты.

Апошняе прымушае яшчэ раз звярнуць увагу на спецыфіку свядомасці эліты літоўскіх і беларускіх палякаў, у якой польскасць арганічна спалучалася з сімпатыяй да іншых мясцовых культур і моваў. Адпаведна можна было ствараць тайныя польскія школы і адначасна падтрымліваць, напр., развіццё беларускай культуры і палескія традыцыі. Такая пазіцыя цалкам адпавядала прынцыпам краёвай ідэалогіі.

У Спісе касцёлаў Пінскай дыяцэзіі за 1936 г. прыгадваўся касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса ў Парэччы, збудаваны намаганнямі Скірмунтаў, які ў 1930-я гг. ужо не існаваў[634]. Аднак архіўныя дакументы паведамляюць толькі пра невялікую капліцу, усталяваную ў адным са складскіх будынкаў Парэцкага маёнтка (1906) без дазволу ўладаў.

Вось як апісаў яе прыстаў у пратаколе ад 18 кастрычніка 1913 г., калі ўлады даведаліся пра «незаконную» капліцу: «В имении Поречье между другими жилыми и хозяйственными строениями, занятыми под суконную фабрику и другие хозяйственные надобности, в южной части довольно обширной усадьбы имеется каменное двухэтажное здание, расположенное фасадом в сторону фабричного корпуса, в коем в нижнем этаже, с правой стороны, в конце здания помещается каплица. Со двора обыкновенный вход в коридор, поперек здания. Из коридора направо две двери в помещение каплицы [...] Самое помещение каплицы размером 12 аршин длиной и 14 аршин шириной. У стены, коей заканчивается здание, посередине устроено возвышение для алтаря; алтарь облечен в соответствующие одежды, на нем имеются священные предметы для совершения богослужения. На стенах несколько икон и священных изображений. С правой стороны каплицы имеется конфессионал для принятия исповеди. Алтарь отделен барьером. Над помешением каплицы на крыше, на щите имеется небольшой крест. Остальное здание, где помещается каплица, занято квартирами служащих и часть складом под железные изделия»[635].

У 1906 г. большая частка гэтага будынка была занята пад склад фабрычнага абсталявання. Калі верыць афіцыйным тлумачэнням Скірмунта (1913), то набажэнствы ў капліцы адбываліся толькі тройчы на год – перад Вялікаднём, перад Раством і ў дзень смерці Аляксандра Аляксандравіча Скірмунта. Ксёндз Войцік наогул заявіў, што гэта не капліца, а пакой для выканання пэўных рэлігійных

---

633 R. Skirmunt, *Jozefa Kurzeniecka (wspomnienia posmiertne)*, «Kurier Litewski, 1915, Nr 107, 25 kwietnia.

634 *Spisy kosciołow i duchowienstwa Diecezji Pinskiej w roku 1936.* Pinsk, 1936.

635 НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 8257, арк. 19–19 адв.

рытуалаў – споведзі на Вялікдзень, адпявання памерлых і «напутствования больным». Неабходнасць такога пакоя ці капліцы тлумачылася тым, што бліжэйшы ад Парэчча касцёл знаходзіўся ў Пінску[636].

Распачалося следства. Раман Скірмунт прадпрыняў намаганні па легалізацыі капліцы. У адказ на ягоны зварот Магілёўскі арцыбіскуп у верасні 1913 г. дазволіў адкрыццё капліцы ў маёнтку Парэчча, а ксёндз Войцік адразу ж яе асвяціў. Адначасова ў прыватнай размове Р. Скірмунт папрасіў менскага губернатара Аляксея Гірса дапамагчы з легалізацыяй капліцы. Аднак Менскае губернскае праўленне запатрабавала прадставіць план будынка і капліцы. Свае карэктывы ў гэтую справу ўнесла вайна. План, падпісаны Раманам Скірмунтам, быў прадстаўлены толькі ў снежні 1914 г. Ён адразу ж быў зацверджаны губернскім праўленнем, што стала падставай для спынення следства.

Сярод матэрыялаў, прысвечаных справе Парэцкай капліцы, варты асаблівай увагі ліст менскага губернатара ў Дэпартамент духоўных спраў ад 23 лютага 1916 г., у якім давалася характарыстыка канфесійнай сітуацыі ў Парэччы і навакольлях. Пры гэтым аўтар абапіраўся на дадзеныя колькасці насельніцтва і яго канфесійнай прыналежнасці, сабраныя павятовым спраўнікам. Верагодна, яны адлюстроўвалі сітуацыю ў Парэччы напярэдадні вайны.

Гэтыя дадзеныя малююць карціну цалкам праваслаўнай мясцовасці, канфесійную маналітнасць якой парушалі пераважна рабочыя-каталікі Парэцкай суконнай фабрыкі: «[...] им. Поречье расположено среди следующих населеных пунктов: в 1 версте от имения находится село Поречье, насчитывающее жителей белорусов 1 665 душ обоего пола, православного исповедания и два еврейских семейства, в этом селе имеется православная церковь; в 3-х верстах – дер. Табулки с населением в 893 чел. и дер. Чемерин с населением в 898 чел. – все православные белорусы; в 5 верстах – дер. Новоселки и хутор Виллы с населением в 215 чел. белорусов православного исповедания, и хутор Фурманы, насчитывающий населения 24 чел. белорусов-католиков; в 18 верстах – дер. Клетная с населением в 509 чел. белорусов православного исповедания, кроме одного еврейского семейства. В самом имении Поречье имеется суконная фабрика, на которой состоит рабочих и служащих 243 чел. католиков-белорусов. В 8 верстах от имения Поречье находится дер. Кротово с населением в 492 чел. и дер. Каролина с населением 191 чел. – все белорусы православного исповедания, в этих селениях имеется православная часовня Поречского прихода. Ближайшими к вышеупомянутому имению римско-католическими богослужебными зданиями является костел в местечке Логишин, отстоящим на расстоянии 24 верст, и в г. Пинске, отстоящим в расстоянии 29 верст»[637].

У гэтай характарыстыцы звяртае на сябе ўвагу выключна каталіцкая канфесія

[636] Тамсама, арк. 17–17 адв.

[637] Тамсама, арк. 27–27 адв.

рабочых суконнай фабрыкі. З улікам спецыфікі ўжывання расійскімі ўладамі тэрміна «беларус-каталік», можна сцвярджаць, што прыстаў, а разам з ім і губернатар А. Гірс імкнуліся давесці начальству, што на фабрыцы Скірмунта працуюць выключна палякі. Але ткацкая вытворчасць у Парэччы ніколі не мела і не магла мець пэўнага канфесійнага характару. Да таго ж цытаваныя вышэй кнігі рэгістрацыі споведзі і прычасця Парэцкай царквы яскрава сведчаць, што яшчэ ў 1886 г. на фабрыцы працавала даволі шмат праваслаўных.

Цалкам верагодна, што вышэйзгаданы дакумент быў разлічаны на людзей, якія нічога не ведалі ні пра Парэчча, ні пра Скірмунтаў. Ён павінен быў пераканаць улады, што Парэцкая рымска-каталіцкая капліца не будзе прадметам міжнацыянальнай і міжканфесійнай варожасці[638]. Магчыма, Р. Скірмунт меў непасрэдны ўплыў на прадстаўленыя дадзеныя і выснову дакумента.

Прыведзеная характарыстыка таксама сведчыць, што веска Парэчча напярэдадні вайны не мела каталіцкага касцёла. А вось праваслаўная царква Раства Багародзіцы была збудавана ў Парэччы ў 1912 г. пры падтрымцы Рамана Скірмунта. Вядома, што ў пасляваенны час у царкве захоўваліся скульптурныя працы Алены Скірмунт, якія, верагодна, трапілі туды з капліцы або былі перададзены сям'ёй Скірмунтаў[639].

Стасунак Рамана Скірмунта да Бога і Царквы складана ахарактарызаваць, бо адсутнічаюць яго ныя публічныя выказванні на гэтую тэму. Але, відавочна, што ён разумеў вялікае значэнне хрысціянства і падтрымліваў будаўніцтва і рамонт святыняў. Так, Раман Скірмунт прыняў актыўны ўдзел у вяртанні вернікам касцёла ў вёсцы Гарадзішча паблізу Пінску. Касцёл і бенедыктынскі кляштар у вёсцы былі зачынены ў красавіку 1865 г. Праз некалькі гадоў яны былі канфіскаваны дзяржавай і прададзены з умовай зносу. У 1899 г. новы ўладальнік прадаў будынак касцёла пінскім габрэям на злом. Але, калі тыя прыехалі ў Гарадзішча, сабраўся натоўп сялян, якія не дазволілі руйнаваць касцёл і прагналі новых уладальнікаў.

У арганізацыі гэтага супраціву вялікую ролю адыгралі актывісткі Таварыства дабрачыннасці Канстанцыя Скірмунт і Юзэфа Кужанецкая. Яны падтрымлівалі сялян у іх намаганнях вярнуць касцёл. Калі пагроза яго руйнавання знікла, па іх ініцыятыве быў створаны Часовы камітэт, які звярнуўся да Магілёўскага арцыбіскупа Стэфана Дзянісевіча з просьбай асвяціць касцёл і адслужыць імшу. Першы ліст да арцыбіскупа ад 9 кастрычніка 1909 г. быў падпісаны Раманам Скірмунтам і Юзэфай Кужанецкай. Асвячэнне касцёла адбылося ў лістападзе таго ж года, але супраць яго ўдзельнікаў распачаўся судовы працэс. Улады заявілі пра незаконнасць усёй акцыі. Інтарэсы абвінавачаных абараняў вядомы пецярбургскі адвакат Баляслаў Альшамоўскі і рабіў гэта паспяхова. Сялян, што рамантавалі кас-

---

[638] Тамсама, арк. 31.

[639] Царква згарэла на пачатку нашага стагоддзя. У 2005 г. яна была адбудавана паводле першапачатковага выгляду.



Адноўлены касцёл у в. Гарадзішча.

цёл, толькі аштрафалі, а ксёндз Станіслаў Іваноўскі, які яго асвяціў, быў апраўданы.

Часовы камітэт вырашыў выкупіць зямельны ўчастак разам з будынкам касцёла. Але існавалі дзве вялікія перашкоды. Па-першае, каталікі не мелі права набываць зямлю ў «Паўночна-Заходнім краі», а па-другое, былі патрэбныя грошы. Урэшце пакупнікамі сталі сяляне з Гарадзішча, а грошы для іх знайшлі Раман і Канстанцыя Скірмунт разам з Юзэфай Кужанецкай. Вырашальную ролю адыграў фундатар, які застаўся інкогніта. Ён перадаў Часоваму камітэту 20 тыс. руб. Раман Скірмунт лічыў, што гэта былі грошы ад княгіні Марыі Магдалены Радзівіл, але яна сама ніколі ў гэтым не прызналася. Гісторыя закончылася ў верасні 1914 г., калі Дэпартамент духоўных спраў дазволіў рамонт і адкрыццё касцёла ў Гарадзішчы[640]. Дарэчы, ва ўспамінах-некралогу на смерць Юзэфы Кужанецкай, якая памерла 12 красавіка 1915 г., Раман Скірмунт з характэрнай для яго сціпласцю галоўную заслугу ў аднаўленні касцёла прыпісаў менавіта ёй[641]. Аднак няма сумневу, што ягоная дзейнасць таксама была вельмі важнай у гэтай справе.

Магчыма, найбуйнейшай падзеяй асабістага жыцця Рамана Скірмунта пачатку XX ст. стала смерць бацькі. У жыцці кожнага сына гэтая падзея з'яўляецца пэўным рубяжом. Да таго ж смерць бацькі мела важныя наступствы для грамадска-палітычнай дзейнасці ўладальніка Парэцкага маёнтку.

Аляксандр Аляксандравіч Скірмунт памёр раніцай 26 чэрвеня 1909 г. у Парэччы. Адбылося гэта нечакана. Напярэдадні ён яшчэ сам аб'ехаў у аднаконным вазку землі маёнтка, аддаў распараджэнні і жыў планамі на наступны дзень...

Яго смерць стала драмай для ўсёй вялікай сям'і. Канстанцыя Скірмунт адгукнулася некралогам на старонках «Кур'ера Літэўскага», у якім характарызавала памерлага як «узорнага грамадзяніна, які доўгія гады вёў нястомную грамадскую працу». У яго жыццяпісе яна адзначыла гаспадарчыя рэформы, якія, між

---

[640] М. Нікалаеў, *Партрэт у Гарадышчынскім касцёле. Хроніка падзей*, «Arche». 2004, Nr 1; R. Skirmunt; *Panie z Muru*, «Słowo Polesia». 1934, Nr 47; «Słowo Polesia», 1934. Nr 49.

[641] R. Skirmunt, *Jozefa Kurzeniecka (wspomnienia posmiertne)*, «Kurier Litewski», 1915, Nr 107, 25 kwietnia.

іншым, стваралі магчымасці заробку для «навакольнага люду», удзел у з'ездах, дзе абмяркоўваліся ўмовы ліквідацыі прыгону ў 1861 г., прыгадала, што падчас паўстання 1863 г. ён рызыкаваў сваім жыццём і маёмасцю, бо меў «сэрца патрыёта», а пасля яго, у час апатыі і прыціску здолеў заснаваць Таварыства дабрачыннасці і Таварыства ўзаемнага крэдыту. Напрыканцы Канстанцыя Скірмунт прыгадала сына Рамана, як «годнага спадкаемца родавай традыцыі»[642].

Канстанцін Скірмунт у лісце да Элізы Ажэшкі ад 18 ліпеня 1909 г. паведаміў пра смерць А. Скірмунта і з горыччу канстатаваў: «Мы страцілі прыгожую і шляхетную, тыпова польскую постаць…»[643]

Жалобная абвестка пра смерць А. Скірмунта была апублікавана ў варшаўскім «Слове» 29 чэрвеня 1909 г. У тым самым нумары былі размешчаны спачуванні ад работнікаў маёнтка, якія назвалі памерлага «каханым Шэфам».

Іншы некралог пад назвай «Жыццё, смерць і пахаванне Аляксандра Скірмунта» быў апублікаваны таксама ў варшаўскім «Слове», а ягоным аўтарам, як ужо адзначалася, быў сын Раман, які для чытачоў газеты застаўся ананімам. Абраная форма развітання з бацькам сведчыла як пра гора сына, так і пра ягонае разуменне значнай ролі бацькі ў жыцці Краю. Пасля ўжо згаданага кароткага жыццяпісу А. Скірмунта і пазначэння абставін яго смерці сын падрабязна распавёў пра пахаванне бацькі, якое адбылося 1 ліпеня. Яно было надзвычай масавым і запамінальным.

На чале пахавальнай працэсіі, якая рушыла з Парэчча на родавыя могілкі ў Моладава (7 вёрст) ішлі пінскі дэкан ксёндз Войцік і янаўскі пробашч ксёндз Элерт. Труну спачатку неслі служачыя і работнікі фабрыкі і Парэцкай эканоміі, за якімі рухаўся тысячны натоўп рабочых, мясцовых сялян і вялікая група памешчыкаў на чале з сябрам Дзяржаўнай Рады Эдвардам Вайніловічам.

На палове дарогі паміж Парэччам і Моладавам у вёсцы Табулкі працэсію сустрэлі мясцовыя сяляне. Яны стаялі на каленях абапал дарогі з высока ўзнятымі крыжамі пад адмыслова збудаванымі брамамі, якія ўпрыгожылі палявымі кветкамі і зелянінай. Адсюль да самых могілак труну неслі ўжо сяляне вёсак Табулкі і Чамярын. Пахавальная працэсія, якая пастаянна папаўнялася людзьмі, расцягнулася на вярсту.

На могілках з развітальнымі прамовамі выступілі Эдвард Вайніловіч, Іво Орда (ад зямян Пінскага пав.) і Ф. Энджэеўскі (ад сялян і рабочых). У развітанні таксама ўдзельнічалі князі Друцкія-Любецкія, графы Плятэры, князь Станіслаў Радзівіл, князь Мікалай Радзівіл, Ромэры, Орды, Шчыты, Свяжынскія, Марыя Радзевічуўна ды інш. Гасцей прымалі ўдава, сёстры памерлага Караліна Скірмунт

---

642 S. K. [K. Skirmuntt]. *Aleksander Skirmunt (wspomnienia posmierne),* «Kurier Litewski». 1909, Nr 161.

643 Instytut Badań Literackich PAN. Archiwum Elizy Orzeszkowej. List Konstantego Skirmuntta. 18. 07. 1907.

і княгіня Эдвіна Друцкая-Любецкая, а таксама Раман Скірмунт. Іншыя дзеці А. Скірмунта чамусьці апынуліся ў ролі «гасцей».

Моцнае ўражанне на прысутных зрабіла прамова Вайніловіча, змест якой Раман Скірмунт перадаў цалкам.

ДАКУМЕНТ

Прамова Эдварда Вайніловіча на пахаванні Аляксандра Скірмунта. 1909 г. [644]

Я не ўпершыню стаю над вырытай магілай. Раней стаяў над магіламі людзей для мяне больш-менш чужых, стаяў і над такімі магіламі, у якія б сам ахвотна лёг толькі, каб вярнуць да жыцця памерлых. Ніколі не прамаўляў. Гаварыць абыякава не выпадае, бо трэба шанаваць смерць, а пра блізкіх казаць цяжка. У гэтым выпадку чалавек збірае боль у сабе і захоўвае няшчасце як Божы знак, які носіць у сваім сэрцы пакуль не зразумее яго, а зразумее, відаць, толькі тады, калі стане перад Найвышэйшым Суддзёй.

Чаму адчуваю патрэбу сказаць некалькі словаў над магілай вельмі блізкага мне чалавека? Перш за ўсё таму, што, маючы мандат абранца землеўласнікаў Міншчыны, адчуваю сябе абавязаным ушанаваць памяць аднаго з найбольш заслужаных грамадзян гэтага краю. Але пра яго буду казаць вельмі мала, думаючы больш пра тых, каго ён пакінуў у краі і ў сям'і. Калісьці на далёкіх могілках я быў уражаны вельмі глыбокай думкай. На помніку замест твару памерлага ўбачыў выявы людзей, якіх ён пакінуў. І гэта вельмі справядліва, бо ім найцяжэй.

Зазначу, што ў нашым выпадку века труны апусцілася не над адным чалавекам, а над цэлым пакаленнем, над цэлай эпохай грамадскага жыцця Літвы і Беларусі. Памерлы быў яго актыўным удзельнікам, а часта нават увасабленнем гэтага жыцця. Гэта быў цяжкі перыяд, але не звычайны, не шэры, перыяд вялікіх эканамічных рэформ і вялікіх палітычных патрасенняў. Ён патрабаваў работнікаў, вялікіх ахвярнасцю і розумам [...] Такіх было дастаткова. Яны трывалі альбо падалі, але заўсёды былі на пасту, на іх месца станавіліся іншыя, верныя сабе, верныя прынцыпам, верныя пакаленню, адзін з апошніх прадстаўнікоў якога стаў каля брамы вечнасці.

Гэтае пакаленне перажыло два цяжкія ўзрушэнні – эканамічную рэформу і палітычны рух 63-га года. Гэта быў занадта вялікі цяжар для ягоных плеч. І калі, нягледзячы на гэта, яно здолела захаваць нетыкальнай не толькі маёмасць, але і нацыянальны гонар, то тым самым выканала свой абавязак. Яму належыць гонар і ўдзячнасць.

Ступень удзелу с. п. Аляксандра ў тых гістарычных падзеях найлепей сведчыць пра яго розум і прынцыпы, пра той шлях, які ён абраў для сябе і па якому імкнуўся весці іншых. Гэта быў шлях абавязку і працы, г. зв. «працы ў падмуркаў».

---

[644] [R. Skirmunt], *Zywot, zgon i pogrzeb s. p. Aleksandra Skirmunta*, «Słowo». 1909, Nr 165.

Гэта быў легальны шлях, на якім ён шмат здолеў зрабіць, а таксама захаваць асабісты гонар і гонар свайго саслоўя. Калі хоць раз станеш на гэты шлях, то зразумееш, чаму імя памерлага так непарыўна звязана з гісторыяй сялянскай рэформы. А вось падзеі 1863 г. можна лёгка зразумець, цалкам абмінаючы ўдзел у іх с. п. Аляксандра. Ён не мог застацца ўбаку, але варта адзначыць, што калі некаторыя ішлі пакутаваць на Далёкі Усход, а іншыя імкнуліся вызначаць лёс краю і кіраваць ім з Захаду, то с. п. Аляксандр застаўся на месцы, каб паказаць, як усё гэта можна перажыць і паслядоўнай працай стварыць новыя ўмовы для жыцця.

Калі ў некалькіх словах ахарактарызаваць памерлага, то трэба адзначыць, што ён быў вялікім прыхільнікам культуры Захаду, прасякнутым яе дасягненнямі, і на іх падставе стварыў будучыню свайго краю. Найлепшым чынам гэта адлюстравалася ў ягоным удзеле ў сялянскай рэформе. Гарачы прыхільнік далучэння сялян да кола землеўласнікаў, ён быў перакананы, што не сам факт уладання зямлёй робіць чалавека грамадзянінам і ўздымае пачуццё ягонай асабістай годнасці, але ў большай ступені спосаб набыцця гэтай уласнасці.

Адчужэння зямлі ён не разумеў! Жадаў, каб селянін здабываў маёмасць працай і ашчаднасцю, пры дапамозе дзяржавы, але без гвалту над прынцыпам прыватнай уласнасці. І гэтае перакананне было настолькі моцным, што пару гадоў таму, калі не толькі падмуркі дзяржавы, але нават грамадскія прынцыпы пачалі разбурацца, яго гарачая кроў зноў зайграла і праз асобу ягонага сына выступіла ў абарону правоў уласнасці.

Памерлы сапраўды быў чалавекам, які разумеў усё чалавечае, адчуваў патрэбы іншых і клапаціўся пра патрэбы сям'і. Гэта быў чалавек з вялікім сэрцам, які лічыў сваім абавязкам уціскаць усё ў жалезны абруч волі і розуму, каб вырашаць усе задачы, прыйсці на дапамогу справамі, а не слязьмі, якія бывае лягчэй самому праліць, чым выцерці чужыя.

Як ужо згадваў, не толькі жыццё чалавека, не толькі жыццё пакалення, але пэўны перыяд гісторыі краю будзе пахаваны ў гэтай магіле. Хачу яшчэ спыніцца на гэтым перыядзе. Гэта быў час вялікай працы, вялікай ахвярнасці нашай грамадскасці. Была ў ім хвіліна веры ўрада ў здольнасці і патэнцыял грамадскасці, калі нават, як часта любіў узгадваць памерлы, з вышыні трону прагучалі словы падзякі за ініцыятыву нашых землеўласнікаў у справе вызвалення сялян. [...]

Не буду казаць пра абавязкі блізкіх, якія засталіся, іх сітуацыя вельмі складаная. Усе мы прывыклі бачыць у Парэччы асяродак парадку, працы і высакароднай думкі. Сям'я павінна згуртавацца, паразумецца і вызначыць святара для гэтага асяродку, бо было б грахом, калі б гэты асяродак рассыпаўся па ўсім свеце галавешкамі ці падманлівым полымем! Але тут я спакойны. Сям'я выхаваная ў Парэччы, спадчына захаваная, і свае абавязкі яна выканае.

Над гэтай свежай магілы звяртаюся да іншых. Мы павінны сказаць сабе, што прыкладзем усе намаганні, каб вярнулася ў нашае жыццё ўсё тое, што гэтая магіла ў сабе схавае. Толькі тады гэтая зямля стане пухам для памерлага, калі

дзецям гэтай зямлі, дзякуючы іх працы, стане лягчэй жыць, калі яны будуць вартыя таго мінулага, якое стагоддзямі хзахоўвала гэтая зямля. Вартыя не правамі […] якія могуць састарэць, а абавязкамі, якія трэба выконваць.

Няхай Бог дазволіць, а нашая воля дапаможа, каб мы сталі соллю гэтай зямлі, каб паўсталі не з праху, які ў ёй схаваны, а з поту, якім яе паліваем. Няхай умовай росквіту гэтай зямлі будзе наша сумленне і добрае імя. Гонар тым, хто ішоў гэтым шляхам перад намі!

Вечны адпачынак дай яму Божа!

Чытаючы гэтыя словы, разумееш, што для Рамана Скірмунта бацька быў сапраўдным НАСТАЎНІКАМ, які і пасля адыходу заставаўся для сына духоўным арыенцірам. Але пасля яго смерці сыну давялося істотна абмежаваць уласную грамадска-палітычную дзейнасць. Гаспадарка маёнтка патрабавала шмат часу і сіл, бо той, хто валодаў Парэцкім маёнткам, фактычна нёс адказнасць за лёс усёй сям'і Аляксандра і Тэафілы Скірмунтаў. Менавіта пра гэта пісала Канстанцыя Скірмунт у лісце да Мар'яна Здзяхоўскага ад 7 чэрвеня 1910 г. Адзначыўшы пэўныя ўласныя праблемы, яна заўважыла, што «на прыезд Рамана Скірмунта, абцяжаранага працай па вядзенню інтарэсаў усёй сям'і, на жаль, разлічваць не магу»[645].

Аднак у сітуацыі нарастання вялікарускага нацыяналізму і аднаўлення ўрадам ранейшага антыпольскага курса Раман Скірмунт усё ж паспрабаваў вярнуцца да вялікай палітыкі. У кастрычніку 1910 г. ён быў абраны сябрам Дзяржаўнай Рады ад Менскай губ.

Гэтаму абранню папярэднічалі важныя падзеі, якія заслугоўваюць увагі. Польская грамадскасць Краю пільна сачыла за дзеяннямі Пятра Сталыпіна і яго-нага ўрада. Дэпутаты літоўскіх і беларускіх палякаў у Дзяржаўнай Думе і Радзе падтрымалі асноўныя мерапрыемствы г. зв. «сталыпінскай аграрнай рэформы», ключавым элементам якой была ліквідацыя абшчыннага землеўладання і пераход да «хутарской гаспадаркі». Дзякуючы таксама іх намаганням, Указ ад 9 лістапада 1906 г. стаў Законам ад 14 чэрвеня 1910 г.

Затое цалкам адмоўна быў успрыняты ўрадавы законапраект пра ўвядзенне земстваў у «заходніх губернях», якія, дарэчы, павінны былі стаць асновай новай выбарчай сістэмы. У сувязі з апошнім 31 мая 1909 г. Дума прыняла законапраект пра скарачэнне тэрміну дэпутацкіх паўнамоцтваў прадстаўнікоў гэтых губерняў да 1 года. Дзяржаўная Рада яго зацвердзіла, а кіраўнік урада Сталыпін падчас абмеркавання паабяцаў на наступную сесію прадставіць законапраект.

У чэрвені 1909 г. пасля завяршэння працы IV сесіі Дзяржаўнай Рады абранцы землеўласнікаў Беларусі, Літвы і Украіны склалі свае паўнамоцтвы. Выбары адбыліся ў сярэдзіне верасня 1909 г. Яны прынеслі чарговы трыумф мясцовым зямянам-палякам.

---

[645] БВУ. Аддзел рукапісаў. F 33–701. Лісты К. Скірмунт да М. Здзяхоўскага, арк. 9–9 адв.

Але сярод абранцаў ужо не было Эдварда Вайніловіча. Яшчэ ў чэрвені 1909 г. на сходзе Кола дэпутатаў ад Беларусі, Літвы і Украіны па ініцыятыве ягонага старшыні Вайніловіча было прынята рашэнне аб перадачы аднаго з дэпутацкіх мандатаў ад шасці губерняў «Паўночна-заходняга краю» прадстаўніку рускай грамадскасці. Дэпутаты спадзяваліся, што гэтая ахвяра зменшыць нападкі «правых».

Сам Эдвард Вайніловіч быў гатовы адмовіцца ад выстаўлення ўласнай кандыдатуры на карысць Рамана Скірмунта. Уладальнік Парэчча разглядаўся як галоўны кандыдат у Дзяржаўную Раду ад Менскай губ. Але 6 чэрвеня 1909 г. у лісце да Чэслава Янкоўскага Раман Скірмунт паведаміў, што ў сувязі з неабходнасцю больш актыўна займацца справамі маёнтка і фабрыкі ён здымае сваю кандыдатуру[646]. Зразумела, што смерць бацькі напрыканцы чэрвеня толькі ўсугубіла сітуацыю.

Між тым, напрыканцы жніўня высветлілася, што польскія зямяне Магілёўшчыны і Віцебшчыны не збіраюцца адмаўляцца ад уласнага прадстаўніка ў Дзяржаўнай Радзе. Знайсці адпаведнага «рускага кандыдата» ад Віленскай, Ковенскай і Гарадзенскай губ. было складана з прычыны адносна малой колькасці рускіх памешчыкаў. Урэшце Вайніловіч заявіў, што здыме ўласную кандыдатуру на карысць памешчыка, сябра земскай управы М. Кір'якова[647]. Гэтае рашэнне падтрымаў таксама Раман Скірмунт. Аднак рускі памешчык так і не быў абраны. Выбаршчыкі не пагадзіліся з меркаваннем кіраўніцтва МТСГ і абралі сябрам Рады князя Гераніма Друцкага-Любецкага.

У пэўным сэнсе гэта быў канец «эпохі Вайніловіча». Польскія зямяне Меншчыны ўжо не спадзяваліся на магчымасць паразумення з расійскай уладай і не маглі пагадзіцца на тое, каб іх край прадстаўляў у Думе рускі памешчык. Яны пагаджаліся з меркаваннямі краёўцаў адносна важнасці згоды з мясцовымі народамі, але пры гэтым не жадалі адмаўляцца ад польскага культурнага і гаспадарчага дамінавання. Прынамсі, так трактаваў пазіцыю прафесара М. Здзяхоўскага падчас гэтых выбараў польскі даследчык Збігнеў Апацкі[648].

Гарадзенскую губ. у Радзе прадстаўляў уладальнік маёнтка Моладава і стрыечны брат Рамана Скірмунта Канстанцін. Падчас выбараў ён заявіў, што як паляк будзе адстойваць у першую чаргу польскія інтарэсы[649]. Толькі потым сцвярджалася важнасць абароны інтарэсаў Беларуска-Літоўскага краю. Пазіцыі братоў усё больш разыходзіліся.

---

[646] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 102–122. Лісты Р. Скірмунта да Ч. Янкоўскага. 1906–1909, арк. 1–1 адв.

[647] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 169.

[648] Z. Opacki, W *kręgu Polski, Rosji i słowianszczyzny. Mysl i działalnosc społeczno-polityczna Mariana Zdziechowskiego do 1914 roku*. Gdansk 1996, s. 169.

[649] Biblioteka Uniwersitetu Jagełłonskiego (далей – BUJ) Dział rękopisow. Sygn. 9493.III. K. Skirmunt, *Moje wspomnienia*, k. 13; K. Skirmunt, *Moje wspomnienia. 1866–1945*, s. 41.

Абмеркаванне ўрадавага законапраекта пра ўвядзенне земстваў у «заходніх губернях» у Думе распачалося ў маі 1910 г. У адмысловым звароце да дэпутатаў Пётр Сталыпін шчыра заявіў, што яго галоўная мэта – забяспечыць рускае панаванне. Сярод прынцыповых палажэнняў варта адзначыць фіксацыю колькасці земцаў ад «рускага» і ад «польскага» насельніцтва; утварэнне нацыянальных курый па абранні земцаў; гарантыю колькаснай перавагі «асоб рускага паходжання» ў земскай управе, а таксама пералік пасадаў, што прызначаліся выключна для рускіх; прыцягненне да земскай працы праваслаўнага духавенства. На Ковенскую, Віленскую і Гарадзенскую губ. земская рэформа не распаўсюджвалася.

Вялікарускія нацыяналісты актыўна падтрымалі ўрадавы законапраект. У большасці выступленняў земская рэформа трактавалася як палітычная акцыя, ад якой, па словах епіскапа Яўлогія, залежала «быць альбо не быць нашаму Заходняму рускаму краю рускім у палітычным, нацыянальным і культурным значэнні»[650].

Прадстаўнікі польскай грамадскасці мелі іншы погляд. Так, сябра Краёвай партыі Літвы і Беларусі Станіслаў Ваньковіч заявіў, што прыняцце законапраекта прывядзе да «земскага самаўпраўства», а не да самакіравання. У прапанове ўрада, на яго думку, выразна прачытваўся лозунг «Расія для рускіх»[651]. Юзаф Монтвіл (Віленская губ.) выказаў меркаванне, што прапанаваны праект супярэчыць палажэнням Маніфеста ад 17 кастрычніка 1905 г. На яго думку, урад імкнецца да «супакаення» краіны не дзеля правядзення рэформ, а дзеля іх поўнай адмены»[652]. Генрык Свянціцкі ахарактарызаваў гэты законапраект як «дыскрымінацыйны» і выказаў упэўненасць, што «прадстаўнікі рускага народу» не дапусцяць знявагі і прыніжэння «народнасці, што столькі стагоддзяў насяляла Заходні край»[653]. Аднак настроям большасці дэпутатаў больш адпавядала рэпліка, што прагучала ў зале напрыканцы выступлення Свянціцкага: «Какой же вредный народ!»[654]

Пасля бурных дэбатаў законапраект з папраўкамі Камісіі па мясцовым самакіраванні быў прыняты. Дума накіравала яго ў Дзяржаўную Раду, дзе засядалі ўжо новыя абранцы ад эліты землеўласнікаў Беларусі і Літвы. Сярод іх быў і Раман Скірмунт. Менавіта ён перамог на выбарах ад Менскай губ. у кастрычніку 1910 г. Гэта былі апошнія выбары, якія адбываліся на сходах землеўласнікаў. Дарэчы, рускія памешчыкі пакінулі выбарчы сход, зразумеўшы, што іх кандыдат не мае шансаў[655].

---

[650] *Националисты в 3-й Государственной думе*. Санкт-Петербург 1912, с. 104.

[651] *Государственная Дума. Созыв 3-й. Стенографические отчёты. Сессия I–V*. СПб., 1908–1912. Сессия III, стлб. 1119–1131.

[652] Там же, стлб. 762–774.

[653] Там же, стлб. 810–823.

[654] Там же, стлб. 823.

[655] РГИА. Ф. 1327, оп. 1, д. 5, л. 187–207.

У Рамана Скірмунта праблемы ўзніклі толькі падчас рэгістрацыі кандыдатуры ў Пінскай павятовай камісіі. Сярод прадстаўленых ім дакументаў адсутнічаў атэстат аб сярэдняй адукацыі. Адпаведна, Камісія адмовіла ў рэгістрацыі. Скірмунт звярнуўся са скаргай да менскага губернатара. На пасяджэнні Менскай губернскай выбарчай камісіі ён прадставіў даведку канцылярыі Менскага шляхецкага дэпутацкага сходу, якая сведчыла, што ён скончыў Рыжскую класічную гімназію. Губернатар асабіста распарадзіўся ўнесці яго ў спіс кандыдатаў[656].

15 кастрычніка 1910 г. распачалася праца V сесіі Дзяржаўнай Рады. У гэты ж дзень Раман Скірмунт прынёс прысягу і падпісаў г. зв. «прысяжны ліст». Аднак і другое ягонае «хаджэнне ва ўладу» аказалася непрацяглым. Камісія Дзяржаўнай Рады па праверцы законнасці абрання дэпутаў 25 кастрычніка 1910 г. прызнала законнымі вынікі выбараў ад васьмі губерняў «Заходняга краю» за выключэннем Менскай. Раману Скірмунту прапанавалі прадставіць «некаторыя дадатковыя звесткі»[657]. Гаворка ішла якраз пра дакумент аб сярэдняй адукацыі. Замест яго ў асабістай справе Скірмунта знаходзілася згаданая даведка. Камісія Дзяржаўнай Рады распачала перапіску з мэтаю адшукаць дакумент.

Між тым, на чацвёртым пасяджэнні Рады, 29 кастрычніка 1910 г. Раман Скірмунт выступіў пры абмеркаванні законапраекта «Пра аўтарскае права». Ён прапанаваў скараціць тэрмін аўтарскіх правоў да 30 гадоў пасля смерці аўтара. Законапраект прадугледжваў 50-цігадовы тэрмін. Сярод аргументаў Скірмунта трэба вылучыць тэзіс пра тое, што творы прыхільнікаў радыкальных перамен («сторонников общего переворота») разыходзяцца ў тысячах танных асобнікаў і становяцца адзінай крыніцай ведаў у галіне сацыяльных навук для малаадукаванай часткі грамадства. У якасці прыкладу ён згадаў выданні Карла Каўцкага і... Льва Талстога (!). Апошні таксама аказаўся ў лагеры тых, хто, паводле Скірмунта, займаўся «крытычнай разбуральнай працай» і «пераацэнкай каштоўнасцяў».

Затое творы, што маюць вялізнае культурнае значэнне для масавага чытача «зачынены» аўтарскім правам, а гэта перашкаджае «культурнаму прагрэсу»: «Грамадства, наогул, моцна зацікаўлена ў тым, каб вынікі працы ягоных лепшых сыноў разыходзіліся па магчымасці без затрымкі. Насамрэч, гэтыя вынікі з'яўляюцца лепшымі рухавікамі культурнага прагрэсу. Надаючы высокім думкам дасканалыя формы, яны робяць іх даступнымі кожнаму, абуджаюць любоў да дабра і прыгажосці. Добрая кніга – выдатны сябра і добры настаўнік. Зрабіць яе даступнай па магчымасці без непатрэбнай затрымкі для маламаёмаснага чытача – гэта, безумоўна, пытанне агульнай карысці»[658].

Атмасфера Дзяржаўнай Рады і чыноўнага Пецярбурга выклікала ў Рамана

---

[656] Там же. Ф. 1162, оп. 8, д. 4, л. 155–156 адв.

[657] Там же, д. 5. *Праверка паўнамоцтваў дэпутаў Дзяржаўнай Рады*, л. 14–14 адв.

[658] *Стенографические отчеты. Государственный Совет. Сессия 5.* Заседания 1–64 (10 октября 1909 г.–17 июня 1910 г.). Санкт-Петербург 1910, стлб. 122–123.

Скірмунта даволі песімістычныя разважанні адносна магчымасцяў расійска-польскага паразумення. 22 лістапада 1910 г. у лісце да Мар'яна Здзяхоўскага ён сцвярджаў, што знаходжанне ў Пецярбурзе не спрыяе спадзевам на перамены да лепшага. «Сумным і балючым» вынікам антыпольскай палітыкі дэпутат лічыў законапраект пра ўвядзенне земстваў. Ён абяцаў змагацца супраць яго прыняцця і «максімальна пашыраць думку пра магчымасць і неабходнасць польска-расійскага збліжэння»[659]. Пры гэтым дэпутат дапускаў магчымасць адмены вынікаў ягонага абрання ў Раду. Дарэчы, звесткі пра сыход Рамана Скірмунта з Рады з'явіліся ўжо на самым пачатку яе сесіі. Так, на старонках газеты «Пинский листок» (рэдактар А. Гольцман), карэспандэнты якой цікавіліся кар'ерай свайго земляка, з'явілася паведамленне, што ў Менску пашыраюцца чуткі, нібыта Р. Скірмунт адмовіцца ад звання дэпутата Дзяржаўнай Рады. Сцвярджалася, што яны маюць пад сабой рэальную глебу[660]. Напрыканцы лістапада газета пацвердзіла гэтую інфармацыю[661].

Падобна, што Раман Скірмунт і сам выдатна разумеў хісткасць уласных пазіцый. 7 студзеня 1911 г. ён накіраваў заяву да старшыні Дзяржаўнай Рады, у якой адмаўляўся ад звання дэпутата з прычыны «нематчымасці пастаяннага пражывання ў Санкт-Пецярбурзе»[662]. Апошняе ён тлумачыў неабходнасцю кіравання маёнткам, які перайшоў у яго рукі пасля смерці бацькі. Пра гэтую заяву на пасяджэнні Рады 12 студзеня паведаміў яе старшыня. 19 студзеня 1911 г. Камісія па асабістым складзе і ўнутраным распарадку зняла з разгляду справу Скірмунта. Магчыма, гэтай заявай ён спрабаваў пазбегнуць розгаласу сітуацыі з ягонай адукацыяй. Месца Рамана Скірмунта ў Дзяржаўнай Радзе заняў Караль Незабытоўскі, які на выбарах у кастрычніку 1910 г. аказаўся другім па колькасці набраных галасоў.

Між тым, сярод грамадскасці Менска і Пінска дамінавала версія, што Скірмунт закончыў нейкі замежны ўніверсітэт, а дэпутатам Рады можа быць толькі выпускнік расійскага ўніверсітэта. У прыватнасці, пра гэта пісаў згаданы «Пинский листок».

Гэтая сітуацыя прымушае вярнуцца да праблемы адукацыі Рамана Скірмунта, высокі ўзровень якой відавочны. Гімназію ён не закончыў, але знаёмства з ягонымі кнігамі, артыкуламі, лістамі або прамовамі на розных публічных мерапрыемствах пераконвае ў тым, што Раман Скірмунт атрымаў акадэмічную адукацыю на высокім узроўні. Прычым добрае валоданне нямецкай і англійскай мовамі сведчыць хутчэй пра тое, што гэтая адукацыя была звязана з навукамі не гуманітарнага, а тэхнічнага цыклу. Гэта ўскосна пацвярджае інфармацыю В. Нээф наконт яго навучання ў Палітэхнічным інстытуце ў Рызе.

---

[659] БУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 33–702а. Лісты Р. Скірмунта да М. Здзяхоўскага, арк. 1–1адв.

[660] «Пинский листок». 1910, № 5.

[661] Там же, № 8.

[662] *Государственный совет. Стенографические отчёты. Сессия III-VII.* СПб., 1908–1912. Сессия VI, стлб. 707–708.

Вяртаючыся да згаданага ліста Скірмунта да Здзяхоўскага, варта звярнуць увагу на радкі, прысвечаныя праблеме польска-расійскіх стасункаў і разуменню Раманам Скірмунтам уласнай ролі ў яе вырашэнні: «Безумоўна, пачуццё ўзаемнай непрыязні – гэта прыроджанае пачуццё як польскай, так і рускай душы. Гэта атавізм з часоў крывавай барацьбы нашых бацькоў і дзядоў. Людзі, якія працуюць над сабой, выкідаюць яго са свайго сэрца, але такіх не шмат. Большасць паддаецца прымхам мінулага. Лічу, што да гэтых апошніх сёння належаць кіраўнікі расійскай палітыкі. Няшчасцем з'яўляецца тое, што з гэтым пачуццём варожасці звязана тандэтная палітычная дактрына стрымлівання неабходных рэформ раздзіманнем шавіністычных інстынктаў. Сучасная антыпольская палітыка – гэта бенкарт саюза гэтых няправых сіл. [...] Напэўна, нацыянальны антаганізм і барацьба ёсць і будуць такім самым неад'емным спадарожнікам чалавечай долі, як смерць ці хвароба, але заўсёды знойдуцца людзі добрай волі, якія будуць супрацьстаяць ім па меры сіл і магчымасцяў». Верагодна, сябе ён таксама адносіў да гэтых «людзей добрай волі».

Між тым, 1 лютага 1911 г. у Дзяржаўнай Радзе выступіў Сталыпін, які палічыў неабходным уласным аўтарытэтам падтрымаць урадавы законапраект пра ўвядзенне земстваў у Валынскай, Віцебскай, Кіеўскай, Магілёўскай, Менскай і Падольскай губ. Кіраўнік урада абгрунтоўваў утварэнне «рускай» і «польскай» выбарчых курый неабходнасцю супрацьстаяння польскім уплывам.

Урадавы законапраект фактычна грунтаваўся на Палажэнні аб губернскіх і павятовых земскіх установах (1890), у якім прынцып саслоўнасці замяняўся нацыянальным. Замест дваранскай і сялянскай выбарчых курый уводзіліся «польская» і «руская», у якую трапілі ўсе народы Краю апрача палякаў. Вызначалася норма земскіх радных ад кожнай нацыянальнасці з перавагай «рускага элемента». Старшынём земства мог быць толькі прадстаўнік «рускай курыі» і г. д.[663] Сталыпін быў пэўны, што без дзяржаўнай падтрымкі «рускага элемента» земствы стануць зброяй у палітычнай барацьбе палякаў супраць Расіі. Ён заклікаў падтрымаць законапраект, бо ў іншым выпадку ў «шматстрадальную гісторыю рускага захаду будзе ўпісана чарговая старонка рускай паразы»[664].

Трэба адзначыць надзвычай энергічную дзейнасць прадстаўнікоў літоўскіх і беларускіх палякаў, каб не дапусціць прыняцця законапраекта. Апрача актыўных пратэстаў у Дзяржаўнай Радзе прадстаўнікі польскіх дэпутатаў у сакавіку 1911 г. (у т. л. К. Скірмунт, А. Мэйштовіч, К. Незабытоўскі) атрымалі аўдыенцыю ў імператара[665]. Размова датычыла земскай рэформы.

Супраць «нацыянальнага сепаратызму», які быццам бы ўзаконьваў урада-

---

[663] В. П. Слобожанин, *Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.)*. Минск 1994. с. 25.

[664] *Государственный совет. Стенографические отчёты. Сессия VI*, стлб. 879–879.

[665] «Kurier Wileński». 1911, Nr 55.

вы праект, выступіла таксама частка «правых» на чале з Уладзімірам Трэпавым. Урэшце большасць Дзяржаўнай Рады прагаласавала супраць палажэння пра нацыянальныя выбарчыя курыі. Быў адхілены адзін з галоўных прынцыпаў урадавага праекта.

Аднак Сталыпін не збіраўся саступаць. 5 сакавіка на стол Мікалая II было пакладзена прашэнне старшыні Рады міністраў пра адстаўку. Вынікам палітычнага дэмарша стала згода імператара на роспуск абедзвюх заканадаўчых палат і прыняцце законапраекта на падставе 87 артыкула Асноўных законаў. Ён дазваляў прымаць законы ў надзвычайных абставінах, калі не дзейнічалі ні Дума, ні Рада. З 12 па 15 сакавіка абвяшчаўся перапынак у іх працы. Дзяржаўная Рада ўсё ж паспела вынесці на галасаванне ўвесь законапраект і адхіліць яго большасцю галасоў – 134 супраць 23[666].

Але 14 сакавіка 1911 г. закон пра земствы быў прыняты на падставе 87 артыкула. Гэта была «піравая перамога» Сталыпіна. Яго дзеянні выклікалі амаль усеагульнае абурэнне. Падобнага здзеку над законам яшчэ не было, як не было нічога падобнага на тыя надзвычайныя абставіны, якія толькі і маглі апраўдаць гэтую меру. Ад старшыні Рады міністраў адвярнуліся амаль усе палітычныя партыі.

Як польская грамадскасць сустрэла закон ад 14 сакавіка 1911 г.? Варта адзначыць, што не было ні панікі, ні асаблівага расчаравання. Раман Скірмунт выказаўся ў вялікім артыкуле «З нагоды ўвядзення земстваў» на старонках «Кур'ера Віленьскага»[667]. Ён высока ацаніў паслядоўнасць і ўпэўненасць дзеянняў прадстаўнікоў польскіх землеўласнікаў ад Краю ў Дзяржаўнай Радзе, якая, на яго думку, «захавала дзяржаўны розум».

Дзеянні Сталыпіна ён назваў «смелымі, але не дальнабачнымі». Скірмунт бачыў у іх хутчэй праяву пэўнага жывёльнага інстынкту, чым «голас розуму і сумлення». Спосаб, якім Сталыпін дабіўся свайго і ўвёў земствы ў шасці «заходніх губернях», ён лічыў больш значнай падзеяй, чым само ўвядзенне земстваў. У апошнім ён наогул не бачыў шкоды для польскай грамадскасці. Паводле Скірмунта, колькасць радных-палякаў у губернскім земстве не будзе меншай, чым у старых земствах, дзе радных прызначаў губернатар. Апрача таго, ён бачыў карысць ад уваходжання ў земства рускіх памешчыкаў, што магло ўзмацніць шэрагі абаронцаў зямельнай уласнасці і г. д.

Рамана Скірмунта не палохала з'яўленне нацыянальных выбарчых курый. Ён заўважыў, што гэтыя курыі як «ізаляцыйныя баракі расійскай палітычнай медыцыны», насамрэч, уведзены яшчэ 3 чэрвеня 1907 г. Указам пра выбары ў Думу, і не з'яўляюцца нейкім «невядомым ліхам».

Публіцыст і палітык высока ацэньваў сам прынцып рэгіянальнага самакіравання, які стварaў магчымасць мясцовым жыхарам кіраваць гаспадаркай

---

[666] А. Я. Аврех, *Столыпин и Третья Дума*. Москва 1968, с. 337–338.

[667] R. Skirmunt, *Wobec wprowadzenia ziemstw*, «Kurier Wileński». 1911, Nr 65.

і культурным жыццём рэгіёну, але пры гэтым крытычна выказваўся наконт вопыту дзейнасці земстваў у Цэнтральнай Расіі. Ён адзначыў высокі кошт яго ўтрымання, які забяспечваўся ростам падаткаў, нізкую эфектыўнасць кіравання і немагчымасць поўнага кантролю над выкарыстаннем сродкаў. Таксама звярталася ўвага, што верагоднае павялічэнне сродкаў на школьную адукацыю не будзе спалучацца з уплывам на яе кірункі, а г. зн., што давядзецца фінансаваць таксама царкоўна-прыходскія школы. Затое сітуацыя з медыцынскімі паслугамі значна палепшыцца. Аўтар быў пэўны, што польская грамадскасць не мае падстаў для хвалявання.

Большую вагу ён надаваў палітычнаму аспекту ўвядзення земстваў, які сведчыў, на яго думку, пра імкненне імперскай бюракратыі захаваць «полымя расійска-польскай канфрантацыі». Супраціў гэтай палітыцы можа і павінна аказаць краёвая польская грамадскасць, якая імкнецца да паразумення ўсіх народаў Краю: «Увядзенне ў нашым краі земстваў на падставе параграфа 87 – гэта больш значымая падзея, чым сам змест закона. Вакол гэтага марнага прадукта заканадаўчай творчасці разыграўся канфлікт дзяржаўнага значэння. Ён выклікаў шэраг гвалтоўных рашэнняў. Аднак не кожны гвалт ёсць праява сілы, ён бывае таксама вынікам істэрыі. На ўвядзенне ў жыццё земскага закона можам глядзець без вялікай трывогі, хоць і з пэўным незадавальненнем. Яго дзейнасць у дачыненні да нас будзе негатыўнай, але не смяротнай, калі мы самі не паспрыяем апошняму.

У кожным выпадку інтэнсіўнасць уласнай духоўнай працы – гэта найважнейшы жыццёвы чыннік. Тое ж можна сказаць пра жыццё і развіццё нацый. Калі мы не здрадзім сабе і будзем трымацца прынцыпаў грамадзянскай этыкі, то брама пагібелі для нас не адчыніцца. Тое, чаго мы дасягнем уласнай працай для краю і для самых сябе, можа ўраўнаважыць наступствы шкодных законаў. Навальніцы прыходзяць і адыходзяць, а нам трэба заставацца на сваім пасту і бараніць яго».

Варта звярнуць увагу на чарговую згадку ў тэксце Скірмунта тэзіса пра важнасць абароны «свайго паста». Падобна, што ідэя пэўнай місіі адносна Краю і лёсу літоўскіх і беларускіх палякаў, сапраўды, была адной з дамінуючых у матывацыі дзейнасці Рамана Скірмунта.

Улетку 1911 г. у выніку выбараў ён стаў *гласным* (дэпутатам) Пінскага павятовага земства ад «польскай курыі». На першым сходзе земства 5 жніўня 1911 г. быў абраны таксама *гласным* губернскага земскага сходу ад Пінскага пав.[668]

Што наогул належала да кампетэнцыі павятовых і губернскіх земстваў трох беларускіх губерняў? Найбольш важная сфера іх дзейнасці была звязана з земскімі павіннасцямі ці «земскімі зборамі». Гэта быў від мясцовага падаткаабкладання ў грашовай і натуральнай форме дзеля задавальнення гаспадарчых,

---

[668] «Kurier Wileński». 1911, Nr 53; *Журналы Пинского уездного очередного земского собрания.* 1911. Пинск 1912.

адміністрацыйных і культурных патрэб рэгіёну. Асновай земскіх збораў было ападаткаванне нерухомай маёмасці – земляў, дамоў, прамысловых прадпрыемстваў і гандлёвых устаноў, з прыбытку якіх земству адводзілася $^{1}/_{20}$ частка. Раней зборам мясцовых падаткаў займаліся чыноўнікі, і выкарыстанне сабраных сродкаў было таямніцай для грамадства. У земствах гэтая інфармацыя станавілася адкрытай. На земскіх сходах, дзе разглядаліся справаздачы пра выкарыстанне сродкаў, маглі прысутнічаць усе ахвотныя. Апрача таго, земствы друкавалі справаздачы пра вынікі ўласнай фінансавай дзейнасці.

Таксама ў кампетэнцыю земстваў перайшлі ўсе гаспадарчыя справы паветаў і губерняў, у т. л. пабудова школ і шпіталяў, дарог і мастоў, адкрыццё базараў і правядзенне кірмашоў, страхаванне, усе справы, што датычылі развіцця сельскай гаспадаркі і кустарнай прамысловасці, паляпшэння культуры побыту ды інш. Земская ўправа збірала інфармацыю пра патрэбы насельніцтва і паведамляла пра іх земскаму сходу. Аднак часта гэтая інфармацыя і рашэнні земскіх сходаў прыводзілі да канфліктаў з мясцовымі чыноўнікамі.

Трэба адзначыць, што земствы мелі ўплыў на гаспадарчую і сацыякультурную сітуацыю ў павеце і губерні. У пэўным сэнсе яны спрыялі вызваленню насельніцтва ад улады бюракратыі і паступова прывучалі людзей да самакіравання. У цэнтральных губернях Расійскай імперыі земствы на пачатку XX ст. ужо назапасілі пэўны вопыт гаспадарання і цалкам невыпадкова сталі інстытуцыйным падмуркам стварэння падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг. галоўных партый расійскага лібералізму, менавіта Партыі канстытуцыйных дэмакратаў і Партыі 17 кастрычніка.

А вось на беларускіх землях усё толькі пачыналася: «Мы переживаем только первые шаги нашего молодого земского самоуправления, поэтому работа эта несколько отличается от аналогичной работы старых земских губерний. Там уже давно всё налажено, уверенно идёт по проторенному пути, между тем, как нам только что перешедшим от приказного строя, приходится всё начинать сначала», – канстатаваў адзін з менскіх земцаў[669]. Даследчык дзейнасці земстваў на беларускіх землях В. Слабажанін наступным чынам пазначыў прыярытэты земскай працы на Меншчыне: народная адукацыя, медыцына і санітарыя, сацыяльная апека, ветэрынарыя, агранамічныя мерапрыемствы, дарожнае будаўніцтва і страхаванне[670].

Першае пасяджэнне губернскага земства адбылося 22 жніўня 1911 г. і было прысвечана абранню кіраўніцтва і фарміраванню земскіх камісій. Старшынём губернскага земства стаў Барыс Самойленка з Навагрудскага пав. «Кур'ер Віленскі» ахарактарызаваў яго, як «чалавека прагрэсіўных поглядаў, не нацыяналіста». Паводле інфармацыі газеты, ягонае абранне стала вынікам барацьбы «прагрэсіўных элементаў» супраць «кансерватыўна-нацыяналістычнай групы». Раман Скірмунт быў кандыдатам у Камісію па самакіраванні, але не набраў патрэбнай

[669] Цытата па: В. П. Слобожанин, *Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.)*, с. 45.
[670] Тамсама.

колькасці галасоў, бо супраць ягонай кандыдатуры выступіла якраз згаданая «кансерватыўна-нацыяналістычная група»[671]. Затое на пачатку першага Менскага губернскага земскага сходу, які праходзіў у Менску з 25 студзеня па 7 лютага 1912 г., ён быў абраны ў склад Бюджэтнай і Юрыдычнай камісій[672].

Журналы пасяджэнняў першага схода сведчаць пра высокую актыўнасць земцаў пры абмеркаванні праектаў Бюджэтнай камісіі, а таксама сітуацыі з народнай адукацыяй. Вельмі актыўнай была пінская група на чале з А. Фацінскім. Пінчукі імкнуліся давесці сходу надзвычай складаную сітуацыю ў галіне адукацыі ў павеце і пераканаць прысутных у неабходнасці дадатковага фінансавання гэтай галіны земскай дзейнасці на Піншчыне. Раман Скірмунт некалькі разоў выступаў пры абмеркаванні праектаў Бюджэтнай камісіі. Менавіта ён прапанаваў вызначыць адзін дзень у тыдзень для калегіяльных пасяджэнняў Управы, што і было прынята агульным сходам.

Варта адзначыць маўчанне Рамана Скірмунта ды іншых дэпутатаў ад «польскай курыі» падчас абмеркавання плана мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю вайны 1812 г. Падобна, што ў гэтым выпадку земцаў падзяліла гістарычная памяць.

Бюджэт земства Пінскага пав. сведчыць пра прыярытэтнасць развіцця народнай адукацыі, медыцыны і дарожнага будаўніцтва. Не апошнюю ролю ў гэтым адыграла актыўнасць Рамана Скірмунта. Ён часта выступаў з прапановамі на сходах земства. Так, на земскай сесіі, якая адбывалася ў Пінску ў снежні 1912 г., Скірмунт прапанаваў увесці абавязковую папярэднюю рассылку матэрыялаў чарговай сесіі дзеля большай эфектыўнасці працы, раіў прыцягнуць мясцовае сельскае насельніцтва да арэндnага ўтрымання вопытнай сельскагаспадарчай станцыі пад Латішыным, а таксама хадайнічаў пра ўнясенне ў трохгадовы план будаўніцтва ў павеце пабудовы маста на р. Ясельдзе па дарозе з в. Парэчча ў в. Азарычы ды інш. Звычайна, ягоныя прапановы прымаліся[673]. 16 снежня земцы павета абралі Рамана Скірмунта сваім прадстаўніком у Эканамічную Раду, а таксама ў Эканамічны аддзел пры Менскім губернскім земстве.

Наступны губернскі земскі сход адбыўся ўжо ў лютым 1913 г. Раман Скірмунт прысутнічаў на ўсіх ягоных пасяджэннях. Ён зноў быў абраны ў Бюджэтную камісію, тэрмін дзеяння якой быў працягнуты да канца паўнамоцтваў гэтага складу Менскага земства[674]. Ізноў маўчаў пры абмеркаванні пытання наконт дэлегацыі

---

[671] «Kurier Wileński». 1911, Nr 71.

[672] «Kurier Wilenski». 1912, Nr 22; *Журналы Первого очередного Минского губернского земского собрания*. Сессия 25 января – 7 февраля 1912 г. Минск 1912, с. 4.

[673] *Журналы Пинского уездного очередного земского собрания*. 1911. Пинск, 1912.

[674] *Журналы Второго очередного Минского губернского земского собрания. Сессия 1–11 февраля 1913 г.* Минск 1913, с. 4.

ў Маскву дзеля ўдзелу ў юбілейных урачыстасцях з нагоды 300-годдзя праўлення дынастыі Раманавых.

З дакладам пра ролю губернскага земства ў развіцці школьнай і пазашкольнай адукацыі выступіў прадстаўнік Барысаўскага пав. І. Арскі. Ён пералічыў зробленае земствам за мінулы год, спаслаўся на вопыт адукацыйнай дзейнасці земстваў Цэнтральнай Расіі і выказаў шэраг прапаноў. Пры абмеркаванні даклада Раман Скірмунт звярнуў увагу на дасягненні павятовых земстваў і прапанаваў менавіта ў іх рукі перадаць усю справу арганізацыі пачатковай адукацыі на месцах[675].

Гэтая прапанова была звязана з ягоным перакананнем, што менавіта павятовыя земствы з'яўляюцца галоўным інструментам вырашэння мясцовых праблем, і якраз яны павінны атрымаць максімальныя паўнамоцтвы і магчымасці дзеля гэтага. Ідэю аўтаноміі павятовых земстваў Р. Скірмунт адстойваў і падчас абмеркавання фінансавых пытанняў.

Іншае важнае перакананне Рамана Скірмунта выявілася падчас дыскусіі наконт павелічэння колькасці сяброў Земскай управы. Гласны С. Падалінскі, між іншым, выказаў апасенне ростам уплыву «трэцяга элемента» ў дзейнасці губернскага земства. Так называлі прадстаўнікоў інтэлігенцыі (лекараў, настаўнікаў, аграномаў ды інш.), якія складалі найбольш актыўную частку земскіх працаўнікоў. У многіх земствах Цэнтральнай Расіі менавіта яны з'яўляліся сапраўдным рухавіком земскай дзейнасці асабліва ў галіне асветы і адукацыі, медыцыны і санітарыі, паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту ніжэйшых колаў грамадства.

Падобна, што актыўнасць «трэцяга элемента» ў земскай дзейнасці на Меншчыне выклікала боязь кансерватыўнага лагеру, якую і выказаў С. Падалінскі. Яго галоўным апанентам аказаўся Раман Скірмунт, які заявіў, што «трэці элемент» складаецца з адукаваных людзей і спецыялістаў, якія выдатна ведаюць сваю справу і заслугоўваюць поўнага даверу. Ён двойчы выступаў у гэтай дыскусіі, падкрэсліваючы вялікае значэнне дзейнасці земскай інтэлігенцыі[676].

А вось пры абмеркаванні прапановы менскага дэпутата Станіслава Хжанстоўскага хадайнічаць пра адкрыццё ў Менску Сельскагаспадарчага або Палітэхнічнага інстытута Скірмунт праявіў стрыманасць. Ён заявіў пра непадрыхтаванасць пытання і заклікаў калег да больш адказнага падыходу. Урэшце сход абраў Камісію, якой даручыў распрацаваць гэтае пытанне да наступнай сустрэчы. У склад Камісіі ўвайшоў і Скірмунт. Напрыканцы схода ён быў абраны сябрам Сельскагаспадарчай Рады губернскага земства[677].

Трэці агульны земскі сход Менскай губ. адбыўся ў студзені 1914 г. Ужо згаданы Арскі выступіў з дакладам пра стан народнай адукацыі ў губерні. Ён даволі крытычна ацаніў сітуацыю і прапанаваў стварыць пры губернскім земстве ста-

[675] Там же, с. 10.
[676] Там же, с. 53, 55.
[677] Там же, с. 69–71, 92.

лую Школьную камісію. Скірмунт выступіў супраць і настойваў на перадачы ўсёй пачатковай адукацыі павятовым земствам. Ён галасаваў супраць стварэння Школьнай камісіі, але перамаглі яе прыхільнікі[678]. Адначасна земцы прынялі рашэнне адкрыць у Менску Настаўніцкі інстытут.

24 студзеня адбылося пасяджэнне Камісіі па распрацоўцы пытання пра вышэйшую навучальную ўстанову ў Менску. Сябры Камісіі, сярод якіх быў і Раман Скірмунт, прынялі рашэнне хадайнічаць «пра адкрыццё ў Менску, які з'яўляецца цэнтрам Беларусі, вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установы і пра асігнаванне на яе з земскіх сродкаў пэўнай грашовай сумы»[679]. Сход адзінагалосна падтрымаў гэтае рашэнне.

Раман Скірмунт таксама быў абраны ў склад Камісіі па балотнай справе. 26 студзеня ў якасці яе старшыні ён выступіў з аналізам вынікаў навуковай дзейнасці Балотнай вопытнай станцыі ў в. Лахва. Гэтыя вынікі былі ацэнены як нездавальняючыя. Скірмунт прапанаваў рэарганізацыю навуковых даследаванняў палескіх балот, якая ўключала ліквідацыю «Балотнай камісіі» і стварэнне Камітэта ў складзе прадстаўнікоў губернскага земства і навуковага персанала станцыі, а таксама губернскага земскага агранома, гідратэхніка і інспектара сельскай гаспадаркі губерні. Прапановы разам з бюджэтам працы станцыі ў памеры 37 тыс. руб. былі прыняты сходам[680]. Напрыканцы сесіі Скірмунт быў абраны прадстаўніком земства ў Расійскай экспартнай палаце і на *Совещании об урегулировании заболоченных рек Полесья и работах Полесской изыскательной партии*[681].

У апошнія дні вясны 1914 г. ён таксама прыняў удзел у працы V Надзвычайнага сходу Менскага губернскага земства[682]. Архіўныя дакументы сведчаць, што ў той час Скірмунт спыняўся ў менскай гасцініцы «Гарні», якая знаходзілася на перакрыжаванні вул. Захар'еўскай і Багадзельнай, 64/36[683].

Эдвард Вайніловіч у апублікаваных успамінах адзначыў дзейнасць польскіх дэпутатаў, да якіх заўсёды прыслухоўвалася зала. Сярод іх ён вылучыў Рамана Скірмунта, які «ўласным аратарскім майстэрствам і ўменнем пераканаць прыцягваў увагу сходу»[684], і спецыяліста па фінансавых пытаннях Міхала Ястжэмбскага. У рукапісным варыянце ўспамінаў Э. Вайніловіча адзначалася прыкметная роля Скірмунта ва ўсёй дзейнасці Менскага губернскага земства[685].

Што можна сказаць пра вынікі яго дзейнасці напярэдадні Першай сусвет-

---

[678] *Журналы Третьего очередного Минского губернского земского собрания. Сессия 20–28 января 1914 г.* Минск 1914, с. 27–28.

[679] Там же, с. 135–136.

[680] Там же, с 60.

[681] Там же, с. 91–92.

[682] НГАБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 709, арк. 18–21.

[683] Сёння гэта дом на рагу праспекта Незалежнасці, 19 і вул. Камсамольскай.

[684] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 88.

[685] ЛДГА. Ф. 1135, воп. 20, спр. 752, арк. 64.

най вайны? Даследаванне В. Слабажаніна сведчыць пра імклівы рост земскіх выдаткаў на адукацыю ў перыяд з 1911 па 1914 г. (больш, чым на 500 %). Амаль на 80 % павялічыліся выдаткі на медыцынскія паслугі. У 1912 г. у Менску былі арганізаваны месячныя сельскагаспадарчыя курсы, праз якія за два гады прайшлі сотні сялян. Рэгулярна праводзіліся меліярацыйныя з'езды. Земства падтрымлівала сельскагаспадарчыя кааператывы, стварала склады, дзе можна было набыць тэхніку, мінеральныя ўгнаенні, насенне ды інш.[686] Журналы губернскіх земскіх сходаў сведчаць, што Раман Скірмунт непасрэдна спрычыніўся да поспеху многіх накірункаў земскай дзейнасці, як у Пінскім пав., так і ва ўсёй Менскай губ.

Вайна

Першая сусветная вайна 1914–1918 гг. і яе наступствы да непазнавальнасці змянілі Цэнтральна-Усходнюю Еўропу і жыццё «падданых» расійскага цара. Мала хто ў ліпені 1914 г. мог прадбачыць, што мір вернецца ў Еўропу толькі праз чатыры гады, а імперыя Мікалая II будзе зруйнавана ў выніку рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Напэўна, і Раман Скірмунт не думаў, што ў сакавіку 1917 г. менавіта ён узначаліць Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), а ў ліпені наступнага года будзе фарміраваць урад Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

Здавалася, што ўжо сам пачатак вайны абумовіў пэўныя змены ў нацыянальнай палітыцы Расіі, прынамсі, у дачыненні да «польскага пытання». Так, 2 жніўня 1914 г. быў апублікаваны зварот вялікага князя Мікалая Мікалаевіча да палякаў, які заклікаў забыць былыя спрэчкі і абяцаў адраджэнне адзінай Польшчы, «свободной в своей вере, в языке, в самоуправлении»[687]. Э. Вайніловіч ва ўспамінах прыгадваў уласную «агаломшанасць» ад гэтага звароту, бо, маўляў, раней нават думаць пра гэта забаранялася[688]. Аднак выконваць гэтыя абяцанні ўлады не спяшаліся. А калі праз нейкі час старшыня Дзяржаўнай Думы Міхаіл Радзянка перадаў цару скаргі польскай грамадскасці, якая не дачакалася перамен, той толькі паціснуў плячыма: «Мы, здаецца, паспяшаліся»[689]. Але, тым не менш, працягваць у дачыненні да польскай супольнасці палітыку ціску ў традыцыйных формах ужо не выпадала.

Абвяшчэнне Германіяй вайны Расіі 19 ліпеня 1914 г. выклікала выбух патрыятычных настрояў сярод значнай часткі расійскай грамадскасці. Ужо на наступны дзень быў апублікаваны Маніфест Мікалая II пра абвяшчэнне вайны Германіі, які падтрымалі амаль усе палітычныя партыі. Разумеючы значэнне аб'яднанага вы-

---

686 В. П. Слобожанин, *Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.)*, с. 46–55.

687 «День». 1914, № 206.

688 E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 178.

689 Цытаванне па: П. Милюков, *Воспоминания*. Москва 1991, с. 397.

ступлення г. зв. «народных прадстаўнікоў», Мікалай II загадаў правесці 26 ліпеня 1914 г. аднадзённыя надзвычайныя сесіі Дзяржаўнай Думы і Дзяржаўнай Рады.

У Думе пасля выступу старшыні Рады міністраў Івана Гарамыкіна на трыбуну ўздымаліся прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, якія казалі пра неабходнасць абароны Радзімы, пра адданасць цару, дзяржаве і народу. Потым прагучалі аналагічныя заявы прагрэсістаў і канстытуцыйных дэмакратаў. Толькі сацыял-дэмакратычная фракцыя ў адмысловай Дэкларацыі асудзіла вайну і адмовілася галасаваць за ваенны крэдыт.

Падобным чынам прайшло пасяджэнне Дзяржаўнай Рады. Гарамыкін заклікаў забыць унутраныя канфлікты і з'яднацца вакол «адзінага сцягу, на якім напісаны найвялікшыя для ўсіх нас словы: "Гасудар і Расія"»[690]. Ад імя польскіх дэпутатаў выступаў Аляксандр Мэйштовіч, які заявіў, што «палякі пойдуць у бой, кіруючыся не толькі пачуццём выканання свайго абавязку. Яны пойдуць даць адпор прускаму *Drang nach Osten*, згадваючы той вялікі бой, у якім побач з палякамі і літоўцамі змагаліся славутыя смаленскія палкі». Прамоўца выказаў надзею, што сумесна пралітая кроў паспрыяе нараджэнню «несакрушальнага польска-рускага саюза»[691]. Цяжка казаць, наколькі шчырым было выступленне дэпутата ад Ковенскай губ. А. Мэйштовіч добра разумеў сутнасць урадавай палітыкі ў вырашэнні «польскага пытання» на беларускіх і літоўскіх землях. Хутчэй за ўсё ягоная прамова была выклікана патрабаваннямі канкрэтнай палітычнай сітуацыі.

Расійскія гісторыкі звычайна імкнуцца паказаць патрыятычны ўздым і адзінства жыхароў імперыі ў момант абвяшчэння вайны. Але рэальнае стаўленне большасці насельніцтва Беларуска-Літоўскага краю да гэтай падзеі лепш перадаюць запісы Дзённіка Міхала Ромэра, які ў маёнтку свайго бацькі (в. Багданішкі Віленскай губ.) 18 ліпеня назіраў мабілізацыю ў войска: «Паўсюдна страшны крык і плач, перапалох ва ўсім двары і вёсцы. Няшчасныя сем'і ахвяр у жаху і роспачы, жонкі і маці плачуць, ірвуць воласы на галаве. «Энтузіязму» ані кроплі»[692].

Эдвард Вайніловіч пазней прыгадваў, як сам атрымаў «чырвоную павестку» ўночы на 18 ліпеня. Яму загадвалася прыбыць у Слуцк дзеля выканання абавязкаў старшыні Мабілізацыйнай камісіі: «Трэба было прымаць коней, павозкі ды іншы інвентар дзеля фарміравання абозаў. Уборка ўраджаю спынілася, людзей мабілізавалі, а вазы, зброя, коні адразу з палёў адпраўляліся ў павет. Горад набыў выгляд вайсковага лагера, напоўніўся вясковымі жыхарамі, якія праводзілі сваіх мужоў і сыноў з плачам і прычытаннямі, але яшчэ болей аплаквалі рэквізаваную

---

[690] *Государственный совет. Стенографические отчёты. Сессия VIII–XII.* СПб.–Петроград 1913–1917. Сессия IX, стлб. 4.

[691] Там же, стлб. 8–9.

[692] Цытаванне па: Z. Solak, *Między Polską a Litwą. Zycie i działalnosc Michała Romera. 1880–1920*, s. 234.

маёмасць. Усё перамяшалася [...] У гэтым пекле мне давялося працаваць дзесяць дзён»[693].

Магчыма, нешта падобнае на Піншчыне назіраў і Раман Скірмунт. Але ўжо праз некалькі тыдняў ён быў у Менску і ўдзельнічаў у VI Надзвычайным сходзе Менскага губернскага земства. Першым у пераліку пытанняў было далучэнне Менскага земства да Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым вайскоўцам (УЗС). Гэтая няўрадавая арганізацыя ўзнікла 30 ліпеня 1914 г. падчас Усерасійскага земскага з'езду. Старшынём Галоўнага камітэту УЗС быў абраны князь Георгі Львоў. Адразу былі створаны аддзелы лекарскай справы і эвакуацыі. Фінансаванне дзейнасці УЗС ажыццяўлялася дзяржавай, земствамі і прыватнымі асобамі[694].

12 жніўня 1914 г. Менскае земства таксама далучылася да УЗС і стварыла Губернскі земскі камітэт дапамогі хворым і параненым вайскоўцам. Ён адразу ж атрымаў ад земства 50 тыс. руб. на арганізацыю шпіталяў, набыццё лекаў і медыкаментаў. Такую ж суму земства пералічыла ў агульны фонд УСЗ. Першым упаўнаважаным ад губернскага земства ва Усерасійскі земскі саюз быў абраны Барыс Самойленка, а другім – Раман Скірмунт[695]. Аднак, паводле інфармацыі *Вестника Минского губернского земства* (1914, № 9) менавіта Скірмунт быў дэлегаваны Менскім земствам на адказныя пасады ў створаны Усерасійскі земскі саюз[696].

Упаўнаважаныя таксама сталі сябрамі ўтворанага губернскага Камітэта. Апрача іх былі абраны такія вядомыя земскія дзеячы, як старшыня Барысаўскай земскай управы І. Арскі, менскі гарадскі галава Станіслаў Хжанстоўскі, земскія дэпутаты Юзаф Свянціцкі, Канстанцін Дзямідэцкі-Дзямідовіч ды інш.[697] Камітэт узначаліў Б. Самойленка, які выступіў на ягоным першым пасяджэнні 14 жніўня з інфармацыяй пра асноўныя задачы дзейнасці УЗС у Менскай губ. У гэты ж дзень было вырашана арганізаваць 100 койкамесцаў для вайскоўцаў у губернскім земскім шпіталі, стварыць запас медыкаментаў, адкрыць пункты харчавання, а таксама рэкамендаваць павятовым земскім управам стварыць мясцовыя Камітэты дапамогі хворым і параненым вайскоўцам[698].

Аднак праца Скірмунта ў УЗС аказалася непрацяглай. Напрыканцы лета 1914 г. і ён атрымаў сваю «чырвоную павестку». Вядома, што 12 кастрычніка 1914 г. падчас выбараў прадстаўнікоў «польскай курыі» ў Пінскае павятовае земства Р. Скірмунт быў абраны завочна, бо знаходзіўся на фронце[699]. Е. Асмалоўскі ва ўспамінах сцвярджаў, што Скірмунт быў мабілізаваны ў 404 пешую Менскую

---

693 E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 177.

694 В. П. Слобожанин, *Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.)*, с. 65.

695 НГАБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 710, арк. 12–12 адв., 65.

696 С. Рудовіч, «*Беларускі дзеяч з вялікіх паноў...*», «Гістарычны альманах». 1999. Том 2, с. 31.

697 НГАБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 710, арк. 53.

698 Тамсама, арк. 59

699 «Kurier Litewski». 1914, Nr 247.

дружыну народнага апалчэння[700]. Яна была адной з шасці дружын Менскай брыгады народнага апалчэння (3 армія). Задачамі апалчэнцаў было нясенне варты і ахова транспартных шляхоў, у першую чаргу, чыгуначных магістраляў. У баявых дзеяннях яны не павінна былі ўдзельнічаць, хоць сітуацыя на фронце часта ператварала апалчэнне ў баявыя вайсковыя адзінкі.

Прагляд дакументаў 404 дружыны ў Расійскім Дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве не пацвердзіў сцвярджэння Асмалоўскага. Скірмунт не фігураваў ні ў загадах камандзіра дружыны палкоўніка Пальчынскага за перыяд з 24 ліпеня па 31 кастрычніка 1914 г., ні ў ягонай «палявой кніжцы» за другую палову 1914 г., ні ў журнале баявых дзеянняў з 24 ліпеня 1914 г. па 30 чэрвеня 1915 г. Магчыма, Асмалоўскі памыліўся з нумарам дружыны. Той жа Асмалоўскі прыгадваў, што Раман Скірмунт быў паранены ў нагу і пасля гэтага накіраваны ў Менск у распараджэнне УЗС[701]. Магчыма, пасля ранення ён вярнуўся да абавязкаў, вызначаных для яго земцамі яшчэ ў жніўні 1914 г. Як бы там ні было, але напрыканцы лістапада Скірмунт ужо прысутнічаў на сходзе Пінскага земства і быў абраны ў склад Рэвізійнай камісіі[702].

Нягледзячы на вайну, дэпутаты Менскага губернскага земства працягвалі дзейнічаць у раней вызначаных кірунках. У прыватнасці, клапаціліся пра развіццё адукацыі, у т. л. вышэйшай. У лістападзе 1914 г. у Менску быў адкрыты Настаўніцкі інстытут з трохгадовым тэрмінам навучання, а пры ім пачалі дзейнічаць настаўніцкія курсы. На парадку дня фігуравала пытанне пра адкрыццё ў Менску ўніверсітэта і сельскагаспадарчага інстытута.

Гэтыя пытанні разглядаліся таксама на пасяджэннях IV Чарговага губернскага земскага сходу напрыканцы студзеня 1915 г. На гэтым сходзе Рамана Скірмунта абралі ў склад Камісіі па адкрыцці ў Менску вышэйшай навучальнай установы. Таксама ён застаўся прадстаўніком земства ва УЗС і Расійскай экспартнай палаце[703].

Трэба адзначыць, што роля Усерасійскага земскага саюза ў вырашэнні пытанняў забеспячэння фронту медыкаментамі і лекарамі імкліва ўзрастала. Ужо напрыканцы 1914 г. Саюз забяспечыў дзейнасць вайсковых шпіталяў на 155 тыс. ложкаў, а на 1 студзеня 1915 г. ім было ўкамплектавана 40 санітарных цягнікоў[704]. Паўнамоцтвы арганізацыі паступова пашыраліся. Урэшце ўрад перадаў УЗС справу забеспячэння фронту харчам і медыкаментамі. Адчыняліся палявыя шпіталі,

---

[700] BN. Dział mikroform. Akc. 6797. J. Osmołowski, *Wspomnienia z lat 1914–1921. Tom 1. 1914–1917*, k. 2.

[701] Ibidem.

[702] «Kurier Litewski». 1914, Nr 303.

[703] НГАБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 708, арк. 256, 276.

[704] В. Воронин, *Земство в годы Первой мировой войны и революций 1917 г.* Рэжым доступу: http://www.portal-slovo.ru/authors/4.php. Дата доступу: 24.12.2016.

рамонтныя майстэрні, пякарні ды інш. Адпаведна сфарміраваўся разгалінаваны апарат упраўлення, вырасла колькасць служачых, ствараліся франтавыя камітэты.

Ад моманту стварэння УЗС дзейнічаў у цесным кантакце з Усерасійскім саюзам гарадоў, які ўзнік у жніўні 1914 г., і займаўся аналагічнымі справамі. У ліпені 1915 г. гэтыя арганізацыі аб'ядналіся ва Усерасійскі земскі і гарадскі саюз (неафіцыйная назва *Земгор*), які стварыў Галоўны камітэт па забеспячэнні арміі. На месцах пачалі ўзнікаць губернскія, павятовыя і гарадскія камітэты. Земгор актыўна супрацоўнічаў з Цэнтральным вайскова-прамысловым камітэтам, які быў створаны па ініцыятыве прадстаўнікоў буйнога прамысловага капітала ў чэрвені 1915 г. Гэты Камітэт уяўляў сабой яшчэ адну ўплывовую грамадскую арганізацыю, якая імкнулася мабілізаваць прамысловасць краіны дзеля патрэб вайны. Першапачаткова гэтыя арганізацыі дзейнічалі выключна як грамадскія, але па меры пагаршэння сітуацыі на фронце яны пачалі прэтэндаваць на палітычныя ролі.

Між тым, сітуацыя расійскіх войск на фронце пагоршылася. У выніку разгрому ва Усходняй Прусіі армій генералаў А. Самсонава і П. Рэненкампфа ў жніўні–верасні 1914 г. Расія страціла загінулымі, параненымі і палоннымі амаль 100 тыс. салдат і афіцэраў[705]. Праўда, перамогі ў Галіцыі над войскамі Аўстра-Венгрыі ў верасні таго ж года трохі зменшылі горыч гэтай паразы.

Напрыканцы зімы 1914–1915 г. становішча на Усходнім фронце, які працягнуўся амаль на 1 200 км, стабілізавалася. Аднак якраз у гэты момант расійскія войскі пачалі адчуваць недахоп забеспячэння. Здараліся выпадкі, калі на фронт прыбывала папаўненне, якое не мела зброі.

Напрыканцы 1914 г. нямецкае камандаванне вырашыла вясной наступнага года пачаць маштабны наступ менавіта на Усходнім фронце. Стратэгічны план Альфрэда фон Шліфена па разгроме Францыі пацярпеў крах, і было прынята рашэнне вывесці з вайны Расію. Пачалася перадыслакацыя войск з Заходняга фронту. На поўдні ад Кракава фарміраваўся моцны ўдарны «кулак», аснову якога складала 11 армія генерала Аўгуста фон Макензена.

15 красавіка 1915 г. пачаўся наступ нямецкіх і астра-венгерскіх армій у Галіцыі. На пачатку чэрвеня быў вызвалены ад расійскіх войск Львоў, а нямецкія дывізіі наблізіліся да Варшавы. Напрыканцы чэрвеня яны перайшлі ў наступ у Памераніі і Усходняй Прусіі. У выніку г. зв. «Свенцянскага прарыву» ўзнікла пагроза акружэння ў Польшчы чатырох расійскіх армій. 9 ліпеня яны пачалі адыход па ўсім фронце. Праз месяц Мікалай II зняў з пасады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, і сам узначаліў войскі.

Становішча на Усходнім фронце стабілізавалася толькі ў верасні 1915 г. Фронт уяўляў сабой амаль прамую лінію, якая ішла ад Рыжскага заліва да мяжы з Румыніяй. Уся Польшча, значная частка Беларусі і Літвы, частка Латвіі аказаліся пад нямецкай акупацыяй. На беларускіх землях фронт стабілізаваўся па лініі

[705] И. Ростунов, *Русский фронт Первой мировой войны*. Москва 1976, с. 118–125.

Дзвінск – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск. Расія страціла землі, на якіх панавала з канца XVIII ст. Да вайны тут пражывала амаль 23 мільёны чалавек або 13 % насельніцтва імперыі. У расійскіх войсках з'явіліся першыя прыкметы дэмаралізацыі. Даваеннай арміі больш не існавала. На фронт накіроўвалі запасных II разрада і апалчэнцаў.

З набліжэннем нямецкіх войск да Пінска Раман Скірмунт з маці і двума слугамі пераехаў у Менск[706]. У маёнтку засталася малодшая сястра Алена, якая правяла там увесь перыяд нямецкай акупацыі і па меры магчымасцяў клапацілася пра лёс маёмасці.

Верагодна, ужо ўвосень 1915 г. Раман Скірмунт і яго маці пасяліліся ў доме Эмануіла Абрампальскага па вул. Захар'еўскай 31/2[707]. Менавіта гэты адрас указаў Рамана Скірмунт у лістападзе 1918 г. падчас выбараў ва Устаноўчы Сход[708]. У гэтым жа доме, паводле кнігі Леаніда Маракова *Галоўная вуліца Мінска* (2012), апроч уласніка (другі паверх) з 1912 па 1916 г. здымала кватэру княгіня Марыя Магдалена Радзівіл (першы паверх), а таксама жылі калегі Скірмунта па МТСГ Мячыслаў Пагоскі, Леў Ваньковіч і Рамуальд Хялхоўскі. Скірмунт у кнізе Маракова згадваецца толькі як адзін з частых наведвальнікаў княгіні Радзівіл, але, насамрэч, у 1915 г. ён заняў адну з двух кватэр на трэцім паверсе гэтага дому[709]. Яны, як устанавіў Леанід Маракоў, якраз вызваліліся ў 1915 г.

Пінск быў захоплены наступаючымі нямецкімі войскамі 15 верасня 1915 г. Парэчча таксама аказалася з нямецкага боку лініі фронту, якая праходзіла ўздоўж р. Ясельды і канала Агінскага. Якраз тут перайшлі да абароны часткі нямецкай арміі генерала фон Лінзінгена. Удзельнік вайны Вальтэр Фогель так апісваў баявыя пазіцыі, якія дазвалялі весці толькі «малую вайну»: «Першабытныя лясы паміж Лагішыным, Выганаўскім возерам і паваротам Шчары не дазваляюць перамяшчэння згрупаваных частак. Торф пад нагамі дрыжыць і хістаецца. Бярвенчаты насціл неабходны для ўмацавання сцяжынак. Цалкам адкрытая тэрыторыя балот лёгка абстрэльваецца праціўнікам з закрытых пазіцый. Густы хмызняк, шматлікія крынічкі, вокны глыбокіх балот перашкаджаюць кожнаму кроку. Пастам, патрулям і высунутым назіральнікам пагражае смерць у багне. Бязлітасна зацягвае падманлівае покрыва сваю ахвяру ў бурую бурлівую глыбіню [...] Патрэбна знаходлівасць, спрытнасць і прысутнасць духа у патрулёў і выведнікаў, каб ваяваць у гэтай каварнай мясцовасці»[710].

---

[706] НГАБ. Ф. 700, воп. 1., спр. 126, арк. 295.

[707] Сёння гэта дом па вул. Савецкай, 17.

[708] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ). Ф. 60п, воп. 3, спр. 737, арк. 22.

[709] Л. Маракоў, *Галоўная вуліца Мінска. 1880–1940. Кніга 1.* Мінск 2012, с. 119–121.

[710] В. Фогель, *Барановичи 1916.* Петербург 1921 Гл.: Рэжым доступу: http://www.fortressby.com/index.php?option=com_content&task=view&id=191&Itemid=6&limit=1&limitstart=3. Дата доступу: 11. 01. 2016.



Парэчча на нямецкіх паштоўках Першай сусветнай вайны.



Увосень 1915 г. салдаты абедзвюх армій рыхтаваліся зімаваць у палескіх балотах. З расійскага боку (3 армія генерала Л. Леша) будаваліся зямлянкі, шалашы, навесы і блокгаузы з бярвенняў і зямлі з лініяй насыпных акопаў. З нямецкага – ішло больш актыўнае будаўніцтва. За восень немцы паспелі пракласці праз багны бярвенчатыя гаці, збудаваць масты і нават пракласці вузкакалейку, па якой падвозілі будаўнічыя матэрыялы, харчаванне і боепрыпасы. Амаль да вясны 1918 г. тут ствараўся моцны абарончы вузел, асновай якога былі бетонныя доты, што захаваліся да гэтага часу. Актыўныя баявыя дзеянні тут не вяліся. Зрэдку адбываліся перастрэлкі, у якія спарадычна ўмешвалася артылерыя. Іншым разам праціўнікі ладзілі выведку боем.

Усё гэта паспрыяла таму, што ні вёска Парэчча, ні маёнтак Скірмунтаў моцна не пастрадалі. Знойдзеныя паштоўкі нямецкага салдата Ітэ Рыхтэра (Itte Richter) з краявідамі Парэчча (ліпень 1916 – красавік 1917 г.), адрасаваныя ягонай сястры ў вёску Хайнесдорф пад Берлінам, дазваляюць сцвярджаць, што ў доме Скірмунтаў месціўся вайсковы шпіталь. Відаць, якраз таму ў самім Парэччы захаваліся могілкі нямецкіх салдат з розных вайсковых адзінак. На адной з паштовак відаць нямецкую палявую кнігарню (*Feldbuchhandlung*) у Парэччы. Немцы вельмі грунтоўна размясціліся ў гэтай палескай мясцовасці.

А вось эра прамысловага Парэчча закончылася. Паводле інфармацыі фабрычнага інспектара Менскай губ. у снежні 1914 г. памеры вытворчасці суконнай фабрыкі ў параўнанні з даваенным перыядам зменшыліся на 30 % з прычыны

высылкі замежных майстроў. Пры гэтым колькасць работнікаў не скарацілася і па-ранейшаму складала 213 чал.[711] Аднак ужо праз некалькі дзён суконная фабрыка Скірмунта і вінакурны завод у Парэччы трапілі ў спіс прадпрыемстваў, што спынілі вытворчасць, бо апынуліся ў раёне баявых дзеянняў[712]. Дарэчы, загадам камандуючага Паўночна-Заходнім фронтам ад 25 ліпеня 1915 г. усе прадпрыемствы, што апынуліся ў «вайсковых зонах» класіфікаваліся па дзвюх катэгорыях. У першую катэгорыю трапілі заводы і фабрыкі, якія працавалі на «ваеннае ведамства» і падлягалі эвакуацыі, у другую – «усе астатнія»[713].

Прамысловасць Парэчча належала да другой катэгорыі. Падобна, што праблема эвакуацыі суконнай фабрыкі была ўзнята са спазненнем. Тэлеграма пра гэта з Міністэрства гандлю і прамысловасці была адпраўлена ў Менск толькі 8 верасня 1915 г.[714] Дакументы сведчаць, што з фабрыкі паспелі вывезці толькі прадукцыю і сыравіну, а станкі ды іншае абсталяванне было сапсаванае. Зрэшты, апошняе сцвярджэнне магло не адпавядаць рэчаіснасці, бо інфармацыя пра сітуацыю ў Парэччы была адпраўлена ў лістападзе 1915 г., калі ўжо не існавала магчымасці праверыць выкананне загаду. Паводле ўспамінаў мясцовых жыхароў, абсталяванне суконнай фабрыкі было вывезена ў Германію на самым пачатку нямецкай акупацыі. Як бы ні было, але даводзіцца канстатаваць канец эпохі «Ліверпуля на Ясельдзе». Прамысловасць даваеннага ўзроўню тут ужо ніколі не будзе ўзноўлена.

Падобна, што крах прамысловасці абярнуўся вялізарнымі фінансавымі праблемамі сям'і парэцкіх Скірмунтаў. Магчыма, менавіта гэта прымушала Рамана Скірмунта працаваць адразу на дзвюх надзвычай адказных пасадах – фактычнага ўпаўнаважанага Асобнай нарады па харчовай справе, а таксама кіраўніка Губернскай харчовай камісіі.

Аднак ягоная сітуацыя была значна лепшай, чым становішча большасці парэцкіх землякоў, якія выбралі лёс бежанцаў. Вядома, што бежанцы з Парэчча і навакольных вёсак спыніліся ў наваколлях Петрыкава і Жыткавіч. Іх жыццё ў вялікай ступені залежала ад дзяржаўнай падтрымкі і ад дзейнасці дабрачынных арганізацый. Як пазней, у сакавіку 1917 г., паведамляў у Менскі губернскі камітэт УЗС настаяцель Парэцкай царквы Мяфодый Крышпіновіч, «местное население очень черство, оно имеет большие запасы хлеба и не хочет продавать их»[715]. Менавіта парэцкі святар праяўляў найбольшы клопат пра лёс сваіх прыхажан. Аднак пункты харчавання для бежанцаў у наваколлі Жыткавіч з'явіліся толькі ўвесну 1917 г.

---

[711] НГАБ. Ф. 311, воп. 1, спр. 93, арк. 29–30.

[712] Тамсама, арк. 72–73.

[713] Тамсама, арк. 16–16 адв.

[714] Тамсама, арк. 103–104.

[715] *Беларусь в годы Первой мировой войны (1914–1918): сборник документов*. Сост. В. В. Врублевский и др. Минск 2014, с. 144.

Адступленне расійскіх войск суправаджалася эвакуацыяй установ і прадпрыемстваў, а таксама перамяшчэннем вялікай масы насельніцтва на ўсход. Спачатку эвакуацыя мела прымусовы характар і была інспіравана вайсковым камандаваннем. Потым дзейнічаў ужо «інстынкт статку» (Э. Вайніловіч) і чуткі пра «зверствы тэўтонцаў».

У выніку летам і напачатку восені 1915 г. у Беларусі назіралася сапраўднае «вялікае перасяленне народаў». Па дарогах Менскай губ. рухаўся вялізарны натоўп бежанцаў з тэрыторыі Каралеўства Польскага і Гарадзенскай губ. Сярод вымушаных «перасяленцаў» пераважалі старыя, жанчыны і дзеці. У ліпені 1915 г. толькі паміж Кобрынам і Баранавічамі ў дарозе знаходзілася каля 400 тыс. чал.[716] З-за адсутнасці планаў эвакуацыі рух бежанцаў быў досыць хаатычным. Да таго ж, яны не атрымлівалі належнай дапамогі.

Трагедыю бежанцаў выдатна перадаюць вусныя ўспаміны, запісаныя напрыканцы XX ст. сябрамі Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку:

● На дарозе, за Белавежай шмат войска і цывільных ішлі пешшу. Ехалі на фургонах і аўтамабілях. Натоўп падаваўся на Баранавічы. […] Паветра, насычанае смуродам конскага поту, перамешвалася з пылам і выхлапнымі газамі аўтамабіляў. Затыкала нос і горла. Людзі хварэлі, і смерць збірала жніво. Трупы валяліся пабабапал дарогі. Ніхто не прыбіраў, не звяртаў на памерлых увагі (Раман Багроўскі, 1906 г. нар.)[717].

● Спыніліся ў Баранавічах, там быў харчавальны пункт. Там гразь была, нечыстата, звал, там бежанцы паміралі. Пастаянна толькі хавалі, вазілі тыя трупы. На маіх вачах некалькі магіл рабілі: капаюць роў, звозяць, закрываюць, і зноў другі роў капаюць (Віктар Паўлючук, 1902 г. нар.)[718].

Польскі дзеяч Зыгмунт Васілеўскі назваў шлях бежанцаў «крыжовай дарогай». Ён адным з першых пачаў збіраць сведчанні гэтых выгнанцаў. Вось адно з іх: «Хтосьці запытаны, як даўно ён у дарозе, адказаў: "Ужо і сам не ведаю. Не ведаю, можа гэта быў сон, што калісьці я меў дом, а можа я стаў вар'ятам? Дом спалены, жонка памерла ў дарозе, і двое дзяцей пайшлі разам з ёю, ляжаць пад крыжамі. Толькі я і гэты конь засталіся на свеце"»[719].

З надыходам восені становішча бежанцаў яшчэ больш пагоршылася. Яны пакутвалі ад холаду і дажджоў. Пачалі распаўсюджвацца інфекцыйныя хваробы. Ва ўмовах бяздзеяння ўладаў расла смяротнасць. «Спачатку, – прыгадваў Э. Вайні-

---

[716] А. Бабков, *Беженское движение в Беларуси в годы Первой мировой войны* (у:) *Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь*: Тэзісы дакладаў і паведамл. Ч. 1. Мінск 1993, с. 147.

[717] *Бежанства 1915 года.* Рэд. В. Луба. Беласток 2000, с. 32.

[718] Тамсама, с. 231.

[719] Цытата па: M. Korzeniowski, M. Mądzik, D. Tarasiuk, *Tułaczy los. Uchodzcy polscy w imperium rosyjskim w latach pierwszej wojny swiatowej.* Lublin 2007, s. 17.

ловіч, – калі на падворках былі запасы дошак, [...] людзей хавалі ў трунах. Пазней хавалі без іх, а часта здараліся выпадкі, калі памерлых прысыпалі зямлёй каля дарогі або закідвалі мохам у лесе, пакідаючы клопат пра лепшае пахаванне мясцоваму насельніцтву. Насельніцтва выконвала гэтую місію неахвотна і толькі пад ціскам уладаў. Прыдарожныя магілы пазначалі той шлях, якім цягнуўся натоўп бежанцаў, каб знайсці сродкі для выжывання для сябе і свайго «жывога інвентара»[720].

У выніку масавага бежанства эканамічная сітуацыя на Меншчыне рэзка пагоршылася. Сталі надзвычай актуальнымі праблемы харчавання і фуражу, забеспячэння людзей палівам, жытлом ды інш.

Эдвард Вайніловіч пазней успамінаў, як вытоптваліся бежанцамі нясжатыя палі, як знішчалася чужая маёмасць: «Сядзібы і фальваркі з жахам сустракалі доўгія абозы, пакрытыя брэзентам і палатном [...] Яны хаатычна рухаліся на ўсход, спыняліся там, дзе яшчэ можна было нешта знайсці, і, як саранча, пакідалі пасля сябе пустэльню»[721].

У верасні 1915 г. павятовы спраўнік М. Стракоўскі паведамляў менскаму губернатару: «[...] Положение беженцев действительно представляет чрезвычайно неприятное впечатление: скот, который был вывезен с насиженных мест, постепенно пропадает от усталости, заболевания; малые дети и старики простуживаются, ослабевают, не имеют соответствующего ухода, скарб растрачивается, запасы продуктов истощились, а потому до прибытия на питательный пункт (которых к тому же очень мало) беженцы и лошади в пути голодают, а на самих пунктах за массою ожидающих очереди много проходит времени, даже день. Все они почти оборванные, грязные, босые, в особенности дети, не вынося резко изменившейся обстановки жизни, болеют и при отсутствии в дороге [...] скорой помощи, фельдшерской или врачебной, умирают в немалом числе. Немало лиц совершенно не обращаются к медицинскому персоналу. Посему эпидемия холерыны и гастрита среди беженцев принимает сравнительно широкие размеры»[722].

Колькі людзей рушыла ў гэты «крыжовы шлях»? Беларускі гісторык Аляксандр Мікалаевіч, спасылаючыся на звесткі Усерасійскага саюза гарадоў, сцвердзіў, што на 1 чэрвеня 1916 г. налічвалася каля 2 760 тыс. бежанцаў. З іх 47,1 % складалі жыхары Гарадзенскай, Віцебскай, Менскай і Віленскай губ.[723] На пачатку 1917 г. агульная колькасць зарэгістраваных бежанцаў вызначалася лічбай 3 200–3 500 тыс. чал.

---

[720] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 185–186.

[721] Ibidem, s. 185.

[722] Трагічны лёс бежанцаў грунтоўна прадстаўлены ў кнізе Анэты Прымак-Онішк (Aneta Prymak-Oniszk, *Bezenstwo 1915. Zapomniani uchodzcy* (Wołowiec 2016).

[723] А. Мікалаевіч, *Бежанцы Першай сусветнай вайны*, «Спадчына». 1994, № 3, с. 19.

Ураджэнцаў Беларусі сярод іх было прыблізна 1 130–1 320 тыс.[724] Іншы беларускі даследчык Віталь Карнялюк налічыў каля 2 млн. бежанцаў[725].

Што датычыць бежанцаў з тэрыторыі Каралеўства Польскага, то большасць польскіх даследчыкаў паўтараюць падлікі гісторыка Валянціны Найдус, якая ўстанавіла, што іх агульная колькасць складала каля 1 млн. чал.[726] Яна ж сцвярджала, што болей 240 тыс. польскіх бежанцаў размясціліся на тэрыторыі Менскай, Магілёўскай і Віцебскай губ.[727] Прычым Менская губ. прыняла болей за 46 тыс.[728] А вось сведка і ўдзельнік тых падзей Е. Асмалоўскі лічыў, што на Меншчыне спынілася каля 100 тыс. бежанцаў з Польшчы[729].

Паражэнні на фронце паўплывалі на палітычную сітуацыю. Грамадскае меркаванне шукала вінаватых. Станавілася відавочным, што імперская бюракратыя не ў стане адэкватна рэагаваць на выклікі вайны. Нават кансерватыўныя элементы пачалі падтрымліваць ліберальную апазіцыю.

Кансалідацыя апазіцыі адбылася падчас сесіі Дзяржаўнай Думы, якая распачалася 19 ліпеня 1915 г. У жніўні сфарміраваўся г. зв. Прагрэсіўны блок, у які ўвайшлі прадстаўнікі амаль усіх партый, апрача крайне левых і крайне правых. Ягоным падмуркам стаўся Земгор. Сябры і прыхільнікі Прагрэсіўнага блоку ўжо не бачылі палітычных перспектыў самаўладдзя і існаванне моцнай улады звязвалі толькі з Думай. Яны патрабавалі стварэння ўрада, адказнага перад Думай, абмежавання ўлады бюракратыі, амністыі асуджаным за палітычныя і рэлігійныя злачынствы, спынення рэлігійнага пераследу (у т. л. антысеміцкага), аднаўлення прафсаюзаў, аўтаноміі Каралеўства Польскага ды інш.

З'яўленне Прагрэсіўнага блоку выклікала сапраўдную эйфарыю сярод інтэлігенцыі і адукаванай часткі грамадства. Але яна хутка закончылася. Мікалай II адхіліў усе патрабаванні і 3 верасня 1915 г. распусціў Думу. У выніку, як заўважыў Рычард Пайпс, ад цара адвярнуліся амаль усе сацыяльныя колы, альянс паміж бюракратыяй і ліберальнай інтэлігенцыяй стаў немагчымым, а рэвалюцыя – непазбежнай[730].

На жаль, адсутнічаюць матэрыялы, якія б дазволілі высвятліць стаўленне Рамана Скірмунта да гэтых палітычных падзей. Служба ў Земгоры, а таксама логіка ранейшай палітычнай дзейнасці дазваляе лічыць яго асцярожным прыхільнікам

---

[724] *Гісторыя Беларусі ў шасці тамах.* Том 4. *Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).* Рэд. М. Біч, В. Яноўская. С. Рудовіч і інш. Мінск 2005, с. 445.

[725] В. Карнялюк, *Праблема гісторыка-дэмаграфічнай характарыстыкі бежанцаў з беларускіх зямель (1914–1918 гг.),* «Веснік ГрДУ», 2000, серыя 1, № 2 (4), с. 24.

[726] Гл., напр., M. Korzeniowski, M. Mądzik, D. Tarasiuk, *Tułaczy los. Uchodzcy polscy w imperium rosyjskim…*, s. 24.

[727] Ibidem, s. 38.

[728] Ibidem, s. 39.

[729] BN. Dział mikroform. Akc. 6797. J. Osmołowski, *Wspomnienia z lat 1914–1921.* T. 1, k. 205.

[730] Р. Пайпс, *Русская революция.* Часть первая. Москва 1994, с. 257–258.

новай апазіцыі. «Асцярожнасць» магла быць абумоўлена крытычным стаўленнем да расійскіх ліберalаў.

Між тым, арганізацыя дапамогі бежанцам таксама спрыяла актывізацыі праціўнікаў царызму. Прычым у гэтым выпадку гаворка ішла ўжо пра нацыянальныя сілы.

Летам 1915 г. праблему дзяржаўнай дапамогі бежанцам узнялі дэпутаты IV Думы. Яе старшыня Міхаіл Радзянка пачаў фарміраваць Раду грамадскіх дзеячаў, у т. л. з прадстаўнікоў Земгора і Ваенна-прамысловых камітэтаў. Аднак ініцыятыву перахапіла адміністрацыя, і 30 жніўня 1915 г. пад эгідай Міністэрства ўнутраных спраў было створана *Особое совещание по устройству беженцев*, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Дзяржаўнай Думы і Дзяржаўнай Рады, а таксама шэрагу агульнарасійскіх грамадскіх арганізацый. Прычым прадстаўніцтва Думы фарміравалася па нацыянальнай прыкмеце. Фармальным кіраўніком *Совещания* з'яўляўся міністр унутраных спраў, а кіраваў пасяджэннямі ягоны намеснік. Як і ў выпадку іншых Асобных нарад, меў месца пэўны палітычны кампраміс паміж манархам і Думай, бюракратыяй і буржуазіяй.

Трэба адзначыць, што калегіяльнасць у прыняцці рашэнняў Асобнай нарады была моцна абмежавана, як і яе паўнамоцтвы. Фактычна пасяджэнні звяліся да зацвярджэння раней асігнаваных сродкаў на дапамогу бежанцам і спробаў кантраляваць іх выкарыстанне. Аднак менавіта дзякуючы стварэнню гэтай Асобнай нарады дзяржава нарэшце пачала выдзяляць значныя сродкі для дапамогі. Так, у 1916 г. штомесяц выдзялялася каля 20 млн. руб., а да лютага 1917 г. агульныя выдаткі дзяржаўнай казны склалі каля 400 млн.[731] Тут варта прыгадаць дзейнасць Камітэта вялікай княгіні Таццяны Мікалаеўны («Таццянінскі камітэт»), які атрымліваў вялізарныя дзяржаўныя субсідыі, што дазваляла аказваць бежанцам аднаразовую матэрыяльную дапамогу, спрыяць іх працаўладкаванню, па меры магчымасці вяртанню на радзіму і г. д. Таксама дапамогу выгнанцам з родных мясцінаў аказвалі Ваенна-прамысловыя камітэты і Земгор.

Дзякуючы фінансаванню згаданай Асобнай нарады і «Таццянінскага камітэта», стала магчымай дзейнасць шматлікіх дабрачынных арганізацый, на рахунку якіх таксама пералічваліся значныя сумы. Гэта датычыла і тых арганізацый, што ствараліся па нацыянальнай прыкмеце. Дарэчы, якраз Асобная нарада прыняла рашэнне пра выкарыстанне нацыянальнага чынніка ў арганізацыі дапамогі. У рэальным жыцці польскія, літоўскія, беларускія ды інш. дабрачынныя арганізацыі сталі своеасаблівай формай легалізацыі нацыянальных рухаў. Дарэчы, менавіта польскія грамадскія арганізацыі першымі здолелі распачаць акцыю масавай дапамогі бежанцам з тэрыторыі Каралеўства Польскага. Адным з важных цэнтраў гэтай дапамогі стаўся Менск, дэмаграфічная сітуацыя ў якім істотна змянілася.

[731] А. В. Ильин Об Особом совещании по устройству беженцев, с. 52. Рэжым доступу: http://www.law.edu.ru/doc/document.asp?docID=1137988. Дата доступу: 20. 01. 2015.

Колькасць прышлага насельніцтва (вайскоўцы, чыноўнікі і бежанцы) дасягала ў Менску 150 тыс. чал.[732]

Многія прадстаўнікі варшаўскай інтэлігенцыі і дзеячы польскіх арганізацый таксама спыніліся ў губернскім цэнтры. Прыгадваючы той час, Вайніловіч заўважыў, што Менск стаў набываць рысы польскага горада[733]. Пра тое ж пісаў і Е. Асмалоўскі, якому па службовых справах часта даводзілася бываць у Менску. Ён сцвярджаў, што «Менск ніколі не быў такім польскім горадам, як у 1916–1918 гг. Ён ператварыўся ў цэнтр польскай палітычнай думкі. Тут былі прадстаўлены палітыкі і грамадскія дзеячы ўсіх кірункаў як Каралеўства Польскага, так і крэсовых палякаў»[734].

Дарэчы, падчас аднаго з візітаў ва ўласны маёнтак Селішча на Піншчыне Асмалоўскі паабяцаў групе польскіх бежанцаў, якая спынілася побач з маёнткам, дапамагчы застацца ў гэтай мясцовасці. Дзеля гэтага ён звярнуўся да Рамана Скірмунта, які дапамог, і бежанцы ўладкаваліся ў маёнтку і ў вёсцы Селішчы[735]. Аднак у красавіку 1916 г. улады вырашылі адправіць іх далей на ўсход. Асмалоўскі зноў звярнуўся да Скірмунта. У выніку мясцовыя ўлады атрымалі тэлеграму ад менскага губернатара: «Прашу не кранаць бежанцаў з маёнтка Селішча палкоўніка Асмалоўскага». Уладальнік маёнтка ўспамінаў, што тэлеграма і ягонае «званне», якога, насамрэч, ён не меў, зрабілі надзвычай моцнае ўражанне на павятовую ўладу[736]. Яна больш не турбавала бежанцаў. А для нас важна адзначыць, што асоба Рамана Скірмунта была даволі ўплывовай у межах губерні.

Найбуйнейшай з польскіх дабрачынных арганізацый быў Цэнтральны грамадзянскі камітэт губерняў Каралеўства Польскага (ЦГК). Ён узнік у Варшаве ў верасні 1914 г. і першапачаткова грунтаваў сваю дзейнасць на ініцыятывах асобных грамадзян, а таксама польскіх грамадскіх, гаспадарчых і культурных арганізацый. У верасні 1915 г. галоўная сядзіба ЦГК знаходзілася ўжо ў Петраградзе. Дзейнасць Камітэта разгарнулася на тэрыторыі Менскай, Магілёўскай, Віцебскай, Чарнігаўскай, Смаленскай і Арлоўскай губ., а таксама неакупаванай часткі Віленскай губ. Камітэт імкнуўся забяспечыць бежанцаў харчаваннем, жытлом, крэдытамі, арганізаваць навучанне дзяцей і г. д. На Меншчыне разам з сябрамі камісій МТСГ яго супрацоўнікі складалі акты страт, панесеных гаспадаркамі ў выніку ваенных дзеянняў.

Расійскія ўлады прызналі Камітэт, хоць у адносінах да яго была відавочнай насцярожанасць бюракратыі. Магчыма, на такі стасунак паўплывала імкненне ЦГК спалучаць дабрачыннасць з актыўнай грамадскай і палітычнай пазіцыяй.

---

[732] *Гісторыя Беларусі ў шасці тамах*. Том 4, с. 445.

[733] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 187.

[734] BN. Dział mikroform. Akc. 6797. J. Osmołowski, *Wspomnienia z lat 1914–1921*. T. 1, k. 14.

[735] Ibidem, k. 14.

[736] Ibidem, k. 18.

У ліпені 1915 г. па ініцыятыве ЦГК у Менску паўстаў Губернскі камітэт апекі над бежанцамі[737]. Першым паўнамочным прадстаўніком ЦГК у Менску быў Мар'ян Лютаслаўскі, якога пазней замяніў Адольф Сьвіда[738].

Вялікую ролю ў ратаванні бежанцаў таксама адыграла Польскае таварыства дапамогі ахвярам вайны (ПТДАВ). Менавіта з ім звязана дабрачынная актыўнасць тых палякаў, якія яшчэ да пачатку вайны пражывалі на беларуска-літоўска-украінскіх землях і ў Цэнтральнай Расіі. Найбольш актыўнымі былі мясцовыя землеўласнікі, інтэлігенцыя і духавенства. Таварыства ўзнікла ў Петраградзе напрыканцы жніўня 1914 г. Адным з яго ініцыятараў быў землеўласнік з Меншчыны Генрык Свянціцкі. Паводле статута, ПТДАВ дазвалялася адкрыццё аддзелаў на ўсёй тэрыторыі Расіі. Ужо напрыканцы 1914 г. такія аддзелы дзейнічалі ў 86 гарадах, у т. л. у Менску і Вільні[739].

Менскі аддзел узнік у лістападзе 1914 г. (старшыня граф Ежы Чапскі) і меў каля 30 секцый па ўсёй губерні. Таксама варта адзначыць існаванне Санітарна-прадуктовай секцыі ПТДАВ (старшыня Баляслаў Ялавецкі), якая аказвала дапамогу тым бежанцам, якія рухаліся далей на ўсход. Паўнамоцным прадстаўніком гэтай секцыі ў Менскай, Магілёўскай і Віцебскай губ. быў Эдмунд Івашкевіч[740].

Важную ролю адыгрываў Польскі камітэт у Маскве, галоўнай задачай якога была арганізацыя дапамогі палякам, якіх прывёў сюды шлях бежанцаў. Ягоным арганізатарам стаў вядомы адвакат Аляксандр Лядніцкі.

Існаванне розных польскіх арганізацый актуалізавала задачу каардынацыі іх дзейнасці, тым больш, што паступова пачала праяўляцца пэўная канкурэнцыя паміж ЦГК і ПТДАВ. У жніўні 1915 г. па ініцыятыве А. Лядніцкага ў Маскве адбыўся Польскі з'езд, які абраў Раду з'ездаў польскіх арганізацый дапамогі ахвярам вайны. Старшынём Выканкаму Рады быў абраны А. Лядніцкі, а ягонымі намеснікамі – Г. Свянціцкі (ПТДАВ) і Е. Здзяхоўскі (ЦГК)[741]. Легалізацыя Рады наступіла ў лістападзе 1915 г. Такім чынам, быў створаны інстытут каардынацыі дзейнасці ўсіх польскіх арганізацый дапамогі бежанцам.

Аднак стварэнне такога каардынацыйнага цэнтра выклікала пратэсты з боку часткі беларускіх палякаў. Старшыня МТСГ Вайніловіч убачыў у гэтым імкненне стварыць нейкі «агульнапольскі ўрад» з прэтэнзіяй на кіраванне жыццём польскай супольнасці ад Менска да Уладзівастока. Узнавілася боязь краёўца і кансерватара, што падпарадкаванне рашэнням Рады, у якой выразна пераважалі прадстаўнікі дэмакратычнай часткі польскай грамадскасці і жыхары Каралеўства Польскага,

[737] M. Korzeniowski, M. Mądzik, D. Tarasiuk, *Tułaczy los. Uchodzcy polscy w imperium rosyjskim...*, s. 56.
[738] Ibidem, s. 57.
[739] Ibidem, s. 89.
[740] Ibidem, s. 91.
[741] Ibidem, s. 120–121.

абернецца для літоўскіх і беларускіх палякаў немагчымасцю адстойваць адметныя ад Польшчы інтарэсы Беларусі Літвы.

У сакавіку 1916 г. Вайніловіч прадставіў уласную пазіцыю падчас Менскага з'езда прадстаўнікоў польскіх арганізацый, якую праводзілі прыхільнікі ідэі цэнтралізацыі. Як ён прызнаваўся ва ўспамінах, ягоная крытыка «агульнапольскага ўрада» была вельмі рэзкай і выклікала абурэнне многіх прысутных. У падтрымку публічна выказаўся толькі Раман Скірмунт. Аднак аргументы двух краёўцаў усё ж паўплывалі на настрой з'езду, і падчас галасавання 1/3 яго ўдзельнікаў не падтрымала «маскоўска-польскай канцэпцыі»[742].

Трэба адзначыць, што з'яўленне ў Менску шматлікіх прадстаўнікоў варшаўскай інтэлігенцыі і дзеячаў польскіх грамадскіх арганізацый істотна змяніла характар мясцовай польскай супольнасці. Да гэтага моманту ў масавай свядомасці жыхароў Меншчыны панавала перакананне ў тоеснасці «паляка» і землеўласніка. І сапраўды, тыя, хто не хаваў сваёй польскасці, звычайна належалі да сацыяльных вярхоў мясцовай грамадскасці. Між тым, сярод польскіх бежанцаў дамінавалі сяляне і рабочыя, а таксама прадстаўнікі інтэлігенцыі.

Для Эдварда Вайніловіча была непрымальнай арыентацыя большасці прышлых палякаў на агульнапольскія нацыянальныя інтарэсы. Іншай характэрнай рысай новай польскай супольнасці была перавага прыхільнікаў дэмакратычнай арыентацыі. А для варшаўскіх бежанцаў нечаканасцю быў выразны кансерватызм мясцовай польскай грамадскасці, арыентацыя яе значнай часткі на каштоўнасці часоў Рэчы Паспалітай абодвух народаў, а таксама на краёвую ідэалогію.

Дзеяч польскай эндэцыі Уладзіслаў Глінка, які ў гэты час знаходзіўся ў Менску, пазней у сваіх мемуарах з абурэннем пісаў, што польскія землеўласнікі ў Беларусі дабраахвотна адмаўляліся на карысць беларусаў ад палітычнага дамінавання і лідэрства. Пры гэтым беларусы характарызаваліся ім як «дзікі» і «варварскі народ»[743].

Відавочна, што бежанцы з Каралеўства Польскага, якія спыніліся на беларускіх землях, не разумелі спецыфікі мясцовых нацыянальных і сацыяльных адносін. Для іх гэта былі толькі «ўсходнія крэсы». Пра складанасць стасункаў паміж дзеячамі з Польшчы і элітай польскай грамадскасці Меншчыны таксама сведчаць успаміны Мячыслава Пароўскага, які, у прыватнасці, абвінавачваў Адольфа Сьвіду ў імкненні павучаць мясцовых дзеячаў[744].

У сутыкненні з «кароннай» Польшчай Раман Скірмунт заўсёды падтрымліваў Вайніловіча. Яны выдатна разумелі адзін аднаго, і нават пэўныя разыходжанні ў трактоўцы краёвай ідэі, якія праявіліся падчас стварэння Краёвай партыі

---

[742] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 195.

[743] Цытата паводле: M. Korzeniowski, M. Mądzik, D. Tarasiuk, *Tułaczy los. Uchodzcy polscy w imperium rosyjskim...*, s. 190.

[744] ZNiO. Dział rękopisow. Sygn. 13542/II. M. Porowski, *Wspomnienia.1904–1918*, k. 102.

Літвы і Беларусі (1907), а таксама ў адносінах да беларускага руху, прынцыпова не паўплывалі на іх супрацоўніцтва і сяброўства. Найбольш яскрава яно праяўлялася ў сумеснай працы ў МТСГ. Раман Скірмунт як віцэ-старшыня ў 1907–1917 гг. заўсёды падтрымліваў канцэпцыю дзейнасці Таварыства, выпрацаваную Вайніловічам.

Дарэчы, увосень 1915 г. стала відавочнай надзвычай складаная гаспадарчая сітуацыя Менскай губ. і змрочныя перспектывы катастрофы з харчаваннем, у першую чаргу для гарадского насельніцтва губерні і асабліва жыхароў Менска. Сітуацыю пагаршалі бежанцы, сотні тысяч якіх рухаліся дарогамі Менскай губ., а таксама акупацыя нямецкімі войскамі часткі яе тэрыторыі і пераўтварэнне іншай часткі ў прыфрантавую зону. Колькасць насельніцтва Менска дасягала 200 тыс. чал. пры адначасным змяншэнні колькасці пастаяннага даваеннага насельніцтва з 110 тыс. да 50 тыс.[745] Гэты «прышлы элемент» надзвычай ускладняў жыццядзейнасць мясцовага насельніцтва і актуалізаваў праблему харчавання.

Напрыканцы 1915 г. на агульным сходзе МТСГ абмяркоўвалася праблема кампенсацый тых страт, якія панесла веска ў выніку руху бежанцаў, а таксама падчас вайсковых рэквізіцый. Была створана Ліквідацыйная камісія, якая павінна была дапамагаць пацярпелым у атрыманні годнай кампенсацыі. У яе склад увайшлі Раман Скірмунт, Ежы Чапскі, Стэфан Ваньковіч, Адольф Сьвіда, Эдмунд Івашкевіч ды інш.

Прысутнасць на сходзе бежанцаў з Каралеўства Польскага парушыла адносна спакойны ход дыскусіі. А. Сьвіда выступіў з шэрагам абвінавачванняў у адрас кіраўніцтва МТСГ. Ён казаў пра экстэнсіўны характар земляробства ў губерні, адсутнасць іпатэкі, нежаданне мясцовых землеўласнікаў аблегчыць клопаты мясцовага люду, абмежаванасць земскага самакіравання, бяспраўны стан польскай мовы ды інш. Цікава, што нават аўтар інфармацыі пра гэты сход, змешчанай на старонках «Новага Кур'ера Літэўскага», не ўтрымаўся ад заўвагі, што прамоўца зусім не ведае ўмоў, у якіх існуе і дзейнічае мясцовая польская супольнасць[746].

Наступны агульны сход Таварыства, які меў справаздачна-выбарчы характар, адбыўся ў сакавіку 1916 г. Заканчвалася чарговая трохгадовая кадэнцыя кіраўнікоў МТСГ і ягонай Рады. Але напачатку схода зноў абмяркоўвалася праблема бежанцаў, менавіта іх працаўладкавання. Выступоўцы вельмі крытычна ацанілі магчымасці выкарыстання бежанцаў як працоўнай сілы і паставілі пытанне пра мэтазгоднасць пасяўных прац. Скірмунт у сваім выступленні заклікаў калег быць спагадлівымі да бежанцаў, бо «кожны з іх думае пра ўласны пакінуты дом, пра ўласную гаспадарку». Што да пытання пра мэтазгоднасць пасяўной, ён

[745] *Гісторыя Беларусі ў шасці тамах*. Том 4, с. 445.

[746] «Nowy Kurier Litewski». 1915, Nr 92.

быў катэгарычны: «Мы павінны сеяць. Гэта наш абавязак, наш доўг як доўг салдата – заставацца на сваім пасту да апошняй магчымасці»[747].

Чарговы раз Скірмунт казаў пра важны і адказны «пост», які нельга пакідаць. Відавочна, што вобраз салдата, які абараняе даручаны яму пост, адлюстроўваў ягоны жыццёвы прынцып.

Са справаздачай на сходзе выступіў Эдвард Вайніловіч, які, між іншым, паведаміў, што дакументы на прызнанне польскай мовы як афіцыйнай у дзейнасці МТСГ даўно накіраваны цэнтральным уладам, а ў апошнія дні ён сустракаўся ў Петраградзе з кіраўнікамі польскіх колаў у Дзяржаўнай Думе і Дзяржаўнай Радзе. Яны абяцалі сваю дапамогу, але прасілі пачакаць, бо спадзяюцца адмены ў бліжэйшы час ўсіх антыпольскіх абмежаванняў[748]. Выбары, дарэчы, прайшлі паспяхова для старога кіраўніцтва. Вайніловіч ізноў быў абраны на пасаду старшыні, а Раман Скірмунт захаваў пасаду віцэ-старшыні.

Актуальныя пытанні гаспадарчага жыцця Меншчыны таксама разглядаліся на сходах Менскага губернскага земства. Так, удзельнікі V сходу, які адбыўся на пачатку лютага 1916 г., засяродзілі сваю ўвагу менавіта на эканамічнай сітуацыі ў губерні і пагаршэнні матэрыяльнага дабрабыту яе насельніцтва. Наступствы з'яўлення бежанцаў, якія адыходзілі разам са сваім «жывым інвентаром», характарызаваліся як стыхійнае бедства.

Земцы канстатавалі, што ўлада фактычна ўхілілася ад вырашэння надзённых пытанняў побыту бежанцаў. Між тым, рэзка абвастрылася праблема харчавання і фуража. Не менш актуальным было таксама пытанне кампенсацыі за рэквізіцыі племянной скаціны і вырубку лесу дзеля патрэб войска.

Сход пастанавіў звярнуцца да вайсковых уладаў з запытам наконт атрымання пазыкі ў памеры 880 тыс. руб. дзеля арганізацыі дапамогі бежанцам. Было прынята рашэнне аб стварэнні павятовых Камісій па харчаванні, а таксама па нарыхтоўцы насення для пасяўной 1916 г. Напрыканцы сходу была створана Эвакуацыйная камісія па арганізацыі і каардынацыі дапамогі насельніцтву, у склад якой увайшлі Р. Скірмунт, Э. Вайніловіч, Ю. Свянціцкі, К. Дзямідэцкі-Дзямідовіч, граф Густаў Эмэрык Чапскі[749].

Скірмунт, як прадстаўнік Пінскага пав., таксама быў абраны ў губернскую Камісію па паліву і ў Камісію па выпрацоўцы «лясной таксы». У апошнім выпадку гаворка ішла пра памеры кампенсацыі, якую павінны былі атрымаць уладальнікі лесу за страты «по военных обстоятельствах». Па выніках абмеркавання сход абраў Рамана Скірмунта сваім паўнамоцным прадстаўніком на нарадзе ў Стаўцы

---

[747] *Журнал общего собрания Минского сельскохозяйственного общества. Мартовские собрания.* Минск 1916, с. 18.

[748] «Nowy Kurier Litewski». 1916, Nr 71.

[749] *Журналы Пятого очередного Минского губернского земского собрания. Сессия 1–7 февраля 1916 г.* Минск 1916, с. 74.

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, прысвечанай пытанню кампенсацыі страт, выкліканых вайной. У апошні дзень працы сходу Скірмунта таксама абралі ў склад Рэвізійнай камісіі.

Гэты сход паказаў, што ва ўмовах набліжэння фронту і з'яўлення шэрагу новых «выклікаў», якімі былі праблема бежанцаў з усімі выцякаючымі наступствамі, праблема харчавання, кампенсацыі страт прыватных гаспадарак і г. д. роля Рамана Скірмунта ў дзейнасці земства яшчэ больш вырасла.

Аднак у матэрыялах наступных чарговых і надзвычайных сходаў губернскага земства імя Рамана Скірмунта ўжо не фігуравала. Падобна на тое, што ён цалкам засяродзіўся на новых для сябе абавязках Упаўнаважанага Асобнай нарады па харчовых мерапрыемствах і кіраўніка губернскай Харчовай камісіі.

Асобная нарада па харчовай справе была створана па ініцыятыве ваеннага міністра Паліванава ў жніўні 1915 г. Яе галоўнымі задачамі былі забеспячэнне арміі прадуктамі харчавання і фуражом, а таксама барацьба з ростам цэн на прадукты. Урад змагаўся з дэзарганізацыяй вытворчасці і гандлю шляхам бюракратычнага рэгулявання.

Дзеля вырашэння пастаўленых задач старшыня Асобнай нарады (міністр земляробства) атрымаў даволі шырокія паўнамоцтвы. Фактычна, ён кіраваў усёй «харчовай справай» Расіі па-за тэатрам ваенных дзеянняў. Праз сваіх упаўнаважаных, губернатараў ды інш. набываў харчаванне і фураж для насельніцтва, рэгуляваў гандаль і цэны, меў права рэквізіцый і канфіскацый, прызначэння «цвёрдых» цэн або ўстанаўлення г. зв. «таксы».

На месцах былі створаны інстытуты упаўнаважаных Старшыні Асобнай нарады, якія з'яўляліся галоўнымі выканаўчымі органамі. Пра значэнне гэтага органа сведчыць ужо той факт, што з агульнай колькасці 67 упаўнаважаных 35 былі губернатарамі, 18 узначальвалі губернскія земствы, 8 былі членамі Дзяржаўнай Рады або Дзяржаўнай Думы, яшчэ чацвёра займалі пасаду граданачальнікаў[750].

У Менскай губ. пасаду Упаўнаважанага «Асобнай нарады для абмеркавання і аб'яднання мерапрыемстваў па харчовай справе ў Менскай губ, а таксама ў Вілейскім і Ашмянскім пав. Віленскай губ.» займаў старшыня Менскай губернскай земскай управы Самойленка. Ягоным намеснікам быў Раман Скірмунт.

Першыя знойдзеныя распараджэнні Упаўнаважанага, датаваныя снежнем 1915 г., былі падпісаны Самойленкам. Але, пачынаючы са студзеня 1916 г., абавязкі Упаўнаважанага выконваў ужо Скірмунт. З гэтага часу і да лютаўскіх падзей рэвалюцыі 1917 г. менавіта ён заставаўся рэальным Упаўнаважаным, бо Самойленка быў заняты іншымі важнымі абавязкамі. На афіцыйных бланках

---

[750] Н. Кондратьев, *Рынок хлебов и его регулирование во время войны и революции. 1914–1919*. Москва 1991. Рэжым доступу: http://istmat.info/node/25336. Дата доступу: 26. 12. 2015.

Упаўнаважанага, падпісаных Скірмунтам, перад пасадай стаіць нахіленая лінія або ўстаўлены злучнік «за».

Да ягоных абавязкаў належала высвятленне колькасці прадуктаў, неабходных для забеспячэння патрэб мясцовага насельніцтва, веданне рынку, дастаўка прадметаў першай неабходнасці, стварэнне на месцы запасаў харчавання, у выпадку неабходнасці размеркаванне гэтых запасаў ды інш. Дзеля гэтага Упаўнаважаны меў права звяртацца да мясцовых дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый і прыватных асоб, хадайнічаць перад Старшынём Асобнай нарады па пытаннях рэквізіцыі скаціны, харчавання і фуража, забароны іх вывазу па-за межы губерні, заняцця памяшканняў для захоўвання прадуктаў ды інш. Дарадчы характар Асобнай нарады, а таксама шматлікія бюракратычныя перашкоды істотна зніжалі эфектыўнасць многіх рашэнняў Упаўнаважанага. Фактычна, і ён, і Губернская харчовая камісія маглі абаперціся толькі на тыя фінансы, якія выдзяляліся дзяржавай для іх дзейнасці, а таксама на прадастаўленыя вагоны дзеля дастаўкі неабходных для жыццядзейнасці грузаў. Пастаянна ўзнікалі праблемы, якія даводзілася вырашаць шляхам вялікіх асабістых намаганняў.

Дакументы архіўных фондаў Земгора, Менскага губернскага земства, Упаўнаважанага Старшыні Асобнай нарады і Менскай губернскай харчовай камісіі, якія захаваліся ў сховішчах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Менску, сведчаць, што са студзеня 1916 г. менавіта Скірмунт займаўся каардынацыяй дзейнасці па забеспячэнні харчаваннем насельніцтва Менскай губ., а з лета 1916 г. таксама і неакупаваных частак Віленскай губ. (Вілейскі і Ашмянскі пав.). Гэта, безумоўна, сведчыла як пра эфектыўнасць ягонай працы, так і пра той вялізны аўтарытэт, што ён здабыў ранейшай грамадскай і гаспадарчай дзейнасцю на Меншчыне. Гэта быў чарговы адказны «пост» грамадзяніна Краю Рамана Скірмунта. Дарэчы, гэтую ж дзейнасць ён працягваў і пасля пачатку Расійскай рэвалюцыі. Толькі захоп улады партыяй бальшавікоў у кастрычніку 1917 г. перапыніў ягоную працу па прадухіленні голада ў Менску і губерні.

Самы ранні знойдзены ў архіве ліст за подпісам Р. Скірмунта як Упаўнаважанага датаваны 16 студзеня 1916 г. У гэты дзень ён звярнуўся з запытам да кіраўніцтва Лібава-Роменскай чыгункі, каб даведацца, на якіх чыгуначных станцыях Менскай губ. прадуктовыя склады і пакгаузы запоўнены прадуктамі? Паколькі адказ затрымліваўся, праз 10 дзён быў накіраваны паўторны ліст з просьбай прыслаць патрэбную інфармацыю[751].

Сярод захаваных перапіскі фігуруе, напрыклад, адпраўка селядцоў з Астрахані для насельніцтва Навагрудскага і Менскага пав., дастаўка вагонаў калёснай мазі з Харкава, адпраўка вагонаў пшанічнай і жытняй мукі, вотруб'я са станцыі Умань ды інш.

Скірмунт пісаў лісты, высылаў тэлеграмы з пазнакай «по военным обстоятель-

[751] НГАБ. Ф. 1170, воп. 1, спр. 3, арк. 16.

ствам», а таксама дакументы на пагрузку прадуктаў і іх дастаўку ў Менск, выязджаў у камандзіроўкі, каб на месцы вырашаць найбольш складаныя пытанні і г. д.[752] Пра ягоную актыўнасць, між іншым, сведчыць тое, што тэлеграма, адпраўленая па адрасе: «г. Минск, Скирмунту», знайшла адрасата[753].



Запіска Р. Скірмунта як упаўнаважанага Асобнай нарады па харчовай справе (1916).

Упаўнаважаны таксама займаўся рэквізіцыямі прадуктаў, якія належалі прыватным гандлярам і маглі быць выкарыстаны ў спекулятыўных мэтах. Рэквізаваныя прадукты па ягоным загадзе накіроўваліся павятовым земствам, якія мелі найбольшую патрэбу. Праўда, працэдура была даволі складанай, бо спачатку трэба было атрымаць дазвол Старшыні Асобнай нарады. Затрымка з дазволам стварала магчымасці для гандляроў пазбегнуць рэквізіцый. Даведаўшыся пра існуючую пагрозу, яны імкнуліся як найхутчэй прадаць прадукты, дамаўляліся з кіраўніцтвам чыгункі, каб тая не спяшалася адпраўляць іх грузы паводле распараджэнняў Упаўнаважанага. У красавіку 1916 г. на «рэквізіцыйных» тэлеграмах Скірмунта з'явіўся пагрозлівы надпіс: «За всякое промедление начальник станции несет полную ответственность»[754]. Таксама здараліся выпадкі, калі земствы перадавалі атрыманыя прадукты іншым прыватным гандлярам.

Але Скірмунт не здаваўся. Дзеля барацьбы са спекуляцыяй ён прапанаваў праводзіць рэквізіцыю «залежалых» прадуктовых грузаў без папярэдняга хадайнічання. Дазвол Старшыні Асобнай нарады быў атрыманы. Ён распаўсюджваўся на Лібава-Роменскую і Александраўскую чыгункі[755]. Раман Скірмунт актыўна ім карыстаўся. Так, «дзеля патрэб насельніцтва» ў маі 1916 г. былі рэквізаваны два вагоны пшанічнай мукі на станцыі Рудэнск, у ліпені – тры вагоны

[752] НГАБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 982, арк. 21, 48, 52–53, 58, 68, 70, 161, 360 ды інш.
[753] Тамсама, арк. 87.
[754] Тамсама. Ф. 1170, воп. 1, спр. 3. арк. 83.
[755] Тамсама, арк. 13–13 адв.

цукру на ст. Гарынь, у лістападзе – два вагоны пшанічнай мукі на ст. Барысаў[756] ды інш. Гандляры атрымлівалі кампенсацыю паводле «цвёрдых» цэн.

Пры гэтым Упаўнаважаны Скірмунт выдатна разумеў важнасць прыватнай ініцыятывы ў забеспячэнні насельніцтва харчаваннем. Так, у студзені 1917 г. ён выказваў занепакоенасць, што змяншэнне колькасці вагонаў, якія паступалі ў распараджэнне Упаўнаважанага, пагражае дзейнасці якраз прыватных гандляроў[757].

Пры ўдзеле Упаўнаважанага, а таксама губернскага земства ў лістападзе 1915 г. была створана Губернская харчовая камісія ў складзе сяброў губернскай земскай управы, прадстаўнікоў павятовых земстваў, Упаўнаважанага Асобнай нарады ды інш. Яна таксама з'яўлялася дарадчай установай, галоўнай задачай якой было забеспячэнне насельніцтва Менскай губ. харчаваннем, закупка прадуктаў, іх размеркаванне паміж паветамі, а таксама барацьба супраць росту цэн.

Стварэнне Губернскай харчовай камісіі, якая адыграла адну з галоўных роляў у забеспячэнні харчаваннем жыхароў Менска і губерні, сведчыць пра пэўны хаос у «харчовай палітыцы» і адсутнасць адзінай сістэмы органаў забеспячэння прадуктамі харчавання. Аднак у Менскай губ. гэтая праблема не існавала, бо на чале Камісіі стаяў Раман Скірмунт, які адначасна выконваў абавязкі Упаўнаважанага Асобнай нарады. У ягонай асобе адбылося аб'яднанне розных арганізацый, што гарантавала каардынацыю іх дзейнасці.

Камісія працавала як пастаянная, збіраючыся двойчы на тыдзень. Апрача ўласна харчовай, даводзілася вырашаць іншыя праблемы, звязаныя з забеспячэннем жыццядзейнасці цывільнага насельніцтва губерні. Да таго ж, на яе сходах папярэдне абмяркоўваліся пытанні, якія потым разглядаліся на пасяджэннях Мясцовай нарады пры Упаўнаважаным.

З кастрычніка 1916 г. у складзе Харчовай камісіі працаваў славуты беларускі паэт і дзеяч нацыянальнага Адраджэння Максім Багдановіч (1891–1917), які ў гэты час прыехаў у Менск. Ён адразу далучыўся да дзейнасці Менскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны. У Харчовай камісіі Багдановіч знаходзіўся на пасадзе «загадчыка выпрацоўкі такс»[758], г. зн., што ягоная дзейнасць датычыла барацьбы са спекуляцыяй шляхам устанаўлення «цвёрдых» цэн. Адначасна ён выконваў абавязкі сакратара ў Губернскай харчовай камісіі і Мясцовай нарадзе пры Упаўнаважаным.

У студзені 1917 г. сакратар Багдановіч падрыхтаваў Агляд дзейнасці Губернскай харчовай камісіі[759]. У гэтым Аглядзе ён, між іншым, падкрэсліў, што Харчовая

---

[756] Тамсама, арк. 120, 225

[757] Тамсама, спр. 2, арк. 105.

[758] Тамсама, спр. 126, арк. 295.

[759] *Обзор деятельности Минской губернской продовольственной комиссии по 1 января 1917 г.* (у:) М. Багдановіч, *Поўны збор твораў.* Т. III. Рэд. У. М. Конан. Мінск 2001, с. 206–

камісія, як і Мясцовая нарада пры Упаўнаважаным, з'яўляліся дарадчымі ўстановамі, адпаведна, іх рашэнні не былі абавязковымі для Упаўнаважанага. Аднак, як адзначаў Багдановіч, не было аніводнага выпадку, каб Скірмунт праігнараваў іх пазіцыю і пастановы[760].

Максім Багдановіч адзначыў намаганні Камісіі па арганізацыі сеткі складоў і яе імкненне абаперціся на гандляроў, якія мелі фінансавую зацікаўленасць і знаходзіліся пад кантролем Камісіі. Таксама згадвалася супрацоўніцтва з мясцовымі кааператывамі, якія атрымлівалі пэўныя ільготы, у т. л. звязаныя з перавозкай прадуктаў па чыгунцы ды інш. Паводле Багдановіча, Скірмунт актыўна падтрымліваў гэтае супрацоўніцтва, якое, аднак, не было плённым па прычыне нізкага ўзроўню развіцця кааперацыі ў губерні.

Першапачаткова сродкі, якія магла выкарыстаць Харчовая камісія, складаліся з 800 тыс. руб. займу, які выдзяліла Ваеннае міністэрства, а таксама 900 тыс. руб., атрыманых губернскім земствам ад Міністэрства ўнутраных спраў на забеспячэнне патрэб у фуражу для скаціны і свойскай жывёлы. Гэтыя грошы таксама былі перададзены Харчовай камісіі. Аднак ужо ў сакавіку 1916 г. Ваеннае міністэрства запатрабавала вяртання сродкаў, частка з якіх ужо была выкарыстана. Давялося паўторна звяртацца да Міністэрства унутраных спраў, якое, аднак, з запрошаных 800 тыс. руб. знайшло магчымасць вылучыць толькі 400 тыс. тэрмінам на 9 месяцаў.

Багдановіч, які дэталёва ахарактарызаваў фінансавую сітуацыю Харчовай камісіі, адразу заўважыў, што нават гэтыя «сціплыя сродкі» часта было складана выкарыстаць з прычыны шматлікіх перашкод, што ўзнікалі падчас набыцця і дастаўкі прадуктаў.

Пры гэтым галоўныя праблемы былі звязаны з забаронамі вывазу прадуктаў па-за межы пэўных рэгіёнаў і дэзарганізацыяй працы чыгуначнага транспарту. На пасяджэнні Камісіі 18 сакавіка 1916 г. было вырашана хадайнічаць перад кіраўніцтвам Асобнай нарады па харчаванні наконт вызвалення закупак Менскай губернскай харчовай камісіі ад забарон на вываз. Аднак хадайніцтва было адхілена.

Між тым, існуючыя забароны парушалі нават планавыя пастаўкі харчавання з запасаў самой Асобнай нарады. Так, даволі доўга ішла перапіска наконт атрымання з Херсонскай губ. запланаваных для Меншчыны на лістапад-снежань 1916 г. 500 тыс. пудоў жыта. Упаўнаважаны Асобнай нарады па харчаванні Херсонскай губ. гофмайстар Гербель катэгарычна адмовіўся выканаць гэтыя

231. У 1917 г. «Обзор» быў выдадзены ў выглядзе брашуры. Аўтар не быў пазначаны. Аўтарства М. Багдановіча ўстанавіў беларускі даследчык Віталь Скалабан у артыкуле «В это суровое и важное время: Максим Багданович в Минске» («Неман». 1981, № 12).

760 *Обзор деятельности Минской губернской продовольственной комиссии...*, с. 211. У тэксце апублікаванага Агляду відавочная памылка. Так, замест слоў: «и вошёл в комиссию с постановлениями» трэба чытаць: «и вошёл в конфликт с постановлениями».

пастаўкі. Умяшальніцтва Петраграда нічога не змяніла. Толькі шляхам асабістых намаганняў аднаго з «агентаў» Менскай харчовай камісіі, камандзіраваных на поўдзень, з Херсонскай губ. у Менск было адпраўлена 50 тыс. пудоў жыта[761]. Зразумела, што падобнае вырашэнне праблемы паставак перакрэслівала ўсе спробы планавай дзейнасці.

Наогул, з пачаткам зімы 1916 г. сітуацыя з забеспячэннем гарадскога насельніцтва хлебам рэзка пагоршылася. 3 снежня на пасяджэнні Мясцовай нарады пры Упаўнаважаным К. Гардзялкоўскі назваў сітуацыю з пастаўкамі мукі ў горад «катастрафічнай», бо пры штомесячнай патрэбе ў 200 вагонаў мукі ў снежні горад павінен быў атрымаць толькі 6 вагонаў. Скірмунт распавёў пра намаганні ў забеспячэнні губерні хлебам, назваў «марудныміі» дзеянні менскага гарадскога самакіравання і звярнуў асаблівую ўвагу на транспартную праблему і адсутнасць каардынацыі ў дзеяннях цывільных і вайсковых уладаў: «Нам даюць хлеб там, дзе няма вагонаў, а там, дзе ёсць вагоны, вываз хлеба забаронены».

Было вырашана тэрмінова звярнуцца да кіраўніцтва вайсковага забеспячэння дзеля вырашэння транспартнай праблемы і атрымання займу ў 700 тыс. руб.[762]. Намаганні прынеслі плён. 20 снежня 1916 г. на пасяджэнні Мясцовай нарады Скірмунт заявіў, што насельніцтва губерні забяспечана жытняй мукой. Атрымалася арганізаваць яе пастаўкі з Херсонскай, Таўрычаскай і Кіеўскай губ.[763]

Даволі часта Харчовая камісія сутыкалася таксама з праблемай адсутнасці вагонаў для дастаўкі закупленых прадуктаў. Да таго ж, планавая колькасць вагонаў на працягу 1916 г. штомесяц змяняпалася. Узнікалі праблемы нават з пастаўкамі прадуктаў з дзяржаўных запасаў, дзе, як здавалася, ужо ніякі гофмайстар не мог чыніць перашкод. Напрыклад, надзвычай складаным аказалася забяспячыць насельніцтва губерні танным цукрам. Дарэчы, прыватныя гандляры знаходзілі яго без асаблівых праблем і прадавалі па завышаных цэнах. Толькі ўвосень 1916 г. намаганні Камісіі далі пазітыўны эфект. Вялікую ролю ў гэтым адыграла паездка Рамана Скірмунта і Канстанціна Гардзялкоўскага ў Кіеў і ўвядзенне пасады адмысловага «агента» для нагляду за пастаўкамі цукру з Украіны.

Цалкам іншая праблема ўзнікла з пастаўкамі семяннога аўса. Харчовы аддзел МУС адправіў у Менскую губ. значна больш аўса, чым было патрэбна. У выніку на станцыях Рэчыца і Хойнікі сабралася да 300 вагонаў ізлішкаў семяннога аўса[764].

Усе гэтыя ды іншыя праблемы павінен быў вырашаць Раман Скірмунт як кіраўнік Харчовай камісіі і фактычны Упаўнаважаны Асобнай нарады па харчовых справах. Безумоўна, без стварэння сеткі вопытных супрацоўнікаў яны былі

---

[761] Тамсама, с. 218.

[762] НГАБ. Ф. 1170, воп. 1, спр. 2, арк. 46–48.

[763] Тамсама, арк. 87–91.

[764] *Обзор деятельности Минской губернской продовольственной комиссии...*, с. 216–217.

невырашальнымі. Такія кадры знайшліся. Багдановіч прыгадваў актыўную дзейнасць агранома Некляпаева, А. К. Гаворкі, А. А. Гутаровіча, Канстанцінаўскага, прысяжнага павераного Паніквіцкага ды інш.[765] Іх праца ў сукупнасці з энергіяй і ініцыятывай Скірмунта дазваляла Харчовай камісіі вырашаць самыя складаныя задачы.

Максім Багдановіч у згаданым Аглядзе падкрэсліў, што на 1 студзеня 1917 г. грашовыя сродкі Харчовай камісіі пракруціліся амаль 4 разы (!). І гэта ў сітуацыі, калі часта даводзілася ствараць запасы харчу і стрымлівацца ад хуткага яго продажу. Найбольшыя сумы пайшлі на набыццё цукру, жытняй і пшанічнай мукі, а таксама крупаў, рыбы, алею і сала. Таксама вялікія сродкі вылучаліся на набыццё фуража ды іншых кармоў[766].

Значнае месца ў дзейнасці Упаўнаважанага Асобнай нарады і кіраўніка Харчовай камісіі займала барацьба з ростам цэн. Калі не зрываліся пастаўкі, то цэны атрымлівалася «збіваць», выпускаючы на рынак буйныя партыі прадуктаў па нізкіх цэнах. У сітуацыі дэфіцыту даводзілася ўводзіць «цвёрдыя» цэны («издание такс»).

Непасрэднае дачыненне да цэнаўтварэння меў Максім Багдановіч. Працэдура выглядала наступным чынам: спачатку цэны абмяркоўваліся на пасяджэнні Харчовай камісіі, потым – у Мясцовай нарадзе пры Упаўнаважаным, а пасля адабрэння накіроўваліся на зацвярджэнне губернатару. Упершыню праблема «таксы» паўстала ў маі 1916 г. Зыходнай пазіцыяй былі праекты мясцовага земскага і гарадскога самакіравання. У абмеркаванні таксама ўдзельнічалі спецыялісты па вытворчасці таго або іншага «прадукта» і прадстаўнікі мясцовасцяў, дзе планавалася ўвядзенне «цвёрдых» цэнаў. Улічваліся сабекошт прадукцыі, кошт выдаткаў на транспарціроўку тавараў і прадуктаў, звычайны адсотак гандлёвага прыбытку ды інш. Усё, што гандляры маглі атрымаць звыш устаноўленай «таксы» лічылася спекулятыўным прыбыткам.

У выніку шэрагу пасяджэнняў са жніўня па кастрычнік 1916 г. былі ўстаноўлены «цвёрдыя» цэны на большасць прадуктаў і тавараў першай неабходнасці на тэрыторыі ўсёй губерні. Асабліва старанна выпрацоўвалася «такса» на жыта. Захаваныя журналы Мясцовай нарады пры Упаўнаважаным па харчаванні Менскай губ. сведчаць пра актыўную ролю Скірмунта ў правядзенні цэнавай палітыкі. Так, галоўным пытаннем пасяджэння 8 жніўня 1916 г. было ўстанаўленне «цвёрдых» цэн на жыта, авёс і ячмень. Агранамічная секцыя МТСГ прапанавала максімальную цану за 1 пуд жыта ў памеры 1,75 руб. Улады Менска настойвалі на 1,50 руб. Пасля гарачай дыскусіі ўдзельнікі пасяджэння пагадзіліся на 1,65 руб. Цана 1 пуда аўса была ўстаноўлена ў памеры 2,00 руб., а пуд ячменю каштаваў –

[765] Тамсама, с. 219.

[766] Тамсама, с. 219–227.

1,60 руб. Трэба адзначыць, што падчас дыскусіі Скірмунт прапанаваў уласны варыянт цаны, які ў выпадку жыта на 1 капейку перавышаў прапанову МТСГ.

Прадстаўнік менскіх уладаў таксама прапанаваў павысіць «цвёрдую» цану на муку, што павінна было, на яго думку, спрыяць павялічэнню запасаў мукі ў горадзе. Скірмунт не пагадзіўся і прапанаваў пачакаць 10 дзён, каб стабілізаваўся рынак пасля прынятых рашэнняў. Удзельнікі нарады прынялі яго прапанову[767]. Дарэчы, Пінскі пав. на гэтым пасяджэнні прадстаўляў падпалкоўнік Е. Асмалоўскі, які ў 1919 г. будзе прызначаны Пілсудскім на пасаду Генеральнага камісара Усходніх земляў. Важна адзначыць, што нягледзячы на выразныя сімпатыі да сацыял-дэмакратаў, ён падтрымліваў блізкія адносіны з Раманам Скірмунтам.

На пасяджэнні Мясцовай нарады пры Упаўнаважаным 15 лістапада 1916 г. абмяркоўвалася сітуацыя з забеспячэннем менскага насельніцтва дровамі. Сябра Харчовай камісіі М. Доўнар-Запольскі (не блытаць з вядомым гісторыкам!) прэзентаваў пазіцыю Камісіі, якая прапанавала ўзняць цану за нарыхтоўку, перавоз і ўкладку 1 м^3 дроў да 24 руб. Таксама менскія ўлады збіраліся ўзняць «цвёрдыя» цэны на розныя гатункі мяса. Скірмунт быў супраць. Ён нагадаў, што, калі зацвярджаліся існуючыя цэны, прадстаўнікі Менска заяўлялі, што яны не зменяцца на працягу ўсёй зімы. Таксама, на думку Скірмунта, павышэнне цаны на дровы не можа гарантаваць адсутнасці «дравянога голаду». У выніку галасавання прапанова Харчовай камісіі была адхілена[768].

Аднак, паводле прызнання самога «загадчыка выпрацоўкі такс» Багдановіча, «цвёрдыя» цэны не апраўдвалі надзей. Асноўнай прычынай была адсутнасць у Харчовай камісіі і Упаўнаважанага дастатковага запасу прадуктаў, на якія ўстанаўлівалася «такса». Без гэтага «цвёрдыя» цэны абарочваліся знікненнем некаторых тавараў/прадуктаў і наступнага іх продажу ўжо па спекулятыўных цэнах. Да таго ж пры фарміраванні «таксы» даводзілася арыентавацца на афіцыйныя дадзеныя цэны транспарціроўкі ды інш. Насамрэч, гандляры часта былі вымушаны набываць прадукты і перавозіць іх са значнай надбаўкай.

Скірмунт спрабаваў выкарыстаць таксама іншыя сродкі ў барацьбе з дарагавізнай, аднак губернатар не падтрымаў яго хадайніцтва пра забарону вывозіць пэўныя віды прадукты па-за межы Менскай губ., а магчымасці рэквізіцый, якімі валодаў Упаўнаважаны, як ужо згадвалася, былі моцна абмежаваны[769].

Запісы журналаў Менскай губернскай харчовай камісіі за студзень-люты 1917 г. сведчаць пра складанасць сітуацыі з забеспячэннем насельніцтва Менскай губ. харчам і пра вялікія намаганні сяброў Камісіі. Так, напрыклад, на пасяджэнні 20 студзеня Скірмунт казаў пра надзвычай складаную сітуацыю з забеспячэннем

---

[767] Тамсама, спр. 1, арк. 3–5.

[768] Тамсама, спр. 2, арк. 1–3.

[769] *Обзор деятельности Минской губернской продовольственной комиссии...*, с. 228–230.

вагонамі[770]. Пасяджэнне 31 студзеня ўпершыню вёў Самойленка. Ягонае з'яўленне было абумоўлена падрыхтоўкай да прыезду ў Менск міністра земляробства, якому неабходна было прадставіць поўную карціну патрэб губерні ў харчаванні[771]. 3 лютага Скірмунт узняў праблему забеспячэння губерні хлебам, бо Курская і Кіеўская губ. сарвалі планаваныя пастаўкі мукі[772]. 21 лютага гаворка ішла пра адсутнасць плана чыгуначных перавозак на сакавік[773] і г. д.

У гэты ж дзень разглядалася прашэнне сакратара Камісіі Максіма Багдановіча пра адпачынак дзеля выздараўлення і пра адпаведную фінансавую дапамогу. Сакратар Камісіі атрымаў двухмесячны адпачынак з захаваннем зарплаты і яшчэ 200 руб. на лячэнне[774]. Максім Багдановіч паехаў у Ялту, адкуль ужо не вярнуўся…

Апошняе пасяджэнне Губернскай харчовай камісіі адбылося 1 сакавіка. Галоўным пытаннем быў разгляд хадайніцтва гарадскіх уладаў Слуцка і Бабруйска пра павышэнне цэн на ўсе хлебныя прадукты. Хадайніцтва было адхілена. Скірмунт лічыў непажаданым змяняць умовы жыцця ў асобных гарадах Менскай губ. Ён заявіў пра неабходнасць «прыкладаць усе намаганні дзеля сумеснай працы гарадскіх і павятовых земскіх управаў»[775].

Гэтае імкненне да супольных намаганняў, да пэўнага яднання ў агульнай справе было характэрным для усёй дзейнасці Рамана Скірмунта, якой бы галіны яна не датычыла.

Польская супольнасць Менска

Разам з наплывам бежанцаў з Каралеўства Польскага знікла ранейшае адзінства польскай супольнасці Меншчыны. Вайніловіч і Скірмунт па-ранейшаму карысталіся вялікім аўтарытэтам, але ўсё часцей на першы план выходзілі іншыя людзі. Іх погляды адлюстроўваліся на старонках штодзённай польскай газеты «Новы Кур'ер Літэўскі», якая пачала выходзіць у Менску ў жніўні 1915 г. Ініцыятарам выдання быў вядомы прадстаўнік ПДНП Юзаф Хласка, а рэдактарам і выдаўцом – Казімір Прухнік.

Ва ўступным рэдакцыйным артыкуле першага нумара газеты абвяшчалася, што яна з'яўляецца пераемніцай віленскага «Кур'ера Літэўскага». Рэдакцыя выказвала надзею, што палякаў з'яднаюць агульнанацыянальныя інтарэсы: «Будучыня нацыі, умовы яе далейшага існавання – гэта праблема, дзеля вырашэння якой кожны з нас гатовы забыць пра асабістыя цяжкасці [...]».

Змешчаны ў гэтым жа нумары Зварот з'езду польскіх таварыстваў дапамогі

---

[770] НГАБ. Ф. 137, воп. 1, спр. 36, арк. 6.
[771] Тамсама, арк. 1.
[772] Тамсама, арк. 15.
[773] Тамсама, арк. 18.
[774] Тамсама, арк. 19.
[775] Тамсама, арк. 22.

ахвярам вайны (Масква, жнівень 1915 г.) патрабаваў кардынальных змен у характары польска-расійскіх адносін. Пазіцыя польскай супольнасці ў стасунку да расійскіх уладаў станавілася ўсё больш патрабавальнай. Апошняе праяўлялася ў рэгулярных паведамленнях пра выступленні дэпутатаў-палякаў у Дзяржаўнай Думе і Дзяржаўнай Радзе, у якіх ўздымалася пытанне пра адмену ўсіх антыпольскіх абмежаванняў[776]. Газета звяртала ўвагу ўладаў на неабходнасць адкрыцця польскіх школ для дзяцей бежанцаў з Каралеўства Польскага[777].

Адначасна Юзаф Хласка выступіў з крытыкай праграмы Прагрэсіўнага блока. Ён адзначыў «адсутнасць яснасці» ў раздзелах, якія датычылі правоў нярускіх народаў імперыі. Адносна палякаў у праграме сцвярджалася неабходнасць ліквідацыі антыпольскіх абмежаванняў і перагляд заканадаўства, што датычыла польскага землеўладання. Для «Новага Кур'ера» гэтага ўжо было недастаткова[778].

Беларускі рух на старонках газеты трактаваўся як «антыпольская інтрыга», арганізаваная спачатку расійскімі ўладамі, а пазней – нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй[779]. Пры гэтым кіраўнікі беларускага руху характарызаваліся як «палякі-перабежчыкі», якія змагаюцца з праявамі польскасці. Погляд «Новага Кур'ера Літэўскага» амаль не адрозніваўся ад віленскага «Кур'ера Літэўскага», які, напрыклад, яшчэ ў кастрычніку 1914 г. абвінавачваў у паланафобіі княгіню Марыю Магдалену Радзівіл[780].

«Новы Кур'ер» разглядаў «польскае пытанне» як агульнапольскую з'яву, не звяртаючы ўвагі на яго асаблівасці ў Беларусі і Літве. Тыповай была рэакцыя на заяву князя Г. Друцкага-Любецкага, выкліканую чуткамі пра магчымасць расійска-германскай сепаратнай мірнай дамовы. Князь пратэставаў супраць верагоднага ў гэтым выпадку падзелу беларускіх земляў. Рэдакцыя суправадзіла змест яго выступлення ўласнай заўвагай, у якой асудзіла праяву «тутэйшага патрыятызму»[781].

Паступова на старонках выдання пачала з'яўляцца інфармацыя пра пэўныя крокі нямецкіх улад насустрач патрабаванням польскай грамадскасці акупаваных земляў[782]. Звычайна гэтыя згадкі суправаджаліся заўвагамі наконт «крыжацкай» небяспекі. У ліпені 1916 г. газета надрукавала заяву расійскага МУС, якая рэзка асуджала тых палякаў, якія «схіляюцца да аўстра-нямецкай пазіцыі»[783]. Ужо ў наступным нумары з'явіўся адказ, напісаны кіраўніком Польскага камітэту ў Маскве А. Лядніцкім. Аўтар звяртаў увагу на тое, што «польскае пытанне» ў расійскай палітыцы стаіць на «мёртвай кропцы». Між тым, даўно наспела не-

[776] «Nowy Kurier Litewski». 1915, Nr 12, 19, 24, 25, 26, 28, 37, 114.
[777] Ibidem. 1915, Nr 38.
[778] Ibidem. 1915, Nr 8.
[779] Ibidem. 1915, Nr 85, 199, 350.
[780] «Kurier Litewski». 1914, Nr 210.
[781] «Nowy Kurier Litewski». 1916, Nr 308.
[782] Ibidem. 1916, Nr 112, 202.
[783] Ibidem. 1916, Nr 186.

абходнасць не толькі зліквідаваць усе абмежаванні, але таксама пацвердзіць «права палякаў на свабоднае нацыянальнае існаванне і эканамічнае адраджэнне, як гэта зрабіла антынямецкая кааліцыя адносна бельгійцаў і сербаў»[784].

Аднак рэакцыя «Новага Кур'ера» на Маніфест ад 5 лістапада 1916 г. была адназначна негатыўнай: «Гэтае новае Каралеўства Польскае, якое павінна ўзнікнуць пад патранатам Германіі, не адпавядае самым сціплым патрабаванням польскай нацыі»[785]. Пры гэтым легіёны асуджаліся як падман польскай моладзі. Газета змясціла таксама пратэсты многіх вядомых палітычных дзеячаў з ліку мясцовых палякаў. Пад адным з іх, напрыклад, стаяў подпіс Іпаліта Корвін-Мілеўскага[786]. Адначасна «Новы Кур'ер Літэўскі» праігнараваў апошнюю спробу віленскіх палітыкаў актуалізаваць краевую ідэю і пад яе сцягам выступіць у абарону тэрытарыяльнай цэласнасці гістарычнай Літвы.


KSIĘGOZBIÓR UMIASTOWSKICH
153
1913

Універсал

Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага.

Лета 1915 мес. Грудня 19 дня члены Літоўскіх, Беларускіх, Польскіх і Жыдоўскіх организацый прыступілі да КОНФЕДЭРАЦЫІ ВЯЛІКАГО КНЯЗЬСТВА ЛІТОЎСКАГО, дабіваючыся супольнымі сіламі, абы Літоўскіе і Беларускіе землі, которые здаўна прыналежалі да ВЯЛІКАГО КНЯЗЬСТВА ЛІТОЎСКАГО, а цяпер апанаваны Нямецкімі войскі, станавілі пры новых варунках гісторычных нераздзельнае цела на фундаменці НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ, ЯК СУЦЭЛЬНАЙ ДЗЯРЖАВЫ, ЗАСЬЦЕРАГАЮЧЫ УСІМ НАЦЫЯМ У ЯЕ МЕЖАХ УСЕ ПРАВЫ.

Дзеля гэтага конфедэраты звяртаюцца да усіх нацый, да усіх станаў, да усіх істнуючых организацый і да усіх грамадзян Краю, клічучы, абы уважаючы на важнасць вялікага гістарычнага моманту, забыўшыся крыўд узаемных, свар і недацёр, часцы на шкоду адно нарыхт супольнае будаўніцтва, прыступіліся да КОНФЕДЭРАЦЫІ ВЯЛІКАГО КНЯЗЬСТВА ЛІТОЎСКАГО.

РАДА ТЫМЧАСОВАЯ

Конфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага.

Універсал Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага (1915).

19 снежня 1915 г. на ідыш, беларускай, польскай і літоўскай мовах у Вільні быў апублікаваны Універсал Часовай Рады Канфедэрацыі ВКЛ. Дакумент паведамляў пра стварэнне літоўска-беларуска-польска-габрэйскай Часовай Рады, якая будзе імкнуцца, каб «Літоўскія і Беларускія землі, якія здаўна прыналежалі да Вялікага Княства Літоўскага, а цяпер апанаваны нямецкімі войскамі, станавілі пры новых варунках гісторычных нераздзельнае цела на фундаменці незалежнасьці Літвы і Беларусі, як суцэльнай дзяржавы, засьцерагаючы усім нацыям у яе межах усе правы»[787].

У лютым 1916 г. Універсал быў дапоўнены зваротам, у якім Рада Канфедэрацыі сваімі галоўнымі задачамі абвяшчала стварэнне на літоўска-беларускіх землях незалежнай дзяржавы з сеймам у Вільні, абраным на падставе ўсеагульных, роўных, прамых і тайных выбараў, і гарантыяй паўнаты праў усім народам Краю.

---

[784] Ibidem. 1916, Nr 187.

[785] Ibidem. 1916, Nr 290.

[786] Ibidem. 1916, Nr 297.

[787] ЛДГА. Ф. 1135, воп. 24, спр. 7, арк. 153.

Тэрыторыя незалежнай дзяржавы павінна была ўключаць Ковенскую і Віленскую губ., беларускую і літоўскую часткі Гарадзенскай і Сувалкаўскай, літоўскія часткі Курляндскай і частку Менскай губ., «каторая звязана з Віленскім цэнтрам». Форму дзяржаўнага ладу і Канстытуцыю «будучай вольнай літоўска-беларускай гасударственнай адзінкі» павінен быў вызначыць і зацвердзіць сейм у Вільні. У заключэнне зварот заклікаў да сумеснай працы дзеля будучыні Краю: «Кіньма сваркі і звадкі, ад каторых церпіць увесь Край. Падумайма разам ды шчыра аб долі гэтага Краю, бо ж усе мы, апрача жмені прыблуд, сыны нашай зямлі – нашай Літвы і Беларусі»[788].

Відавочна, што ідэйнай пляцоўкай супрацоўніцтва краёўцаў-дэмакратаў з дзеячамі літоўскага і беларускага рухаў стаўся ўжо вядомы тэзіс супольнага (краёвага) грамадзянства ў форме гарманічнага міжнацыянальнага сужыцця. Апошняе трактавалася як перадумова аптымальнага развіцця ўсіх народаў гістарычнай Літвы. Краёўцы па-ранейшаму ў нацыянальнай эмансіпацыі літоўцаў і беларусаў бачылі не супрацьпастаўленне, а дапаўненне краёвай свядомасці.

Часовая Рада аб'яднала дзеячаў розных нацыянальных рухаў, а ініцыятыва яе стварэння належала беларусам, у прыватнасці, Івану Луцкевічу. Аднак выпрабавання часам яна не вытрымала. Абвастрэнне міжнацыянальных адносін (асабліва польска-літоўскіх), да чаго сваю руку прыклалі кіраўнікі германскай акупацыйнай адміністрацыі, хутка зруйнавала гэты праект.

Краёўцы аказаліся адсунутымі на перыферыю грамадска-палітычнага жыцця. Фактычна, толькі беларускія дзеячы заставаліся прыхільнікамі краёвай канцэпцыі дзяржаўнасці і працяглы час выступалі за ўтварэнне Беларуска-Літоўскай федэрацыі або канфедэрацыі. Прычым гэта датычыла не толькі віленскіх, але і менскіх беларускіх дзеячаў.

Безумоўна, параза краёвай ідэі ў Вільні не магла не паўплываць на яе папулярнасць з іншага боку фронта. Тым больш, што «каронная» частка польскай супольнасці ў Менску катэгарычна не прымала краёвасці, сцяг якой яшчэ трымалі ў руках прызнаныя мясцовыя правадыры беларускіх палякаў. Узмацненне пазіцый «прышлых» палякаў вяло да пэўнай маргіналізацыі такіх дзеячаў, як Раман Скірмунт і Эдвард Вайніловіч. Мясцовая польская супольнасць пераставала быць сацыяльнай базай краёвай ідэі, яна ўсё больш хілілася ў бок ідэалогіі польскіх нацыянальных дэмакратаў. Раман Скірмунт не мог не заўважыць гэтай тэндэнцыі. Цалкам магчыма, што ягонае далучэнне да беларускага руху не ў апошнюю чаргу было абумоўлена якраз пошукамі новага саюзніка краёвай ідэі.

---

[788] А. Смалянчук, *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй...*, с. 313. Найбольш грунтоўна гісторыя Канфедэрацыі ВКЛ была раскрыта ў артыкуле Зеновіуша Панарскага (Zenowiusz Ponarski) *Konfederacja Wielkiego Księstwa Litewskiego 1915–1916* (Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1998, Nr 10, s. 57–68).

«БЕЛАРУСКІ ДЗЕЯЧ З ВЯЛІКІХ ПАНОЎ...»[789]

Напрыканцы 1916 г. Раман Скірмунт прыняў запрашэнне ўвайсці ў склад Менскага аддзелу *Беларускага таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны* (БТППВ). Тым самым ён зрабіў важны жыццёвы выбар. Як ужо адзначалася, аналагічныя дабрачынныя таварыствы адначасна з'яўляліся важнымі легальнымі асяродкамі нацыянальных рухаў. Беларускае таварыства не было выключэннем. Фактычна, у снежні 1916 г. да беларускага руху далучыўся буйны памешчык і прадпрымальнік, адзін з ідэйных лідэраў краёвасці, былы дэпутат Дзяржаўнай Думы (1906) і былы сябра Дзяржаўнай Рады (1910–1911), кіраўнік Губернскай харчовай камісіі, Упаўнаважаны Асобнай нарады па харчовых мерапраемствах і віцэ-старшыня Менскага сельскагаспадарчага таварыства. У студзені 1917 г. ён да таго ж быў абраны сябрам праўлення Віленскага зямельнага банка[790]. Безумоўна, прысутнасць Скірмунта ў беларускім Адраджэнні ўзмацняла ягоную грамадскую вагу і спрыяла росту цікавасці да беларускай ідэі з боку эліты тагачаснага грамадства.

Выбар, зроблены Скірмунтам напярэдадні Расійскай рэвалюцыі, быў незвычайным для прадстаўніка гэтага роду, але ён выцякаў з ягонай адданасці краёвай ідэі і ранейшай прыхільнасці да культурніцкай дзейнасці беларускіх адраджэнцаў.

Беларускі выбар

Беларускае таварыства дапамогі ўзнікла ўвесну 1915 г. у Вільні (старшыня – Вацлаў Іваноўскі, намеснікі – Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі). Ягоная дзейнасць распаўсюджвалася на Віленскую, Віцебскую, Гарадзенскую, Магілёўскую і Менскую губ. Таварыства атрымала права на выдачу грашовай дапамогі, адкрыццё пунктаў харчавання, прытулкаў і сталовых для бежанцаў, аказанне ім медыцынскіх паслуг, забеспячэнне працай ды інш. Бюджэт Таварыства фарміраваўся з прыватных ахвяраванняў і дзяржаўных субсідый. Аднак у беларускім выпадку субсідыі былі мінімальныя. Расійскія ўлады фактычна адмовіліся фінансаваць беларускую дабрачынную арганізацыю. Тым не менш, яшчэ да «Свенцянскага прарыва» былі створаны аддзелы Таварыства ў Менску, Вілейцы, Полацку ды іншых гарадах[791].

---

[789] Так, у 1919 г. ахарактарызаваў Р. Скірмунта адзін з карэспандэнтаў газеты «Беларуская думка» (№ 4). С. Рудовіч выкарыстаў гэтыя словы ў назве свайго артыкула ў «Гістарычным альманаху» (1999, том 2).

[790] «Минский голос». 1917, № 2330.

[791] *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII–пачатку XXI ст.*, с. 298–299 (аўтар тэксту С. Хоміч).

ДАКУМЕНТ

Са Звароту Камітэта Беларускага таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны.

28 мая 1915 г.[792]

Да грамадзян Беларусі

Памагаць бліжнім у бядзе – гэта павіннасць усіх, хто, жывучы у вялікай сямьі людакоў, бачыць у кожным чалавеку брата. Гэта наказ, ад катораго ніхто ня вольны, калі у яго сэрцы захоўваюцца словы адвечнай святой запаведзі: любі бліжняго свайго як сябе самога.

У пачатку вайны з сумежных з намі зямель Польшчы і Літвы панаехала у нашу старонку багата людзей, у каторых вайна забрала ўсё: хаты, зямлю, меньне, заработак. Са сваіх вёсак і мястэчак пацягнуліся да нас сотні і тысячы палякоў, жыдоў і літвіноў.

І беларусы, памятаючы сваю павіннасць як мага адгукнуліся на іх нядолю: з беларускіх валасцей сяляне слалі збожжа і грошы польскім сялянам; на местах беларускія грамадзкія працаўнікі ахвоча ішлі працаваць у камітэты, што памагаюць усім пацярпеўшым ад вайны – бяз розніцы нацыі і веры; беларускія гурты устраівалі зборы грошаў і спектаклі на іх карысць і т. п. Ажно прыйшоў час, што хваля вайны закранула і Беларускі край. Нагарэлі у часі бітвы беларускія вёскі і мястэчкі. Скрануліся з мейсца нашы шарыя гаротнікі ды памандравалі у глыб сваей старонкі – бяз куска хлеба, без граша у каліце, адно з пустымі рукамі! І вось да нашых грамадзкіх павіннасцей прылучылася ішчэ адна: дагэтуль нам даводзілася памагаць нашым бяздольным гасьцям, цяпер жа мы павінны даць падмогу і прыпынак сваім сыном зямлі Беларускай, спрадвечным жыхаром яе.

Гэта ужо няпростая дапамога бяздольнікам, гэта – самапомач, бо, памагаючы нашым братом родным, мы памагаем самі сабе, беларусы – беларусам.

Каб споўніць гэтую павіннасць, трэба злучыць нашыя грамадзкія сілы, трэба наладзіць шырокую на ўвесь край – арганізацію дзеля помачы пацярпеўшым ад вайны. Да гэтай работы і прыступіла «Беларускае Таварыство помачы пацярпеўшым ад вайны» аткрытае у Вільні [...]

Ніхай-жа усе шчырыя беларусы і усе праўдзівыя грамадзяне Беларускага краю бяз розніцы веры і нацыі адгукнуцца на гэты наш кліч, ніхай прыступаюць да «Беларускага таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны», ніхай памагаюць яму працай сваей і грашмі, каб споўніць сваю грамадзкую павіннасьць перад Родным краем, споўніць вялікую запаведзь любві да чалавека.

КАМІТЭТ

У Камітэт Таварыства выбраны:

Маршалак В. Іваноўскі

Намеснікі маршалка: А. Луцкевіч і В. Ластоўскі

Пісары: П. Алексюк і І. Біндзюк

Скарбнік В. Столыгва

---

[792] «Наша Ніва». 1915, № 21, 28. 05. Тут і далей усе беларускамоўныя дакументы і цытаты падаюцца з захаваннем арфаграфіі і пунктуацыі.

З пачаткам нямецкай акупацыі заходняй часткі Беларусі аддзелы БТППВ на ўсход ад фронту пачалі дзейнічаць самастойна. Апрача дабрачыннай дзейнасці яны таксама займаліся нацыянальна-культурнай працай, менавіта ладзілі вечарыны і спектаклі, арганізоўвалі навучанне на беларускай мове і г. д. У кулуарах абмяркоўваліся палітычныя праблемы.

Асабліва важнай была дзейнасць Таварыства ў Менску, які паступова станавіўся не толькі ваенным, але і палітычным цэнтрам Беларусі. Архіўныя дакументы сведчаць, што ўжо ў маі 1916 г. Менскі аддзел БТППВ паспрабаваў істотна пашырыць межы сваёй дзейнасці. Ягоны сябра Вільгельм Русецкі звярнуўся да губернатара з просьбай дазволіць выданне беларускамоўнай штотыднёвай газеты «Беларусь»[793].

Апрача мовы, яе праграма амаль не адрознівалася ад большасці іншых выданняў. Газета павінна была змяшчаць агляды палітычнага і гаспадарчага жыцця, інфармацыю пра ход ваенных дзеянняў, публікаваць справаздачы з пасяджэнняў Дзяржаўнай Думы і Дзяржаўнай Рады, асвятляць дзеянні ўрада, змяшчаць тэлеграмы і карэспандэнцыі з замежжа і з Расіі, у т. л. планавалася «Беларуская і мясцовая хроніка». Таксама В. Русецкі збіраўся знаёміць чытачоў з літаратурнымі навінкамі.

Выданне газеты магло паспрыяць фактычнай легалізацыі культурніцкай працы дзеячаў беларускага руху. Але губернатар адхіліў прашэнне. Паліцыя выказала сумневы наконт асобы заяўніка, які меў толькі «домашнее образование» і мог быць «подставной особой», а вайскоўцы заявілі пра адсутнасць ваенных цэнзараў з веданнем беларускай мовы. Варта адзначыць, што ў захаванай службовай перапісцы за май–чэрвень 1916 г. яшчэ адсутнічала перасцярога адносна развіцця беларускага руху. Але даволі хутка стаўленне чыноўнікаў да беларускай культурніцкай дзейнасці кардынальна зменіцца.

Галоўныя намаганні менскага аддзелу БТППВ датычылі дабрачыннай дзейнасці. Максім Багдановіч пад псеўданімам *М. Осьмак* у лістападзе 1916 г. змясціў на старонках петраградскай газеты «Дзянніца» агляд дзейнасці першага года існавання Менскага аддзела[794]. У прыватнасці, ён адзначыў, што ў яго склад уваходзіла «каля паўсотні чалавек». Узначальваў Аддзел адвакат Віктар Чавусаў, а найбольш актыўнымі супрацоўнікамі былі Людвіка Сівіцкая (*Зоська Верас*) і яе маці Эмілія, Антон Лявіцкі (*Ядвігін Ш.*) і яго дачка Ванда, Усевалад Фальскі, Вільгельм Русецкі, Уладзіслаў Голуб (*Уладзіслаў Галубок*), якія «шмат працы палажылі на карысць Камітэту».

Сябра Менскага аддзела Багдановіч пісаў пра адкрытыя дармовыя прытулкі для сем'яў бежанцаў, бясплатныя і танныя сталовыя (у т. л. славутую

---

[793] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 9243, арк. 1–1 адв.

[794] М. Осьмак [Багдановіч М], *Агляд працы за першы год Менскага аддзелу Беларускага Таварыства для помачы пацярпеўшым ад вайны, «Дзянніца»*. Беларуская штотыдньовая газэта. 1916, № 4, с. 1–4.

«Беларускую хатку», якая паступова ператварылася ў клуб беларускай інтэлігенцыі), пра дзіцячы прытулак, арганізацыю ткацкай майстэрні, адкуль выходзілі «тканіны з узорамі на беларускі лад», пра сельскагаспадарчыя курсы для бежанцаў. Тут вялося навучанне па-беларуску, а заняткі вялі Л. Сівіцкая, В. Русецкі і Я. Крыўка.

М. Осьмак канстатаваў адсутнасць пастаяннай фінансавай дапамогі. БТППВ толькі эпізадычна атрымлівала грошы ад Усерасійскага саюза гарадоў, г. зв. *Северопомощи* і Таццянінскага камітэта. І нават гэта каштавала вялікіх намаганняў. І тым не менш, паэт і грамадскі дзеяч бачыў перспектывы гэтай дзейнасці: «Значыцца працаваць можна! Дзеля таго клічма ўсіх сьвядомых беларусоў еднацца і працаваць – ні пакладаючы рук, каб у гэтыя суровыя і важныя часы, калі быць может ідзе аб увесь далейшы кірунак жыцьця нашага Краю, каб быў чутны і наш голас – голас маладой Беларусі»[795].

Гісторык Віталь Скалабан, які высвятліў аўтарства Багдановіча, падчас падрыхтоўкі гэтага «Агляду» да друку (1980) вёў актыўную перапіску з былой сакратаркай Таварыства Людвікай Сівіцкай (у шлюбе Войцік), якая звярнула ўвагу на пэўнае перабольшанне значэння дзейнасці Менскага аддзела[796]. Магчыма, такім чынам Багдановіч імкнуўся заахвоціць «маладую Беларусь» да актыўнай грамадскай і культурнай працы.

Дарэчы, яна ж распавяла, што ўжо ў першы свой вечар у «Беларускай хатцы» Багдановіч папрасіў не класці цукар у гарбату. Пазней падчас размовы прызнаўся, што гэта ягоная асабістая ахвяра дзеля дзяцей, якія не атрымліваюць цукру. А аднойчы Максім Багдановіч прынёс у Таварыства паўпуду цукру. Як аказалася, ён назапашваў цукар з таго пайка, які атрымліваў у Харчовай камісіі, каб перадаць дзецям бежанцаў[797].

Сябрамі Менскага аддзела былі таксама Аляксандр Уласаў, Альберт Паўловіч, Аркадзь Смоліч, Павел Аляксюк, Рамуальд Зямкевіч, Лявон Дубяйкоўскі, Лявон Заяц, Самуіл Плаўнік (*Змітрок Бядуля*), ксёндз Аляксандр Астрамовіч (*Андрэй Зязюля*), ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі ды інш.[798]

Напрыканцы лістапада В. Чавусаў падаў прашэнне губернатару аб правядзенні 4 снежня 1916 г. публічнай беларускамоўнай лекцыі «Беларускае адраджэнне» (*докладчик Максим Адамович Богдановіч*). Паводле прашэння, мэтаю лекцыі

---

[795] Тамсама, с. 4.

[796] В. Скалабан, «*Вам як гісторыку не зашкодзіць ведаць...*» *Лісты Зоські Верас да Віталя Скалабана* (у:) *Асоба і час. Беларускі біяграфічны альманах.* Выпуск 1. Мінск 2009, с. 181–183.

[797] *Верас Зоська, Я помню ўсё. Успаміны, лісты.* Уклад. М. Скобла. Гародня-Вроцлаў 2013, с. 41–42.

[798] Тамсама, с. 32–47; *Гісторыя Беларусі ў шасці тамах.* Том 4. *Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.).* Рэд. М. Біч, В. Яноўская. С. Рудовіч і інш. Мінск 2005, с. 462.

было папаўненне фінансавых сродкаў Аддзела. Да прашэння дадавалася кароткая праграма выступу. Багдановіч пасля агляду нацыянальных рухаў у Заходняй Еўропе збіраўся распавесці пра гістарычны лёс Беларусі і фарміраванне беларускай народнасці, пра «Літоўска-рускую дзяржаву» і беларускую культуру ў XVI–XVIII стст., барацьбу з польскімі ўплывамі і «адраджэнне Беларусі» ў пачатку XIX ст., ахарактарызаваць сучасны беларускі рух, а таксама пазнаёміць слухачоў з развіццём беларускай літаратуры апошняга дзесяцігоддзя[799].

Губернатар А. Гірс адхіліў прашэнне па рэкамендацыі дырэктара Дэпартамента паліцыі: «Ввиду повсеместного распространения в Империи сепаратистских течений среди национальностей, населяющих окраины России, и усиливающейся в последнее время в том же направлении пропаганды белорусских националистов, разрешение В. Чаусову лекции [...] в целях государственного порядка является нежелательным»[800].

Падобна, што ў другой палове 1916 г. Менскі аддзел БТППВ зрабіў даволі шмат, каб расійскія ўлады заўважылі іх «прапаганду», і гэтая лекцыя выклікала значна больш боязі, чым ранейшае прашэнне пра выданне газеты на беларускай мове.

Паводле ўспамінаў Сівіцкай, адвакат Чавусаў быў «фармальным» кіраўніком. Ён часта адсутнічаў на пасяджэннях і дзейнасцю Аддзела асабліва не цікавіўся. Затое ведаў усе працэдурныя «кручкі» і «падыходы» да адміністрацыі[801]. Напрыканцы 1916 г. востра адчувалася патрэба ў іншым кіраўніку. Відавочна, што Рамана Скірмунта запрашалі ў сябры БТППВ якраз з мэтай перадаць у ягоныя рукі кіраванне арганізацыяй.

Паводле паказанняў Аркадзя Смоліча следчым АДПУ (1930), гэтае запрашэнне перадаў яму Максім Багдановіч[802]. Інфармацыі можна давяраць, бо, як прыгадвала пазней Сівіцкая, Смоліч быў сябрам Багдановіча падчас знаходжання паэта ў Менску[803]. Апрача таго, як адзначалася, Багдановіч у другой палове 1916 г. – пачатку 1917 г. працаваў у Губернскай харчовай камісіі, дзе шчыльна супрацоўнічаў са Скірмунтам.

У сваіх паказаннях Смоліч ахарактарызаваў паэта як «анархіста-індывідуаліста з яскравай нацыяналістычнай афарбоўкай». Ён нават прыпісаў Багдановічу кіраванне тагачаснай нацыянальнай палітыкай і адзначыў, што той «цвёрда стаяў на пазіцыі кааліцыі з буржуазіяй»[804].

Як ужо адзначалася, далучэнне Рамана Скірмунта да беларускага руху было

---

[799] НГАБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 9187, арк. 410.

[800] Тамсама, арк. 406.

[801] В. Скалабан, «*Вам як гісторыку не зашкодзіць ведаць...*», с. 183.

[802] *Показания А. Смолича от 20 октября 1930 г.*, «Навіны Беларускай Акадэміі Навук». 1992, 11 снежня.

[803] В. Скалабан, «*Вам як гісторыку не зашкодзіць ведаць...*», с. 190.

[804] *Показания А. Смолича от 20 октября 1930 г.*, с. 5.

незвычайнай падзеяй у гісторыі Адраджэння. Між іншым, яна прымушае яшчэ раз задумацца пра прывабнасць беларускай ідэі. Гэтая ідэя давала тым, хто яшчэ нядаўна меў толькі адно жаданне: *Людзьмі звацца*, пачуццё гонару за прыналежнасць да нацыі. Гістарычныя экскурсы адраджэнцаў спрыялі разуменні велічы гістарычнага шляху беларусаў.

Вось, напрыклад, што пісаў Максім Багдановіч у «Лісце да простых людзей»: «Беларусы! Мы – вялікі народ, шырока раскінуліся мы і спрадвеку жывем тут. Гэта наш край, наша старонка. Калісьці ў нас было свае гасударства, скрозь чутно было нашу беларускую гаворку. У ёй пісалі законы, разбіралі справы па судах, вучылі ў школах, друкавалі кнігі, спраўлялі набажэнствы ў царквах ды касцёлах. І ўсе размаўлялі па-нашаму: і чыноўнікі, і папы, і паны над панамі, і вялікія князі, што правілі гасударствам. [...] Не пакінем свае гаворкі, сваіх песняў, сваіх звычаяў – свайго кроўнага, спрадвечнага, беларускага. Не адракомся, не забудзем, не кінем на глум; будзем шанаваць, бараніць, дзецям сваім аб тое запаведаць»[805].

Ён жа сцвярджаў дэмакратызм беларускай ідэі, які цалкам пазбаўляў яе шавінізму ў стасунку да іншых народаў: «Защищая интересы своего народа и кладя в основы этой деятельности наличность самостоятельной белорусской национальности и белорусской культуры, белорусская интеллигенция никогда не впадала в шовинизм, не стремилась к умалению прав соседних национальностей [...]»[806]. Пералічваючы задачы беларускага руху, Багдановіч адзначаў «выделение Белоруссии и Литвы, спаянных экономически, географически и исторически, в областную самоуправляющуюся единицу»[807].

Упэўнены, што для краёўца Рамана Скірмунта падобная характарыстыка беларускага Адраджэння выглядала вельмі прывабнай. Тым больш, што паэт умеў пераконваць суразмоўцаў. Таксама важную ролю ў гэтым выбары «грамадзяніна Краю» павінен быў адыграць ягоны характар, менавіта імкненне падтрымаць тых, хто меў патрэбу ў дапамозе і заслугоўваў яе.

Даследчыку складана ў гэтым выбары Скірмунта разгледзець прагматызм буйнога прадпрымальніка і землеўласніка. А вось беларускія дзеячы сацыялістычнай арыентацыі заўсёды бачылі «прагматызм» і вінавацілі Рамана Скірмунта ў намеры «панаваць над беларускім працоўным людам», а таксама ў прапольскіх сімпатыях.

---

[805] М. Багдановіч, *Хто мы такія? Ліст да простых людзей* (у:) М. Багдановіч, *Поўны збор твораў. Том III. Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцця і творчасці*, с. 126–127.

[806] М. Богданович, Белорусы (у:) М. Багдановіч, *Поўны збор твораў. Том III. Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцця і творчасці*, с. 124–125.

[807] Тамсама, с. 125.

ДАКУМЕНТ

Кастусь Езавітаў. У 25-я ўгодкі Ўсебеларускага кангрэсу[808]. Фрагмент.

[...] У Менску на чале «Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны» знаходзіліся буйны беларускі абшарнік Раман Скірмунт, прадстаўніца старога беларускага арыстакратычнага роду княгіня Магдалена Радзівіл, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, беларускі пісьменнік Ядвігін Ш. (Лявіцкі), юрыст Лявон Заяц, В. Фальскі ды яшчэ некалькі свядомых беларускіх адзінак. Палітычныя памкненні і ідэалы ў гэтых грамадзян былі розныя. Раман Скірмунт выразна меў нахіл у бок польскі, княгіня Магдалена Радзівіл, наадварот, слухаць не хацела аб паляках, бо мела старыя пэрсанальныя спрэчкі з польскай арыстакратыяй [...]

Скірмунт павінен быў добра арыентавацца ў беларускіх справах, тым больш, што ён фінансава падтрымліваў «Наша Ніву» ў часы рэдактарства Янкі Купалы, быў знаёмы з Максімам Багдановічам, пры пасярэдніцтве Марыі Магдалены Радзівіл сустракаўся з вядомымі беларускімі палітыкамі. Веданне сітуацыі ў беларускім Адраджэнні наўрад ці дазваляла яму з аптымізмам глядзець на яго перспектывы.

Беларускі нацыянальны рух ужо меў ўласную гісторыю, у якой значныя поспехі чаргаваліся з прыкметнымі няўдачамі. Найбольшыя дасягненні былі звязаны з развіццём культуры і асабліва літаратуры. Вялікую ролю ў культурніцкім руху адыграў беларускі перыядычны друк і, у першую чаргу, «Наша Ніва» (1906–1915). Гэтая газета здолела стаць сапраўдным цэнтрам нацыянальна-культурнага Адраджэння беларусаў.

Але адначасна даводзіцца прызнаць, што расійскія ўлады ў вялікай ступені здолелі ізаляваць нацыянальную эліту ад шырокіх народных мас. Палітыка русіфікацыі збірала свой «ураджай». Беларуская мова не трапіла пад дахі народных школ, не ўвайшла ў царкву і касцёл, а значыць, не прайшла этапаў сацыялізацыі і сакралізацыі. Беларуская ідэя хутка пашыралася, але ўсё ж не мела масавай падтрымкі сярод сялян. Дзеячы Адраджэння гэта выдатна ўсведамлялі. Дастаткова прыгадаць верш Янкі Купалы «Прарок» (1912), славутую «Пагоню» (1916) Максіма Багдановіча або публіцыстыку Вацлава Ластоўскага і Антона Луцкевіча пра «паднявольны народ» на старонках «Нашай Нівы».

Пра прычыны пэўнай маруднасці нацыятворных працэсаў сярод беларусаў напісана шмат. Неабходна адзначыць, што ў тым змаганні за ідэйную прыхільнасць шырокіх мас, якое разгарнулася ў Беларуска-Літоўскім краі на пачатку XX ст., беларускі рух з цяжкасцю вытрымліваў канкурэнцыю з польскім і літоўскім. А яшчэ даводзілася даваць адпор вялікарускім шавіністам і блізкім да іх прадстаўнікам кансерватыўнай плыні «заходнерусізму», рэагаваць на шавінізм

[808] К. Езавітаў, *У 25-я ўгодкі Ўсебеларускага кангрэсу*, «Раніца». 1943 № 1–2.

Партыі нацыянальных дэмакратаў Дмоўскага. У даваенныя гады «беларускае пытанне» было выключна ўнутранай справай Расійскай імперыі, а дакладней, яе органаў бяспекі.

Сітуацыя пачала змяняцца толькі падчас вайны. У 1916 г. на акупаваных нямецкімі войскамі тэрыторыях адбывалася паступовая палітызацыя беларускага руху. Яго цэнтрам заставалася Вільня. Як ужо адзначалася, Іван Луцкевіч ды іншыя беларускія дзеячы мелі непасрэднае дачыненне да ідэі адраджэння Вялікага Княства Літоўскага, што ў снежні 1915 г. была ўвасоблена ў віленскай адозве Часовай Рады Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага, якую ведалі і ў Менску[809].

Прагерманская арыентацыя беларускага руху была вымушанай. Немцы разыгрывалі «беларускую карту» ў сваёй антырасійскай палітыцы, а беларусы ў гэтых геапалітычных гульнях таксама імкнуліся атрымаць хоць нейкія «козыры». Адным з іх стала развіццё беларускага школьніцтва. Галоўнакамандуючы Усходнім фронтам Пауль Гіндэнбург напрыканцы 1915 г. дазволіў школьную адукацыю на родных мовах, у т. л. на беларускай. У Вільні адкрыліся беларускія настаўніцкія курсы, а ў Гародні на пачатку 1916 г. з'явілася першая беларуская школа.

Іншым важным поспехам стала тое, што ў 1916 г. «беларускае пытанне» ўпершыню было вынесена на міжнароднае абмеркаванне. У маі таго ж году Вацлаў Ластоўскі і Язэп Салавей на канферэнцыі паняволеных народаў Расіі ў Стакгольме падпісалі зварот да прэзідэнта ЗША Вудро Вільсана з просьбай дапамагчы абараніцца ад асіміляцыі. А ўжо праз месяц у Лазане на III з'ездзе нацыянальнасцяў яны ж распаўсюдзілі мемарандум, у якім выказваўся спадзеў, што незалежна ад вынікаў вайны «еўрапейскія народы выступяць гарантамі надання Беларусі ўсіх палітычных і культурных праў, якія забяспечаць свабоднае развіццё ўсіх інтэлектуальных, духоўных і эканамічных сіл нашага народу і дазволяць яму быць гаспадаром на ўласнай зямлі»[810]. Такім чынам, палітыка нямецкай акупацыйнай адміністрацыі дазволіла Вільні заставацца цэнтрам беларускага руху.

Аднак гэтыя першыя «ластаўкі» перамен зусім не азначалі набліжэння «беларускай вясны». Беларусь была перарэзана лініяй фронту. Сотні тысяч яе жыхароў выправіліся ў крыжовы шлях бежанцаў. Прыфрантавыя губерні былі перапоўнены чужынцамі, якія не ведалі і не разумелі нацыянальна-культурных і гістарычных асаблівасцяў Беларусі. Красамоўным сведчаннем гэтых працэсаў быў сам Менск, у якім, як ужо адзначалася, «прышлы элемент» на пачатку 1917 г. перавысіў даваеннае насельніцтва ў тры разы.

На жаль, адсутнічаюць дакументы, якія б дазволілі паглыбіцца ў матывы «бе-

---

[809] Адозва захоўвалася ў фондзе архіва БНР (НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 19, арк. 170, 172) разам з Універсалам Часовай Рады Канфедэрацыі ВКЛ.

[810] [L. Abramowicz], *Litwa pod czas wojny: zbior dokumentow, uchwał, odezw i t. p.* Zebrał i do druku przygotował L. A. Warszawa 1918, s. 124.

ларускага выбару» Рамана Скірмунта. Магчыма, з беларускім рухам ён звязваў перспектывы пашырэння краёвай ідэалогіі, тым больш, што павінен быў ведаць пра ўдзел братоў Луцкевічаў і Ластоўскага ў прапагандзе беларускага варыянта краёвасці[811]. Але таксама можна меркаваць пра верагодную эвалюцыю поглядаў гэтага грамадзяніна Краю ў беларускім кірунку.

Аркадзь Смоліч у вышэйзгаданых паказаннях таксама сцвярджаў, што Раман Скірмунт прыцягнуў да дзейнасці БТППВ «яшчэ кагосьці з беларускай крупнай буржуазіі». Гэты выраз дапамагла зразумець Сівіцкая, якая прыгадала ўдзел у пасяджэннях разам са Скірмунтам княгіні Марыі Магдалены Радзівіл («Радзівіліхі»)[812]. У іншых публікацыях таксама згадваўся Станіслаў Радзівіл са Століна.

У студзені 1917 г. Скірмунт узначаліў адзіную беларускую арганізацыю ў Менску. Напрыканцы студзеня, як паведаміла газета «Минский голос», ён быў абраны старшынём Управы Таварыства, у якую разам з ім увайшлі Усевалад Фальскі (намеснік старшыні), а таксама сакратар Таварыства Уладзіслаў Голуб і скарбніца Людвіка Сівіцкая[813]. Магчыма, у той момант ніхто не звярнуў асаблівай увагі на гэтую інфармацыю, але хваля рэвалюцыі і актыўнасць Управы Менскага аддзела БТППВ ператварылі сціплую дабрачынную арганізацыю ў сапраўдны авангард беларускага нацыянальнага руху.

На чале беларускага руху

Інфармацыя пра паўстанне ў Петраградзе ў апошнія дні лютага, пра адрачэнне ад прастола Мікалая II на карысць брата Міхаіла (2 сакавіка 1917 г.), а таксама адрачэнне апошняга дайшлі да Менска са спазненнем. Генерал Аляксей Эверт стараўся максімальна доўга трымаць сталіцу Заходняга фронту ў інфармацыйнай блакадзе, спадзеючыся на нармалізацыю палітычнай сітуацыі. Але ўрэшце і ён саступіў.

В. Гадлеўскі ў аўтабіяграфічным нарысе (1928) прыгадваў атмасферу, якая запанавала ў Менску, калі да яго дайшлі звесткі пра рэвалюцыю: «Менск заварушыўся. Беларусы страпянуліся разам зь іншымі. Пачалася рэвалюцыйная гарачая работа. У сэрцы ўступіла нейкая магутная сіла. Усюды закіпела, як у катле. Народ пайшоў на вуліцу. Пачаліся маніфэстацыі. Помню, у першай агульнаграмадзкай маніфэстацыі прынялі ўчасьце і беларусы з транспарантам, на якім была з аднаго боку надпіс: «Няхай жыве вольная Беларусь», а з другога – нешта болей інтэрнацыянальнае («Пралетарыі злучайцеся» ці нешта іншае). Пад транс-

[811] А. Смалянчук, *«Краевая ідэя» ў беларускай гісторыі*, с. 9–44.

[812] Верас Зоська, *Я помню ўсё. Успаміны, лісты*, с. 47.

[813] «Минский голос». 1917, № 2333.

парантам даволі вялікая грамада беларусаў з Алексюком на чале, каторы стараўся выбіцца на чало беларускага руху»[814].

Эдвард Вайніловіч больш стрымана згадваў першыя сакавіцкія дні ў Менску. Ён успамінаў, што даведаўся пра рэвалюцыю падчас сходу Менскага губернскага земства. Земцам абвясцілі пра неабходнасць прынясення прысягі імператару Міхаілу ў менскім Кафедральным саборы, але хутка ўлады адмянілі гэтае распараджэнне.

6 сакавіка Э. Вайніловіч назіраў вялізную дэманстрацыю на чале з «гарадскім галавой» Станіславам Хжанстоўскім, удзельнікі якой ішлі ў накірунку кафедральнай плошчы. Там адбыўся мітынг у гонар перамогі рэвалюцыі з удзелам галоўнакамандуючага Заходнім фронтам генерала Эверта і кіраўніка Губернскай земскай управы Самойленкі. Паводле Вайніловіча, на мітынгу выступоўцаў ад вайсковага камандавання змянілі цывільныя аратары, з вуснаў якіх гучалі лозунгі «бальшавіцкага зместу»[815].

Стыманасць Э. Вайніловіча ў ацэнках Расійскай рэвалюцыі з улікам яе далейшага развіцця цалкам зразумелая. Але ў тыя сакавіцкая дні 1917 г. грамадскасць Расіі перажывала сапраўдную эйфарыю. Напрыклад, петраградская газета «Глос Польскі» выйшла з загалоўкам «Вялікая Рэвалюцыя ў Расіі! Цуд». Рэдакцыйны артыкул пачынаўся словамі: «Здарылася! Адбылося тое, пра што яшчэ некалькі дзён таму можна было толькі марыць. Расійскі велікан нарэшце скінуў сваю векавую няволю, махнуў магутнаю рукою, разбіў плюгавую скарлупу абсалютызму і выкінуў кайданы. Ідзе вясна, вясна тых, хто марыў у Расіі пра свабоду, хто імкнуўся да новага лепшага жыцця, хто задыхаўся і паміраў у цесных і задушлівых формах старой дзяржавы...»[816]

А вось як пазней прыгадваў настрой мінчукоў адзін з аўтараў «Минской газеты»: «Немедленно в городе начались торжества, живой, горячий энтузиазм охватил все массы населения, весь город. Смещение прежних властей, удаление полиции, уничтожение гнезд самодержавия прошло спокойно и мирно, без всяких эксцессов. Только жандармерия успела сжечь свои дела и предать забвению «славную» деятельность минских охранников и провокаторов, смешав с пеплом их «достопочтенные» имена»[817].

Здзіўляла хуткасць рэвалюцыйных перамен. Той жа Эдвард Вайніловіч адзначаў лёгкасць, з якой быў зрынуты царызм, які яшчэ ўчора здаваўся непрыступным, а сёння ў адзін момант страціў усіх сваіх прыхільнікаў[818].

---

[814] З *жыцьця і дзейнасьці кс. В. Гадлеўскага. Аўтабіяграфічны нарыс*, «Biełaruskaja krynica». 1928, № 13.

[815] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 196.

[816] «Głos Polski» (Piotrograd). 1917, Nr 9–11.

[817] «Минская газета». 1918, № 1924.

[818] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 197.

Гісторыя гэтых некалькіх дзён выклікала ў Рычарда Пайпса параўнанне Расійскай дзяржавы з вялізнай штучнай пабудовай, што не мела арганічнага адзінства, а была нібыта сцягнута вяроўкамі, канцы якіх трымаў у руках манарх. А калі ён сышоў, уся пабудова імгненна рассыпалася[819].

Часовы ўрад быў сфарміраваны вечарам 2 сакавіка. Яго ўзначаліў кіраўнік Земгора князь Георгі Львоў, які быў прыхільнікам крайніх форм дэмакратычнага папулізму. Князь быў перакананы, што пры сапраўднай дэмакратыі асноўныя рашэнні прымаюцца зацікаўленымі асобамі, а дзейнасць урада абмяжоўваецца іх рэгістрацыяй. Між тым, на Часовы ўрад звалілася безліч праблем, якія трэба было неадкладна вырашаць. Адной з іх быў статус нярускіх народаў Расіі і рэформа мясцовага самакіравання.

Раман Скірмунт быў адным з тых палітыкаў, якія ўжо ў гэтыя першыя дні выдатна разумелі неабходнасць такога рэфармавання і важнасць вырашэння праблемы ўлады. На самым пачатку сакавіка на сходзе МТСГ ён вітаў перамены і прапанаваў правесці ў Менску сход земскіх радных з удзелам духавенства, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і партый, а таксама людзей, якія могуць быць карыснымі для грамадства, дзеля абрання Камітэта бяспекі і парадку. Ягонай асновай магла стаць Земская губернская ўправа, дапоўненая абранцамі сходу.

Таксама Раман Скірмунт прапанаваў не марудзячы распачаць фарміраванне новай паліцыі, абраць камісараў замест былых станавых прыставаў і арганізаваць павятовую службу парадку. Ён таксама заклікаў калег па МТСГ не ўхіляцца ад грамадскай працы[820]. Магчыма, што ўжо ў тыя дні, напоўненыя радасцю і энтузіязмам, краёвец адчуў небяспеку рэвалюцыйнай хвалі, якая пры адсутнасці ўлады лёгка магла ператварыцца ў выбух анархіі. Дарэчы, з улікам таго, што Часовы ўрад прызначыў камісарам Менскай губ. Барыса Самойленку перад Скірмунтам адкрываліся выразныя перспектывы адміністрацыйнай кар'еры. Той жа Самойленка, як пазней прыгадваў Л. Заяц, на адной з нарадаў Губернскай земскай управы станоўча выказаўся за аўтаномію Беларусі[821].

Аднак найбольшую актыўнасць Скірмунт развіў у БТППВ. Іншыя справы і інтарэсы ўласнай кар'еры адышлі на другі план. Менавіта ён быў адным з галоўных ініцыятараў пераўтварэння дабрачыннай арганізацыі ў *Беларускі камітэт* (іншая назва, якая сустракаецца ва ўспамінах – *Беларускі нацыянальны камітэт*), які адразу ж распачаў энергічную арганізацыйную і прапагандысцкую працу. Дзякуючы аўтарытэту кіраўніка Беларускага камітэта і актыўнасці ўсіх ягоных сяброў, у першыя тыдні рэвалюцыі прысутнасць гэтай арганізацыі ў грамадскім жыцці горада была вельмі прыкметнай.

Стварэнне Беларускага камітэта вітаў князь Станіслаў Радзівіл. 18 сакавіка

---

[819] Р. Пайпс, *Русская революция. Часть первая*. Москва 1994, с. 366.

[820] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 64.

[821] Л. Заяц, *Абмылковы крок*, «Савецкая Беларусь». 1927, № 64.

«Минский голос» апублікаваў ягоную тэлеграму на імя Скірмунта: «Искренне приветствую Белорусский Комитет, желая плодотворной работы для общего блага нашего родного края. Надеюсь быть вам полезным. В память свободы сооружаю в Столине низшую ремесленно-агрономическую школу, которая будет передана в ведение белорусского просвета»[822].

Прадстаўнік Беларускага камітэта Павел Аляксюк увайшоў у склад Камітэта грамадскай бяспекі Менска[823]. Лявон Заяц быў сакратаром першага схода Менскага савета рабочых дэпутатаў, на якім разглядалася квота прадстаўніцтва ў ім ад прадпрыемстваў, войска, партыйных і нацыянальных арганізацый.

4 сакавіка на пасяджэнні Камітэта ён паведаміў пра ўдзел у сходзе і прапанаваў паслаць у Савет свайго прадстаўніка. Аднак прапанову не прынялі. Заяц пазней прыгадваў «іранічную крытыку» свайго выступу на сходзе Савета, якую пачуў ад прысутных. Маўляў, няма чаго «з «нейкімі» саветамі важдацца, калі для Нацыянальнага камітэту адчыняюцца шырокія перспектывы супрацоўніцтва з сапраўднай уладай краю, якая была абраная ў Губернскай земскай управе ў відзе Менскага камітэту грамадскага парадку і бясьпечнасьці, куды пасылае сваіх прадстаўнікоў і Беларускі нацыянальны камітэт».

У выніку абралі толькі часовага дэлегата «з мэтамі інфармацыйнымі». Як прызнаваўся Лявон Заяц, «[...] да гэтага прычыніўся якраз той, хто найбольш па сваёй абшарніцка-клясавай прыродзе мусіў быць супроць Савету – гэта праславуты пан Раман Скірмунт. Гэты стары палітык і далёкабачны буржуй больш практычна падышоў да справы, зазначыўшы, што такі зьвязак для беларусоў мець ня шкодзіць, хаця, канешна, хваліцца гэтым перад кадэцкімі верхаводамі і заправіламі ня варта»[824].

Аднак даволі хутка кантакты паміж Беларускім камітэтам і Саветам абарваліся, а іх шляхі разышліся. У святле далейшых падзей, калі роля Менскага савета рабочых дэпутатаў няўхільна расла, як і сацыялістычныя настроі ў грамадстве, гэтае рашэнне можна ацаніць як памылковае.

Першыя крокі Беларускага камітэта сведчылі пра імкненне Скірмунта да паразумення і кансалідацыі з рознымі палітычнымі сіламі. Гэта сапраўды магло ўмацаваць пазіцыі беларускай арганізацыі ў той палітычнай і нацыянальнай барацьбе, якая толькі распачыналася. Дарэчы, сам склад Беларускага камітэта, у якім Раман Скірмунт дзейнічаў разам з такімі прыхільнікамі сацыялізму як Аркадзь Смоліч, Фабіян Шантыр або Усевалад Фальскі, ствараў для гэтага пэўныя магчымасці.

6 сакавіка 1917 г. Беларускі камітэт прыняў удзел у агульнагарадской маніфестацыі ў гонар рэвалюцыі, якую прыгадваў ва ўспамінах Вайніловіч. Сябры

---

[822] «Минская газета». 1917, № 2381.

[823] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 78.

[824] Л. Заяц, *Абмылковы крок*, «Савецкая Беларусь». 1927, № 64.

Камітэта прайшлі ў калоне пад сцягам з надпісамі «Witajma wolu narodu» (лацінкай) і «Жыве Беларусь» (кірыліцай)[825]. Фактычна ў гэты дзень менская беларуская арганізацыя ўпершыню публічна і голасна заявіла пра сваё існаванне.

А праз чатыры дні Камітэт у памяшканні былога участка паліцыі на Залатой горцы правёў ужо самастойны мітынг, на якім з прамовамі на беларускай мове выступалі П. Аляксюк, А. Смоліч, У. Фальскі і Ф. Шантыр[826].

Раман Скірмунт упершыню выступіў у Менску на беларускай мове 12 сакавіка, калі па ініцыятыве Беларускага камітэта праводзіўся «Дзень беларускага значка». Паводле сведчання ксяндза Гадлеўскага, ён «добра ўладаў беларускай мовай (трохі з палескім акцэнтам: «шо, шчо»)». Гадлеўскі таксама адзначыў аратарскія здольнасці старшыні Беларускага камітэта і прыгадаў, што выступленні Скірмунта на беларускіх сходах «выдзяляліся і зместам і формай. Яны былі заўсёды высокапатрыятычныя з беларускага пункту гледжання і часам нават проста рэвалюцыйныя, што выклікала ў прысутных буру воплескаў»[827].

Напярэдадні беларускага свята газета «Новое варшавское утро» паведамляла чытачам, што будуць прадавацца беларускія значкі чырвонага і белага колеру для збору сродкаў у Фонд свабоднага беларускага друку[828]. «Минская газета» назвала гэтыя колеры «нацыянальнымі колерамі Беларусі»[829].

Цэнтральнай падзеяй гэтага дня быў мітынг у кінатэатры «Гігант», на якім выступалі Скірмунт, доктар філасофіі Масоніус, Заяц, Аляксюк, Смоліч, Фальскі, Шантыр ды інш. Нягледзячы на разыходжанні ў палітычных поглядах, усе яны выступалі сугучна, бо іх яднала нацыянальная ідэя. «Калі Скірмунт, – успамінаў Макар Касцевіч (*Макар Краўцоў*), – у кожнае слова стараўся ўлажыць праграму, дык Шантыр спяваў гімны рэвалюцыі проста за тое, што яна ўжо сталася, што яна ёсць. Абодва яны былі тады разам, за адным столікам прэзідыуму»[830]. Але так будзе не заўсёды.

У адзінагалосна прынятай рэзалюцыі вылучаўся галоўны лозунг беларускага нацыянальнага руху, менавіта – патрабаванне аўтаноміі Беларусі. «Минский голос» цытаваў рэзалюцыю: «Беларусы, стоячы на глебе краёвай аўтаноміі, будуць выбіраць ва Устаноўчы Сход грамадзян, што падзяляюць гэты прынцып»[831].

Рэвалюцыя ператварыла Расію ў адну з найбольш свабодных краін Еўропы. Фактычна не існавала абмежаванняў для культурніцкай і палітычнай дзейнасці нацыянальных арганізацый. Беларускі камітэт актыўна гэтым карыстаўся.

---

[825] С. Рудовіч, *Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г.* Мінск 2001, с. 79.

[826] «Минский голос». 1917, 11 и 12 марта; «Новое варшавское утро». 1917, № 2802.

[827] В. Гадлеўскі, *З беларускага палітычнага жыцця ў Менску ў 1917–18 гг.*, «Спадчына». 1997, № 5, с. 20.

[828] «Новое варшавское утро». 1917, № 2804.

[829] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 79.

[830] Цытата паводле: С. Рудовіч. *Час выбару...*, с. 79.

[831] Тамсама.

У сакавіку 1917 г. Менск стаў сапраўдным цэнтрам беларускай палітычнай дзейнасці. І варта яшчэ раз падкрэсліць вялікую ролю ў гэтых пераменах якраз Рамана Скірмунта.

Менавіта Беларускі камітэт і ягоны кіраўнік першымі выступілі публічна з лозунгам аўтаноміі Беларусі ў межах федэратыўнай і дэмакратычнай Расійскай рэспублікі. Гэты лозунг стаў асновай дзейнасці беларускіх адраджэнцаў у 1917 г. і засведчыў пераход беларускага руху на новы этап. Праца па нацыянальна-культурным Адраджэнні пачала сумяшчацца з актыўнай палітычнай дзейнасцю. Значную ролю ў гэтай трансфармацыі адыграў якраз Скірмунт.

Магчыма, якраз актыўнасць Беларускага камітэта перадвызначыла тую павагу да беларушчыны, якая раней не назіралася ў Менску. Так, запланаваныя групай менскіх адвакатаў папулярныя лекцыі пра формы выбараў ва Устаноўчы Сход планаваліся на рускай, польскай, ідыш і беларускай мовах[832]. Камітэт грамадскай бяспекі вырашыў адкрыць у Менску Народны дом, а кіраванне ім даверыць Беларускаму камітэту[833].

У тым жа сакавіку 1917 г., калі Менскі губернскі камітэт Земгора вырашыў стварыць спецыяльную камісію для распрацоўкі праграмы вядзення прапаганды ў вёсцы, у яе склад былі ўключаны прадстаўнікі Беларускага камітэта П. Аляксюк і А. Смоліч[834]. Пазней гэтая Камісія трансфармавалася ў Камітэт прапаганды на вёсцы на чале з доктарам Уладзімірам Марзонам. Намеснікам стаў Павел Аляксюк. Тыя ж Аляксюк і Смоліч павінны былі выступаць на першым мітынгу, які праводзіў Камітэт прапаганды 27 сакавіка ў Смалявічах.

Як заўважыў Станіслаў Рудовіч, адозвы гэтай арганізацыі, якія публікаваліся на старонках «Вестника Минского губернского комитета», хоць і былі рускамоўнымі, але ўтрымлівалі як лінгвістычны, так і зместавы «беларускі каларыт». Яны пераконвалі, што каталікі-беларусы – «родныя браты» праваслаўных беларусаў, адпаведна, яны павінны «супольна адстойваць свае інтарэсы». Таксама адозва заклікала да яднання ўсіх сялян, каб «не быць прыдушанымі іншымі класамі і нацыянальнасцямі»[835].

Варта адзначыць імкненне Беларускага камітэта наладзіць сувязі з вёскай. Рудовіч паведаміў пра дэлегаванне Камітэтам свайго прадстаўніка ў Вілейскі пав. для арганізацыйнай працы сярод сялян дзеля абрання іх дэлегатаў у склад Камітэта. Таксама гісторык адзначыў факт дэлегавання ў склад Беларускага

---

[832] С. Рудовіч, *Час выбару*..., с. 80; «Минский голос». 1917, 19 марта.

[833] Тамсама.

[834] С. Рудовіч, *Утварэнне каардынацыйнага цэнтра беларускага нацыянальнага руху ў Менску (сакавік 1917 г.)* (у:) «Спадчына». 1996, № 3.

[835] Цытата па: С. Рудовіч, *Утварэнне каардынацыйнага цэнтра беларускага нацыянальнага су*..., с. 25; «Вестник Минского губернского комитета». 1917, 24 марта.

камітэта прадстаўніка бежанцаў Наваградскага пав. падчас мітынгу ў Менску 15 сакавіка[836].

Напрыканцы сакавіка Беларускі камітэт і Камітэт прапаганды сумесна пачалі падрыхтоўку да склікання агульнакраёвага сялянскага з'езда. На жаль, гэтае супрацоўніцтва аказалася непрацяглым. Беларуская нацыянальная прапаганда і асабліва ідэя аўтаноміі Беларусі знайшлі шмат праціўнікаў, у т. л. сярод рэвалюцыйнай часткі грамадскасці.

Актывізацыя нацыянальных рухаў, пашырэнне ідэі Расіі як федэратыўнай краіны выклікала занепакоенасць шырокіх колаў расійскай палітычнай эліты ад кансерватараў да сацыялістаў. Маючы розныя сацыяльныя праграмы, яны сышліся на платформе ўнітарнай і непадзельнай Расійскай дзяржавы. У Менску ініцыятарам згуртавання гэтых сіл быў Сяргей Кавалік (1846–1926), сапраўдная легенда народніцкага руху. Пасля адбыцця катаргі і ссылкі ў Сібіры ён у 1898 г. пасяліўся ў Менску.

11 сакавіка 1917 г. па яго ініцыятыве ў Гарадскім тэатры адбыўся Сход рускіх грамадзян Менска. На сходзе дамінавала думка, што нацыянальнае з'яўляецца перажыткам «старога парадку», што прыйшоў час адкінуць гэты «перажытак» і будаваць праграмы на «палітычных платформах». Як заўважыў Станіслаў Рудовіч, праявы гэтага нацыянальнага нігілізму ў нейкай ступені можна разглядаць як рэакцыю на сталыпінскую палітыку ў заходніх губернях імперыі, калі выбары ў Дзяржаўную Думу і земствы праводзіліся па нацыянальных курыях, што суправаджалася дыскрымінацыяй часткі насельніцтва. Магчыма, якраз таму імкненне ўлічыць нацыянальныя асаблівасці ў працэсе трансфармацыі імперыі некаторымі ўспрымалася як адмова ад далейшай дэмакратызацыі дзяржаўнага ладу[837].

Таксама вельмі актыўна разгортвалі сваю прапаганду левыя сацыялістычныя партыі. Так, 22 і 23 сакавіка на дзвюх нарадах групы сялянскіх дэпутатаў, што прыехалі ў Менск для ўдзелу ў выбарах Губернскага харчовага камітэта, быў утвораны Менскі губернскі сялянскі камітэт, які ўзначаліў бальшавік Міхаіл Фрунзе (*М. А. Міхайлаў*). Камітэт пачаў працу над скліканнем 20 красавіка 1917 г. з'езда сялян Менскай губ. Адмоўнае стаўленне кіраўніцтва Губернскага сялянскага камітэта да самавызначэння беларусаў яскрава праявілася ў імкненні супрацьпаставіць агульнакраёваму сялянскаму з'езду як спробе аб'яднання сялянства ў агульнанацыянальным маштабе арганізацыю сялян па губернях і паветах.

Вяртаючыся да беларускай дзейнасці, трэба адзначыць, што ў першы месяц гісторыі Расіі без царызму Беларускі камітэт зрабіў надзвычай шмат для арганізацыі ўсіх наяўных беларускіх сіл, выпрацоўкі ўласнай палітычнай пра-

---

[836] С. Рудовіч, *Утварэнне каардынацыйнага цэнтра беларускага нацыянальнага руху...*, с. 25.

[837] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 86.

грамы і прапаганды беларускай ідэі. Гэтая ацэнка не выглядае завышанай, калі ўлічыць выразную абмежаванасць як матэрыяльных, так і чалавечых рэсурсаў Камітэта.

Вялікая заслуга ў гэтым належала Раману Скірмунту, які фактычна быў адзіным сябрам беларускага Камітэта, які меў вопыт палітычнай дзейнасці і шырокія сувязі з чыноўнай элітай Менскай губ.

Да таго ж, ён па-ранейшаму заставаўся віцэ-старшынём Менскага таварыства сельскай гаспадаркі. Гэтая арганізацыя з пачаткам рэвалюцыі ўжо не абмяжоўвалася выключна вырашэннем гаспадарчых праблем, а імкнулася ўплываць на грамадска-палітычнае жыццё Меншчыны. Скірмунт разам з Вайніловічам намагаліся захаваць «краёвы» характар МТСГ, яго арыентацыю на патрэбы Беларуска-Літоўскага краю. Фактычна гаворка ішла пра галоўныя задачы польскай супольнасці ў Беларусі. Скірмунт настойваў на іх прынцыповай адметнасці ад задач агульнапольскага руху.

Прыхільнікі польскіх нацыянальных дэмакратаў, пазіцыі якіх значна ўмацаваліся ў выніку эвакуацыі ў Менск значнай часткі варшаўскай інтэлігенцыі, крытычна ставіліся да яго дзейнасці. 24 сакавіка падчас сходу арганізацыйнага камітэта, які рыхтаваў глебу для аб'яднання ўсіх польскіх арганізацый на тэрыторыі Менскай губ., упершыню прагучала рэзкая крытыка ў адрас тых палякаў, якія займаюцца не польскімі, а беларускімі праблемамі. Імя Скірмунта яшчэ не называлася, хоць галоўны адрасат гэтага абвінавачвання быў відавочны.

З крытыкай выступіў вядомы польскі адвакат Эдмунд Івашкевіч. Ён быў адным з найбольш актыўных і ўплывовых дзеячаў арганізацыйнага камітэту, які ўвесну 1917 г. выступаў супраць краёвай ідэалогіі. Івашкевіч заклікаў прысутных адчуць важнасць моманту для вырашэння «польскага пытання» і заявіў, што «палякі не павінны апранацца ў беларускі плашчык, а паўсюдна адкрыта і шчыра заяўляць пра ўласную польскасць»[838]. Варта дадаць, што крытыка прагучала напярэдадні менскага з'езда беларускіх арганізацый, галоўным арганізатарам якога быў Беларускі камітэт на чале са Скірмунтам.

Вяртаючыся да дзейнасці Камітэта, можна цалкам пагадзіцца з высновай гісторыка Рудовіча, што яшчэ да сакавіцкага з'езда беларускіх арганізацый менскі асяродак ператварыўся ў цэнтр беларускага нацыянальнага руху і пачаў выконваць каардынацыйныя функцыі[839]. Так, С. Рудовіч паведаміў пра тэлеграму Камітэта да беларусаў Петраграда ад 22 сакавіка 1917 г., у якой апошнім прапанавалася ўстрымацца ад уваходжання іх прадстаўнікоў у Літоўскую нацыянальную раду.

---

[838] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 84.

[839] С. Рудовіч, *Утварэнне каардынацыйнага цэнтра беларускага нацыянальнага руху...*, с. 19.

Літоўская рада была створана ў Петраградзе на пачатку сакавіка і выступала за аб'яднанне Сувалкаўскай, Ковенскай і Віленскай губ. у новую самастойную адміністрацыйную адзінку з назвай «Літва» і літоўскай адміністрацыяй. Апошняе датычыла і тых паветаў, дзе літоўцы складалі меншасць. Рада пастанавіла сфарміраваць Часовы камітэт кіравання Літвой у складзе 12 літоўцаў і 12 прадстаўнікоў іншых народаў (у т. л. шасцёх беларусаў). Камітэту належала падрыхтаваць скліканне Устаноўчага сходу Літвы, які павінен быў вызначыць форму кіравання і акрэсліць стаўленне да суседзяў. У Менску гэта расцанілі як прэтэнзіі на беларускія землі і адмоўна адрэагавалі на прапанову Літоўскай рады.

Менавіта Беларускі камітэт выказаў ініцыятыву склікання з'езда беларускіх арганізацый у Менску, а таксама узяў на сябе яго арганізацыю і правядзенне. З'езд павінен быў з'яднаць беларусаў на аснове рэальнай палітычнай праграмы і стаць пэўнай дэманстрацыяй волі і магчымасцяў беларускага руху.

Неабходнасць такога з'езда была абумоўлена не толькі пэўнымі ўнутранымі праблемамі беларускага руху, але і знешнімі фактарамі. Галоўным з іх была легалізацыя нацыянальных рухаў, якія ўсё часцей выступалі з ідэяй уласнай аўтаноміі ў межах федэратыўнай Расіі. Якраз гэтае палажэнне ўтрымлівала праграма згаданай Літоўскай рады. А 4 сакавіка 1917 г. у Кіеве было абвешчана стварэнне Украінскай цэнтральнай рады (УЦР), якая выступіла з лозунгам аўтаноміі Украіны. Увесну канцылярыя Часовага ўрада амаль штодня атрымлівала тэлеграмы ад розных украінскіх арганізацый з патрабаваннем аўтаноміі[840]. Выразныя імкненні да аўтаноміі праяўляліся таксама ў дзеяннях латышскіх арганізацый. Кансалідацыя нацыянальных рухаў суседніх народаў і лозунгі аўтаноміі непасрэдна закраналі інтарэсы беларусаў і датычылі тэрыторыі іх пражывання. Пэўную патэнцыйную небяспеку таксама ўтрымліваў у сабе працэс адраджэння незалежнай Польшчы.

Наогул, сакавік быў месяцам бурлівых дыскусій пра будучыню Расіі, а для іх беларускіх удзельнікаў таксама пра лёс беларускай зямлі. Некаторыя дзеянні ўрада Г. Львова (заява пра незалежнасць Польшчы, пашырэнне аўтаноміі Фінляндыі) сапраўды давалі падставы спадзявацца на пераўтварэнне імперыі ў федэрацыю.

Сітуацыя патрабавала кансалідацыі беларускіх сіл, цэнтрам якіх стаўся Беларускі камітэт. Якраз Камітэт падрыхтаваў і распаўсюдзіў друкаваную ўлётку «Biełarusy», якая заклікала да яднання («Ніхай нас нішто не раздзеліць, хай ні будзе сваркі паміж беларусам праваслаўным і каталіком, бо ўсе мы дзеці аднэй Маткі – Беларусі») і яшчэ раз сцвярджала адметнасць беларусаў ад сваіх суседзяў («Мы не палякі і не расейцы...»). Улётка друкавалася як польскім варыянтам лацінкі, так і кірыліцай.

---

[840] ГАРФ. Ф. 1778, оп. 1, д. 244 и др.

ДАКУМЕНТ

Улётка «Biełarusy!»[841]

Nastało wialikaje świata swabody. Konczyłasia doŭhaja niawola naszaj staronki. Staroje naczalstwa, katoraje dawiało nas da straszennaj, niebywałaj biady złomleno. Ministry ŭ wastrozi, car adroksia ad prastołu. Kamitet Hasudarscwiennaj Dumy ŭziaŭ u swaje ruki kirawannie narodam. Z Kamitetam iduć raboczyje, wojsko, narod. Nowy paradak niasie nam nie bizun i nahajku, nie znieważeńnie naszych światych dumak ab swabodnaj doli, a niasie wolu, niasie praudu, niasie paszanu da Biełaruskago narodu.

Braty!

Budujcie swaju świetłuju buduczynu. Pakażecie ŭsiamu świetu, szto żywie Biełarus, pakażecie, szto żywie jaje spradwiecznaja mowa, szto żywie narod Biełaruski, katory wynias na swaich pleczach hetulki kryùdy i zdzieku i nia zhinuŭ praz stolki wiakoŭ padniawolnago życcia. Dahetul mowa nasza nia mieła hramadzianskich prawoŭ. Dahetul narod nasz byŭ pakryudżany, abiazdolany – ni znaŭ swajho imiani; ciapier nastaŭ czas, kali puty niawoli, katoryja cisnuli jaho praz sotki hadoŭ, tresnuli; ciapier jon swabodny, ciapier jon może skazać swajo swabodnaje słowa.

Dyk strapianisia, Narod Biełaruski! Bolsz ni zakujuc Ciabie ŭ puty zaleznyja, bo sam budziesz swajoj dolaju kirawać. Twaje wybarnyje ludzi zawiaduć taki paradak, jaki Tabie budzie patrebny – tolki wiedaj, kaho wybirać. Wybiraj tych, katoryje pastajać za rodnuju ziamielku, za swabodnuju Biełarus.

Narod Biełaruski!

My nie Palaki i nie Rasijecy, my ad wiakoŭ siadzim tut, my haspadary na swajoj rodnaj ziamielcy, my haspadary hetaha kraju nie budziam liczyć parobkami druhich narodaŭ, jak nas dahetul liczyli. Biełarusy, my adzin Narod. Dyk złuczymsia ŭ adno, bo ŭ jednasci siła. Nichaj nas niszto ni razdzielajc, chaj ni budzie swarki miz Biełarusam prawasłaunym i katalikom, bo ŭsie my dzieci adnej Matki – Biełarusi. Hniazdom naszym chaj budzie Minski Biełaruski Kamitet.

Hramadzianie Biełarusi!

Budziem twaryć narodnaje szczaście, jano ciapier u naszych rukach. Dzieci naszyja buduć dziakawać nam za swabodu Backauszczyny i s paszanaj i luboŭju ab nas uspaminać. Kliczcie wialiki klicz woli pa ŭsich kutkoch swabodnaj Biełarusi!

Biełaruski kamitet
Minsk. Zacharauskaja wuł. № 18.
Praczytaŭszy – addaj susiedu.

З'езд беларускіх арганізацый быў прызначаны на 25 сакавіка 1917 г. у Менску. Ва ўмовах вайны і рэвалюцыйных перамен арганізаваць выбары было немагчыма. Адпаведна арганізатары рассылалі запрашальныя тэлеграмы, імкнучыся дабіцца

[841] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 7, арк. 29–29 адв.

прадстаўніцтва ўсіх беларускіх суполак на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі, а таксама грамадскіх арганізацый, што праяўлялі цікавасць да «беларускага пытання», і нават асобных дзеячаў. Беларускі камітэт праяўляў самую шчырую зацікаўленасць у максімальна шырокім беларускім прадстаўніцтве. С. Рудовіч адшукаў у архівах кароткую тэлеграму з Менску, адрасаваную беларускім актывістам Петраграда: «*Неабходна прыбыць усім*»[842]. Гэтая дзейнасць прынесла плён. Паводле пратакола з'езда, на ім прысутнічала каля 150 удзельнікаў.

Трэба адзначыць, што гэта быў з'езд не толькі арганізацый, але і партый. Так, у першай палове дня 25 сакавіка група дэлегатаў, сярод якіх былі Аркадзь Смоліч, Алесь Бурбіс, Зміцер Жылуновіч ды інш., правялі сход, на якім пастанавілі адрадзіць Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ). Галоўным патрабаваннем партыі ў галіне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва абвяшчалася аўтаномія Беларусі ў складзе федэратыўнай Расіі. Кіраўнічым органам было прызнана Менскае бюро БСГ на чале з Смолічам[843]. Якраз ён вітаў з'езд ад імя БСГ. Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі выступіў як прадстаўнік «Каталіцкай дэмакратычнай партыі», а Рамуальд Зямкевіч – «Народнай дэмакратычнай партыі». Падобна, што апошняя існавала толькі ў планах і намерах Р. Зямкевіча, а вось В. Гадлеўскі рэпрэзентаваў групу, якая ў маі 1917 г. афіцыйна аформілася ў «Беларускую хрысціянскую злучнасьць».

Праца распачалася 25 сакавіка ў 19 гадзін. Старшынём з'езда быў абраны Казімір Кастравіцкі (*Карусь Каганец*), а ягонымі «таварышамі» – намеснік губернскага камісара адвакат Іван Метлін і сябра Беларускага камітэта Павел Аляксюк. Сакратарамі абралі Лявона Зайца і Браніслава Тарашкевіча. Адсутнасць у складзе Прэзідыума аднаго з галоўных арганізатараў з'езда Рамана Скірмунта растлумачыў карэспандэнт газеты «Новы кур'ер літэўскі», які паведаміў, што кіраўнік Беларускага камітэта захварэў.

Апублікаваны пазней Пратакол пасяджэнняў з'езда перадае ўзнёслы настрой яго ўдзельнікаў, разуменне імі ўсёй маштабнасці задач, што стаялі перад беларускімі адраджэнцамі, і веру ў магчымасць іх вырашэння[844].

Праўда, поўнай салідарнасці сярод удзельнікаў з'езда не было, і гэта праявілася ўжо падчас абрання намеснікаў старшыні. Метлін, якога вылучылі прысутныя прадстаўнікі рускай супольнасці Менска, прызнаў, што ён «не сімпатызуе залу, бо не трэба дзяліць рускі народ нацыянальнымі перагародкамі»[845]. Нягледзячы

---

[842] С. Рудовіч. *Час выбару...*, с. 84.

[843] Тамсама, с. 87–88.

[844] *Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г.*, «Спадчына». 1990, № 4, с. 29–33. Скарочаны і папраўлены тэкст пратакола друкаваўся таксама ў зборніку *Верас Зоська. Я помню ўсё. Успаміны, лісты. Уклад. М. Скобла. Гародня-Вроцлаў 2013, с. 48–54.*

[845] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 83.

на гэта, з'езд усё ж прагаласаваў за ягоную кандыдатуру. Перамагло імкненне да яднання нават з сумніўнымі палітычнымі партнёрамі.

Праца распачалася з чытання тэлеграм ад партый, арганізацый і асоб, што віталі беларускі з'езд. Гэта былі шматлікія беларусы з Петраграда, якія не даехалі да Менска, сябры выдавецтва «Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ», а таксама сябры розных беларускіх гурткоў з ліку бежанцаў, беларусы з Харкава, вайскоўцы-беларусы, а таксама «палякі Пінскага павету». Апошняе прымушае задумацца пра асабістую ролю Рамана Скірмунта ў арганізацыі з'езда. Магчыма, ягоная постаць паўплывала і на прывітальную прамову прадстаўніка палякаў Аршанскага пав., былога супрацоўніка Губернскай харчовай камісіі К. Гардзялкоўскага, які фактычна выступаў ад імя ўсіх палякаў.

Але першым з прывітаннем звярнуўся старшыня Камітэта прапаганды доктар Уладзімір Марзон. Ён заклікаў яго ўдзельнікаў з'езда да супольнай працы і згоды. З прывітальным словам выступілі таксама Зміцер Жылуновіч ад Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў Петраграда, Міхаіл Какановіч – ад магілёўскіх педагогаў ды інш. Ад Менскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў з'езд прывітаў Кузьміцкі. Наогул, большасць выступленняў былі прасякнуты ідэяй згоды і паразумення ўсіх сацыяльных слаёў на падмурку агульных нацыянальных інтарэсаў.

Варта спыніцца на выступе К. Гардзялкоўскага. Дарэчы, у 1907 г. ён належаў да Польскага дэмакратычнага саюза, створанага ў Менску, і быў прыхільнікам краёвай ідэі. Прамоўца выказаў радасць з той нагоды, што палякі разам з беларусамі будуць будаваць вольную Беларусь. Паводле яго прызнання, гэта пазіцыя ўсіх мясцовых палякаў як «суайчыннікаў беларусаў і літоўцаў». Гардзялкоўскі заявіў, што беларусы ў намаганнях да вылучэння Краю ў самастойную адміністрацыйную адзінку знойдуць сярод мясцовых палякаў самых верных саюзнікаў[846].

Заўважу, што пратакол не ўтрымлівае інфармацыі пра аналагічныя выступы прадстаўнікоў іншых нацыянальных супольнасцяў Беларусі. Падобна, што толькі мясцовыя палякі адназначна падтрымалі беларускі з'езд. Тэкст прамовы Гардзялкоўскага змясціў на сваіх старонках «Новы кур'ер літэўскі», рэдакцыя якога ў гэтым выпадку салідарызавалася з прадстаўніком палякаў Аршанскага пав.

Усевалад Фальскі паведаміў пра дзейнасць Менскага аддзелу БТППВ, які пасля «ўзыходжання сонца свабоды» стварыў Беларускі камітэт, арганізоўваў мітынгі, далучаў да сваёй працы сялян і мяшчан, збіраў сродкі на вольны беларускі друк у Менску і Бабруйску, нарэшце, склікаў з'езд нацыянальных арганізацый і займаецца падрыхтоўкай краёвага сялянскага з'езда.

З паведамленнямі пра дзейнасць беларускіх арганізацый выступалі Эдвард Будзька (Петраград), Кілчэўскі (Бабруйск), Парэчын (Яраслаўль). Павел Аляксюк распавёў пра колішнюю «светнасьць» Беларусі, наступны заняпад і падзеі 1905 г., калі «святлейшыя сыны бацькоўшчыны началі будзіць дух народны». Ён вітаў пе-

[846] Ibidem.

рамены апошняга часу і папярэджваў: «Шчасце ў нашых руках, і калі цяпер мы яго не здолеім узяць, то каб ні было пасьля запозна»[847].

Аркадзь Смоліч выступіў з дэкларацыяй БСГ, якая абяцала абараняць як класавыя, так і нацыянальныя інтарэсы беларускага сялянства. Вінцэнт Гадлеўскі ад імя «Каталіцкай дэмакратычнай партыі» казаў пра дапамогу народу ў яго «штодзённай справе» і сцвярджаў, што моцны народ «павінен мець усё сваё: школу, мову, аўтаномію і сваю культуру». Пра асвету народу як галоўную мэту «Народнай дэмакратычнай партыі» казаў Рамуальд Зямкевіч.

Пануючы настрой згоды і паразумення парушыў намеснік старшыні з'езда Іван Метлін, які ў сваёй прамове заявіў, што першачарговая задача – скліканне Устаноўчага Схода, а нацыянальнае пытанне толькі шкодзіць яе вырашэнню. І дадаў, што «па яго разуменьню, наш рух нацыянальны – ні натуральны, бо пад ім німа цьвёрдаго фундамэнту народных нізоў»[848].

Гэтая заява выклікала надзвычай эмацыйную рэакцыю. З пратэстамі, якія часам парушалі этычныя нормы, выступілі Л. Заяц, Э. Жылуновіч, І. Краскоўскі, В. Цывінскі, А. Смоліч, А. Бурбіс, В. Чавусаў, П. Аляксюк. Яны казалі пра права беларусаў на нацыянальнае развіццё як важную частку заваяванай свабоды. Толькі нехта Адамовіч, чыноўнік і былы настаўнік падтрымаў Метліна і заявіў, што беларуская мова і культура – пустыя тукі, а галоўныя задачы – гэта ваенная перамога над ворагам і дэмакратычныя рэформы[849].

У адказ Аляксюк выказаўся супраць таго, каб Метлін заставаўся «таварышам» старшыні беларускага з'езда. У выніку, як сведчыць пратакол, І. Метлін і яго прыхільнікі пакінулі з'езд[850]. А вось карэспандэнт газеты «Новы кур'ер літэўскі» сцвярджаў, што канфлікт меў працяг. Пасля сыходу Метліна ўзняўся «пякельны шум», бо рускія, што стаялі пры сценах, пачалі крычаць, грукаць крэсламі аб падлогу. І гэта працягвалася даволі доўга[851]. Урэшце абвясцілі перапынак.

І гэта быў не апошні пратэст у першы дзень працы з'езда. Гісторык Уладзімір Ладысеў паведаміў, што старшыня Казімір Кастравіцкі пакінуў яго, незадаволены абраннем ў Прэзідыум з'езда «памешчыка» Скірмунта[852]. Відаць, напрыканцы першага дня працы ён усё ж далучыўся да з'езда і быў абраны ў склад Прэзідыума, а таксама ў склад агітацыйна-палітычнай, арганізацыйнай і фінансавай камісій.

Гэтыя падзеі паказваюць, што, нягледзячы на ўсе намаганні дасягнуць згоды і паразумення, наладзіць супольную працу ўсё ж не атрымалася. Сваю згуб-

---

[847] *Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г.*, с. 29.

[848] Тамсама, с. 30.

[849] Тамсама.

[850] Тамсама, с. 31.

[851] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 83.

[852] У. Ладысеў, П. Брыгадзін, *Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.)*. Мінск 2003, с. 23.

ную ролю адыгрываў як недавер да «сацыяльна чужых», так і разыходжанне ў разуменні сутнасці «беларускага пытання».

Пасля аднаўлення працы былі выбраны камісіі з'езда дзеля падрыхтоўкі да наступнага дня. Ва ўсіх камісіях дамінавалі сябры Беларускага камітэта, а Раман Скірмунт апынуўся ў складзе трох камісій. У двух камісіях працавалі П. Аляксюк, Л. Заяц, А. Смоліч, В. Лявіцкая, А. Лявіцкі і Б. Тарашкевіч. Такое шырокае прадстаўніцтва Камітэта было невыпадковым, бо менавіта ягоныя сябры рыхтавалі асноўныя дакументы для працы ўсіх камісій.

У другі дзень з'езда ў яго прэзідыум былі абраны Раман Скірмунт (старшыня), Павел Аляксюк і Аркадзь Смоліч (намеснікі). Зміцер Жылуновіч пазней патлумачыў гэтае абранне імкненнем дэпутатаў прадухіліць раскол, што намеціўся ў першы дзень[853]. Відавочна, што арганізатары з'езда спадзяваліся на той аўтарытэт, які Скірмунт меў сярод земцаў і адміністрацыі. Дарэчы, паводле інфармацыі газеты «Новое варшавское утро», напрыканцы сакавіка ён кіраваў аддзелам забеспячэння ў новастварэным Менскім губернскім харчовым камітэце[854].

І, сапраўды, калі верыць пратаколу, другі дзень абышоўся без скандалаў. Камісіі прадстаўлялі вынікі сваёй працы. Так, Смоліч ад агітацыйна-палітычнай камісіі падкрэсліў важнасць прапагандысцка-асветніцкай працы сярод сялянства і звярнуў увагу на значэнне дзейнасці вясковых настаўнікаў. Меркавалася весці прапаганду па трох асноўных накірунках – палітычным (падтрымка Часовага ўрада), сацыяльным («пад сцягам шырокіх сацыяльных рэформ») і нацыянальным, дзе асноўную ролю павінен быў адыгрываць лозунг «краёвай» (абласной) аўтаноміі. Прынамсі, так гэтыя накірункі бачыліся Міхаілу Кахановічу на старонках «Могилёвского вестника»[855]. А ў прынятай з'ездам рэзалюцыі звяртаў на сябе ўвагу пункт наконт склікання Беларускім камітэтам сялянскага і настаўніцкага з'ездаў і стварэнне саюзаў сялян і настаўнікаў. Пры гэтым беларускія адраджэнцы выказвалі гатоўнасць працаваць у вёсцы поруч з іншымі арганізацыямі[856].

Зміцер Жылуновіч выступаў з дакладам ад камісіі друку. Яе галоўная прапанова была звязана з выданнем беларускай газеты (пажадана штодзённай), рэдакцыя якой павінна была складацца з прадстаўнікоў розных партый, абраных Беларускім камітэтам. Камітэт павінен быў распрацаваць канцэпцыю газеты і прыдумаць яе назву.

Найбольшае месца ў Пратаколе заняла інфармацыя пра даклад прадстаўніка

---

[853] З. Ж. [З. Жылуновіч], *З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. 25 сакавіка 1917 г.*, «Полымя». 1925, № 6.

[854] С. Рудовіч, *«Беларускі дзеяч з вялікіх паноў...» Эпізоды палітычнай біяграфіі Рамана Скірмунта*, «Гістарычны альманах». 1999, Том 2, с. 42.

[855] НАРБ. Ф. 6-п, воп. 3, спр., 175, арк. 3–5.

[856] *Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г.*, с. 31.

Школьнай камісіі Браніслава Тарашкевіча. Камісія зыходзіла з неабходнасці ўвядзення беларускай мовы навучання ў першую чаргу ў пачатковых школах, але пры гэтым звярнула ўвагу на адсутнасць беларускамоўных падручнікаў і настаўнікаў-беларусаў. З'езд пастанавіў арганізаваць Таварыства «Прасьвета» і запрасіць да ўдзелу ў ім вядомых дзеячаў беларускай культуры. Сярод кандыдатаў фігуравалі Максім Багдановіч, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, Вацлаў Іваноўскі ды інш. З'езд даручыў будучай дэлегацыі да Часовага ўрада патрабаваць перадачы адукацыі ў «беларускія рукі». Таксама гаворка ішла пра ўсеагульны характар адукацыі, павелічэнне колькасці розных тыпаў школ, арганізацыю беларускіх курсаў для настаўнікаў, пашырэнне пазашкольнай асветы, адкрыццё пры першай магчымасці ўніверсітэта ды інш.

Этнаграфічная камісія (дакладчык М. Кахановіч) прыйшла да высновы, што аўтаномная Беларусь як «нацыянальна-дзяржаўная адзінка» Расійскай федэрацыі павінна ўключаць Менскую, Гарадзенскую, Магілёўскую, Віцебскую, большую частку Віленскай, некаторыя паветы Смаленскай і Чарнігаўскай губ. Як высвятліў Станіслаў Рудовіч, з друкаванага варыянта Пратакола выпадкова «выпалі» згадкі Віцебскай і Віленскай губ. Разгорнутая справаздача з'езда, апублікаваная М. Кахановічам на старонках «Могилёвского вестника» (31.03–2.04. 1917) утрымлівала іх поўны пералік[857].

Дарэчы, для больш дакладнага вызначэння этнаграфічных межаў Беларусі з'езд пастанавіў стварыць асобную Навуковую камісію, у склад якой запрасіць акадэмікаў Я. Карскага і А. Шахматава, а таксама гісторыкаў М. Доўнар-Запольскага і М. Любаўскага. Таксама быў выказаны пратэст супраць намераў Літоўскай нацыянальнай рады (Петраград) уключыць у склад Літвы ўсю Віленскую губ.[858]

Апошняе рашэнне суправаджалася дыскусіяй наконт стаўлення да Літвы і яе аўтанамісцкіх намаганняў. Паводле карэспандэнта «Новага кур'ера літэўскага», у цэнтры спрэчак аказалася пытанне, ці трэба шукаць саюза з Літвой. Меркаванні разышліся. Смоліч ад імя БСГ заявіў пра важнасць беларуска-літоўскага саюза і пажаданне аўтаноміі шасці губерняў гістарычнай Літвы, што адпавядала традыцыі, дазволяла пазбегнуць канфлікта за тэрыторыі са змяшаным насельніцтвам, а таксама гарантавала Беларусі выхад да мора.

А вось Кахановіч як прадстаўнік ліберальнай плыні «заходнерусізму» ў беларускім руху быў катэгарычна супраць. На яго думку, гісторыя ў гэтым выпадку не мела значэння, а з пункту гледжання этнаграфіі і культуры беларусаў нічога (?!) не звязвала з Літвой. Рэдактар «Могилёвского вестника» настойваў на існаванні «адной рускай сям'і» ў складзе Вялікаросіі, Беларусі і Маларосіі[859]. Гэта

---

[857] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 91

[858] *Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г.*, с. 32.

[859] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 83.

быў толькі пачатак той «цывілізацыйнай» дыскусіі, якая на працягу ўсяго 1917 г. будзе падзяляць прадстаўнікоў розных накірункаў беларускага Адраджэння і істотна перашкаджаць яднанню нацыянальных сіл.

У апублікаваным варыянце Пратакола таксама адсутнічалі важныя палажэнні даклада фінансавай камісіі (Э. Будзька). Чытачы маглі даведацца, што ў створаным Нацыянальным фондзе знаходзіцца 2 тыс. руб., сабраных беларусамі Петраграда. Насамрэч, дакладчык казаў пра перадачу 1 тыс. руб. Э. Вайніловічам, яшчэ 1 тыс. руб. «іншымі». Скрыначны збор на вуліцах Менска і Бабруйска папоўніў Фонд на 2 тыс. руб. Найбольшую суму (10 тыс. руб.) у гэты фонд перадала княгіня Радзівіл. Дэлегаты апладысментамі выказалі ёй падзяку[860].

Даклад Земскай камісіі рабіў аграном Стаўпоўскі. Камісія пры падтрымцы з'езда выказалася за дэмакратычную рэарганізацыю земскага самакіравання, асноваю якога павінна было стаць валасное земства, сфарміраванае на аснове ўсеагульнага выбарчага права, якое распаўсюджвалася таксама на жанчын[861].

Адным з найбольш важных быў даклад арганізацыйнай камісіі, з якім выступаў Павел Аляксюк. Пасля даклада з'езд выказаўся за стварэнне ў бліжэйшы час вышэйшага прадстаўнічага і заканадаўчага органа аўтаномнай Беларусі – Беларускай Краёвай Рады ў Менску. У яе павінны былі ўвайсці прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцяў Краю. Да яе фарміравання ролю вышэйшага органа ўлады ў Беларусі з'езд браў на сябе[862]. Праўда, як слушна заўважыў Рудовіч, рэалізацыя гэтага рашэння была магчымая толькі пры ўмове, што беларускія адраджэнцы здолеюць аб'яднаць вакол ідэі агульнакраёвай улады ўсе галоўныя палітычныя сілы Беларусі, а таксама асноўную частку яе насельніцтва – беларускае сялянства[863]. Трэба прызнаць, што ўвесну 1917 г. гэта было невырашальнай задачай.

Для кіравання Краем з'езд сфарміраваў Беларускі нацыянальны камітэт (БНК)[864], асноўнымі задачамі якога абвяшчаліся «арганізацыя Беларусі» ў кантакце з Часовым урадам, падрыхтоўка выбараў у Беларускую Краёвую Раду і прапаганда выбараў ва Устаноўчы сход на прынцыпах федэратыўнай і дэмакратычнай Расійскай рэспублікі. Дзеля вырашэння гэтых задач планавалася стварэнне губернскіх, павятовых і нават валасных аддзелаў БНК. У склад БНК былі абраны Раман Скірмунт, Аркадзь Смоліч, Павел Аляксюк, Лявон Заяц, Эдвард Будзька, Усевалад Фальскі, Браніслаў Тарашкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Яўсей Канчар, Іван

---

[860] Ibidem; НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр. 175, арк. 7.

[861] *Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г.*, с. 32–33.

[862] Тамсама, с. 33.

[863] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 91

[864] Як пэўны казус выглядае сцвярджэнне гісторыка Андрэя Чарнякевіча, што падчас з'езда менскае аддзяленне «Таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны» абвясціла сябе Беларускім нацыянальным камітэтам (А. Чернякевич, *БНР. Триумф побежденных*. Минск, 2018, с. 27).

Краскоўскі, Алесь Бурбіс, Казімір Кастравіцкі, Бабарыкін, Фабіян Шантыр, Міхаіл Кахановіч, Вацлаў Іваноўскі, Лявон Дубяйкоўскі і Зміцер Жылуновіч. Большасць сяброў Камітэта належала да БСГ. Аднак яго старшынём пасля доўгіх і вострых спрэчак стаў Скірмунт.

Ксёндз В. Гадлеўскі пазней тлумачыў, што ў той момант ніхто з сяброў БНК, а магчыма і ўдзельнікаў з'езда, не думаў пра далейшае развіццё рэвалюцыі аж «да камунізму». Урад князя Львова выглядаў даволі трывалым, і перамагло меркаванне, што з кадэтамі лягчэй будзе весці размову Скірмунту, а не беларускім сацыялістам[865].

У Прэзідыум БНК апрача Скірмунта абралі Алексюка і Фальскага як «таварышаў» старшыні, Зайца (скарбнік) і Тарашкевіча (пісар). З'езд вызначыў склад беларускай дэлегацыі для візіту ў Петраград. Кампанію Скірмунту склалі Краскоўскі, Будзька, Канчар, Аляксюк, Кахановіч і Касяк. Таксама з'езд выказаўся за «прылучэньне» да дэлегацыі прадстаўнікоў праваслаўнага і каталіцкага духавенства[866].

Напрыканцы працы па прапанове Алексюка з'езд прыняў Дэкларацыю, якую дэлегацыя павінна была ўручыць Часоваму ўраду.

ДАКУМЕНТ

Дэкларацыя З'езда беларускіх арганізацый (Менск, 25–27 сакавіка 1917 г.[867])

З'езд прэдстаўнікоў беларускіх палітычных партый і клясоў, сабраўшыся ў Мінску 25–27 марца гэтага году, вітаючы вялікую расейскую рэвалюцыю, прынесшую нам свабоду і блізкасьць аўтономіі Беларусі, выражаючы сваю гатоўнасьць падтрымаць Часовы Урад у яго барацьбе з унешнімі ворагамі за свабоду Расеі і яе народаў і з прыслужнікамі старога ўраду – перэдае споўніцельную ўладу Беларускаму Нацыянальному Камітэту, каторы павінен у кантакце з Часовым Расейскім Урадам арганізаваць Беларусь. Беларускі Нацыянальны з'езд, умацаваны ў шчырым жаданьні нясьці часьць вялікай працы на карысьць вольных народаў Расеі, моцна перэконаны, што яго Нацыянальны Камітэт, кіруючыся да паляпшэньня жыцьця ў родным краю, прынясе карысьць агульна-гасударственнаму будаваньню на фундамэнце федэратыўнаго строю дэмократычно-рэспубліканскай Расеі, аб чым з'езд даручае сваёй дэлегацыі данясьці да ведама Часовага Ураду.

Такім чынам, напрыканцы сакавіка 1917 г. з'езд беларускіх арганізацый і БНК заявілі пра ўласную гатоўнасць забяспечыць канстытуяванне Беларусі як аўтаномнай палітычнай адзінкі ў складзе Расійскай федэрацыі. Ва ўмовах рэвалюцыйнай

---

[865] В. Гадлеўскі, *Зь беларускага палітычнага жыцьця ў Менску*, «Спадчына». 1997. № 5, с. 21–22.

[866] *Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г.*, «Спадчына». 1990. № 4, с. 33.

[867] Ibidem; Гл. таксама: «Новое Варшавское утро». 1917, № 2189. На рускай мове гэты зварот быў апублікаваны ў газеце «Речь»за 1917 г., № 74, с. 4.

эйфарыі і веры ў добрую волю новых кіраўнікоў «свабоднай Расіі» гэтая задача здавалася цалкам вырашальнай. Аднак красавіцкі візіт дэлегацыі БНК у Петраград і перамовы з міністрамі Часовага ўрада высветлілі эфемернасць беларускіх надзей.

Як слушна заўважыў Рудовіч, у тагачасных умовах Беларускаму нацыянальнаму камітэту было надзвычай складана стаць зародкам агульнакраёвай улады ў Беларусі. Ён мог быць толькі грамадскай установай, каардынацыйным цэнтрам вакол якога адбывалася палітычная і нацыянальна-культурная кансалідацыя той часткі беларусаў, што заставалася пад юрысдыкцыяй Расіі[868].

Гэтаму цэнтру трэба было як мага хутчэй зразумець рэальную сітуацыю новай Расійскай дзяржавы, дзе выразна дамінавалі цэнтралісцкія тэндэнцыі, якія мелі моцных саюзнікаў у Беларусі. Апрача таго, у Краі і побач з ім разгортваліся нацыянальныя рухі суседніх народаў, інтарэсы якіх трэба было таксама ўлічваць у справе «арганізацыі Беларусі». А яшчэ важна было дакладна акрэсліць сілы, гатовыя з'яднацца вакол праграмы БНК, каб зразумець рэальнасць уласных нацыянальных прэтэнзій.

Відавочна, што першасны склад БНК на чале са Скірмунтам быў арыентаваны на кансалідацыю ўсіх наяўных беларускіх сіл, а таксама на пошук і прыцягненне патэнцыйных саюзнікаў сярод іншых нацыянальнасцяў Беларусі. Менавіта такой была пазіцыя арганізатараў з'езда і самога Рамана Скірмунта. Як ужо згадвалася, яшчэ да сакавіцкага з'езда ён імкнуўся далучыць да беларускага руху буйных землеўласнікаў. Прыгадваючы фінансавую дапамогу з боку Радзівілаў і Вайніловіча, удзел у пасяджэннях БНК князя Г. Друцкага-Любецкага, можна сцвярджаць, што гэтыя намаганні далі пэўны пазітыўны вынік.

Паводле Гадлеўскага, кіраўнік БНК наогул імкнуўся стварыць «беларускую абшарніцкую партыю»[869]. Не думаю, што гэта сапраўды ўваходзіла ў планы Скірмунта. Ён добра арыентаваўся ў настроях мясцовых «абшарнікаў» каталіцкага веравызнання і разумеў немагчымасць стварэння падобнай партыі. У 1907 г. у яго не атрымалася стварыць Краёвую партыю Літвы і Беларусі, дык няўжо ў 1917 г. ён бачыў магчымасць стварэння «беларускай абшарніцкай партыі»?

Больш верагодна, што ў гэты момант ізноў праявілася характэрная рыса Рамана Скірмунта як палітыка. Ён заўсёды імкнуўся да паяднання і кансалідацыі розных палітычных сіл. А тое, што Гадлеўскі лічыў «абшарніцкай партыяй», насамрэч, было толькі імкненнем прыцягнуць да беларускай палітычнай дзейнасці ўплывовых землеўласнікаў.

Пра імкненне кіраўніка БНК да кансалідацыі таксама сведчыць згаданае пазітыўнае стаўленне да абрання прадстаўніка беларускай арганізацыі ў Менскі Савет рабочых дэпутатаў дзеля пастаяннага кантакта. Таксама вядома, што кіраўнік БНК

---

[868] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 92–93.

[869] В. Гадлеўскі, З *беларускага палітычнага жыцця...*, с. 22.

угаворваў сацыяліста і прыхільніка расійскай арыентацыі Яўсея Канчара не выходзіць са складу БНК, «таму што пункт гледжання Канчара ў камітэце патрэбны»[870].

Дарэчы, Канчар 30 сакавіка 1917 г. напісаў ліст да Скірмунта, у якім выказаў сумненні ў шчырасці нацыянальных матываў дзейнасці кіраўніка БНК і цікавіўся ягоным стаўленнем да «ўяўнага ўдзелу» палякаў у беларускім руху. Раман Скірмунт напісаў ліст у адказ, які захаваўся дзякуючы таму, што быў апублікаваны Канчарам увесну 1918 г. на старонках часопіса «Чырвоны шлях», выдання Беларускага аддзела Наркамата па справах нацыянальнасцяў у Петраградзе.

У сваім лісце Скірмунт не кляўся ў прыналежнасці да беларускай нацыі, ён толькі адзначыў, што з'яўляецца «ўраджэнцам беларускага Палесся» і дадаў, маючы на ўвазе Беларусь і беларусаў: «Я заўсёды быў і буду горача адданы сваёй радзіме і свайму народу». На верагодны падтэкст пытання наконт «уяўнага ўдзелу» палякаў ён не стаў рэагаваць, адзначыўшы адсутнасць у яго сумневаў наконт шчырасці тых прадстаўнікоў каталіцкага духавенства, якія выступаюць за ўвядзенне беларускай мовы ў дадатковае набажэнства. Скірмунт таксама адкінуў ідэю «гістарычных парахункаў» беларусаў з іншымі народамі, заявіўшы, што «адносіны да іншых заўсёды будуюцца на ўзаемнасці».

ДАКУМЕНТ

З ліста Рамана Скірмунта да Яўсея Канчара. Красавік 1917 г.[871]

Милостивый Государь Евсевий Степанович,

[…] Я сам уроженец Белорусского Полесья, потомок литовской семьи с древних времен, с испокон веков оседлой в этом крае, и мои предки до 17 столетия пользовались белорусским языком как домашним. Я всегда был и буду горячо предан своей родине и своему народу. Их местонахождение не за Неманом и Бугом, и не на Волге, а здесь в Белоруссии. В I Государственной Думе, смею сказать, благодаря моим усилиям, выделилась краевая группа депутатов Литвы и Белоруссии, совершенно самостоятельная и независимая от Польского Кола. Во фракции автономистов-федералистов I Госуд[арственной] Думы я отстаивал интересы белорусского народа. В отношении настоящего участия в польских организациях и депутации, посетившей Временное правительство, меня по-видимому смешивают с моим двоюродным братом К. Г. Скирмунтом, членом Государственного Совета по выборам от Гродненской губернии.

Указывая дальше на мнимое участие многих поляков в белорусском движении, я полагаю, Вы имеете главным образом ввиду католических священников. Гнет старого правительства, осложняя многие вопросы политической жизни края, оказывал в некоторых случаях – против желания – косвенную поддержку

---

[870] С. Рудовіч, «*Беларускі дзеяч з вялікіх паноў...*», с. 38.

[871] «Чырвоны шлях». 1918. № 1–2, с. 12–13. Хачу выказаць удзячнасць гісторыку Рыгору Лазько за перададзеную ксеракопію гэтага выдання.

Полонизму. Отрицая существование, не допуская мысли об употреблении в костелах белорусского языка, оно этим же самым закрепляло положение польского языка. Духовенство не могло согласиться на введение великорусского языка, чуждого прихожанам и в то время опасного для самого существования костела и, конечно, волей-неволей должно было придерживаться польского. Ныне, когда освобождение от прежнего гнета принесло нам свободу самоопределения, когда изречение, имевшее силу и значение в течение десятков лет, «белорусского языка нет и быть не может», отошло в область преданий, многие ксендзы, считаясь с нуждами своей паствы, возбудили вопрос о замене при добавочном Богослужении польского языка белорусским. Сомневаться при таких обстоятельствах в их искренней преданности Белорусскому делу мы не имеем оснований.

Вопрос об «исторических счетах» Белорусов с другими народностями я бы пока оставил на стороне. Преобладающее влияние учений Илловайского в течение десятков лет вызвало несколько одностороннее отношение истории к некоторым фактам из прежней жизни нашего края. Впрочем вопрос этот в данный момент не имеет существенного значения. У нас будет столько работы около культурного, экономического и морального возрождения края, что думать об исторических расчетах на первых порах не придётся. Отношения к другим всегда основаны на взаимности. Поскольку другие народы проявляют к нам недоброжелательные стремления, им, конечно, должен быть оказан надлежащий отпор. Arma in man сит расе in corde (Са зброяй у руцэ і з мірам у сэрцы. – А. С.) – вот лозунг, которого бы я придерживался в отношении к другим народам.

Полагая, что эти ясные и положительные ответы вас удовлетворят, имею честь пребывать к Вам с совершенным почтением и преданностью.

Р. А. Скирмунт

Аднак падзеі, якія адбываліся пасля беларускага з'езда, разбуралі той узнёслапераможны настрой, які запанаваў сярод адраджэнцаў. Па-ранейшаму найбольш актуальнай заставалася праблема адзінства.

У ліку першых на заклік беларусаў да яднання адрэагавалі мясцовыя іерархі праваслаўнай царквы. Так, 2 красавіка 1917 г. епіскап Менскі і Тураўскі Георгі ў адмысловым пасланні да духавенства даводзіў «польскі характар» Беларускага камітэта, які нібыта падрываў асновы праваслаўнай веры і падманваў беларусаў, якія, насамрэч, з'яўляюцца толькі адгалінаваннем рускага народу[872].

Сур'ёзныя праблемы паўсталі падчас арганізацыі і правядзення агульнакраёвага сялянскага з'езда ў Менску. Ён адбыўся, але аказаўся малапрадстаўнічым, а яго рашэнні не атрымалі водгуку на месцах. Паводле інфармацыі «Минской газеты», на з'езд прыехалі толькі 52 дэлегаты пераважна з Магілёўскай і неакупаваных частак Віленскай губ. З'езд падтрымаў аграрную праграму БСГ з яе па-

[872] С. Рудовіч. *Час выбару...*, с. 99–100.

лажэннем пра «агульнанародную ўласнасць» на зямлю і перадачу яе сялянам для карыстання ў адпаведнасці з працоўнай нормай. Канчатковае вырашэнне аграрнага пытання звязвалася з дзейнасцю Краёвага сойма Беларусі. Таксама ўдзельнікі з'езда падтрымалі прапанову ўтварэння на месцах сялянскіх камітэтаў пад эгідай БНК[873]. Аднак з'езд і ягоныя рашэнні аказаліся амаль незаўважанымі ў Беларусі.

Галоўнай прычынай няўдачы было супрацьдзеянне Губернскага сялянскага камітэта на чале з бальшавіком Фрунзе, а таксама адмова Камітэта прапаганды ўдзельнічаць у падрыхтоўцы з'езда. Абодва камітэты сышліся на платформе непрыняцця ідэі аўтаноміі Беларусі. Іх напалохала актыўнасць беларускіх адраджэнцаў і сур'ёзнасць іх намераў.

Між тым, выконваючы рашэнне сакавіцкага з'езда, дэлегацыя БНК у сярэдзіне красавіка выправілася ў Петраград на перамовы з Часовым урадам па найбольш актуальных пытаннях існавання беларускай нацыі. Напярэдадні візіту 8 красавіка ў Петраградзе адбыўся мітынг мясцовых беларусаў. Беларусы прывіталі Часовы ўрад і заявілі, што апрача дэмакратычных перамен выступаюць за федэратыўны лад Расіі як неабходную ўмову яе свабоднага развіцця. Беларусь яны бачылі адным са «штатаў свабоднай федэратыўнай Расеі»[874]. Была прынята адпаведная дэкларацыя ў адрас Часовага ўрада. Яе падпісаў «старшыня мітынгу» Вацлаў Іваноўскі, які праз некалькі дзён далучыўся да дэлегацыі БНК.

Перад ад'ездам ў Петраград БНК прыняў удзел у масавай маніфестацыі ў Менску, што адбылася пасля заканчэння I з'езда вайсковых і рабочых дэпутатаў Заходняга фронту, які падтрымаў палітыку Часовага ўрада. У прысутнасці такіх вядомых думскіх палітыкаў як М. Радзянка, Ф. Родзічаў, М. Скобелеў, М. Чхэідзе, І. Цэрэтэлі па вуліцах Менска пад гукі «Марсельезы» прайшла калона маніфестантаў на чале з генералам А. Эвертам і ягоным штабам. Сярод розных нацыянальных і палітычных арганізацый ішлі таксама прадстаўнікі БНК пад белым сцягам з надпісам «Вольная Беларусь»[875]. Але гэтае рэвалюцыйнае яднанне ўжо было больш вонкавым...

Прыехаўшы ў Петраград, яшчэ да перамоваў з Часовым урадам беларусы сустрэліся з сябрамі Літоўскай нацыянальнай рады. Раман Скірмунт, нягледзячы на антылітоўскія настроі прадстаўнікоў «заходнерускай плыні» ў беларускім руху, усё ж не траціў надзеі на паразуменне. Магчыма, што яго пазіцыя набліжалася да курса, які ў стасунку да Літвы займалі ў той час кіраўнікі віленскай беларускай суполкі. Так, у сакавіку 1917 г. Антон Луцкевіч у спецыяльным мемарандуме, дасланым канцлеру Германіі, сфармуляваў галоўную мэту беларускага руху, менавіта – «стварэнне з трох аб'яднаных абласцей Беларусі, Літвы і Курляндыі, занятых нямецкімі войскамі, незалежнай дзяржаўнай арганізацыі»[876]. Сталіцай

[873] Тамсама, с. 125–126.

[874] ГАРФ. Ф. 1778, оп. 1, д. 244, л. 31.

[875] «Новое Варшавское утро». 1917, № 2199.

[876] ЦБУАНЛ. Аддзел рукапісаў. F 21–277, k. 12.

гэтай канфедэрацыі бачылася Вільня. Для беларусаў і часткі літоўскіх і беларускіх палякаў краёвасць яшчэ захоўвала сваю актуальнасць, адпаведна прывабным выглядаў палітычны саюз з літоўскім рухам.

У Петраградзе адбылася свайго роду беларуска-літоўская канферэнцыя, дзе беларускі бок быў прадстаўлены дэлегацыяй БНК і прадстаўнікамі Беларускага камітэта ў Петраградзе. Паводле інфармацыі М. Кахановіча, змешчанай на старонках «Могилевского вестника» (№ 89 ад 20 красавіка), літоўцам прапанавалі саюз дзеля «лепшай будучыні для абодвух народаў». Паводле беларускага боку, ён павінен быў грунтавацца на «даўнейшай супольнай лучнасці ў форме дзяржавы – гістарычнай Літвы», а таксама на існуючай «адміністратыўнай супольнасці» ў форме г. зв. Паўночна-Заходняга краю, і адзінстве эканамічных і палітычных інтарэсаў Літвы і Беларусі[877]. З гэтай прапановай выступіў Раман Скірмунт.

Сябра дэлегацыі кс. Вінцэнт Гадлеўскі пазней прыгадваў, што беларусы апрача факта гістарычнага адзінства, казалі пра значэнне супольнай абароны ад мацнейшых суседзяў і адзначалі агульнасць палітычных і сацыяльных інтарэсаў. Між іншым, гаворка ішла пра важнасць для беларусаў выхаду да Балтыйскага мора, а для літоўцаў – пра існаванне вялікага «заплечча» (Hinterland)[878].

Аднак гэтая прапанова не была прынята. Літоўскія прадстаўнікі заявілі, што «літоўская справа» ўжо набыла міжнародны характар, а «беларускае пытанне» ўсё яшчэ застаецца ўнутрырасійскай праблемай. Дзяржаўнасць на падмурку былога Вялікага Княства Літоўскага не ўваходзіла ў іх планы.

Літоўскі рух мэтаскіравана імкнуўся да дзяржаўнасці ў межах «этнаграфічнай Літвы з прылеглымі тэрыторыямі», і краёвая ідэя ўжо не знаходзіла падтрымкі. Сябры Літоўскай нацыянальнай рады настойвалі на аўтаноміі Літвы з літоўскай адміністрацыяй у межах Ковенскай, Сувалкаўскай і Віленскай губ. «Этнаграфічныя аргументы» беларусаў яны адкідалі на карысць існуючага адміністрацыйнага падзелу. «Яблыкам разладу» таксама стала Вільня. У адказ на літоўскія прэтэнзіі беларусы заявілі, што Вільня – не беларускі і не літоўскі горад, але паколькі ён знаходзіцца на беларускай тэрыторыі і аточаны беларускім насельніцтвам, то павінен належаць беларусам[879].

Палітычная пазіцыя кіраўнікоў літоўскага руху не пакідала аніякіх шансаў на поспех краёвай ідэі. Менавіта «сепаратысцкія памкненні Літвы» Раман Скірмунт пазней назаве галоўнай прычынай маргіналізацыі краёвасці[880].

Відавочна, што ў Петраградзе прыезд беларускай дэлегацыі не выклікаў вялікай

---

[877] W. Slawucic, *Biełarusy i litoŭcy ŭ 1917 hodzie*, «Krynica». 1925, 18 studz.

[878] В. Гадлеўскі, *Беларускае літвафільства*, «Беларускі фронт». 1938, № 7 (публікацыя ў часопісе «Спадчына». 1993, № 2, с. 47)

[879] НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр. 171, арк. 19–21.

[880] R. Skirmunt. *Rysy odrębnosci Polesia* (y:) *Polesie ilustrowane*: monografja: praca zbiorowa. Pod red. O. Nelarda. Brzesc 1923, s. 28.

цікавасці. Многія тагачасныя петраградскія газеты («Вестник Временного правительства», «Петербургский листок», «Новое время» ды інш.) наогул не заўважылі гэтай падзеі, хоць іх старонкі былі перапоўнены інфармацыяй пра дзейнасць і патрабаванні польскіх, украінскіх ды іншых нацыянальных арганізацый. Знайшлося нават месца, каб паведаміць пра прыезд у Петраград дэлегацыі чукчаў, якія якраз у гэты час імкнуліся прывітаць Часовы ўрад.

Пра візіт беларускай дэлегацыі паведамілі толькі газета кадэтаў «Речь» і «Русская воля», якую выдаваў былы царскі міністр унутраных спраў А. Пратапопаў. З нататкі на старонках «Русской воли» чытачы маглі даведацца, што 11 красавіка ў Петраград прыбыла дэлегацыя беларусаў у складзе былога дэпутата Дзяржаўнай Думы Рамана Скірмунта, інжынера Іваноўскага, настаўніка Касяка, публіцыста Будзяка (Э. Будзькі. – *А. С.*) ды інш. Адзначалася, што дэлегаты наведаюць Часовы ўрад і Выканкам Савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў, каб прывітаць іх ад імя беларускага з'езда[881].

На старонках «Речи» фігуравалі таксама іншыя сябры дэлегацыі, менавіта ксёндз Гадлеўскі, праваслаўны святар Разумовіч, рэдактар «Могилевского вестника» М. Каханоўіч і ўпаўнаважаны Усерасійскага Саюза гарадоў І. Краскоўскі. Адзначалася, што дэлегаты ўручаць пастановы беларускага з'езда Часоваму ўраду і Выканкаму Савета[882]. Дарэчы, менавіта «Речь» напрыканцы сакавіка 1917 г. паведаміла сваім чытачам пра з'езд беларускіх партый і арганізацый у Менску і ягоныя рашэнні. Ужо ў той інфармацыі падкрэслівалася імкненне БНК спрыяць развіццю Расіі на прынцыпах федэратыўнага і «дэмакратычна-рэспубліканскага ладу»[883].

Сціплыя газетныя паведамленні дазваляюць удакладніць склад беларускай дэлегацыі. Можна меркаваць, што адпаведна з пажаданнямі ўдзельнікаў з'езда яна была дапоўненая прадстаўнікамі каталіцкага (Гадлеўскі) і праваслаўнага (Разумовіч) духавенства. Таксама фігуруе імя В. Іваноўскага, які, верагодна, замяніў Канчара.

Апошні на старонках газеты «Новый куръер варшавский» пасля публікацыі заметкі пра вяртанне беларускай дэлегацыі з Петраграда заявіў, што выйшаў з яе складу, бо не падтрымлівае ідэі аўтаноміі Беларусі. «Як сацыяліст-народнік, – пісаў Канчар, – я выступаю за дэмакратычную рэспубліку з мясцовым самакіраваннем на падставе нацыянальнага самавызначэння і гістарычных умоваў мясцовасці. Толькі так я разумею самакіраванне Беларусі. Федэратыўны лад у Расіі і федэратыўнае ўладкаванне Беларусі лічу непрымальным, зыходзячы з гісторыі стварэння рускай дзяржавы, а таксама амерыканскай і швейцарскай практыкі»[884].

Яшчэ два сябры дэлегацыі не былі заўважаны петраградскім друкам. Між тым,

---

[881] «Русская воля». 1917, № 58; НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр. 175, арк. 16.

[882] «Речь». 1917, № 84; НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр.175, арк. 17.

[883] «Речь». 1917, № 74.

[884] «Новое Варшавское утро». 1917, № 3009.

імя лекара Аляксандра Ярэміча прысутнае на Дакладной запісцы, перададзенай міністру-старшыні Часовага ўрада 14 красавіка. А Павел Аляксюк распавёў пра працу дэлегацыі на з'ездзе беларускіх арганізацый у Менску ў ліпені 1917 г.

Першы візіт дэлегацыя нанесла кіраўніку Часовага ўрада і адначасна міністру ўнутраных спраў князю Львову. Яму была ўручана *Докладная записка*. Падчас размовы падкрэслівалася неабходнасць абвяшчэння Расіі федэратыўнай рэспублікай, дэмакратызацыі гарадскога і земскага самакіравання, пэўнай беларусізацыі адукацыі (напр., увядзення беларускамоўнага навучання ў сістэме народных школ, вывучэння беларускай мовы і гісторыі Беларусі, а таксама беларускай літаратуры і краязнаўства ў настаўніцкіх і духоўных семінарыях ды інш). Таксама закраналася пытанне кампенсацыі тых страт, якія панесла беларускае насельніцтва падчас ваенных дзеянняў.

Аляксюк, прыгадваючы гэты візіт, заўважыў, што князь Львоў «выслухаў усё гэта ўважна, але сказаў, што ўсе гэтыя дамаганьні належуцца да розных міністраў»[885]. Паводле Гадлеўскага, кіраўнік урада заявіў, што пажаданні беларусаў можа задаволіць толькі Устаноўчы сход[886]. Кахановіч на старонках «Могилевского вестника» (№ 89 ад 20 красавіка) таксама адзначыў, што дэлегацыя звярнула ўвагу міністра-старшыні на беспадстаўнасць літоўскіх прэтэнзій на беларускія тэрыторыі ў межах Ковенскай, Сувалкаўскай і Віленскай губ., а таксама на Вільню. Князь Львоў заявіў, што прымае да ведама беларускі пратэст і прызнаў, што ўжо атрымаў дэкларацыю літоўцаў, у якой згадваюцца тэрыторыі трох губерняў. Беларуская дэлегацыя яшчэ раз выказалася пра адсутнасць падстаў для падобных прэтэнзій[887].

На асобніку *Докладной записки*, які захаваўся ў фондзе Міністэрства ўнутраных спраў Часовага ўрада (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі), ёсць рэзалюцыя князя Львова, які накіраваў гэты дакумент свайму намесніку ў Міністэрстве ўнутраных спраў Сяргею Лявонцьеву.

ДАКУМЕНТ

Докладная записка съезда белорусских общественных организаций.

14 апреля 1917 г.[888]

25, 26 и 27 марта 1917 года в Минске состоялся Съезд Бел[орусских] Общ[ественных] деятелей, который избрал из своей среды для проведения в жизнь постановлений съезда «Бел[орусский] Нац[иональный] Комитет».

По вопросам общеполитическим съезд высказался следующим образом: «При-

---

[885] «Вольная Беларусь». 1917, № 8.

[886] З *жыцьця і дзейнасьці кс. В. Гадлеўскага. Аўтабіяграфічны нарыс*, «Беларуская крыніца». 1928, 12 і 16 лютага.

[887] НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр. 171, арк. 22.

[888] ГАРФ. Ф. 1800, оп. 1, д. 44, л. 1–1 адв. Тэкст *Докладной записки* выклікае здзіўленне, бо больш нагадвае чарнавік, аўтар якога ўжываў скарачэнні слоў. Аднак менавіта на гэтым тэксце прысутная рэзалюцыя князя Львова.

знавая, что основные взаимоотношения между Белоруссией и Рос[сийской] Державою должны быть определены Всероссийским Учр[едительным] Собр[анием], съезд Б[елорусских] О[бщественных] деятелей считает, что единственной возможной формой государственного устройства Р[оссийской] Д[ержавы] является федеративная республика. Ядром Б[елоруссии] являются губернии: Минская, Могилёвская, Витебская, Гродненская и Виленская.

В виду отсутствия в некоторых губ[ерниях] земских организаций, а в других наличия лишь «столыпинских» упрощенных организаций самоуправления, необходимо ускорить введение в Крае учреждений городского и земского самоуправления на демократических началах».

По вопросам народного образования съезд высказался следующим образом: «Необходимо назначение в местные органы Центральных управлений по Мин[истерству] Н[ародного] П[росвещения] людей Края, предложенных местными национальными организациями. Преподавание в низших народных школах Белоруссии должно вестись на родном бел[орусском] языке. В учительские и духовные семинарии вводится изучение Белорусского языка, истории Белоруссии, Белорусской литературы и краеведения. Те же предметы вводятся факультативно и в средние школы Бел[оруссии]. Необходимо немедленное учреждение в Б[елоруссии] университета и высшего спец[иального] уч[ебного] заведения. В университете необходимо учредить кафедры белорусского языка, литературы, истории и краеведения Б[елоруссии].

По вопросу о возмещении населению убытков, причиненных военными действиями, съезд высказался за необходимость немедленного изменения закона от 6 окт[ября] 1916 г. для действительного обеспечения разоренному населению возможности получить возмещение убытков, причиненных военными действиями.

14 апреля 1917 г.

Председатель съезда Р. А. Скирмунт (подпись)
Члены делегации:
Крестьянин Виленской губ. Будславской вол. Э. Будзько)
Народный учитель Виленской губ. И. Косяк
Доктор медицины А. П. Еремич, уроженец Минской губ.
Инженер, техник, доктор технических наук В. Л. Ивановский, Виленская губ.
Преподаватель Могилёвского Ремесленного училища М. С. Каханович
Юрист П. П. Алексюк Гродненская губ.
Минск, Захарьевская, 31
Белорусский национальный комитет

Дарэчы, варта звярнуць увагу на адрас Беларускага нацыянальнага камітэта. Падобна, што ягонай сядзібай стала кватэра Рамана Скірмунта. Магчыма, якраз там адбываліся нарады БНК.

Між тым, беларуская дэлегацыя наведала Сяргея Лявонцьева, які пачаў раз-

мову з пытання: «Якая рэальная сіла стаіць за вамі?» Аляксюк сказаў пра вялікую маральную сілу. Згадаўшы пра гэта падчас з'езда, ён прызнаў, што на чыноўніка гэтае прызнанне не зрабіла аніякага ўражання. Лявонцьеву таксама паскардзіліся на губернскіх камісараў з ліку радных былога «сталыпінскага» земства, якія працягвалі «абрусіцельную палітыку». Ён у адказ заявіў, што «спагадае гэтай бядзе, але памагчы нічым ні можа, ня можа ісьці проціў выбарной уласьці».

Міністр народнай асветы А. Мануйлаў таксама ўважліва выслухаў пажаданні адкрыцця ў Беларусі ўніверсітэта і сельскагаспадарчага інстытута, дапасавання школьных праграм да краёвага жыцця і перадачы кіравання сістэмай адукацыі ў рукі мясцовых ураджэнцаў. Міністр пагадзіўся з выказанымі прапановамі, але заявіў, што ён нічога не можа зрабіць і параіў накіраваць беларускіх прадстаўнікоў у Камітэт пры Міністэрстве народнай асветы.

Паводле ўспамінаў Алексюка, найбольш канкрэтнай была размова з обер-пракурорам Сінода Уладзімірам Львовым. Той, дарэчы, падтрымліваў дэмакратычна і па-рэфарматарску настроеную частку духавенства і канфліктаў з іерархамі праваслаўнай царквы. Сябры дэлегацыі звярнулі ўвагу на палітычныя выступы асобных высокіх прадстаўнікоў царквы ў Беларусі, якія, на іх думку, распальвалі міжнацыянальную і міжрэлігійную варожасць. Львову перадалі асобнік адозвы аднаго з такіх іерархаў, і пракурор пагадзіўся, што такіх людзей нельга трымаць на пасадзе. Таксама абмяркоўвалася кандыдатура епіскапа-беларуса. Але наступстваў гэта не мела.

Важнай падзеяй для дэлегацыі быў візіт да адміністратара Магілёўскай архідыяцэзіі і кіраўніка каталіцкага касцёла ў Расіі біскупа Яна Цэпляка. 12 красавіка Р. Скірмунт, кс. Гадлеўскі, Э. Будзька і П. Аляксюк уручылі біскупу адмысловую заяву пра неабходнасць увядзення беларускай мовы ў касцёл. У заяве сцвярджалася ненармальнасць раздвоенасці беларусаў, якія ў хаце гавораць па-беларуску, а ў касцёле – па-польску. Таксама прыводзіліся прыклады ранейшых спроб увядзення беларускай мовы ў храм, пачынаючы з айцоў езуітаў у Хвашчоўцы. Беларускія дзеячы падкрэслівалі асаблівую патрэбу беларусізацыі касцёльнага жыцця ў тагачаснай сітуацыі, «bo aproč narodnaha biełaruskaha ruchu, katory žadaje swaje mowy ŭ kascieli, a takze apraca karysci, jakuju prynosic nawučennie wiery ŭ rodnaj mowi, siudy jaśce dałučajecca patrebnasc niasci swiatło wiery katalickaj tym, katoryja ciapier nawaročywajucca da katalickaha Kasciołu i da katorych ciažka zwaročywacca pa-polsku, bo jany jaje zusim nie razumiejuc, insymi sławami, palščyna u ciapierašnich warunkach moža pryniasci tolki škodu katalickamu kasciołu na Biełarusi, a nie karysc»[889].

У заяве ўтрымліваліся пажаданні ўвядзення заняткаў па беларускай мове, літаратуры і гісторыі ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Петраградзе; чытання ў касцёлах зваротаў вышэйшага духавенства па-беларуску; перадачы белару-

[889] *Ab biełaruskaj mowi u kascieli,* «Homan». 1918, Nr 39.

скаму духавенству касцёлаў, якія будуць вернутыя новым урадам і ў якіх можна будзе адразу ўвесці беларускую мову; выдання беларускамоўных кніг для касцёла і школы, а таксама беларускамоўнага часопіса; прызначэння у Беларусь ксяндзоў-беларусаў або тых, хто валодае беларускай мовай; і, нарэшце, прызначэння біскупа-беларуса або таго, «katory umieje pa-biełarusku hawaryć, znaje biełaruski narod i jaho patreby». Таксама біскупа прасілі нагадаць духавенству ў Беларусі пра ягоны абавязак «nakolki chopić sił i mahćymasci pramaulać pa-biełarusku da ludziej u nawućanni wiery ů kascieli i školi». Каталіцкі іерарх спагадліва паставіўся да беларускай дэлегацыі, але нейкіх практычных вынікаў візіт і заява не мелі.

Аляксюк нічога не сказаў пра наведванне Выканкама Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, але, відавочна, што і той візіт, калі ён наогул адбыўся, меў аналагічны вынік. Усе ўважліва слухалі, спагадалі і... нічога не рабілі. Агульны вынік працы дэлегацыі, паводле Алексюка, можна перадаць адным словам рускай мовы – «вообще»[890].

Ацэньваючы гэты візіт сёння, варта адкінуць эмоцыі, характэрныя для маладых беларускіх палітыкаў, якія з цяжкасцю пазбываліся рэвалюцыйнай эйфарыі. Магчыма, галоўным вынікам дзейнасці беларускай дэлегацыі на чале са Скірмунтам было давядзенне да ведама новага расійскага ўрада рашучага імкнення дзеячаў беларускага руху да аўтаноміі Беларусі і федэралізацыі Расіі, адстойванне нацыянальных інтарэсаў у спрэчках з Літоўскай радай. Таксама важным момантам было наладжванне пастаяннага кантакту паміж Часовым урадам і БНК праз упаўнаважаных апошняга. Такімі паўнамоцтвамі Скірмунт надзяліў Эдварда Будзьку і Аляксандра Ярэміча, пра што паведаміў намесніку міністра ўнутраных спраў Дз. Шчэпкіну[891].

Адначасна гэты візіт паспрыяў актывізацыі сіл, варожых беларускаму руху. Дарэчы, водгукі змагання адчуваліся нават у сталіцы Расіі. Так, газета «Речь» (№ 85 ад 13 красавіка) змясціла пратэст БНК супраць тых заяў, якія рабіліся арганізатарамі I з'езда сялянскіх дэпутатаў Менскай і Віленскай губ.

Ад імя Беларускага нацыянальнага камітэта было заяўлена наступнае: «На белорусском национальном съездзе присутствовало до 150 человек, представители политических партий Белоруссии: Белорусской социалистической грамады, Народно-демократической беспартийной группы, Демократической католической партии и других различных групп, которые в своих декларациях и своим единогласным принятием резолюций определили характер съезда. Таким образом, это был не «так называемый съезд», а действительно съезд белорусских общественных деятелей, работающих уже много лет над делом возрождения Белоруссии, среди которых было немало представителей старой краевой политической партии, имеющей свою историю и заслуги, Белорусской социалистической

---

[890] «Вольная Беларусь». 1917, № 8.

[891] ГАРФ. Ф. 1800, оп. 1, д. 44, л. 2.

грамады. Правильно организованного представительства крестьян и рабочих на этом съезде, как и на съездах других организаций быть не могло, но заявление, что «белорусский народ в лице своих трудовых классов – крестьян и рабочих» в работах национального съезда никакого участия не принимал – совершенно неверно»[892].

Між тым, 20–23 красавіка 1917 г. у Менску адбыўся І з'езд сялянскіх дэпутатаў Менскай і Віленскай губ. Ён сабраў болей 800 дэлегатаў і праходзіў пад старшынствам Фрунзе. Як сведчыць Дакладная запіска яго намесніка Піліпа Караткевіча ад 1 снежня 1917 г. галоўнай задачай арганізатараў было супрацьдзеянне беларускаму руху і рашэнням сакавіцкага з'езда[893]. На з'ездзе панавалі антыбеларускія настроі. Фрунзе нават спрабаваў забараніць прадстаўнікам БСГ і БНК выступаць па-беларуску.

Аўтары артыкула пра Рамана Скірмунта на старонках Польскага слоўніка біяграфічнага Чэслаў Бжоза і Каміль Стэпан сцвярджалі прысутнасць Скірмунта на гэтым з'ездзе і ягоныя намаганні нейтралізаваць уплывы бальшавіцкай фракцыі, якая крытыкавала БНК як «памешчыцкую інтрыгу»[894].

Калі Скірмунт сапраўды быў на сялянскім з'ездзе, то трэба прызнаць мужнасць палітыка, які адстойваў свае погляды ў самых неспрыяльных абставінах. Аднак супрацьстаяць бальшавіцкай прапагандзе на з'ездзе беларускага сялянства было складана. Верагодная прысутнасць на ім Скірмунта магла толькі ўзмацніць атакі на БНК з боку прадстаўнікоў партый сацыялістычнага кірунку. У авангардзе гэтых атак ішлі бальшавікі і эсэры. А на тым самым І з'ездзе дэлегаты прагаласавалі за рэзалюцыю, якая асуджала ідэю палітычнай аўтаноміі Беларусі і выказвалася за абласное самакіраванне ў межах Расійскай рэспублікі.

У адказ БНК звярнуўся да рэгіянальных беларускіх арганізацый з патрабаваннем энергічна пратэставаць супраць прынятых на з'ездзе рэзалюцый. Так, старшыня Магілёўскага Беларускага камітэта 29 красавіка атрымаў тэлеграму з Менску: «На состоявшемся 23 апреля крестьянском съезде Минске председатель Михайлов заявил Бел Нац Ком помещичья интрига. Соц Громада на поводу помещиков. Объявил беспощадную борьбу. Принята резолюция обрусительного характера. Энергично протестуйте. Присылайте протест Весник Мн Губ комиссара. Председатель Скирмунт»[895].

Магілёўцы адрэагавалі праз... месяц. У пратаколе пасяджэння Камітэта ад 24 мая 1917 г. было запісана: «...Выразить протест от имени МБК против действий

---

[892] НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр. 175, арк. 18.

[893] НАРБ. Ф. 4, воп. 1, спр. 98, арк. 188.

[894] Cz. Brzoza, K. Stepan, *Skirmunt Roman (1868–1939)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 185.

[895] Беларускі Дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей: БДАМЛіМ). Ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 58.

и выступлений в г. Минске Михайлова, изложенной в телеграмме председателя Минского комитета Скирмунта»[896].

Сябра БНК Яўсей Канчар таксама ўдзельнічаў у згаданым сялянскім з'ездзе і быў моцна расчараваны пазіцыяй сялянскіх дэлегатаў («белорусские крестьяне поведены по неправильному пути»[897]), а таксама пазіцыяй кіраўніцтва БНК. Паводле ягонай ацэнкі, кіраўніцтва абвінаваціла сялян у адсталасці, неразуменні дзяржаўных, нацыянальных і культурных задач і выкрэсліла яго са сферы сваіх дзеянняў. Стаўку вырашылі рабіць на інтэлігенцыю. Канчар у знак пратэсту падаў заяву пра выхад з Камітэту.

Пазней ён прыгадаў сустрэчу са Скірмунтам і Алексюком на беларускім спектаклі, які адбыўся пасля заканчэння з'езда. Скірмунт прапанаваў Канчару забраць сваю заяву і застацца ў Камітэце, бо ягоны пункт гледжання важны для БНК. Аляксюк запытаў, ці верыць ён у беларускую культуру? Канчар адказаў, што верыць, але мільёны беларускіх сялян адкінутыя ад яе, яны засталіся без нацыянальных правадыроў і зжыліся з «вялікай рускай культурай». Таксама ён заявіў пра ўласны намер ісці ў сялянства і абуджаць у ім нацыянальнае пачуццё. Гэтая ідэя ягоным суразмоўцам падалася невыканальнай, а Яўсей Канчар усё ж выйшаў са складу БНК[898].

Трэба прызнаць, што большасць беларускага сялянства сапраўды была заклапочана не праблемай нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі, а пытаннямі зямлі і міру, а таксама штодзённымі турботамі сацыяльна-эканамічнага характару. Прапаганда агульнарасійскіх сацыялістычных партый, якая сцвярджала «непадзельнасць» Расіі, выкрывала нібыта «буржуазна-памешчыцкі» характар Беларускага нацыянальнага камітэта і «польскую арыентацыю» БСГ, а таксама абяцала сялянам хуткае вырашэнне практычна ўсіх (?!) існуючых праблем, аказалася даволі эфектыўнай. Яны распальвалі сацыяльныя інстынкты ніжэйшых колаў насельніцтва, і беларуская ідэя згарала ў гэтым полымі, не вытрымліваючы канкурэнцыі.

У 1918 г. сацыяліст Аляксандр Цвікевіч адной з галоўных прычын гэтай няўдачы назваў знаходжанне на чале БНК Рамана Скірмунта, «чалавека надзвычай непапулярнага сярод сялянскага насельніцтва»[899]. Гэта ж адзначыў у сваёй працы «Белорусское движение» (1921) іншы прадстаўнік беларускіх сацыялістаў Фёдар Турук: «Факт участия в Белорусском национальном комитете Р. Скирмунта, человека непопулярного среди крестьян и связанного узами идейного родства

---

[896] Тамсама, спр. 136, арк. 28 адв.

[897] Е. С. Канчер, *Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов* (публікацыя В. Скалабана), «Неман». 1993, № 1, с. 147.

[898] Там же, с. 147.

[899] А. Цвикевич, *Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики*. Киев 1918, с. 7.

с польско-литовской ориентацией, был первой крупной политической ошибкой в истории белорусского движения наших дней, которой умело воспользовались противники [...], сумевшие на крестьянских съездах и собраниях рабочих внедрить в сознание широких масс населения Белоруссии убеждение, что "белорусский вопрос в его целом есть просто польско-помещицкая интрига, направленная к отделению Белоруссии от России и порабощению белорусского крестьянства польскими панами"»[900].

Варта прывесці таксама ацэнку сітуацыі аднаго з лідэраў левага крыла ў БСГ Жылуновіча. У 1925 г., згадваючы пра сакавіцкі з'езд і стварэнне БНК, ён адзначаў, што «сам па сабе Нацыянальны Беларускі Камітэт, як скутак з'езду, займае значнае месца ў гісторыі беларускага нацыянальна-рэволюцыйнага руху. Ён адыграў значную ролю і зрабіў бы шмат большую работу, каб на чале яго ня стаў Скірмунт. Гэтая фігура, далёка не адпавядаючая сутнасьці беларускага руху, які выключна грунтаваўся на беларускіх працоўных масах, унясла сабою сумную старонку ў гісторыю яго развіцьця»[901].

Сапраўды, Скірмунт яшчэ з часоў I Дзяржаўнай Думы (1906) меў рэпутацыю абаронцы памешчыцкага землеўладання. Ва ўмовах хуткай радыкалізацыі сацыяльных нізоў, у т. л. сялян, якія былі найбольш заклапочаны вырашэннем аграрнага пытання, постаць кіраўніка БНК выклікала пэўную насцярожанасць. З боку ворагаў беларушчыны яна стала аб'ектам палітычных спекуляцый[902].

А як мясцовая польская супольнасць адрэагавала на лідэрскую ролю Скірмунта ў беларускім руху? Прадстаўнік яе «левай» часткі Ежы Асмалоўскі ў сваім Дзённіку адзначыў з'яўленне ў Менску Беларускага камітэта на чале з добрым знаёмым Раманам Скірмунтам. Пры гэтым ён адразу падкрэсліў «кансерватыўны» характар гэтай арганізацыі, залічыўшы ў «кансерватары» нават А. Смоліча. Скірмунта ён ахарактарызаваў як «колішняга паляка, які абвясціў сябе беларусам». У гэтай характарыстыцы не было іроніі. Асмалоўскі наогул з павагай паставіўся да нацыянальнага выбару Скірмунта. Таксама ў Дзённіку адзначалася пераважна культурніцкая дзейнасць БНК, якая, на яго думку, стала магчымай дзякуючы фінансавай падтрымцы княгіні Радзівіл ды іншых прыхільнікаў беларускага руху[903].

Аднак у маі з польскага боку ўжо прагучала выразная крытыка пазіцыі Скірмунта і ягоных прыхільнікаў сярод мясцовых землеўладальнікаў. Газета «Новы кур'ер

---

[900] Ф. Турук, *Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белоруссов*. Москва 1921, с. 33.

[901] З. Ж. [З. Жылуновіч], *З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. 25 сакавіка 1917 г.*, с. 206.

[902] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 2, арк. 15.

[903] BN. Dział mikroform, akc. 6797 J. Osmołowski, *Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 1 (1914–1917)*, k. 221.

літэўскі» змясціла ананімны артыкул «Пра польскасць на крэсах», аўтар якога, між іншым, звязваў пачаткі беларускага руху з мясцовымі палякамі, што здрадзілі свайму народу[904]. Аўтар заклікаў польскіх чытачоў зберагаць польскасць і не выступаць у якасці «беларусаў польскай культуры». Апошняе ён лічыў «адхіленнем ад нормы» і «надзвычай шкодным» для польскай супольнасці. У якасці прыкладу аўтар прыгадаў інтэрв'ю «аднаго польскага дэпутата» I Дзяржаўнай Думы (імя Р. Скірмунта не называлася) карэспандэнту «Дзенніка Кіеўскага» (1906), у якім дэпутат назваў якраз сябе «беларусам польскай культуры».

Крытык гэтага меркаванага «крывадушша» быў пэўны, што дэкларацыяная падвоеная свядомасць з'яўляецца фактарам, які расколвае польскую супольнасць і перашкаджае нацыянальнай працы. Адначасна ён не бачыў перспектывы для такіх «перакіньчыкаў» у беларускім руху, прадракаючы, што беларусы будуць успрымаць іх толькі як падманшчыкаў.

Раман Скірмунт, які, безумоўна, чытаў «Новы кур'ер літэўскі», павінен быў зразумець, што частка польскай супольнасці, у т. л. мясцовай, пачала яго ўспрымаць як здрадніка, а ягоную беларускую дзейнасць ацэньваць як свядомы раскол польскага руху. Абвінавачванне ўжо прагучала, хоць прысуд яшчэ не быў вынесены...

Між тым, усё больш складаным станавілася становішча Рамана Скірмунта ў беларускім руху. Падобна, што ўжо ў другой палове красавіка ў БНК пачала складвацца свайго роду «антыскірмунтаўская апазіцыя». Атмасфера на пасяджэннях стала напружанай. Беларускія сацыялісты пачалі думаць пра замену кіраўніцтва. Важную ролю адыгрывала і тое, што большасць беларускіх арганізацый на месцах арыентаваліся на БСГ. Адным з ініцыятараў стварэння гэтай апазіцыі быў кіраўнік Менскага бюро БСГ і рэдактар газеты «Грамада» Аркадзь Смоліч[905].

Беларускі даследчык Арсень Ліс трапна заўважыў: «Як на прадстаўнічую дэлегацыю ў Петраград да Часовага ўрада з беларускімі пастулатамі, то былы член Думы, імпазантны Скірмунт, пэўна, падыходзіў. Але штось іншае было дзейсна весці беларускую работу ў свеце, які імкліва радыкалізаваўся, ды ўнутры БНК, у асяроддзі маладых сацыялістаў. [...] Аб поглядах яго не пыталіся: якая каму была патрэба ведаць, што гэты памешчык даў слова безаглядна падпарадкавацца ў будучым рашэнню Устаноўчага сходу – перадаць сваю зямлю сялянам»[906].

Спадзяванні кіраўніцтва БНК на магчымае паяднанне беларусаў на глебе нацыянальнай ідэі паступова слабелі і разбураліся. Сітуацыю, сапраўды, магла палепшыць спроба пэўнага сумяшчэння беларускай ідэі з папулярнай сацыяльна-эканамічнай праграмай або нават падпарадкаванне гэтай ідэі вырашэнню першачарговых сацыяльных праблем, але ў тагачаснай сітуацыі гэта магло прывесці да растварэння беларускіх арганізацый у агульнарасійскім сацыялістычным руху,

---

[904] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 104.

[905] А. Ліс, *Аркадзь Смоліч* (у:) Ліс А. *Выбранае*. Мінск 2014, с. 156.

[906] А. Ліс, *Gloria victis!* Збор твораў. Мінск 2010, с. 89.

дзе дамінавалі прадстаўнікі ўжо рэвалюцыйнага цэнтралізму, і ўрэшце да фактычнай адмовы ад барацьбы за нацыянальныя каштоўнасці і дзяржаўнае самавызначэнне.

Беларускі нацыянальны камітэт спрабаваў ісці тым шляхам, які быў вызначаны сакавіцкім з'ездам. Працягвалася праца па падрыхтоўцы выдання газеты «Вольная Беларусь», значэнне якой Скірмунт выдатна разумеў. Яшчэ да сакавіцкага з'езда на патрэбы «Вольнай Беларусі» было сабрана і перададзена Паўлам Алексюком сакратару рэдакцыі Вандзе Лявіцкай болей 1,5 тыс. руб.[907]

Было створана Таварыства беларускай культуры, якое ў красавіку звярнулася да краёвай інтэлігенцыі з заклікам працаваць на ніве беларускай асветы[908]. Першай рэальнай справай Таварыства сталася абвяшчэнне конкурса (з 1 чэрвеня 1917 г.) падручнікаў для беларускай пачатковай школы[909]. Падтрымліваліся намаганні беларускага духавенства па ўвядзенню беларускай мовы ў дадатковае набажэнства ў касцёл. На пачатку мая 1917 г. у менскіх газетах з'явіліся абвесткі пра стварэнне пры БНК беларускага тэатра. «Першае беларускае таварыства драмы і камедыі» запрашала артыстаў, музыкантаў і спевакоў[910].

8 мая адбыўся агульны сход Беларускага таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны, якое імкнулася пашырыць сваю дзейнасць. Старшынём быў абраны А. Ахрэм-Ахрэмовіч, ягонымі намеснікамі – У. Фальскі і Крынка. Быў пашыраны склад праўлення, аднак «абшарнікаў» там прадстаўляла толькі княгіня М. Радзівіл[911].

14 мая «Новое варшавское утро» паведамляла пра лекцыю «Патрэбнасьць нацыянальнага жыцьця для беларусоў», якая павінна была адбыцца ў гэты ж дзень у будынку Гарадской управы. Прозвішча выступоўцы не згадвалася, але, магчыма, ім быў Шантыр. У 1918 г. у Слуцку выйшла з друку ягоная кніга *Патрэбнасьць нацыянальнага жыцьця для беларусау і самаадзначэньня народу*, у якой аўтар лічыў гонарам працу над адраджэннем Беларусі: «Працаваць над прабуджэньням свайго народу, працаваць над адбудовай вольнай Бацькаушчыны Беларусі, працаваць у карысць, каб яна ня была пагардай другіх. А мы ня нявольнікамі сваей цемры, а роунымі сябрамі другім народам, вялікімі сваімі светам і культурай – якая гэта вялікая доля для нас! Як мы павінны быць гордыя тым, што гісторыя на нас складае гэту вялікую і святую працу»[912].

У маі і чэрвені 1917 г. галоўныя намаганні кіраўніцтва БНК датычылі як прапаганды ідэі аўтаноміі Беларусі і далейшага разгортвання нацыянальна-куль-

---

[907] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 19, арк. 47.

[908] Тамсама, спр. 2, арк. 113.

[909] Тамсама, арк. 16; «Новое Варшавское утро». 1917, № 352.

[910] «Новое Варшавское утро». 1917, № 417.

[911] Тамсама, 1917, 19 мая.

[912] Ф. Шантыр, *Патрэбнасьць нацыянальнага жыцьця для беларусау і самаадзначэньня народу*. Слуцк 1918, с. 25.

турнай дзейнасці, так і захавання адзінства беларускага руху. Таксама трэба было даваць адпор ягоным праціўнікам ужо з рэвалюцыйнага лагеру. Так, 11 мая 1917 г. на старонках газеты «Новое варшавское утро» з артыкулам пра беларускае Адраджэнне выступіў П. Аляксюк. Ён пісаў, што ва ўмовах свабоднай Расіі беларускае Адраджэнне нечакана знайшло новых ворагаў: «На смену гнетущему царизму явились люди из демократических лагерей и, не желая глубже разобраться в нашем прошлом, начали борьбу с этим движением, находя его буржуазным, ведущим к помещичьей кабале, польскому королю и тому подобные дикости. Печальнее всего, что в настоящий момент они привлекают к себе наши крестьянские массы и демократическими выкриками временно сеют рознь между народом и интеллигенцией»[913].

Павел Аляксюк, нягледзячы на сяброўства ў БСГ, быў адным з найбольш актыўных прыхільнікаў пазіцыі Скірмунта. Напрыканцы артыкула ён выказваў надзею на «цвярозы інстынкт» роднага народу, які не можа не быць беларускім і не можа ганьбіць бацькоўскую мову. Ён урэшце пойдзе шляхам Адраджэння, але, каб гэта здарылася, ягоныя правадыры павінны захаваць адзінства.

Відавочна, што ў гэты час найбольш грунтоўным падмуркам гэтага адзінства была ідэя аўтаноміі Беларусі. Раман Скірмунт мог толькі вітаць наступныя радкі з артыкула *А. Жывіцы* (Аркадзь Смоліч) «Зямля» ў першым нумары газеты БСГ «Грамада»: «Нам трэба на ўвесь край беларускі краёвае земства, куды будуць выбіраць па новым справядлівым законе са ўсіх губерній Беларусі, і якое будзе распараджацца ў нашым краі ўсімі тутэйшымі справамі. Як кажуць вучоныя людзі, нам патрэбна аўтаномія краю нашага альбо шырокае мясцовае самакіраванне»[914].

Тэма аўтаноміі была адной з дамінуючых на старонках газеты «Вольная Беларусь», першы нумар якой выйшаў 28 мая 1917 г. Рэдактар Язэп Лёсік ва ўступным артыкуле пісаў: «Ад шчырага сэрца вітаючы вольнасць Дзяржавы Расейскай, мы з набалелаю пакутнаю душою рвемся да новага жыцьця, да культурна-нацыянальнаго адраджэньня нашаго народу. Мы цьверда ведаем, што гэтакаго мамэнту двойчы ня будзе, і што страцім цяпер, таго ня найдзем ніколі. Наша сьвятая павіннасьць, доўг кожнаго і сьвядомаго беларуса ня бавіць часу, а цяпер жа да скліканьня Устаноўчага Сэйму (Учредительного Собрания) аддаць свае сілы і розум на службу многапакутнаго народу [...] Да вялікай працы, браточкі, уставайця! Да змагання за аўтаномію Беларусі, за дэмакратычную рэспубліку Дзяржавы Расейскай!»[915]

Першы нумар газеты Беларускага нацыянальнага камітэта выйшаў з друку ў момант, калі сітуацыя ў Камітэце істотна змянілася. Справа ў тым, што падчас

[913] «Новое Варшавское утро». 1917, 11 мая.

[914] «Грамада». 1917, 18 красавіка (1 мая).

[915] «Вольная Беларусь». 1917, № 1.

сесіі БНК 13–15 мая 1917 г. адбылося сур'ёзнае сутыкненне паміж сябрамі БСГ і прыхільнікамі пазіцыі Рамана Скірмунта.

Гадлеўскі ў аглядзе беларускага палітычнага жыцця ў Менску ў 1917–1918 гг. прыгадваў, што падчас сесіі яго прыемна ўразіла імкненне прысутных землеўласнікаў (Э. Вайніловіча, княгіні М. Радзівіл, князя Г. Друцкага-Любецкага) вярнуцца «да таго народу, з якога яны вышлі». Так, Друцкі-Любецкі ў сваёй прамове заявіў, што паходзіць з роду беларускіх князёў і заявіў, «што ён не вінаваты, што над яго калыскай пяялі не беларускія, а польскія песні». Аднак большасць сяброў Камітэта вельмі крытычна паставілася да гэтага «беларускага павароту» землеўласнікаў. Як заўважыў В. Гадлеўскі, «надыходзіў такі час, што ад князёў і буйных земляўласьнікаў трэба было быць як найдалей, і прыхільнікі Скірмунта, адчуўшы гэты настрой да іх сяброў сэсіі Б. Нац. Камітэту, вышлі, каб болей ужо не вярнуцца. Спужала іх радыкальнасьць беларускага руху»[916].

Гэтыя ўспаміны сведчаць пра палітычнае паражэнне Р. Скірмунта. Яны не дазваляюць прыняць меркавання даследчыкаў У. Ладысева і П. Брыгадзіна, якія заявілі, што ўдзел Э. Вайніловіча, М. Радзівіл і Г. Друцкага-Любецкага ў майскай сесіі БНК дапамог Скірмунту заблакаваць патрабаванні сацыялістычнай часткі Камітэта па яго далейшай дэмакратызацыі і спалучэнні палітычнай і нацыянальна-культурнай працы БНК з праграмай сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў[917].

У складзе Камітэта засталіся толькі Скірмунт і княгіня Радзівіл. Апошняя ніякай палітычнай ролі не адыгрывала, застаючыся фундатаркай беларускай арганізацыі. А вось становішча Скірмунта істотна змянілася. Магчыма, менавіта падчас майскай сесіі або неўзабаве пасля яе ён адмовіўся ад пасады старшыні БГК і застаўся ў ягоным складзе ў якасці звычайнага сябра. Скірмунт згадаў пра гэта ў прамове на з'ездзе беларускіх арганізацый 9 ліпеня 1917 г.: «Паказывалі на мяне, што шкоджу толькі працы Камітэту, стаючы на чэле яго. Я зараз жэ зьняў з сябе паўнамочыя старшыні Камітэту і застаўся простым яго сябрам»[918].

Варта прыгадаць, што намеснікамі старшыні БНК («таварышамі») былі абраны П. Аляксюк і У. Фальскі. Падобна, што яны падзялілі паміж сабою абавязкі старшыні.

У апазіцыі да сацыялістаў

Майская сесія выразна высветліла імкненне БСГ манапалізаваць Беларускі нацыянальны камітэт, выдаліць з яго нязгодных з сацыялістычнай праграмай сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў і нават тых, хто прымаў гэтую праграмную

---

[916] В. Гадлеўскі, *Зь беларускага палітычнага жыцьця ў Менску*, «Спадчына». 1997, № 5, с. 23.

[917] У. Ладысеў, П. Брыгадзін, *Паміж Усходам і Захадам...*, с. 27.

[918] «Вольная Беларусь». 1917, № 11.

му, але прадстаўляў заможныя колы грамадства. Праўда, у маі 1917 г. сябры БСГ, відаць, яшчэ не адчувалі сябе досыць упэўнена для цалкам самастойнага вядзення палітычнай дзейнасці, і Скірмунт застаўся ў складзе Камітэта.

Па выніках майскай сесіі БНК з'явілася дэкларацыя, якая ўпершыню была апублікавана 3 чэрвеня 1917 г. у газеце «Новое варшавское утро» на рускай мове. «Вольная Беларусь» з арыгінальным беларускамоўным тэкстам выйшла толькі 11 чэрвеня. Дэкларацыя асвятляла пазіцыі Камітэта па найбольш важных задачах яго дзейнасці, якія былі пастаўлены яшчэ на сакавіцкім з'ездзе. У першым параграфе БНК яшчэ раз выказваўся за аўтаномію Беларусі ў межах федэратыўнай і дэмакратычнай Расіі. Пры гэтым падкрэсліваліся тыя «шырокія магчымасці», якія нібыта стварыла для Беларусі Расійская рэвалюцыя. Адначасова дэкларацыя перасцерагала ад людзей, што выступаюць ад імя БНК за далучэнне Беларусі да Польшчы ці нейкай іншай краіны і абвяшчала іх «правакатарамі».

Апошні абзац даносіць да нас водгук ужо згаданай дыскусіі на сесіі БНК. Відавочна, што сацыялістаў хвалявала не толькі праблема «памешчыка Скірмунта», але таксама праблема «паляка Скірмунта». Тут варта прыгадаць ліст Я. Канчара да Р. Скірмунта ад 30 сакавіка, дзе ўжо адчуваўся пэўны «нацыянальны недавер». Магчыма, што адказ кіраўніка БНК, як і ягоная дзейнасць на пэўны час задаволілі беларускіх сацыялістаў. Аднак умацаванне пазіцый БСГ у сувязі з агульнай радыкалізацыяй грамадства, а таксама той факт, што Скірмунт як віцэ-старшыня МТСГ захоўваў сувязі з мясцовай польскай супольнасцю, ізноў актуалізавалі гэтую праблему. Трэба прызнаць дамінаванне сярод беларускіх сацыялістаў свайго роду «філасофіі падазрэння» ў адносінах да сацыяльна «чужых», якая знішчала надзею на адзінства беларускіх сіл. Гэтая «філасофія падазрэння» аказалася надзвычай жывучай у беларускай гісторыі.

Можна меркаваць, што гэты «польскі абзац» дэкларацыі быў пэўным папярэджаннем Скірмунту і ягоным прыхільнікам, якія імкнуліся да польска-беларускага паразумення. Менавіта так можна патлумачыць прысутнасць Скірмунта ў МТСГ. Таксама варта яшчэ раз згадаць асновы краёвай ідэалогіі. «Краёвае» або палітычнае разуменне нацыі было платформай міжнацыянальнага паразумення дзеля будучыні Краю як Радзімы розных народаў. Цалкам верагодна, што пошукі саюза з сялянствам, асабліва відавочныя ў дзейнасці Скірмунта ў сакавіку 1917 г., таксама былі звязаны з ягоным разуменнем краёвай ідэі як падмурку саюза розных сацыяльных груп.

У майскай дэкларацыі БНК дэкларавaў свабоду веравызнання і заклікаў беларусаў незалежна ад іх канфесійнай прыналежнасці працаваць разам над «стварэннем ядынай беларускай культуры». Вырашэнне аграрнай праблемы было аднесена да кампетэнцыі Усерасійскага Устаноўчага Схода і Беларускай краёвай рады. Апрача таго, Камітэт выказваўся за нацыянальны характар беларускай школы, а таксама за заключэнне міра без анексій і кантрыбуцый на аснове права нацый на самавызначэнне. Неабходнай умовай міра абвяшчаўся «зварот забранай

часткі этнаграфічнай Беларусі і далучэньне яе, аб'яднанай з рэштай Беларусі, да Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі»[919].

Гэтае настойлівае падкрэсліванне прыналежнасці Беларусі да рэвалюцыйнай Расіі таксама засведчыла дамінаванне ў БНК сацыялістаў. Аднак сыход Скірмунта з пасады старшыні пакуль заставаўся ўнутранай справай Камітэта. Магчыма, яго сябры баяліся, што інфармацыя пра раскол пашкодзіць аўтарытэту галоўнай беларускай арганізацыі. Усе перамены павінен быў легалізаваць наступны з'езд беларускіх арганізацый, які першапачаткова быў запланаваны на 29 чэрвеня[920].

Аднак на пачатку лета 1917 г. БСГ атрымала палітычнага канкурэнта. Сацыялістычная плынь беларускага руху папоўнілася Беларускай народнай партыяй сацыялістаў (БНПС). 15–16 мая 1917 г. у Менску адбыўся сход, на якім было сфарміравана Арганізацыйнае бюро на чале з настаўнікам Язэпам Сушынскім. У яго склад увайшлі Антон Лявіцкі (намеснік старшыні), Самуіл Плаўнік (*Змітрок Бядуля*) як казначэй і Спіргоба (сакратар). Арганізатары заявілі пра надзвычайную важнасць аграрнага пытання і звярнулі ўвагу на неабходнасць улічваць пры яго вырашэнні «краёвыя асаблівасці і ўмовы мясцовага жыцця»[921]. Таксама на 22 мая быў анансаваны мітынг «народных сацыялістаў». У перыядычным друку адсутнічае інфармацыя пра гэты мітынг, але Кастусь Езавітаў ва ўспамінах (1943) заявіў, што менавіта на ім была прынята праграма партыі і абраны яе Камітэт на чале з Лявонам Зайцам[922].

У беларускай гістарыяграфіі стварэнне і дзейнасць гэтай партыі звязваюць з Раманам Скірмунтам. Так, гісторык Мікалай Сташкевіч лічыў, што Скірмунт пачаў яе ствараць яшчэ напрыканцы 1916 г. (?!) Ён жа сцвярджаў, што пасля канчатковага афармлення ў 1917 г. да партыі далучылася «група буйных памешчыкаў на чале з Р. Скірмунтам»[923]. Аднак меркаванне Сташкевіча не было падмацавана гістарычнымі крыніцамі.

Гэтую інфармацыю пазней паўтаралі У. Ладысеў і П. Брыгадзін[924], С. Хоміч[925]. Пры гэтым у пераліку найбольш вядомых сяброў БНПС звычайна згадваліся таксама П. Аляксюк, А. Лявіцкі, В. Чавусаў, Ф. Стульба, пратаірэй А. Кульчыцкі, генерал К. Кандратовіч, С. Плаўнік, А. Багдановіч, Я. Сушынскі. Згадкі пра дачыненне Скірмунта да стварэння БНПС не суправаджаліся спасылкамі на гістарычныя крыніцы.

Між тым, такія крыніцы ёсць, і яны пацвярджаюць прыналежнасць Рамана

---

[919] «Вольная Беларусь». 1917, № 2.

[920] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 2, арк. 19.

[921] «Новое Варшавское утро». 1917, 20 мая.

[922] К. Езавітаў, *Скірмунт раскалывае адзінства беларускага грамадства*, «Раніца». 1943, № 4.

[923] *Октябрь 1917 г. и судьбы политической оппозиции в 3-х частях.* Под ред. Энтина Э. М. Часть 2. Гомель 1993, с. 80–81.

[924] У. Ладысеў, П. Брыгадзін. *Паміж Усходам і Захадам...*, с. 14.

[925] *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII–пачатку XXI ст.*, с. 326.

Скірмунта да Народнай партыі сацыялістаў. У фондзе 582 («Беларуская Народная Рэспубліка») Цэнтральнага Дзяржаўнага архіва Літвы захаваўся праект праграмы партыі са спісам яе сяброў на адвароце. Ён быў апублікаваны ў зборніку «Архівы БНР», падрыхтаваным да друку Сяргеем Шупам[926].

У гэтым спісе фігуравалі Р. Скірмунт, П. Аляксюк, А. Уласаў, А. Лявіцкі, П. Камароўскі, генерал К. Кандратовіч, кс. В. Гадлеўскі, кс. Каральчук, В. Русецкі, праваслаўныя святары Кульчыцкі, Ачакоўскі і Васюкевіч, Т. Вернікоўскі, К. Гадыцкі-Цвірка, Р. Зямкевіч, Г. Крэпскі, Акуліч, Чаховіч, Герлятовіч і Круглік (пасля прозвішча апошняга пастаўлены знак пытання). Таксама пазначана, што шляхам кааптацыі да БНПС далучыліся П. Мядзёлка, ксёндз А. Цікота, менскі біскуп Э. О'Рурк, Кузьміцкі, Турчыновіч і Раткевіч. Не ўсе партыйцы пакінулі прыкметны след у гісторыі, але постаці вядомых нам беларускіх дзеячаў і святароў выклікаюць сумніў ў іх шчырай прыхільнасці да сацыялістычнай ідэалогіі. Але для нас важная прысутнасць Скірмунта ў згаданым спісе.

Пра ролю Скірмунта ў стварэнні гэтай партыі ў 1943 г. распавёў Кастусь Езавітаў. Ён сцвярджаў, што партыя была створана групай беларускай інтэлігенцыі, якая «не жадала сварыцца з Р. Скірмунтам», а таксама некалькімі менскімі мяшчанамі, якім Скірмунт нібыта «параіў» увайсці ў новую партыю[927].

Галоўнымі мэтамі дзейнасці БНПС абвяшчалася адраджэнне беларускай культуры і ўсебаковае развіццё нацыянальнага жыцця «на фундаменці інтарэсоў працуючага народу», а таксама кіраванне жыццём Беларускага краю да моманту, калі зямля, прылады працы і яе вынікі стануць агульнай уласнасцю ўсяго народу. Партыя выступала за федэратыўнае і дэмакратычнае ўладкаванне Расіі, патрабавала аўтаноміі Беларусі на чале з Беларускай краёвай радай і гарантавала роўнасць усім нацыянальным меншасцям Беларусі.

Цэнтральным у праграме быў раздзел, прысвечаны зямельнаму пытанню. Зямля і ўсе яе багацці, а таксама воды абвяшчаліся агульнанароднай уласнасцю. Права карыстання зямлёй належала тым, хто на ёй працаваў без прыцягнення наёмных работнікаў. Галоўным распараджальнікам зямлі з яе багаццямі, а таксама лесу станавілася Беларуская краёвая рада, абраная агульным, тайным, роўным і прамым галасаваннем. Нацыяналізаваныя землі паступалі ў Нацыянальны народны фонд, з якога ў адпаведнасці з працоўнай нормай меркавалася надзяляць беззямельных і малазямельных сялян. Прычым землі кабінецкія, казённыя, удзельныя, царкоўныя, а таксама падараваныя каралямі Рэчы Паспалітай і расійскімі імператарамі, або набытыя ў гады Першай сусветнай вайны ўключаліся

---

[926] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі.* Уклад.: Сяргей Шупа (уклад., падрыхтоўка тэксту, камент., пер.). Вільня, Нью-Ёрк, Менск, Прага 1998, т. 1, кн. 1, с. 5; ЦДАЛ. Ф. 582, воп. 2, спр. 5, арк. 9–9 адв.

[927] К. Езавітаў, *Скірмунт раскалывае адзінства беларускага грамадства,* «Раніца». 1943, № 4.

ў Нацыянальны народны фонд бясплатна. Сялянскія надзельныя землі і дробныя надзелы, якія не перавышалі працоўнай нормы, заставаліся ў прыватнай уласнасці. Дзеля выключэння прыватнаўласніцкіх зямель з гандлёвага абароту права іх набыцця давалася толькі Нацыянальнаму народнаму фонду. Захоўвалася палажэнне аб выкупе: землі, набытыя «за грошы запрацаваныя», павінны перайсці да народа «за памяркоўную плату» са сродкаў Нацыянальнага фонда.

Гэты раздзел сведчыў пра пэўныя перамены ў поглядах Скірмунта на сутнасць аграрнай рэформы ў Беларусі. Рызыкну выказаць меркаванне, што перамены былі абумоўлены ў першую чаргу радыкалізацыяй сацыяльнага жыцця і не з'яўляліся вынікам пэўнай эвалюцыі поглядаў палітыка ў сацыялістычным накірунку.

Таксама планаваўся кантроль Краёвай рады над дзейнасцю заводаў і фабрык, 8-гадзінны працоўны дзень, сістэма страхавання, ахова жаночай і дзіцячай працы. Прадугледжвалася нацыяналізацыя школы і ўвядзенне бясплатнага навучання ва ўсіх тыпах школ[928]. Такім чынам, у праграме выразна дамінавала ідэя аўтаноміі Беларусі і прапановы «народніцка-сацыялістычнага» характару па вырашэнні аграрнай праблемы. Многія палажэнні «тыповай» праграмы сацыялістычнай партыі адсутнічалі. Відавочна, што Скірмунт і ягоныя прыхільнікі паспрабавалі змагацца з сацыяльным радыкалізмам сяброў БСГ на іх жа тэрыторыі.

У дакуменце фігураваў адрас БНПС: Мінск, вул. Захар'еўская, 24, «Беларуская кнігарня». Тут можна было атрымаць патрэбную інфармацыю, напр., друкаваную праграму БНПС[929] і нават уступіць у партыю. Дарэчы, існаванне друкаванага варыянта партыйнай праграмы сведчыць пра тое, што партыйцы шмат увагі надавалі агітацыі і сур'ёзна ставіліся да перспектыў БНПС.

Таксама можна сцвярджаць, што ўзнікненне БНПС у Менску было звязана з актывізацыяй дзейнасці агульнарасійскай Партыі народных сацыялістаў («энэсаў»). Якраз у маі–чэрвені 1917 г. адбываўся хуткі рост яе арганізацый, а ў чэрвені 1917 г. яна аб'ядналася з *трудовиками* і атрымала назву «Трудовой народно-социалистической партии» (ТПНС)[930].

Многія палажэнні гэтай партыі адпавядалі праграме БНК і маглі задаволіць большасць дзеячаў беларускага руху. Так, па аграрным пытанні партыя выступала за нацыяналізацыю земляў, г. зн. за іх перавод у агульнадзяржаўную ўласнасць з наступнай перадачай працоўнаму насельніцтву. Пры гэтым ТПНС імкнулася не дапусціць «анархічных выступленняў на глебе аграрных адносін», а таксама прадухіліць крызіс гаспадаркі[931]. Праграма прадугледжвала агульнадаступную і абавязковую

---

[928] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 3, арк. 11.

[929] БДАМЛіМ. Ф. 3, воп. 1, спр. 150.

[930] А. В. Сыпченко, *Трудовая народно-социалистическая партия: идеология, программы, организация, тактика (1906 г.–середина 1920-х гг.)*. Автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора исторических наук. Самара 2006, с. 34.

[931] *Программы главнейших русских партий*. [Москва 1917], с. 35.

пачатковую адукацыю на роднай мове. Будучыню Расіі яна звязвала з усталяваннем федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі, якая павінна забяспечыць свабоднае нацыянальнае развіццё кожнаму народу ў рамках шырокай аўтаноміі[932].

Аўтарытэт гэтай партыі ўзмацніўся напрыканцы вясны – напачатку лета 1917 г., калі яна прыйшла да ўлады. Народныя сацыялісты ўзначалілі міністэрства харчавання (А. Пашахонаў) і міністэрства юстыцыі (А. Зарудны).

Варта адзначыць, што пасля Лютаўскай рэвалюцыі вектар грамадскага развіцця безупынна змяшчаўся ў бок найбольш радыкальных левых партый. У сувязі з гэтым ТПНС паступова ператварылася ў цэнтрысцкую партыю, а пазней апынулася нават на «правым фланзе». Гэты дрэйф быў абумоўлены прынцыповым адказам народных сацыялістаў ад радыкальных дзеянняў і дыктатуры. Улетку стала відавочным іх супрацьстаянне бальшавікам.

Радыкалізацыя грамадскага жыцця ў Беларусі, імкненне БСГ манапалізаваць беларускі рух рабіла Партыю народных сацыялістаў прывабнай для той часткі беларускіх палітыкаў ліберальнай арыентацыі, якія выступалі супраць левага радыкалізму. Сярод іх апынуўся і Павел Аляксюк, які з канца 1916 і да лета 1918 г. звычайна быў побач з Раманам Скірмунтам. Напрыканцы чэрвеня 1917 г. «Новое варшавское утро» апублікавала ягоны адказ на крытыку праграмы БНПС, з якой «сацыяліст-эканаміст» Пратасевіч выступіў на старонках газеты «Минский голос». Ён абвінавацiў народных сацыялістаў у абароне інтарэсаў буйных землеўласнікаў. Аляксюк даказваў неабгрунтаванасць такіх абвінавачванняў. Ён працытаваў некалькі палажэнняў праграмы БНПС, якія сцвярджалі, што ўся зямля павінна быць агульнанароднай уласнасцю, а карыстацца зямлёй могуць толькі тыя, хто жыве з уласнае працы і не наймае работнікаў. Таксама ён сцвярджаў, што «ўся зямля знаходзіцца пад загадам Беларускай Краёвай Рады, выбранай усім тутэйшым народам, агульным, закрытым, роўным, простым галасаваньнем»[933].



Павел Аляксюк. Фотаздымак пачатку 1920-х гг.

У маі і чэрвені 1917 г. БНПС, імкнучыся знайсці падтрымку працоўных мас, правяла ў Менску некалькі мітынгаў, але шырокага розгаласу не атрымала. Тым не менш, пар-

[932] Там же, с. 37.

[933] «Новое Варшавское утро». 1917, 23 июня.

тыя ўдзельнічала ў ліпеньскім з'ездзе беларускіх партый і арганізацый як галоўны апанент БСГ і спрабавала не дапусціць скасавання Беларускага нацыянальнага камітэта.

Пра гэты з'езд гаворка яшчэ наперадзе, а пакуль варта звярнуць увагу на актывізацыю польскіх арганізацый у Менску і даць ацэнку падазрэнням дзеячаў БСГ у прапольскай арыентацыі Скірмунта. Магчыма, боязь сацыялістаў была абумоўлена выразным ажыўленнем дзейнасці польскіх арганізацый на Меншчыне. Варта нагадаць, што польская супольнасць Менскай губ. яшчэ напярэдадні Першай сусветнай вайны адыгрывала істотную ролю ў гаспадарчым і грамадска-палітычным жыцці рэгіёна. У адпаведнасці з «моўнай» канцэпцыяй вызначэння нацыянальнасці ў самім Менску ў 1897 г. 11,4 % насельніцтва былі палякамі[934]. Большасць беларускіх даследчыкаў упэўнена, што гэтыя паказчыкі даволі дакладна адлюстроўваюць сапраўдную колькасць палякаў у горадзе. Даследчыкі з Польшчы звычайна крытычна ставяцца да «моўнага» крытэрыя вызначэння нацыянальнасці, падкрэсліваючы, што расійская афіцыйная статыстыка, як і палітыка ўладаў, імкнуліся мінімалізаваць польскую прысутнасць. Для высвятлення нацыянальнай структуры насельніцтва яны выкарыстоўваюць таксама дадзеныя па канфесійнай прыналежнасці. Аўтар адной з найбольш грунтоўных прац па нацыянальнай структуры насельніцтва Беларусі ў XX ст. Пётр Эбэрхардт сцвердзіў, што ў 1897 г. палякі складалі 15,9 % насельніцтва Менска[935]. Паводле ягоных падлікаў, у 1909 г. амаль кожны чацвёрты жыхар Менскага пав. (24,1 %) быў палякам[936].

Вядома, што ўплыў на гаспадарчае і грамадска-палітычнае жыццё залежаў не столькі ад колькасці палякаў, колькі ад іх сацыяльнай, эканамічнай і культурнай пазіцыі. Паводле дадзеных МУС, у 1905 г. у Менскай губ. сярэдняе і буйное польскае землеўладанні (больш за 150 дзес.) складала 52,4 % усіх прыватнаўласніцкіх зямель[937]. Палякі традыцыйна дамінавалі ў Гарадской думе Менска, якая выбіралася з «вярхушкі» гараджан. У адпаведнасці з Гарадавым палажэннем 1892 г. правам выбіраць і быць выбраным у Думу валодала менш за 1 % менчукоў[938]. Напрыканцы XIX–напачатку XX ст. прэзідэнтамі горада былі граф Караль Чапскі, Мечыслаў Райкевіч, Міхал Валовіч, Мечыслаў Доўнар-Запольскі, Станіслаў Стэфановіч і Станіслаў Хжанстоўскі[939]. Адзін з тагачасных польскіх

---

[934] *Первая всеобщая перепись населения Российской империи. 1897 г. Вып. XXII. Минская губ.* Санкт-Петербург 1904.

[935] П. Эберхардт, *Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі: 1897–1989.* Менск 1995, с. 50.

[936] Тамсама, с. 67.

[937] А. Смалянчук, *Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905–1907 гг.* Гародня 2000, с. 38.

[938] З. В. Шибеко, С. Ф. Шибеко, *Минск. Страницы жизни дореволюционного города.* Минск 1990, с. 29.

[939] A. Chwalba, *Historia Polski. 1795–1918.* Krakow 2000, s. 409.

дзеячаў Мечыслаў Пароўскі ўспамінаў, што ў 1909 г. Гарадская рада складалася з 35-ці палякаў і толькі 7-х прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў[940].

Роля польскай супольнасці Менска яшчэ больш выросла пасля наплыву бежанцаў з Каралеўства Польскага. Менск фактычна стаўся адным з цэнтраў польскага руху. Існуючыя польскія дабрачынныя арганізацыі займаліся таксама культурна-асветніцкай дзейнасцю, умацоўваючы пазіцыі польскай культуры на Меншчыне.

Як ужо адзначалася, у жніўні 1915 г. у Менску пачала выдавацца штодзённая польская газета «Новы кур'ер літэўскі», якая даволі крытычна ставілася да беларускага руху. Так, увесну 1916 г. аўтар артыкула «Тонкая праца» ахарактарызаваў беларускі рух як антыпольскую інтрыгу расійскіх уладаў, а на тэрыторыі Віленшчыны – нямецкіх[941]. Аднак увесну 1917 г. газета адмовілася ад канцэпцыі «інтрыгі» і пачала станоўча ацэньваць беларускую палітычную дзейнасць. «Новы кур'ер» прыхільна сустрэў сакавіцкі з'езд беларускіх арганізацый і стварэнне БНК. Аўтары публікацый абяцалі падтрымаць аўтаномію Беларуска-Літоўскага краю[942]. «Новы кур'ер» змясціў цікавы і падрабязны рэпартаж з беларускага з'езда, напісаны ў прыязнай да беларусаў танальнасці. Газета рэгулярна паведамляла пра беларускія палітычныя сходы і мітынгі. На яе старонках знайшлося таксама месца для адлюстравання пазіцыі «беларусаў польскага паходжання». Так, адзін з іх у апублікаваным лісце ў рэдакцыю сцвярджаў, што хоць паводле паходжання з'яўляецца палякам, але лічыць сваім абавязкам «працаваць дзеля дабрабыту таго краю, у якім нарадзіўся»[943].

Наогул, з пачаткам рэвалюцыі дзейнасць польскай грамадскасці актывізавалася. Гэтаму моцна паспрыяў Зварот Часовага ўрада да палякаў ад 16 (29) сакавіка 1917 г. Урад Расіі з пэўнымі агаворкамі (санкцыя Устаноўчага Схода і ваенны саюз з Расіяй) выказаўся за стварэнне незалежнай польскай дзяржавы. 21 сакавіка 1917 г. было апублікавана распараджэнне Часовага ўрада пра адмену ўсіх антыпольскіх абмежаванняў.

Важнай публічнай праявай польскасці ў Менску сталася ўрачыстае святкаванне чарговай гадавіны Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Упершыню менскія палякі атрымалі магчымасць святочна адзначыць гэтую дату. Свята пачалося з набажэнства ва ўсіх касцёлах. Потым удзельнікі святкавання, сярод якіх вылучаліся дэлегаты з'езда палякаў-вайскоўцаў Заходняга фронту, прайшлі па горадзе дзвюма працэсіямі, якія сустрэліся каля касцёла на Залатой горцы. Тут адбыўся мітынг. Прамоўцы казалі пра значэнне Канстытуцыі 3 мая, пра становішча польскай нацыі і яе перспекты-

---

940 ZNiO. Dział rękopisow. Sygn. 13542/II. M. Porowski, *Wspomnienia. 1904–1918*, k. 48.

941 «Nowy Kurier Litewski». 1916, Nr 85.

942 Ibidem, Nr 83.

943 D. Tarasiuk, *Kwestja białoruska w pogladach mińskich Polakow (1917–1918)* (у:) *Нацыянальныя пытанні*: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў. Рэдкал. Э. Дубянецкі і інш. Мінск 2001, с. 189.

вы. Закончылася святкаванне каля касцёла св. Сымона і Алены. А познім вечарам у Менску яшчэ чыталіся лекцыі пра польскую гісторыю на польскай і беларускай мовах[944]. Марыя Чапска прыгадвала шматлюднасць гэтага святкавання і слёзы радасці ягоных удзельнікаў, якія не маглі стрымаць эмоцый[945]. Міхаліна Даманьска ва ўспамінах сцвярджала, што ва ўрачыстасцях удзельнічала каля 40 тыс. чал.[946]

Аднак, насамрэч, адзінства сярод польскай супольнасці Менска не было. Тая ж М. Чапска распавяла пра польскі сход у вялікай зале Менскага сельскагаспадарчага таварыства, ініцыяваны Раманам Скірмунтам і Эдвардам Вайніловічам. Гаворка ішла пра будучыню Беларускага краю. Паводле Чапскай, большасць залы выказалася за Беларусь у складзе Польшчы. Супраць далучэння да Польшчы выступілі толькі Скірмунт і Вайніловіч, што выклікала абурэнне прысутных.

Аўтарка канстатавала, што большасць польскіх землеўласнікаў адарвалася ад «беларускай глебы» і не жадала разумець асаблівасцяў Краю, прынамсі, не надавала ім значэння: «Мы ўсе любілі наш родны край. Народжаныя і выхаваныя ў Беларусі, мы б ніколі яе не пакінулі, але мы не заўважалі ягонай адметнасці і ўжо крышталізаванай нацыянальнай свядомасці. За стагоддзі польскага дамінавання ў Літве і Беларусі эліта нацыі з вялікай для яе шкодай паланізавалася і адарвалася ад сваёй глебы.

Нашыя суседзі, вялізная большасць землеўласнікаў і менскай інтэлігенцыі выраслі на беларускай глебе, але ўзбагаціўшыся і атрымаўшы набілітацыю, як Вайніловічы, Багдановічы, Федаровічы, Трэпкі, Ёдкі ды інш., паступова далучаліся да прышлага польскага элементу, засвойваючы мову, звычаі і свядомасць каланізатараў, узбагачаючы іх энергіяй і геройствам, замест таго, каб ствараць эліту ўласнай нацыі. Тое ж самае адбывалася ў этнаграфічнай Літве, аналагічна было з дынастыямі Чартарыскіх, Сангушкаў, Сапегаў, Радзівілаў, спаланізаваных так, як і ўся літоўска-беларуская шляхта.

І таму, калі перад менскім сходам было пастаўлена пытанне, ці Беларусь павінна існаваць як незалежная рэспубліка, ці яна мусіць як да падзелаў быць паяднанай з Польшчай, мы ўсе ў вялізнай большасці галасавалі за гэтае паяднанне. Не ведаю, ці былі на тым сходзе нацыянальна свядомыя беларусы, і як бы яны паставіліся да яго, каб былі. Нам, хто галасаваў за паяднанне з Польшчай, здавалася цалкам натуральным, што гэты край дзеля абароны ад агрэсіўнай Расіі павінен шукаць апірышча ў Польшчы. Супраць паяднання з Польшчай выказаліся абодва кіраўнікі сходу – Раман Скірмунт і Эдвард Вайніловіч. Мы былі абураныя на іх, бо не разумелі праблемы»[947].

---

[944] «Новое Варшавское утро». 1917, 21 апреля.

[945] M. Czapska, *Czas odmieniony.* Paryz 1978, s. 45.

[946] D. Tarasiuk, *Między nadzieją a niepokojem. Działalnosc społeczno-kulturalna i polityczna Polaków na wschodniej Białorusi w latach 1905–1918.* Lublin 2007, s. 114–115.

[947] Czapska, *Czas odmieniony*, s. 42–43.

У гэтых успамінах Скірмунт выступае як прыхільнік незалежнасці Беларусі ўжо ўлетку 1917 г. Але больш верагодна, што ў прамовах Скірмунта і Вайніловіча гаворка ішла толькі пра незалежнасць Беларускага краю ад Польшчы.

Інфармацыя пра менскі сход таксама дазваляе яшчэ раз прыгадаць сцвярджэнне Гадлеўскага наконт імкнення Скірмунта стварыць беларускую «абшарніцкую партыю». Магчыма, тое ж меў на ўвазе Эўгеніуш Ромэр, які ў сваім дзённіку ў чэрвені 1917 г., разважаючы над будучыняй Літвы і Беларусі, прыгадаў намер Скірмунта стварыць арганізацыю, мэтаю якой было б самавызначэнне Беларусі: «Літва нашая маўчыць, бо ў асноўным знаходзіцца ў руках немцаў, але калі ход вайны зноў верне яе ў расійскую дзяржаву, то будзе абавязкова імкнуцца да аўтаноміі. Цёмная і несвядомая Беларусь не мае дастаткова інтэлігенцыі, каб распачаць самастойную палітыку. Здаецца, Раман Скірмунт носіцца з праектам стварэння арганізацыі, якая будзе імкнуцца да самавызначэння Беларусі, але асабіста сумняваюся, каб пры адсутнасці супрацоўнікаў, што выйшлі з беларускага народу, арганізацыя, якую стварылі і якой кіруюць людзі іншай нацыянальнасці і культуры, можа здабыць сабе прызнанне ўсяго краю і адыграць якую-небудзь ролю»[948]. Відавочна, што Ромэр меў на ўвазе дзейнасць Скірмунта сярод мясцовай польскай супольнасці.

Наяўнасць сярод палякаў Меншчыны розных меркаванняў пра будучыню Беларускага краю і ягоныя стасункі з «Каронай» істотна ўплывала на арганізацыйную дзейнасць польскіх актывістаў. У польскім менскім друку паведамлялася пра аднаўленне Польскага дэмакратычнага саюза (К. Дзямідзецкі-Дзямідовіч), стварэнне Польскага вайсковага саюза, Польскай мацежы школьнай, Нацыянальнага саюза польскай моладзі, Польскага палітычнага клуба ды інш. Таксама ўжо ў сакавіку заўважальныя намаганні па стварэнні адзінага польскага каардынацыйнага цэнтра для ўсіх арганізацый Меншчыны. 11 сакавіка 1917 г. «Новы кур'ер літэўскі» апублікаваў заклік Часовага арганізацыйнага польскага камітэта (старшыня У. Крыньскі) аб правядзенні з'езда прадстаўнікоў польскіх арганізацый Беларусі з мэтаю стварэння «Рады польскіх саюзаў»[949]. Аднак толькі напрыканцы вясны гэтыя намаганні далі плён.

21–23 мая ў Менску адбыўся сход прадстаўнікоў польскіх арганізацый Меншчыны, якія аб'ядналіся ў Польскую раду Менскай зямлі (ПРМЗ)[950]. Галоўнай мэтай Рады абвяшчалася абарона інтарэсаў мясцовай польскай грамадскасці. На сходзе таксама выказвалася ідэя стварэння падобнай арганізацыі для ўсёй Беларусі, а потым і для ўсіх г. зв. «крэсаў». Ягоныя рашэнні і прамовы ўдзельнікаў не

---

[948] E. Romer, *Dziennik. 1914–1918.* T. 1. Warszawa 1995, s. 555.

[949] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 67.

[950] Гісторыя стварэння і дзейнасці ПРМЗ грунтоўна прадстаўлена ў кнізе: D. Tarasiuk, *Między nadzieją a niepokojem. Działalnosc społeczno-kulturalna i polityczna Polakow na wschodniej Białorusi w latach 1905–1918* (Lublin, 2007).

пакідаюць сумневу ў тым, што ПРМЗ падтрымлівала ідэю аўтаноміі Беларусі. Так, у вырашэнні аграрнай праблемы галоўная роля адводзілася аўтаномнаму сейму. Пры абмеркаванні нацыянальнага пытання было выказана пажаданне прадстаўніцтва кожнай нацыянальнай групы ў мясцовым самакіраванні, а таксама будучым сейме. Адвакат Э. Івашкевіч казаў пра неабходнасць стварэння такіх умоў для мясцовай польскай супольнасці, якія б адпавядалі яе культурным і гаспадарчым пазіцыям. Ён жа заявіў пра гатоўнасць палякаў змагацца разам з беларусамі супраць усіх, хто імкнецца знішчыць асаблівасці Краю, і патрабаваў роўнасці для кожнай нацыі, якая будзе падпарадкоўваць свае інтарэсы патрэбам беларускай зямлі[951].

У рашэннях польскага схода відавочная скіраванасць ягонай дзейнасці на інтарэсы мясцовай польскай супольнасці і «беларускай зямлі». Варта падкрэсліць гэтую «краёвасць» Польскай рады, тым больш, што сход па сваім складзе аказаўся даволі дэмакратычным. «Новы кур'ер літэўскі» канстатаваў слабы ўдзел у ягонай працы землеўласнікаў. Сярод 351 дэлегата з вясковых рэгіёнаў Меншчыны толькі 14 прадстаўлялі землеўласнікаў[952].

Старшынём Рады быў абраны вядомы грамадскі дзеяч і землеўласнік з Мазырскага пав. Геранім Кяневіч. У Выканкам Рады ўвайшлі Э. Івашкевіч (віцэ-старшыня), В. Ваньковіч (віцэ-старшыня), У. Крыньскі, Ч. Крупскі (сакратар), К. Дзямідзецкі-Дзямідовіч, І. Парэмбскі, М. Масоніус ды інш.[953].

Сярод выступоўцаў аказаўся прадстаўнік БНК Павел Аляксюк, які выказаў надзею, што палякі будуць працаваць для дабра Беларусі. Мэтаю беларусаў, па яго словах, з'яўляецца аўтаномія краю, і беларусы гатовы змагацца за свае правы. У адказ К. Дзямідзецкі-Дзямідовіч заявіў, што палякі хочуць працаваць разам з беларусамі і гатовы разам гнаць з Беларусі яе ворагаў. Прамову ён закончыў словамі: «Няхай жыве вольная Беларусь!»[954] Прысутнасць на з'ездзе і прамова Алексюка сведчаць пра спадзевы кіраўніцтва Беларускага нацыянальнага камітэта на супрацоўніцтва з Польскай радай. Гэта было важна яшчэ і таму, што надзеі як віленчукоў, так і менчукоў на саюз з дзеячамі літоўскага руху аказаліся марнымі.

Аднак на рэальную супрацу разлічваць не даводзілася. Асмалоўскі ва ўспамінах сцвярджаў, што ПРМЗ ставілася да Беларускага нацыянальнага камітэта «платанічна прыхільна, па сутнасці ігнаруючы існаванне беларускай арганізацыі». У сваю чаргу і БНК асабліва не шукаў паразумення з Польскай радай, ахвотна ідучы на супрацоўніцтва з асобнымі польскім арганізацыямі ў вырашэнні кан-

---

951 «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 126.

952 Ibidem, Nr 130.

953 Ibidem, Nr 126.

954 Ibidem.

крэтных пытанняў[955]. Між тым, у польскай гістарыяграфіі ПРМЗ часам характарызуецца як «неафіцыйны польскі парламент»[956].

У згаданым сходзе ўдзельнічалі прадстаўнікі МТСГ Раман Скірмунт і Эдвард Вайніловіч. Апошні прыгадваў, што яны прыйшлі на яго разам а другой гадзіне ночы пасля нейкага беларускага сходу, дзе Р. Скірмунт быў старшынём. Шматлікія выступы ўдзельнікаў польскага схода ў падтрымку расійскай рэвалюцыі і выказаныя надзеі, што перамены істотна палепшаць сітуацыю ў Краі, выклікалі ў іх пратэст. Яны больш крытычна ацэньвалі сітуацыю і паспрабавалі пазнаёміць з ёй прысутных. Паводле Э. Вайніловіча, абодва казалі пра тое, што сацыялістычныя прынцыпы і новая сістэма галасавання знішчаць дамінаванне «культурнага элемента», парушаць грамадскі лад і аслабяць маёмасныя пазіцыі польскай супольнасці «крэсаў». Адзінай мэтай падтрымання стасункаў з цэнтральным урадам яны лічылі магчымае змяншэнне наступстваў анархіі, у якую ператвараецца рэвалюцыя[957]. Зала адказала шумным незадавальненнем. Прадстаўнікі МТСГ адмовіліся ўваходзіць у Раду.

Магчыма, прыгадваючы падзеі гэтага сходу, Вайніловіч прыпісаў Скірмунту ўласныя думкі. Усё ж Скірмунт на той час падзяляў надзеі на перамены ў нацыянальным жыцці, якія магла гарантаваць толькі рэвалюцыя. Да таго ж, як вядома, Скірмунт быў катэгарычным праціўнікам тэрміна «крэсы». Ён мог казаць пра Край або Беларусь. Ягоная адмова ўваходзіць у ПРМЗ магла быць абумоўлена ў першую чаргу ўласнай беларускай палітычнай дзейнасцю[958]. А вось верагоднасць непрыняцця поглядаў Скірмунта большасцю ўдзельнікаў польскага сходу не выклікае сумневу.

Ва ўспамінах Вайніловіча важна іншае – тое, што Скірмунт удзельнічаў у сходзе не як старшыня ці прадстаўнік БНК, а як дзеяч МТСГ. Нагадаю, што тая сесія БНК, на якой адбыўся першы адкрыты канфлікт «беларускіх абшарнікаў» з беларускімі сацыялістамі, наступствам якога стаў сыход Скірмунта з пасады старшыні, адбылася 13–15 мая.

«Краевая» арыентаванасць ПРМЗ знайшла адлюстраванне на старонках яе перыядычнага органа «Дзенніка Мінскага» (рэдактары Фелікс Хільхэн і Мар'ян Масоніус), які пачаў выходзіць 1 ліпеня 1917 г. замест «Новага кур'ера літэўскага». У рэдакцыйным артыкуле № 1 адзначалася: «Мы прызнаем права кожнага народу на развіццё і будзем імкнуцца да добрасуседскіх адносін з усімі, хто лічыць сябе грамадзянамі краю і імкнецца працаваць дзеля яго росквіту. Асабліва ў адносінах

---

[955] BN. Dział mikroform, akc. 6797 J. Osmołowski, *Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 1 (1914–1917)*, k. 221.

[956] T. Zienkiewicz, *Polskie zycie literackie w Minsku w XIX i na początku XX w. (do roku 1921)*. Olsztyn 1997, s. 111; A. Chwalba, *Historia Polski...*, s. 584.

[957] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 197.

[958] D. Tarasiuk, *Między nadzieją a niepokojem...*, s. 120.

з беларусамі, адвечнымі жыхарамі і гаспадарамі краю, з якімі нас яднаюць стагоддзі агульнай гісторыі, а часта і агульнасць крыві, будзем імкнуцца, наколькі гэта ў нашай моцы, спрыяць іх дабрабыту і развіццю культуры і разам змагацца за шырокую аўтаномію Белай Русі»[959].

Рэдакцыя «Дзенніка» абяцала быць газетай «нацыянальнай», менавіта ставіць нацыянальныя інтарэсы вышэй за класавыя, і «дэмакратычнай». Апошняе ўвасаблялася ў клопат пра надзяленне люду ўсімі сацыяльнымі і палітычнымі правамі, паляпшэнне становішча малазямельных і беззямельных сялян ды інш. Таксама адзначалася імкненне рэдакцыі спрыяць фарміраванню на беларускіх землях арганізаванай і свядомай польскай грамадскасці, абуджаць дух грамадзянства сярод дробнай шляхты і сялян шляхам арганізацыі школьнай і пазашкольнай асветы. Дарэчы, апошні тэзіс выклікаў крытыку з боку аўтараў газеты «Вольная Беларусь», якія ацанілі яго як імкненне працягваць паланізацыю беларусаў[960].

У першым нумары «Дзенніка» віцэ-старшыня ПРМЗ Ч. Крупскі тлумачыў асноўныя мэты і задачы новай польскай арганізацыі. Ён адзначыў веліч барацьбы польскай нацыі за незалежнасць аб'яднанай Айчыны і падкрэсліў адметнасць задач палякаў Беларусі як карэннага народу Краю. Апошнія зводзіліся да захавання і падтрымкі польскасці, развіцця асветы і культурнага ўзбагачэння люду шляхам «пашырэння свядомасці сярод самых шырокіх слаёў нашага грамадства і народу, умацавання сувязі паміж імі»[961].

«Дзеннік Мінскі» ў пэўным сэнсе быў спробай паяднання краёвасці з польскай ідэяй. Гэта праяўлялася, як у складзе рэдакцыі, так і ў аналітычных тэкстах, што датычылі нацыянальна-культурнай сітуацыі Меншчыны і яе перспектыў. Таксама было відавочным імкненне мясцовай польскай супольнасці захоўваць прыязныя стасункі з беларускім рухам. Тым больш, што на чале БНК стаяў Раман Скірмунт, які ўласнай асобай сімвалізаваў пэўнае польска-беларускае паяднанне. У кожным выпадку, дэкларацыя мэты палітычнай дзейнасці польскай грамадскасці Меншчыны ўлетку 1917 г. яшчэ не разыходзіліся з мэтамі беларускага руху.

Аднак некаторыя заявы палітыкаў Польшчы, якая адраджалася пад нямецка-аўстрыйскім пратэктаратам, насцярожвалі беларускіх дзеячаў. Так, яны крытычна ацанілі заяву польскага Часовага ўрада ад 6 красавіка 1917 г., у якой сцвярджалася, што лёс земляў паміж Польшчай і Расіяй «павінен вырашацца ў адпаведнасці з нацыянальнымі інтарэсамі незалежнай Польшчы і з улікам волі народаў, якія іх насяляюць»[962]. Пэўныя экспансіяніцкія настроі польскіх палітыкаў адносна г. зв. «крэсаў» былі відавочнымі. «Гоман» адрэагаваў на гэта шэрагам антыпольскіх тэкстаў.

---

[959] «Dziennik Minski». 1917, Nr 1.

[960] «Вольная Беларусь». 1917, № 2.

[961] Cz. Krupski, *Organizacja Rady Polskiej Ziemi Minskiej*, «Dziennik Minski». 1917, Nr 1.

[962] Цытата па: J. Pajewski, *Odbudowa Panstwa Polskiego.* Warszawa 1985, s. 198.

Між тым, стварэнне польскіх арганізацый, у якіх аб'ядналіся бежанцы з Каралеўства Польскага і мясцовыя беларускія палякі, працягвалася. У ліпені 1917 г. у Магілёве была створана Польская рада Магілёўскай зямлі. На арганізацыйным з'ездзе прысутнічаў прадстаўнік аналагічнай Віцебскай рады[963]. У прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі з'езда выказалі намер дамагацца аўтаноміі Беларусі з прызнаннем правоў нацыянальных меншасцяў[964].

Напрыканцы жніўня кіраўнікі ПРМЗ удзельнічалі ў сходзе «Крэсовай польскай рады» ў Кіеве. Было вырашана распрацаваць *Статут польскага насельніцтва на Русі* як падставу сістэмы польскага самакіравання на тэрыторыях Беларусі, Літвы і Украіны[965]. Відавочна, што ўлетку 1917 г. большасць польскай супольнасці Беларусі яшчэ не звязвала свой лёс з лёсам той польскай дзяржавы, якая адраджалася пры падтрымцы Германіі і Аўстра-Венгрыі.

Найбольш папулярным быў лозунг аўтаноміі Беларусі, у якой былі б гарантаваны правы ўсіх нацыянальных меншасцяў. Гэты лозунг таксама падтрымлівала тая частка каталіцкага духавенства, якая падзяляла ідэалы беларускага Адраджэння. 24–25 мая 1917 г. па ініцыятыве ксяндза Гадлеўскага ў Менску адбыўся сход ксяндзоў-беларусаў (болей 20 чалавек, у т. л. Адам Станкевіч, Фабіян Абрантовіч, Люцыян Хвецька), удзельнікі якога выказаліся за аўтаномію Беларусі ў межах дэмакратычнай федэратыўнай Расіі, а таксама за навучанне на беларускай мове ў школах, увядзенне ў касцёлах казанняў і дадатковага набажэнства па-беларуску[966].

Менскі з'езд фармальна завяршыў працэс стварэння беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі, якая першапачаткова атрымала назву *Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць*. Пазней яна будзе перайменавана ў *Беларускую хрысціянскую дэмакратыю*.

Паводле меркавання айца Аляксандра Надсана, менавіта падчас гэтага з'езда княгіня Радзівіл перадала ксяндзам Францішку Будзьку, Фабіяну Абрантовічу і Люцыяну Хвецьку брыльянтавае калье на заснаванне беларускай грэка-каталіцкай калегіі (семінарыі) у Рыме. Усё рабілася тайна. Пра калье ведала толькі некалькі чалавек, у т. л. і Раман Скірмунт[967]. Відавочна, што княгіню і палескага «абшарніка» зблізіла якраз супраца на беларускай ніве і падтрымка адраджэння грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы. З ёй звязваліся надзеі на пашырэнне беларускай свядомасці.

---

963 «Dziennik Minski». 1917, Nr 4.

964 Ibidem, Nr 5.

965 Ibidem, Nr 52.

966 З *жыцьця і дзейнасьці кс. В. Гадлеўскага. Аўтабіяграфічны нарыс*, «Biełaruskaja krynica». 1928, № 13; С. Рудовіч, *Праблема самавызначэння Беларусі...*, с. 121–122.

967 А. Надсан, *Княгіня Марыя Магдалена Радзівіл і справа адраджэньня Уніі ў Беларусі*. Менск 2006, с. 42.

Таксама немагчыма аспрэчыць вялікую ролю Рамана Скірмунта ў пашырэнні ідэі аўтаноміі. Менавіта ён адным з першых зрабіў яе галоўным лозунгам беларускага руху амаль адразу пасля падзення дынастыі Раманавых. Гэтую ідэю настойліва імкнуўся ажыццявіць БНК і пасля сыходу Скірмунта з пасады кіраўніка. Так, ва ўжо згаданай заяве БНК на старонках «Вольнай Беларусі», дзе фігураваў сюжэт пра правакатараў, якія «прыкрываючыся іменем беларускім, вялі прапаганду за далучэньне да Польшчы або да якога другога гасударства», таксама першачарговай задачай Камітэта абвяшчалася «аўтаномнае адбудаваньне Беларусі ў граніцах Расеі, у якіх было б забяспечана вольнае жыцьцё і поўныя правы іншым народам, жывучым на Беларусі»[968].

Тэма аўтаноміі Беларусі была адной з найважнейшых на старонках «Вольнай Беларусі». Першы нумар гэтага перыядычнага органа БНК выйшаў 28 мая 1917 г. і за яго з'яўленнем стаяла вялізная праца ўсяго Камітэта і, безумоўна, першага кіраўніка. Рэдактарам стаў сябра БНК Язэп Лёсік.

У артыкуле «Нашы патрэбы» ён сцвярджаў, што ўсе патрэбы Беларускага краю можна абагульніць адным словам – аўтаномія. Аўтаномію Лёсік тлумачыў як «права заводзіць у сябе свае парадкі, як права на тое, каб наша родная беларуская мова скрозь панавала ў нашым краю, каб на ёй вучыліся, гаварылі, каб яна ўжывалася нараўне з расійскай ва ўсіх урадавых інстытуцыях; каб развівалася наша беларуская культура, літэратура, умеласьць, каб мы, беларусы, сталі нараўне і поплеч з усімі народамі, што жывуць на сьвеці – з расійцамі, палякамі, пранцузамі, ангельцамі і т. д.»[969]

Пазней гэтыя артыкулы былі перапрацаваны ў брашуру пад назвай «Аўтаномія Беларусі» (кастрычнік 1917 г.), у якой Язэп Лёсік даводзіў неабходнасць аўтаноміі не толькі для палітычнага і нацыянальна-культурнага развіцця беларусаў, але таксама для задавальнення асноўных патрэб працоўнага люду.

Спроба сумясціць у лозунгу аўтаноміі Беларусі нацыянальнае і сацыяльнае была вельмі важнай, бо ўсё больш відавочнай станавілася радыкалізацыя сацыяльных патрабаванняў шырокіх народных мас (у т. л. сялянства), якія актыўна далучаліся да грамадска-палітычнага жыцця Беларускага краю. Аднак гэтае сумяшчэнне не магло абысціся без пэўных страт, тым больш што папулярныя ў беларускай вёсцы арганізацыі агульнарасійскіх сацыялістычных партый, асабліва эсэры і сацыял-дэмакраты, цалкам адмаўлялі беларускую нацыянальную ідэю і трактавалі БНК у катэгорыях «панскасці» і польскасці.

Між тым, БНК пад кіраўніцтвам Скірмунта шмат намаганняў прыкладаў дзеля прапаганды менавіта беларускай ідэі, звязваючы з яе пашырэннем умацаванне сацыяльнай базы беларускага руху. Як ужо адзначалася, у красавіку 1917 г. было створана Таварыства беларускай культуры, у маі – Першае таварыства белару-

---

[968] *Ад Беларускага нацыянальнага камітэту*, «Вольная Беларусь». 1917, № 2.

[969] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Нашы патрэбы*, «Вольная Беларусь». 1917, № 19.

ВОЛЬНАЯ
Беларусь
Газета палітычная, эканамічная і літаратурная.
№ 4 (Субота) Выходзіць двойчы на тыдзень. 24 чэрвеня
ДЗЕНЬ
ВОЛЬНАЙ БЕЛАРУСІ.
УНІВЭРСАЛ

Абвестка пра збор сродкаў у Нацыянальны фонд на старонках «Вольнай Беларусі» (1917, 24 чэрвеня).

скай драмы і камедыі. Быў заснаваны Беларускі нацыянальны фонд, сродкі якога прызначаліся для нацыянальнай культурніцкай дзейнасці. 24–25 чэрвеня ў Краі і ў тых гарадах Расіі, дзе існавалі беларускія арганізацыі, праводзіліся *Дні вольнай Беларусі*, падчас якіх распаўсюджваліся лістоўкі БНК, ладзіліся выставы твораў нацыянальнага мастацтва, чыталіся лекцыі па гісторыі і культуры Беларусі, а таксама збіраліся сродкі для Беларускага нацыянальнага фонда[970]. Аляксюк на старонках «Нового варшавского утра» заклікаў менчукоў «внести сваю лепту на газеты, книги и школы многомиллионного народа»[971]. Тая ж газета пісала пра поспех беларускіх дзён у Менску, адзначыўшы вялікую цікавасць менчукоў да спектакля Першага таварыства драмы і камедыі і да Купальскай вечарыны. Таксама сцвярджалася, што збор у Беларускі фонд «встретил сочувствие широких масс населения»[972].

Ініцыятыву БНК падтрымалі не толькі менчукі. Як паведаміў адзін з карэспандэнтаў «Вольнай Беларусі», у Барысаве ў Нацыянальны фонд было сабрана болей 400 руб.[973] Моцную падтрымку намаганням БНК аказваў таксама Беларускі камітэт у Магілёве (старшыня М. Кахановіч). Гэтая актыўнасць спрыяла пашырэнню нацыянальнай свядомасці. Так, 20 чэрвеня «Новое варшавское утро» паведаміла пра вынікі Сялянскага з'езда Віцебскай губ., удзельнікі якога выказаліся за аўтаномію Беларусі, роўнасць усіх нацый Краю, а таксама за

970 С. Рудовіч. *Час выбару…*, с. 126, «Новое Варшавское утро». 1917. № 386, 16 июня.

971 «Новое Варшавское утро». 1917. № 392, 24 июня.

972 Ibidem, № 394, 27 июня.

973 «Вольная Беларусь», 1917. № 14, 17 жніўня.

беларусізацыю школы. Яны пагадзіліся з тым, што рашэнне па аграрнай рэформе прыме Устаноўчы Сход, а зямлю будзе размяркоўваць Беларуская рада[974].

Аднак тыя ж сяляне даволі часта дэманстравалі адкрытую пагарду да беларушчыны. У жніўні карэспандэнт «Вольнай Беларусі» з мястэчка Зембін Барысаўскага пав. з горыччу пісаў пра адмоўнае стаўленне местачкоўцаў да беларускага руху: «Каля нашага мястэчка ёсць шмат паноў, але яны руху беларускаму ніякіх перашкодаў не чыняць, наадварот, паміж іх ёсьць шмат прыхільнікаў беларускага руху, як напр. Сьвянціцкія, Цюндзявіцкія і інш. Ды проста аж дзіву даешся, адкуль і праз каго нашы сяляне, дома і па-за домам гаворачы па-беларуску, набралі нянавісьці да ўсяго роднага»[975].

Прычыны гэтага трэба шукаць не толькі ў складанасці працэсу фарміравання беларускай нацыі. Як ужо адзначалася, БНК і ўвесь беларускі нацыянальны рух сустрэў вельмі моцнае супрацьдзеянне з боку Выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў Менскай і Віленскай губ., а таксама Настаўніцкага саюза. Негатыўнае стаўленне да яго дэманстравалі вядомыя ў Менску дзеячы эсэр С. Кавалік, энэс І. Мятлін і бальшавік М. Фрунзе. Надзвычай варожа да БНК ставіліся таксама Беларускі народны саюз (Віцебск) і Саюз беларускай дэмакратыі (Гомель), які прытрымліваліся ідэалогіі «заходнерусізму». Адмоўную ролю адыгрывала і тое, што ў праграме БНК нацыянальна-культурная дзейнасць не спалучалася з прапановамі вырашэння аграрнай ды іншых актуальных праблем сацыяльнага жыцця.

Тым не менш, за вясну 1917 г. беларускі рух прайшоў вялікі шлях, які не ў апошнюю чаргу быў звязаны з асобай «абшарніка» Рамана Скірмунта. В. Гадлеўскі, які паспрабаваў зрабіць пэўнае абагульненне ягонай дзейнасці ў гэты перыяд, сцвярджаў, што Скірмунт прынёс «шмат карысьці»...

ДАКУМЕНТ

Кс. Вінцэнт Гадлеўскі. Зь беларускага палітычнага жыцьця ў Менску ў 1917–1918 гг.[976] Фрагмент.

Роля Скірмунта ў беларускім палітычным жыцьці пачынаецца ад расейскай рэвалюцыі, г. зн. ад лютага месяца 1917 г. Да гэтага часу быў ён ведамы як краёвец, каторы хацеў стварыць супрацоўніцтва народаў, якія знаходзіліся даўней у граніцах Вялікага Княства Літоўскага, і яшчэ ў 1906–1909 гг. многа працаваў над польска-беларускім збліжэньнем. Чалавек, бясспрэчна, зь вялікай духовай культурай, шырокім сьветаглядам і высокай асьветай, Скірмунт належыў у тыя часы да групы тых рэдкіх абшарнікаў на Беларусі, для каторых беларускі селянін быў

[974] «Новое Варшавское утро». 1917, № 387, 20 июня.

[975] «Вольная Беларусь». 1917. № 14, 17 жніўня.

[976] В. Гадлеўскі, *Зь палітычнага жыцьця ў Менску ў 1917–1918 гг.*, «Спадчына». 1997, № 5, с. 20–22.

бліжэйшы за селяніна, а нават шляхціца з этнаграфічнай Польшчы і каторыя пачуваліся да нейкай і маральнай, і фізічнай сувязі з народам беларускім.

Ад 1917 г. Скірмунт становіцца ў рады беларускіх дзеячоў і, хоць буйны землеўласьнік (да яго належыць вялікі двор Парэчча ў Пінскім павеце), стаецца вялікім дэмакратам і нават (шчыра ці няшчыра) беларускім патрыётам. Пры ўсім гэтым ён добра ўладаў беларускай мовай (трохі з палескім акцэнтам: «шо, шчо»), і ягоныя прамовы на беларускіх сабраньнях выдзяляліся і зместам і формай, яны былі заўсёды высока-патрыятычны з беларускага пункту гледжаньня і часам нават проста рэвалюцыйны, што выклікала ў прысутных буру воплескаў. І вось гэты чалавек скорам выбіваецца на чало беларускага руху.

Зараз пасьля рэвалюцыі быў скліканы ў Менску зьезд беларускіх дзеячоў, каб выбраць беларускі палітычны цэнтр і каб нарысаваць плян працы на будучыню. Зьезд адбыўся дня 25–26 сакавіка 1917 г., якраз на год прад абвешчаньнем незалежнасьці Беларусі. На гэты зьезд прыехалі бадай усе актыўныя беларускія сілы ня толькі з Беларусі, але з абшару ўсяе даўнейшае Расеі, зь Петраграду, Масквы, Кіева і іншых гарадоў. На зьездзе былі рэпрэзэнтаваны ўсе тагачасныя палітычныя кірункі, пачынаючы ад беларускіх народнікаў, а канчаючы на соціялістах. На гэтым зьездзе доўгі час дыскутавалася пытаньне, каго выбраць на старшыню такое важнае інстытуцыі, як першага Беларускага Нацыянальнага Камітэту, і пасьля доўгіх спрэчак бадай усе дзеячы затрымаліся на асобе Р. Скірмунта, б. дэлегата ад Меншчыны ў 1-ую Дзяржаўную Думу, і ён быў выбраны на старшыню Б. Нац. Камітэту ў Менску.

Чаму не каго іншага выбралі, а Скірмунта?

Трэба ведаць, што на пачатку расейскай рэвалюцыі ніхто не спадзяваўся, што яна будзе паглыбляцца шторaз далей, аж да камунізму. Людзі думалі, што ўрад князя Львова, а потым Керанскага будуць трывалкімі, што расейскі лібэралізм і дэмократызм, які дайшоў да ўлады будзе дэцыдаваць аб будучым дзяржаўным строю Расеі, што кадэты, а потым і эсэры, якія стаялі на чале ўлады, не аддадуць гэтай улады нікому. А ў гэтых людзей, асабліва ў кадэтаў, асоба Скірмунта, як ведамага палітычнага дзеяча і сябры 1-й Дзяржаўнай Думы, мела свае значэньне.

Вось дзеля гэтай прычыны Скірмунт ня толькі быў выбраны на старшыню Бел. Нац. Камітэту, але і пастаўлены на чале дэлегацыі, якая была выбрана ў ліку 7-мі чалавек на гэтым-жа з'ездзе беларускіх дзеячоў, каб перадаць расейскаму ўраду рэзалюцыі і дамаганьні зьезду ў справе школьніцтва, самаўраду і аўтаноміі Беларусі.

Скірмунт у той час быў пакліканы як фаховец («спэц») ад палітычных і вонкавых спраў (нешта падобнае як Чычэрын у бальшавікоў)[977]*. І трэба сцвердзіць,*

[977] Чычэрын, як ведама, ня гледзячы на тое, што паходзіў з расейскае арыстакрацыі, быў пакліканы бальшавікамі ў першых гадох іхняй улады на высокае становішча камісара загранічных спраў і спаўняў гэты абавязак, пакуль яго не замяніў Літвінаў (заўвага – *В. Г.*).

што як Чычэрын для бальшавікоў, так і Скірмунт для беларусаў у свой час прынясьлі шмат карысьці і адыйшлі (або былі адсунуты) тагды, калі іх услугі сталіся непатрэбнымі. Пры ўсім гэтым магчыма, што Скірмунт хацеў на беларускай справе зрабіць палітычную кар'еру, бо палітыцы ён быў адданы целам і душою, не шкадаваў для яе ні фізычных, ні маральных трудоў.

У «другім эшалоне»

Напачатку лета ўсё больш відавочнай станавілася як выразная дыферэнцыяцыя ўнутры Беларускага нацыянальнага камітэта, так і неабходнасць выпрацоўкі новай ідэйнай платформы адзінства ўсіх палітычных сіл беларускага Адраджэння.

Варта адзначыць, што ў гэты час значна пашырыліся ўплывы БСГ. 18 красавіка пачала выходзіць яе газета «Грамада» (рэд. А. Смоліч). Суполкі БСГ існавалі ў Петраградзе, Менску, Маскве, Гомеле, Віцебску, Бабруйску, Слуцку ды інш. У чэрвені адбылася канферэнцыя БСГ, на якой быў абраны часовы ЦК (З. Жылуновіч, Я. Варонка, К. Дуж-Душэўскі, А. Смоліч ды інш.). Таксама было прынята рашэнне пра пераезд ЦК у Петраград. Пра рост аўтарытэта БСГ сведчыць і тое, што па запрашэнні старшыні Юрыдычнай нарады пры Часовым урадзе прадстаўнікі яе Петраградскай арганізацыі ўдзельнічалі ў выпрацоўцы палажэння аб выбарах ва Устаноўчы сход[978].

Важныя рашэнні павінен быў прыняць Другі з'езд беларускіх арганізацый, які першапачаткова планаваўся на канец чэрвеня. Так, ужо 1 чэрвеня быў падпісаны кіраўніком аддзела БНК Язэпам Лёсікам цыркуляр, які паведамляў пра з'езд дэлегатаў беларускіх грамадскіх і палітычных арганізацый, запланаваны на 29 чэрвеня. У парадку дня фігуравала справаздача Камітэта, пытанні пра беларускае Адраджэнне, аўтаномію Беларусі, беларусізацыю школы, эканамічную сітуацыю і зямельную праблему, а таксама пра рэарганізацыю БНК («праэкт цэнтральнай беларускай арганізацыі»)[979].

Аднак давялося з'езд пераносіць, і ён адбыўся толькі 8–9 ліпеня 1917 г. Падрабязныя рэпартажы газеты «Вольная Беларусь» дазваляюць прааналізаваць ягоную працу. Падрыхтоўкай і арганізацыяй з'езда займаўся Беларускі нацыянальны камітэт, у якім пасля сыходу Скірмунта з пасады старшыні дамінавалі сябры БСГ. Менавіта дэлегаты гэтай партыі адыгралі вызначальную ролю ва ўзмацненні сацыяльнага складніка беларускага руху і дыферэнцыяцыі розных палітычных сіл нацыянальнага Адраджэння.

Жылуновіч, успамінаючы гэты з'езд, адзначаў незадавальненне Петраградскай арганізацыі БСГ дамінаваннем у Менску «буржуйна-шовіністычных элементаў»,

---

[978] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 19, арк. 11.

[979] Тамсама, спр. 2, арк. 19.

якія групаваліся вакол БНК[980]. Лідэры БСГ лічылі, што гэтыя «элементы» стрымліваюць развіццё «беларускага рэвалюцыйнага руху» ва ўмовах, калі рэвалюцыя «зрабіла круты ўхіл улева»[981].

Варта адзначыць, што напярэдадні менскага з'езда ў Петраградзе 3–5 ліпеня адбыліся антыўрадавыя выступленні салдат, матросаў і рабочых, падчас якіх пралілася кроў. Гэтыя падзеі многія гісторыкі лічаць спробай бальшавіцкага мяцяжу, які быў задушаны войскамі, выкліканымі з фронту. Ягоным галоўным палітычным вынікам стала адстаўка князя Львова і фарміраванне новага кааліцыйнага ўрада на чале з лідэрам партыі эсэраў Аляксандрам Керанскім. Ягонае прызначэнне адбылося 8 ліпеня. Склад урада быў пераважна сацыялістычным.

Жылуновіч лічыў неабходным дзеля «выяўленьня сапраўднай сутнасьці беларускага рэвалюцыйнага руху адрэзаць усялякую сантыментальную «агульнанацыянальнасьць» разам з Скірмунтам і ксяндзамі; трэба было стаць перад тварам рэволюцыі ў сапраўдных узаемаадносінах клясавых сіл у беларускім руху, і на гэта Грамада пакіравала. Існаваўшы ад пачатку рэволюцыі Нацыянальны Камітэт захоўваў гэтыя ўзаемаадносіны і тым самым перашкаджаў нармальнаму разьвіццю беларускіх рэвалюцыйных сіл. Ясно, што ў далейшым нельга было заставіць у новым органе з сяброў Камітэта ніводнага чалавека, каб гэтым сьцерці ўсякую пераемнасьць з ім».

БНПС трактавалася кіраўніцтвам БСГ як групоўка «права-шовіністычных элементаў». У згаданых успамінах, апублікаваных на старонках часопіса «Полымя» (1923), Жылуновіч сцвярджаў, што напярэдадні з'езда сябрам БНПС стаў таксама Раман Скірмунт, які паабяцаў дарма перадаць сваю зямлю сялянам[982]. Гэтае абяцанне беларускі сацыяліст лічыў толькі «данінай часу» і не ўспрымаў паважна.

З'езд абяцаў быць «гарачым». Аднак у першы дзень яшчэ дамінавала «сантыментальная агульнанацыянальнасць». Праца распачалася прывітальнай прамовай намесніка старшыні БНК Алексюка, які адзначыў важнасць з'езда і заклікаў яго ўдзельнікаў «найці новыя дарогі для нацыянальнай справы, уліць новыя сілы ў рады працаўнікоў беларускага адраджэньня»[983]. Адбыліся выбары Прэзідыума, які ўзначаліў Зміцер Жылуновіч. Ягонымі намеснікамі («таварышамі») былі абраны А. Лявіцкі (БНПС) і Ф. Галавач (БСГ). Сакратарамі з'езда сталі Э. Будзька (*трудовик*), Ф. Стульба (БНПС) і П. Каравайчык (беспартыйны).

Пасля гэтага па прапанове П. Алексюка з'езд накіраваў прывітальную тэлеграму Украінскай цэнтральнай радзе, якая 10 чэрвеня 1917 г. прыняла Універсал, што

---

[980] Ж. З. [З. Жылуновіч], *Уступамі да Акцябра (Матэр'ялы да гісторыі Савецкай Беларусі)*, «Полымя». 1923, № 7–8, с. 86.

[981] Тамсама, с. 87.

[982] Тамсама.

[983] *Зьезд дэлегатаў ад беларускіх партыйных і грамадскіх арганізацый 8–10 ліпня ў Мінску*, «Вольная Беларусь». 1917, № 8.

абвяшчаў аўтаномію Украіны. Смоліч пры гэтым назваў Украіну «авангардам нацыянальнага руху». Супраць прывітальнай тэлеграмы выступілі толькі дэлегаты Віцебскага камітэта Беларускага народнага саюза, якія пазней нават пакінулі з'езд «сепаратыстаў».

Цэнтральным пунктам першага дня была справаздача БНК. З ёй выступіў намеснік старшыні Камітэта Усевалад Фальскі. «Вольная Беларусь» надзвычай сціпла пераказала ягоную прамову. У газетным варыянце адлюстраваліся пераважна скаргі выступоўцы на «страшэнна кепскія [палітычныя і фінансавыя] умовы» для працы БНК, які «рабіў усё, што мог». Прамоўца таксама адзначыў, што Камітэтам рэгістраваліся новыя арганізацыі, дасылалася літаратура, выдаваліся адозвы, быў заснаваны Нацыянальны фонд і арганізаваны чарговы з'езд беларускіх арганізацый. Аляксюк дадаў, што пры ацэнцы дзейнасці БНК трэба ўлічваць «слабое нацыянальнае пачуццё» ў Беларусі, якое ў многіх абуджаецца толькі тады, калі чалавек трапляе на чужыну.

Невядома, ці то сапраўды такімі сціплымі аказаліся дакладчыкі ад БНК, ці то газета, якую рэдагаваў дзеяч БСГ, не палічыла патрэбным падрабязна пераказваць змест іх выступаў. Відавочна, што маштаб працы БНК ніяк не адлюстраваўся ў газетным варыянце справаздачы.

Адказваючы на пытанне Язэпа Дылы, П. Аляксюк падрабязна распавёў пра красавіцкі візіт дэлегацыі БНК у Петраград, падсумаваўшы яго вынікі словам «вообще»[984]. У адказ на пытанне наконт ініцыятыў БНК па стварэнні рэгіянальных беларускіх арганізацый намеснік старшыні прызнаў, што Камітэт актыўнасцю ў гэтай справе не адрозніваўся і займаўся пераважна рэгістрацыяй суполак, якія ўзнікалі самастойна.

Даклады рэгіянальных арганізацый распачаліся выступам Э. Будзькі, які распавёў пра працу беларусаў у Петраградзе. На яго думку, найважнейшай справай беларускага Адраджэння на дадзены момант з'яўляецца беларусізацыя школы і падрыхтоўка падручнікаў. Даклады з месцаў працягнуў Кахановіч, які на прыкладзе Магілёва выказаў упэўненасць, што «беларускі рух мае моцны грунт пад сабою і можа прыцягнуць да сябе шмат людзей»[985]. Я. Дыла распавёў пра працу маскоўскіх беларускіх арганізацый – Народнай Грамады і Сацыялістычнай Грамады. Дэлегат Асвяцімскі (Слуцк) паведаміў пра беларускую дзейнасць у Слуцкім пав., дзе таксама давялося сутыкнуцца з эсэрамі і бальшавікамі. Ён заклікаў больш актыўна «ісці ў народ» і займацца прапагандай беларушчыны, распавёўшы, што сяляне, якім ён пераказаў праграму БНК, адзінагалосна яе падтрымалі.

Таксама выступалі дэлегаты беларускіх арганізацый Гомеля, Віцебска, Копыля, Бабруйска, Кіева, Смілавічаў. Аляксандр Цвікевіч пазнаёміў прысутных з праграмай Беларускай народнай Грамады (Масква). Зміцер Жылуновіч распавёў

[984] Тамсама.

[985] Тамсама, № 9.

пра дзейнасць петраградскай арганізацыі БСГ, падкрэсліўшы, што «трэба абараняць ня толькі нацыянальныя, але і эканамічныя інтарэсы працоўнага люду». На яго думку, толькі гэта можа паспрыяць далучэнню гэтага люду да беларускага руху. Кіраўнік БСГ заклікаў працаваць з салдатамі і сялянамі. Таксама выступалі беларусы-вайскоўцы, прадстаўнікі арганізацый беларусаў-бежанцаў.

Асаблівай крытыкі БНК з боку рэгіянальных арганізацый не было. Аднак напрыканцы дня Асвяцімскі заявіў пра дрэнную рэпутацыю БНК і запатрабаваў яго «перавыбраць, наіменаваць Цэнтральным камітэтам беларускіх арганізацый, каб было даверые на вёсцы і тагды нехай усе, хто толькі можа, йдуць на вёску, каб правесьці сваіх людзей да земства і Устаноўчага сойму»[986].

Гэтую крытыку падтрымаў... Павел Аляксюк: «Пісака выпісаўся [...] Такая праца не рабіла жаднаго ўплыву на жыцьцё. Трэба як-небудзь падняць гэто жыцьцё, направіць яго па новай дарозе». Ён прапанаваў зрабіць «цэнтральную арганізацыю» кааліцыйнай, каб у ёй была прадстаўлена не толькі сацыялістычная плынь беларускага руху. Намеснік старшыні БНК сцвярджаў, што справы не выглядаюць так кепска, як пра гэта многія казалі, што «працэс самаабуджэньня народу, разпачаўшыся, ідзе ўсё далей і глыбей». Ён жа звярнуў увагу на цяжкую фінансавую сітуацыю Камітэту, якая перашкаджае актыўнай прапагандзе беларушчыны напярэдадні выбараў ва Устаноўчы Сход[987]. Падобна, што за гэтай прамовай Алексюка стаяла імкненне не дапусціць манаполіі БСГ у кіраўніцтве беларускага руху. Магчыма, пра сапраўдныя намеры лідэраў сацыялістаў сябры БНК ужо ведалі.

Скірмунт у газетным рэпартажы не згадваўся. Відавочна, што асаблівай актыўнасці ён не праяўляў і ў абмеркаваннях першага дня не ўдзельнічаў. Магчыма, пазіцыя былога кіраўніка БНК часткова адлюстравалася ў выступах ягоных намеснікаў, у першую чаргу Алексюка. Тым больш, што падчас з'езда яны былі ўжо аднапартыйцамі.

Пасля выступу Алексюка дыскусіі перапыніліся, а з'езд падзяліўся на секцыі (палітычную, школьную, бежанскую, ваенна-арганізацыйную і зямельную), якія павінны былі падрыхтаваць дакументы для наступнага дня працы. 8 ліпеня з'езд яшчэ захоўваў вонкавае адзінства сваіх шэрагаў, хоць апошнія выступы ўжо прадракалі дыскусіі і спрэчкі вакол «цэнтральнай арганізацыі» беларускага руху.

Агульнае пасяджэнне другога дня распачалося а 16-й гадзіне выступам Я. Сушынскага, які распавёў пра беларускую дзейнасць у Дрысенскім пав. Грунтуючыся на уласным досведзе агітатара, ён сцвярджаў, што сяляне адгукаюцца на прапаганду беларушчыны, і беларускае слова мае падтрымку сярод іх[988].

Ад палітычнай і арганізацыйнай секцыі выступіў М. Кахановіч. Ён заявіў, што

---

[986] Тамсама, № 10.

[987] Тамсама.

[988] Тамсама.

Беларускі нацыянальны камітэт, абраны ў сакавіку, «выйшаў трохі няўдалым». Яму рабілі закіды, што беларуская справа – «польская і панская інтрыга», а ён амаль не рэагаваў на гэта. Дакладчык прызнаў пэўную справядлівасць гэтых закідаў, адзначыўшы, што ў Камітэце «фактычна былі людзі даволі багатыя». Таксама ён прыгадаў, што БНК не выканаў адно з важных даручэнняў сакавіцкага з'езда, а менавіта не вызначыў этнаграфічныя межы Беларусі. Апрача таго, БНК не здолеў упарадкаваць працэс стварэння беларускіх арганізацый, якія «растуць як грыбы пасля дажджу, а Камітэт нават не ведае, дзе яны ёсьць, а дзе іх німа».

Какановіч заклікаў рэфарміраваць арганізацыю, стварыўшы «орган, які б лучыў усіх ад крайніх правых да крайніх левых». Гэта была ягоная асабістая пазіцыя, а секцыя прыняла рашэнне пра стварэнне арганізацыі выключна з сацыялістаў і дэмакратаў. На думку дакладчыка, рашэнне секцыі не супярэчыла ягонай прапанове, бо зараз, «хто не сацыяліст, той называе сябе дэмакратам».

Паводле прапановы секцыі, ствараласа «Цэнтральная рада дэпутатаў беларускіх арганізацый», якая ў перспектыве павінна была ператварыцца ў «Беларускую цэнтральную раду», галоўнай задачай якой было дасягненне аўтаноміі Беларусі. Дзеля палітычнага прадстаўніцтва прапанавалася мець двух сваіх прадстаўнікоў у Петраградзе і аднаго ў Магілёве.

Пасля выступу Какановіча прамаўляў А. Цвікевіч, які толькі часткова пагадзіўся з прапановамі секцыі. Ён быў супраць стварэння «Беларускай рады», бо аўтаномію разумеў толькі як «гаспадарскае самакіраваньне, троху як законадаўскае». Цвікевіч асудзіў «сэпаратызм» і выказаўся за моцную Расію з эканамічна-тэрытарыяльнай аўтаноміяй асобных народаў: «Мы хочам упарадкавацца самым і памагчы Расіі [...] Што-ж нам трэба рабіць? Не захопліваць законадаўчых функцый, а ўзяцца за арганізаваньне масаў»[989]. Ён быў супраць дэцэнтралізацыі Расіі і заявіў, што яе «народы прывыклі ўжо жыць у блізкіх адносінах адны з другімі». Прадстаўнік Народнай Грамады нават прапанаваў прыняць удзел у палітычным сходзе 11 ліпеня разам з прадстаўнікамі эсэраў, кадэтаў, Выканкама Рады рабочых і салдацкіх дэпутатаў, губернскага земства ды інш. Цвікевіч спадзяваўся знайсці паразуменне з тымі, хто вёў сапраўдную вайну супраць беларускага Адраджэння.

У дыскусію адразу ж уступіў Аляксюк як прыхільнік палітычнай і нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Менавіта разуменне тэрміна «аўтаномія» апынулася ў цэнтры абмеркавання На жаль, «Вольная Беларусь» не стала пераказваць усёй дыскусіі, палічыўшы, што яна цікавая толькі для юрыстаў. А на самім з'ездзе дыскусію перапыніла з'яўленне прадстаўніка Польскай Рады Менскай зямлі, які прывітаў беларускі з'езд і пераказаў жаданне мясцовых палякаў «як сыноў гэтага краю жыць у добрым суседстві з беларусамі і разам працаваць на карысьць агульнай Бацькаўшчыны»[990].

---

[989] Тамсама.

[990] Тамсама, № 11.

Далейшая дыскусія ў большай ступені датычыла ўжо фармата новай «цэнтральнай арганізацыі». Нарэшце з прамовай выступіў і Раман Скірмунт. Ён казаў пра неабходнасць менавіта палітычнай аўтаноміі, з якой звязваў дабрабыт Беларусі. Былы старшыня БНК назваў «справядлівай» крытыку М. Кахановічам дзейнасці Камітэта і прыгадаў «страшэнна цяжкія ўмовы», у якіх даводзілася працаваць. Ён пагаджаўся з неабходнасцю рэарганізацыі БНК, але быў супраць яго ліквідацыі і стварэння новай арганізацыі. Паводле Скірмунта, гэта магло толькі ўсцешыць ворагаў беларушчыны[991].

ДАКУМЕНТ

Пераказ прамовы Рамана Скірмунта 9 ліпеня 1917 г. на з'ездзе дэпутатаў беларускіх арганізацый[992]. Фрагмент.

[...] Юрысты добра сказалі, што німа яснага і справядлівага азначэньня розных форм аўтаноміі. Але, калі Цьвікевіч гаварыў аб ніпатрэбе палітычнай аўтаноміі, а толькі мяйсцовай, гаспадарскай [...] здалося, што Цьвікевіч радзіць здаволіцца пашырэным земскім самаупраўленьнем. Пры зьмяніўшымся дзяржаўным ладзі стары цэнтралістычны парадак далей трываць не можа і не павінен. Дабрабыт як усяе Расіі, так і наш грунтуецца на шырокай палітычнай аўтаноміі краёў і народаў. Да гэтаго трэба дабавіць, што тэрмін «палітычная аўтаномія» не разумее безпременна свайго войска, сваіх асобных грошаў і мытных граніц. Усё гэта можа быць агульнае. Але ад сваіх праўдзівых патрэбаў мы адступацца не можам і не павінны. [...]

Выступленьне Украінскай Рады надта зрэлае й абдуманае, яно грунтуецца на ясным разуменні інтарэсаў свайго народу. Калі Расія зразумее сэнс нацыянальных намаганьняў жывучых у ёй народаў і пойдзе ім насустрэч, яна не толькі не аслабее, а наадварот, узмацніцца. Грамадзянін Цьвікевіч моцна памыліўся, кажучы, што народы Расіі пры старым парадку прывыклі адзін да другога і зліліся ў адно цэлае. Гэта было злучэньне кайданаў і ланцугоў. Цяпер насталі новыя часы і трэба шукаць новых прынцыпаў злучэньня. (Бурн. апл.)

Зробленая Кахановічам крытыка працы Камітэту справядліва. Камітэт, папраўдзі, зрабіў мала, але дзеля страшэнна цяжкіх умоў працы. Час наш пераходны і ідэёвая праца сустрачае шмат неабдуманых слоў і абвінавачэньняў. Паказывалі на мяне, што я шкоджу толькі працы Камітэту, стаючы на чале яго. Я зараз жэ зьняў с сябе паўнамочыя старшыні Камітэту і застаўся простым яго сябрам. Злосныя нападкі на Камітэт, можа, азначаюць толькі тое, што Камітэт стаяў на сапраўднай дарозі. Тут гаварылі аб ягонай працы і ніхто не ўспамянуў аб тым, што Камітэт не толькі склікаў зьезды, але й залажыў газэту «Вольная Беларусь»,

---

[991] Тамсама.

[992] Паводле публікацыі газеты «Вольная Беларусь» (№ 11 ад 3 жніўня 1917 г.).

орган, што стаіць моцна на нацыянальным грунце і адпавядае духу цяперашняга часу.

Перамена, рэарганізацыя Камітэту патрэбна. Але праэкт Кахановіча вяртае нас назад. Нацыянальны камітэт і Выканаўчы камітэт тое самае. Быць можа замест таго, каб яго касаваць, перавыбраць, перабудаваць яго. Скасаваньне Камітэту нашы ворагі могуць зразумець як уступку ім, і гэто акрыліла-б іх надзеі. (Апл.)

Газетны пераказ прамовы не дазваляе ўпэўнена сцвярджаць, што Скірмунт пакінуў без адказу заўвагу Кахановіча наконт невыканання БНК даручэння сакавіцкага з'езда, звязанага з вызначэннем этнаграфічных межаў Беларусі. Магчыма, ігнараванне рашэння з'езда было абумоўлена тым, што кіраўнік БНК не развітаўся з краёвай канцэпцыяй і працягваў шукаць шляхі захавання цэласнасці ўсёй гістарычнай Літвы. Пра гэта могуць сведчыць ягоныя намаганні дасягнуць паразумення з Літоўскай радай у Петраградзе і імкненне пашыраць краёвасць сярод мясцовых польскіх арганізацый.

Меркаванне былога кіраўніка БНК наконт таго, што ліквідацыя Камітэта толькі ўсцешыць ягоных ворагаў, падтрымаў Я. Сушынскі, які таксама заявіў, што не разумее клопату асобных дэпутатаў пра Расію: «Мы павінны найперш дбаць аб дабро свайго народу»[993]. Э. Будзька заявіў, што ў беларускага руху ёсць больш пільныя патрэбы, чым замена адной арганізацыі на іншую. Ім запярэчыў Аркадзь Смоліч, які сцвердзіў, што як арганізатар беларускага руху БНК ужо выканаў сваю ролю, а зараз узнікла патрэба стварэння іншай арганізацыі: «Цяперашні зьезд меншы па ліку, але большы па ўдзельнай цяжасьці, і яго орган павінен мець больш аўтарытэту і паўнамочый»[994].

З'езд прыняў рашэнне пра абранне пяцёх сяброў Выканаўчага камітэта, якія павінны былі ў бліжэйшы час падрыхтаваць першую сесію новай арганізацыі. Пры ўдзеле Алексюка, Гадлеўскага і Смоліча была выпрацавана рэзалюцыя, што з'езд беларускіх арганізацый перадае палітычныя справы Выканаўчаму Камітэту з'езда, а культурныя – Таварыству беларускай культуры. Выканкам быў абавязаны правесці першую сесію да 5 жніўня.

Кандыдатамі на сяброўства ў Выканкаме былі толькі прадстаўнікі БСГ і БНПС. Позна ўвечары ў выніку галасавання былі абраны Я. Лёсік, П. Бадунова, У. Фальскі (усе БСГ), П. Аляксюк і А. Лявіцкі (усе БНПС)[995].

Аднак вынікі выбараў абярнуліся скандалам, які высвятліў сапраўдныя намеры кіраўнікоў БСГ. Я. Дыла, А. Смоліч і З. Жылуновіч заявілі, што выбары неабходна паўтарыць, бо яны прайшлі «паспешна», і што абраны Выканкам

[993] Тамсама, № 11.

[994] Тамсама, № 12.

[995] Тамсама.

нібыта не здольны да працы, бо ў яго склад трапілі «шкодныя элементы». На пытанне пра «шкодніка» Жылуновіч адказаў: «Гэта Аляксюк». Прадстаўнікі БСГ заявілі, што не жадаюць працаваць ні з кім з былых сяброў БНК. Адбыўся кароткі і жорсткі абмен меркаваннямі паміж дэлегатамі БСГ і БНПС, падчас якога прагучалі даволі рэзкія ўзаемныя абвінавачванні. У знак пратэсту дэпутаты ад БНПС (апрача Лявіцкага) пакінулі пасяджэнне. Відавочна, што разам з імі сышоў і Скірмунт.

Адбылося паўторнае галасаванне, і сябрамі Выканкама сталі Я. Лёсік, А. Лявіцкі, У. Фальскі, А. Смоліч і У. Голуб[996]. Даследчык Алесь Жынкін сцвярджаў, што Выканкам узначаліў Язэп Лёсік[997]. Калі гэта і так, то згода Лёсіка на кіраўніцтва была няпростым рашэннем. Вядома, што ён быў абураны скандалам з паўторнымі выбарамі і нават адмовіўся ўваходзіць у склад Рады. Толькі настойлівая просьба Бадуновай змяніла яго рашэнне. Ва ўспамінах Жылуновіч ахарактарызаваў гэтае свядомае разбурэнне адзінства беларускага руху з боку дзеячаў БСГ як «ужыванне рэволюцыйнага мэтоду»[998].

Рэдактар «Вольнай Беларусі» Язэп Лёсік. Фотаздымак 1920-х гг.

Варта адзначыць, што не прайшла прапанова ператварыць «Вольную Беларусь» у орган друку Цэнтральнай Рады. Газета засталася органам Таварыства беларускай культуры, створанага яшчэ былым БНК. Падобна, што Лёсік як рэдактар газеты не збіраўся рабіць яе яшчэ адным органам БСГ.

Пазней на пасяджэнне вярнуўся Стульба, каб зачытаць пратэст народных сацыялістаў. Яны ацанілі паводзіны дэпутатаў БСГ як недэмакратычныя, як гвалт над меншасцю і заявілі, што адклікаюць сваіх прадстаўнікоў са з'езда і шырока паведамяць пра гэта. Дзеянні сяброў БСГ яны ахарактарызавалі як «перашкодныя да шырокага нацыянальна-культурнага адраджэньня Беларусі». Пры гэтым БНПС заяўляла, што «ставячы вышэй за ўсё эканамічны і нацыянальна-культурны росквіт нашага народу, яна ўсе свае сілы ахвяруе яму і на абарону яго клясавых інтарэсаў»[999].

---

[996] Тамсама, № 13.

[997] Я. Лёсік, *Творы*. Укладанне, прадмова і каментары Алеся Жынкіна. Мінск 1994, с. 11.

[998] Ж. З. [З. Жылуновіч], *Уступамі да Акцябра (Матэр'ялы да гісторыі Савецкай Беларусі)*, с. 88.

[999] «Вольная Беларусь». 1917, № 13.

Напрыканцы з'езда было прынята рашэнне пра арганізацыю беларускіх бежанскіх гурткоў на чале з Беларускай народнай Грамадой, таксама быў зацверджаны склад Арганізацыйнага бюро беларусаў-вайскоўцаў і заяўлена пра неабходнасць адкрыцця ў Беларусі ўніверсітэта і сельскагаспадарчага інстытута. На гэтым з'езд скончыў працу.

Як ацаніць ягоныя вынікі? Зміцер Жылуновіч пазней канстатаваў, што пасля з'езда «з затаенай крыўдай адыйшлі на гэты раз ад чыннага ўдзелу ў беларускім руху яго злыя гэніі – Р. Скірмунт, П. Алексюк і блізкія ім»[1000]. Для найбольш радыкальных беларускіх сацыялістаў нацыянальная ідэя адыходзіла на другі план перад перспектывай перамогі ў класавым змаганні. Той жа кіраўнік БСГ сцвярджаў: «Буржуазія хоць і свая, хоць і натхнёная адраджэнцкім рухам, усё-ж такі – буржуазія. Значыць – яна вораг...»[1001]

Аднак цалкам задаволенымі петраградскія лідэры БСГ не былі. Яны лічылі, што ў Выканкаме Рады ўсё ж апынуліся «ненадзейныя элементы». У іх катэгорыю трапілі сябры былога БНК. Дарэчы, адзін з іх – Язэп Лёсік – з аптымізмам вітаў стварэнне новай беларускай арганізацыі. На старонках «Вольнай Беларусі» ён сцвярджаў, што першым крокам Рады «будзе зьяднаньне параскіданага, згуртаваньне расьцярушанага ў адно цэльнае, моцнае і працаздольнае і надасць яму сілы, павагі і аўтарытэтнасьці»[1002]. У артыкуле рэфрэнам гучаў лозунг «Жыве Беларусь!» Як старшыня Выканкама Лёсік прыступаў да новых абавязкаў поўны аптымізму і гатовы да цяжкай працы.

Асноўнымі задачамі беларускага руху ў той момант ён лічыў вырашэнне арганізацыйнай праблемы (стварэнне Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый на яе першай сесіі), фінансавага пытання, «ацэнка палітычнага моманту і стаўленне да яго» (магчыма, хвалявала далейшая радыкалізацыя рэвалюцыйнага руху), прыняцце адозвы да народу і правядзенне выбарчай кампаніі ва Устаноўчы сход.

«Злы гэній» беларускага руху Раман Скірмунт толькі аднойчы прамаўляў на гэтым з'ездзе. Магчыма, сярод сацыялістаў ён не адчуваў сябе дастаткова ўпэўнена. А можа, да апошняга спадзяваўся на захаванне адзінства беларускага руху, што звязваў з дзейнасцю БНК, які яднаў розныя палітычныя сілы? На жаль, адсутнічаюць дакументы, якія маглі б дапамагчы зразумець ход думак Скірмунта ў гэты вельмі няпросты для яго перыяд. Насамрэч, адбылося ягонае выгнанне з беларускага руху, і нават падзяка не прагучала падчас ліпеньскага з'езда.

Казімір Акуліч акрэсліў кіраўніцтва БНК Раманам Скірмунтам, «палякам

[1000] Ж. З. [З. Жылуновіч]. *Уступамі да Акцябра (Матэр'ялы да гісторыі Савецкай Беларусі)*, с. 89.

[1001] Тамсама.

[1002] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Беларуская Рада*, «Вольная Беларусь». 1917, № 11.

і беларусам у адной асобе», як «апошні акт польска-беларускага сімбіёзу...»[1003] Насамрэч, Скірмунт заставаўся дзеячам «другога эшалону» беларускага руху, і яго яшчэ чакалі як новыя поспехі, так і новыя расчараванні. «Апошні акт» яшчэ працягваўся...

Між тым, БНПС не збіралася здаваць свае пазіцыі і адмаўляцца ад удзелу ў сесіях Цэнтральнай рады. Так, 28 ліпеня 1917 г. у мястэчку Смілавічы адбыўся сход жыхароў, на якім было вырашана «залажыць аддзел беларускай партыі народных сацыялістаў і выслаць прэдстаўніком сваім кс. Янку Завістоўскага на зьезд беларускіх партый і арганізацый у г. Мінск 5 аўгуста 1917 года»[1004]. Падобна, што «зъездам» назвалі І сесію Цэнтральнай рады, прызначаную на 5 жніўня. Старшынём «аддзелу» абралі ксяндза Астрамовіча, ягоным намеснікам Каэтана Станішэўскага. Подпісы пад дакументам пакінулі каля 10 чалавек. Відавочна, што шматлікіх прыхільнікаў у Смілавічах БНПС не мела. Але гэты дакумент дазваляе сцвярджаць, што кіраўнікі БНПС усё ж не гублялі надзеі стаць апанентам БСГ.

Пошукі водгукаў на рашэнні ліпеньскага з'езда прымусілі зазірнуць на старонкі галоўнага органа віленскага цэнтра беларускага руху газеты «Гоман». Цікава, што ўпершыню інфармацыя пра беларускую палітычную дзейнасць у Менску з'явілася ў газеце толькі ў чэрвені 1917 г. Магчыма, гэтае спазненне было абумоўлена абмежаваннямі нямецкай цэнзуры. Дык вось, у артыкуле «Аўтаномія Беларусі» (без подпісу) паведамлялася пра з'езд беларускіх арганізацый і стварэнне Беларускага Нацыянальнага камітэта, галоўнай мэтаю якога была аўтаномія Беларусі. Таксама ў тэксце давалася пазітыўная ацэнка далучэння да беларускага руху «цэлага раду вялікіх паноў-беларусаў». Праўда, з гэтага «раду» былі названы толькі Вайніловіч як прадстаўнік «беларускага правага крыла» і Булгак. Таксама ў артыкуле фігуравалі добра вядомыя беларускай Вільні А. Уласаў і В. Іваноўскі[1005].

Аднак вельмі хутка Антон Луцкевіч на старонках «Гомана» катэгарычна асудзіў саюз з «панамі». У артыкуле «Новы фронт»[1006] ён заявіў, што беларускі рух ад свайго пачатку з'яўляўся «шчыра дэмакратычным» і заўсёды быў моцна звязаны з расійскай сацыял-дэмакратыяй. Ён заклікаў не верыць тым, хто не падтрымліваў сацыял-дэмакратычную апазіцыю ў Расіі. Далучэнне да беларускага

[1003] K. Okulicz, *Podział ziem Wielkiego Księstwa Litewskiego 1915–1923–1940* (у:) *Alma Mater Vilnensis. Prace Społecznosci Akademickiej USB na obczyznie*. Tom III. Londyn 1953, s. 122.

[1004] Цэнтральная Нацыянальная бібліятэка імя Якуба Коласа. Аддзел рукапісаў. Ф. 23, воп. 1, спр. 20, арк. 1.

[1005] б/п. *Аўтаномія Беларусі*, «Гоман». 1917, № 51. (Варта адзначыць, што з пачаткам нямецкай акупацыі Вільні там быў уведзены грыгарыянскі календар. У 1917 г. яго разбежнасць з юліянскім, які яшчэ дзейнічаў на тэрыторыі Расіі, складала 12 дзён. Між іншым, гэта значыць, што публікацыя ў «Гомане» з'явілася падчас першага дня працы II з'езда беларускіх арганізацый.

[1006] І. Мялешка [А. Луцкевіч], *Новы фронт*, «Гоман». 1917, № 53.

руху «Скірмунтаў, Ваньковічаў і т. п.», якія раней нібыта не прызнавалі беларусаў, Луцкевіч не лічыў праявай «палітычнага розуму» і раіў ставіцца да іх «з вялікай асьцярожнасьцю: ніхай цяперашняе палажэньне адменіцца, і тыя паны, не задумваючыся перамяняць свой фронт гэтаксама, як перамянілі цяпер». Паводле лідэра беларускіх сацыялістаў, «уся буржуазія і ўсё панства беларускае здаўна апалячылося ці абмасковілося».

Вось так... Нібыта і не было ранейшых кантактаў са Скірмунтам і прыхільнасці да краёвай ідэі. Нават у выпадку Луцкевіча сацыялістычнае дактрынёрства брала верх.

Забягаючы наперад, трэба адзначыць, што ўвосень 1917 г. падчас падрыхтоўкі Віленскай беларускай канферэнцыі сацыялісты разам з А. Луцкевічам пачалі актыўна ствараць агульнабеларускі фронт і загаварылі пра першынство ўжо нацыянальнай ідэі.

У беларускай гістарыяграфіі пашырана думка, што «дэмакратызацыя» цэнтральнага каардынацыйнага органа беларускага руху, а таксама паглыбленне сістэмнага крызісу Расіі паспрыяла яго далейшаму разгортванню. Гэта, прынамсі, адзначыў С. Рудовіч[1007]. Наконт «крызісу» сумневаў няма, а вось сцвярджэнне пра «дэмакратызацыю» выклікае пытанні. Ці сапраўды ліквідацыя БНК і спроба адлучэння ад беларускага Адраджэння прадстаўнікоў больш заможных колаў грамадства можа разглядацца як «дэмакратызацыя» беларускага руху? Хутчэй варта казаць пра ягоную сацыяльную радыкалізацыю. Магчыма, яна сапраўды павялічыла колькасць прыхільнікаў БСГ і беларускай справы, але няма адказу на пытанне, у якой ступені іх прывабліва нацыянальная ідэя, а ў якой – сацыялістычная?

Даследчык Юры Туронак бачыў пэўную заканамернасць у ліквідацыі БНК і выгнанні Скірмунта: «БНК павінен быў сысці з палітычнай сцэны. Рэвалюцыя адштурхоўвала Скірмунта, які быў не толькі буйным землеўласнікам, але перш за ўсё як дэпутат былой Дзяржаўнай Думы кампетэнтнай і вопытнай у палітычных справах асобай. «Рэакцыянерамі» таксама лічылі дзеячаў хадэцыі і народнікаў, сярод якіх толькі некаторыя мелі шляхецкае паходжанне. У нармальных умовах гэта было б роўным самазабойству, але з нагоды нігілістычнай палітыкі ўрада ў нацыянальным пытанні не мела вялікага значэння»[1008]. З апошнім тэзісам нельга пагадзіцца. У тагачаснай сітуацыі надзвычай важную ролю адыгрывала дзейнасць партый і арганізацый Беларусі, а не ўрада. Між тым, як трапна заўважыў Алег Латышонак, «БСГ атрымала перамогу коштам адзінства беларускага нацыянальнага руху»[1009].

Гісторыя беларускага руху ў 1917 г. – гэта таксама гісторыя змагання сацыялістычнай дактрыны ў варыянце агульнарасійскіх партый з беларускай ідэяй

[1007] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 131.

[1008] J. Turonek, *Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi*. Warszawa 1992, s. 72.

[1009] O. Łatyszonek, *Białoruskie formacje wojskowe. 1917–1923*. Białystok 1995, s. 43.

і канцэпцыяй нацыянальнага адзінства. Ліквідацыя БНК перакрэслівала надзею на гэтае адзінства. Зразумела, што ў той момант яно мела больш вонкавы характар і было фармальным, але і форма ў гістарычных падзеях часам адыгрывае важную ролю. Асабліва ў сітуацыі, калі гісторыя прыспешвае свой ход.

Вяртаючыся да аптымізму Язэпа Лёсіка, трэба адзначыць, што пасля першай сесіі Цэнтральнай рады, якая адбылася ў Менску 5–6 жніўня 1917 г., гэты аптымізм моцна пахіснуўся. Так, інфармацыя пра сесію мела вельмі сціплы характар і была надрукавана на апошняй старонцы газеты[1010].

Гаворка ішла пра зацвярджэнне Статута Рады прадстаўнікамі 23-х беларускіх арганізацый, якія «вызнаюць права Беларусі на аўтаномію, родную мову і разьвіцьцё нацыянальнай культуры». Таксама адзначалася, што гэтыя арганізацыі яднае «прынцып поўнай дэмакратызацыі грамадзянскага ладу, дарэмнай перадачы ўсяе зямлі працоўнаму народу і абароны інтарэсаў работнікаў». Апрача таго, на сесіі быў зацверджаны Статут асветніцкіх гурткоў для вайскоўцаў і прынята рашэнне пра стварэнне ў Менску Цэнтральнага беларускага бежанскага камітэта. Фінансавую праблему ўдзельнікі сесіі прапанавалі часткова вырашыць шляхам падаткаабкладання. Уводзіўся 1 % падаходны падатак з кожнага сябра беларускіх арганізацый, а таксама 25 % ад даходаў кожнай арганізацыі.

Таксама вядома, што на першай сесіі гаворка ішла пра распаўсюджванне нацыянальных лозунгаў на франтах і ўзмацненне барацьбы за беларускую школу. Удзельнікі сесіі абралі Выканкам Рады, куды ўвайшлі: Я. Лёсік, А. Смоліч, Ф. Шантыр, Р. Астроўскі, Ф. Галавач, Я. Дыла, З. Жылуновіч, П. Бадунова ды інш.

Пры гэтым ужо на першай сустрэчы выявілася імкненне петраградскіх лідэраў БСГ адасобіцца ад нібыта «правага» крыла партыі. Пазней Жылуновіч прыгадаў, што дэлегаты Нарвенскай раённай арганізацыі БСГ (Петраград) пачалі асуджаць «трусьлівую палітыку Рады, яе яшчэ нескасаваную тэндэнцыю прадстаўляць агульнанацыянальны рух і інш. Напады былі досьць значныя і мелі важкі ўплыў на сэсыю»[1011]. Магчыма, менавіта гэта аслабіла імпэт Язэпа Лёсіка ды іншых «старых» кіраўнікоў беларускага руху ў складзе Цэнтральнай рады.

У сярэдзіне жніўня «Вольная Беларусь» апублікавала Статут Цэнтральнай рады, першы параграф якога сцвярджаў, што Рада з'яўляецца «адпаведальным кіраўніком і прадстаўніком усяе беларускае справы». Паміж сесіямі Рады важную ролю адыгрываў Выканаўчы камітэт, які павінен быў весці «справы палітычнага прадстаўніцтва і абьеднаньня ўсіх беларускіх арганізацый»[1012].

[1010] б/п. *Першая сэсія Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый*, «Вольная Беларусь». 1917, № 13; НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 8, арк. 105–106 адв.

[1011] Ж. З. [З. Жылуновіч]. *Уступамі да Акцябра (Матэр'ялы да гісторыі Савецкай Беларусі)*, с. 90.

[1012] *Статут Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый*, «Вольная Беларусь». 1917, № 14; НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 8, арк. 136–136 адв.

Поўнай згоды і паразумення паміж рэдакцыяй «Вольнай Беларусі» і радыкальнай часткай сяброў Цэнтральнай рады не было. Пэўная перамена настрояў і з'яўленне больш крытычнага погляду на вынікі ліпеньскага з'езда адлюстраваліся ў № 16 «Вольнай Беларусі» (ад 28 жніўня 1917 г.). На першай старонцы былі змешчаны нататкі *І. Піліпава* (сапр. Язэп Нялепка), які заклікаў «братоў Беларусаў» да адзінства: «Ідзіце ўсе разам, памятаючы раз назаўсёды, памятаючы так, каб кожная капля вашай крыві чула; каб кожная складка мазга ведала; каб уся душа ваша любоўю гарачай спазнавала: Адзін за ўсех і ўсе за аднаго! [...] Сіла ў еднасьці»[1013].

У тым самым нумары Самуіл Плаўнік (*Змітрок Бядуля*) падзяліўся расчараваннем ад апошняга беларускага з'езда: «Сварка, ледзь за чубы не ўзяліся. Партыйныя рахункі, асабістыя рахункі... «Гэта хамства!» – выклікае адзін... «А вы агент каталіцкай клерыкальнай партыі», – дадае другі. «Дарога, па якой Б.С.Г. хоча вясьці нашую працу, можа быць перашкоднай для шырокага нацыянальна-культурнага адраджэньня Беларусі», – выяўляе трэці. Што гэта такое? [...] Прадстаўнікі цэлай партыі пакідаюць сход, а старшыня кажа: «Зьезд беларускіх арганізацый вядзе далей сваю справу». Гдзе ж тут характар «агульнага», калі лічыць, што ў нас толькі дзве партыі? А калі хто ня лічыць Б. Н. Саў спрыяючымі нашай справе, хай давядзе нам гэта. Мы хочам ведаць, мы павінны ведаць усё! Вы стаіці на варце інтарэсаў любай усім нам Маткі-Беларусі. Мы ўглядаемся на вас, як на лепшых сыноў яе, – тлумачце нам. Вораг ня сьпіць. Яму да душы гэткія зьявы»[1014].

Нарэшце, варта звярнуць увагу на артыкул «Зямельнае пытаньне і дзяржаўны лад»[1015] за подпісам *І. Рамановіч*. Беларускага дзеяча з такім прозвішчам, здольнага напісаць падобны артыкул і названага ў каментарах рэдактара «шаноўным аўтарам», не было. Аналізуючы змест тэксту можна выказаць меркаванне, што за гэтым псеўданімам мог хавацца Раман Скірмунт[1016]. Зразумела, што артыкул пад ягоным прозвішчам не меў шансаў быць апублікаваным на старонках органа Цэнтральнай рады. Затое нішто не перашкаджала публікацыі пад новым і непазнавальным псеўданімам.

У тэксце крытычна ацэньвалася канцэпцыя нацыяналізацыі («перадачы зямлі

[1013] І. Піліпаў [Я. Налепка], *Сіла у еднасьці*, «Вольная Беларусь». 1917, № 16.

[1014] Зрэбны [С. Плаўнік], *З вёскі*, «Вольная Беларусь». 1917, № 16.

[1015] І. Рамановіч [Р. Скірмунт?], *Зямельнае пытаньне і дзяржаўны лад*, «Вольная Беларусь». 1917, № 16.

[1016] Пошукі аўтара *J. Ramanowicza* ў польскім віленскім друку пачатку XX ст. дазволілі выявіць дзве публікацыі зямяніна Юзафа Рамановіча. Публікацыі мелі апісальны характар і датычылі жыцця польскай супольнасці на беларускага-літоўскім памежжы. Прагляд «Вольнай Беларусі» дазволіў выявіць яшчэ адзін тэкст *І. Рамановіча*. У № 6 (1918) газеты ў фельетоне «Чорны Адам» ён заклікаў шанаваць розум і разумных людзей па аналогіі з «заходнімі культурнымі краінамі». У № 21 быў апублікаваны спіс ахвяраванняў на выданне «Вольнай Беларусі», з якога можна даведацца, што *Рамановіч* перадаў у рэдакцыю 50 руб.

ў казну») або сацыялізацыі зямлі («перадача ў агульнародную ўласнасьць»). Дарэчы, аўтар не бачыў прынцыповай розніцы паміж імі. Ён выказваў занепакоенасць, што такая аграрная рэформа прывядзе да значнага ўзмацнення ролі ўрада, які «набірае страшэннай сілы над грамадзянствам гасударства, над яго культурным, эканамічным і нацыянальным развоем». *І. Рамановіч* не меў пэўнасці, што ўрад не будзе злоўжываць сваёй уладай. У гэтым выразная сугучнасць артыкула 1917 г. са скірмунтавым аналізам праектаў радыкальнай аграрнай рэформы ў Дзяржаўнай Думе (1906).

Апрача таго, аўтар выказваў занепакоенасць, што сітуацыю маглі пагоршыць міжнацыянальныя канфлікты ўнутры дзяржавы і верагодны прыход да ўлады ў Расіі «правых нацыяналістаў» або «рэакцыі».

Іншая праблема, на якую ён звяртаў увагу, датычыла памераў зямельнага надзела, які з улікам колькасці ахвотных яго набыць і памераў зямельнага фонду будзе дастатковы «на пражытак, але ні на значнейшы дастатак». Аднак воля і свабода толькі тады становяцца «вельмі каштоўным набыткам», калі народ атрымлівае магчымасць «павялічваць свой дастатак».

Наймацнейшым стымулам да працы аўтар лічыў «асабісты інтарэс», што грунтуецца на прыватнай ўласнасці, якую паўсюдна шануюць, «ня гледзячы на тое, што яна часта ідзе побач з крыўдай і паняверкай». Ён таксама заклікаў не змагацца з «капіталам», а спрыяць яго станаўленню: «Ад творчай працы капіталу мы павінны чакаць эканамічнага (гаспадарнага) росквіту нашага краю і павялічэньня у ём дастатку».

Напрыканцы тэксту аўтар зноў звяртаўся да тэмы аўтаноміі Беларусі і сцвярджаў, што «Беларусь хоча жыць сваёй воляй і сваім розумам». Ён заклікаў патрабаваць ад Устаноўчага сходу аўтаноміі «з правам увадзіць свае ўласныя распарадкі, згодныя з духам і воляю нашага народа ў поўным закрэсі сваіх спраў, а ў тым ліку і справы зямельнае». Дзеля гэтага прапанавалася стварыць Цэнтральную беларускую народную раду і правесці асобныя выбары ва Устаноўчы сход, «дзе нашы прадстаўнікі апрацуюць статут нашай аўтаноміі і акрэсляць граніцы беларускае зямлі».

Варта нагадаць, што сярод існуючых беларускіх партый найбольш актыўна за агульнанародную ўласнасць на зямлю выступала БСГ. Гэтае палажэнне ўтрымлівалася ў яе праграме, прынятай на канферэнцыі 25 сакавіка 1917 г. Дзеяч БСГ Алесь Бурбіс ва ўласным праекце новай партыйнай праграмы, складзеным улетку 1917 г., сцвярджаў неабходнасць «канфіскацыі зямель казённых, удзельных, манастырскіх, царкоўных і памешчыкых у аддачу іх працавітаму народу на фундамэнце сацыялізацыі»[1017]. Гэтай перадачай павінна была займацца Краёвая беларуская Рада.

[1017] А. Сідарэвіч, *Да гісторыі Беларускай сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў*, «Archepачатак». 2006, № 4.

ДАКУМЕНТ

І. Рамановіч [Р. Скірмунт?]. Зямельнае пытанне і дзяржаўны лад[1018].

Можна спадзявацца, што да Устаноўчага Сойму пройдуць у большасьці дэпутаты сацыялістычнага кірунку. Грамада селянскага люду ў Расіі хоць і ні сацыялістычна, але, будучы палітычна ніспелай, цёмнай, беднай і спрагнёнай зямлі, лёгка можна пайсьці у той бок, адкуль чуецца кліч: «Зямля і воля». Вось і можна думаць, што Сойм вынясе дужа важнае пастанаўленне: установіць у Расіі дэмакратычную рэспубліку і перадасьць усю зямлю з рук ціперашніх яе ўласьнікаў у казну, або завядзе сацыялізацыю зямлі. Мы павінны заговедзь [загаддзя] разгледзіць, ці будзе гэтая зямельная рэформа карысная для беларускага народу.

Вядома, што кожны народ больш за ўсё жадае быць самавітым гаспадарам у сваём краю, і той дзяржаўны лад, які прызнаў бы за Беларусью права на аўтаномію у яе этнаграфічных (дзе жывуць беларусы) [межах], быў бы для нас найлепшы і карысны. У рэспубліцы дабіцца гэтага лягчэй, чым у манархіі, – значыць, гэты парадак дзяржаўнага ладу ня перэчыць інтарэсам беларускага народу. Зусім іншая справа – сацыялізацыя зямлі або пераход яе да казны. Ад мамэнту пераходу ўсёй зямлі у казну, у рукі Ураду – трэ' думаць, тым самым Урад набірае страшэннай сілы над грамадзянствам гасударства, над яго эканамічным, культурным і нацыянальным развоем. Патрэбна вялікая пэўнасьць, што ўрад, узяўшы ў свае рукі такую ўласьць, будзе заўсёды праўдзівым прадстаўніком інтарэсаў усіх грамадзян гасударства, што ён ня будзе злоўжываць ці махляваць гэтай уласьцю; што ў нас будзе магчымасьць скінуць ці зьмяніць яго, калі ён парушыць правы грамадзян. Нарэсьці, ці патрапяць самі народы ў гасударстві спыніць у сябе і паміж сабою усялякія спрэчнасьці ў справе змагання на ніве эканамічнай, нацыянальнай і інш., і ці не створаць яны многа перашкод для Ураду пры выкананні ім сваіх абавязкаў.

Дагэтуль ня маем прыкладу, каб дзе на сьвеці быў такі дзяржаўны лад, які нам бажаецца завесьці. Тым-та самую трываласьць дзяржаўнага ладу ня можна згоры правідзіць і ня можна быць пэўным, што так яно станяцца, як жадаецца. Маемо прыклад на Францыі. Французы, адзін з найбольш культурных народаў у Эўропі, посьля вялікай рэвалюцыі у канцы 18-га веку, два разы порываліся устанавіць у сваём гасударстві рэспубліку, і ледзьвя за трэцім разам блізка праз 80 год посьле рэвалюцыі, здолалі умацаваць гэты лад дзяржаўнага кіравання. Ці Расія здолее за адным махам пры сваёй культурнай адсталасьці завесьці гэтакі лад, якога яшчэ нідзе німа (усе ціперашнія рэспублікі буржуазныя), ды яшчэ у гэткім часе як цяпер – нет ведама. А што будзе, калі уласьць у Расіі захопяць расійскія нацыяналісты?

[1018] Вольная Беларусь. 1917. № 16, 28 жніўня.

Дагэтуль яшчэ ніводнае культурнае гасударство не адважылась завесьці у сябе сацыялізацыю зямлі, але можна спадзявацца, што у тым гасударстві, дзе гэта будзе заведзена, не закасуецца гэта і пры пераходзі ўлады у рукі рэакцыі, якая рада будзе выкарыстаць пераход зямлі пад загад Ураду як павелічэньне свае ўласці дзеля трымання людзей у кабале і абрусенні [наварота на маскалёу], пераселяючы людзей з аднае акругі у другую па свайму бажанню. Закліч «Уся зямля для працоўнікаў на зямлі» пры сацыалізацыі зямлі вядзе да роўнага падзелу і спажыткавання на роўных правах усяго зямельнага запасу ў гасударстві паміж усімі ахвотнікамі працаваць сваім рукамі на зямлі. Залежна ад гэтаго, – ад ліку зямлі і працоўнікаў, кожны адтрымае кавалак зямлі, які хто зможа абрабіць сам з сямьёю, але бяз найміта, а можа і меньш таго, калі выявіцца нідахват зямлі. Пры гэтакіх парадках трудна будзе выбіцца каму-небудзь з гурту шэрых земляробаў, пакуль хто сядзіць на зямлі, каторае можа хваціць на пражытак, але ні на значнейшы дастатак. Хто сойдзе з зямлі, дык на яго месца пасадзяць другога, бо зямля ня будзе асобнай уласнасьцю, а гасударсцьвеннаю, значыць з яе будуць карыстаць як з дажывотнай арэнды. Памрэ гаспадар, не ведама, што рабіць удаве з нялетнімі дзецьмі: найміта або парабка ня будзе, бо хто можа працаваць, той і сам возьме зямлі. Воля – вельмі каштоўны набытак, калі народ мае магчымасьць павялічваць свой дастатак. Чалавек тым і розьніцца ад безмоўнага стварэння, што ён ніколі не здавальняецца тым, што мае, а пастаянна рупіцца аб тым, каб надбаць сабе як найбольш дабра, патрэбы яго пашыраюцца і праз гэта ён вытварае культурны поступ у грамадзянстві. З часам станяцца, што людзі навучацца шчыра працаваць дзеля агульнай карысьці, на грамаду. Цяпер жа такіх людзей мала і трэба прызнаць, што у наш час асобісты інтэрэс гэта самая моцная прынука да працы. Праз тое на цэлым сьвеці шануюць уласнасьць, ня гледзячы на тое, што яна часта ідзе побач з крыўдай і паняверкай. Бяз яе людзь загразьлі б у апатыі і, заміж пашырэньня і павялічваньня патрэб, зьменшылі-б іх да ліку лёгка дабываных патрэб пражыўлення.

Беларусь – край бедны. Ані нетра яго, ані паверхні пласт зямлі ня славіцца багацьцем. Трэба многа шчырай і разумнай працы, каб мець добры зыск і аплату за працу, а разумная праца вымагае капіталу (грошы). А сушка балотаў, штучныя гноі, гаспадарскія машыны і прылады, заводы фабрыкі і інш. вымагаюць многа грошы і асабістага пачыну (ініцыятывы), а праз гэта нам ня след змагацца з капіталам (у яком сэнсі? – Рэд.), а наадварот ад творчай працы капіталу, мы павінны чакаць эканамічнага (гаспадарнага) росквіту нашага краю, павялічэння ў ём дастатку.

Для нас важней за ўсё, каб нам ніхто ня накладаў свае волі. Беларусь хоча жыць сваею воляй і сваім разумам. Устаноўчы Сойм павінян даць Беларусі тэрыторыяльную аўтаномію з правам увадзіць свае ўласныя распарадкі, згодныя с духам і воляю нашага народу ў поўным закрэсі усіх спраў, а ў тым ліку справы зямельнае. Дзеля гэтага нам трэба хутчэй устанавіць Цэнтральную Беларускую Народную

Раду як на Украіні і дабівацца асобных выбараў у Сойм, дзе нашы прэдстаўнікі апрацуюць статут нашай аўтаноміі і акрэсьляць граніцы беларускай зямлі.

І. Рамановіч

P. S. Заўважыўшы, што сацыялізацыя і нацыяналізацыя (вылучана рэд. – А. С.) зямлі ні адно і тое, згаджаючыся з шаноўным аўтарам, што зямельная справа на Беларусі можа быць разважаная толькі Беларускаю Краёваю Радаю, і што усе праэкты зямельнай рэформы расійскіх партый для нас ні дапасованы, рэдакцыя ахвотна друкуе артыкул шаноўнага аўтара. Разам з тым, рэдакцыя спадзяецца, што гэта выкліча спрэчкі і знойдуцца людзі, каторыя захочуць асьвяціць пытаньне с свайго погляду на грунт рэчы.

Жылуновіч памыляўся, калі сцвярджаў ва ўспамінах, што Скірмунт пасля ліпеньскага выгнання не ўмешваўся ў беларускія справы, «да чаго ўжо было прывыкнута»[1019]. У гэты перыяд ён знік з палітычнай арэны як публічны беларускі дзеяч, але падтрымліваў стасункі з сябрамі былога БНК і спрабаваў адстойваць уласныя погляды на будучыню Беларусі. Цалкам невыпадкова на другой сесіі Цэнтральнай Рады ў кастрычніку 1917 г. ягоная кандыдатура была прапанавана сябрамі Выканкама ў якасці прадстаўніка Беларусі ў Радзе народаў. Рада была створана падчас II з'езда прыгнечаных народаў Расіі (5–14 верасня 1917 г., Кіеў)... У кожным выпадку Скірмунт не адышоў цалкам ад палітычнай дзейнасці.

Ён працягваў працаваць у Менскім губернскім харчовым камітэце, дзе з канца сакавіка займаў пасаду загадчыка аддзела забеспячэння. Выкананне службовых абавязкаў патрабавала вялікіх намаганняў і пэўнай самаахвярнасці. Можна толькі здагадвацца якіх высілкаў каштавала яму спалучэнне палітычнай дзейнасці з працай у Камітэце. Дакументы Губернскага камітэта, якія захаваліся ў фондзе 1743 Дзяржаўнага архіва Менскай вобл., дазваляюць у агульных рысах ахарактарызаваць гэты кірунак дзейнасці Скірмунта, які быў працягам ягонай ранейшай працы.

У матэрыялах згаданага фонду захаваліся тэлеграмы і лісты за подпісам Скірмунта як Упаўнаважанага па справах харчавання ў Менскай губ. за студзень – сакавік 1917 г. У прыватнасці, гэта тэлеграма ад 5 студзеня 1917 г. пра выдзяленне двух вагонаў мукі на патрэбы спажывецкага таварыства ў мястэчку Юравічы, накіраваная ў Рэчыцкую земскую ўправу[1020]. 7 сакавіка ўжо на яго імя прыйшоў ліст кіраўніцтва Спажывецкага таварыства чыноўнікаў з просьбай аб выдзяленні для крамы гэтага Таварыства прадметаў першай неабходнасці. Гэта быў паўторны ліст. Ягоныя аўтары адзначалі, што атрымаць гэтыя прадметы немагчыма без распараджэння

[1019] Ж. З. [З. Жылуновіч], *Уступамі да Акцябра (Матэр'ялы да гісторыі Савецкай Беларусі)*, с. 91.

[1020] Дзяржаўны архіў Менскай вобл. (далей: ДАМВ). Ф. 1743, воп. 2, спр. 5, арк. 12.

Скірмунта[1021]. Але падобна, што задавальненне патрэбаў чыноўнікаў не належала да прыярытэтаў ягонай дзейнасці. Адказ на гэты ліст не захаваўся.

13 сакавіка Раман Скірмунт накіраваў пісьмовае распараджэнне начальніку станцыі Лібава-Роменскай чыгункі наконт перадачы Харчоваму камітэту Заходняга фронту Земгора двух вагонаў грэчневай крупы, трох вагонаў гароху і пяці вагонаў пшанічнай мукі[1022]. Адзін з апошніх дакументаў, падпісаных Скірмунтам як Упаўнаважаным нарады па харчаванні датычыў адпраўкі з Адэсы вагона мыла для Менска і быў датаваны 25 красавіка[1023]. А вось тэлеграма да міністра харчавання ад 29 красавіка па справе дастаўкі з Паўночнага Каўказа для Менскай губ. 30 вагонаў кукурузы, была падпісана: «Губпродком Скірмунт»[1024].

Падобна, што на працягу сакавіка – красавіка 1917 г. адбывалася паступовае пераўтварэнне былых імперскіх органаў у новыя ўстановы. Прысутнасць Скірмунта і Самойленкі сведчыла пра пераемнасць дзейнасці устаноў забеспячэння харчаваннем.

Палажэнне аб Губернскім харчовым камітэце было зацверджана Часовым урадам толькі 30 сакавіка 1917 г. Управа Камітэта фарміравалася з прадстаўнікоў найбольш уплывовых арганізацый Менска і губерні, якія прадстаўлялі розныя сацыяльныя колы.

Першае пасяджэнне Менскага губернскага харчовага камітэта (МГХК) адбылося роўна праз месяц 30 красавіка. Ягоная стэнаграма сведчыць, што сябрамі Управы сталі Раман Скірмунт (ад землеўласнікаў), Ісаак Цеўмін і Барыс Шкубер (ад Менскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў), Ефім Хургін (ад гарадскога самакіравання), П. Шэпетаў (ад Менскага аддзела Сялянскага саюза і гарадской кааперацыі), Е. Трушынскі (ад губернскага земства)[1025].

Падчас вечаровага пасяджэння Скірмунт распавёў пра стварэнне і дзейнасць Губернскай харчовай камісіі і падрабязна пералічыў тыя перашкоды, якія не дазвалялі ёй у поўнай меры забяспечваць патрэбы насельніцтва ў харчаванні. Заканчэнне рэферата было даволі аптымістычным. Паводле стэнаграмы, выступоўца выказаў меркаванне, што «в настоящее время дело снабжения губернии из других губерний России значительно улучшиться, чему могут в значительной мере способствовать водные пути, связывающие Минскую губернию с южными, снабжающими ее продовольственными продуктами по плану снабжения. Познакомив заседание с планом снабжения губернии на май месяц, Роман Александрович Скирмунт говорит, что в распоряжении отдела снабжения за тот же месяц будет иметься около 800 вагонов, из которых отдел предполагает ис-

[1021] Тамсама, арк. 39.
[1022] Тамсама, арк. 42.
[1023] Тамсама, арк. 64.
[1024] Тамсама, воп. 1, спр. 5, арк. 52.
[1025] Тамсама, воп. 2, спр. 27, арк. 1.

пользовать около 400, остальные же будет предоставлять частным лицам, т. е. комиссионерам по закупкам»[1026].

У жніўні 1917 г. інструктарам аддзела забеспячэння стаў Павел Аляксюк. Відавочна, што гэта была ініцыятыва Скірмунта. Месячны заробак інструктара складаў 250 руб. і мог быць галоўнай крыніцай даходаў маладога беларускага палітыка, які ў той час ішоў поруч з былым кіраўніком БНК. У верасні 1917 г. Аляксюк атрымаў яшчэ 150 руб. «за сверхурочныя работы по исполнению обязанностей заведующего общим делопроизводством»[1027]. Падобна, што з гэтымі абавязкамі Аляксюк спраўляўся, бо ў дакументах МГХК за кастрычнік і лістапад ён фігураваў ужо як сакратар Управы.

Прынамсі, гэта датычыць надзвычайнага пасяджэння Управы 30 кастрычніка 1917 г., выкліканага нядаўнімі падзеямі ў Петраградзе. Пасяджэнне, якое вёў І. Цеўмін, асудзіла бальшавікоў «за углубление революционного раскола среди демократии и усиление разрухи в продовольственной деле». Управа вырашыла не прызнаваць бальшавіцкі ўрад, заставацца выканаўчым органам МГХК і дзейнічаць у кантакце з мясцовым Камітэтам ратавання рэвалюцыі. Стэнаграму рабіў Аляксюк[1028]. Дарэчы, Раман Скірмунт напрыканцы кастрычніка знаходзіўся ў Петраградзе як сябра Перадпарламента і быў сведкам бальшавіцкага перавароту.

Між тым, сітуацыя з забеспячэннем насельніцтва запасамі харчавання сапраўды рэзка пагоршылася. Арганізатары Усерасійскага прадуктовага з'езда, які адбыўся напрыканцы лістапада, загадзя разаслалі праект рэзалюцыі, у якім адзначалася поўная адсутнасць запасаў харчавання як на фронце, так і ў буйных гарадскіх цэнтрах, сцвярджалася, што краіна жыве толькі тэрміновым падвозам харчавання і канстатавалася «набліжэнне харчовай катастрофы»[1029].

Аднак палітычныя перамены канчаткова адсунулі Рамана Скірмунта ад працы ў МГХК. У стэнаграмах пасяджэнняў Управы за лістапад 1917 – студзень 1918 г. ягонае імя ўжо не фігуравала. Таксама там не згадваўся і Аляксюк. Затое з'явіліся новыя людзі, у прыватнасці, прадстаўнік бальшавіцкага Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) Людвік Рэзаўскі[1030], які «праславіцца» актыўным удзелам у разгоне Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г.

Сыход з МГХК спрыяў больш актыўнай палітычнай дзейнасці, але адначасна пазбаўляў Рамана Скірмунта важнай крыніцы існавання. Матэрыяльная сітуацыя Скірмунтаў у Менску да канца невядомая, але ўскосныя дадзеныя дазваляюць сцвярджаць, што вайна абярнулася фінансавым крызісам сям'і, і праца Скір-

---

[1026] Тамсама, арк. 7.

[1027] Тамсама, воп. 1, спр. 1, арк. 92, 105.

[1028] Тамсама, спр. 5, арк. 22.

[1029] Тамсама, спр. 1, арк. 75–75 адв.

[1030] Тамсама, спр. 10, арк. 73–81 ды інш.

мунта ў органах забеспячэння харчаваннем Менскай губ. была важнай крыніцай існавання.

Між іншым, пра гэта сведчыць адсутнасць інфармацыі наконт рэгулярнай грашовай падтрымкі Скірмунтам беларускіх культурніцкіх ініцыятыў, а таксама складанае фінансавае становішча Менскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны і БНК, у т. л. падчас ягонага кіравання. Актыўная дабрачынная дзейнасць сям'і Скірмунтаў у дарэвалюцыйны перыяд і непасрэдна Рамана Скірмунта ў 1920–1930-я гг. не дае падставы падазраваць палітыка ў празмернай ашчаднасці. Праца ў Харчовым камітэце была галоўнай крыніцай захавання пэўнага ўзроўню дабрабыту. Дарэчы, паводле знойдзеных дакументаў, заробак сябра Управы МГХК і загадчыка аддзела забеспячэння штомесяц складаў 500 руб.[1031] Памеры заробку былі вызначаны ў красавіку і не змяняліся, прынамсі, да лістапада 1917 г.

Таксама Скірмунт меў дачыненне да з'яўлення ў чэрвені 1917 г. у Менску Саюза землеўладальнікаў, пра што паведаміла газета «Новое варшавское утро». Паводле яе інфармацыі, Саюз ствараўся «для абароны іх [землеўдальнікаў. – *А. С.*] інтарэсаў сёння і падчас правядзення аграрнай рэформы ў заканадаўчых установах»[1032]. Карэспандэнт «Новага кур'ера літэўскага» паведаміў, што Саюз заявіў пра недатыкальнасць прыватнай уласнасці і неабходнасць уздыму дабрабыту ўсяго вясковага насельніцтва[1033]. Вядома, што напрыканцы ліпеня 1917 г., калі канчаткова сфарміравалася структура Саюза землеўладальнікаў, Раман Скірмунт увайшоў у склад ягонай Аграрнай камісіі[1034].

Вайніловіч пазней прыгадваў, што Саюз быў створаны падчас агульнага пасяджэння МТСГ. Ініцыятарам, а таксама галоўным «рухавіком» усёй арганізацыйнай працы быў адвакат Людвік Уняхоўскі, а старшынём абралі Ежы Чапскага. Былі наладжаны сувязі з агульнарасійскім Цэнтральным саюзам памешчыкаў, сядзіба якога знаходзілася ў Маскве. Менчукі рэгулярна ўдзельнічалі ў пасяджэннях Цэнтральнага саюза ў Маскве і Петраградзе. Вайніловіч адзначаў уплывовасць маскоўскіх партнёраў і іх дапамогу ў абароне маёмасных правоў землеўладальнікаў Меншчыны[1035].

Справа ў тым, што сацыяльная сітуацыя на Меншчыне рэзка абвастрылася ўжо ўвесну 1917 г. Гэтаму спрыяла блізкасць фронту з войскам, якое перажывала дэзарганізацыю і распад, ператваралася ў галоўную крыніцу анархіі і сваволля. Так, у маі 1917 г. якраз салдаты ўчынілі пагром маёнтка князя Святаполк-Мірскага ў м. Мір

[1031] Тамсама, воп. 2, спр. 21, арк. 9.

[1032] «Новое Варшавское утро». 1917, 18 июня.

[1033] «Nowy Kurier Litewski». 1917, Nr 145.

[1034] Cz. Brzoza, K. Stepan, *Skirmunt Roman (1868–1939)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 185.

[1035] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Częśc pierwsza*, s. 189–190.

Наваградскага пав. На ягонай тэрыторыі знайшлі запасы гарэлкі. П'яны натоўп тры дні рабаваў палац, знішчыў бібліятэку і карцінную галерэю. Мэблю і раялі выкідалі з вокнаў другога паверха. Узнікла пагроза антыгабрэйскага пагрому ў самім Міры. Урэшце камандаванне здолела прыслаць баяздольны полк, які прымусіў рабаўнікоў пакінуць м. Мір[1036]. Амаль адначасна салдатамі быў разрабаваны палац Радзівілаў у Паланечцы Наваградскага пав. Рабаўнікі парушылі нават спачын памерлых. Яны разбівалі труны на могілках і выкідалі прах, шукаючы скарбы[1037]. У чэрвені п'яныя казакі знішчылі сядзібу Хялхоўскіх на мяжы Менскай і Віленскай губ.[1038]

Трывожная інфармацыя прыходзіла з Палесся, насельніцтва якога таксама праяўляла «рэвалюцыйную актыўнасць». Як адзначаў карэспандэнт газеты «Новое время», «дымом лесных пожаров, разорением помещичьих гнезд, разрушением культурных предприятий (питомников, лесонасаждений) и упразднением частной собственности откликнулось дикое Полесье на революционный призыв центров».

Увесну 1917 г. па ўсходнім Палессі пракацілася хваля рабункаў маёнткаў і захопаў памешчыцкай зямлі, а таксама падпалаў лесу, якія часта рабіліся браканьерамі. Улетку сітуацыя нібыта нармалізавалася, але той жа карэспандэнт «Нового времени» меў прадчуванне, што «крестьяне лишь выжидают время, когда созреют «панские нивы и огороды», чтобы ринуться на них и пожать то, что ими не посеяно. Есть основание предполагать, что это не обойдется без дреколья и крови, так как атмосфера уже чересчур насыщена грозой»[1039].

Гэтыя вясновыя падзеі можна лічыць свайго роду «першымі ластаўкамі» чарговага сялянскага бунту, які выбухне напрыканцы 1917 – пачатку 1918 г. Полымем пажараў і забойствамі «эксплуататараў» разам з сем'ямі ён напіша крывавую старонку айчыннай гісторыі, пра якую ўсё яшчэ маўчыць беларуская гістарыяграфія.

Менск жыў іншым жыццём, але і яно было напоўнена подыхам вайны. З жніўня «Новое Варшавское утро» паведаміла, што ў горад прыбыў польскі атрад на чале з генералам Доўбар-Мусніцкім. Чакалі прыбыцця польскіх уланаў[1040]. Упэўнены, што гэтая падзея прыцягнула ўвагу Скірмунта, які пазней будзе мець непасрэднае дачыненне да лёсу корпуса Доўбар-Мусніцкага.

Рэвалюцыя і яе «нарады»

У першай палове жніўня галоўная ўвага была прыцягнута да Дзяржаўнай нарады, якая з 12 па 15 жніўня праходзіла ў Маскве. Яна была ініцыявана Часовым урадам дзеля кансалідацыі палітычных сіл пасля спробы бальшавіцкага путча.

[1036] «Новое Варшавское утро». 1917, 13 мая; 18 мая.
[1037] «Dziennik Minski». 1917, Nr 134.
[1038] «Новое Варшавское утро». 1917, 24 июня.
[1039] «Новое время». 1917, № 14831; НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр. 178, арк. 15–17.
[1040] «Новое Варшавское утро». 1917, 3 августа.

Удзельнікамі Дзяржаўнай нарады былі дэпутаты Думы ўсіх скліканняў, дэлегаты палітычных партый і арганізацый, гарадскіх дум, земстваў, Савета сялянскіх дэпутатаў, Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прадстаўнікі гандлёва-прамысловых колаў, арміі і флота, нацыянальных камітэтаў, навуковых і грамадскіх арганізацый, духавенства, Саюза землеўладальнікаў ды інш. Таксама прысутнічалі камісары і сябры Часовага ўрада.

Усяго прыехала каля 2 500 чал. Сярод іх быў і Раман Скірмунт як дэпутат I Дзяржаўнай Думы. Апрача яго ў Маскву прыехалі ад Менскага губернскага з'езда Б. Самойленка і М. Ястжэмбскі, ад гарадской думы – А. Вайнштэйн. З ліку думскіх дэпутатаў, апрача Скірмунта, былі В. Янчэўскі, М. Масоніус, А. Фацінскі, А. Папа-Афанасопула, М. Варанцоў-Вельямінаў ды інш. Э. Івашкевіч, Крамскі і Ф. Хільхэн прадстаўлялі Польскую раду Менскай зямлі[1041].

Дзяржаўная нарада праходзіла ў будынку Вялікага тэатру і выклікала вялікую цікавасць гараджан. У дзень яе адкрыцця сабралася каля 10 тыс. чал. Будынак быў аточаны ланцугом салдат і юнкероў, але натоўп паводзіў сябе спакойна. Карэспандэнт газеты «Известия» параўнаў гэтую падзею з адкрыццём Дзяржаўнай Думы, але адзначыў адсутнасць радасных твараў, а таксама стрыманую і нават крытычную сустрэчу дэлегатаў[1042].

Большасць выступоўцаў заклікала да ўмацавання дзяржаўнай улады ў цэнтры і рэгіёнах, прапанавала спыніць супрацьпраўную дзейнасць радыкальных арганізацый, асудзіць «сепаратызм», ваяваць да перамогі і абвясціць Расію рэспублікай.

Цэнтральнай фігурай Нарады быў міністр-старшыня Часовага ўрада Аляксандр Керанскі, аўтарытэт якога яшчэ быў вялікім. Падчас адкрыцця Нарады ён заявіў, што галоўнай задачай урада з'яўляецца «спасение государства, ограждение чести и достоинства народа русского и государства Российского и борьба со всем, что разрушает эту единственную силу и с теми, кто мешает и препятствует задачам Временного правительства»[1043].

Пэўную канкурэнцыю Керанскаму апошнім часам пачаў складаць генерал Лаўр Карнілаў, якога расійскія «правыя» праслаўлялі як народнага героя. У сярэдзіне ліпеня ён быў прызначаны Вярхоўным галоўнакамандуючым. Генерал здолеў за кароткі тэрмін вярнуць расійскаму войску баяздольнасць. Дзеля гэтага выкарыстоўваліся суровыя сродкі, у т. л. смяротнае пакаранне за дэзерцірства. Кансерватыўныя сілы звязвалі з генералам устанаўленне аўтарытарнага рэжыму, здольнага спыніць рэвалюцыю і анархію.

Ён выступаў у другі дзень Нарады. Рэакцыя залы на яго з'яўленне выразна прадэманстравала адсутнасць таго яднання, якога дабіваўся Часовы ўрад. Большасць

[1041] «Новое Варшавское утро». 1917, 8 августа; 9 августа.

[1042] «Известия». 1917, № 143.

[1043] *Государственное совещание*. Москва-Ленинград 1930, с. 19.

удзельнікаў Нарады пры з'яўленні Карнілава ўзнялася з месцаў і сустрэла яго апладысментамі. Левая частка партэра, дзе сядзелі прадстаўнікі Саветаў, «левых» партый і салдаты, сустрэла дакладчыка моўчкі і на сваіх месцах. На крыкі справа: «Салдатам устаць!» злева адказалі: «Халопы!» Распачалася перапалка, якую з цяжкасцю спыніў старшыня Нарады, які папрасіў павагі да «першага салдата Часовага ўрада і да самога Часовага ўрада»[1044].

У сваёй прамове Карнілаў казаў пра катастрафічную сітуацыю на фронце, на пагубнае ўздзеянне на салдат некаторых законаў Часовага ўрада і бальшавіцкай прапаганды, прывёў прыклады салдацкай анархіі і доўга пералічваў імёны забітых салдатамі афіцэраў. Ён быў пэўны, што толькі надзвычайныя меры могуць вярнуць дысцыпліну ў войска і выратаваць Расію ад паразы ў вайне[1045].

Варта адзначыць, што адным з тых, хто не ўстаў пры з'яўленні Карнілава быў Раман Скірмунт, які сядзеў сярод «правых» на прыкметным месцы побач з дзеячамі партыі кадэтаў і, да таго ж, паводле М. Касакоўскага, быў у форме харунжага[1046].

Дзякуючы Дзённіку Міхала Касакоўскага, які ў той час узначальваў польскі Цэнтральны грамадзянскі камітэт у Менску і апекаваўся бежанцамі з Каралеўства Польскага, мы можам даведацца пра пазіцыю беларускага палітыка падчас Дзяржаўнай нарады. 24 жніўня 1917 г. на старонках Дзённіка ён пераказаў размову з Раманам Скірмунтам, які распавёў яму пра Маскоўскую нараду[1047].

Скірмунт выказаў шкадаванне, што спазніўся на Нараду і не меў магчымасці выступіць перад яе ўдзельнікамі. Аднак ён здолеў выказаць свае думкі на сакрэтным сходзе думскіх дэпутатаў. Згадаўшы гэты выступ, Скірмунт прызнаўся, што ніколі так выразна не адчуваў, якая бездань дзеліць яго і іншых дэпутатаў. Ён меў 20 хвілін для выступу, але апошнія 10 хвілін ужо не чуў уласнага голасу ў тым шуме, што ўзняўся ў зале. На пытанне Касакоўскага, што ў яго прамове магло так абурыць прысутных, Скірмунт адказаў: прапанова неадкладнага падпісання міра. На здзіўленае пытанне суразмоўцы, а што ж у гэтым выпадку застанецца ад Расіі, адказаў, што нешта застанецца і нават зашмат. Ён быў перакананы, што параза Расіі пойдзе ёй на карысць, бо застанецца арганізм, здольны да адраджэння. Магчыма, краіна нарэшце развітаецца з традыцыяй карміцца сокамі іншых дзяржаўных арганізмаў. Яна атрымае шанс распачаць уласнае жыццё і выпрацаваць уласны жыццёвы лад.

[1044] ГАРФ. Ф. 3529, оп. 1, д. 2, л. 26.

[1045] Там же, л. 26–33.

[1046] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917.* Tom 2. Red. naukowa. D. Tarasiuk, M. Korzeniowski, K. Latawiec. Lublin 2006, s. 133 Рукапіс Дзённіка знаходзіцца ў Архіве Польскай Акадэміі Навук у Варшаве. Sygn. III–4. У некаторых згадках Дзённіка спасылкі будуць даваццa на арыгінальны рукапіс.

[1047] Ibidem, s. 132. Магчыма, мелася на ўвазе ўніформа Земгора.

Менавіта гэтыя развагі прымусілі Скірмунта выказацца пра неадкладны мір. І гэта адбылося падчас працы Нарады, на якой, як заўважыў аўтар Дзённіка, Керанскі з трыбуны абвясціў праклён кожнаму, хто выступаў за сепаратны мір.

Касакоўскі ў гэтым месцы палічыў патрэбным даць кароткую характарыстыку постаці палітыка Рамана Скірмунта. Гэтая характарыстыка ўвабрала ў сябе шмат. Ён прыгадаў «смелыя выступы» супраць радыкальнай аграрнай рэформы ў І Дзяржаўнай Думе, адзначыў, што былы «згоднік» ператварыўся ў ворага «згнілай Расіі», заявіў пра ягонае непрыязнае стаўленне да палякаў з Каралеўства Польскага і напрыканцы дадаў, што Скірмунт гаворыць пра сябе: «Мы, беларусы».

Таксама Касакоўскі патлумачыў, што Скірмунт не ўстаў пры з'яўленні Карнілава, бо быў праціўнікам ваеннай дыктатуры ці гэтага генерала ці казачага «вахмістра» Каледзіна, які таксама выступіў на Нарадзе з жорсткай крытыкай сітуацыі ў войску. Паводле аўтара Дзённіка, Скірмунт быў гатовы падтрымаць дыктатуру адмірала Калчака або генерала Гурко. Асабліва прыхільна ён ставіўся да апошняга і шкадаваў, што той знаходзіцца ў выгнанні як прыхільнік старога рэжыму.

Гэтая размова адбылася 24 жніўня, калі многім здавалася надзвычай верагодным усталяванне ваеннай дыктатуры. У гэтай сітуацыі Скірмунт выказваўся на карысць дыктатуры *просвещенного генерала*. Аднак з улікам ягонай палітычнай дзейнасці на працягу 1917 г. зусім не выпадае адносіць змагара за аўтаномію Беларусі да ліку прыхільнікаў дыктатуры, якая б перакрэсліла ўсе нацыянальна-культурныя і палітычныя імкненні беларусаў і палякаў. Думкі пра дыктатуру, як і пра падпісанне неадкладнага міру, а значыць фактычнай капітуляцыі Расіі, маглі грунтавацца на боязі, што разгортванне рэвалюцыі прывядзе да новай хвалі анархіі і гвалту.

Відавочна і тое, што эвалюцыя поглядаў і палітычнай пазіцыі Скірмунта з пачаткам рэвалюцыі засталася таямніцай для аўтара Дзённіка, які быў прыхільнікам больш радыкальных сацыяльных пераўтварэнняў. Ён заўважыў толькі змену нацыянальнай ідэнтычнасці свайго суразмоўцы.

Таксама Касакоўскі прыгадаў, што пасля вяртання з Масквы Скірмунт аформіў свае думкі ў артыкул і паспрабаваў яго апублікаваць у расійскім цэнтральным друку. Апублікаваць гэты тэкст згадзіўся толькі Максім Горкі на старонках «Новой жизни». Прагляд гэтай газеты дазваляе сцвярджаць, што сваё абяцанне рэдактар не выканаў.

Вяртаючыся да Дзяржаўнай нарады варта адзначыць, што большасць аналітыкаў заявілі пра яе поўную няўдачу. Нарада засведчыла раскол расійскага грамадства і паказала, што падобны палітычны форум не ў стане вырашыць аніякага пытання, тым больш, стварыць новы парламент ці іншы орган, які мог бы стаць апірышчам улады.

Што датычыць беларускай групы ўдзельнікаў Нарады, то яна ўключала Радаслава Астроўскага і Фелікса Галавача, якія прадстаўлялі Менск, Язэпа

Варонку і Вячаслава Багдановіча (абодва Петраград), Івана Краскоўскага (Кіеў) і Алеся Бурбіса (Масква)[1048]. Паводле прызнання І. Краскоўскага, «ідэя шырокага самакіравання» імі толькі згадвалася. Падчас свайго выступу на Дэмакратычнай нарадзе ў Петраградзе ў верасні 1917 г.[1049] Варонка прыгадаў, што ў Маскве прадстаўнікі нацыянальных супольнасцяў выступалі ў перапынках паміж пасяджэннямі[1050].

Дарэчы, менавіта з гэтай Нарады пачалася палітычная кар'ера Язэпа Варонкі (1891–1952). Улетку 1917 г. былы вольны слухач Пецярбургскага ўніверсітэта быў абраны ў ЦК БСГ. Ён адкрыў у сабе талент прамоўцы і хутка стаў у шэрагі кіраўнікоў беларускага руху. У Радзе БНР ён будзе адным з галоўных апанентаў Скірмунта.

Нарада сталася пачаткам імклівага падзення аўтарытэта Керанскага, які яшчэ зусім нядаўна выступаў як «ратавальнік рэвалюцыі». Сам міністр-старшыня выйшаў з Нарады цалкам перакананы, што галоўная небяспека сыходзіць ад «правых».

Сапраўды, дамінаванне «правых» у палітычным жыцці Расіі пасля падзей 3–5 ліпеня было бясспрэчным. Аднак г. зв. «карнілаўскі мяцеж» канца жніўня і ягонае паспяховае падаўленне перавярнулі ўсю палітычную сітуацыю ў краіне. Чашы палітычных вагаў імгненна памяняліся месцамі. «Правую» пацягнула ўніз, а «левая» заняла яе месца. Галоўным палітычным наступствам «карнілаўшчыны» быў поўны разгром і дэмаралізацыя «правых». А вось бальшавікі выдатна выкарысталі сітуацыю і вярнуліся на палітычную арэну ў якасці адного з яе галоўных акцёраў.

Адлучаны ад публічнай беларускай працы, Скірмунт у гэты час працягваў грамадскую дзейнасць. Як віцэ-старшыня МТСГ ён разам з прадстаўнікамі мясцовай польскай супольнасці ўвечары 24 жніўня сустракаў на менскім вакзале ксяндза каноніка О'Рурка, прызначанага адміністратарам Менскай дыяцэзіі[1051].

Працягваліся прыватныя кантакты Скірмунта з кіраўнікамі польскіх арганізацый у Менску. Пры гэтым ягонае прозвішча амаль не сустракаецца на старонках «Дзенніка Менскага», рэдактарам якога напрыканцы ліпеня 1917 г. стаў Тадэуш Яворскі. Новы рэдактар належаў да бежанцаў з Каралеўства Польскага, якія не разумелі краёвасці. Змена рэдактара ў пэўным сэнсе сімвалізавала перамены настрояў польскай супольнасці Меншчыны, якая з усё большай сімпатыяй глядзела ў бок адраджаючайся Польскай дзяржавы.

1 верасня 1917 г. Расія стала рэспублікай. Пра яе федэратыўны характар у пастанове ўрада гаворкі не было. Між тым, «перадавіцы» ўсіх вераснёвых нумароў «Вольнай Беларусі», напісаныя Я. Лёсікам, былі прысвечаны праблеме аўтаноміі

[1048] Ф. Турук, *Белорусское движение...*, с. 34.

[1049] У. Ладысеў, П. Брыгадзін, *Паміж Усходам і Захадам...*, с. 37.

[1050] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 21, арк. 12.

[1051] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia* 1917. Tom 2, s. 133.

Беларусі. Так, рэдактар газеты пераконваў чытачоў паслаць ва Устаноўчы Сход «такіх людзей, каторыя павінны ўстанавіць у Расіі федэратыўную дэмакратычную рэспубліку (*вылучана аўт.*), або, сказаць па-нашаму, каб кожын народ быў сам сабе галава і каб увесь народ быў сам сабе цар»[1052]. Напрыканцы верасня ён заклікаў урад, не чакаючы Устаноўчага сходу, «выдаць закон, што расійская рэспубліка ёсьць федэратыўная дэмакратычная рэспубліка»[1053].

Магчыма, актывізацыі прапаганды ідэі аўтаноміі паспрыялі рашэнні З'езда прадстаўнікоў народаў і абласцей Расіі, скліканага па ініцыятыве Украінскай Цэнтральнай Рады (8–15 верасня, Кіеў). У складзе беларускай дэлегацыі на г. зв. «З'ездзе народаў» было 8 чалавек, у т. л. два прадстаўнікі БСГ. Адным з іх быў Язэп Лёсік. Менавіта ён пазнаёміў чытачоў «Вольнай Беларусі» з рашэннямі з'езда. Адно з іх патрабавала абвяшчэння федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі[1054].

Апрача таго, на з'ездзе была прынята дэкларацыя па беларускім пытанні, якая выказвала занепакоенасць падзелам беларускай зямлі лініяй фронту і заклікала Часовы ўрад неадкладна абвясціць аўтаномію Беларусі ў складзе федэратыўнай дэмакратычнай Расійскай Рэспублікі. З'езд прыняў рашэнне пра стварэнне «Рады народаў» з сядзібай у Кіеве, якая павінна была тэарэтычна падрыхтаваць абвяшчэнне Расійскай Федэрацыі. Старшынём Рады абралі вядомага гісторыка і кіраўніка Украінскай Цэнтральнай Рады Міхайлу Грушэўскага[1055].

На пачатку кастрычніка Лёсік ізноў заклікаў «дамагацца, каб усе часткі Расійскай рэспублікі былі ні толькі аўтаномнымі правінцыямі, а і дзяржавамі, злучанымі паміж сабой федэрацыйным (хаўрусным) паравяслам на грунці агульнага інтарэсу, супольнае патрэбы і ўзаемнай дапамогі. І толькі тагды становішча Беларусі будзе забезпечана і адносіны яе да Расійскай Рэспублікі будуць шчырыя і пэўныя, калі гэта станецца або калі справы аўтаномнага жыцьця злучаць усе народы Расіі ў адзіны вольны дзяржаўны хаўрус – федэрацыю. А гэта будзе, бо яны вымагаюцца і жыцьцём, і гістарычным поступам народаў Эўропы. Так, гэта будзе, бо павінна быць, калі хоча таго жыцьцё, калі ў гэтым прагрэс і культура чалавецтва»[1056].

Між тым, у новай палітычнай сітуацыі галоўным станавілася пытанне пра ўзаемаадносіны паміж сацыялістычнымі партыямі. Бальшавікі патрабавалі пакончыць з кааліцыямі і сфарміраваць аднародны сацыялістычны ўрад. Аднак

[1052] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Нашы патрэбы*, «Вольная Беларусь». 1917, № 19.

[1053] Я. Л-к [Я. Лёсік]. *Расійская рэспубліка*, «Вольная Беларусь». 1917, № 21.

[1054] [Я. Лёсік] *Зьезд народаў*, «Вольная Беларусь». 1917, № 21.

[1055] О. Гуцуляк, *Съезды порабощенных народов России как этапы предпрометеизма: из истории прометеизма как борьбы народов против русского империализма*. Рэжым доступу: http://www.mesoeurasia.org/archives/15034. Дата доступу: 4. 07. 2017.

[1056] Я. Л [Я. Лёсік]. *Нашы патрэбы*, «Вольная Беларусь». 1917, № 23.

Усерасійскі цэнтральны выканаўчы камітэт, дзе дамінавалі меньшавікі і эсэры, выказаўся за вырашэнне гэтага пытання на Дэмакратычнай нарадзе.

Нарада распачала сваю працу ў Петраградзе 14 верасня і праходзіла ў бясконцых дэбатах і спрэчках. Толькі 19 верасня пытанне пра склад новага ўрада было пастаўлена на галасаванне. Аднак паразуменне не было дасягнута. Падчас дыскусіі бальшавіцкая фракцыя пакінула залу пасяджэння. Пытанне пра ўладу было вырашана перадаць г. зв. Часовай Радзе Расійскай рэспублікі або «Перадпаламенту».

Ён быў сфарміраваны 20 верасня на пасяджэнні Прэзідыума Дэмакратычнай нарады. Ягоныя паўнамоцтвы заключаліся ў санкцыянаванні дзейнасці новага ўрада і выкананні пры ім функцый дарадчай установы. Бальшавікі, якія атрымалі толькі 58 месцаў (з 313), байкатавалі дзейнасць Перадпарламента.

Ад Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый на Нарадзе выступіў Язэп Варонка. Напярэдадні на сходзе дэлегатаў Рады былі зацверджаны асноўныя пункты яго заявы. Яны ўключалі абвяшчэнне Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі з гарантыяй правоў нацыянальных меншасцяў, стварэнне Рады па нацыянальных справах, якая б выбірала са сваіх шэрагаў міністра па нацыянальных справах, роўнасць моваў у судзе, школе, кіраванні і самакіраванні, прызнанне за ўсімі народамі права склікання ўласных Устаноўчых сходаў, нацыяналізацыю войск, адмову ад кааліцыі з буржуазіяй пры фарміраванні ўрада, адмену смяротнага пакарання, заключэнне міру ды інш.[1057] Варта адзначыць, што ў гэтым пераліку першыя месцы займалі патрабаванні нацыянальнага характару. Тэрмін «аўтаномія» адсутнічаў, хоць рэалізацыя прапаноў непазбежна вяла да аўтаноміі.

Язэп Варонка выступаў 17 верасня ў паўпустой зале. Ён пачаў прамову менавіта з крытыкі стаўлення «рэвалюцыйнай дэмакратыі» да нацыянальнага пытання. Варонка параўнаў Дэмакратычную нараду з Дзяржаўнай нарадай, дзе дамінавалі цалкам іншыя палітычныя сілы, а адносіны да праблем нацыянальных меншасцяў былі такімі ж. У выступленні прысутнічалі ўсе вызначаныя дэлегацыяй асноўныя пункты, але галоўны акцэнт быў зроблены на нацыянальныя патрабаванні. Менавіта гэтая частка выступу найчасцей перапынялася рэплікамі і пытаннямі з залы. Аднойчы нават прагучала пытанне: «Товарищ, а Вам в Минске позволили бы так говорить?» Затое прапановы, што датычылі «сацыяльнага блоку», перапыняліся толькі апладысментамі[1058].

Што датычыць Перадпарламента, то новы кааліцыйны ўрад Керанскага пашырыў яго склад да 555 чал. У гэты орган улады увайшлі таксама прадстаўнікі партыі кадэтаў, гандлёва-прамысловых аб'яднанняў ды інш. У выніку пашырэння ў складзе Перадпаламента апынуўся і Скірмунт. Таксама ягонымі сябрамі былі Варонка і Жылуновіч[1059].

[1057] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 21, арк. 12.

[1058] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 21, арк. 13–14.

[1059] Ф. Турук, *Белорусское движение...*, с. 34.

Сесія Перадпарламента распачалася ў Марыінскім палацы 7 кастрычніка і працягвалася да бальшавіцкага пераваротy 25 кастрычніка. Расійскі гісторык Святлана Руднева ў дысертацыйным даследаванні (2007), прысвечаным гісторыі гэтай установы, сцвярджала, што ў працы Часовай Рады (адбылося 10 пленарных пасяджэнняў) панавала поўнае рознагалоссе пазіцый і поглядаў і не назіралася нават перспектывы збліжэння палітычных сіл[1060]. Старшынём быў абраны адзін з лідэраў уплывовай партыі эсэраў Мікалай Аўксенцьеў, але нават аўтарытэт партыі не дапамог. Падчас кароткага існавання Перадпарламента так і не сфарміравалася большасць, здольная да канструктыўнай дзейнасці.

24 кастрычніка на пасяджэнні нечакана з'явіўся Аляксандр Керанскі, які паведаміў, што ў сталіцы пачалося паўстанне бальшавікоў. Перадпарламент прыняў рашэнне пра стварэнне Камітэта грамадскага ратавання. Раніцай 25 кастрычніка Марыінскі палац быў аточаны матросамі, а бальшавіцкі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт прымусіў сяброў Перадпарламента пакінуць памяшканне[1061].

Удзел Рамана Скірмунта ў працы гэтай дзяржаўнай установы зрабіў яго нявольным сведкам прыходу да ўлады партыі Леніна-Троцкага. Але пра гэта гаворка яшчэ наперадзе...

У верасні 1917 г. актуалізавалася праблема выбараў ва Устаноўчы Сход. Пачалося стварэнне выбарчых камітэтаў. 26 верасня ўзнік Польскі выбарчы камітэт, у склад якога ўвайшоў увесь Выканкам ПРМЗ, а таксама прадстаўнікі іншых польскіх арганізацый Меншчыны, у т. л. Менскага таварыства сельскай гаспадаркі. У Камітэце яго прадстаўлялі граф Х. Грабоўскі і Р. Скірмунт. Таксама варта адзначыць прысутнасць у Польскім выбарчым камітэце М. Масоніуса і К. Дзямідэцкага-Дзямідовіча (ад ПРМЗ), Г. Друцкага-Любецкага (ад Саюза землеўласнікаў Менскай губ.)[1062]. Гэтыя дзеячы былі найбольш свядомыя сваёй мясцовай «беларускай прапіскі».

Падобна, што Раман Скірмунт быў фармальным сябрам Камітэта, бо належаў да кіраўніцтва МТСГ. Ягоная дзейнасць у складзе Польскага выбарчага камітэта нідзе не адлюстравалася, а сам ён узначаліў спіс кандыдатаў ва Устаноўчы Сход ад Саюза землеўладальнікаў Менскай губ.

Інфармацыя пра стварэнне Польскага выбарчага камітэта з'явілася на старонках «Дзенніка Мінскага» 4 кастрычніка, а ўжо праз некалькі дзён у артыкуле «Палітыка крэсаў» У. Альшынскі сцвярджаў неабходнасць карэкціроўкі палітычнага курсу польскай супольнасці ў Беларусі. Ён лічыў памылкай, што польскі рух у Беларусі разгортваецца пад «сцягам эміграцыйнай палітыкі [...] на

[1060] С. Руднева, *Предпарламент (октябрь1917 г.): опыт исторической реконструкции.* Автореферат диссертации на соискание научной степени доктора исторических наук. Москва 2007, с. 42.

[1061] Там же, с. 44.

[1062] «Dziennik Miński». 1917, Nr 79.

падмурку агульнапольскіх інтарэсаў», і заклікаў думаць пра будучыню, у якой Беларусь і Польшча могуць стаць суседзямі. У інтарэсах Польшчы ён заклікаў прадстаўнікоў мясцовай польскай супольнасці прыгадаць уласнае паходжанне і адчуць сябе «польскімі грамадзянамі ў Беларусі».

Як бачна, «грамадзяне краю» трансфармаваліся ў «польскіх грамадзян». Але ў тагачаснай сітуацыі гэта можна трактаваць як пэўную праяву краёвай ідэі. Аўтар заклікаў не адмяжоўвацца, а актыўна супрацоўнічаць з беларускім рухам: «Апрача пабудовы незалежнай Польшчы і ў яе інтарэсах мы павінны будаваць незалежную Беларусь, а гэта можна рабіць толькі разам з беларусамі. Сувязі павінны захоўвацца як паміж «нізамі», так паміж «вярхамі», а супрацоўніцтва павінна ахапіць усе сферы грамадскага і культурнага жыцця»[1063].

Падобна, што заклік «краёўца» Альшынскага быў рэакцыяй на спад цікавасці палякаў Меншчыны да беларускага руху і выразнае «ахалоджанне» польска-беларускіх стасункаў. Польскі даследчык Тадэуш Зянкевіч наогул лічыў, што пэўныя сімпатыі да беларускага руху сярод эліты польскай грамадскасці зніклі ўжо ўвосень 1917 г.[1064] Гэты тэзіс падаецца занадта катэгарычным, хоць на сітуацыю не магла не паўплываць далейшая сацыяльная радыкалізацыя беларускага руху, якая прывяла да ліквідацыі БНК і адыходу ад публічнай дзейнасці Скірмунта. Зрэшты, пасля «карнілаўскага мяцяжа» ў Расіі наогул ўзмацніліся пазіцыі найбольш радыкальных палітычных сіл. А эліта мясцовай польскай супольнасці з большай зацікаўленасцю пачала сачыць за адраджэннем Польскай дзяржавы. Дарэчы, у рубрыцы «Дзенніка Мінскага» пад назвай «Весці з краю» змяшчалася інфармацыя выключна з Каралеўства Польскага.

Іншай праблемай, якая магла адмоўна паўплываць на сімпатыі да беларускага руху, сталася праблемы мовы дадатковага набажэнства ў касцёле. Нагадаю, што доўгі час менавіта польская мова ў касцёле і польскае землеўладанне лічыліся асновай польскіх пазіцый у «забраным краі».

«Дзеннік Менскі» ў шэрагу артыкулаў звярнуў увагу на спробы ўвядзення беларускай мовы ў касцёл[1065]. У выніку ксёндз Гадлеўскі быў вымушаны тлумачыцца на старонках газеты. Ён, між іншым, прызнаў, што гэтая ініцыятыва належыць не яму, а магілёўскаму арцыбіскупу Эдварду Ропу. Гадлеўскі таксама сцвярджаў прыхільнае стаўленне да беларускай мовы з боку мясцовага каталіцкага насельніцтва[1066]. Паколькі крытыка працягвалася, Гадлеўскі больш грунтоўна спыніўся на праблеме і адзначыў нараджэнне «новых дзяржаўных арганізацый, такіх як Украіна і наша супольная Айчына Беларусь, што сёння змагаецца за свае

[1063] Wł. Olszyński, *Polityka kresow*, «Dziennik Miński». 1917, Nr 73.

[1064] T. Zienkiewicz, *Polskie zycie literackie w Mińsku w XIX i na początku XX w. (do roku 1921)*, s. 49.

[1065] Напр., гл. «Dziennik Miński». 1917, Nr 69.

[1066] «Dziennik Miński». 1917, Nr 73.

правы. З імі трэба лічыцца і для агульнага дабра супрацоўнічаць». Напрыканцы ён заявіў, што беларускія ксяндзы заўсёды здолеюць ушанаваць у польскім сэрцы пачуццё любові да роднай мовы, аднак яны чакаюць і з польскага боку пашаны да іх уласнай беларускай мовы[1067].

Важным фактарам польска-беларускіх стасункаў стала арганізацыя і дыслакацыя на Меншчыне Польскага корпуса. Яго гісторыя пачалася на з'ездзе вайскоўцаў-палякаў, які адбыўся ў Петраградзе ў чэрвені 1917 г. З'езд выказаўся за арганізацыю польскай вайсковай часткі. Дэлегаты абралі Галоўны Польскі вайсковы камітэт («Начполь») на чале з харунжым Уладзіславам Рачкевічам. Начполь дабіўся згоды Вярхоўнага Галоўнакамандуючага на фарміраванне трох польскіх карпусоў.

І Польскі корпус фарміраваўся на Заходнім фронце пад камандаваннем генерала Юзафа Доўбар-Мусніцкага ў складзе трох пяхотных дывізій, двух артылерыйскіх брыгад і батарэі цяжкай артылерыі. Начполь, які прэтэндаваў на палітычнае кіраўніцтва Польскім корпусам, разгарнуў актыўную дзейнасць па яго фарміраванні. Заклікі і звароты запісвацца ў корпус друкаваліся на старонках «Дзенніка Менскага» і органа Начполя газеты «Жолнеж польскі». Было створана Таварыства сяброў польскага салдата, на чале якога стаў удзельнік чэрвеньскага з'езда вайскоўцаў-палякаў і кіраўнік Цэнтральнага грамадзянскага камітэта ў Менску Міхал Касакоўскі.

Увосень у корпусе налічвалася ўжо каля 25 тыс. чал., з якіх каля 3 тыс. былі афіцэрамі. Прыток афіцэрскіх кадраў быў абумоўлены тым, што многія афіцэры шукалі ў Корпусе паратунку ад анархіі і дэзарганізацыі войска. Дарэчы, у ім адсутнічалі салдацкія камітэты, а іх функцыі выконвалі камісары Начполя, які пастаянна падкрэсліваў палітычны нейтралітэт Польскага корпуса. Штаб корпуса знаходзіўся ў Менску, а падраздзяленні былі раскіданы па тэрыторыі Менскай, Віцебскай і Магілёўскай губ. Генерал прыехаў у Менск напрыканцы ліпеня 1917 г.[1068] Па ініцыятыве М. Касакоўскага адбылася яго сустрэча з лідэрамі мясцовай польскай супольнасці[1069].

Польскі корпус упершыню паказаў сябе 5 лістапада 1917 г. падчас урачыстасцяў у гонар 100-годдзя смерці Тадэвуша Касцюшкі. Кульмінацыяй свята стаў вайсковы парад на Кафедральнай плошчы з удзелам польскіх уланаў, які выклікаў патрыятычны ўздым сярод мясцовай польскай грамадскасці.

Восень была насычана важнымі падзеямі і ў беларускім руху. Я. Варонка пазней адзначаў хуткую актывізацыю «беларускай працы» пасля Дзяржаўнай і Дэмакратычнай нарад, дзе прадстаўнікі Беларусі здолелі давесці свае патрабаванні да

[1067] W. Godlewski, *Język białoruski w kosciole*, «Dziennik Miński». 1917, Nr 97.
[1068] «Новое Варшавское утро». 1917, 3 августа.
[1069] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia* 1917. Tom 2, s. 134

расійскай палітычнай эліты[1070]. Важнай з'явай станавілася стварэнне арганізацый сярод беларусаў-вайскоўцаў армій Паўночнага, Заходняга, Румынскага франтоў і Балтыйскага флота, якія адгукаліся на лозунгі нацыянальнага Адраджэння і аўтаноміі Беларусі.

Падчас гэтай актывізацыі імкненне часткі беларускай эліты да нацыянальнай кансалідацыі чарговы раз сутыкнулася з супрацівам найбольш левай групы ў БСГ. Ізноў нагодай для дыскусіі і пэўнага размежавання стала постаць Рамана Скірмунта, які знаходзіўся ў Петраградзе і працаваў як сябра Перадпарламента. Падобна, што важнасць ягонага вяртання ў беларускі рух, як і неабходнасць самай шырокай кансалідацыі наяўных беларускіх сіл усё больш выразна ўсведамлялася ў Менску. Перадавіцы Язэпа Лёсіка на старонках «Вольнай Беларусі» ў кастрычніку 1917 г. падкрэслівалі актуальнасць якраз агульнанацыянальных задач, сярод якіх вылучалася аўтаномія Беларусі. Сацыяльнае нібыта адыходзіла на другі план.

Дарэчы, у дзень адкрыцця другой сесіі Цэнтральнай Рады «Вольная Беларусь» змясціла артыкул «Расійскае безладзе», у якім ішла гаворка пра ператварэнне рэвалюцыі ў панаванне анархіі і гвалту: «Вырваўшыся за дапамогай падняволь-ных суседзяў с кайданаў раманаўскага самадзяржавія гэта цёмная маскоўская маса захапіла ў свае рукі ўладу, уселася гаспадарыць на царскае мейсца і бушуе як істы дзікар, апьянелы воляй і нястрымаласьцю. Сама інтэлігенцыя гэтай масы перанята ўсе звычкі і забабоны старога рэжыму і праз свае камітэты, рады і арганізацыі робіць арэшты, карае сьмерцю, садзіць у турмы, зачыняе газэты, накладае цэнзуру, рэквізуе друкарні [...] Велікаруская нацыя, ня гледзячы на сваё нацыянальнае панаванне і дзякуючы гэтаму панаванню, ня мае ні толькі нацыянальнага, але нават племянного, сваяцкага пачуцьця. Яна, бачыш, вышэй за гэта і пустэлю свайго нацыянальнага пачуцьця запаўняе пустым зыкам касмапалітызму»[1071].

Менавіта так Язэп Лёсік ацэньваў тую «класавую барацьбу», якую працягвалі распальваць бальшавікі і левыя эсэры: «Наша заданне, – пісаў ён, – абараніць наш край ад загубы, захаваць яго ад тае заразы, што насуваецца с цэнтру».

У наступным нумары «Вольнай Беларусі» яе рэдактар выразна засведчыў, што ставіць агульнанацыянальныя задачы вышэй за сацыяльныя пераўтварэнні. Ён заклікаў «памятаць нізабытныя словы Бэбэля, каторы сказаў, што ён перш за ўсё сын свае бацькаўшчыны, а потым – сацыяліста, і памятаючы гэта, несьці сьвятло нацыянальнай сьвядомасьці ў сёлы, вёскі, мястэчкі, пад чорную страху селяніна, у цёмны куток пралетарыя. [...] мы павінны ўсьведаміць іх, што наша збавеньне ў нацыянальным адраджэньні, у адбудаваньні жыцьця свайго на грунці ўласнага, нацыянальнага істненьня. Ніхто нашых патрэб не разважыць і не мае права разважаць, апрач нас самых. Нашым Устаноўчым Соймам павінна быць наша Беларуская Краёвая Рада. [...] Там, на сваім Устаноўчым Соймі вольна загамоніць

[1070] Я. Варонко, *Беларускі рух ад 1917 да 1920 году*. Коўна 1920, с. 5.

[1071] Я. Л-к. [Я. Лёсік], *Расійскае безладзе*, «Вольная Беларусь». 1917, № 24.

Беларусь на цэлы белы сьвет, разважыць свае справы, апрацуе плян будаўніцтва, уложэ статут свайго нізалежнага нацыянальнага істненьня і вынясе яго дзеля ўзаемнае ўхвалы на Устаноўчы Сойм усіх народаў дзяржавы Расійскай»[1072].

Пагроза цэнтралізму трактавалася як адна з галоўных на шляху беларускага Адраджэння, і нават на Устаноўчы Сход ужо не ўскладаліся вялікія надзеі: «Хіба вы не бачыце, што ў нашай хаці пануе маскаль-цэнтраліст, каторы, абвязаўшы свой твар чырвонаю хусткай, пройдзе ад нас і да Устаноўчага Сойму? І працаваць там ён будзе ні для нас, ні на карысьць тае нацыі, коштам якой гадуецца. […] Наша будучына ў нашых руках, і наш Устаноўчы Сойм павінен быць на нашай слаўнай беларускай зямлі. Продкі нашы заўсюды цураліся Масквы і змагаліся з ёю і наказалі нам жыць сваім уласным беларускім жыцьцём, справуючыся праз свой беларускі Краёвы Парлямэнт»[1073].

«Вольная Беларусь» галоўнай мэтай абвяшчала дасягненне «палітычна-тэрытарыяльнай аўтаноміі». Падобнае разуменне сітуацыі стварала падмурак для кансалідацыі розных палітычных сіл беларускага руху, у т. л. для вяртання ў ягонае рэчышча Рамана Скірмунта і ягоных аднадумцаў. Але з перспектывы «беларускага Петраграда» сітуацыя ацэньвалася інакш...

Як ужо адзначалася, паступова пачаў паўставаць канфлікт паміж Язэпам Лёсікам і рэдакцыяй «Вольнай Беларусі», з аднаго боку, і менавіта петраградскімі арганізацыямі БСГ, прадстаўленымі ў Цэнтральнай Радзе, – з другога. Сутыкненне розных пазіцый адбылося падчас другой сесіі Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый, якая распачалася 15 кастрычніка ў Менску. Жылуновіч ва ўспамінах (1923) наўпрост заявіў пра раскол БСГ. А вось інфармацыя «Вольнай Беларусі» аўтарства Язэпа Лёсіка пра гэтую сесію, а таксама пра III з'езд БСГ (14–25 кастрычніка) і з'езд вайскоўцаў-беларусаў Заходняга фронту (18–24 кастрычніка) была напоўнена аптымізмам і верай у палітычную перамогу беларускага Адраджэння. Відавочна, што аўтар гэтай інфармацыі настойліва імкнуўся падкрэсліць тыя моманты, якія сведчылі пра разуменне ўдзельнікамі форума неабходнасці яднання палітычных сіл.

Другая сесія Цэнтральнай Рады адбывалася ў будынку былога «губернатарскага дома». Залу ўпрыгожваў белы беларускі штандар з надпісам «Ніхай жыве вольная Беларусь». Праца распачалася прамоваю сябра Выканкама Аркадзя Смоліча, які казаў пра важнасць агульнабеларускага паяднання. У Прэзідыум былі абраны Я. Дыла (старшыня), а таксама А. Уласаў, В. Адамовіч, Б. Тарашкевіч і А. Данілевіч. Наогул, на сесію прыехалі 36 сяброў Цэнтральнай Рады, якія, паводле інфармацыі Мандатнай камісіі, прадстаўлялі больш за 27 тыс. чал. Варта адзначыць, што на час гэтай сесіі з'езд БСГ перапыніў сваю працу.

Са справаздачай аб дзейнасці Выканкама выступіў Смоліч, які прызнаў, што з дзевяці яго сяброў рэальна працавалі толькі два. Істотнай праблемай была ад-

---

[1072] Я. Л-к. [Я. Лёсік]. *Устаноўчы Сойм*, «Вольная Беларусь». 1917, № 25.

[1073] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Савет Расійскай Рэспублікі*, «Вольная Беларусь». 1917, № 26.

сутнасць фінасавання, бо мясцовыя арганізацыі не пералічвалі сродкі. Фактычна ўся дзейнасць звялася да дэлегавання сваіх прадстаўнікоў на Дзяржаўную і Дэмакратычную нарады, а таксама на з'езд бежанцаў (Масква) і з'езд народаў (Кіеў). Смоліч прызнаў, што Цэнтральная Рада не здолела заваяваць даверу шырокіх мас і стаць аўтарытэтнай краёвай арганізацыяй.

Лёсік адзначыў выступ Язэпа Дылы ў першы дзень. Старшыня Прэзідыума казаў пра беларускую інтэлігенцыю, якая звыклася працаваць на «чужынцаў», і часцяком «перакіньчыкі-беларусы» горш ставіліся да свайго народу і ягонай культуры, чым рускія ці палякі. Дыла адзначыў пагрозу з боку «чырвоных», якія, на яго думку, у нацыянальным пытанні вярнуліся да палітыкі самаўладдзя. Ён адкінуў прапановы пра перанос цэнтра беларускай дзейнасці ў Магілёў або Віцебск і заявіў, што такімі цэнтрамі павінны заставацца Менск і Вільня[1074].

А. Прушынскі ў другі дзень сесіі зазначыў важнасць паяднання беларускай інтэлігенцыі і сялянства. Ён згадаў як падчас з'езда бежанцаў-беларусаў у Маскве (24–26 верасня 1917 г.) даводзілася тлумачыць яго ўдзельнікам асноўныя задачы беларускага руху і выказаў упэўненасць, што нацыянальная ідэя здольная з'яднаць самыя розныя сілы беларущчыны. Прыгадаўшы беларускі рух сярод вайскоўцаў, ён заявіў пра неабходнасць стварэння «моцнай Рады, каторая б бараніла і кіравала ўсёй справаю. Нам патрэбны асобны сэкрэтарыят, каб ён назіраў за ўсім»[1075].

Даклады з «мейсцаў», з якімі выступілі Язэп Дыла (Масква), Зміцер Жылуновіч (Петраград), Латышэнка (ад бежанцаў), Васіль Муха (Балтыйскі флот), Вінцэнт Гадлеўскі, Радаслаў Астроўскі ды інш. прэзентавалі шырокую панараму беларускага руху, якая таксама пераконвала ў неабходнасці моцнага каардынацыйнага цэнтра. Варонка як прадстаўнік «агульнапалітычнай камісіі» сесіі прапанаваў стварэнне Вялікай Беларускай Рады[1076].

На трэці дзень працы, 17 кастрычніка на агульным пасяджэнні ўдзельнікі сесіі прынялі рашэнне пра стварэнне Вялікай Беларускай Рады (ВБР) як новага кіраўнічага цэнтра беларускага руху. Рада павінна была абвясціць сябе «правамоцнаю і бараніць увесь беларускі народ». Сесія прызнала неабходным «кінуць палітыку карэктнасьці і голасна абвесьціць, хто гаспадар на Беларусі», і працаваць дзеля яе аўтаноміі[1077]. Прушынскі назваў ВБР «таранам для беларускай справы», які праб'е «мур нірухомасьці».

Вялікую ролю ў стварэнні новай арганізацыі адыграў рэдактар «Вольнай Беларусі» Язэп Лёсік. Удзельнікі сесіі палічылі патрэбным прывітаць яго апладысментамі. У адказ той заявіў, што «беларускі рух набярэ хутка вялікай сілы і праз

[1074] *II-я сэсія Цэнтральнае Рады беларускіх арганізацый*, «Вольная Беларусь». 1917, № 26.
[1075] Тамсама, № 27.
[1076] Тамсама, № 28.
[1077] Тамсама.

Раду пойдзе да Вялікай Краёвай Беларускае Рады, каторая абвесьціць: уся зямля працоўным людзям, а ўся ўласьць на Беларусі беларускаму народу!».

З 18 па 23 кастрычніка сесія прыпыніла сваю дзейнасць. Многія яе прадстаўнікі ўдзельнічалі ў з'ездзе вайскоўцаў-беларусаў Заходняга фронту, на якім таксама прысутнічалі дэлегаты 12 арміі Паўночнага фронту, а таксама Балтыйскага флота і Румынскага фронту. З'езд прызнаў неабходным стварэнне беларускага войска і сфарміраваў Цэнтральную Беларускую Вайсковую Раду (ЦБВР) на чале з Сымонам Рак-Міхайлоўскім[1078]. Яе галоўнай задачай было стварэнне беларускага войска.

24 кастрычніка другая сесія аднавіла сваю працу. У выбарах Выканкама ВБР прынялі ўдзел сябры Выканкама ЦБВР. У выніку ў кіраўніцтва беларускага руху былі абраны В. Адамовіч (старшыня Выканкама), А. Прушынскі, А. Смоліч, С. Рак-Міхайлоўскі, І. Дварчанін, П. Аляксюк, А. Лявіцкі ды інш.[1079] Прысутнасць Паўла Алексюка сведчыць пра адмову БСГ ад ранейшага курса на размежаванне з г. зв. «правымі» і спробу пэўнай кансалідацыі беларускага руху. Апошняе стварала магчымасць для публічнага вяртання ў ягоныя шэрагі таксама Рамана Скірмунта. Камісарамі Вялікай Беларускай Рады былі абраны Я. Дыла, Б. Сталыгва, Б. Тарашкевіч, З. Жылуновіч, Я. Варонка, П. Бадунова ды інш.[1080] Выканкам разам з камісарамі склаў Малую Раду ВБР.

Выканкам разглядаўся як прататып дзяржаўнай улады аўтаномнай Беларусі, таму ён атрымаў права каптацыі ў свае шэрагі прадстаўнікоў іншых беларускіх арганізацый, а таксама валасных і павятовых земстваў і гарадскіх дум. Стварэнне ВБР можна ацаніць як безумоўны поспех беларускага руху, які зноў спрабаваў пайсці шляхам нацыянальнай кансалідацыі.

Ці з'яўляўся Раман Скірмунт сябрам ВБР? Польскія даследчыкі Ч. Бжоза і К. Стэпан станоўча адказалі на гэтае пытанне на старонках Польскага слоўніка біяграфічнага. Яны нават сцвердзілі, што вядомы палітык у якасці сябра ВБР удзельнічаў у *Беларускім з'ездзе павятовых саветаў Менскай губ.*, які адбыўся ў лістападзе 1917 г. у Менску[1081]. Праўда, згадкі пра гэты з'езд адсутнічаюць у беларускай гістарыяграфіі. Магчыма, даследчыкі памыліліся з назвай беларускага форума.

Сярод асабістых дакументаў Аркадзя Смоліча, якія захаваліся ў БДАЛіМ, у чарнавіках матэрыялаў Выканаўчага камітэта ЦБВР захаваліся два спісы, у адным з якіх побач з Уласавым, Гадлеўскім, Кульчыцкім, Алексюком, Русецкім, Зямкевічам

[1078] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 140.

[1079] Тамсама.

[1080] *II-я сэсія Цэнтральнае Рады беларускіх арганізацый*, «Вольная Беларусь». 1917, № 28.

[1081] Cz. Brzoza, K. Stepan, *Skirmunt Roman (1868–1939)* (у:) *Polski Słownik Biograficzny*. Tom XXXVIII/2. Zeszyt 158, s. 186.

і Кандратовічам фігуравала прозвішча Скірмунта[1082]. Магчыма, менавіта гэта стала падставай для меркавання польскіх даследчыкаў. Але варта адзначыць, што ў згаданым спісе пералічаныя сябры Менскага беларускага прадстаўніцтва, якое аформілася значна пазней. Пра адсутнасць Скірмунта ў Вялікай Беларускай Радзе сведчаць таксама ўспаміны Яўсея Канчара пра тэлефонную размову напярэдадні Усебеларускага з'езда з прадстаўніком Беларускага Абласнога камітэта А. Кусэ-Цюзам, у якой апошні ахарактарызаваў склад Выканкама ВБР. Паводле ягонай ацэнкі, там дамінавалі прадстаўнікі БСГ, а найбольш «правым» быў сам А. Кусэ-Цюз[1083].

Цікава, што ў гэты ж час імкненне да нацыянальнага паяднання назіралася таксама сярод беларускага руху на акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі і Літвы. Дарэчы, у дзень стварэння ВБР «Гоман» апублікаваў артыкул Янкі Станкевіча пра лёс беларускіх бежанцаў у Расіі, у якім ён ахарактарызаваў беларускі рух у Менску. Цікава, што напрыканцы кастрычніка 1917 г. аўтар артыкула сярод найбольш актыўных працаўнікоў на беларускай ніве называў Р. Скірмунта, П. Алексюка, княгіню М. Радзівіл, А. Лявіцкага, А. Уласава, В. Гадлеўскага ды інш.[1084] Цяжка пазбыцца ўражання, што артыкул быў напісаны яшчэ ўвесну 1917 г.! Але цалкам магчыма, што згадка асобаў, якія былі непрымальнымі для менскіх сацыялістаў, таксама засведчыла пэўныя перамены ў настроях дзеячаў віленскага беларускага цэнтра.

Створаная Лёсікам на старонках «Вольнай Беларусі» карціна беларускага паяднання істотна разыходзілася з пазнейшымі ўспамінамі Жылуновіча пра другую сесію Цэнтральнай Рады. У 1923 г. ён імкнуўся давесці чытачам часопіса «Полымя», што галоўным вынікам сесіі стала канчатковае размежаванне правых і левых у БСГ і кіраўніцтве беларускага руху.

Жылуновіч ва ўспамінах заявіў пра «паправенне былых народніцкіх элементаў» БСГ. Ён сцвярджаў, што нагодай для расколу стала абранне беларускіх прадстаўнікоў у Раду народаў. З выразным абурэннем ён працытаваў па памяці прапанову дэлегата З'езда народаў «Л.» (Язэпа Лёсіка? Антона Лявіцкага?), які раіў накіраваць у Раду народаў Рамана Скірмунта і заявіў, што «мы мусім паслаць ад нас моцных вучоных людзей. На зьездзе іншыя народы былі прадстаўлены дужа моцнымі людзьмі. Мы не павінны ганяцца за партыйнасьцю, а мусім глядзець з погляду карысьці агульнанацыянальнай справе»[1085].

На здзіўленне лідэра БСГ значная частка ўдзельнікаў сесіі падтрымала гэтую

[1082] БДАМЛіМ. Ф. 3, воп. 1, спр. 277, арк. 22.

[1083] Е. С. Канчер, *Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов* (публікацыя В. Скалабана), «Неман». 1993, № 1, с. 149.

[1084] Я. Станкевіч, *Беларускія ўцекачы ў Расеі*, «Гоман». 1917, № 82.

[1085] Ж. З. [З. Жылуновіч], *Уступамі да Акцябра (Матэр'ялы да гісторыі Савецкай Беларусі)*, с. 90.

прапанову. «Левыя» грамадоўцы правялі адмысловую нараду, каб з'яднаць галасы БСГ і не дапусціць абрання Скірмунта «і нікога з непажаданых», але яна мела толькі частковы эфект. Як заўважыў Жылуновіч, «у некаторых сяброў Грамады правага ўхілу адпала ўся рэволюцыйнасьць. Агульнасьць справы патуманіла іх ушчэнт. Тронутыя да «глыбіні душы» пачуцьцём сантыментальнага патрыятызму, яны заліліся сьлёзамі ўміленьня (Бадунова) і патапілі сваю клясавую абасобнасьць у частых і гучных овацыях розным дзеячом. Сваім-жа левым сябрам, каторыя дапомнілі аб заданьнях соцыялістых, намякнулі пра «шкодную абмылковасць» падагравацъ непатрэбную к часу спрэчнасьць інтарэсаў [...] Болей таго, былі зроблены нават і лічныя выпады супроціў аднаго з прадстаўнікоў Пецербургскай арганізацыі Бел. С. Грамады»[1086]. У выніку, як сцвярджаў З. Жылуновіч, левыя дэманстрацыйна пакінулі пасяджэнне, правялі ўласную нараду і фактычна замацавалі раскол БСГ на правых (Менская арганізацыя) і левых (Петраградская і Бабруйская арганізацыі).

Падобна, што канфлікт правых і левых сапраўды меў месца на сесіі. Так, нават у ідылічнай карцінцы, намаляванай Лёсікам на старонках «Вольнай Беларусі», прыгадваюцца шматлікія галасаванні па пытанні стварэння ВБР, на першым з якіх ідэю новай арганізацыі падтрымалі толькі «ў прынцыпі». Таксама звяртае на сябе ўвагу працягласць апошняга пасяджэння, на якім адбываліся выбары Выканкама ВБР і яе камісараў. Праца распачалася а 10-й гадзіне раніцы, а скончылася а 4-й гадзіне ночы.

Размежаванне паміж найбольш радыкальнымі левымі (Нарвенская арганізацыя БСГ на чале з А. Чарвяковым і Бабруйская арганізацыя на чале з Ф. Шантырам) і большасцю ўдзельнікаў сесіі было выразным, але раскол яшчэ не адбыўся. Аднак пасля сесіі і III з'езду БСГ Нарвенская арганізацыя выйшла з партыі і стварыла Беларускую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю, якая падтрымлівала бальшавікоў[1087].

Пра адсутнасць згоды сярод сяброў Малой Рады ВБР таксама сведчыць артыкул Лёсіка «Вялікая Беларуская Рада», апублікаваны на старонках «Вольнай Беларусі» 30 кастрычніка. Рэдактар лічыў надзвычай важным стварэнне ВБР у той момант, «калі анархія і гаспадарскае безладзе разьліліся руйнуючай навальніцай па ўсяму цэнтру расійшчыны». Ён адзначаў, што Рада была створана на прынцыпах поўнага дэмакратызму, перадачы зямлі працоўнаму народу і абароны інтарэсаў рабочых. Менавіта гэта дазваляе ёй лічыць сябе «адпаведальным кіраўніком і прэдстаўніком ўсяго беларускага руху і беларускае справы». Аднак, на думку Лёсіка, у Выканкам ВБР трапілі таксама выпадковыя людзі, «не разумеючыя вялікіх заданняў нацыянальнага адраджэння і зацікаўленыя больш дэмагогічным уплывам або ні здольныя да рэальнай палітычнай і культурнай працы». Аўтар

[1086] Тамсама, с. 91.

[1087] Ф. Турук, *Белорусское движение*..., с. 34.

заклікаў гэтыя «выпадковыя элементы» адысці, інакш «час выцісьне іх сам, як здаровы, ачуньваючы арганізм выціскае з сябе ўсё шкадлівае і нідарэчнае»[1088]. Магчыма, Лёсік меў на ўвазе тых палітычных кіраўнікоў БСГ, якія ўсё яшчэ арыентаваліся на агульнарасійскую «дэмакратыю» і не лічылі першачарговай задачай кансалідацыю ўсіх беларускіх нацыянальных сіл.

Ужо на наступны дзень гэты артыкул абмяркоўваўся на пасяджэнні Выканкама ВБР. «Вольная Беларусь» змясціла інфармацыю пра гэтае пасяджэнне за подпісам *Смутак*. Аўтар напачатку адзначыў, што толькі тры – чатыры сябры Выканкама размаўляюць па-беларуску, а некаторыя з іх нават не разумеюць важнасці беларускага друкаванага слова. Найбольш увагі ён удзяліў абмеркаванню згаданага артыкула, які выклікаў рэзкія нападкі з боку асобных сяброў Выканкама. У прыватнасці, А. Смоліч паставіў пытанне рубам: «Мы або газета?» Дыскусію перапыніў Б. Тарашкевіч, які заявіў, што ніхто не мае права судзіць газету за яе погляды і настаяў на тым, каб гэтае пытанне было знята з парадку дня[1089].

Перамога бальшавікоў

Захоп бальшавікамі ўлады ў сталіцы прайшоў непрыкметна як для Менска, так і для ўсёй Расіі. Петраградская газета «Крыніца» паведаміла пра перамогу бальшавікоў толькі ў лістападзе (№ 3): «У Петраградзе бальшавікі, ня хочучы слухаць Тымчасовага Ураду, падгаварылі салдатаў і рабочых, каб яго скінуць, і скінулі. Адбылося гэта 24–25 кастрычніка. На месца Тымчасовага Ураду паставілі «Раду народных камісараў», наперадзе каторых стаіць Ульянаў-Ленін. За імі не пайшлі другія партыі. Керанскі ўцёк і ўзяўшы войска ішоў проціў іх, дзеля гэтага паўстала вялікае замяшанне, каторае невядома чым скончыцца». Таксама толькі ў лістападзе на падзеі, які адбыліся ў ноч на 25 кастрычніка ў Петраградзе, звярнула ўвагу «Вольная Беларусь».

Бальшавікі выкарысталі сітуацыю двоеўладдзя, якая склалася яшчэ ў лютым 1917 г., і фармальна перадалі ўладу Саветам. Да таго ж, як слушна заўважыў Рычард Пайпс, яны здолелі схаваць сацыялістычную накіраванасць Кастрычніцкага пераварота. За першы тыдзень знаходжання пры ўладзе бальшавікі не выпусцілі аніводнага дакумента са словам «сацыялізм»[1090]. Іх перамозе паспрыяла падзенне аўтарытэту Часовага ўрада і самога Керанскага. Большасць насельніцтва спадзявалася на Устаноўчы Сход, выбары ў які павінны былі прайсці ў сярэдзіне лістапада.

Сябра Перадпарламента Раман Скірмунт у тыя дні якраз знаходзіўся ў Петраградзе і стаўся сведкам пераварота. Няма сумневу, што ацэнка палітыкам

[1088] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Вялікая Беларуская Рада*, «Вольная Беларусь». 1917, № 27.

[1089] Смутак, *У Выканаўчым Камітэце*, «Вольная Беларусь». 1917, № 28.

[1090] Р. Пайпс, *Русская революция. Часть вторая*. Москва 1994, с. 177.

трыумфу партыі Леніна-Троцкага магла быць толькі негатыўнай. Менавіта ў дзейнасці бальшавікоў найбольш выразна праяўлялася тэндэнцыя распальвання класавай вайны з непазбежнай анархіяй і гвалтам, якія пагражалі самім асновам культуры і цывілізацыі.

Пэўную інфармацыю адносна пазіцыі і настрою Скірмунта даносяць успаміны Ежы Асмалоўскага. На пачатку кастрычніка 1917 г. ён быў камандзіраваны ў штаб Петраградскай вайсковай акругі. Асмалоўскі вітаў рэвалюцыйныя падзеі вясны 1917 г. і падтрымліваў дэмакратычныя перамены ў войску. У Петраградзе ён пасяліўся ў гатэлі «Еўрапейскі» і сустрэў там Рамана Скірмунта.

22 кастрычніка яны разам вячэралі ў рэстаране. Паводле ўспамінаў Асмалоўскага, Скірмунт распавядаў пра працу Перадпарламента, крытычна ацэньваў А. Керанскага і з павагай выказваўся пра дзейнасць былога старшыні IV Дзяржаўнай Думы М. Радзянкі, характарызаваў кадэтаў як «дактрынёраў» і выказваў занепакоенасць становішчам Краю, пад якім разумеў Менскую губ. Асмалоўскі зрабіў выснову, што суразмоўца пастаянна атрымліваў інфармацыю пра сітуацыю ў Менску. Скірмунт быў пэўны, што выбары ва Устаноўчы Сход забяспечаць перамогу левым эсэрам альбо бальшавікам.

Асмалоўскі таксама адзначыў пэўныя спадзевы свайго суразмоўцы на тое, што яшчэ ёсць час спыніць небяспеку бальшавіцкага радыкалізму, што ўрад мае жаданне і магчымасці вярнуць лад і спакой у краіне, а дысцыпліну – у войску[1091].

25 кастрычніка Асмалоўскі абедаў з Раманам Скірмунтам у тым самым рэстаране. У гэты час перамога бальшавіцкага паўстання ўжо была відавочнай. Міністр-старшыня і Вярхоўны галоўнакамандуючы Керанскі выехаў на фронт. Часовы ўрад кантраляваў толькі Зімовы палац, аточаны атрадамі Чырвонай гвардыі.

Раман Скірмунт распавёў пра роспуск Перадпарламента войскамі бальшавікоў і пра дэпутацкую боязь арыштаў, якіх не было Ён пазітыўна ацаніў выезд Керанскага, сцвярджаў, што на II з'ездзе Саветаў бальшавікі будуць у меншасці, і спадзяваўся, што ўмяшальніцтва франтавых вайсковых частак за пару гадзін цалкам зменіць сітуацыю. Пры гэтым лічыў неабходным, каб урад Аляксандра Канавалава, які замяніў Керанскага, пратрымаўся да прыходу войскаў[1092]. Літаральна праз некалькі гадзін спадзевы Скірмунта зніклі разам з Часовым урадам, які быў арыштаваны ў Зімовым палацы.

Баючыся гвалту «рэвалюцыйных» салдат і матросаў, якія на вуліцах Петраграда нападалі на добра апранутых жыхароў сталіцы, Скірмунт разам з іншым былым думскім дэпутатам Яўстахам Любаньскім ноч на 27 кастрычніка правялі ў гатэльных апартаментах Асмалоўскага. Той меў тры пакоі, дзе пасяліліся таксама ягоныя ардынарцы. Асмалоўскі сам прапанаваў Скірмунту і Любаньскаму правесці

[1091] BN. Dział mikroform, akc. 6797 J. Osmołowski, *Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 1 (1914–1917)*, k. 121.

[1092] Ibidem, k. 132.

ноч у сябе, гарантуючы абарону з боку сваіх салдат, якія былі настроены супраць бальшавікоў. Прапанова з удзячнасцю была прынята. Пазней Асмалоўскі прыгадваў хваляванне ардынарца Патапа Еўтуха з Піншчыны, які вельмі хваляваўся, што будзе абслугоўваць вядомага ўсяму Палессю славутага «поріцкага пана»[1093].

Скірмунт яшчэ некалькі дзён правёў у Петраградзе, хоць Асмалоўскага ён пакінуў адразу пасля таго, як той на падставе дакумента новай улады рэквізаваў апартаменты. У аўтара ўспамінаў засталося ўражанне, што Скірмунт, уражаны гэтай рэквізіцыяй, нават пазбягаў сустрэчы з ім[1094].

Пра што сведчаць пераказы Асмалоўскім двух размоў з Раманам Скірмунтам? Дзейнасць М. Радзянкі магла ацэньвацца пазітыўна як пэўная альтэрнатыва палітычнаму курсу Керанскага і ягонага ўрада, які ў кастрычніку страціў сваіх апошніх прыхільнікаў. Радзянка як кіраўнік Часовага камітэта Дзяржаўнай Думы працяглы час імкнуўся аднавіць яе дзейнасць. Не знаходзячы ў гэтым падтрымкі Часовага ўрада, ён з красавіка па жнівень 1917 г. праводзіў прыватныя нарады думскіх дэпутатаў, спрабаваў (разам з іншым лідэрам *октябристов* Аляксеем Гучковым) заснаваць Ліберальна-рэспубліканскую партыю. Аднак усе яго палітычныя ініцыятывы лета-восені 1917 г. закончыліся няўдачай.

Раману Скірмунту маглі спадабацца намаганні Міхаіла Радзянкі вярнуць дзяржаўнай уладзе моц і прэстыж. Нагадаю, што яшчэ ў 1906 г., выступаючы ў Думе супраць прыняцця дэпутатамі адмысловага звароту да народу, Скірмунт заявіў, што нават збанкрутаваная ўлада будзе лепшым варыянтам, чым панаванне анархіі[1095]. Варта адзначыць, што Радзянка не належаў да той катэгорыі палітыкаў, якія казалі «Расія», а думалі толькі пра захаванне ўласных прывілеяў і маёмасці. Характэрны эпізод меў месца 27 лютага падчас ягонага выступу ў Таўрычаскім палацы перад Сямёнаўскім палком. Нехта з салдат закрычаў: «Изничтожить надо этого Родзянко!» Старшыня Думы спакойна адказаў: «Что ж, стреляйте... Отойдите, граждане...» Аднак у сваім кабінеце не вытрымаў: «Мерзавцы! Мы жизнь сыновей отдаем своих, а это хамье думает, что земли пожалеем».

Звяртае на сябе ўвагу прысутнасць Краю ў размове Асмалоўскага і Скірмунта. Менавіта Край, пад якім трэба разумець не толькі Меншчыну, але і ўсю неакупаваную нямецкім войскам Беларусь, быў у той час зыходнай кропкай разважанняў Скірмунта. Знаходзячыся ў Петраградзе, ён імкнуўся быць у курсе апошніх падзей у Беларусі і Літве. Пры гэтым, размаўляючы з адным з лідэраў польскай супольнасці Меншчыны, ён не закранаў «польскага пытання». Затое гаворка ішла пра выбары ва Устаноўчы Сход, у які імкнуліся трапіць абодва суразмоўцы. Дарэчы, Асмалоўскі быў кандыдатам № 1 у спісе Польскага выбарчага камітэта.

[1093] Ibidem, k. 141.

[1094] Ibidem, k. 137.

[1095] *Стенографические отчеты. Гос. дума, 1906 год, сессия первая.* Том 2. Заседанія 19–38, с. 1964; «Kurier Litewski». 1907, Nr 151.

Пэўныя спадзяванні Скірмунта на паразу бальшавікоў, выказаныя яшчэ 25 кастрычніка, магчыма, сведчылі, што ён, як і большасць тагачаснай палітычнай эліты, не мог уявіць пераўтварэння бальшавікоў у партыю ўлады.

Скірмунт і Любаньскі вярталіся ў Менск чыгункай праз Маскву. Аднак падарожжа, якое здавалася найбольш бяспечным, насамрэч, такім не было. У Маскве ішлі вулічныя баі. Горад аказаў супраціў бальшавікам, і менчукі за пераезд з аднаго вакзала на другі заплацілі рамізніку 200 руб.[1096]

Між тым, бальшавікі, каб надаць сваім дзеянням падабенства законнасці, увечары 26 кастрычніка 1917 г. абвясцілі на II з'ездзе Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў вядомыя дэкрэты пра мір і зямлю. З'езд, на якім пасля сыходу правых эсэраў, дамінавалі прыхільнікі бальшавікоў, падтрымаў дэкрэты без абмеркавання. Быў сфарміраваны новы ўрад – Савет народных камісараў (Саўнарком) на чале з Уладзімірам Ульянавым (*Леніным*).

Тэрмін яго дзейнасці быў абмежаваны скліканнем Устаноўчага Сходу, які павінен быў пачаць працу ўжо ў лістападзе. Фактычна ў гэтыя кастрычніцкія дні бальшавікі не столькі захапілі ўладу, колькі заявілі прэтэнзіі на яе.

Планы бальшавікоў па руйнаванні старога «буржуазнага» (дэмакратычнага) ладу і пабудове сацыялістычнай дзяржавы не маглі абапірацца толькі на намаганні сяброў іх партыі. Дзеля «расчысткі тэрыторыі» неабходна было зрабіць сваімі саюзнікамі сацыяльныя нізы, рабочых і сялян, якія нічога не ведалі пра сацыялізм і, тым больш, пра дыктатуру пралетарыяту. Як заўважыў Пайпс, бальшавікі паставілі перад імі цалкам зразумелую і прывабную мэту, якую добра перадае лозунг «Рабуй нарабаванае!»[1097]

Былую імперыю фактычна аддавалі на рабаванне. Бальшавіцкі Дэкрэт пра зямлю, які перадаваў сялянскім абшчынам усе ворныя землі, выклікаў чарговы сялянскі бунт, які меў трагічныя наступствы для Беларусі. Абвешчаны «рабочы кантроль» на прадпрыемствах абярнуўся тым, што рабочыя дзялілі паміж сабою ўсе прыбыткі свайго завода. Салдаты-франтавікі рабавалі вайсковыя склады і падбухторвалі сялян прыфрантавых вёсак да рабунку памешчыцкіх маёнткаў і забойства іх уладальнікаў. Фактычна разам з паняццем прыватнай уласнасці знікалі паняцці дзяржаўнай і народнай уласнасці. Сучаснікі бачылі ў гэтым толькі бязладдзе і анархію, але, насамрэч, бальшавікі займаліся «расчысткай тэрыторыі» для ўсталявання новага палітычнага і сацыяльнага ладу[1098].

Пакуль народ рабаваў, бальшавікі на чале з Леніным і Троцкім планамерна ліквідавалі сваіх палітычных праціўнікаў. У выніку праз два тыдні пасля бальшавіцкага пераварота ў Расіі не засталося нават слядоў 12-гадовага парламентарызму. Дыктатура пралетарыята ў варыянце бальшавікоў азначала фактычнае вяр-

---

[1096] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917*. Tom 2, c. 263.

[1097] Р. Пайпс, *Русская революция. Часть вторая*, с. 184.

[1098] Там же, с. 181.

танне самаўладдзя. Дэкрэты Саўнаркома, падпісаныя Леніным, адразу набывалі моц закону.

Быццам прадчуваючы ўсё гэта, Вялікая Беларуская Рада, Цэнтральная Беларуская Вайсковая Рада, БСГ, БНПС і Беларускі Выканкам Заходняга фронту 27 кастрычніка 1917 г. выступілі з «Граматай да Беларускага Народу». Яны казалі пра неабходнасць яднання ўсіх «жывых сіл нашае Бацькаўшчыны» дзеля абароны свабоды: «У гэтыя дні нам належыць паказаць запраўды, што злучаная пакутай беларуская рэвалюцыйная дэмакратыя ні дапусьціць, каб віхор бязладу згубіў нашую сьвятую нацыянальную справу абароны вольнасьцяў і правоў Беларускага Народу. [...] Злучыцеся ў адну згодную сям'ю каля Вялікай Беларускай Рады, адкідаючы ад сябе сеючыя нізгоду поклічы і будзьце асцярожнымі ў сваіх дзеях. Толькі парадак і згоднасьць паміж усімі паможа нам утрымаць спакой у нашым краі, а еднасьць з войскам падыйме дух і злучыць увесь народ»[1099].

Цікава, што ў гэты ж дзень на старонках «Дзенніка Мінскага» быў апублікаваны артыкул яго рэдактара, які пасля аналізу сітуацыі ў Расіі і Беларусі заклікаў польскую супольнасць Меншчыны працаваць толькі дзеля Польшчы і катэгарычна заяўляў: «Нашая Айчына – гэта Польшча!»[1100] Менавіта падобныя настроі адштурхоўвалі Скірмунта ад больш цесных кантактаў з польскай грамадскасцю.

Між тым сітуацыя ў Краі станавілася сапраўды трагічнай. Ахвярамі салдацка-сялянскага бунту ўсё часцей станавіліся мясцовыя землеўладальнікі ды іх сем'і. Ініцыятарамі рабункаў ды іх найбольш актыўнымі ўдзельнікамі ў прыфрантавой паласе найчасцей былі дэзерціры. Адным з эпізодаў гэтай катастрофы быў разгром маёнтка Эдварда Вайніловіча ў Савічах у лютым 1918 г. Наогул, хваляванні і пагромы пачаліся раней, але бальшавіцкі «Дэкрэт пра зямлю» ад 26 кастрычніка 1917 г. паспрыяў іх пашырэнню і пэўнай легалізацыі. Сяляне зразумелі, што ўлада на іх баку.

Эдвард Вайніловіч успамінаў, што пасля з'яўлення гэтага Дэкрэта распачалася адкрытая экспрапрыяцыя зямлі і маёмасці памешчыкаў сялянскімі камітэтамі. Ва ўладальніка Савічаў ужо ў другой палове кастрычніка сяляне канфіскавалі ключы ад гумна ды іншых гаспадарчых будынкаў, пачалі прадаваць сабраны ўраджай, у т. л. самому былому гаспадару і г. д. Апошняе было праявай якраз добрага стаўлення. Як прыгадваў Вайніловіч, іншыя сялянскія камітэты часта не дазвалялі памешчыку і ягонай сям'і набываць зерне і малако, адмаўлялі нарыхтоўку дроў, не давалі коней для паездак. Землеўласнікі цярпелі прыніжэнне, але заставаліся на месцы, бо адчувалі, што гэта не можа цягнуцца бясконца. Калісьці запасы хлеба ды іншых прадуктаў павінны былі скончыцца. І сапраўды панаванне сялянскіх камітэтаў саступіла месца пагромам, якія, на думку Вайніловіча, залежалі не

[1099] *Грамата да Беларускага Народу*, «Вольная Беларусь». 1917, № 28; Ф. Турук, *Белорусское движение...*, с. 93–94.

[1100] T. J. [T. Jaworski], W *powaznej chwili*, «Dziennik Miński». 1917, Nr 99.

столькі ад багацця памешчыка і стаўлення да яго жыхароў суседняй вёскі, колькі ад настрояў вяскоўцаў ці дваровай службы і актыўнасці бальшавіцкіх агітатараў[1101]. У ролі апошніх часта выступалі дэзерціры, якія стваралі банды марадзёраў.

Маёнтак Савічы Вайніловіча быў разгромлены на пачатку лютага 1918 г. Ягоны ўладальнік пазней падрабязна прыгадваў тыя падзеі.

ДАКУМЕНТ

Успаміны Эдварда Вайніловіча пра разгром маёнтка Савічы

6–8 лютага 1918 г.[1102]

Перад вячэрай мы назіралі за абозам, які рухаўся праз маёнтак вялізарнай калонай, «разбаўленай» пяхотай і некалькімі вершнікамі. Нечакана абоз спыніўся, і да яго з цемры падбегла група людзей, сяброў «камітэта». Гэта была змова наконт пагрома. Праз некалькі хвілін абоз аднавіў свой рух, а мы адчулі палёгку, не ведаючы, што ён спыніцца праз поўвярсты за паркам, у вёсцы, якая таксама называлася Савічы, і якая ніколі ні ў часы прыгону, ні ў той час, ні потым не мела ніякага дачынення да маёнтка. Пасля непрацяглай вячэры […] мы пайшлі спаць. […] Не паспелі задрамаць, як нас абудзіў стук у дзверы нашага пісара Дзмітра Шкуцько, які паведаміў, што прыйшлі тыя, хто будзе нас рабаваць.

Ён хутка пабег уніз, а я правёў жонку па «чорнай лесвіцы» ў сад праз бакавыя дзверы […]

Я выпусціў пісара з дому, мяркуючы, што, калі нападнікамі будуць не салдаты, а мясцовыя сяляне, то нічога кепскага мне не зробяць. І амаль адразу заўважыў 12–15 узброеных салдат, якія беглі да параднага ўваходу. Я выбег праз тыя ж бакавыя дзверы, праз якія толькі што вывеў жонку, і накіраваўся праз парк у бок доміка ў садзе. Яшчэ да таго, як дабег да першых дрэў, якія павінны былі схаваць мяне ад рабаўнікоў у гэтую ноч, пачуў шум, гам, выстралы, рык натоўпу, які ўварваўся ў дом. Пачаўся пагром, які потым дакаціўся да стайні і карэтнага сараю і скончыўся праз пару гадзін. Увесь гэты час, не адчуваючы марозу, я стаяў паміж ліпамі, не адводзячы вачэй ад месца, дзе схавалася мая жонка, і чуў крыкі і грукат у доме.

Трохі сцішылася. Я выйшаў з укрыцця і ўбачыў пісара, які папярэдзіў мяне пра з'яўленне новай групы рабаўнікоў у суправаджэнні сялян з суседніх Савічаў. Сялянам загадалі шукаць уладальніка, якога трэба пакараць. Пісар параіў мне сысці з маёнтку, што я і зрабіў. Рэшту дня і ўвесь наступны дзень да вечара я правёў у лесе, назіраючы за тым, што рабілася ў маёнтку і доме. Адтуль па-ранейшаму даносіліся выстралы, да якіх далучыліся яшчэ і нейкія выбухі. Колькасць адступаючых войск (г. зн. марадзёраў) павялічылася, вераніцы сялянскіх вазоў, дакладней, маіх уласных вазоў, захопленых дваровымі людзьмі, рухалі туды і сюды з нара-

[1101] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 200.
[1102] Ibidem, s. 202–206.

баванай маёмасцю. Я бачыў уганяемае быдла і коней, рабаўнікоў, якія сварыліся і біліся за здабычу.

Нярвовае ўзбуджанне не дазваляла замёрзнуць, нягледзячы на тое, што меў лёгкую вопратку, а быў моцны мароз. Толькі ўвечары наступнага дня я рашыўся пайсці ў суседні фальварак «Малыя Савічы», які належаў Чарноцкім. Гаспадароў там ужо не было, але там я знайшоў жонку пад апекай упраўляючага. Ноч я правёў не распранаючыся, у крэсле, у цёплым пакоі і пад дахам.

Пагром працягваўся яшчэ два дні, а мы ўвесь тыдзень правялі ў чужым маёнтку, не паказваючыся людзям і атрымліваючы інфармацыю ад блізкіх дваровых людзей пра тое, што мяне ўсё яшчэ шукаюць і расцягваюць рэшткі маёмасці. Толькі 13/27 лютага пасыльны паведаміў, што прыбыў нямецкі атрад, саксы, полк № 100, і мяне выклікаюць. Я паехаў і ўбачыў усю дваровую службу на ганку палаца.

На кампасным слупе знаходзіўся кулямёт, а побач дваіх найбольш актыўных дваровых бальшавікоў, якіх немцы збіраліся павесіць. Чалавек 20 з начальнікам хадзілі па пакоях і здзіўляліся таму спусташэнню, якое людзі іншым разам робяць бяздумна і без асаблівай патрэбы дзеля задавальнення сваіх варварскіх патрэб. Не засталося ніводнага століка, ніводнага цвіка ў сцяне, павырывалі ўсе пячныя дзверцы. Шматлікія шыбы і дзверы былі выбіты, многія вывезены. Па прычыне таго, што былі павырываны каналізацыйныя трубы была заліта вадой падлога на другім паверсе і столь на першым. А што зрабілі з архівам і бібліятэкай, якая налічвала болей за 5 000 тамоў! Усё парвана, карціны і партрэты раданачальнікаў нарэзаныя на палосы аба прастрэленыя.

Я прасіў саксаў не вешаць арыштаваных пры ўмове, што яны і яшчэ чатыры найбольш нядобранадзейныя сям'і з'едуць з маёнтку, што і было зроблена. Але яны пасяліліся ў суседніх вёсках на адлегласці 1–2 вёрстаў і працягвалі прапаганду.

Найбольш балела тое, што сярод самых злосных ворагаў былі тыя, у каго не толькі бацькі, але нават дзяды нарадзіліся і правялі ўсё жыццё ў маёнтку на службе ў маіх продкаў, унукаў якіх я дапамагаў выхоўваць. Праўда, было шмат людзей, якія засталіся мне вернымі ў самыя цяжкія часы, знаходзіліся побач і былі гатовыя падзяліць мой лёс. У першую чаргу трэба назваць сына нашага былога рамізніка, упраўляючага Дзмітра Шкуцько, эканомку, пісара, кухара і лёкая. [...] Я павінен таксама з задавальненнем адзначыць, што сяляне былой дваровай вёскі Браткова ад пачатку адмаўляліся ўдзельнічаць у пагроме і згадзіліся на гэта толькі пад пагрозай, што пры падзеле зямлі нічога не атрымаюць.

Варта адзначыць, што для Вайніловіча і ягонай жонкі гэты пагром закончыўся не так трагічна, як для многіх іншых землеўласнікаў Менскай, Магілёўскай і Віцебскай губ. Так, паводле інфармацыі «Дзенніка Віленскага» падчас нападу сялян навакольных вёсак на маёнтак Шапялёва Дзісенскага пав. у пажары загінулі граф Мар'ян Бжастоўскі і ягоныя госці, якія спрабавалі абараняцца. У Дрысенскім пав. рабаўнікі забілі ўсю сям'ю Зайкоўскіх, на Магілёўшчыне аднаму з землеўласнікаў,

які належаў да польскай самаабароны, перад тым як забіць, зламалі рукі і ногі і г. д.[1103]

«Вольная Беларусь» паведаміла пра пагромы і рабункі маёнткаў Глінін, Зарэчча, Бараўляны, Лісін, Казіміра, Слабодка ды інш. на Барысаўшчыне, Грушына, Калюніца, Крушчына, Камокі, Нарцэвічы (графа Чапскага) на Ігуменшчыне, Парахонск (Фр. Друцкага-Любецкага): «У некаторых выпадках пагромы канчаліся гвалтоўніцтвам над гаспадарамі. Разгромы рабілі салдаты поруч з сялянамі». Камісар Слуцкага пав. Радаслаў Астроўскі пісаў пра разгром маёнткаў Малева, Альба і Робертава. Жахлівая сітуацыя склалася ў Ігуменскім і Барысаўскім пав., куды былі нават накіраваны войскі[1104].

Для Рамана Скірмунта асабліва балюча было даведацца пра пагромы маёнткаў Лунін князя Гераніма Друцкага-Любецкага на Піншчыне і Маньковічы Станіслава Радзівіла ў Столінскім пав. Разам з іх уладальнікамі ён пашыраў краёвую ідэю і працаваў у Беларускім нацыянальным камітэце. Пагромы адбываліся і ў іншых мясцовасцях Палесся. Так, 31 кастрычніка Міхал Касакоўскі атрымаў ад інструктара ЦГК з Лунінца спіс разгромленых маёнткаў, сярод якіх фігуравалі Колбы Алевінскіх, Нінкавічы Тупальскіх, Вулька Цярлецкіх, Сучэ і Барова Крашэўскіх, Вешуца Нелюбовічаў, Мокра Барова Ордаў, Церабень і Чарнаў Неслухоўскіх[1105].

Падрабязныя апісанні гвалтаў і рабункаў за лістапад 1917–люты 1918 г. з боку беларускіх сялян і салдат можна знайсці на старонках газет «Дзеннік Мінскі», «Дзеннік Віленьскі» і «Вольная Беларусь». Так, у першым з іх у артыкуле «Пагромы» К. Загурскі, пераказаў абставіны пагрому сядзібы Замойскіх у Рацаве на Віцебшчыне, сведкам якога ён быў, і пералічыў іншыя вядомыя пагромы. У спісе фігуравалі маёнткі Углы, Баброва і Цімухоўка Даўнаровічаў, Трухановічы Камароўскіх, Глінішча Сушчэўскіх, Чарняўка Мацкевічаў, Александраўка Чахоўскіх, Чарнаручча, Гаўрылаўка, Янаў, Друцк, Рай і Пясэчна Шчытаў ды інш.[1106]

Напачатку снежня 1917 г. салдацкая банда паўторна напала на палац Радзівілаў у Паланечцы Наваградскага пав. Зрабавалі ўсё, што мела нейкую каштоўнасць, астатняе разбілі і спалілі. Тое ж зрабілі з домам адміністратара. Карэспандэнт «Дзенніка Мінскага», які паведаміў пра гэтае здарэнне, заўважыў, што банды салдат да гэтага часу знішчалі толькі «буржуеў», але зараз пагроза датычыць ужо сялян: «Адбываюцца забойствы, гвалт і самыя жахлівыя здзекі. Калі ўрад не ўмяшаецца, то невядома, чым гэта скончыцца»[1107]. Паводле Загурскага, Польская Рада Магілёўскай зямлі звярнулася да «главковерха» Крыленкі з патрабаваннем абараніць польскае насельніцтва ад гвалту. У адказ прыйшла тэлеграма, у якой

[1103] *Rządy bolszewickie*, «Dziennik Wileński». 1918, Nr 68.
[1104] «Вольная Беларусь». 1917, № 30.
[1105] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917*. Tom 2, c. 263.
[1106] K. Zagorski, *Pogromy*, «Dziennik Miński». 1917, Nr 136.
[1107] «Dziennik Minski». 1917, № 134.

паведамлялася, што бальшавіцкая ўлада не будзе абараняць «буржуеў» і перашкаджаць сялянскай рэвалюцыі.

«Вольная Беларусь» паведамляла пра «віхор руйнавання» ў Віцебскай губ.: «У Гарадокскім павеці асталіся покуль што цэлымі два маёнткі. Дзіка нішчуцца нацыянальныя скарбы. Што німа як унясьці ці ўвезьці, тое нішчыцца на мейсцы; такім чынам, астаўляюць на мейсцы парэзаную жывёлу. Абразы, цяжкія шафы, камоды і др. палюцца на вогнішчах. Раскідываюць печы, падлогу і столь. Часам усе будоўлі падпальваюцца. Здаралося, што забівалі гаспадароў, калі тыя ні пасьпелі ўцячы. Лес глуміцца да канца. Гэтыя дзікія расправы ўжо пачаліся і ў Віцебскім павеці, і німа каму бараніць»[1108].

Пісьменнік і публіцыст Змітрок Бядуля на старонках беларускай газеты заклікаў да стварэння беларускага войска, з якім ён звязваў надзею на абарону Краю ад «шалёнага віхору паўстання»: «Яго дзікае полымя ахоплівае сваімі буйнымі хвалямі ўсё большыя масы людзей. Пайшоў буяніць і разгуліваць звер. Той звер, які ў звычайным часе сядзіць глыбока захаваны ў чалавечай душы, а ў часе смут і сваволля зрываецца з ланцугоў сумлення, сораму і страху. Рабуюць і паляць маёнткі, мястэчкі і вёскі. Абдзіраюць адзін другога, рэжуць, б'юць, нішчаць здабыткі людскія, і – ратунку няма. Гэты шалёны віхор разгульвае цяпер у нашым краі. Гурт дзікіх людзей-ваўкоў, уходзячы ад фронту, рыскае па нашай зямлі і нішчыць, глуміць усё на пуці сваім, астаўляючы за сабою плач, стогны, голад, холад і руіны»[1109].

Міхал Касакоўскі назваў гэта «вайной народу супраць уласнай культуры»[1110]. Нічога не змяніў нават зварот магілёўскага арцыбіскупа Эдварда Ропа «Да майго народу каталіцкага» ад 28 лістапада 1917 г. Арцыбіскуп заклікаў супраціўляцца уплывам разбэшчанай салдатні і заставацца народам каталіцкім, справядлівым, добрых звычаяў, які памятае пра Божы суд і вечнасць. А там, дзе цэлыя парафіі «растапталі Божы закон і ўдзельнічалі ў гвалтах і рабунках», Роп забараніў спяваць падчас набажэнства і праводзіць урачыстасці ў касцёле, пакуль мясцовыя пробашчы не атрымаюць дазволу арцыбіскупа[1111].

Бальшавікі здолелі ператварыць сацыяльную напружанасць у сапраўдны пажар, у полымі якого гінула лагоднасць і памяркоўнасць беларускага сялянства, знікалі патрыярхальна-патэрналісцкія настроі мясцовых землеўладальнікаў. Да сярэдзіны лютага 1918 г. у Беларусі было знішчана каля 13 тыс. прыватных гаспадарак[1112].

[1108] «Вольная Беларусь». 1917, № 33.

[1109] З. Бядуля [С. Плаўнік], *Пара бараніцца*, «Вольная Беларусь». 1917, № 33.

[1110] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917*. Том 2, с. 342.

[1111] «Dziennik Miński». 1917, Nr 132.

[1112] *Гісторыя Беларускай ССР пяці тамах*. Пад рэд.І. Ігнаценкі і інш. Том 3, Мінск 1973, с. 94.

Імкнучыся зразумець прычыны гэтай катастрофы і матывы мясцовых удзельнікаў пагрому, Вайніловіч прыгадаў палітыку расійскай дзяржавы, якая, на яго думку, на працягу чатырох пакаленняў імкнулася пасварыць маёнтак і вёску, распальвала «нацыянальна-класавую барацьбу»[1113]. Аднак варта адзначыць, што гэтыя стасункі былі далёкімі ад нармальных яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай, якую літоўскія палякі пачатку XX ст. моцна ідэалізавалі.

За тыя гады, што мінулі пасля адмены прыгону, у свядомасці сялянскай масы не адбылося кардынальных змен. Расія фактычна засталася «страной рабов, страной господ». Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў сяляне, апранутыя ў салдацкія шынелі, адчулі поўную беспакаранасць. Не толькі ў карэннай Расіі, але і ў Беларусі адбыліся падзеі, якія моцна нагадвалі колішнія бунты рабоў. Эпоха парламентарызму аказалася занадта кароткай, каб «падданыя імператара» адчулі сябе свабоднымі грамадзянамі краіны.

Чытаючы газетную інфармацыю пра пагромы і забойствы канца 1917 – пачатку 1918 г. на тэрыторыі цэнтральнай і ўсходняй Беларусі, прыгадваюцца пушкінскія словы з аповесці «Капітанская дочка»: «Не приведи Бог видеть русский бунт – бессмысленный и беспощадный». У чарнавіках паэта захаваўся працяг думкі, які не трапіў у апублікаваны варыянт аповесці: «Те, которые замышляют у нас невозможные перевороты, или молоды и не знают нашего народа, или уж люди жестокосердные, коим чужая головушка полушка, да и своя шейка копейка»[1114].

Упэўнены, што гэты бунт нельга лічыць жахлівай праявай чужынскага сваволля, нейкай «расійшчынай» у айчыннай гісторыі, у якую гвалтам былі ўцягнуты беларускія сяляне. Паняцце беларускай талерантнасці, надзвычай папулярнае напачатку 1990-х гг., даўно патрабуе свайго пераасэнсавання...

Чарговы сялянскі бунт закладваў падмуркі беларускага грамадства без Скірмунтаў і Радзівілаў. Безумоўна, важную ролю адыграла бальшавіцкая агітацыя, якая прапагандавала сацыяльную нянавісць і заахвочвала да гвалтаў і забойстваў. Аднак адказнасць перад гісторыяй за здзейненыя злачынствы нясуць у першую чаргу «тутэйшыя». Тагачасныя пагромы былі выстралам ва ўласную будучыню, і менавіта беларусы найчасцей націскалі на курок. Класавая нянавісць перамагала нацыянальную ідэю і салідарнасць. Увосень 1939 г. ужо ў Заходняй Беларусі сялянскі бунт разам з рэпрэсіўным механізмам савецкай таталітарнай дзяржавы дашчэнту знішчыць апошніх беларускіх «буржуеў», адным з якіх акажацца і Раман Скірмунт...

Бальшавікі захапілі ўладу ў Менску і ва ўсходняй Беларусі ў першай палове лістапада. Паўсюдна былі створаны Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты (ВРК), якія абапіраліся на бальшавізаваныя войскі Заходняга фронту. Узначаліў гэтую ўладу старшыня Менскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў Карл Ландар.

[1113] E. Woyniłłowicz, *Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza*, s. 205–206.

[1114] А. Пушкин, *Полное собрание сочинений в 10 т.* Москва-Ленинград 1950, т. 3, с. 328.

Імкнучыся да легітымнасці сваёй улады, бальшавікі ў сярэдзіне лістапада правялі ў Менску III з'езд сялянскіх дэпутатаў Менскай і Віленскай губ., з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці і II з'езд армій Заходняга фронту.

Ужо сама арганізацыя з'ездаў забяспечыла колькасную перавагу бальшавікоў. У выніку быў сфарміраваны Абласны выканаўчы камітэт саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) на чале з М. Рагазінскім. Ён прэтэндаваў на заканадаўчую ўладу на ўсёй тэрыторыі Заходняга фронту. Выканаўчая ўлада перадавалася Савету народных камісараў Заходняй вобласці і фронту (кіраўнік К. Ландар). Пра легітымнасць улады, дзе дамінавалі вайскоўцы, казаць не даводзіцца. Ва ўмовах стыхійнай дэмабілізацыі фронту бальшавікі фактычна ажыццявілі манёўр захавання створаных імі ўладных структур шляхам іх мімікрыі пад паўнамоцнае прадстаўніцтва рабочых і сялян Беларусі[1115].

Магчыма, што перамога бальшавікоў паспрыяла перасэнсаванню Скірмунтам ролі польскага чынніка ў тагачасных падзеях. Пасля вяртання ў Менск ён прыняў удзел у з'ездзе прадстаўнікоў польскіх арганізацый Беларусі і Украіны, які праходзіў нелегальна. Скірмунт таксама ўдзельнічаў у нарадах Вайсковай камісіі з'езда, дзе гаворка ішла пра стварэнне польскага войска і пра лёс корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага. Пасля працяглай дыскусіі яе ўдзельнікі сцвердзілі, што «польскі салдат павінен абараняць ад рабунку і гвалту польскіе грамадскіе арганізацыі, а таксама ўсіх людзей без розніцы веравызнання і нацыянальнасці, што польскае войска не павінна служыць класавым або партыйным інтарэсам, і што Крэсы павінны яго падтрымліваць маральна і матэрыяльна»[1116].

Касакоўскі, які ў сваім Дзённіку апісаў гэтую дыскусію, адзначыў адзінства ў разуменні важнасці падтрымкі польскага войска, абумоўленае станам роспачы, які запанаваў сярод землеўласнікаў. Эмацыйны запал многіх выступоўцаў ахалоджвалі толькі... лічбы. У выпадку верагоднага спынення дзяржаўнага фінансавання існуючага Польскага корпуса ўвесь фінансавы цяжар ускладаўся на Край, які пасля масавага знішчэння маёнткаў ужо не быў у стане яго вытрымаць.

13 лістапада 1917 г. Раман Скірмунт выступіў на пасяджэнні Вайсковай камісіі з'езда з прамовай, якую Касакоўскі ў Дзённіку назваў «сенсацыйнай». Прамоўца выказаў сімпатыі да Польскага корпуса і заклікаў ствараць у Краі польскае войска дзеля «выканання вялікага запавету Рэчы Паспалітай»[1117].

Праз два дні адбылася сакрэтная нарада ў ксяндза Чэслава Мірскага з удзелам Чэслава Крупскага, Эдмунда Івашкевіча, Гераніма Кяневіча, Міхала Касакоўскага і Рамана Скірмунта. Гаворка датычыла вайсковай справы. Абмяркоўваліся рэальныя крокі дапамогі Начполю і камандаванню Польскага корпуса. Удзельнікі на-

[1115] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 151.
[1116] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917*. Tom 2, s. 288–290.
[1117] Ibidem, s. 294.

рады згадзіліся з першачарговай неабходнасцю аддзялення ад Расіі «абарончым мурам». Пры гэтым галоўнай задачай бліжэйшага часу абвяшчалася «паразуменне з краем». У гэтым выпадку гаворка ішла ўжо пра Польшчу. Пачатковым этапам яго дасягнення разглядалася шырокая супраца ў справе арганізацыі вяртання бежанцаў.

Паводле Касакоўскага, удзельнікі нарады дасягнулі амаль поўнай згоды. Было вырашана стварыць «пазапартыйную групу», мэтаю якой была падтрымка фарміравання і дзейнасці польскага войска на «крэсах». Раман Скірмунт пры гэтым заявіў пратэст супраць ужывання тэрміна «крэсы», падкрэсліўшы, што беларуская зямля – гэта «Край»[1118]. Аўтар Дзённіка з пэўнай іроніяй заўважыў, што асабіста ён як «недасведчаны палітык» у дадзенай сітуацыі не разумее розніцы паміж «крэсамі» і «краем». Аднак у гэтай сапраўды не істотнай для вынікаў нарады спрэчцы адлюстраваліся прынцыпова розныя погляды на будучыню беларускай зямлі. Усё ж поўнага паразумення паміж Скірмунтам і кіраўніцтвам мясцовых польскіх арганізацый не было. Цэнтрам прыцягнення для апошніх заставалася Польшча. Менавіта яна была іх «Краем». Аднак у пэўны момант інтарэсы гэтых дзеячаў і Скірмунта супалі.

19 лістапада 1917 г. Менск наведаў кіраўнік Цэнтральнага грамадзянскага камітэта Каралеўства Польскага, сябра Партыі нацыяльных дэмакратаў Уладзіслаў Грабскі. Пасля Кастрычніцкага пераваротy ён выйшаў з Камісіі па ліквідацыі спраў Каралеўства Польскага, зразумеўшы немагчымасць рэалізацыі яе праграмы. Паводле Касакоўскага, у Менску ён выказваўся за ўсталяванне «тайных кантактаў» мясцовых польскіх арганізацый з Рэгенцыйнай Радай[1119]. Скірмунта на гэтую сустрэчу не запрасілі…

Чаму Раман Скірмунт у лістападзе 1917 г. пайшоў на збліжэнне з польскімі арганізацыямі? Відавочна, што ён шукаў саюзніка дзеля абароны Беларусі ад бальшавізму. У надзвычай складаны час Скірмунт працаваў на польска-беларускае паяднанне, магчыма, прыгадваючы часы Люблінскай уніі. Польска-беларускае паразуменне бачылася як адзін з перспектыўных варыянтаў абароны Краю, тым больш, што ў Беларусі знаходзіўся баяздольны Польскі корпус. Таксама варта прыгадаць краёвую ідэю, якая для Скірмунта заставалася актуальнай, і ягоныя кантакты з элітай мясцовай польскай супольнасці.

Дарэчы, патэнцыял краёвасці таксама імкнуліся выкарыстаць беларускія дзеячы Віленшчыны, якія да апошняга спадзяваліся на беларуска-літоўскае паразуменне. Яшчэ ў верасні 1917 г. сход віленскіх беларускіх арганізацый накіраваў тэлеграму ў германскі рэйхстаг, у якой выказваў надзею, што Германія дапаможа «рэалізацыі палітычных ідэалаў, падзеленага фронтам 9-мільённага белару-

[1118] Archiwum PAN. Sygn. III–4. M. Kossakowski, *Diariusz*. T. 4, s. 402.
[1119] Ibidem, s. 419.

скага народу, на падставе адзінства з этнаграфічнай Літвой і Курляндыяй»[1120]. Аднак літоўскія палітыкі цвёрда стаялі на пазіцыі ўтварэння мононацыянальнай дзяржавы ў межах «этнаграфічнай Літвы з прылеглымі тэрыторыямі» і сталіцай у Вільні. На гэтым шляху яны знайшлі падтрымку з боку германскіх улад.

Тым не менш, беларусы не саступалі. У верасні 1917 г. падчас сходу беларускіх арганізацый Вільні было прынята рашэнне аб правядзенні Беларускай канферэнцыі. На ёй павінны былі быць прадстаўленымі ўсе беларускія арганізацыі, што дзейнічалі на захад ад лініі фронту. Галоўнай мэтай прадстаўнічага сходу была каардынацыя намаганняў у справе будаўніцтва ўласнай дзяржаўнасці ў саюзе з літоўскай нацыяй. Землі ўсходняй і цэнтральнай Беларусі планавалася далучыць да гэтай «самабытнай дзяржавы»[1121].

Напрыканцы лістапада быў створаны Арганізацыйны камітэт. Яго сябры на старонках газеты «Гоман», дзе галоўную ролю адыгрывалі Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі, заявілі, што перад беларускім рухам з заходняга боку фронту стаіць двайная задача – культурна-нацыянальнае і палітыка-дзяржаўнае самавызначэнне. Галоўнай мэтай абвяшчалася стварэнне дзяржавы ў межах Беларуска-Літоўскага краю. У Камітэт, між іншым, увайшлі браты Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Язэп Салавей, барон Казімір Шафнагель, ксёндз Уладзіслаў Талочка, іераманах Савацій, князь В. Святаполк-Мірскі. Склад Камітэта сведчыць пра спробу арганізатараў аб'яднаць усе сацыяльныя колы беларускага грамадства.

Гэтаму павінна была спрыяць таксама публікацыя ліста Шафнагеля «Да нашай краёвай інтэлігенцыі»[1122]. Аўтар, землеўладальнік з Гарадзеншчыны пісаў пра трагізм становішча беларускага селяніна, пакінутага сваёй інтэлігенцыяй. Ён заклікаў прадстаўнікоў заможных колаў грамадства ўсвядоміць «очывістую праўду – праўду тэрытарыяльную, а хутка пэўне ўжо і праўду палітычную: што вы – грамадзяне Літвы і Беларусі, яе сыны – значыць: "літвіны" або "беларусы"». Шафнагель пераконваў: «Паварот да гэтага адвечнага самавызначэньня [...], паварот згодлівы з вашым паходжэньнем і традыцыяй, ня толькі ня будзе вас ганьбіць, а наадварот, прынясе вам чэсць, бо звяжэ вас з народам, бо дасць вам аснову быту, бо вас узмацуе і падніме...»

Гэты зварот у духу краёвасці быў разлічаны на далучэнне да беларускага палітычнага руху часткі вышэйшых сацыяльных колаў мясцовага грамадства. Сярод патэнцыйных адрасатаў ён сустрэў пераважна крытычныя заўвагі. Але важна адзначыць прысутнасць у праграме віленскіх беларускіх арганізацый водгукаў колішняй краёвай ідэі. Яна зноў выкарыстоўвалася як падмурак нацыянальнага і сацыяльнага паяднання жыхароў Беларуска-Літоўскага краю.

[1120] [L. Abramowicz], *Litwa podczas wojny: zbiór dokumentów, uchwał, odezw i t.p.*, s. 128.

[1121] «Гоман». 1917, № 86.

[1122] «Гоман». 1917, №№ 89–91. Пазней ліст будзе выдадзены асобна на польскай мове.).

Вяртаючыся да Скірмунта, трэба адзначыць, што ягонае збліжэнне з польскімі арганізацыямі і падтрымка польскіх вайсковых частак у Беларусі зусім не азначала заканчэння ягонай беларускай дзейнасці. Міхал Касакоўскі на старонках Дзённіка працытаваў адказ аднаго з беларускіх дзеячаў (П. Алексюка?) на пытанне пра Рамана Скірмунта: «Ён для нас вельмі важны, але ён "пан", таму мы яго пакуль "схавалі"»[1123].

Магчыма, менавіта ў гэты час Скірмунт вырашыў стаць свайго роду звязковым звяном паміж Беларуссю і Польшчай і паспрабаваць з'яднаць палітычныя намаганні эліты беларускіх палякаў і дзеячаў беларускага руху дзеля інтарэсаў Беларуска-Літоўскага краю.

Трэба адзначыць, што польскія вайскоўцы ў месцах дыслакацыі корпуса сапраўды спрабавалі абараняць сядзібы і маёнткі ад рабункаў і пагромаў. Гэта вяло да сутыкненняў з сялянскімі камітэтамі і бальшавіцкай уладай. Апошнюю найбольш абурала самастойнасць Польскага корпуса, які паспяхова пазбягаў бальшавізацыі.

Спробы правядзення бальшавіцкай агітацыі сярод салдат корпуса, абвінавачванні польскіх вайскоўцаў у гвалтах, рабунках і забойствах сялян, адмовы мясцовых «камітэтаў» дазволіць размяшчэнне частак корпуса на сваіх тэрыторыях прымусілі камандзіра 4 снежня звярнуцца да сваіх падначаленых з адмысловай заявай. Генерал Доўбар-Мусніцкі заявіў пра пагаршэнне сітуацыі вакол корпуса. Ён адкінуў абвінавачванні з боку сялянскіх камітэтаў і заявіў, што «польскі салдат занадта культурны, каб дазволіць сабе гвалт над кім-небудзь», аднак пры гэтым «ён здольны абараніць свой гонар і жыццё». Камандзір нагадаў, што корпус падпарадкоўваецца Начполю, створанаму на з'ездзе палякаў-вайскоўцаў у Петраградзе, імкнецца вярнуцца ў Польшчу як арганізаваная і дысцыплінаваная сіла, заклікаў сваіх падначаленых абараняць сябе ад умяшальніцтва чужынцаў і не ўмешвацца ў «чужыя справы»[1124].

Аднак у тагачаснай сітуацыі і з улікам рэзалюцыі нарады ад 13 лістапада 1917 г. гэта было немагчыма. Пра гэта ж сведчаць пратэсты як сялянскіх камітэтаў, так і беларускіх арганізацый.

Між тым, 21 лістапада 1917 г. у мястэчку Солы Ашмянскага пав. была падпісана дамова аб спыненні ваенных дзеянняў. Набліжэнне мірных перамоваў абвастрыла пытанне пра лёс Краю, падзеленага лініяй фронту. Яно хвалявала беларусаў з абодвух яго бакоў. Калі «заходнікі» рыхтавалі Беларускую канферэнцыю ў Вільні і спадзяваліся знайсці падтрымку з боку ўладаў Германіі, то «ўсходнікі» асноўныя надзеі звязвалі з дзейнасцю ВБР і паяднаннем розных нацыянальных і палітычных сіл на глебе агульнакраёвых інтарэсаў.

На старонках «Вольнай Беларусі» Язэп Лёсік пісаў пра важнасць «краёвага сой-

---

[1123] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917*. Tom 2, s. 306.

[1124] *Polskie siły zbrojne*, «Dziennik Minski». 1917, Nr 136.

му», які лічыў адзіным сродкам захавання «дэмакратычных заваяванняў» і абароны Краю як ад рэвалюцыйнай анархіі, так і «контррэвалюцыйнасці»: «Краёвая Беларуская Рада стала на чаргу дня і кліча на работу ўсіх, хто любіць свой край, хто жадае яму лепшай сьветлай будучыні і ні хоча загінуць у моры безладзя, калатні і занепаду»[1125].

Ідэя яднання і спадзеву на ўласныя сілы былі галоўнымі ў ягоным артыкуле «Сучасны момэнт»: «Анархічная зараза, нахлынуўшая на нас с цэнтру, ахапіла ўвесь наш край ад краю да краю. Штодня прыносяцца жахлівыя весткі, што пагромы, гвалт і руйнаваньне разліліся па ўсёй шырокай Беларусі. Панскія маёнткі, лясы, сядзібы, усё грамадзкое дабро паліцца, крышыцца, нішчыцца або псуецца на векі. Гіне скарб, пустошыцца край, гарыць народнае дабро. І хто ж дасць ратунак нам, як ні мы самі? [...] На сьцені Белае Русі паўстаў покліч айчыны: Паўстаньце ўсе як адзін, ратуйце свой край ад згінення!»[1126]

Гэтыя заклікі рэдактара «Вольнай Беларусі» і аднаго з найбольш аўтарытэтных беларускіх дзеячаў цалкам адпавядалі поглядам Скірмунта. Верагодна, якраз гэтая ідэйная блізкасць і стала асновай вяртання «абшарніка» ў беларускія арганізацыі.

Язэп Лёсік таксама выказаўся наконт крытыкі беларускага Адраджэння як «польскай інтрыгі», якая нібыта падтрымліваецца коштам «тутэйшых паноў» дзеля далучэння Беларусі да Польшчы: «Чаму да Польшчы ганебна прылучацца і дзе яны (ворагі Адраджэння. – *А. С.*) чулі, што беларусы жадаюць да кагонібудзь прылучацца, – яны гэтага ні тлумачаць. Ні тлумачаць яны і таго, што ў Польшчы жыве гэтакі самы працоўны народ, як і мы, – ні горшы і ні лепшы за расійцаў ці які-небудзь іншы народ. Іх гэта мала абходзе, але гадаўё гэтае добра кеміць, куды гразёю шпурляе. Яны разумеюць, што нашае сялянства, дзякуючы прыкрым гістарычным умовам, звыкло разумець пад палякамі мейсцовых паноў-перакінчыкоў, і ўсю ганьбу і злосьць да паноў-землеўласьнікаў пераносе на ўвесь польскі народ, ні ведаючы яго і абражаючы людзей саўсім ні вінаватых [...] Справа тут ні ў паляках і ні ў расійцах, – ворагам нашым наогул не падабаецца рух нацыянальнаго адраджэння нашаго народу»[1127].

Між тым, набліжаліся выбары ва Устаноўчы Сход, якія маглі выявіць рэальную расстаноўку палітычных сіл у Беларусі. Выбары ў Менскай выбарчай акрузе, якая ўключала таксама неакупаваную частку Віленскай губ. павінны былі праходзіць 12–14 лістапада, але ў сувязі з супрацьстаяннем паміж Менскім камітэтам ратавання рэвалюцыі і бальшавіцкім ВРК адбыліся толькі 26–28 лістапада.

Выбаршчыкі павінны былі галасаваць за партыйныя спісы. Выбарчая камісія дапусціла да ўдзелу ў выбарах 11 такіх спісаў, сярод якіх варта адзначыць № 3 – Усерасійскі саюз землеўласнікаў; № 5 – блок Бунда і РСДРП (меньшавікі); № 8 –

[1125] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Паўстанне і нашыя заданні,* «Вольная Беларусь». 1917, № 28.

[1126] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Сучасны момэнт,* «Вольная Беларусь». 1917, № 29.

[1127] Я. Л-к [Я. Лёсік], *Скуткі большэвіцкаго паўстання,* «Вольная Беларусь». 1917, № 30.

Польскі выбарчы камітэт; № 9 – РСДРП (бальшавікі); № 12 – блок эсэраў і Савета сялянскіх дэпутатаў Менскай і неакупаванай часткі Віленскай губ.; № 13 – БСГ.

Раман Скірмунт прыняў актыўны ўдзел у выбарах. Ён быў «першым нумарам» у спісе кандыдатаў Усерасійскага саюза землеўласнікаў. Прысутнасць Скірмунта ў гэтым спісе была прычынай скандалу, які закончыўся ягонай адстаўкай з пасады віцэ-старшыні МТСГ. 15 кастрычніка 1917 г. на сходзе Таварыства хтосьці з яго сяброў назваў спіс кандыдатаў ад Саюза землеўласнікаў «рускім». Абураны Скірмунт ускочыў з мейсца і пабег да выступоўцы, каб яго зняважыць. Калегі не дапусцілі, а калі Скірмунт супакоіўся, то папрасіў прабачэння ў залы за свой учынак і падаў у адстаўку з пасады віцэ-старшыні[1128].

Увосень 1917 г. менавіта гэты Саюз стаў для Скірмунта адзінай пляцоўкай, якая стварала магчымасць трапіць ва Устаноўчы Сход. Зрэшты, з улікам папулярнасці сацыялістычнай ідэі і дамінавання левых партый і арганізацый гэтая магчымасць была чыста тэарэтычнай.

Зыходзячы з імкнення палітыка да кансалідацыі розных палітычных сіл, можна выказаць меркаванне, што ў МТСГ і Саюзе землеўласнікаў ён бачыў уплывовыя арганізацыі, здольныя адстойваць інтарэсы Краю. Скірмунт быццам уласнай асобай імкнуўся з'яднаць вельмі розныя палітычныя і нацыянальныя сілы.

Захаваныя архіўныя матэрыялы сведчаць, што Саюз землеўласнікаў у Менску не меў вялікага кадравага патэнцыялу. У параўнанні з іншымі «кандыдацкімі спісамі» Менскай акруговай камісіі сярод архіўных матэрыялаў спіса № 3 не захавалася ні зваротаў і абвестак, ні пераліку назіральнікаў[1129].

Аналіз іншых кандыдатаў спіса № 3 сведчыць пра дамінаванне ў ім дробных землеўласнікаў[1130]. Чацвёра (з дванаццаці) кандытатаў пражывалі на хутарах, яшчэ двое – у мястэчку і фальварку. Апрача Скірмунта вядомым палітыкам быў землеўласнік і дэпутат IV Дзяржаўнай Думы (Прагрэсіўны блок) Міхаіл Варанцоў-Вельямінаў, які актыўна працаваў у Саюзе земстваў, а пасля Лютаўскай рэвалюцыі выконваў абавязкі камісара Часовага ўрада ў Бабруйскім пав.

Наогул, вядомыя сваёй палітычнай і гаспадарчай дзейнасцю землеўласнікі ў спісах кандыдатаў Менскай выбарчай акругі адсутнічалі. Іх не было ні ў спісе партыі кадэтаў, ні ў пераліку кандыдатаў Польскага выбарчага камітэта. Апошні ўзначаліў Ежы Асмалоўскі. Таксама ў гэтым спісе фігуравалі адвакат Э. Івашкевіч, ксёндз С. Мацэевіч, К. Дзямідэцкі-Дзямідовіч ды інш.

«Першым нумарам» спіса БСГ стаў Аляксандр Прушынскі. Таксама ў яго

[1128] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917*. Tom 2, s. 229.

[1129] НАРБ. Ф. 60п, воп. 3, спр. 737, арк. 22.

[1130] А. Воробьев, *Выборы в Учредительное собрание на территории северо-западных губерний России (Витебской, Минской, Могилёвской, Псковской и Смоленской)*. Могилёв 2013, с. 35.



Таварышы і грамадзяне!

На выбарах да Устаноўчага Сойму па Мінскай

№ 13. галасуйце за сьпісак № 13.

Беларуская Сацыялістычная Грамады.

Сацыялістычная грамада выстаўляе гэтакі кандыдатаў:

1] Прушынскі Аляксандр Уладзімірау,— беларускі паэт, адбыў 9 год сяміцкі за зямлю і волю народа. [Мінск, 2-я Міхалаеўск, 6].

2] Петроўскі Базыль Пятрат [Масква. Пераведзеровка, 12].—Работнік і літаратор. Родам с Капыля.

3] Лёсік Язэп Юркау, [Мінск, Захараўск., 18].

4] Жылуновіч Дмітрый Тодароў, [Петроград. Знаменская 36-54.] Работнік, кватэрнічаў. Беларускі пісьменнік. Родам с Капыля.

5] Міхайлоўскі Рак Сымон Аляксандрау, салдат. X арміі, вучыцель

6] Мамонька Язэп Аляксеяў, салдат, XII арміі Родам са Случчыны.

7] Тарашкевіч Браніслаў Адамау, [Петроград. Знаменская 36-54] Сын сялянина с-пад Вільні, кандыдат фізолёгіі.

8] Тураў Тодар Тодароў. [Масква. В.-Лубянка, Зрашенск., 6] Вучыцель Мінскай гімназіі. Родам з Новагрудчыны.

9] Адамовіч Вячаслаў Антонаў. [Мінск. Міхайлоўская, 21]. Даўнейшы рэдактар «Северо Запад. Телеграфа».

10] Бадунова Надзея Аляксандроўна [Мінск, Захараўск., 18] народні вучыцель.

11] Міцкевіч Кастусь Міхалаў [Якуб Колас] Вядомы паэт. Беларусі з Мікалаўшчыны, Мінскага пав. паходзіць 298 Аляксеева полку.

12] Остроўскі Родаслаў Казіміраў. Слуцк, Камерцыят. Вучыцель с Случчыны, беларускі працаўнік.

13] Смоліч Аркадзі Антонаў, агранам. родам з Бабруйскага павету, беларускі сялянін.

Зварот БСГ да выбаршчыкаў ва Устаноўчы Сход на старонках «Вольнай Беларусі» (лістапад 1917 г.).

ўвайшлі Я. Лёсік, З. Жылуновіч, С. Рак-Міхайлоўскі, Б. Тарашкевіч, В. Адамовіч, А. Смоліч ды інш.

Напярэдадні выбараў заключылі пагадненне і ўтварылі выбарчыя блокі эсэры (№ 12) з бундаўцамі і меньшавікамі (№ 5), Аб'яднаная габрэйская сацыялістычная рабочая партыя (№ 1) і «Паалей-Цыён» (№ 10), а таксама Польскі выбарчы камітэт (№ 8) і Саюз землеўласнікаў (№ 3). Відавочна, што ў апошнім пагадненні важную ролю адыграла менавіта асоба Рамана Скірмунта.

Якімі былі вынікі выбараў? Гісторык Аляксандр Вараб'ёў у манаграфіі, прысвечанай выбарам, сцвердзіў адсутнасць поўных дадзеных па Менскай выбарчай акрузе, што можа сведчыць пра пэўныя бальшавіцкія маніпуляцыі, накіраваныя на тое, каб схаваць рэальную карціну выбараў[1131].

Паводле дадзеных, агучаных Менскай акруговай выбарчай камісіяй, усяго ў акрузе прагаласавала 917 248 выбаршчыкаў. Перамаглі бальшавікі, які атрымалі 579 тыс. галасоў (63,1 %). Рашаючую ролю адыграла падтрымка вайскоўцаў Заходняга фронту, а таксама блокавае пагадненне бальшавікоў з Сацыял-дэмакратыяй Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ), ППС-левіцай і Латышскай сацыял-дэмакратыяй. Другімі былі эсэры разам з бундаўцамі і меньшавікамі (198 тыс.). За спіс кандыдатаў блока Польскага выбарчага камітэта і Саюза землеўласнікаў прагаласавала трохі болей за 40 тыс. выбаршчыкаў (4,4 %). БСГ атрымала толькі 3 тыс. галасоў (0,3 %). Гэта быў найгоршы паказчык, бо нават за спіс Саюза землеўласнікаў прагаласавала 3 465 выбаршчыкаў (0,4 %)[1132]. Паводле інфармацыі газеты «Вольная Беларусь» у Менску за Саюз землеўласнікаў прагаласавала толькі 55 выбаршчыкаў, за БСГ – 161, а за польскі спіс – 4 261. Усяго ў галасаванні ўдзельнічаў 35 651 выбаршчык[1133].

[1131] Там же, с. 42.

[1132] Там же, с. 42–43.

[1133] «Вольная Беларусь». 1917, № 33.

Усяго ў трох беларускіх акругах (Магілёўскай, Менскай і Віцебскай) і Заходнім фронце беларускія партыі і аб'яднанні атрымалі толькі каля 19 тыс. галасоў (1 614 тыс.)[1134]. Гэта быў моцны ўдар па прэстыжы беларускага руху.

Аналізуючы прычыны беларускай няўдачы, С. Рудовіч звярнуў увагу не толькі на гіпноз шматлікіх бальшавіцкіх абяцанняў, але таксама на палітычную нявопытнасць, узаемныя супярэчнасці і арганізацыйную раз'яднанасць беларускага руху. Але галоўнай прычынай было тое, што беларуская ідэя знаходзіла значна больш актыўную падтрымку сярод бежанцаў за межамі Беларусі, чым на яе тэрыторыі. Апрача таго, значную ролю адыграла пераарыентацыя дзеячаў на беларускі Устаноўчы Сход[1135].

Параза Саюза землеўласнікаў таксама была заканамернай, а вось Польскі выбарчы камітэт мог разлічваць на значна лепшы вынік. Але, падобна, што і ў асяродку мясцовых палякаў сацыяльныя інтарэсы аказаліся больш зразумелымі для выбаршчыкаў, чым нацыянальная ідэя.

Усебеларускі з'езд

Перамога бальшавікоў, якая суправаджалася руйнаваннем маёнткаў і сядзібаў, расправамі з палітычнымі апанентамі, а таксама мірныя перамовы, што распачаліся ў Берасці паставілі на парадак дня беларускага руху пытанне пра дзяржаўна-палітычнае вызначэнне. Ужо ў сярэдзіне лістапада была агучана ініцыятыва склікання Усебеларускага з'езда. Як паказалі даследаванні С. Рудовіча, амаль адначасова пра неабходнасць агульнанацыянальнага форуму заявілі Вялікая Беларуская Рада ў Менску і Беларускі абласны камітэт (БАК), у якім дамінавалі прарасійскі настроеныя дзеячы ў Петраградзе. Незалежна ад іх з гэтай ідэяй таксама выступіла Беларуская Народная Грамада (БНГ) у Маскве і Краёвае арганізацыйнае бюро (Менск). Апошняе ўзнікла ў сярэдзіне лістапада і складалася з прадстаўнікоў Савета сялянскіх дэпутатаў Менскай і Віленскай губ., Саюза настаўнікаў, Саюза паштовых служачых і г. д. Паводле Прушынскага, Бюро рэпрэзентавала «правыя і масквафільскія элементы»[1136].

Несуцяшальныя вынікі выбараў ва Устаноўчы сход прымусілі беларускіх палітыкаў прыспешыць арганізацыйную працу. Яна адбывалася ва ўмовах выразнай канфрантацыі паміж беларускім рухам і бальшавіцкай уладай у Менску, якая ў беларускім Адраджэнні бачыла пагрозу ўласнаму панаванню.

30 лістапада 1917 г. на старонках «Вольнай Беларусі» з'явілася абвестка пра Усебеларускі з'езд.

[1134] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 163.

[1135] Тамсама, с. 162–163.

[1136] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 167–168.

ДАКУМЕНТ

УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД[1137]

Спаўняючы волю беларускіх з'ездаў ваенна-служачых Заходняга фронту і беларускіх палітычных арганізацый, Выканаўчы Камітэт Вялікай Беларускай Рады назначае на 5 сьнежня 1917 году агульны беларускі з'езд у г. Мінску. Гэты з'езд павінен выказаць волю народу беларускага, які ні можэ і ні хочэ далей нідбала глядзець на сваю долю у цяперашні грозны і адпаведны момант. З'езд павінен абсудзіць і разважыць справы аб арганізацыі самаабароны абездоленага беларускаго народу. З'езд павінен стварыць усімі прызнаную дэмакратычную беларускую краевую ўласьць, якая патрапіць выкіраваць народ беларускі на сьветлы шлях будучыны, які дасьць народу зямлю, волю і мір унутры краю і за яго межамі.

Парадак дня павінен быць такі:

1) Міжнароднае становішчо Беларусі (вайна і мір)

2) Зямельная справа

3) Які мае быць палітычны лад на Беларусі

4) Стварэньне органу Краёвай ўласьці.

Аднак адкрыццё з'езда затрымалася. Не ўсе дэлегаты здолелі прыбыць у Менск 5 снежня, тым больш, што БАК настойваў на адкрыцці з'езда 15 снежня. Урэшце пасля доўгіх спрэчак урачыстае адкрыццё адбылося 7 снежня 1917 г. у будынку Менскага гарадскога тэатра.

Падрабязнае апісанне дзейнасці Усебеларускага з'езда не ўваходзіць у намеры аўтара, тым больш што гэтаму форуму прысвечана багатая гістарычная літаратура. Яна ўключае даследаванні беларускіх гісторыкаў, пачынаючы ад кнігі Фёдара Турука «Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белоруссов» (Москва, 1921) і заканчваючы працамі С. Рудовіча, С. Хоміча ды інш. Таксама апублікаваны ўспаміны ўдзельнікаў з'езда (В. Захаркі, К. Езавітава, М. Касцевіча, А. Цвікевіча ды інш.) і гістарычныя дакументы. Сярод апошніх варта адзначыць падрыхтаваную да друку Віталем Скалабанам падрабязную справаздачу з працы з'езда Яўгена Ярушэвіча (1993)[1138], а таксама публікацыю пратаколаў, выяўленых Сяргеем Шупам у Цэнтральным Дзяржаўным архіве Літвы (1998)[1139].

Амаль тыдзень удзельнікі з'езда інтэнсіўна працавалі ў секцыях і камісіях.

[1137] «Вольная Беларусь». 1917, № 32.

[1138] *Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанні сучасніка* (прадмова і публікацыя В. Скалабана), «Беларускі гістарычны часопіс». 1993, № 1, с. 62–69; № 2, с. 46–55; № 3, с. 61–69; № 4, с. 50–62; *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі.* Укладанне, падрыхтоўка тэксту, уступны артыкул, каментары, пераклады, паказальнікі, кампутарны набор, макет С. Шупы. Том 1, кніга 1. Вільня, Нью-Ёрк, Менск, Прага 1998, с. 15–38.

[1139] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі.* Том 1, кніга 1, с. 19–38.

Увесь гэты час у Менск прыбывалі новыя групы дэлегатаў, якія далучаліся да ягонай працы. Паводле дадзеных прэзідыума і Мандатнай камісіі, у працы з'езда ўдзельнічала 1 872 дэлегаты, у т. л. 1 167 – з правам вырашальнага «голасу» і 705 – з правам дарадчага[1140]. Ці быў сярод іх Раман Скірмунт? Цяжка ўявіць, каб, знаходзячыся ў Менску, ён мог праігнараваць вялікі беларускі форум, які разглядаў надзвычай важныя праблемы і вызначаў будучыню Краю. Пра ягоны ўдзел у працы з'езду заявіла падчас інтэрв'ю (2008) дачка Людвікі Сівіцкай Галіна Антонаўна Войцік. Пры гэтым яна спаслалася на вусныя ўспаміны маці[1141].

Гіпатэтычна Скірмунт мог прысутнічаць на з'ездзе як дэлегат БНПС, якая таксама была на ім прадстаўлена. Дарэчы, паводле справаздачы Я. Ярушэвіча, вельмі актыўную ролю ў працы з'езду адыгрываў Павел Аляксюк, які на працягу ўсяго 1917 г. дзейнічаў поруч з колішнім кіраўніком БНК. Ён нават быў абраны ў Раду старэйшын з'езда. Таксама ў справаздачы і пратаколах згадваюцца імёны іншых дзеячаў з блізкага атачэння Скірмунта, якія ў гэты час у пэўным сэнсе працавалі ў яго «каманде». Гэта Аляксандр Уласаў, сябра абноўленай Рады старэйшын Аляксандр Прушынскі, генерал Кіпрыян Кандратовіч і Язэп Сушынскі. Усе яны былі прыхільнікамі абвяшчэння Беларускай рэспублікі.

Аднак ніводны з вядомых даследчыкам дакументаў працы Усебеларускага з'езда не ўтрымлівае імя Скірмунта. Пётр Крэчэўскі ў грунтоўным нарысе «Кто был на 1-м Всебелорусском съезде» сцвярджаў ягоны беларускі і народны характар і згадаў толькі пра аднаго памешчыка, менавіта «старого белорусского деятеля Бонч-Осмоловского»[1142]. Таксама імя Скірмунта не згадвалася ў даследаваннях такіх грунтоўных знаўцаў гэтага пытання як Віталь Скалабан і Станіслаў Рудовіч.

Відавочна, што бальшавіцкае панаванне ў Менску, рэпрэсіі супраць «буржуеў», не спрыялі публічнаму характару яго дзейнасці. Даводзілася хавацца. Іншая справа, што ён, безумоўна, ведаў пра тое, што адбывалася на менскім форуме. Апрача пытанняў пра дзяржаўна-палітычную будучыню Беларусі і зямельную рэформу Рамана Скірмунта павінны былі цікавіць праблемы міжнацыянальнага сужыцця і асабліва беларуска-польскіх дачыненняў.

Якім было стаўленне да Усебеларускага з'езда палітычна актыўнай часткі мясцовай польскай супольнасці? «Дзенік Мінскі» прывітаў Усебеларускі з'езд і пажадаў ягоным удзельнікам плённых нарадаў. Пры гэтым выказваліся спадзевы, што «карэнныя жыхары краю, разважаючы пра закон, справядлівасць і самавызначэнне, не забудуць пра нашую [польскую – *А. С.*] культуру і нацыянальную адметнасць і вызначаць належнае нам месца ў згодным сужыцці ўсіх народаў»[1143].

[1140] *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII–пачатку XXI ст.*, с. 342.

[1141] Інтэрв'ю з Галінай Войцік захоўваецца ў асабістым архіве аўтара, а таксама на сайце он-лайн праекта «Беларускі архіў вуснай гісторыі».

[1142] НАРБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 6, арк. 13–13 адв.

[1143] «Dziennik Miński». 1917, Nr 135.

7 снежня з прывітальнай прамовай выступіў прадстаўнік Польскага дэмакратычнага саюза сябра ППС Гнаінскі, які прыгадаў доўгія гады здзекаў расійскай улады над беларусамі і палякамі і пажадаў беларусам быць поўнымі гаспадарамі ў сваім краі[1144]. Ягоны выступ сустрэлі бурнымі апладысментамі.

8 снежня ўдзельнікаў форума віталі прадстаўнік Вярхоўнага польскага ваеннага камітэта прапаршчык Солтык, які пажадаў росквіту вольнай Беларусі, і дэлегат польскіх вайскоўцаў Заходняга фронту. Апошні сцвердзіў супадзенне польскіх і беларускіх інтарэсаў і выказаў надзею на добрасуседскія адносіны паміж народамі, а таксама на тое, што ў Беларусі будзе гарантавана поўная свабода развіцця польскай супольнасці[1145]. Тамаш Грыб у адказ заявіў пра намер беларусаў такім чынам уладкаваць жыццё, каб усім было «вольна і добра». «Наш ідэал, – казаў адзін з лідэраў беларускіх эсэраў, – свабода, роўнасць, братэрства. Верым, што польская дэмакратыя хоча таго ж [...] Няхай жыве Польская дэмакратычная рэспубліка!»[1146]

Аднак за афіцыйнымі рэверансамі ў бок беларусаў хавалася насцярожанасць, з якой эліта мясцовай польскай супольнасці назірала за Усебеларускім з'ездам. 9 снежня 1917 г. Касакоўскі ў Дзённіку распавёў пра сход ПРМЗ, на якім абмяркоўваліся адносіны да з'езда. Яго ўдзельнікі крытычна ацанілі ягоны пачатак, калі чуліся толькі сацыялістычныя лозунгі на рускай мове і адчуваўся антыпольскі настрой. Паступова, паводле іх назіранняў, пачала дамінаваць беларуская мова і змяніўся настрой, бо на палякаў пачалі глядзець як на верагодных саюзнікаў. У прынятай рэзалюцыі ПРМЗ пераважала пазіцыя чакання[1147].

Дарэчы, у тым жа дзённікавым запісе Касакоўскі заўважыў, што апладысменты, якімі дэлегаты сустрэлі і правадзілі Гнаінскага, былі звязаныя з той паслугай, якую польскія сацыялісты аказалі з'езду. Польскі дзеяч сцвярджаў, што ў рукі сяброў Начполя трапіла тэлеграма аднаго з кіраўнікоў Аблвыканкамзаха Аляксандра Мяснікова, у якой той выказваўся за разгон беларускага форума. Палякі паспяшаліся папярэдзіць беларусаў. Гэтая інфармацыя заслугоўвае ўвагі, улічваючы добрую абазнанасць Касакоўскага ў справах, якія датычылі польска-беларускіх стасункаў. Магчыма, планы разгону з'езда існавалі ў Аблвыканкамзаху з моманту яго адкрыцця.

Стаўленне эліты польскай супольнасці да беларускага форума таксама адлюстравалася ў артыкуле *Беларускі з'езд у Менску*, апублікаваным у «Дзенніку мінскім» 24 снежня за подпісам *К. Р.* Аўтар засяродзіўся на стаўленні з'езда да

[1144] *Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанні сучасніка*, «Беларускі гістарычны часопіс». 1993, № 2, с. 49.

[1145] Тамсама, с. 50–51.

[1146] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі.* Том 1, кніга 1, с. 31; ЦДАЛ. Ф. 582, воп. 1, спр. 1.

[1147] M. Kossakowski, *Diariusz. 29 kwietnia–31 grudnia 1917.* Tom 2, s. 362.

Польшчы і палякаў. Ён ацэньваў яго даволі крытычна, адзначыўшы, што ў прамовах такіх лідэраў беларускага руху як прафесар Я. Карскі, ксёндз В. Гадлеўскі, А. Данілевіч, а таксама «прарока з Палестыны спадара Кантара» (Я. Канчар?) адчувалася імкненне да вяртання колішняй русіфікацыйнай палітыкі ў дачыненні да палякаў. Большасць вясковых удзельнікаў з'езда, паводле *К. Р.*, былі далёкімі ад разумення нацыянальных інтарэсаў і цікавіліся выключна тым, як забраць памешчыцкія землі. Шмат увагі аўтар удзяліў таксама намаганням бальшавікоў, якія праз сваіх пасланцаў імкнуліся раскалоць і сарваць з'езд. Калі ж гэтага зрабіць не атрымалася, яны разагналі яго з дапамогай войск.

Аднак заканчэнне артыкула было цалкам пазітыўным. Аўтар вітаў пачатак беларускага Адраджэння (менавіта так ён разумеў сэнс форума) і сцвярджаў, што пасля вырашэння аграрнай праблемы беларусы перастануць баяцца палякаў і адчуюць неабходнасць згоднага сужыцця з заходнім суседам[1148].

Польская тэма даволі часта ўздымалася на з'ездзе. Звычайна яе закраналі, згадваючы пра знаходжанне ў Беларусі Польскага корпуса, а таксама сцвярджаючы існаванне польскіх планаў анексіі Беларусі. Справаздача Ярушэвіча дазваляе сцвярджаць, што гэтая антыпольская заклапочанасць асабліва ўзрасла ў апошнія дні з'езда пасля прыезду ў Менск дэлегацыі БАК. Менавіта яго прадстаўнікі Я. Канчар, А. Ваціла і М. Гольман найчасцей казалі пра пагрозу з боку Польшчы. Так, Канчар заявіў, што «поляки-империалисты стремятся к воссозданию Польши. [...] Польские легионы распределены по Белоруссии. Говорят о Белоруссии как о землях, являющихся достоянием польского государства»[1149]. Ва ўнісон выступалі прадстаўнікі радыкальнай «Левай фракцыі», у прыватнасці, У. Фальскі. На з'ездзе нехта распаўсюджваў чуткі, што на савецка-германскіх перамовах у Берасці «адзін з бакоў» прапанаваў далучыць Беларусь да Польшчы.

Трэба адзначыць, што рэцыдывы палонафобіі, якая працяглы час насаджалася царызмам, былі характэрнай з'явай для беларускага руху ў 1917–1918 гг. У гэты час пастулаты і стэрэатыпы заходнерусізму былі даволі папулярнымі. Прадстаўнікі больш памяркоўнага Блока сацыялістаў і беспартыйных, аснову якога складалі сябры ВБР і ЦБВР, спрабавалі парыраваць гэтыя антыпольскія выпады. Так, Макар Касцевіч заявіў, што не хоча кідаць бруд ва ўвесь польскі народ[1150]. Алесь Бурбіс пратэставаў супраць абвінавачванняў, якія гучалі ў кулуарах з'езда, што ўвесь беларускі рух інспіраваны «польскімі панамі»[1151].

З'езд паказаў дамінаванне ў беларускім руху прыхільнікаў сацыялістычнай ідэі і савецкай улады. Партыйная дыферэнцыяцыя яго ўдзельнікаў не адыгрыва-

---

[1148] K. P. [K. Prochnik?], *Zjazd białoruski w Mińsku*, «Dziennik Miński». 1917, Nr 147.

[1149] *Усебеларускіз'езд 1917 года: сведчанні сучасніка*, «Беларускі гістарычны часопіс». 1993, № 3, с. 68.

[1150] Тамсама. № 4, с. 54.

[1151] Тамсама, с. 53.

ла істотнай ролі. У выступе Канчара нават прагучала: «У нас буржуазии нет»[1152]. Ён жа ў перадапошні дзень заявіў: «Мы отвергаем какое бы то ни было соглашательство с буржуазияй»[1153]. Сапраўды, кансерватыўная плынь беларускага руху на з'ездзе ніяк сябе не праявіла. З'езд адбываўся ў момант панавання ў грамадстве сацыялістычнай ідэі і не было магчымасці супрацьстаяць ёй на ўсебеларускім форуме. Скірмунту заставалася толькі назіраць за ходам падзей.

14 снежня арганізацыйныя пытанні былі вырашаны, і з'езд перайшоў да абмеркавання найбольш важных палітычных і сацыяльных праблем. Дэпутаты заслухалі інфармацыю тагачаснага старшыні з'езда К. Савіча пра змест тэлефоннай размовы з наркомам па нацыянальных справах Сталіным, якая датычыла лёсу Беларусі і Берасцейскіх мірных перамоў. Апошні паабяцаў, што «Савет Народных камісараў будзе абараняць інтарэсы працоўных мас Беларусі ўсімі сродкамі»[1154]. Тым не менш шматлікія прамоўцы патрабавалі дабівацца ўдзелу беларусаў у перамовах.

Найбольш вострыя спрэчкі і дыскусіі датычылі будучыні Беларусі. С. Рудовіч убачыў у гэтым праяву пэўнага «цывілізацыйнага разлому» беларускай супольнасці «на носьбітаў расійска-праваслаўнага сацыякультурнага кода – прыхільнікаў далейшага дрэйфу Беларусі на ўсход у складзе шматнацыянальнай супердзяржавы анахранічнага імперскага тыпу, і тых, чыя ментальнасць заставалася адкрытай каштоўнасцям заходняй еўрапейскай цывілізацыі з шанаваным там ідэалам нацыі-дзяржавы»[1155].

Трэба прызнаць, што прыхільнікі незалежнасці на гэтым з'ездзе не мелі шансаў. Фактычна гаворка вялася пра розныя ступені самастойнасці Беларусі ў межах федэратыўнай і дэмакратычнай Расіі. Вось як пазней характарызаваў сітуацыю А. Цвікевіч: «На Ўсебеларускім Зьезьздзе думка аб незалежнасьці Беларусі не мела суспеху: агульна лунала па ўсіх сходах і камісыях толькі формула «федаратыўнай Расіі», прычым Беларусь мысьлілася як частка яе. Прынцып федарацыі мала каму быў ведам, але спрэчацца з ім значыла наражацца на непрыемнасьці. Нязнайства федэратыўнай сістэмы было нагэтулькі вялікае, што прапазыцыя назваць Беларусь рэспублікай, хоць бы і ў складзе Расійскай федарацыі, выклікала сярод дэпутатаў абураньня, супярэчкі і варожыя адносіны. Трэба адзначыць, што супраць гэтае прапазыцыі найбольш былі настроены прадстаўнікі валасных земстваў, вёскі і наагул сялянскія дэпутаты, палітычна мала сьвядомыя і знайходзіўшыяся пад уплывам расійскіх эс.-эраў. Што датычэ прэдстаўнікоў ад войска, дык яны, як больш маладыя, сьвядомыя і рэвалюцыйныя, супроць формулы «Беларуская рэспубліка» нічога не мелі, а некаторыя групы сярод іх зусім ясна вычувалі дум-

---

[1152] Тамсама. № 3, с. 68.

[1153] Тамсама. № 4, с. 52.

[1154] Тамсама. № 3, с. 66.

[1155] С. Рудовіч, *Час выбару...*, с. 182.

ку аб дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі. Усё-ж большасьць гэтага кроку баялася, баялася, каб падобным крокам не пашкодзіць "адзінаму фронту расійскай рэвалюцыі"»[1156].

На пазіцыю многіх дэпутатаў уплываў фактар мірных перамоў у Берасці. Менавіта там вырашаўся лёс падзеленай фронтам Беларусі. Выбар аўтаноміі ў межах Расіі ствараў ілюзію, што савецкая дэлегацыя сапраўды будзе абараняць інтарэсы Беларусі і не будзе гандляваць яе зямлёй дзеля падпісання мірнай дамовы.

Як вядома, пасля доўгіх спрэчак быў знойдзены кампраміс. У выніковай рэзалюцыі адсутнічаў тэрмін «Беларуская рэспубліка», але сцвярджалася ўстанаўленне «дэмакратычнага рэспубліканскага ладу ў межах Беларускай зямлі». Гэтая «зямля» заставалася часткай федэратыўнай Расіі. Больш важным было прыняцце рашэння пра стварэнне органа краёвай улады, менавіта «Усебеларускай Рады сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў», якая часова (да Беларускага Устаноўчага Сходу) павінна была кіраваць Краем і наладжваць адносіны з цэнтральнай уладай[1157]. Як сведчаць апублікаваныя матэрыялы, гэтае рашэнне было аднадушным.

Фактычна перамагла ідэя аўтаноміі, за якую Раман Скірмунт змагаўся яшчэ ўвесну 1917 г., але наўрад ці ён радаваўся гэтай перамозе напрыканцы года. Зрэшты, радасць удзельнікаў з'езда была непрацяглай. Яны здолелі прагаласаваць толькі за першы пункт рэзалюцыі. Аблвыканкамзах выкарыстаў салдат 1 Рэвалюцыйнага палка для разгону ўсебеларускага форума. Кіравалі разгонам камісары Крывашэін, Рэзаўскі і Рамнёў.

ДАКУМЕНТ

З успамінаў Макара Касцевіча. 1937 г.[1158]

Страшэнны гоман і мітусьня... Улавіўшы мамэнцік некаторай цішыні, Рэзаўскі абвяшчае Зьезд распушчаным, а Прэзідыум яго арыштаваным... Матрос Муха голасна пратэстуе і заяўляе, што ён больш не камісар апекі... Тымчасам урываюцца ў залу ўзброеныя салдаты Рамнёва і, разыходзячыся направа і налева, стараюцца ахапіць Зьезд. Дэлегаты супраціўляюцца, настаўляючы грудзі, іншыя пасярэдзіне грымяць крэсламі, барыкадаю адгароджваючы Прэзідыум. Калёнаю ў два рады салдаты ўціскаюцца ў сярэдзіну Зьезду. Дайшоўшы да барыкадаў, Рамнёў вымае з похвы рэвальвер, паднімае ўгару і колькі разоў нацискае цынгель... Але стрэлу не чутно... Пара трусьлівых сьвітак бяжыць за раяль, што стаіць па левай руцэ Прэзідыуму. Магутная фігура селяніна ў жоўтым расшпіленым кажусе

[1156] А. Цвікевіч, *Чатыры гады. 1918 – 25. III. 1922*, «Спадчына». 1996, № 3, с. 140–141.

[1157] *Постановление 1-го Всебелорусского С'езда о самоопределении Белоруссии и о временной краевой власти* (у:) Ф. Турук, *Белорусское движение*..., с. 106.

[1158] М. Краўцоў [Касцевіч М.], *20 гадоў назад (успамін пра Ўсебеларускі зьезд 1917 г.)*, «Спадчына». 1996, № 1, с. 193–194.

становіцца на крэсьле пасярэдзіне залы, сьціскае свае мазалістыя кулакі і крычыць: «Раззброіць іх!», паказваючы на чырвонаармейцаў...

Усё бачанае апісаць немагчыма... Зьезд разганяецца пагрозаю штыхоў... Нехта запяяў беларускую марсэльезу. Зь ёй выходзім, паміж шпалерамі збройных салдатаў, па сходах на Падгорную вуліцу... На скрыжаваньні Скобелеўскай і Падгорнай – ваякі на белых конях... Два панцырнікі грозна маўчаць...

Паход разагнанага Зьезду скіроўваецца ў бок рэзыдэнцыі бальшавіцкае ўлады – будынку Камэрцыйнае Школы... Зь тысячы грудзей разьлягаецца матыў хаўтурнага маршу: «Вы жертвою пали в борьбе роковой...»

ДАКУМЕНТ

На старонках «Вольнай Беларусі»[1159]

18 сьнежня, а 3-й гадзіні у поўначы, посьля таго як на Усебеларускім Зьездзі у Беларускім Нацыянальным домі (Дваранскае Сабранне) была прынята рэзолюцыя аб пераходзі ўласьці на Беларусі да Рады Зьезду, натоўп большэвіцкіх узброеных салдат аблажыу будынак, дзе адбываўся Зьезд, арыштавау прэзідзіум і разагнау Зьезд.

Арыштованыя выпушчаны. Зьезд мае вясьці далей работу, ні гледзючы на гвалт з боку большэвіцкай мейсцовай улады.

Большэвікі ультыматыуна запрапанавалі Вялікай і Вайсковай Беларускім Радам пакінуць заняты імі будынак (дом губэрнатора) праз 24 гадзіны, але іх ніхто ні паслухау.

У ноч на 19-е сьнежня большэвіцкі караул заняў дом Беларускае Рады.

Зьезд зачыніуся. Былі зноу арэшты, але усе выпушчаны. Абурэнне вялікае. Беларуская рэвалюцыя пачалася. Ніхай жыве Беларускі народ!

А вось «Дзеннік Мінскі» змясціў кароткую згадку пра разгон Усебеларускага з'езда без каментароў[1160]. Побач была змешчаная інфармацыя пра Доўбар-Мусніцкага і стварэнне польскага войска...

Адначасна бальшавікі занялі былы Дом губернатара, у якім месцілася ВБР, Выканкам ЦБВР, ЦК БСГ ды іншыя беларускія арганізацыі. Аднак беларуская праца не спынілася. Выканкам ЦБВР разам з Выканкамам Рады Усебеларускага з'езда перабраліся ў будынак на вул. Паліцэйскай. Менскія бальшавікі не рашыліся працягваць «беларускі пагром», бо выразна перакрочылі межы сваёй кампетэнцыі. Мітынгі пратэсту ў Менску, Магілёве, Віцебску, Оршы ды іншых гарадах, а таксама шматлікія пратэстныя тэлеграмы і звароты да цэнтральных органаў улады адыгралі сваю ролю. Мяснікоў і Ландэр атрымалі з Масквы вымовы і павінны былі тлумачыцца.

[1159] «Вольная Беларусь». 1917, № 35.

[1160] «Dziennik Miński». 1917, Nr 143.

Крыленка непасрэдна навязаў кантакт з ЦБВР. Праз тыдзень пасля разгону кіраўнік Ваеннага аддзела ЦБВР Кастусь Езавітаў разам з Янкам Серадой накіраваліся ў Магілёў, дзе была дасягнута дамоўленасць наконт фарміравання беларускіх вайсковых частак у складзе Чырвонай арміі[1161]. Праўда, пазней Крыленка адмовіўся ад стварэння беларускага войска.

Паводле Рудовіча, разгон усебеларускага форума перапыніў натуральны і паўнавартасны працэс пераўтварэння беларусаў з аморфнай этнічнай масы ў сучасную палітычную нацыю. Далейшая трансфармацыя ў гэтым кірунку «пайшла пакручастымі дарогамі, сталася запаволенай і шмат у чым дэфармаванай»[1162].

Аднак цалкам перакрэсліць вынікі Усебеларускага з'езда бальшавікі не здолелі. Рада старэйшын ператварылася ў Раду з'езда, а раніцай 18 снежня быў створаны Выканкам Рады на чале з Тамашам Грыбам, які абавязваўся праводзіць у жыццё ўсе прынятыя рашэнні і пастановы. Праўда, дзеля гэтага давялося перайсці на нелегальнае становішча. Такі ж лёс напаткаў ВБР і ЦБВР.

Як успрыняў гэтыя падзеі Раман Скірмунт? Як Усебеларускі з'езд і вынікі форума паўплывалі на ягоную палітычную пазіцыю? Відавочна, што Скірмунт не мог не звярнуць увагу на тэрмін «Беларуская рэспубліка», які шматразова гучаў на з'ездзе. Тэрмін сведчыў, што Беларусь ужо ўспрымалася не як нейкая «паўночна-заходняя ўскраіна» Расіі, а як самастойны суб'ект агульнарасійскай федэрацыі з адметнай культурай і ўласнымі традыцыямі. Ад гэтага ўсведамлення было недалёка да ідэі дзяржаўнай незалежнасці, тым больш, што і яна прысутнічала на Усебеларускім з'ездзе, хоць часцей як аб'ект крытыкі.

Пасля з'езда мала каму прыходзіла ў галаву прыгадваць няўдалыя для беларускага руху вынікі выбараў ва Устаноўчы Сход. Беларускае Адраджэнне выявіла свой вялізны патэнцыял і прымусіла лічыцца з ім усе існуючыя палітычныя сілы, у т. л. бальшавікоў. Усё гэта магло толькі заахвочваць да далейшай палітычнай дзейнасці.

Магчыма, Скірмунт таксама належным чынам ацаніў здольнасць да кампрамісу, якую прадэманстравалі на з'ездзе прадстаўнікі розных палітычных сіл беларускага Адраджэння. Як ужо адзначалася, ягоная дзейнасць у 1917 г. адбывалася ў рэчышчы дэмакратычнай складовай беларускага руху. Аднак з дамінаваннем у беларускім руху прыхільнікаў радыкальнай сацыялістычнай дактрыны Скірмунт пагадзіцца не мог.

Ежы Асмалоўскі ва ўспамінах адзначыў раскол сярод беларускіх арганізацый пасля разгону з'езда. Ён сцвярджаў, што большасць беларускіх дзеячаў падтрымлівала Раду Усебеларускага з'езду і будучы Народны Сакратарыят, а кансерватыўная ці больш памяркоўная іх частка стварыла *Беларускі камітэт*,

---

[1161] O. Łatyszonek, *Białoruskie formacje wojskowe. 1917–1923*, s. 63.

[1162] С. Рудовіч, Час выбару..., с. 189.

які ўзначаліў Раман Скірмунт. Ягоным намеснікам Асмалоўскі назваў Смоліча[1163]. Непасрэдныя згадкі пра гэтую арганізацыю адсутнічаюць у вядомых матэрыялах беларускага руху, але ўспаміны Асмалоўскага, а таксама падзеі пачатку 1918 г. дазваляюць выказаць меркаванне, што таямнічы «Беларускі камітэт» сапраўды ўзнік напрыканцы 1917 г. Ва ўмовах панавання бальшавікоў ён дзейнічаў нелегальна, а пасля іх сыходу 25 лютага 1918 г. ператварыўся ў Менскае Беларускае прадстаўніцтва (або Беларускае народнае прадстаўніцтва)[1164].

Дарэчы, гэтая арганізацыя на старонках газеты «Беларускі шлях» таксама часта фігуравала як «Камітэт». Менавіта ён згадваўся на старонках «Вольнай Беларусі» і «Дзенніка Мінскага» ў сувязі з тэлеграмай пратэсту, накіраванай у вышэйшыя інстанцыі Германіі, а таксама кіраўніцтву «Обэр-Ост» 18 сакавіка 1918 г. Прычынай тэлеграмы была інфармацыя пра нібыта існуючыя нямецкія планы ўключэння Гарадзеншчыны і Віленшчыны ў склад Польшчы. Аўтары тэлеграмы Р. Скірмунт, А. Зянкевіч і П. Аляксюк выступалі ад імя «Беларускага народнага камітэта»[1165]. Што датычыць *А. Зянкевіча*, то гэта быў не хто іншы, як Рамуальд Зямкевіч[1166].

Таксама трэба адзначыць, што ў інфармацыйным паведамленні Прэсавага бюро пры Нацыянальным сакратарыяце БНР ад 11 ліпеня 1918 г. сцвярджалася, што Менскае беларускае прадстаўніцтва таксама дзейнічае пад назвай «Беларускага народнага камітэта»[1167]. Стварэнне новай беларускай арганізацыі ўскосна пацвярджаюць згадкі Ежы Асмалоўскага пра польска-беларускія стасункі ў Менску на пачатку 1918 г. Ён сцвярджаў, што Рада Усебеларускага з'езду і ПРМЗ фактычна не кантактавалі. Затое на штотыднёвых сходах Выканкама ПРМЗ прысутнічаў дэлегат «Беларускага Камітэта» Аляксандр Прыстар, а прадстаўнік Польскай рады Чэслаў Крупскі рэгулярна ўдзельнічаў у пасяджэннях «Беларускага камітэта». Таксама варта прыгадаць сцвярджэнне Асмалоўскага, што сацыяльныя і палітычныя пазіцыі беларускай і польскай арганізацый былі ўзгоднены[1168].

Пра кантакты паміж ПРМЗ і Беларускім народным камітэтам Асмалоўскі прыгадваў некалькі раз, і іх факт можна лічыць устаноўленым. Іншая справа – згадка Аляксандра Прыстара як прадстаўніка «Камітэта», а таксама Аркадзя Смоліча як намесніка Скірмунта. Яны выклікаюць сумневы. Вядома, што як дзеяч ППС Прыстар уваходзіў у склад Выканкама Рады Усебеларускага з'езда. Тое ж датычыць і Смоліча, які быў сябрам Беларускай сацыялістычнай грамады. Далучэнне левых да новай арганізацыі Скірмунта ўяўляецца малаверагодным. Калі ж яны

[1163] BN. Dział mikroform, akc. 6797. J. Osmołowski, *Wspomnienia*, tom 1, k. 211.

[1164] «Беларускі шлях». 1918, № 1.

[1165] «Вольная Беларусь». 1918, № 10; «Dziennik Miński». 1918, Nr 54.

[1166] На жаль, не атрымалася растлумачыць такі варыянт ягонага подпісу.

[1167] НГАБ. Ф. 325, воп. 1, спр. 21, арк. 222–222 адв.

[1168] BN. Dział mikroform, akc. 6797. J. Osmołowski, *Wspomnienia*, tom 1, k. 214.

сапраўды мелі дачыненне да Беларускага Народнага Камітэта, то гэта сведчыць пра дастаткова гнуткую пазіцыю часткі беларускіх сацыялістаў, якія імкнуліся выкарыстаць усе магчымасці дзеля беларускага палітычнага Адраджэння.

Такім чынам, напрыканцы снежня 1917 г. пасля разгону Усебеларускага з'езда Раман Скірмунт, Павел Аляксюк і Рамуальд Зямкевіч стварылі Беларускі народны камітэт. Дзейнасць працягвалася…

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке